Беларуская мемуарная бібліятэка

Выгнаны патрыцый

Кніга пра Міхася Стральцова

Беларуская
мемуарная
бібліятэка

Выгнаны патрыцый

Кніга пра Міхася Стральцова

Мінск
«Лімарыус»
2017

УДК 94(476)(093)
ББК 63.3(4Беи)
В92

Серыя заснавана ў 2011 годзе

Укладанне, прадмова, каментары
Міхась Скобла

Навукова-рэдакцыйная рада:
Валянцін Голубеў, Ганна Запартыка, Аляксей Каўка,
Вітаўт Кіпель, Адам Мальдзіс, Мікола Нікалаеў,
Генадзь Сагановіч, Алесь Смалянчук, Лявон Юрэвіч

Укладальнік і выдавецтва
выказваюць шчырую падзяку
Алене Дзмітрыеўне Стральцовай
за дапамогу ў выданні кнігі

ISBN 978-985-6968-56-6

© Скобла М., укладанне,
прадмова, каментары, 2017
© ТАА «Лімарыус», 2017

ЁН БАЧЫЎ СВЕТ БЕЗ БРУДУ І ХАМСТВА

Задума гэтай кнігі ўзнікла два гады таму ў Слаўгарадзе (колішнім Прапойску), на радзіме Міхася Стральцова. З Анатолем Вярцінскім, Міхасём Шавыркіным і Юрыем Несцярэнкам, які ахвотна далучыўся да нашай сталічнай кампаніі ў Бялынічах, мы ў Слаўгарадскай раённай бібліятэцы прэзентавалі «кнігазбораўскі» том Стральцова. На століку пабліскваў золатам стос свежавыдрукаваных кніг, наш творчы квартэт стараўся як мог, і праз гадзіну-паўтары, здавалася, класікі на бібліятэчнай сцяне былі гатовыя дружна пасунуцца і прыняць у свой шэраг яшчэ аднаго роўнавялікага творцу.

Пасля прэзентацыі гасцінныя гаспадары зладзілі для нас экскурсію па мясцовым краязнаўчым музеі. Маўляў, ён толькі што адкрыты, прасторныя залы з клімат-кантролем, у экспазіцыі — уся гісторыя Слаўгарадчыны з данашаэрных часоў да дзён сённяшніх. І сапраўды, у музеі экспанатаў хапала — кулямётаў і калаўроткаў, эпалетаў і партбілетаў, мамантавых біўняў і карцінаў самадзейных мастакоў, што былі развешаныя ў прасторных залах...

Мы дарэмна імкнуліся знайсці залу Стральцова. Мы да апошняга спадзяваліся пабачыць прысвечаную яму экспазіцыю. Мы няўцямна азіраліся ў апошняй зале — дзе ж тут Стральцоў, пісьменнік № 1 для Слаўгарадчыны? Але ў Слаўгарадскім краязнаўчым музеі Стральцова не было зусім — ні радка ягонага, ні хоць бы здымка ў шматлюднай галерэі заслужаных слаўгарадцаў. І гэта прытым, што пісьменнік — усё ж лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, што адказнымі за культуру чыноўнікамі ва ўсе часы ўспрымалася як своеасаблівы пропуск.

Заўважна памаркотнеў разважліва-мудры Анатоль Вярцінскі, які ў свой час радасна вітаў у «ЛіМе» з'яўленне Стральцова-паэта. Пасумнеў заўсёды энергічны заснавальнік і шматгадовы

рэдактар часопіса «Роднае слова» Міхась Шавыркін, які калісьці падпісваў у друк зборнічак стральцоўскіх афарызмаў. Зніякавеў і таленавіты бард Юры Несцярэнка, які ўсяго гадзіну назад натхнёна выконваў песні на вершы Стральцова...

На падворку музея дырэктарка збянтэжана апраўдвалася — маўляў, мы тут у правінцыі і не ведалі, што Стральцоў у сталіцы ў класікі залічаны, ды і экспанатаў адпаведных у музейных фондах няма... Я спытаўся ў дырэктаркі, ці была яна ў недалёкім Сычыне, дзе і экспанаты можна было б пашукаць. Маладзіца прызналася, што не ведае, дзе знаходзіцца родная вёска Стральцова...

Вось тады я і паабяцаў слаўгарадцам кнігу пра іх земляка Міхася Стральцова. Пра паэта строга класічнага і надзіва гарманічнага, па якім, як па камертоне, можна правяраць свой паэтычны слых. Пра празаіка, чыя проза напоўненая паэзіяй, як напоўнены сокам даспелы яблык. Выцісніце яго — і атрымаюцца непрыдатныя для спажывы жамяры. Стральцоў мог пачаць і закончыць празаічны твор вершам, як, напрыклад, аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь», і як жа арганічна тое выглядала! Мог уласную прозу напоўніць чужой паэзіяй, як гэта зроблена ў бліскучым эсэ «Загадка Багдановіча». Тая «Загадка...» сталася таямніцай і самога Стральцова — як ён, ні разу не пабываўшы ў Крыме, у Ялце, у «белым доме ля сіняй бухты», здолеў так псіхалагічна дакладна апісаць апошнія дні Максіма Багдановіча?

Міхася Стральцова ў паваеннай беларускай літаратуры няма з кім параўнаць, у сваім пакаленні ён глядзіцца непадобным на другіх адзінцом. Магчыма, гэтым сваім непадабенствам ён кагосьці і раздражняў. Але Стральцова любілі і шанавалі тыя творцы, каму не засціла вочы зайздрасць, хто цаніў адметнасць чужога таленту — Рыгор Барадулін, Уладзімір Караткевіч, Янка Брыль. Вось напісаў я пра немагчымасць параўнання і ўспомніў, што Брыль сугучнага Стральцову пісьменніка ўсё ж знайшоў. Праўда, не ў беларускай літаратуры. Прадстаўляючы трыццацігадовага Стральцова тады яшчэ ўсесаюзнаму чытачу (у Маскве ў перакладзе на расійскую мову выходзіла кніга

«Что будет сниться»), Іван Антонавіч параўнаў свайго маладога калегу з... Іванам Буніным («абодвух чытаў на адной хвалі прыёму»). Празорлівы і начытаны Брыль ведаў, што гаворыць, і ўсё роўна словы ягоныя выглядалі як нечувана шчодры аванс, які належала адпрацаваць. І Стральцоў адпрацаваў — колькі паспеў.

Два такія розныя пісьменніцкія лёсы — і адна хваля прыёму? Чым жа яны сугучныя — патомны дваранін з Варонежа і сын настаўніка з Магілёўшчыны? І ў Буніна, і ў Стральцова — вытанчаны псіхалагізм, паэтычнае светаадчуванне, увага да дэталі.

«Прыгадваецца мне ранняя пагодная восень. Жнівень быў з цёплымі дажджамі, быццам наўмысна спорнымі для сяўбы...»

Хто гэта? Мабыць, Стральцоў. Але ў якім ягоным апавяданні такі пачатак? Не шукайце — не знойдзеце. Гэта пачатак «Антонаўскіх яблыкаў» Буніна. Думаецца, пры добрым перакладзе стральцоўскай прозы магчымы і адваротны эфект. І як быццам няма тут аніякага дзіва — малодшы мог вучыцца ў старэйшага, як скрозь водзіцца ў літаратуры. Але Бунін — з'ява непаўторная і немагчымая па-за літаратурай расійскай. Проста павінен быў нарадзіцца падобны талент, з гэткай жа чулай, як мембрана, душой. Праўда, тут можна згадаць яшчэ і той факт, што продкі Буніна паходзілі з Беларусі і насілі прозвішча Бункоўскія. Жонка так і называла яго беларускім імем — Ян.

«Милый Ваня, мой бог свободен от цензуры, и я ликую,» — гэтак Яну-Івану Буніну надпісаў свой дарэвалюцыйны здымак Фёдар Шаляпін. Савецкая ўлада хутка разабралася з усімі багамі, і ўжо напачатку 20-х і знакаміты пісьменнік, і славуты спявак, ратуючы свае таленты, апынуліся за мяжой, у Францыі. Эміграцкі хлеб горкі, але жылі яны ў культурнай сталіцы Еўропы — Парыжы, вандравалі па свеце, ім былі даступныя здабыткі сусветнай культуры.

Грамадзянін другой краіны і жыхар другой эпохі Міхась Стральцоў таксама цягнуўся да сусветнай культуры — наколькі гэта было магчыма ў СССР. «Плач па Гарсія Лорку», «Калі

сын Феба — Фаэтон / памчаў адзін на калясніцы...», «У Анны у Андрэеўны Ахматавай / ёсць невялікі вершык...» — так пачынаюцца першыя, якія прыйшлі на памяць, стральцоўскія вершы.

Цікава, вядома ж, паназіраць за Фаэтонам на калясніцы ці паразмаўляць з музай, якая калісьці дыктавала старонкі «Пекла» самому Дантэ. Але барабанна-барацьбітная эпоха вымагала іншых тэмаў і герояў. І сапраўдныя паэты, каб не здрадзіць сабе, не могучы эміграваць кудысьці далей (мяжа была на сямі замках), эміграваліі — хто ў перакладчыкі (як Арсеній Таркоўскі), хто ў казачнікі (як Уладзімір Дубоўка), хто ў сумную краіну маўчання або ў вясёлае на першы погляд царства Вакха (такіх лічыць — не пералічыць). Міхась Стральцоў таксама пабываў і там, дзе сум, і там, дзе весялосць. І калі сябры пачыналі дакараць за празмернае маўчанне, паэт абараняўся таленавіта, як умелы фехтавальнік: «Над словам і над гукам, / даўмешыся пары, / спярша на рукі хукай, / пасля ужо твары». Тонкі, дасціпны ўкол тым творцам, якіх прынята называць пладавітымі.

Невыпадкова апошняя кніга Стральцова атрымала назву «Мой свеце ясны» — ён так бачыў свет, без бруду і хамства. Гэты невялікі, густоўна выдадзены зборнік — як эталон чысціні, чысціні пачуццёвай і паэтычнай.

Калі паэт дачасна згас у анкалагічным шпіталі ў Бараўлянах (1987 год), літфункцыянеры спахапіліся і ўзнагародзілі ўжо мёртвага Стральцова Дзяржаўнай прэміяй. Як чатыры гады перад гэтым узнагароджвалі — таксама пасмяротна — Уладзіміра Караткевіча. Але ж — «гэта трэба не мёртвым, гэта трэба жывым». Ды што паробіш, калі ўлада, як правіла, заўважае найперш дзяржаўны падхалімаж. Няма яго — няма і прэміі.

А запабягаць перад кімсьці было не ў характары Міхася Стральцова. Памятаю, у рэстаране Цэнтральнага дома літаратара ў Маскве пасля прысвечанай Алесю Адамовічу вечарыны я апынуўся поплеч з вядомым крытыкам Валянцінам Аскоцкім. Ён уразіў мяне веданнем сучаснай беларускай паэзіі і зусім ужо ашаламіў, калі разам з паэткай Рымай Казаковай зацягнуў

беларускую народную песню. «Адкуль гэта ў вас?» — спытаўся я ў Аскоцкага. «Ад Мішы Стральцова», — прагучаў адказ.

Ужо дома ў стральцоўскім аднатомніку я прачытаў прысвечаны сябру-масквічу верш, які заканчваўся радкамі: «Далёкі друг, я даль тваю люблю, / далёкі друг, любі маю таксама». І аніякага табе шапказдымання перад уплывовым крытыкам. Сказана з пачуццём уласнай годнасці і раўнапраўнай дружбы. Чаго сёння так не хапае некаторым беларускім палітыкам. Палітыкі мусяць браць урокі ў пісьменнікаў, у тым ліку ў Міхася Стральцова.

Ён так і застаўся ў айчыннай літаратуры пяцідзесяцігадовым патрыцыем ("Вось тут, далёка ад сталіцы, / ад ісцін новых і старых, / жыву, як выгнаны патрыцый..."), які, аднак, не захінаўся ў тогу высакамернасці, калі, «хукнуўшы на рукі», ціха прамаўляў непачутыя своечасова ісціны, выяўляў сваю захопленасць светам (абавязкова — ясным). Сёння многія стральцоўскія радкі гучаць афарыстычна: «Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш», «Павер, што болей чым імгненне / не прыме вечнасць ад цябе», «Хай слова будзе як патрэба, / як у прыпар вады глыток, / але ж бывае слова — срэбра, / маўчанне — золата, браток». І калі афарызмы гэтыя гучаць сапраўды неяк па-патрыцыянску, то ўмеў Стральцоў і пра высокія матэрыі сказаць проста і даходліва, нібы знарок для якога Хведара ці Панаса, якія мільгаюць у адным з ягоных вершаў. Прычым сказаць на папулярнай у народзе ва ўсе часы трасянцы: «Цвічок ва ўласным боце / страшней, чым «Фауст» Гёце».

Прасеяўшыся залатым пяском праз сіта часу, афарыстычна загучала і проза Міхася Стральцова. Вось як заканчваецца ягоная «Загадка Багдановіча»: «Застаўся пасля яго адзін «Вянок». Не старайцеся ўплятаць туды новыя кветкі: тыя, што там, ніколі не завянуць. Сплятайце свае вянкі. Не старайцеся адшчыкнуць хоць адзін лісток ад тых лаўраў: тыя лаўры, перш чым стаць імі, былі цернямі». Які годны запавет творчай моладзі, якая часам пнецца самасцвердзіцца праз прыніжэнне старэйшага пакалення. Але не будзем папракаць маладых — звычайна тое адбываецца праз элементарнае няведанне спадчыны.

Аднойчы прыляцела да мяне юная шчабятлівая ластаўка з тэлеканала «Белсат». «А чаму ў беларускай літаратуры няма шэдэўраў сусветнага ўзроўню? А чаму яна ўся прыземлена-вясковая? А можаце назваць што-небудзь не горшае за... Гары Потэра?» І пачаў я той ластаўцы называць — усё стральцоўскае: «Смаленне вепрука», «Сена на асфальце», «Адзін лапаць, адзін чунь»... Бачу — крывіцца расчаравана, вёскай ёй ад тых загалоўкаў патыхае. А названыя творы — лірычна-філасофская проза самай высокай якасці, чытво на ўсе ўзросты. І ўвогуле, гэта той выпадак, пра які народная мудрасць трапна гаворыць: *мае лапці твае боты пераходзяць*.

Як і кожнаму творцу, Міхасю Стральцову хацелася быць пачутым. У тым апошнім для яго 1987-м ён згаджаўся на ўсе выступы. У сталічным Доме літаратара прэзентаваліся «Мой свеце ясны» і кніга крытыкі «Пячатка майстра». А ўсяго за тры месяцы да смерці ў бараўлянскім шпіталі ён сустракаўся са сваімі чытачамі ў Гародні і Лідзе. І ў восеньскай журбе спрабаваў дапільнаваць імгненні жыццёвай весялосці...

Ужо са смяротнай лажніцы ён прашаптаў схіленаму над ім Янку Брылю: «Мне без вас нельга». Сёння ўсім нам нельга абысціся без Міхася Стральцова, без яго паэтычнага і празаічнага «свету яснага».

Пішу гэтыя радкі, выконваючы дадзенае ў Слаўгарадзе абяцанне. І мне верыцца, што гэтая кніга камусьці дапаможа ўбачыць Стральцова ў поўны рост. І з'явіцца з цягам часу і музейная экспазіцыя, і акадэмічны збор твораў, і вуліцы яго імя — у сталіцы і ў тым самым слаўным горадзе Слаўгарадзе, дзе пісьменніка неяк падазрона хутка дарэшты забылі.

Што праўда, сённяшняму чытачу ўбачыць Стральцова ў поўны рост пакуль няпроста. У друку хоць зрэдку, але працягваюць з'яўляцца невядомыя тэксты, эпісталярый пісьменніка апублікаваны пакуль толькі часткова. То бок, постаць Міхася Стральцова яшчэ далёкая ад кананічнай завершанасці. Пра якую завершанасць можна гаварыць, калі ўсяго гады тры таму быў знойдзены цэлы стральцоўскі архіў, пра існаванне якога не падазравалі і самыя дасведчаныя архіўныя пінкертоны.

Не ведаў і я, хоць узяўся ўкладаць той самы, прэзентаваны ў Слаўгарадзе, «кнігазбораўскі» том Стральцова. Прызнаюся, я ледзь не паддаўся на ўгаворы літаратурных усяведаў, якія настойліва раілі проста ўзяць і адсканаваць выбранае 1987 года, а не бегаць па бібліятэках і архівах у пошуках новых тэкстаў. Маўляў, усё роўна нічога вартаснага не знойдзеш. Ды і архіва пасля Стральцова практычна не засталося — не захоўваў ён рукапісаў, не сартаваў па тэчках папяровай непатрэбшчыны. Вопіс яго асабістага фонду ў Беларускім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва танюткі, як вучнёўскі сшытак, ды і там нічога недрукаванага няма...

Выбранае з прадмовай Алеся Адамовіча я паціху сканаваў, патроху каментаваў, а сам думаў — буду апошнім лайдаком, калі не знайду ну хоць бы стральцоўскіх лістоў — эпісталярны раздзел у будучай кнізе адчайна пуставаў.

Дзе тыя лісты шукаць? Я прыехаў на вуліцу Прытыцкага, у дом № 6, падняўся на скрыпучым ліфце ў кватэру, дзе жыў Стральцоў.

Удава паэта Алена Дзмітрыеўна сустрэла мяне надзвычай гасцінна і — о дзіва! — ледзь не з парога абнадзеіла. Аказваецца, стральцоўскі архіў быў падзелены на дзве часткі — адна трапіла ва ўжо згаданы БДАМЛіМ, а другая ў свой час была вывезеная на захаванне ў надзейнае месца за кружной дарогай.

Кожны наступны дзень я даймаў Алену Дзмітрыеўну тэлефоннымі званкамі — калі паедзем? Нарэшце, дамовіўшыся, мы адправіліся ў пошукавую экпедыцыю. У сучасным катэджным пасёлку адшукалі дом, сённяшнія насельнікі якога правялі мяне ў падвал і паказалі на скіданую ў адносным парадку гару старых рэчаў пад самую столь — шукайце тут. Перавязаныя стосы кніг, старое адзенне, посуд, елачная мішура, гаршкі з-пад вазонаў, абутак на ўсе сезоны, савецкія часопісы, дзіцячыя цацкі і напоўненыя нечым падазроным флаконы — я раскопваў тую падвальную джамалунгму з імпэтам салігорскага шахцёра, якога паабяцалі прэміяваць за вагон прадукцыі звыш нормы.

Час ад часу вылазячы наверх хапянуць свежага паветра, я адчуваў, што цярпенне жыхароў дому на сыходзе, мае лёгкія пра-

тэстуюць і вочы слепнуць. Але, гнаны невядомай сілай, зноў спускаўся ў паўцёмны падвал і ледзь не вобмацкам перабіраў невядома з якой мэтай знесеныя туды клункі, скрынкі і рознае рыззё.

Шуканае аказалася на самым дне. З-пад пагрызенай мышамі дванаццацітомнай «Истории второй мировой войны» я выцягнуў бліжэй да цьмянай лямпачкі прадаўгаватую скрыню і з трымценнем у сэрцы прачытаў зроблены фламастарам надпіс *Архіў М. Стральцова...*

На зваротнай дарозе ў Менск мне неадчэпна думалася пра знойдзеную скрыню, дзе магло быць што заўгодна, у тым ліку і рукапіс калісьці анансаванай у часопісе «Маладосць» аповесці «Конь гуляў на волі»...

Тою ноччу я не заснуў — раскладаў на падлозе змесціва скрыні (усё было ў ідэальным парадку) і не спяшаючыся ўчытваўся ў пажаўцелыя старонкі. Нечакана ў скрыні аказалася шмат лістоў — многія з іх трапілі ў «кнігазбораўскі» том. У тэчцы з перакладамі зверху ляжаў Мікеланджэла па-беларуску — перакладзены ў пачатку 70-х для італьянскай паэтычнай анталогіі, ён чамусьці туды не ўвайшоў. Знайшліся ў скрыні і жартоўныя вершы, адрасаваныя паэтам дачцэ і сябрам. У асобным канверце ляжалі фатаздымкі.

Почырк у Стральцова далёка не каліграфічны — некаторыя чарнавікі расчытаць тады не ўдалося. Пад адным скрэсленым рукапісам я звярнуў увагу на дату: *7.07.87.* Паэт ужо ведаў пра свой дыягназ, меўся класціся ў бараўлянскую больніцу. Заставалася паўтара месяцы жыцця...

«У скверы гэтым лугавінка...» Далей ішлі зусім нечытэльныя, шматкроць закрэсленыя радкі. Цалкам удалося прачытаць толькі адну страфу ды заканчэнне: «Касіў за двух і жыў за двух!».

Накід верша, зроблены, да таго ж, алоўкам, у том выбранага, зразумела, не трапіў. Ды нешта мне рупіла ў тым нерасчытаным рукапісе. Я насіў яго з сабою, расказваў пра яго ўсім зацікаўленым і нават браў з сабой у Сычын — на радзіму паэта.

І Міхась Лявонавіч нада мной злітаваўся. Аднойчы ў зацішным БДАМЛіМе мне прынесьлі не тую справу. Замаўляў Сяднёва, а памылкова прынеслі Стральцова. Я машынальна зірнуў на дзясятак даследчыцкіх роспісаў на лісце карыстальніка і ледзь не здаў тую справу 36 з фонда 361 назад у сховішча.

Гартануўшы ўсё ж белы нататнік з вядомымі мне перакладамі, я нечакана ўбачыў белавы варыянт таго адшуканага ў падвале верша! Старонка мела нумар 37 — год нараджэння Стральцова... Так прыйшоў да чытача апошні стральцоўскі верш, верш-развітанне:

У скверы гэтым лугавінка
Мне, што выпадкам, так сабе,
Задобрыў думку успамінкам
Аб даўняй ліпеньскай касьбе, —
Такая радасць і аддуха,
Такая горыч і журба!
Сядзі і ўласным сэрцам слухай,
Як адступае ціха скруха,
А з ёй — і гора, і бяда.
Няхай! Ды толькі дзе, мой хлопча,
Падстрэшак той і дзе каса?
Другі ўжо нехта копы топча,
Другі ў прыпар спачыну хоча,
Другія там — не ты ўжо сам.
Ах, божа мой! Чыёю верай
Перада мной той даўні луг
Паслаўся чыстаю паперай,
Каб я радком пракосы мераў,
Касіў за двух
І жыў за двух!

Калі б ананімную раздрукоўку гэтага верша мне прыйшлося вылавіць у закарванай бутэльцы дзе-небудзь на неабжытай выспе пасярод акіяна, то і тады не ўзнікла б аніякіх сумневаў наконт аўтарства — столькі ў гэтых дваццаці

радках стральцоўскага дыхання, стральцоўскай гэтак зразумелай журбы!

Гэтая кніга — не парадны партрэт у залатой раме. Паэты не святыя, ім не патрэбныя салодкагалосыя акафісты і фіміям, ад якога кружацца галовы найперш у саміх кадзільшчыкаў. Паэт адбываецца ў Слове, тым самым умацоўваючы бяссмерце свайго народа. Бо адзінае і сапраўднае бяссмерце паэта і народа — у прамоўленым і захаваным Слове. Паколькі ўсё падлягае разбурэнню, апрача Слова.

Думаецца, Міхась Стральцоў усведамляў сваю адказную місію захавальніка кастальскай крыніцы Мовы і Паэзіі, упэўнена прамовіўшы на схіле XX стагоддзя: «Мой голас і ў веку наступным пачуецца». Гэты наступны век настаў. І голас гучыць — не прыглушаны далеччу часу.

Міхась Скобла

ПРЫ ЎРАЧЫСТЫМ СВЯТЛЕ ДНЯ
Успаміны пра Міхася Стральцова

Ала Сямёнава

«Раніцай яснага мая...»

Фатаздымак (Міхась Стральцоў аддаў мне яго і іншыя здымкі пасля перадачы па тэлебачанні, дзе яны былі скарыстаныя), на якім малады, нават малы яшчэ, раскудлачаны Міхась, — заспеў нейкае гарэзлівае, імклівае імгненне. Нібыта бег ён з вясёлае гульні і на хвіліну спыніўся, задыхаўшыся: каб бегчы некуды зноў. Каб адчуць «шумліва-порсткі, роспачна-вясёлы» вецер, паслухаць «лапатлівых» вераб'ёў, падпільнаваць птушак на лясоўцы. Як герой ягонай аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь». І, мабыць, як ён, быў у атопках пасляваеннай пары. І, верагодна, ягоны дзед Міхась, як дзед Міхалка з тае аповесці, прасіў пана Бога за ўнука: «Пашлі выпрабаванні яму па сіле». Дзеда з матчынага боку, Міхала Ігнатавіча Кузьміцкага, Міхась Стральцоў згадваў неяк у лісце: «Дзед памёр надта рана для ягоных год, але першапачатковым выхавацелем маім, калі гэта, вядома, можна было называць на той час і ў тых умовах выхаваннем, займаўся ён».

Дык прыехаў гэты хлопец — Міхась Стральцоў — у сталіцу парой, якую пазначаюць «хрушчоўскай адлігай». У сярэдзіне 50-х гадоў. У пару ашаламляльнага сацыяльна-грамадскага прарыву. Было вернута натуральнае права на ўспрыняцце сапраўднай, існуючай рэальнасці, а не фантомнага «сёння» дзеля светазарнага «заўтра». Праўда, неўзабаве нам паабяцалі, што мы будзем жыць пры камунізме. Аднак скептычнае наша пакаленне (рамантызм спакойна суседнічаў з самаіроніяй і скепсісам) успрыняло гэтую дэкларацыю як дэкларацыю — не больш. Затое мы займелі права на самавыяўленне. На сумнеў. «Нас вырастил Сталин...» — догма нашага дзяцінства была

абвержана, мы вярнуліся да натуральнай высновы, што гадавалі нас бацькі, больш маці (таты нашага пакалення ці не праз аднаго загінулі на вайне), бабкі, дзяды, цёткі. Дзіцячыя дамы... «Я другой такой страны не знаю, где так вольно дышит человек...» — гэтая прыемная ілюзія таксама знікла пасля першых афіцыйных звестак пра рэпрэсіі. Неаспрэчнае веданне пра тое, што ў нас усё — самае лепшае, руйнавалася самой рэчаіснасцю. Нашы паркалёвыя «футболкі» пэўна не маглі канкураваць нават з немудрагелістымі світэрамі якога шатландскага вырабу — з'явіліся першыя пасылкі «адтуль», з-за кардону. Пачаў аказвацца «імпарт», слова, што даўно, мабыць, не было ў абыходку. Лаліта Торэс спявала з экранаў пра цудоўны горад Каімбру таксама не ў лахманах, а Ліз Тэйлар то і ўвогуле ў «Рапсодыі» не так выконвала ролю і грала на фартэпіяна (па ролі — яна піяністка), як дэманстравала сваю бездакорную постаць у недасягальна шыкоўных строях. Надавалі сацыяльнай самаўпэўненасці хіба што італьянскія неарэалісты — ваша галеча на нашу галечу: хто, так бы мовіць, перасягне.

Галоўнае ж — пасля пасляваенных гаротных нашых пайкоў у прамым і ў пераносным сэнсе, было чым жывіцца. Стаўся ўжо нейкі харч, наедак, і — хлеб духоўны: пасля ўсіх «Кавалераў залатой зоркі», «Кубанскіх казакоў», усіх класных і пазакласных «вальналюбных і патрыятычных матываў», пасля рэпрадукаваных «шэдэўраў» выяўленчага мастацтва накшталт «Ленін і Сталін у Горках», пасля па сутнасці суцэльнай забароны жывога слова і жывой думкі — Хэмінгуэй і Рэмарк, Олдынгтан і Дос-Пасас, Салжаніцын і Залыгін, Брыль і Быкаў, займелі зноў літаратурныя і чалавечыя правы Уладзімір Дубоўка і Ян Скрыган, Анна Ахматава і Марына Цвятаева... Пачалі з'яўляцца і згадвацца творы Сент-Экзюперы, Сартра, Камю, Ануя, Гамсуна, Както... З'явіліся фільмы Дэ Сіка, Феліні, Уайлера, Фішэра, Стэнлі Крэмера, Марселя Карнэ, Лукіна Вісконці... З цэлым гуртам зорак: Жан Габэн, Ален Дэлон, Жэрар Філіп, Жан Марэ, Сімона Сіньярэ, Бэт Дэвіс, Анук Эмэ, Марлен Дзітрых, Марына Уладзі, Віўен Лі, Одры Хэпбёрн, Грэгары Пэк, Максіміліян Шэл...

Мы глядзелі «Ляцяць журавы» Р. Калатозава і «Баладу пра салдата» Р. Чухрая, «Гамлета» Р. Козінцава і «Звычайны фашызм» М. Рома. З'явіліся новыя творы А. Твардоўскага. Усіх скалануў «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» А. Салжаніцына. Пачалі друкаваць І. Буніна... Пісаў сваю новую прозу В. Катаеў: «Святы калодзеж», «Трава забыцця»...

Пасля бясконцых рэпрадукцый «Раніцы ў сасновым лесе» (на ўзроўні клішэ на цукерачных абгортках) мы захлыналіся «Гісторыяй імпрэсіянізму», кнігай Ліянела Вентуры «Ад Манэ да Латрэка», публікацыямі пра Пабла Пікаса і Сальватора Далі... Хапалі, як гарачыя піражкі, польскую прэсу, пільнавалі «Иностранную литературу» і «Новый мир».

У Саюзе візітавалі замежныя зоркі Іў Мантан і Жэрар Філіп... А Гелена Лаўбалава ў Мінску, у атракцыйнай чырвонай сукенцы, фацэтна какетавала галаском з мілым акцэнтам: «Крьасную рьозочьку, крьасную рьозочьку я тебье дарью...» На рэнтгенаўскую плёнку запісвалі Булата Акуджаву і Уладзіміра Высоцкага... Зачытваліся Максімам Багдановічам, адкрываючы сабе наноў гэтага «хрэстаматыйнага» паэта. Даведваліся пра тое, што ў беларускай культуры былі Браніслаў Тарашкевіч, Мікола Шчакаціхін, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, Ядвігін Ш., Зоська Верас, Антон Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі, Язэп Лёсік... Але тут дзверы зачыняліся. Нельга, не дазволена, не пажадана.

Канец 50-х — пачатак 60-х... Ілюзіі, надзеі, спадзяванні...

Было вернута права на лірыка-філасофскую прозу. На інтымную тэму. На камернае, так бы мовіць, светаўспрыманне. Хаця ўвесь час афіцыйная перавага аддавалася эпахальнаму, маштабнаму, падкрэслена сацыялагічнаму. І ўсё ж... З'явіліся новыя творы Янкі Брыля, Юрыя Нагібіна, Валянціна Катаева. Пачыналі пісаць Юрый Казакоў, Георгій Сямёнаў, Андрэй Бітаў, Міхась Стральцоў, Уладзімір Караткевіч.

Падавалі — упэўнена і па-ранішняму свежа — галасы Рыгор Барадулін і Анатоль Вярцінскі, Яўгеній Еўтушэнка і Андрэй Вазнясенскі, Бэла Ахмадуліна і Вера Вярба (славутых сёння Іосіфа Бродскага, Уладзіміра Сакалова мы прачыталі пазней).

Было вернута права на скепсіс. На іронію. На парадаксальнае мысленне. Абнаўлялася рэчаіснасць, рабілася іншай літаратура. Дарэчы, не толькі ў разварушаным ідэёвымі віхурамі Савецкім Саюзе. І там, на Захадзе, з'явілася так званае раз'юшанае пакаленне: Джон Уэйн, Джон Осбарн, Джон Портэр. Там быў абвешчаны антыраман: Наталі Сарот, Алан Роб-Грые, Мішэль Бютор. Зноў па ўсім свеце пайшла мода на парадоксы Бернарда Шоў і Оскара Уайльда, усе сцэны былога сёння Soviet Union бралі ў палон «Варшаўская мелодыя» Л. Зорына (пра нешчаслівае каханне полькі і рускага) і «Двое на арэлях» У. Гібсана (таксама — гісторыя кахання), праўда, гэта крыху пазней.

А ў сярэдзіне 50-х юнака са Слаўгарадчыны, з вёскі Сычын у горадзе Мінску сустрэлі сінкопы яшчэ мала дазволенага ў нас джаза, хаця рытмы класічнага дыксілэнда паўсюдна ўжо рваў на часткі пераможны рок-н-рол. На пляцоўцы ж паміж інтэрнатамі ўніверсітэта на Бабруйскай і хімічным і фізічным карпусамі акуратна вальсавалі «шэрачка з машэрачкай» учарашнія дзесяцікласніцы, смела падтоптвалі падэшвы вальс-бастонамі спрактыкаваныя танцоры, старанна-зухавата пераміналіся з нагі на нагу ўрбанізаваныя «элементы», рытмічна млелі ў танга парачкі. «Домино, домино, будь весёлым, не надо печали», — гнаў распеўна радкі узмацняльнік. «Ты ходишь в галстуке, ты куришь сигареты», — вясёла ці то папракаў, ці то канстатаваў нехта борздзенькім рытмам; пераможна-няголасна грымела: «Мишка, Мишка, где твоя улыбка...» А на юрфаку, дзе месціўся з канца 50-х і філфак (журналісты былі ў яго складзе), адбывалася нешта і зусім па тым часе забароненае: мясцовы аркестрык жвава «выдаваў» рэпертуар Элвіса Прэслі і Дзіна Рыда. І энергічна куляліся, скакалі юрысты, філалагіні, журналісты — ажно да вялікага гневу мясцовых камсамольскіх уладаў. Якія, дарэчы, у суполцы з рознымі актывістамі вялі цяжкія «ідэалагічныя» баі: якую шырыню павінны мець штаны ў савецкага маладзёна, і як гэная шырыня адбіваецца на ягоным інтэлектуальным узроўні і патрыятычных пачуццях.

А насупраць філалагічна-юрыдычнага корпуса была наша сапраўдная alma mater — Ленінка. Дзе мы і набывалі па праграмах, а больш самапасам, адукацыю. Чыталі класікаў і няклясікаў. Здаецца, Міхась Стральцоў Ленінку не вельмі наведваў, любіў спасцігаць мудрасць у больш камфортных хатніх умовах. Як і не быў зацятым танцорам. Але... і ён, і яго героі жылі ў тым часе. Дзе былі тыя ж захапленні, тыя ж гукі, тыя ж кнігі. А магчыма, больш неяк згадваецца ягоны «Свет Іванавіч, былы донжуан», яго герой-равеснік: «Недзе на трэцім курсе я адпусціў доўгія валасы — тады гэта было можна. І падняў каўнер курткі — гэта таксама, здаецца, лічылася, што няблага. Тады катастрафічна, увачавідкі вузелі ў хлопцаў штаны, затое так прасторна было плячам пад шырачэзнымі пінджакамі. Праўда, гэта ўжо мяне не датычыла. Доўгія валасы — няблага. І падняць каўнер — таксама. Я чытаў тады французскія раманы. Эміль Бландэ, Люсьен Рубампрэ... Галантны век, дасціпнасць. І скепсіс».

У кожнага з нас быў свой час спасціжэння «Страчаных ілюзій». Я праглынула 13 тамоў Бальзака, якія толькі што выйшлі з друку, карычневыя асобнічкі адзін да аднаго, недзе ў 9 класе, — прыблізна тады ж Стэндаля, Уайльда, Шоў, герой Міхася Стральцова — на трэцім курсе. Некалі прачытаў іх і сам Стральцоў. Наша пакаленне адкарасквалася ад бабаеўскіх і кочатавых, мы мелі інтарэс да замежных раманаў: Рамэна Ралана, Томаса Мана, Ражэ Мартэна дзю Гара, Джона Галсуорсі... І тыя самыя раманы Філдынга, Дыкенса, дзе «шматпакутныя героі пад эпілог сыходзіліся на ласкавы агонь камінка. За апушчанымі шторамі выў халодны восеньскі вецер. Камінак быў узнагародай. Цаной былой неўладкаванасці і нягод». Ва ўніверсітэцкі і пазнейшы час пра ўсё гэта мы, як і герой Міхася Стральцова, згадвалі з іроніяй. Самаіронія рабілася зброяй самаабороны, пафас быў «прыладай» састарэлай і штучнай.

У польскай перыёдыцы мы чыталі Пруста і Кафку. Тата Хэм, Олдынгтан, Эрых Марыя Рэмарк, Скот Фіцджэральд, — іх героі нішчылі ўсе ўяўленні пра свет і пра нас. Адгортвалі старонку кнігі і чыталі: «А потым што мы рабілі? — спытаў ён».

Ніякіх табе тлумачэнняў, апісанняў, прэамбул. Мы адчувалі на сабе ўздзеянне таго самага таямнічага падтэксту, разуменне якога пазней зацягалі, заштампавалі, а ў нас, у Беларусі, так і не ўспрынялі, беручы пад увагу як адзіна магчымую, так бы мовіць, нацыянальную школу — апісальна-крытычны рэалізм, падрабязны, непаспешлівы, грунтоўны. Толькі так, усё астатняе ад нячыстага. Праўда, Міхасю Стральцову непадобнасць яго неяк даравалі. Ён пачынаў, не «расцякаючыся думкаю па дрэве»: «У тэлефоннай будцы былі двое, і я ненавідзеў іх». Вы не знойдзеце такога пачатку ні ў каго з ягоных літаратурных равеснікаў. Хаця да ўсіх прыйшла літаратура, якую даўно ці наогул не друкавалі ў Саюзе. Хаця ўсе былі «дзецьмі XX з'езда», «дзецьмі вайны», амаль усе — «з хат».

Але вось гэта было канкрэтнай і агульнай рэаліяй для ўсіх: партрэт «бацькі ўсіх народаў» пыліўся ў інтэрнацкай шафе-кладоўцы. Рэаліяй, што давала, аднак, магчымасць думаць па-рознаму, успрымаць па-рознаму. Было такое ўяўленне падчас чытання Стральцова — у нечым гэта аб'ектыўная, а ў нечым суб'ектыўная рэальнасць. Таму што час, палітычныя абставіны Стральцоў пазначаў толькі штрышком. Яны прысутнічалі, і досыць відавочна — скажам, адзін лапаць, адзін чунь з яго аднайменнай аповесці: рэаліі і ваеннага, пасляваеннага часу. Але яны — толькі штуршок для аповеду. Ён экзістэнцыяльна ўспрымаў свет і падзеі — у яго ў цэнтры ўвагі асоба, чалавек. Астатняе — фон: гістарычны, сацыяльны, падзейны. Абставіны рэчаіснасці. Якія ён умеў пазначыць кароценька і трапна. Не любіў сумна-сумленна расцягваць на безліч старонак. «Я — малафарматнік», — гаварыў ён. Крыху пацвельваючыся.

Хлопец з вёскі Сычын меў прыроджаны тонкі, дыхтоўны густ. Адразу займеў арыентацыю на сучасны ўзровень мыслення і пісьма. Хаця любіў і ведаў і «гудлівыя строфы» Эсхіла і Піндара, і «літургійна суладнае і прыгожае» Сярэднявечча, і высілкі «нястрымнага розуму» новага часу. І, дарэчы, нейкую асаблівую звабліваcць мелі для яго паэты пушкінскай пары, і сам «абраннік сонечнага Феба», і «сядзібная культура» XIX стагоддзя. З XX стагоддзем адносіны ў яго былі

ўважліва-складаныя. Ён падоўгу трымаў кніжкі, што браў у мяне: Ж. П. Сартра («Экзістэнцыялізм — гэта гуманізм», «Словы», «П'есы»), Тэяра дэ Шардэна («Феномен чалавека»), Бертрана Расела («Гісторыя заходняй філасофіі»), Ражэ Гарадзі («Рэалізм без межаў»), Самарыя Велікоўскага («Канты «няшчаснай свядомасці»).

Гэта, праўда, было ўжо ў 70-я, 80-я гады. А на тую маладую пару яго не абмінулі, здаецца, усеагульныя «ідалы». Згадаем хаця б у «Дні ў шэсцьдзясят сутак» — «Сцеражыцеся рыбылоцмана!» Назва раздзела «паўночнага дзённіка», увесь гэты раздзельчык, «адступленне літаратурнае» — пра Хэмінгуэя. Пра рыбаў-лоцманаў, што цікавалі і за Хэмінгуэем, і за Чэхавым (Стральцоў прыгадвае тут яго). Мы, мабыць, можам дадаць — і за самім Стральцовым. І пра тое, што «літаратура была для яго, Хэмінгуэя, адным з даступных чалавеку сродкаў сцвярджаць сваю годнасць», і пра тое, як яго «брала ў палон даведзеная да самай звычайнай рэальнасці ілюзія перададзенага словам жыцця». І... і... Стральцоў меў жыццёвыя і літаратурныя прыхільнасці свайго пакалення: той яго часткі, для якой ён пісаў. Ці чытала яна яго? Пытанне няпростае. І пра гэта крыху пазней. А тады, мабыць, і Стральцова, як усіх нас, вабіла нязвычнасць, нязмушанасць, натуральнасць герояў Хэмінгуэя, інтрыгаваў стыль іх жыцця. Жалезная заслона толькі-толькі скрогатна і цяжка адчынялася. А героі Хэмінгуэя сёння — у Парыжы, заўтра — на боі быкоў у Памплоне, паслязаўтра — на сафары ў Афрыцы. І на вайну глядзелі інакш — не так прасталінейна, як большасць нашых суайчыннікаў. І стаўленне да высноў жыцця ў іх было іншае. Іх светаўспрыманне было для нас навіной, адкрыццём.

Для пакаленняў старэйшых гэта сталася, так бы мовіць, магчыма, чарговай модай, паўторам трыццатых гадоў (шмат што друкавалася ў «Иностранной литературе» — Хэмінгуэй, Дос Пасас). Для нас — не тое каб сталася найноўшым катэхізісам, аднак вельмі ж успрымальным ракурсам рэчаіснасці. Яны так выйгравалі ў параўнанні з пастулатамі сталінскага афіцыёзу. Мы ўзбройваліся скепсісам Генрыха Бёля і Эрыха Марыі

Рэмарка: «бліскуча замілаванае нішто, уталентаванае ў сваёй нікчэмнасці»; «хто ні на што не спадзяецца, той не будзе расчараваны»; «толькі не прымаць нічога блізка да сэрца. Тое, што прымеш, маеш намер утрымаць, а ўтрымаць нельга нічога». Мы адпрэчвалі плакатна-пустазвоннае ўчора і сёння. Мы прагнулі адкаснуцца ад стэрэатыпаў рэжыму.

Вызваляліся ад пафасу бацькоў і дзядоў, ад ілжэідэалогіі, ад ілжэідэалаў: пагарджалі наменклатурнымі чыноўнікамі, іранічна-скептычна ставіліся да афіцыёзу. Мы вышэй за ўсё лічылі звычайныя чалавечыя адносіны, шанавалі перавагу інтэлекту і таленту, але не перавагу пасады. Не мелі пашаны да маёмасці. Пра грошы гаварыць не было завядзёнкі. Спытаць — колькі зарабляеш? — было пачварна ганебным тонам.

Адкуль жа ўзяліся чыноўнікі? Што вы рабілі падчас застою? Як пазначылі дваццацігоддзе ад сярэдзіны 60-х да сярэдзіны 80-х? Такія пытанні давялося пачуць нам у другой палове 80-х.

Дарэчы сказаць, высокія чыны ўвогуле мала хто займаў з нашага пакалення. Калі займалі — досыць позна. Напачатку лічылася — занадта маладыя, «сталінская гвардыя» моцна трымала пазіцыі, сядзела ва ўсіх чыноўніцкіх крэслах гэтак жа цвёрда, як у крамлёўскіх. «Не магу без працы» — гэта было праўдай, гэта было і трагедыяй. Было трагедыяй таго пакалення — і наступных. Ці не ў першую чаргу — нашага. Бо калі прыйшоў да ўлады Гарбачоў, было пазначана спачатку неаспрэчна: старыя — у архіў. Хаця крыху пазней наша пакаленне паказала сябе вельмі актыўным, вырашальна актыўным — і падчас так званай перабудовы, і падчас пазнейшых падзей. Але гэта ўсё «рэплікі ўбок», як пазначаюць драматургі. Большасць — не імкнулася да пасад. «Не прымяраў мундзіраў», — гэтак пра сябе мог сказаць не толькі Рыгор Барадулін (яго словы), а і Уладзімір Караткевіч, і Васіль Сёмуха, і Арсень Ліс, і, безумоўна, Міхась Стральцоў. «Для пісьменніка няма іншай кар'еры, акрамя творчай», — словы таго ж Хэмінгуэя. І яно заўсёды было так, ва ўсе часы. Але на нашу пару — пачынаючы ад 30-х гадоў — адукаваныя мецэнаты зніклі, за кіраўнічыя сталы траплялі вельмі рэдка людзі дасведчаныя і талерантныя, звычайна — з трафарэтным

і ваяўніча выпрастаным уяўленнем. Хаця — літаратурнаму пакаленню Стральцова пашанцавала: у «Полымі» на пачатку іх літаратурных спроб быў Максім Танк, у «Маладосці» — Пімен Панчанка. Прозу Стральцова дабраслаўляў Янка Брыль. Аднак — у выдавецтве, што выпускала мастацкую літаратуру, тады рабілі дырэктарамі С. Майхровіч і З. Матузаў. Гэта пры іх грамілі і рассыпалі набор твораў Уладзіміра Караткевіча. Гэта пры іх рассылаліся загады і вердыкты — што можна, што трэба і што не трэба пісаць.

Міхась Стральцоў выбраў сабе шлях, які ў 60-я, 70-я гады ніхто не забараняў і ніхто асабліва не заахвочваў. Не лаялі, а так, пашкрэбвалі словам: немаштабна, камерна, неактуальна. Лірычна-філасофская проза. Крытычная проза. Пазней — паэзія. Тут было выратаванне. Тут была трагедыя.

Наша пакаленне ў відавочныя маразы пасля «адлігі» «залегла» ў рамантычна-апалітычны дрэйф. «А я еду, а я еду за туманом, за туманом, и за запахом тайги», — гэтую немудрагелістую мудрасць, хай даруюць мне таўталогію, падхапілі невыпадкова. Бегчы было яшчэ магчыма. І не толькі за мяжу (гэта было досыць складана, між іншым). Хаця, зразумела, выяўлялася, што ў тайзе або каля праліва Лаперуза тое ж самае, што ў роднай Беларусі ці дзе-небудзь у так званай сярэдняй паласе нашай былой неабсяжнай. «Вясёлую планету» Калыму, здаецца, так актыўна ўжо не асвойвалі, аднак трапіць у псіхушку ці проста ў спісы нядобранадзейных было вельмі проста.

Узварухнулася, абудзілася была надзея на аднаўленне, калі не Адраджэнне, беларускасці — і пайшла пад лёд пасля «адлігі». Адлучэнне ад беларускага ішло неўпрыкметку нібыта, але запланавана, няўхільна. Паводле прадпісанняў і тэорый пра адміранне нацый. З'явіліся «ліберальныя» паслабленні: хочаш — вучы, не хочаш — не вучы. У навучальных установах знікала мова. На ўсіх узроўнях. Забываліся на мову тыя, хто яе ведаў: нашы равеснікі. Які ж інжынер, якая лекарка мелі нармальную магчымасць гаварыць па-беларуску? Пісалі пра нашу мову Уладзімір Караткевіч, Рыгор Барадулін, даводзілі выдатныя ўзоры літаратурнага існавання яе Вячаслаў Адамчык, Іван

Чыгрынаў, Анатоль Кудравец. Пакутна раздумваў пра «загадку Шамісо» Міхась Стральцоў у «Загадцы Багдановіча». Тут было выратаванне. Тут была трагедыя. У канцы 80-х гэтае пакаленне папракалі. Шмат. Жылі ў застоі. У турму не ішлі. Штандар нязгоды не выкідвалі. На мітынгі не выходзілі (далёка не зайшлі б, між іншым). Адным словам, мелі нахабства — існавалі. Паслухмяна запісвалі ў анкеты: «не быў», не ўдзельнічаў», «не маю»... Так.

І захоўвалі свабодны дух. Хаця «ламаліся» нашы равеснікі, тыя, хто нарадзіўся ў канцы 30-х — пачатку 40-х, часцей, як больш старэйшыя ці маладзейшыя. Адны, старэйшыя, набылі жыццёвага вопыту і маўклівага скепсісу яшчэ пры «правадыры ўсіх народаў». Маладзейшыя — набывалі імунітэт самазахавання ў брэжнеўскія часы. Мы, загартаваныя ў дзяцінстве лозунгамі накшталт «За справу Леніна-Сталіна будзьце гатовы!» — «Заўжды гатовы!», у гады сталення і ўзроставага максімалізму паверылі «назаўсёды»: культу асобы не будзе, таталітарызму не будзе, хлусні не будзе... Рамантызм, высокія ідэалы, іронія, скепсіс, вера і нявер'е — усё перакруцілася ў няпросты скрутак. А тут пачалося — інверсіі, эўфемізмы: «быў рэпрэсаваны», праз пару гадоў — «трагічна загінуў», яшчэ праз нейкі час — дабрачынна «памёр». Пра ўсіх ахвяр 30-х гадоў. Прывучаныя да аскетызму як да нормы жкцця, існавання, мы бачылі, што гэтыя прынцыпы ў пару «развітога сацыялізму» не маюць цаны, увогуле пачаліся масавыя «абмены» — купля-продаж на масавым, прымітыўным, і нейкім бессаромна-танным узроўні.

Праўда, можна было цешыць сябе «маленькімі радасцямі»: чытаць кнігі (яны былі досыць таннымі, і з'яўлялася многа цікавага), хадзіць у тэатр (у 60-я гады быў сапраўдны тэатральны бум), слухаць музыку (сур'ёзныя, класічныя творы былі не толькі ў пашане, былі ў модзе — неблагая мода), хадзіць у кіно (а глядзець было што — фільмы Бергмана, Антаніёні, Андрэя Таркоўскага). Дарэчы, прыканцы 50-х, у 60–70-я гады мы слухалі Святаслава Рыхтэра, Эміля Гілельса, Давіда і Ігара Ойстрахаў, Віктара Траццякова — білеты былі недарагія, а паз-

нейшага абавязковага блату было не трэба: білеты набываліся проста ў касах. Мы слухалі Баха, Моцарта, Шапэна, Шумана, Паганіні, Вівальдзі... А Брамса і Ліста выконваў выдатна наш менскі філарманічны аркестр. Дырыжыраваў — як дырыжыраваў! — Віктар Дуброўскі.

Можна было прыдбаць новыя туфлі, з'есці смачных цукерак, паспрабаваць паехаць за мяжу, дыхнуць «пылам стагоддзяў» (гэта было досыць складана, але магчыма). Пайсці ў кавярню, выпіць кубачак кавы, келіх віна. Адчыняліся сімпатычныя кавярні, якіх раней не было (на тую пару, калі я пішу — у 1991–1992 гадах — кавярні робяцца прытулкам для... не, не для эліты, для абраннікаў, так бы мовіць, Мідаса — праўда, модны сучасны Мідас мае палёгку: можа пераствараць і наадварот: золата ў рэчы і рэчывы).

Шмат было дробязных і менш дробязных і вызначальных — «прывілеяў», што былі даступныя кожнаму. На побытавым узроўні. На свядомасным.

Можна было колькі хочаш раздумваць пра лёс свой. Лёс народа. Шляхі чалавецтва. Тут было выратаванне. Тут была трагедыя.

Сёння, калі я пішу гэтыя радкі, вельмі модна выдаваць сябе за ахвяру рэжыму, пакутніка. Нават тым, хто няблага ўладкоўваўся ў розныя часы. Не быў ані бедным, ані ніцым.

Міхась Стральцоў не выдаваў сябе за пакутніка. Не адчуваў сябе ім. Не быў ніколі прыстасаванцам. Жыў у рэчаіснасці. І ў свеце, створаным ім самім. У той рэальнасці, што ён назваў — «Мой свеце ясны». Беларускае слова для яго было натуральным, сваім, нязмушаным. Ён не змагаўся за яго. Ён жыў ім. Душу свайго народа адчуваў глыбінна, сутнасна. Першаіснасна. Высловіў гэта. Непасрэдна — больш у «Загадцы Багдановіча», апасродкавана — ва ўсіх сваіх творах. Ці адчуваў трагедыю беларускага слова? Безумоўна. Як змагаўся за яго? Адпаведна з прыродай свайго таленту і чалавечай натуры.

Пра творчасць, пра творчую асобу думаў заўсёды. Не толькі пра літаратараў.

1990

Таццяна Арлова

Грустные улыбки XX века

Наше общение с Мишей Стрельцовым я могу разбить на три периода. Мы поступили в один и тот же год на отделение журналистики филологического факультета БГУ и проучились рядом пять лет. Второй период был более длительным, вплоть до 1980 года, и прошел, как в тумане. Каждый был занят своими личными проблемами. Третий период — снова короткий, до Мишиной смерти в 1987-м, но эти недолгие годы мы дружили тесно и ежедневно общались хотя бы по телефону.

Небольшое наше студенческое сообщество в год поступления — 1954-й — обнаружило в своей среде мощных литераторов. Они пришли поступать на журналистику со стихами и рассказами, а спустя какое-то время о них говорили, как о новом сильном поколении белорусской литературы. Наш курс в дальнейшем называли звёздным, одним из самых одарённых в истории белорусского журналистского образования. Посудите сами. Здесь были поэты Генадь Буравкин, Василь Зуёнок, Юрась Свирка, Сымон Блатун. Пробовали себя в прозе Коля Гилевич, Анатолий Силенков, Александр Станюта, Володя Скапа. С нами рядом постоянно были Рыгор Бородулин, Борис Саченко, Иван Сипаков. К младшеньким присоединялись старшекурсники Иван Чигринов, Иван Пташников. Со студенческих лет прозвали академиком нашего товарища Адама Мальдиса. Вскоре было трудно различить, кто где учится. Мы считали своим даже Владимира Короткевича.

Я не называю других своих однокурсников, которые тоже серьезно занимались литературой и стали хорошими критиками. Не все готовили себя для журналистики. Но все мы жили очень насыщенной интеллектуальной жизнью. Постоянно обсуждали, кто и что написал в Беларуси и соседней России. Спешили увидеть, услышать, окунуться в городскую жизнь. Ребята, что приехали из деревни, с фанатизмом ходили в театр и кино, продвигались в профессии семимильными шагами.

Интересно, что коллективный характер времени не разделял нас по принадлежности к домашним и общежитским, обеспеченным и не очень, городским и деревенским, по национальности и языку. В принципе, мы все были идеологизированны, мало успели повидать и узнать, с любопытством бросались в неизведанное и недоступное. Для нас Михась Стрельцов очень скоро стал авторитетом. Он первым среди нас стал писать как-то необычно. Не так, как мы читали и как нас учили. Я говорю о прозе. В поэзии, безусловно, в эти годы лидировал Бородулин. Миша как-то сразу перестал ходить в начинающих. И рано начал печататься в серьёзных журналах.

Наши споры, интеллектуальная жизнь, конечно же, сопровождались вечным студенческим ритуалом: сдвинутые столы в общежитиях, лавочки в парках. Особенно насыщенной жизнь была на студенческой картошке. Лёгкие романы, дешёвое вино, ночные прогулки под луной. Картошка летела в корзину под сопровождение стихов.

Со студенческих лет за Мишей закрепилось прозвище «Мишель-вермишель». Макаронный продукт прилепился случайно, беспричинно. А вот «Мишель» возник неспроста. Молодой, сильный, красивый парень выделялся не только своей скромностью, но и молчаливой улыбчивостью, и непонятно откуда взявшейся интеллигентностью, что у многих в то время ассоциировалось с мужчиной-иностранцем. Это, кстати, замечали в отношении к себе девчонки. Кажется, за свою жизнь Миша так и не успел побывать за рубежом, но вёл себя иногда будто прошерстил парижские бульвары. Особенно когда начинал рассуждать и спорить. Он стремительно набирался знаний и умения себя вести. Говорил, что это от его отца-учителя.

Высокую культуру и интеллигентность сельского парня замечали многие. Эту особенность личности Михася отметил Янка Брыль. Несмотря на двадцатилетнюю разницу в возрасте, они дружили. Как критики. Как писатели. В 1967 году Михась отметил свое тридцатилетие. Брыль посвятил ему статью с точным названием «З добрай, сумнай усмешкай». У Миши действительно всю жизнь была особенность улыбаться по-доброму

и чуть печально. Брыль писал так: «Проза гэтага пісьменніка лірычная ў самым высокім значэнні гэтага паняцця, яна безумоўна адтуль, дзе пачынаецца сапраўдная літаратура. Пра што б, пра каго б ні пісаў Стральцоў, на кожнай яго старонцы я перш за ўсё бачу аднаго і галоўнага героя: абаяльны вобраз самога аўтара, чалавека высокакультурнага і сардэчнага, з позіркам вострым на праўду і няпраўду, інтэлігента з народных працоўных нізоў, які няблага засвоіў нялёгкую і складаную мудрасць часу. Шчыры чалавек, відушчы пісьменнік ідзе па жыцці з добрай і сумнай усмешкай».

Стрельцов не остался в долгу и к пятидесятилетию Брыля написал статью «Словы ўдзячнасці», называя старшего коллегу своим учителем. Чуть позже Брыль с восторгом анализировал повесть «Адзін лапаць, адзін чунь», пожалуй, одно из самых ярких событий белорусской литературы XX века: «Гэта — глыбока адчутая і да шчымлівай радасці сардэчна пададзеная паэзія дзіцячай чысціні, пракляцце вайне, гімн чалавечнасці». И здесь же старший товарищ замечает важный поворот в творчестве нашего Мишеля: «Я не спяшаюся гаварыць пра ягоныя поспехі ў вершах. Затое апошняя яго праца, эсэ «Ад Максіма кніжніка пачатак...», падабаецца мне плённым спалучэннем вобразнасці, думкі, спалучэннем мастацкай прозы і крытычнага даследвання — на мяжы высакаякаснага жанравага сплаву, вельмі рэдкага ў нас і вельмі патрэбнага. Верыцца — тут будзе ў М. Стральцова толк».

Мы закончили университет в 1959 году, и пути-дороги стали расходиться. Работа в журналистике. Те, кто работал в Доме печати, встречались часто. Миша работал в газете «Літаратура і мастацтва». На выселках. Иногда встречались на улице или на каких-то мероприятиях. Обменивались ничего не значащими словами. Я слышала, что у него были проблемы в личной жизни. Его стала одолевать традиционная славянская болезнь. Иногда он был слишком возбуждённым или со стеклянным отсутствующим взглядом. Но, кажется, в этот период много успел написать. О нём постоянно говорили литературные критики.

В те 60-е и 70-е однокурсники не терялись, а продолжали радоваться успехам друг друга и читали, много читали. Карьерное продвижение, честно говоря, не очень волновало. На наших теперь уже нечастых сходках однокурсников он не появлялся. Его «Загадка Богдановича» стала для многих из нас настольной книгой. Он раздаривал её щёдро и не жалея красивых слов-автографов. Позже я поняла, почему мы, однокурсники, так полюбили эту книгу. Нас учили заниматься журналистикой. Самым желанным и недоступным жанром было эссе. Все мы хотели писать эссе, а редакторы требовали репортажи и корреспонденции. Миша написал свою «Загадку...» как эссе и этим покорил всех нас. Что называется, прорвался к журналистской свободе через литературу.

Значительно позже «прорвалась» и я. Стала тоже писать эссе, и мы с Мишей вдоволь наговорились на эту тему. Но это все произошло позже.

Мы стали активно общаться после 1980 года, потому что подружились семьями во время зимних и весенних школьных каникул, когда с детьми на нелелю-другую выезжали в Дом творчества писателей «Каралищевичи». Старая просторная деревянная дача Якуба Коласа удивительно сплачивала всех, кто там собирался. При минимуме удобств максимум свободы. Почти полный отрыв от цивилизации, лесные засыпанные снегом дороги, замёрзшее озеро, щёдрый щенячий приплод — маленьких дворняг все тайком старались затащить в комнаты.

У наших детей Алеси и Мити почти не было возрастной разницы. Мой муж, актёр, режиссёр, поэт Евген Шабан был своим в окружении друзей Михася. Мишина жена Елена — на редкость коммуникабельный человек — легко объединяла своим потрясающим юмором и хозяйскими умениями. Мы стали бывать у них. Они — у нас. Кажется, в 1984-м они жили у меня на даче в Ждановичах. Мы ежедневно переговаривались по телефону. Советовали друг другу, какие книжки почитать, что посмотреть.

Когда у Миши в кармане появлялись деньги от гонораров, он шёл домой через книжные магазины. Приходил с пустым

кошельком и стопкой книг. Случалось, что, не сговариваясь, покупал и на мою долю что-то интересное. Я никогда не отказывалась, потому что Миша всегда попадал в точку, угадывая, что мне могло бы быть любопытно.

Тогда, в восьмидесятых, пройдя лечение, пережив тяжёлую моральную травму, наш Мишель словно вернулся к нам заново. Старых приятелей стал узнавать и общаться. Бывал в компаниях, но рюмку прикрывал рукой. Он много читал и писал. Каждый вечер часами по телефону разговаривал с близкими по духу писателями. Зачитывал Бородулину свои строчки, выслушивал его. Однако вокруг него сразу же появились литературные вампиры. Кто-то одолевал пустыми разговорами. Кто-то подсовывал стихи для квалифицированной правки. Кто-то, даже зная, что Стрельцов не пьёт, стремился его угостить водочкой и как-то использовать. Михася это злило, но по своему характеру он не умел категорично и решительно сказать «Нет!».

Он очень подружился с моей мамой, бывшей актрисой, расспрашивая её о той жизни и той среде, которой не знал вовсе — о России первой половины XX века, о Шаляпине, Демьяне Бедном, Михаиле Чехове, которых моя мама знала лично. Помоему, у них даже образовались собственные секреты. Они много острили и смеялись.

Это короткое время нашей тесной дружбы было наполнено юмором.

Он неохотно выползал из дома. В это время особенно стал ценить уют и семейное тепло. Завёл собачонку, которой дал кличку Лиска. Прогуливался с нею по бульвару на своём проспекте Притыцкого. Собачонка часто отлучалась. Миша шёл, думая о своём, и мог вернуться домой без собаки.

У него было пальто с рыжеватым меховым воротником, и мы часто подшучивали: не пустил ли он свою рыжую собачонку на воротник.

Наше сознание не всегда способно управлять нашими эмоциями. Удерживая себя в цивилизованных рамках, мы иногда начинаем представлять отдельные ситуации, стирая грани между событиями реальными и нафантазированными.

Не люблю вторгаться со своими воспоминаниями в чужие компании. Есть люди, которые намного теснее общались с Мишелем, и, наверное, многое из рассказанного мною им не понравится. Мы со Стрельцовым были уходящей навсегда натурой советской жизни и отлично понимали, что такое ностальгическая тоска по некой потерянной общности. У нашего поколения точка отсчета — шестидесятые, семидесятые годы, мир советской романтики.

Это позволяет мне вполне субъективно вспоминать Мишу с добрым чувством тихой радости. Понимаю, почему в последние годы его жизни мы так близко и так быстро сошлись. Наверное, было желание компенсировать этой стремительностью долгое неведение друг о друге. Неважно, что он рос на селе, а я на московском асфальте. Оказалось, что мы читаем одинаковые книжки и одинаково смотрим на мир и события. И этим оказались интересны друг другу.

В 2011 году появилась книга нашего однокурсника Саши Станюты «Сцены из минской жизни». Он тоже вспоминает нас всех и Мишу Стрельцова. В чём-то наши мысли перекликаются, наше восприятие людей и времени. Как с ним не согласиться, что можно понимающе молчать на языке одного возраста, что пережитое не тает, как облако, не рассыпается, будучи перенесённым в другое место и в другое время, потому что это живой мир со своим собственным временем и пространством, замкнутый и самодостаточный.

Мише всегда было легко на природе. Я в этом убедилась, когда он гостил у меня на даче. Наш маленький домик был пригоден только для спанья. Вся жизнь происходила в саду, в лесу, на речке. Мишель даже что-то плёл про свою болдинскую осень. Наверное, ему неплохо работалось и без кабинета с письменным столом. Он вместе с детьми охотно обживал окрестности. По вечерам что-то быстро записывал.

В этот период Мишель стал очень интересоваться театром. Конечно, прежде всего, Купаловским. Там среди актеров было у него несколько друзей. Особенно тесно он дружил с Пашей Дубашинским и Фомой Воронецким. По хорошему

совпадению это и мои друзья. Часто общался с режиссёром Валерием Раевским. В 1971 году с ним они сделали телефильм «Па шчасце, па сонца» по стихам Янки Купалы. Задумали и начали работать над телефильмом о Максиме Богдановиче. Но что-то помешало.

В 1970-х, работая режиссером телевидения, мой муж Евген Шабан написал инсценировки произведений лучших современных ему писателей: Василя Быкова, Рыгора Бородулина, Анатоля Велюгина, Ивана Пташникова. И, конечно же, Миши Стрельцова. Снял телеспектакли, которые, несмотря на визуальную бедность (нехватка средств, плохая техника), были очень доброжелательно встречены белорусской интеллигенцией и публикой. Такая популяризация белорусской литературы сделала Шабана своим в среде литераторов, а со Стрельцовым у них даже возникли какие-то совместные проекты, которые, правда, не удалось осуществить. Когда в восьмидесятых годах Шабан был завлитом театра Янки Купалы, они снова сблизились, и Миша даже перевёл по его просьбе на белорусский язык несколько пьес.

Выступая на 75-летии со дня рождения Стрельцова, Фома Воронецкий говорил о том, что рассказы и повести Миши очень сценичны. И жаль, что театр пока не сделал из них спектакль. Когда Воронецкий работал в Академии искусств, каждый год на каждом конкурсе обязательно кто-нибудь из студентов брался за тексты Стрельцова. Выезжали со своими работами на конкурсы в Москву, Санкт-Петербург и привозили оттуда награды. Будет странно, если высокой культурой чувств и интеллекта Стрельцова, театральностью его рассказов русский театр увлечется раньше белорусского. Природа его таланта предназначена не только литературе, но и театру. Впрочем, я опять о своём, что мне особенно близко. Что делать, если из наших талантливых однокурсников только Мишель серьёзно увлёкся театром, и это нас сближало.

Один его человеческий поступок поразил и растрогал меня до слёз. Это было в 1983 или в 1984 году. Сейчас не помню

точной даты. Для меня это было очень трудное время. После внезапной смерти мужа надо было с сыном-подростком и матерью-пенсионеркой начинать жить по-новому. Резко ухудшилось здоровье. Денег не было. Остались долги.

Мише и нашему другу, блестящему театральному критику Георгию Коласу пришла в голову мысль провести меня в члены Союза писателей. В те времена членство в Союзе было не только престижно, но сопровождалось целым рядом льгот. У Союза была своя поликлиника, свой Дом творчества на Ислочи, возможность работать и отдыхать практически бесплатно раз в год возле Чёрного моря. Членам Союза регулярно оказывали материальную помощь. Стоит ли говорить о том, что вступить туда было непросто. Кажется, мне надо было пройти три высокие комиссии и собрать авторитетные рекомендации.

Эти рекомендации мне написали Стрельцов и Колас. Когда меня пригласили на первое чистилище, они темпераментно и высокопарно пытались убедить сидящих (а было там не менее двадцати человек), что секция критики и драматургии дальше жить не сможет без Татьяны Орловой. Там присутствовали Рыгор Бородулин, Василь Быков, Иван Пташников, Ничипор Пашкевич, Нил Гилевич. Естественно, тайным голосованием меня лихо прокатили.

Стрельцов выскочил из комнаты разъярённый и красный, как рак. В последующие дни он кому-то названивал и что-то писал. Уверял, что на следующем заседании всё будет нормально.

Наверное, через месяц меня пригласили на второе заседание. Опять прозвучали оды в мой адрес от Стрельцова и Коласа. Ситуация повторилась. Мою кандидатуру снова прокатили. Как позже сказал мне Иван Чигринов, незачем было так расхваливать. Никто не поверил.

Миша переживал из-за этого поражения намного больше, чем я. С самого начала я не очень-то верила в успех этой авантюры. Была какой-то отрешённой, равнодушной, а позже, когда проанализировала, поняла, почему меня не приняли и не

могли принять в Союз писателей Беларуси, но с Мишей своими соображениями не поделилась.

Очень расстроенный Миша Стрельцов даже вычислил тех, кто голосовал против. Не хватало всего-то трёх-четырёх голосов. Но Миша не назвал мне фамилии, хотя из любопытства я пыталась узнать.

В ту пору Миша работал в журнале «Нёман» и стал заказывать мне статьи. На тогдашние гонорары можно было жить. Более того, Миша стал меня рекомендовать всем журналам и в какие-то литературные проекты. Но я его надежды не оправдала. Не хватило работоспособности, может, смелости, может быть, чего-то ещё...

Умея много и упорно работать, Миша никогда никого не расталкивал локтями и даже, по-моему, панически боялся стать каким-нибудь, хоть маленьким начальником. Просто не знал и не понимал, что такое управлять подчинёнными. Да и себя никогда подчинённым не чувствовал. И слава Богу. Он пользовался своим достаточно привилегированным положением в журнале только для того, чтобы кому-нибудь чем-нибудь помочь. Лично для себя он никогда не умел подойти и что-то попросить.

Сейчас, когда мы с его вдовой Еленой Стрельцовой собираемся в их квартире со взрослыми детьми (у нас уже растут внуки) и прокручиваем, как киноленту, те времена, радуемся, что Господь даровал нам общение с Мишелем. Из потока утраченного времени выступают новые человеческие подробности, которые позволяют продолжать разговаривать со Стрельцовым и быть ему в чём-то подотчётным.

Очень прав Саша Станюта в своем категоричном заключении: «Для Михася Стрельцова сегодня всё было бы как раньше. И действительно, что бы он уже такое потерял? Звание, пост, лауреатство, место в президиуме или заграничную поездку? Не имел, не сидел, не ездил. Он был хорошим писателем и смог им остаться до сих пор».

Аляксандр Станюта

Астатняе — у маўчанні

...Ты вось кажаш: Стральцоў... Так, і Стральцоў таксама. Згодзен.

Але якая ж усё-такі жорсткая рэч — час! Як бесцырымонна аддаляе ён тое, што яшчэ ўчора было тваім!..

Так у мяне цяпер і з кнігамі Стральцова.

Як табе растлумачыць? У адной п'есе кажуць: «І гэта таксама пройдзе». Ну вось, прайшло, відаць, і гэта для мяне. І крытыка ягоная, і вершы... І апавяданні. Праўда, за выключэннем «Вепрука», амаль усяго. І некаторых стылістычных ходаў у «Лапці». (Напрыклад, галасы застолля, чутныя малому пасля глытка гарэлкі; або маналог дзеда Міхалкі.)

Астатняе ж... Так, сапраўды, прайшло — ну што ты зробіш? І сённяшнія кнігі Быкава, Брыля, — здавалася, бясспрэчных антыподаў. Ловіш сябе на адчуванні, што... Ну, словам, болей не расцеш на гэтым, разумееш?

Яно, канешне, і дагэтуль свеціць мне. Але ўжо не грэе. Восеньскае сонца.

Могуць спытаць: але чаму, чаму? Трэба ж даводзіць.

Нават не падумаю. Тут жа не інстытут літаратуры.

Проста такі выпадак. Асабісты. Ты перарос, ты вырас з нечага ці проста страціў штосьці ў тлуме, у карагодзе сваіх дзён, — гэта ўжо толькі твае праблемы.

Вось яго кніжкі на маіх паліцах. Стаяць, нібы чаго чакаюць. Адна, маленькая, танюткая, але ў дэрмаціне — «Загадка Багдановіча». На вокладцы — пытальнік.

Барыс Забораў быў мастаком той кнігі. Зараз ён далёка, у Парыжы. А Стральцоў — тут, у нас, у Мінску. На Чыжоўскіх могілках.

Мы пазнаёміліся ў пяцьдзясят чацвёртым, на першым курсе аддзялення журналістыкі тагачаснага філфака.

Гарэзлівыя дзеці горада, мы ўпершыню бачылі побач вясковых адналеткаў і бавілі з імі час.

Ветлівыя, але насцярожаныя дзеці вёскі ўпершыню сядзелі разам на занятках і бралі чарку ў інтэрнаце са сваімі гарадскімі знаёмцамі.

Асаблівага збліжэння не было. Прынамсі, першыя гады. Размаўлялі ўсе па-руску. Здаецца, нават і Грыша Барадулін, наш філфакавец.

У Стральцова знешнасць была невясковая. Вясковасці я ў ім не адчуваў.

Што ён прыкмячаў ува мне, не ведаю.

Ведаю толькі, што яго нічога не адштурхоўвала ў тагачаснай нашай, сказаць так, юнацкай гарадской культуры. Ейнымі ж рысамі былі: нефанабэрлівы гонар людзей сталічнага цэнтра, хоць і збольшага, але начытанасць і нейкая асаблівая, прывабная для нас сумесь знешняй інтэлігентнасці і гэткай элегантнай блатнаватасці. Яе пакінула ў нас школьнае пасляваеннае жыццё-быццё. Спярша фантасмагорыя распусных і вычварных гульняў, боек у руінах. Пасля — футбол, трафейнае кіно і джаз.

Мы пачалі неяк збліжацца са Стральцовым.

Я прывёў яго аднойчы да сябе. Ён глядзеў толькі на кнігі і маўчаў. Кніг было мала. Ён узяў двухтомнік «Маяковский. Театр. Кино» — і нават не гартаў, толькі трымаў на далонях новенькія тамы ў гладкіх вокладках. Цяпер я думаю, яму было ўсё роўна, хто там аўтар. Яму проста было прыемна браць у рукі кнігі, так...

І ён прывёў мяне аднойчы да сябе таксама. І мы пераначавалі ў пакойчыку яго інтэрната пасля рэстарана «Заря», што быў тады насупраць кінатэатра «Победа».

З ягоным прозвішчам я ніяк не мог звыкнуцца. Бо тады якраз грымнула такое ж прозвішча з Масквы па радыё, у футбольных рэпартажах — Эдуард Стральцоў. «Эдзік» — пісалі крэйдай у дварах на сценах. «Стральцоў» — чуў я ў нашай аўдыторыі, але адразу прыгадваўся той, каго ўслаўлялі тады на стадыёнах ад Мінска да Стакгольма...

Чаму ў Міхася такое рускае прозвішча? — думалася мне.

Прайшоў час. Ён ужо быў сапраўдным, вядомым пісьменнікам. Ён добра ведаў і любіў рускую класіку, мы гаварылі з ім

пра гэта, і сляды гэтага я бачыў у яго творах. Але аднойчы ледзь утрымаўся, каб не сказаць:

— Ну навошта, навошта ты такі... рускі?

Не, справа не ў насычанасці яго тэкстаў, яго стылю рускай мастацкай традыцыяй. Справа не ў творчасці наогул, а ў жыцці.

Справа ў падуладнасці той раз'юшанай жыццёвай стыхіі, якая ў славянаў, асабліва ў рускіх, цягне нібы ў вір ці да апошняга краю бездані, да самазнішчэння ўрэшце. (Нешта падобнае, здаецца, адбывалася і з Караткевічам.)

Гэта нейкая загадкавая, містычная прага безагляднага захаплення, пасля якога ўсякае намаганне ці стрымліванне сябе ўжо — сум, нудота, шэрая проза пасля паэзіі.

Гэта звыклая для герояў Шукшына прага «свята ў душы», без чаго яны не ведаюць, што з сабою рабіць.

Гэта нясцерпная патрэба «постоять на кр-раю», як спяваў Высоцкі. «Чую гибельную радость — пропадаю, пр-ропадаю!..»

Так, менавіта гібельная радасць — празмернасці пачуццяў, душэўных узлётаў. Безабароннасць перад гэтай спакусай, але і гатоўнасць да яе.

Тыпова славянская, няўцямная для руплівага Захаду, бяздонная шырокасць, дзе святло, пераходзячы апошнюю рысу, спапяляе сябе, абрынаючыся ў цемень, у нішто.

Такая шырокасць у жыцці не пакідае ўжо сіл для творчасці.

Ніхто і ніколі не дакажа мне, што Стральцова знішчыў «час».

Гэтая заўсёдная адмычка ў савецкіх тлумачэннях лёсу творцаў тут не спрацуе.

Не трэба нагадваць ні пра застой, ні пра вязняў сумлення, ні пра парушэнні правоў чалавека.

І пра цэнзуру ці адсутнасць палітычных свабодаў — таксама не трэба.

Бо Стральцоў стварыў свой непаўторны мастацкі свет і сябе якраз у час гэтай адсутнасці. Таксама як і згаданыя Караткевіч, Быкаў, Брыль...

Ён пагаджаўся з Пушкіным, якога так добра ведаў і цытаваў, што без палітычных свабодаў жыць яшчэ можна, а вось без свабоды ўнутранай — нельга.

Але небяспека і ў занадта вялікай свабодзе творчай асобы ад звычайных жыццёвых цяжкасцяў. Мастаку тады пагражае адчужэнне ад жыцця, самазамыканне.

Як рэдка спалучаюцца ў славянскім творчым духу гэтыя процілеглыя, але аднолькава неабходныя бакі: глыбіня, багацце паэтычнага пачуцця і строгая дысцыпліна; вялікае жыццялюбства і самаабмежаванне; адоранасць міласцю боскай і вялікая патрабавальнасць, самакантроль; вытанчанасць, артыстызм і суровая мужнасць мэтанакіраванай працы, цярпенне і трываласць.

Стральцоў меў залішне многа свабоды ад жыцця. Жыццё не дазваляе, не даруе гэтага.

У самой такой свабодзе закладзена ўжо і пакаранне за яе. Яна робіцца цяжкай. Невыносны цяжар свабоды кідае нас на пошукі таго, куды можна было б здаць, зваліць гэты груз са сваіх плеч.

Доўга шукаць не даводзіцца. Шмат чаго ў жыцці толькі і чакае гэтага, цікуе за намі і бачыць: вось гэты гатовы аддаць.

Да таго ж, тое жыццё, што абступала Стральцова ў апошні час, ужо не паддавалася ягонай любові — так востра, хваравіта ўспрымаў ён увесь гэты навакольны гул і раз'юшанасць.

Творчы арганізм Стральцова, надзвычай чуйны і трапяткі, у добрым сэнсе ломкі, не змог ахапіць гэтага, зрабіць сваім — і ўвайшоў у безвыходны канфлікт з жыццём.

Мне здаецца, пасля «Смалення вепрука» ён пачаў баяцца няўдачы. (Дарэчы, больш нічога ў прозе ён і не пісаў.)

Аднойчы я сказаў яму:

— Пасля такой рэчы, як «Вяпрук», трэба, каб час прайшоў. Каб у душы зноў насачылася і досыць назбіралася...

Ён усхапіўся, нібы толькі гэтага і чакаў:

— Вось бачыш, як ты разумееш!.. На якім узроўні! Канешне, час патрэбен. І яшчэ які!..

Ён змоўк — спакойны, задаволены. А я, грэшны, падумаў: «Баіцца рызыкі. Баіцца прайграць. Разумее: усё, што ні напіша, спярша паставяць у параўнанне з «Вепруком».

Я не ведаю, што б ён яшчэ зрабіў, калі б жыў. Але ведаю, чаго б ён НЕ зрабіў. І для нашай літаратуры гэта нязробленае ім было б не менш істотным, чым шмат што зробленае іншымі.

Як празаік, ён бы не пісаў такіх аповесцяў ці раманаў, дзе аўтар ні ў адным сказе не можа ўзняцца вышэй за сваіх герояў, з галавою зарываючыся з імі ў снег або ў траву.

Ён бы не браў у свае героі людзей ужо за адно тое, што яны людзі «простыя», «бедныя», як гэта рабіла ўся савецкая шматнацыянальная літаратура, упэўненая, што галеча ледзь не ідэал.

У крытыцы ён бы і цяпер не кляўся славутай народнасцю як вышэйшай якасцю мастацтва, бо ніколі не рабіў гэтага і раней.

Ён не пісаў бы літаратуру з абавязковаю мэтай «адлюстроўваць праўду жыцця». Бо разумеў, што мэта літаратуры не ў набліжэнні да жыцця, а ў такім мастацкім пераўтварэнні яго, калі толькі і адкрываецца нябачная дагэтуль праўда.

Гэта што датычыць непасрэдна творчасці. А для пісьменніка існуе яшчэ паняцце творчых паводзін.

Стральцоў сёння ні ў якім разе не жаліўся б на людзях, у газетах на мізэрныя ганарары за свае кнігі, называючы лічбы і для большага ўражання пералічваючы сотні тысяч няшчасных «зайцоў» на дзясяткі даляраў.

Не, ён бы не трос рыззём і трантамі, стоячы пасярод рынка ў позе жабрака-паэта і дакараючы сваім гібеннем урад ці дэмакратаў.

І ён бы не спраўляў прыватны апакаліпсіс і не клікаў бы на жалобу па сваіх чытачах, якія, маўляў, раптам пакінулі яго, спакусіўшыся раманамі з жыцця геніталіяў, — нашто яму такія чытачы?

Ён разумеў: чытача заўсёды няма — і чытач ёсць заўсёды.

Чытача ж масавага мае толькі газета. І яго не мелі на самой справе нават пісьменнікі з афіцыйнай абоймы. Ім толькі

здавалася так з-за сваіх тыражоў, якія былі дзяржаўнымі ўзмацняльнікамі іх імёнаў: масы чулі іх імёны — і не чыталі іх кніг.

А сёння скончылася гучная дзяржаўная вядомасць. Не чытач адвярнуўся — узмацняльнік адключылі.

І для Стральцова сёння ўсё было б як і раней. Ну сапраўды, што б ён такое ўжо страціў?

Званне, пасаду, прэміі, лаўрэацтва, месца ў прэзідыуме ці замежную вандроўку?

Не меў і не атрымліваў. Не сядзеў і не ездзіў.

Ён быў пісьменнікам — не болей. Але ж і не меней.

Ён змог ім стаць — ён змог ім і застацца, ужо назаўсёды. І сказаць тое, што сказаў.

Астатняе — у маўчанні.

Алесь Жук

Памяць аб радасці

Не жизни жаль с томительным дыханьем,
Что жизнь и смерть? А жаль того огня,
Что просиял над целым мирозданьем,
И в ночь идет, — и плачет, уходя.

А. Фет

Міхась Стральцоў мне помніцца маладым, прыгожым, з яго абаяльнай усмешкаю, прыжмурам зеленаватых вачэй. Ведаў яго розным, у зорныя часіны і ў самыя цяжкія і пакутлівыя, але ўспамінаю чамусьці маладым і прыгожым — відаць, таму, што прыгажосць яго была не толькі знешняя, а глыбокая, душэўная, тая прыгажосць, над якою не ўладны час. А можа, яшчэ і таму, што ўсё тое, што было з намі ў маладосці, цяпер здаецца і цікавым, і добрым, і радасным, як гаворыцца, і нават вада тады была смачнейшая, чым цяпер.

Аднак не буду парушаць традыцыю айчынных запісных успамінальшчыкаў і пачну ўспаміны з самога сябе. А даклад-

ней, як здарылася, што я пазнаёміўся з Міхасём Стральцовым яшчэ школьнікам. Цяпер гляджу з гумарам на тую сваю хлапчукоўскую самаўпэўненасць і нахабства і з сумам думаю пра тое, чаму не з'яўляюцца ў рэдакцыйных пакоях са сваімі рукапісамі наіўныя і шчыра ўпэўненыя ў сабе падлеткі.

Дык вось, я папісваў заметкі ў раённую газету, займаўся ў школе рабселькораў пры ёй, пра што маю адпаведны дакумент, засведчаны подпісам рэдактара і пячаткаю, і калектыўную фатаграфію ўсіх нас, няштатных, рознага ўзросту людзей. Акрамя вучобы і рабселькорства, многа чытаў, у той час асабліва захапляўся і адкрываў для сябе Чэхава. Начытаўшыся яго, рашыў і сам напісаць нешта такое кароткае, лаканічнае, «пад Чэхава». Знайшоўся і ўдзячны матэрыял — расказы бабулі пра вайну, пра «партызанку». Не надта мудруючы, запісаў расказанае ў выглядзе кароткіх апавяданняў ці замалёвак. Запісанае паслаў у часопіс «Нёман».

Як гром з яснага неба, было пісьмо з рэдакцыі, у якім паведамлялася, што мае навэлкі прыняты да друку, запланаваны ў нейкі нумар. Як цяпер разумею, гэта быў «пераможны» нумар, матэрыял падыходзіў. Мне прапаноўвалася тэрмінова выслаць у рэдакцыю фатаздымак.

Здымак я паслаў, часопіс выйшаў з маімі апавяданнямі, па пошце я атрымаў нечувана вялікі ганарар, дзесьці рублёў сорак пяць, і таму не мог не адчуць сябе сапраўдным пісьменнікам. Гэта потым ужо мне расказалі супрацоўнікі часопіса, што мае замалёўкі яны ўспрынялі як успаміны былога партызана, запісаныя на даволі прыстойным узроўні, а таму і паставілі ў святочны нумар. Фатаздымак зялёнага школьніка, які яны атрымалі, іх шакаваў, але адступаць не было куды, канвеер быў запушчаны...

Дык вось, тады я адчуў сябе самым што ні на ёсць пісьменнікам, засеў за пісьмовы стол і панапісваў апавяданняў — і на рускай, і на беларускай мовах. І вырашыў сам завезці ў Мінск, у рэдакцыі. Найперш трапіў у «Нёман», да Валянціна Тараса, які тактоўна, але даволі пераканаўча астудзіў мой імпэт і ў дадатак параіў пісаць на той мове, якую я ведаю, у асяроддзі якой

жыву. Гэта мяне падбадзёрыла, і з «Нёмана» я накіраваўся ў «Маладосць», да Міхася Стральцова.

З таго першага наведвання запомніўся найперш, вядома, Стральцоў, нечакана малады, усмешлівы і быццам нейкі сарамлівы. Нібыта гэта ён, а не я, прыйшоў са сваімі «опусамі». І тым не меней, яго рука з алоўкам не адрывалася ад каліграфічнага, разборліва, як школьнае сачыненне, напісанага мной тэксту. Чытаў ён і курыў цыгарэту, тоненька віўся сіні дымок, нешта заклапочана перабіраў на сваім стале Мікола Аўрамчык, коратка пазіраючы то на мяне, то на Міхася. І пад той час, як было скончана чытанне, Мікола Якаўлевіч неяк неўпрыкмет далікатна знік з пакоя. Чалавек вопытны, ён адчуваў, якая будзе гаворка.

Урэшце, я і не надта запомніў, што гаварыў мне Міхась Лявонавіч. Бо праходзіўся ён па радках, па кожным слове, не гаворачы ўжо пра ацэнку маіх рукапісаў цалкам. Яны гэтай ацэнкі заслугоўвалі, у гэтым я пераканаўся потым, калі ўжо быў студэнтам і таксама насіў на суд Стральцова новыя свае апавяданні. Памятаю, што тады, у студэнцкія часы, без жалю выкінуў школьныя сшыткі. На Стральцова крыўды не засталося, запомнілася яго «старычок» — «разумееш, старычок», «тут не так, старычок»... Абнадзеіў яго даволі катэгарычны наказ пісаць надалей і прысылаць яму.

Яшчэ калі я быў у вёсцы, Стральцоў станоўча адгукнуўся на маю навэлку, якая потым друкавалася пад назвай «Мужчыны». А першапачатковую назву мела «Балада». Памяняць назву мне параіў даволі катэгарычна Рыгор Бярозкін на семінары маладых пісьменнікаў на Свіцязі. І надрукавана яна была ўпершыню ў «ЛіМе» як твор удзельніка семінара. Але першы станоўчы водгук на навэлку меў ад Міхася Стральцова. Ён прасіў даслаць яшчэ што-небудзь у дадатак, каб з часопіснае публікацыі ўжо неяк паўставала, акрэслівалася асоба аўтара.

Тое «што-небудзь» у мяне не атрымлівалася доўга. Разумею цяпер, што пісаніна была і рыхлая, і наіўная, таму што многія з нас тады былі хто болей, а хто меней ачмурэлыя ад творчасці

Рэмарка, Фіцджэральда, Хэмінгуэя і, вядома ж, не маглі не быць зачараваны той шырокаю плынню, якая абазначалася паняццем «лірычная проза».

Адметным прадстаўніком, сапраўдным паэтам у гэтай лірычнай, інтымнай, звернутай да ўнутранага свету чалавека прозе быў найперш Міхась Стральцоў. Яго «Блакітны вецер» каму не кружыў тады галаву і самой тэмай, і мелодыкай фразы. Пасля гадоў запалітызаванай, заідэалагізаванай прозы было ап'яненне ад гэтага свежага струменю, які дазваляў паспавядацца душы пра самае запаветнае.

Магчыма, цяпер, перачытваючы апавяданні ўсіх нас з першага і наступнага «філалагічных» пакаленняў, кінецца ў вочы свядомае і самамэтнае любаванне словам, захапленне пластыкай фразы, малюнкавасцю і настраёвасцю, але то не было даганянне ні Буніна, ні Чэхава. То быў натуральны працэс, калі беларуская літаратура павінна была праходзіць пэўны перыяд у сваім развіцці, дараспрацоўваць тое, што пачынаў у сваіх «імпрэсіянісцкіх» апавяданнях Чорны, што было напісана, але не дайшло да чытача, Максімам Гарэцкім.

Няхай была за гэтым і хвароба росту, але і тыя пошукі сёння маюць мастацкую вартасць і цікавасць, сваю прывязку да часу. Што датычыць Міхася Стральцова, то ў выніку гэтых пошукаў ім напішуцца хрэстаматыйныя творы беларускай прозы. Пільным вокам пісьменніка падмеціць Стральцоў феномен «сена на асфальце».

Як тонкі лірык, ён адзначыць смутак і журбу развітання з вёскаю і недасягненне душэўнай гармоніі былога вяскоўца, які асуджаны пераехаць на жыццё ў горад. Сам Міхась Стральцоў болей не вяртаўся да гэтай тэмы, якая і на сённяшні дзень не развіта, не прасочана беларускай літаратурай ва ўсіх складанасцях гэтай праявы, у выніку якое атрымоўваецца не толькі «сена», але і звычайная «пацяруха», якою замятае і нашы паўвясковыя гарады, і саму недаабгарадзелую вёску, «пацяруха» душэўнай чэрствасці, эгаізму, страты адчування чалавечай і нацыянальнай годнасці, тых адметных рыс народнага характару, якія, як залацінкі, намываліся пакаленнямі.

Але тады быў толькі пачатак... І лірычнасць, адкрытасць, дакрананне да інтымных бакоў чалавечага жыцця выклікала супраціўленне. Ад «аглаблёвай» крытыкі таго ж Якава Герцовіча перападала і Стральцову за яго «блакітныя ветры», якія класіфікаваліся не інакш як прапаведанне распусты, разбэшчанасці, калі не болей. Таму і ўзнікала ўпартае жаданне пісаць насуперак старым маралізатарам...

Можа, у выніку гэтага і напісалася мной апавяданне «Сок манга», у якім ёсць і маладосць, і цыбатая стоечка ў бары, і дзяўчынка, і хлопчык, і крыху экзотыкі. На маё здзіўленне, Міхась Лявонавіч пахмыкаў, зрабіў некалькі паправак і вынес прысуд: «Нічога, старычок». Аднак гэта яшчэ не было рашэнне канчатковае, бо апавяданне выглядала нейкім незавершаным. Вось з гэтым «завяршэннем» я і папакутаваў. Прыносіў і абзацы, і новыя старонкі, пасля якіх Стральцоў ніякавеў і паўтараў сваё: «Не тое, старычок».

Магчыма, так бы і сканала ў рукапісе тое апавяданне, але ў адзін з маіх чарговых прыходаў, калі была адхілена, перакрэслена цэлая старонка розных варыянтаў, Міхась Лявонавіч урэшце прасветлена ўсміхнуўся, перакрэсліў мае варыянты і сваёй рукой напісаў кароценькі сказ: «Так думала яна». І ўсё стала на свае месцы. Цяпер, перачытваючы тое пачаткоўскае апавяданне, я спатыкаюся на гэтым запісаным з чырвонага радка кароткім сказе, бачу зеленаватыя, вясёлыя і задаволена прыжмураныя Міхасёвы вочы і разумею, што не толькі я, але і ён, рэдактар, таксама шукаў разам са мною і быў рады, што знайшліся патрэбныя словы.

І зараз чамусьці ўслед за гэтай сцэнай у «маладосцеўскім» кабінеце, гарэзлівым агеньчыкам у маладых вясёлых вачах успамінаецца іншая сустрэча.

Быў адзін з тых пагодлівых, ужо не спякотных, але амаль што ласкавых асенніх дзён. Шчодра раскашавала ў парку барвовае, жоўтае, чырвонае лісце. Яго не пачалі яшчэ зграбаць і вывозіць з паркаў і сквераў. Ад гэтага лісця, ад яснасці, сонечнасці дня душу кранала нейкая светлая і адначасна журботлівая радасць.

Угледзеў Міхася Лявонавіча нечакана, адзінокага на лаўцы ў скверыку Янкі Купалы. Ён сядзеў задумлівы, журботны і зусім адзінокі, быццам пакрыўджаны некім у гэты восеньскі святочны дзень. Ён не чакаў угледзець каго-небудзь са знаёмых, мабыць, не хацеў, каб бачылі і яго, каб заміналі самоце. Але ўсміхнуўся сваёй ціхаю ўсмешкаю, неяк пакорліва. Не памятаю, пра што мы гаварылі, бо быў я ўсё ж толькі пачатковец, які сустрэў старэйшага таварыша, рэдактара, якому на суд давядзецца насіць не адзін свой твор. Ці не тады ён сказаў, што перайшоў на працу з «Маладосці» на тэлебачанне, і неяк нясмела намякнуў, што такую падзею можна адзначыць. Потым мы ўсё на той жа лавачцы пілі чырвонае балгарскае віно.

Міхась Лявонавіч быццам абудзіўся ці адкаснуўся ад сваіх трывог, вочы яго ажылі, засвяціліся зялёнымі агеньчыкамі, весялей павіўся над цыгарэтаю тоненькі дымок. А потым ён пачаў чытаць на памяць вершы, пачаўшы з вершаў пра прыроду, перайшоў да сваіх найбольш любімых. Чытаў рускую паэзію, якую ён ведаў і памятаў надзіва. У гэтым я пераконваўся потым неаднойчы. А тады быў уражаны і здзіўлены...

І калі прачытаў праз некалькі год верш «Пра мудрасць», чамусьці ўспомніў тую сустрэчу ў восеньскім парку, тую Міхасёву адзіноту і прадчуванне нечага нядобрага, пра што тады не здагадаўся, ды і не мог, відаць, зразумець з-за маладосці, што ў жыцці ў пісьменніка пачынаецца новы, вельмі пакутлівы адрэзак лёсу...

Вось сівізна — а мудрасць дзе?
А мо пакорлівасць бядзе
Завецца словам гэтым?
Бяда ідзе, бяду вядзе:
Калі міне, сустрэне дзе,
Пасварыць дзе са светам...

А падчас той сустрэчы ў скверыку ў памяці маёй усё стаяла перад вачыма святочная зала Купалаўскага тэатра. Можа, таму, што студэнтам у тэатры бываў не часта, сляпіла святочнае святло залы. Здаецца, ці не быў гэта адзін з першых юбілеяў

Максіма Багдановіча, які адзначаўся на афіцыйным узроўні. Галоўным дакладчыкам выступаў Міхась Стральцоў. Было гэта пасля таго, як была ўжо напісана «Загадка Багдановіча», ці пазней? Ці тады толькі ў Стральцова былі асобныя публікацыі пра паэта і ён рыхтаваўся да напісання «Загадкі»?

Можа, гэта ўжо не так і важна, бо сёння бронзавы Максім Багдановіч вярнуўся ў сталіцу, у якой няма жывога, удзячнага чытача, прадаўжальніка, даследчыка Міхася Стральцова. З таго вечара засталася ў душы незвычайная святочнасць, захопленасць прыгожым, у белай рубашачцы пад гальштукам Міхасём Стральцовым за трыбунай, добрая белая зайздрасць да яго, яго таленавітасці, маладосці і прыгажосці, абаяльнасці, адукаванасці і густу.

Быў я яшчэ ў Міхася Стральцова, які апынуўся на раздарожжы. Ён частаваў мяне чаем, мы сядзелі і гаварылі ў пакоі, дзе ляжалі звязкі неразабраных, нерасстаўленых кніг з ягонай бібліятэкі. А потым ён зноў чытаў мне вершы на памяць. Чытаў, ці паэтычным словам вёў роздум пра сэнс чалавечага жыцця-быцця на зямлі, магчыма, пра свой лёс, і шукаў у мудрых радках парады і выратавання? А можа, яму падабалася адкрываць яшчэ раз і перад самім сабой мудры свет паэтычнай класікі? Тады я не ведаў, што такі прызнаны празаік, як Міхась Стральцоў, піша вершы, і што гэта не проста капрыз, а сталы пераход да працы ў новым, самым высокім і ювелірным жанры літаратуры.

Нагадаю, што сустрэча адбылася пасля нашумелага «Света Іванавіча, былога донжуана». Менавіта нашумелага, бо пасля з'явілася аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь», светлая і горкая аповесць-роздум пра чалавечы лёс на зямлі, пра абавязак чалавека перад жыццём, замешаная на пасляваенным дзяцінстве. Герой гэтай аповесці, калі можна так сказаць, дзед Міхалка, той дзед, які пачаў, відаць, галерэю вобразаў «старых» у беларускай літаратуры. Гэта цяпер, углядаючыся ў светлы свет мудрага дзеда Міхалкі і яго адносін з унукам, сэрцам перажываеш выпакутаванае пісьменнікам, разумееш крышку інакш, чым проста «лірычную прозу».

Памятаю, як распытвалася ў мяне мама пра Міхася Стральцова. Чытаць кнігі ёй не надта выпадала часу, але здарылася так, што ёй выпадкова трапіўся часопіс «Маладосць», які я студэнтам адвозіў у вёску. Якое ў яе было захапленне і суперыжыванне, і як яна здзіўлялася, што гэтакі малады змог гэтак напісаць.

Потым Міхась Стральцоў напіша сваю «Загадку Багдановіча», якая ўразіла навуковаю грунтоўнасцю, эстэтычнасцю, культураю думкі, разуменнем і пранікненнем у лёс паэта, у значнасць яго асобы, творчасці для нацыянальнай культуры. Урэшце, уся проза Міхася Стральцова — удзячны аб'ект для даследавання навукоўцаў, асабліва праз прызму няхай невялікага, але ўжо прамінулага часу, калі жыццё расставіла свае акцэнты, узняло новыя праблемы і пытанні, адсеяла многае, што прэтэндавала на манаполію, на прыярытэтнасць у беларускай літаратуры.

Апавяданне Міхася Стральцова «Смаленне вепрука» пазначана 1973 годам, у гэтым жа годзе выйдзе з друку і першая паэтычная кніга «Ядлоўцавы куст». Глыбокі даследчык, адукаванейшы знаўца, прынцыповы ў сваіх ацэнках Алесь Адамовіч, якому пры ўсёй яго аб'ектыўнасці болей імпанаваў Міхась Стральцоў-празаік, аўтарытэтна засведчыў: «Я, напрыклад, упэўнены, што сярод таго лепшага, што будзе выразней заўважацца заўтра, хрэстаматыйна загучаць назвы такіх твораў: «На чацвёртым годзе вайны», «Адзін лапаць, адзін чунь», «Смаленне вепрука», «Загадка Багдановіча»...»

Мудры Алесь Міхайлавіч, думаецца, невыпадкова паставіў шматкроп'е ў прадчуванні, што сам час пашырыць пазначаны ім спіс, безумоўна, далучыўшы сюды і лепшае з лірыкі Стральцова-паэта, а для даследчыкаў беларускай літаратуры не застануцца незаўважанымі крытычныя работы Міхася Стральцова, і тыя, што пісаліся як жывы водгук пра літаратурны працэс, і звернутыя ў сваіх развагах да беларускай класікі, да яе вопыту і набыткаў.

Але і быў няпросты час у жыццёвым лёсе Міхася Стральцова проста жывога чалавека. Здарылася так, што давялося яму

сустракаць зіму з шэсцьдзясят дзявятага на сямідзясяты год у нас у інтэрнацкім пакоі на вуліцы Свярдлова. Пакоі па-свойму знакамітым хаця б тым, што там у час свайго аспіранцтва жылі Рыгор Семашкевіч і Яўген Лецка. Рыгор Семашкевіч ажаніўся, з'ехаў з жонкаю з інтэрната на прыватную кватэру, захаваўшы месца для «зайца» Юркі Голуба, да якога падсуседзіцца давялося і мне. А потым прыйшлося пацясніцца і на месца для Міхася Стральцова, які на зіму застаўся без жытла. У яго тады балела нага, хадзіць было цяжка і даводзілася зімаваць зіму найбольш на ложку, сумаваць, пакуль наша студэнцкая кампанія збярэцца з горада ў пакой, і ў гэты час занатоўваць паэтычныя радкі. Сваіх вершаў ён нам не чытаў...

У тым нашым цесным студэнцкім жыцці ставала рознага, вясёлага і сумнага, тым болей, што камендантцы не надта падабаўся гэты маленькі інтэрнацік у адным пакоі, і была поўная пагроза ўсім «зайцам» аднойчы апынуцца на вуліцы. Але Рыгору Семашкевічу, які часам наязджаў у інтэрнат, удавалася ўстанавіць паразуменне і прадоўжыць наша існаванне ў тых сценах. Дык вось, у адзін з такіх трывожных часоў Міхась Лявонавіч, які заставаўся адзін і якому было сумна, адкрыўся для нас яшчэ адным бокам свайго таленту: ад суму над ложкам, на якім ён спаў, намаляваў недакуркам на сцяне заліхвацкага джэнтльмена ў каўбойскім капелюшы і з цыгараю ў зубах.

Вось такога «псавання інтэрнацкай маёмасці» камендантка магла не вытрымаць. Знайшоў выйсце зноў жа Рыгор Семашкевіч, які з недалёкай кнігарні, што на вуліцы Кірава, прынёс адмысловы плакат, на якім была намалявана рабочая рука з паходняй, а знізу красаваўся подпіс: «Ударнику коммунистического труда». Міхась Лявонавіч ацаніў гумар і тое, што гэтакі плакат не адважыцца зачапіць на сцяне ніякая камендантка. Так і перазімаваў пад ім...

У 1974 годзе Міхась Стральцоў у «Бібліятэцы беларускай прозы» выдаў томік прозы, быццам падвёў рысу пад зробленым у гэтым жанры. У тым жа годзе пабачыла свет і першая яго паэтычная кніга «Ядлоўцавы куст», адметная не толькі майстэрствам, навізною формы, але і глыбокай філасафічнасцю,

нават у нечым гарэзлівасцю, але галоўным, стрыжнявым ужо ў першым зборніку быў засяроджаны роздум над чалавечым лёсам у сусвеце, у вечнасці, у вечным свеце прыроды. І за гэтым роздумам адчуваецца глыбокая самота і боль душы, які пакуль што стрымліваецца, прыглушваецца, але няўмольна прарываецца ў слове:

Згасаеш? Ну, згасай! Навошта варушыць
Вуголле шэрае, каб іскрынку пабачыць?
Згасаеш — ну згасай! Хоць горка на душы,
Хоць ведаю, што гэта ўрэшце значыць.

Ці ведаў тады пісьменнік, ці мог здагадацца, які будзе цяжкі яго шлях праз цэлыя гады дэпрэсіі, адзіноты, адчаю і безнадзейнасці да свайго «свету яснага»? Наўрад. Думаю пра той перыяд у жыцці Міхася Стральцова і ўсё болей пераконваюся ў тым, што той «зрыў», які з ім адбыўся, у многім быў народжаны адчуваннем, разуменнем, рэакцыяй на сваю незапатрабаванасць грамадствам у самым шырокім, сур'ёзным разуменні такіх паняццяў, як «запатрабаванасць» і «грамадства».

Гэтыя акалічнасці ў свой час прымусілі сказаць горкія радкі ў адрас свайго народа Багушэвіча, Багдановіча, Купалу. Таленавіты, адукаваны, інтэлектуальна багаты Міхась Стральцоў як чалавек вельмі чуйны, не мог не адчуць, што па-сапраўднаму тое, што ён стварае і можа стварыць, патрэбна адносна невялікай колькасці людзей, але не ўсяму народу. Можа, таму і збянтэжылася, і была заблудзіла яго душа ў будзённых жыццёвых прыцемках. Міхась Стральцоў, які напісаў «Загадку Багдановіча», пакінуў нам сваю загадку.

Памятаю, як ён, пазначаны не толькі сівізной, але і глыбокімі маршчынамі і шрамамі на твары, слядамі перажытых болю і пакут, вярнуўся да актыўнай творчасці. Мы курылі з ім у кабінеце ў «ЛіМе», куды ён прынёс падборку вершаў. Я прапанаваў прыйсці на работу ў газету загадчыкам аддзела. Міхась Лявонавіч удзячна кіўнуў галавою, сказаў, што падумае. Разумею, што газетны тлум, «маладзёвы» калектыў «ЛіМа» не зусім імпанавалі яму, каму хацелася засяроджанасці, бліжэйшай

далучанасці да літаратурнай работы. І таму ён згадзіўся пайсці ў «Нёман» літработнікам...

Апошняя сустрэча здарылася ў мяне з Міхасём Стральцовым у фае Дома літаратара. Была яна мімалётная, як здараецца ва ўсіх нас, занятых сваімі будзённымі клопатамі. Некалькі дзяжурных слоў: «Як жывеш? Як здаровы?» — «Так, нічога...» Прыкладна такая гаворка, але голас далёка не бадзёры, а нейкі задумёны, і позірк, звернуты ў самога сябе. Пазней даведаўся, што Міхась ужо здагадваўся пра сваю хваробу, якая гучала, як прысуд...

Напісанае Міхасём Стральцовым, магчыма, умесціцца ў два томікі. Але гэта будуць залатыя томікі, пазначаныя знакам Майстра, якому Богам быў дадзены сапраўдны талент. Пераконваюся ў гэтым яшчэ раз, перачытваючы напісанае Міхасём Стральцовым. Не адважваюся называцца яго сябрам, ды гэта і няўдзячная справа — набівацца ў сябры да тых, каго ўжо не стала на свеце.

У свой час Міхась Стральцоў кнігу свайго выбранага назваў «На ўспамін аб радасці». І я пішу гэтыя радкі, згадваючы калі не пра сяброўства, то пра блізкае знаёмства з Міхасём Стральцовым з адчуваннем журботнай памяці аб радасці за тое, што лёс калісьці хоць ненадоўга зводзіў нашы жыццёвыя сцяжыны.

Анатоль Вярцінскі

Падарожжа да Міхася Стральцова

Мне б лепей у журбе,
У думках і здалёку,
Ў табе і пры табе
Шукаць сабе палёгку.

Міхась Стральцоў

Сваю колішнюю, пяцідзесяцігадовай даўнасці, рэцэнзію на першую кнігу Міхася Стральцова «Блакітны вецер» я пачынаў, памятаю, з разгляду апавядання «Перад дарогай». Што па-

свойму сімвалічна, бо былі абодва прыкладна перад дарогай — літаратурнай. З невялікай розніцай ва ўзросце і творчым досведзе. Рэцэнзія ж (яна называлася «Ці існуе блакітны вецер?») была ўсяго адной з самых першых спробаў выступіць у якасці літаратурнага крытыка.

«Перад дарогай»... «На вакзале чакае аўтобус»... «На аўтобуснай станцыі»... «Падарожжа за горад»... Вершаваныя радкі: «Мне дарожанька, адпачын — табе», «І ўсё вяла, вяла дарога. То хмель на ёй, то дзераза...» Словам — дарога, падарожжа. Віртуальная, вобразна-паэтычная. Ды я хачу распавесці пра падарожжа сапраўднае, пра рэальную паездку на радзіму аўтара прыведзеных вышэй радкоў.

На гэты раз нас, а менавіта мяне і Міхася Шавыркіна, чакаў не нейкі «безыменны» аўтобус на вакзале, а чакаў настроены на дарожны лад ля пад'езда свайго дома на Партызанскім праспекце, што ў некалькіх кроках ад станцыі метро «Магілёўская», са сваім быстраходным, добра знаёмым нам «Міцубішы» Міхась Скобла. Ініцыятыва, кажуць, рэч адказная, нават каральная. Ён стаў галоўным ініцыятарам выдання выбраных твораў Стральцова ў знаным кніжным праекце «Беларускі кнігазбор», укладальнікам кнігі і аўтарам каментароў да яе. І вось цяпер лічыць сваім доўгам папулярызаваць выданне, ладзіць гэтак званыя прэзентацыі і ў выпадку, падобным на наш, самому сядаць за стырно ўжо ў літаральным сэнсе гэтых слоў.

Выпраўляліся ў даволі далёкую дарогу: ад мінскай станцыі метро «Магілёўская» да поўдня магілёўскага краю — раным-рана, а сёмай гадзіне. Міхась — кіроўца — з асобнікамі «Выбраных твораў», другі Міхась, былы шматгадовы рэдактар часопіса «Роднае слова» — з публікацыяй, прысвечанай творчасці М. Стральцова, а я — з дарагім для мяне томікам «Мой свеце ясны» (маўляў, пагартаем, асвяжым у памяці па дарозе). У Бялынічах робім невялікі прыпынак — і ў выніку да нас далучаецца нядаўна прыняты ў наш пісьменніцкі Саюз празаік і музыка, аўтар песняў на словы Стральцова Юры Несцярэнка. Вось такая, з такім «багажом», складвалася літгрупа, настроеная на адну агульную, стральцоўскую хвалю.

А ў самім Слаўгарадзе нас сустракаў блізкі зямляк Міхася Стральцова, заслужаны, вядомы на Магілёўшчыне грамадскі актывіст, аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў Фелікс Шкірманкоў. Як колішні мясцовы кіраўнік, Фелікс Уладзіміравіч парупіўся наконт правядзення прэзентацыі. Адбывалася яна ва ўтульнай залі раённай бібліятэкі. Прайшла, як і трэба было чакаць, хораша, жыва. Мы гаварылі пра адметныя вартасці кнігі М. Стральцова, пра яго творчасць і жыццёвы шлях, які пачынаўся ў дваццаці вёрстах ад гарадка, чыталіся яго вершы і ці не ўпершыню тут гучалі песні на яго словы, гучаў выразна

Матыў лірычны, адмысловы
У важкай думе ці журбе —
Ён неабходны, каб на слове,
Паэце, верылі табе.

Прэзентацыя мела своеасаблівы працяг. Вырашылі наведаць заадно родную вёску Стральцова, той самы Сычын, дзе ён нарадзіўся, рос, гадаваўся і які не забываў, па якім нязменна тужыў і ў душы, і разам з героямі сваіх твораў. Ехалі апетай ім у вершах дарогай. Палі, пералескі, лугавіны... «Святло той рэчанькі Галубы, якую прыгалубіў Сож»... Малая Каменка... Вялікая Каменка... Не адразу знайшлі Сычын, давялося спыняцца і распытваць. Калі даехалі — не надта ўзрадаваліся. Бязлюдная вёска, ніводнай жывой душы. Некаторыя хаты — мала сказаць закінутыя — з выбітымі вокнамі і абваленымі стрэхамі і столямі. З цяжкасцю адшукалі на ўскрайку вёскі... не, не хату, не сядзібу, хата настаўніка Лявона Клімавіча Стральцова згарэла, — а ўсяго толькі зарослае хмызам і густой травой падвор'е з абгарэлымі шуламі. Малюнак, так бы мовіць, не для слабанервовых. Трымаліся, дзякуючы ўпартай неадступнасці М. Скоблы. І суцешыла крыху тое, што сустрэлі ўсё ж карэннага вяскоўца — сычынца і да таго ж стрыечнага брата Стральцова. Так, таго самага, Уладзіміра Громава, якому пісьменнік прысвяціў сваё апавяданне «Двое ў лесе». Пасядзелі з ім, адзінокім і хворым, на лаўцы каля яго хаты, пагутарылі, падаравалі братаву кнігу. «Ага, пачытаю» — сказаў на развітанне...

Няцяжка ўявіць, з якім пачуццём пакідалі мы «малую» радзіму Міхася Стральцова. З якім пачуццём, з якім настроем, з якімі думкамі. Выходзіць, — думалася, — нездарма ён аддаваў у сваіх творах столькі ўвагі тэме пакінутай вёскі, пакінутай бацькоўскай хаты, нездарма яго герой з нясцерпным болем вырашае, якім чынам памірыць у душы горад і вёску. Нібы прадбачыў аўтар, якім яно будзе, што атрымаецца з гэтага прымірэння наяве. Згадаўся амаль даслоўна ягоны ліст, адрасаваны гомельскай паэтцы Ніне Шкляравай, — яна пазнаёміла мяне потым з лістом, — дзе ён пісаў, што вельмі хочацца дамоў, што «дом у нас адзін, той, што з калыскі». Яшчэ дадаваў гаркотныя словы, што наканаваную апошнюю часіну трэба сустракаць на тым парозе, «на які Бог усадзіў: няхай ужо адтуль і прымае». Дык вось яны, вынікі злавеснай змовы быцця з нябытам, — дзяліўся я ўжо ўслых роздумам са сваімі спадарожнікамі, — няма ні таго бацькоўскага дома, таго парога, ні той ранейшай вёскі, няма з намі і самога аўтара ліста, і аўтара кнігі, што пабачыла свет ужо без яго і выданню якой прысвячалася наша паездка.

Рэальная паездка, вядома ж, цесна спалучалася з падарожжам віртуальным, з духоўным падарожжам у прасторы і часе, у душы і памяці. Што і зразумела. Бо ён, Міхась Стральцоў, займаў сваё адметнае месца ў маёй біяграфіі.

Мы бачыліся, сустракаліся і супрацоўнічалі па трох наступных мінскіх адрасах: вуліца Захарава, 19 (рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва»), вуліца Энгельса, 9 (Саюз пісьменнікаў, таго будынка ўжо не існуе) і вуліца Веры Харужай, 48 (пяціпавярховік, у якім разам атрымоўвалі кватэры і суседнічалі).

Вярнуўшыся (пасля вандраванняў з адной раённай газеты ў другую) у стольны Мінск, я стаў працаваць у рэдакцыі пісьменніцкага штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Тут у адзін цудоўны дзень і адбылося маё знаёмства з пачынаючым празаікам Міхасём Стральцовым. Павітаўся з характэрнай для яго ўсмешкай, павіншаваў мяне з новай працай і паклаў на стол... не, не апавяданне, а рэцэнзію. Не памятаю — на якую кнігу. Ды ўзяўся тут жа з цікавасцю чытаць і спыніўся на вызначэнні:

«талент — у чалавечнасці, без чалавечнасці нічога таленавітага не створыш».

Сцверджанне здалося мне занадта катэгарычным. Пра што я сказаў. Міхась памяркоўна выслухаў, ледзь было не пагадзіўся са мной. Ды ўсё ж стаў прыводзіць аргументы ў карысць свайго меркавання. Спакойна, ціхім голасам, але з глыбокай перакананасцю. Размова скончылася тым, што я ўхваліў рэцэнзію без якіх-небудзь значных правак, сэнсавых ці стылёвых.

Такім быў пачатак нашых узаемаадносін, нашай таварыскай супрацы. Затым, не без маёй ініцыятывы, Стральцоў прымае ўдзел у распачатай «ЛіМам» дыскусіі пра стан беларускага рамана: выступае са смелым, крытычным артыкулам. (Не ўсім ён спадабаўся, мелі непрыемнасці і аўтар, і супрацоўнікі газеты.) Далей — болей. Пазнаёміўшыся з яго першай кнігай «Блакітны вецер», я рашыўся ўзяцца за пяро ў якасці літаратурнага крытыка і змясціў на старонках тыднёвіка разгорнуты артыкул пад назвай «Ці існуе блакітны вецер?» Даваў высокую ацэнку: «Існуе». Гэта была, здаецца, ці ні першая такога роду публікацыя ў дачыненні да творчасці маладога празаіка. І размова ў ёй, заўважу, ішла пра тую самую чалавечнасць. Я зазначаў, што ў апавяданнях Міхася Стральцова ўражвае найперш надзвычайныя любоў і спагада да чалавека, засяроджаная ўвага да рухаў яго душы, да яго духоўнага, інтэлектуальнага і эмацыйнага свету. І заканчваў рэцэнзію высновай: «Харошую кнігу напісаў Міхась Стральцоў. Светлую, чалавечную, таленавітую».

Ён у дзень выхаду газеты спачатку патэлефанаваў, потым зайшоў у рэдакцыю, дзякаваў. Крыху сумеўшыся, казаў, што ці не перахвалілі ягоны зборнік, што ў яго ёсць больш цікавыя задумы...

Так вось складваліся нашыя стасункі — чалавечыя і творчыя.

Пазней я не змог па нейкай прычыне выказацца ў друку пра яго аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь». А выказацца было проста неабходна. Справа ў тым, што калі ўчытваўся ў твор, то не толькі з цікавасцю, але нават са здзіўленнем зазначаў: Міхалка і Трафім — амаль вылітыя мае рэальныя дзяды, дзед Грышка (па маці) і дзед Арцём (па бацьку). Яны адыгрывалі прыкладна

такую ж ролю ў тым, каб неяк дапамагаць маці (бацька быў на вайне) адзяваць і абуваць нас, малалеткаў. Кожны па-свойму, як і персанажы аповесці. Асабліва ўразіла сваім падабенствам гісторыя з наганам і патронам да яго. З той, праўда, розніцай, што калі дзед Міхалка прадбачліва адабраў і «перахаваў» унукаву зброю, то дзед Грышка дазволіў майму стрыечнаму брату Барысу пазабаўляцца з вінтоўкай, якую з адным ці двума патронамі яму далі як калгаснаму вартаўніку. Унук усё ляскаў і ляскаў затворам на печы і стрэліў напраўду. Проста ў спіну дзеду, які, схіліўшыся над дзяжой, вырабляў аўчыну. Той толькі і войкнуў: «Што ты, Барыс, нарабіў...» І праз некалькі хвілін памёр...

Запомнілася тое ўражанне, з якім дачытваў аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь». Асабліва — апошнія старонкі, у прыватнасці праніклівыя радкі пра начны адыход у «празрыста-халодную вечнасць», пра натуральную, негвалтоўную — у адрозненне ад гібелі майго дзеда, — смерць дзеда Міхалкі. Дачытаў і тут жа пазваніў па тэлефоне аўтару: «Міхась, зайдзі пасля працы да мяне. Пагаворым пра твае лапаць і чунь, пра твайго Іванку і тваіх дзядоў, у тым ліку і пра маіх. Як, адкуль ты дазнаўся пра іх?».

Міхась падвечар прыйшоў. (Балазе, жылі, як я ўжо казаў, па суседстве, у сумежных кватэрах.) Пагаварылі, так бы мовіць, і па справе, і па шчырасці, пра аповесць і пра сваё ваеннае дзяцінства, пра дабро і зло, праўду жыццёвую і праўду мастацкую. Прагаварылі, памятаю, да поўначы.

Увогуле, што характэрна, Міхась Стральцоў згадваецца ў сукупнасці з нейкімі важнымі для мяне жыццёвымі момантамі. Ён адзін з першых выказаў мне спачуванне з нагоды смерці маці. Знайшоў нягучныя, але адпаведныя нагодзе словы. Мы былі побач на нашумелым пятым з'ездзе пісьменнікаў, і ён з захапленнем (не перабольшваю) гаварыў мне пра мой верш «Поезд справядлівасці», які мне ўдалося надрукаваць напярэдадні з'езда — у падтрымку Васіля Быкава. Ён віншаваў мяне, з адабрэннем гаварыў мне пра мой другі прыход — ужо ў якасці галоўнага рэдактара — у тыднёвік «Літаратура і мастацтва» і нават прапанаваў увесці новую рубрыку «Калонка рэдактара». У нас з ім быў агульны старэйшы сябра Аляксей Васільевіч

Пысін. Я не раз з той альбо іншай нагоды пісаў пра яго паэзію, і Міхась заўсёды адзываўся з пахвалой, дзяліўся сваімі меркаваннямі. Мы разам, памятаю яшчэ, ладзілі ў колішняй так званай каміннай зале Дома літаратара «паэтычную пятніцу», прысвечаную выхаду кнігі Аляксея Пысіна «Ёсць на свеце мой алень», апошняга прыжыццёвага выдання паэта...

Так згадваецца ён, так думаецца пра яго.

Я не выпадкова вынес у якасці эпіграфа радкі М. Стральцова з яго ўлюбёным, з яго незаменным, абавязковым, шматзначным словам «журба». Як, пэўна, гэтак жа невыпадкова Анатоль Сідарэвіч у сваёй грунтоўнай прадмове да «Выбраных твораў» нават лічыць, што «журба стала для маладога Стральцова антытэзаю, апазіцыяй казённаму партыйна-камсамольскаму аптымізму», «бодрячеству». У тым ліку ў творчасці». Часткова, можа, і так. Ды, думаю, рэч тут не толькі ў пэўнай лексеме як «антытэзе», а ў характэрнай адметнасці паэтыкі аўтара, у арганічна ўласцівых яму, як асобе і творцу, светаадчуванні і светапоглядзе. Пра што гаворыць ужо той факт, што паняцце журба мае ў яго творах мноства адценняў і асацыяцый і — па ўласным прызнанні пісьменіка, — гэтая самая журба «стала ягонай другой натурай».

Так, мы пераважна ведалі і ўспрымалі ягоную, так бы мовіць, натуру першую, яўную. Яе цяпер згадваем, пра яе гаворым і пішам. А вось што тычыцца ягонай «другой натуры» (ён яшчэ гаварыў пра «сваю душэўную гаспадарку»), то гэта — асобная тэма.

2016

Васіль Зуёнак

Той куст ядлоўцавы...

А — «ведаеце што...», — як зазвычай пачынаў свой кожны публічны выступ паэт Станіслаў Шушкевіч, так пакарыстаюся гэтым «мабілізуючым» увагу двухслоўем і я. Дадаўшы толькі ў яго маленькі значок — коску. Каб прагучала пытанне: «А ведаеце, што ў паэтычнай кніжцы Міхася Стральцова «Ядлоў-

цавы куст» сам ядловец, апроч вось гэтага, загалоўнага, слова ні разу не згадваецца? Проста адсутнічае — вось у такім, назыўным, сэнсе...

То як жа яно гэтак? І што б тое азначала? Што пад гэтым хаваецца? Шыфр які тут ці што?..

От так і падумалася: а ці не ўсё гэта — «Міхась Стральцоў. Ядлоўцавы куст»... — ці не ўсё яно разам — і аўтар, і кніжка, як душа і цела, — і ёсць той самы ядлоўцавы куст. Той, які і характарам, і выявамі яго ў слове так нагадвае Міхася. І лёсам. Лёсам, бадай, найперш. Бо, пэўна ж, не абстрактнае дрэва стаяла перад вачыма ў аўтара, а балюча-блізкі двайнік...

Ядлоўцавы куст...

Ці не такі быў і ў мяне. Бо кажу пра Міхася, а мне бачыцца ядловец мой, з майго маленства. Само сабой, так і павінна быць. Інакш не было б і паэзіі, калі б не было гэтага сустрэчнага чытацкага рэха...

Мой самотна вызначаўся здалёку. Там, дзе сыходзіліся ў клін — гэтакі трохкутнік: поле — лес — надрэчны луг... Ці ён сам абраў, ці яму вызначылі гэтае месца?.. І што бліжэй да яго было: лес, куды ён ішоў, ды не дайшоў (ці адтуль яго выгналі?), альбо поле, куды ён хацеў вярнуцца?..

Ён быў самотны, але не быў адзінокі.

Яго любілі птушкі і дзеці.

Птушкі — бо ён быў іх надзейнай аховай ад розных дзюбастых ды кіпцюрастых. Паспрабуй дабрацца да гнязда праз гэта шчыльнае спляценне пругкіх, непадатлівых галінак і вострай ігліцы, — не ўдасца, як ні круціся... Ды і не па нутры крылатаму драпежніку высоўвацца з кутка затоенага і цёмнага на чыстае, агляднае месца...

Ну а дзеці? Ды што ж тут пытацца: дзе птушкі — там і дзеці!

Ці не пастаяннае, сталае жыхарства мела ў ядлоўцавым доме сачыўка...

З кожнай вясной ён (менавіта ён, хоць і найменне насіў жаночае — сачыўка, сачавіца... А што ён і ёсць сам пан гаспадар, сведчыў адметны мужчынскі ўбор: ярка-чырвоны берэт і гэткая ж — на ўсе грудзі — манішка. Па тым і няцяжка было

яго пазнаць: ён здалёку свяціўся ліхтарыкам)... дык вось — ён садзіўся на самы вастрачок ядлоўцу (гэтакі НП — назіральны пункт) і з лёгкім паваротам на ўсе бакі свету азіраў наваколле — сачыў, высочваў: што, дзе і як, — сачыўка ўсё ж... Можна сказаць і «вычэкваў». Бо калі ўсё спакойна было, ён пасвіствaў флейтай, а як заўважаў што трывожнае, флейта пераключалася на «чэканне»... Так гаспадар нёс службу...

А мы чакалі ... Чакалі яечак, чакалі, калі з гняздзечка павысоўваюцца кволенькія, жаўтлява-ружовыя дзюбачкі — з адзіным жаданнем ... І як жа шчыравалі бацькі, кармілі малечу — вырастайце хутчэй!.. І тыя раслі... І неўзабаве выбіраліся з гняздзечка. Але куст не пакідалі: дарослыя строга сачылі за гэтым. Калі ж хто высоўваўся неасцярожна, сачыўка так біў трывогу чэканнем, што і нам няўстрым рабілася — прыбегчы і падзівіцца, а то і злавіць, і патрымаць у руках пухнаты, трапяткі камячок...

І ўсё гэта бачыў і ўсяму радаваўся ядлоўцавы куст.

Дарослыя ж — паважалі, а то і шанавалі яго (бо пабрацімы ягоныя былі не з апошніх між дрэў на могілках). А тут ён, у гэтым вузле між полем, лесам і лугам, быў нейкім, як я цяпер разумею, знакам, вызначаў «вузлавую», сакральную кропку. Яго пэўным чынам бераглі і аберагалі. Ці ён і сам падсяліўся як абярог... Яго не кранулі — ні каса ў малалецтве, ні плуг у юнацтве, ні сякера ў сталасці...

Ядловец дрэва не шумлівае. Якія б вятры ні шасталі ў лесе, ні гойсалі ў полі, ні загульваліся з лугавымі кветкамі, — у яго заўсёды быў свой вецер. Прыгледзьцеся — ён шызавата-блакітны, асабліва, калі выспеляцца ягады. Ён сам надае ветру адценне і колер...

А не шумлівае — бо ўстойлівае...

Міхась Стральцоў на нашым журналісцкім курсе ў студэнцкай грамадзе быў, напэўна, самы немітуслівы і засяроджаны. Хто з вершамі, хто з інфармацыйнымі карацелькамі грукаліся ў рэдакцыйныя дзверы; хто налягаў на вучобу і спрасонку мог адчаканіць, якія і чые артыкулы былі надрукаваныя, ну, скажам, у пятым нумары ленінскай газеты «Искра» (між іншым,

ніхто з іх, здаецца, ні слова, ні паўслова — творчага — так і не сказаў); хто цешыўся перспектыўнай бязважкасцю грамадскіх «нагрузак»...

Міхася ўсё гэта як бы абыходзіла.

Таемнасць ягонай зоркі спялілася ў кніжным небе. На нашым курсе ён быў, што называецца, самым начытаным. Ужо са школы ён прыйшоў у студэнцкую аўдыторыю літаратурна падкаваным, выдатна арыентаваўся і ў рускай, і ў сусветнай класіцы. І толькі ён мог без асаблівых пярэчанняў выслухаць дэкана Міхася Рыгоравіча Ларчанку, які на наша патрабаванне дазволіць вольнае наведванне лекцый, каб мець час перачытаць усе «першакрыніцы», даводзіў, што чытаць трэба было ў школе, а тут, ва універсітэце, — навукова аналізаваць... Наіўныя былі мы, наіўны быў і прафесар... На вышыні тут, здаецца, быў адзін Міхась...

Праўда, пры ўсім пры гэтым, што тычыцца ўласнай творчасці, асаблівых «вехаў» у яго не было. Рэспубліканскі друк засведчыў усяго толькі адну публікацыю — вершык на рускай мове ў газеце «Сталинская молодёжь» (пазней «Знамя юности»). Бадай, усё... Калі не лічыць вясёлых «расповедаў» (таксама рускамоўных) пра закаханыя прыгоды і няўдачы нейкага «Страстишкина». Мы ведалі яго імя і ад душы рагаталі, рагатаў і сам «герой», а Міхась стрымана і паблажліва пасміхаўся... То было рэха студэнцкай вольніцы «на бульбе», дзе мы «аказвалі дапамогу» калгасу...

А наогул Міхась Стральцоў маўчаў...

Што ж, Міхасю было над чым задумацца. Апынуўшыся ў «атачэнні» беларускамоўных — і з адметнымі перспектывамі! — пачаткоўцаў, неабходнасць, як цяпер бы сказалі, перафарматавання ён пастаянна адчуваў — і ў аўдыторыі, і ў інтэрнацкім пакоі. А галоўнае — яго вяртала да сябе тая стыхія, што дыктавалася генамі. Набытае вопытам чытання адступала — хоць і заставалася па-ранейшаму трывалай апораю.

Натура даткліва-паэтычная, Міхась Стральцоў не мог па часе не адчуць няпэўнасці і штучнасці свайго «рускамоўя». Мажліва, «па закліку» студэнцкай «абыдзённасці» мы не

заўсёды заўважалі гэтай стральцоўскай патаемнай працы ды і не імкнуліся заўважаць, апантаныя «грандыёзнасцю» сваіх «задум» і неадкладнасю іх здзяйснення. А ён імкнуўся дыхнуць паветрам вечнасці, якім прасякнутыя для яго былі самыя будзённыя, шараговыя праявы жыцця. Пэўна, ён глядзеў на ўсе нашы красавіцкія скокі вачыма вераснёўскага мудрага сузіральніка. Гэта была адухоўленасць чэхаўскага ўзору...

Але ж была, не будзем забывацца, яшчэ і класіка беларуская, і прыклад класікаў жывых... Былі, урэшце, два Максімы — Багдановіч з яго (і стральцоўскай) загадкай і «чалавек з Малой Багацькаўкі» Гарэцкі з яго (і стральцоўскім) памкненнем зразумець і паяднаць сялянскую і «гарадскую» стыхію ў душы чалавека, «перакінутага» воляй жыццёвых абставін ці лёсу са сцяжынкі ў ласкавай траўцы-мураўцы на асфальт...

З Максімамі, найперш, моўчкі вёў размову Міхась. І што ў гэтай цішыні выспявала, мы неўзабаве пабачылі і ў здзіўлёным захапленні ахнулі!..

Адно за адным — апавяданні: у «Маладосці», «Полымі», «ЛіМе»... А ўпобачкі — вершы...

А потым — кніжкі, дзе сустрэліся яны — «Блакітны вецер» і «Ядлоўцавы куст» — проза з паэзіяй (ці паэзія з прозай?)... Якая розніца! — галоўнае: сустрэліся! Шчасліва сустрэліся.

Яны сэрцавыверана з'явіліся і трывала ўмацаваліся, як дыялог праз усё творчае жыццё Міхася Стральцова. Ва ўсім панавала лірычная настроенасць душы. Трапяткі паэтычны лад як бы перацякае з яго вершаў у прозу, і наадварот — сардэчным парыванням, роздумам з прозы ў паэзію. Так да маштабных абагульненняў узнімаўся глыбокі асабісты досвед творцы...

Блакітны вецер летуценна і настойліва падступаўся з пошукам адказаў на пытанні жыцця — праз аб'ектывізаваныя дзеі, характары як бы «старонніх» людзей — герояў празаічных твораў:

«Трэба жыць, — падумаў ён (Лагацкі. — *В. З.*), — трэба смялей і весялей жыць: пазбыцца раўнадушша, чэрствасці,

замкнутасці ў сабе. І тады ніколі не пакіне мяне блакітны вецер»...

Ядлоўцавы куст як бы адказваў на тыя ж пытанні — праз наўпростую выяву душы мастака:

Я — голас і думка, я — праўда і зрок,
Даў мову я камню, траве і расінцы.
Мой дзень — не імгненне, планеты віток,
Друкую свой крок на сусветным гасцінцы... —

І пасля гэтых «планетарных» крокаў — такая трывалая, устойлівая зямная хада:

Мана прыдумана не мной,
І крыўда ўскормлена не мной.
Любоў я выспеліў і гнеў,
Які пакора не сагне...

Успамінаю-згадваю і ніяк не магу прыгадаць, каб Міхась дзе-небудзь вытыркаўся паперадзе з лозунгам ці папяровым сцягам у руках. Не магу, бо такога не было і быць не магло. Ён не аматар быў увязвацца ў пустаслоўныя «дыспуты», недзе «засвяціцца» публічна і «ўсенародна». У яго не было на гэта патрэбы. Сваё прызначэнне — як грамадзяніна і творцы — ён бачыў у іншым: словам сваім, мастацкім служэннем ціхенька пагрукацца — каб не спалохаўся — у чалавечае сэрца, падтрымаць чалавека ў чалавеку, не даць яму развярнуцца і пашыбаваць у бок супрацьлеглы боскаму прызначэнню. І «даводзіць» ён вялікія (філасофскія) ісціны не ў жалезабетонных формулах, а ў дыханні травінкі, у святле кволай — як сляза — расінкі, ва ўсім, міма чаго мы праходзім безуважліва і раўнадушна. Марна чакаць ад Міхася Стральцова голых дэкларацый. Яго светаўспрыманне сцвярджаецца не наўпрост, а асацыятыўна. Сусвет яго слова напоўнены гукамі і фарбамі зямнога жыцця. Яны ўскалыхваюць думку, скіроўваюць яе да самых глыбіняў натуры вышэйшай, чалавечай. Каб не забываўся чалавек, хто ён ёсць, і дзеля чаго прыйшоў на зямлю. Каб меў права аднойчы запытацца і тут жа даць адказ:

— Хацелі бога вы? Ёсць бог, —
да вусцішнасці проста і — бясспрэчна, бо гэта сказана ў твар сытым і задаволеным сваёй сытасцю чалавекам абяздоленым і, здаецца, пакінутым богам...

«Ёсць» — ён у душы ў кожнага. І важна, каб сюды не падсяліўся д'ябал...

У самыя цяжкія моманты свайго жыцця Міхась не губляў чалавечай годнасці. Трымаўся дастойна. І на пэўны знак падтрымкі заўжды нешматслоўна пытаўся: «То цяпер я магу распарадзіцца?..»

І проза, і паэзія Міхася Стральцова (як, разумеецца, і сам аўтар) пастаянна паўстаюць як выклік перад кожным, хто намерыўся падступіцца да іх са сваім ментарскім «аршынам». Ён такі, які ёсць, — інакшым не бывае. Ён увесь непаўторна жывы ў свеце сваіх мастацкіх вобразаў. Так, гэта «блакітны вецер», — ён ёсць, вось ён, такі адчувальны, і такі няўлоўна-летуценны. І гэта «ядлоўцавы куст» з яго непахіснай заземленасцю...

Патрабавальнасць да таго, што выходзіла з-пад яго пяра, была з радні прынцыповай няўступлівасці: «Сказаць хачу — і так, як я хачу». Ён адстойваў сваё «сказана» — як «vixi» (пражыта). Нават у дробязях, — праўда, дапускаючы пры гэтым спагадлівую саступку, магчымасць запярэчыць яму...

Прыкметная (ці то стылю, ці то характару?) асаблівасць, — нешта ж у гэтым тоіцца...

Перачытваючы эсэ і крытычныя нататкі Міхася Стральцова — разам, у адной кніжцы — нельга не заўважыць:

«Здаецца, яшчэ Пушкін казаў, што слова пісьменніка ёсць ужо ўчынак яго...»

«О если б без слова сказаться душой было можно!» Гэта, здаецца, Фет...»

«Море смеялось» — гэта, здаецца, з «Мальвы» — усё ж не лепшага горкаўскага апавядання...»

«Здаецца, у Горкага недзе ёсць сведчанне пра тое, як уражаны быў у старэчым узросце Талстой «празаічнай» дакладнас-

цю радкоў маладога Буніна: «Грибы сошли, но крепко пахнет / в овраге сыростью грибной...»

«Кажуць, гэта трохі перайначаныя радкі з перакладу польскай песні...»

«Пра Гамера нехта сказаў, што ён не-не ды і прымгне вока над сваёй «Іліядай...»

«Калі не памыляюся, А. Нікалаеў не часта перакладае з беларускай...»

«Чэхаў у нейкім лісце, як на прыклад талстоўскага «ясновидения», спасылаўся на Карэніну, што бачыла ў цемрадзі... свае вочы! Чэхаў, захапляючыся, гаварыў непрытворна: «Ён мяне палохае!» (А, здаецца, пра Леаніда Андрэева Талстой аднойчы выказаўся: «Ён палохае, а мне не страшна!»)... Не дзіўна, што Талстой разумеў навізну чэхаўскага пісьма. Пра гэта ёсць, калі не памыляюся, у ягоным нейкім інтэрв'ю пасля смерці Чэхава...»

Цікавыя і да месца, грунтоўныя па кантэксце сведчанні. Але чаму і навошта гэтыя «здаецца», «недзе ёсць», «у нейкім лісце», «кажуць», «нехта сказаў», «калі не памыляюся», «у нейкім інтэрв'ю»?.. Адкуль гэтая няпоўнасць (ці няпэўнасць) паведамлення?..

Можна, канешне, «падвярстаць» адпаведныя абставіны і зразумець Міхася Стральцова. Працуючы над сваімі тэкстамі, ён згадваў выказванні і сведчанні іншы раз, «карыстаючыся» выключна памяццю; звяраць жа іх, спраўджваць па арыгінале ці то часу не меў, ці асаблівай ахвоты, жадання. Ды і патрэбы: не навуковыя ж, нарэшце, трактаты піша, каб скурпулёзнай «пашпартызацыяй» займацца...

Так яно, прынамсі, уяўляецца...

А можа... А можа, гэта своеасаблівы стральцоўскі прыём? Не дзеля бравады, а дзеля хітраватага літаратурнага шарму? Вось пабачце, як нязмушана, без натугі і вучонай пыхі, як проста ўсё ў мяне, без «цытатнага гальштука» і як бы мімаходзь...

І хоць гэта «здагадка» набліжае да ісціны, але не вычарпальна. Не з такіх творцаў Міхась Стральцоў, каб разменьвацца на спробу «літпіжонства»...

Хутчэй за ўсё (і яно так) бачым мы тут спосаб — своеасаблівы, стральцоўскі — наблізіць сур'ёзныя высновы да гутаркова-даверлівай інтанацыі: не «азадачваць» суразмоўцу, а даверліва, па-сяброўску яго дапускаць да свайго, запаветнага... А то і запрашаць, прыкладам: «Я то знаю, а ты засумняваўся — правер, пашукай, даследуй. З якіх сусекаў я чэрпаў, зачарпні і ты. І папраў мяне, калі што якое»...

Я аднойчы гэтак і «паправіў». Ну, не паправіў, а проста падказаў... У «Загадцы Багдановіча» згадваюцца Халопенічы, дзе нарадзіўся бацька Максіма Адам Ягоравіч. І назваў Міхась паселішча гэта вёскай. Я і заўважыў яму, што Халопенічы — не вёска, а мястэчка. З даўняй гісторыяй. Адным часам тут нават сеймікі праходзілі — калі цэнтр павета Орша быў захоплены маскоўцамі...

Міхась паслухаў, быццам і пагадзіўся. Дымнуў папяроскай, прытоена, як сам сабе, усміхнуўся ды і прамаўчаў... А ягоны «адказ» прачытаў я ў рэцэнзіі на адну з маіх кніжак: «Халопенічы — гэта, здаецца, родная вёска аўтара»... — Вось так, будзь ласкаў: і «здаецца», і «вёска»...

Наогул жа Міхась Стральцоў не аднойчы выказваў слова падтрымкі маёй творчасці — і вусна, у сяброўскіх гаворках, і пісьмова — у друку, і ў такім «жанры», як рэкамендацыя ў Саюз пісьменнікаў... Не абыходзілася, пэўна ж, і без заўваг. А помніцца добрае... Помніцца, як пахвальна ён адгукнуўся на публікацыю ў «ЛіМе» раздзелаў з паэмы «Лукам'е», — пра агонь, у прыватнасці... Давялося нават трохі «ахалоджваць» Міхася: «Ды ты ж яшчэ ўсяго твора не чытаў, можа, не тое загаворыш». На што ён толькі адмахнуўся: «Ну ты, старычок, гэта кінь...» Дапытваўся, як я ў гістарычным, па сутнасці, творы «выкручваюся» з мовай...

Да слова Міхась Стральцоў ставіўся пяшчотна. І пачціва, як бы нават сарамліва — перад Яго Вялікасцю. Не толькі на пісьме, але і ў звычайнай, будзённай гаворцы. Іншы раз (і даволі часта) замаўкаў, — пэўна, даючы прамоўленаму слову прастору для палёту, перспектыву. А можа, і магчымасць сабрацца з думкамі суразмоўцу. Такім мне бачыўся ён і падчас гутарак

з аўтарамі часопіса «Маладосць». Ён не навязваўся са сваімі «меркамі», нават кансультуючы самых зялёных пачаткоўцаў. Ён быццам бы раіўся з аўтарам, дапытваўся яго думкі... Стральцоўская школа не падразала крылы. Яна натхняла і абнадзейвала — не крыклівай, а спагадлівай мудрасцю... І ўласнай яго творчасцю...

Размаўляючы з ценямі вялікіх, звяраючы з імі сваё слова, Міхась Стральцоў набліжаўся да іх узроўню. Дастаткова прыгадаць класічныя «Смаленне вепрука», «Сена на асфальце»...

Што тычыцца «Смалення вепрука», то мушу прызнацца, вестку пра яго ўспрыняў я з недаверлівым чаканнем. Міхась, гэтакі эстэтычна-вытанчаны, — як жа ён управіцца ў слове з гэтай «раблезіянскай натурай», з «тэхналогіяй» уладжвання не штодзённа-будзённага сялянскага клопату... Аднак насцярожанасць была дачасная. Як выявілася, само смаленне вепрука сталася толькі «сігнальным знакам», зялёным промнем святлафора, каб даць, адкрыць шлях, па якім пойдзе здзяйсненне іншай — галоўнай — задачы: раскрыць характар чалавека, зазірнуць у таямніцы яго душы. А як жа з самім «працэсам» заяўленага «смалення»? А ён рухаецца сваім ходам, як бы «кропачнымі ўспышкамі», настойліва трымаючы ўвагу ў напружанні (ад экспазіцыі: «мне даўно хацелася напісаць адно апавяданне і назваць яго так: «Смаленне вепрука» — да фіналу: «такою парою пішу я эпітафію апавяданню, якое магло б называцца «Смаленне вепрука»), — гэтакі эфект «заваблівага чакання» і пранікнення ў глыбіні адной з'явы праз выкарыстанне — у якасці «рабочага інструмента» — з'явы другой...

І, нарэшце, час «адкрыць карты»: гэтым разам я пакарыстаўся стральцоўскай методыкай, так бы мовіць, практычна праходзіў майстар-клас Міхася Стральцова. Эцюд мой ствараўся «спосабам ядлоўцу» накшталт спосабу «смалення вепрука»...

Ядлоўцавы куст... Нагадаю: гэта ўсё пра яго — пра Міхася Стральцова. А што тады сена на асфальце?

А гэта ўсё пра нас, учарашніх вяскоўцаў у горадзе. Сена — паняцце не адзінкавае, зборнае: гэта — мы...

2015

Ніна Шклярава

Азірніся!

Агонь кастра не патушыць,
Што з Каралішчавіч палае...

Ніна Мацяш

Божа! Што ў цябе за звычка развітвацца:
унурыцца і нават не азіраецца.
Я ўсё гляджу табе ўслед. Азірніся!

Міхась Стральцоў

Азірнулася, але Міхася ўжо не было...

Пазнаёміліся мы ў Каралішчавічах. Разам з ім на семінар творчай моладзі (1967 год) завіталі таксама Генадзь Бураўкін і мой зямляк Анатоль Грачанікаў. Там жа, нарэшце, сустрэлася з нашымі класікамі: Іванам Шамякіным, Андрэем Макаёнкам, Іванам Мележам. Анатоль Вярцінскі быў нашым куратарам. Ён жа кіраваў і праграмай семінара. Яму ўдалося зрабіць асноўнае: згуртаваць нас, дапамагчы нам адчуцца адной сям'ёй, запаліць у душы кожнага свечку дабразычлівасці, напоўніць істоту натхненнем так, што яно аберагала нас ад рознай брыдоты ўсё жыццё, як добры анёлак. І вось цяпер, азірнуўшыся праз гады, хочацца ўспомніць пра кожнага. І пра тых, каго ўжо з намі няма...

Днём праводзілася літаратурная вучоба: чытанні, семінары, конкурсы. Вечарам — паходы на прыроду, у лес. Снежань месяц, зямля прыцярушана лёгкімі сняжынкамі... Гучаць вершы ўперамешку са смехам, віскам: нехта знайшоў куст каліны! Міхасю трапілася на вочы арабіна. Карацей, усё здавалася цікавым, незвычайным і вартым увагі...

І Стральцоў, і Грачанікаў, і Бураўкін, і Вярцінскі уяўляліся нам недасягальна таленавітымі і ў той жа час — сваімі, а не чужакамі. Мы ўсе былі людзьмі аднаго раду і роду...

Недзе гады праз два я сустрэла Міхася Стральцова ў выдавецтве, калі заносіла туды рукапіс сваёй першай кнігі. Вершы

яму глянуліся, ён тут жа, на маіх вачах, адрэдагаваў некалькі, чым вельмі мяне здзівіў: выпраўленыя радкі гучалі адназначна лепш, прытым не парушаўся аўтарскі почырк.

Потым я ўсім расказвала пра тую сутрэчу, а Вярцінскаму нават прызналася: «Вось бы мне такога рэдактара!» Але Вярцінскі сам згадзіўся паглядзець мой рукапіс... Ягоныя праўкі былі даволі слушнымі, але адрозніваліся ад стральцоўскіх. Гэта была праўка рэдактара, погляд збоку... А Міхась уносіў праўкі ў тэкст так, быццам сам яго напісаў, ягоны стыль зліваўся з аўтарскім стылем арганічна. Ён мог, напрыклад, замяніць слова, падабраўшы да яго такі сінонім, што радок раптоўна ажываў. Напрыклад, у маёй паэме «Пялёсткі» ёсць радкі:

Паштальён прынёс павестку ў хату,
І забралі сына у салдаты.

Стральцоў замест «павесткі» ўпісаў слова «позва», і радок загучаў сапраўды па-беларуску: «Позву паштальён прынёс у хату...»

З тае пары я стала больш пільна ставіцца да карыстанага слоўнікавага запасу, і цяпер у мяне ёсць цэлы слоўнічак рэдкіх слоўцаў, з якімі ахвотна дзялюся з чытачамі. Ён нават змешчаны асобна ў манаграфіі Алеся Бараноўскага пра маю творчасць «За прамень схаплюся і жыву».

Пазней я была запрошана на творчую вечарыну Міхася Стральцова, якая адбылася ў Доме літаратара ў Мінску. Пазнаёмілася з яго жонкай Ленай, мы сталі сяброўкамі. Аднойчы я прыехала да Стральцовых у госці з двума маладымі гомельскімі паэтамі — Ігарам Журбіным і Віктарам Кіенем. Затым і Міхась завітаў да нас у Гомель. Горад наш яму спадабаўся. Нават застаўся фатаздымак, дзе я, адораная увагай хлопцаў, сяджу на маленькім коніку — поні...

Неяк Міхась з жонкай Ленай і дачушкай Алесяй завіталі да нас з мужам у госці. Алеся з маёй Алёнай былі амаль равесніцамі. Так мы пасябравалі сем'ямі. Дарэчы, і Алеся, і яе маці з жаночай пяшчотай шчыравалі вакол Міхася. Гэта было і засталося ў характары Лены на ўсё жыццё: яе шчырасць,

прастата і дасціпнасць у адносінах. Калі надараліся нейкія непаразуменні, то Лена ўсё пераводзіла ў жарт, распавядала пра гэта з такім гумарам, што Міхась тут жа пачынаў усміхацца і гучна рагатаць ад усёй душы. Ён прызнаваў і цаніў гэты талент сваёй жонкі, ды і сам іншы раз умеў ёй падыграць, таму ў іх кампаніі было заўсёды проста і весела. Гасцінныя і дабразычлівыя, яны дзяліліся сваімі гаспадарчымі сакрэтамі.

Аднойчы падалі на сняданак звычайны супчык, у якім разбавілі чайную лыжачку гарчыцы. Ягоны смак помню і сёння і карыстаюся гэткай прыправай сама. Вось паспрабуйце — спадабаецца...

Надарылася неяк быць у Мінску на курсах павышэння кваліфікацыі. Я працавала на Гомельскім тэлебачанні — з лёгкай рукі Генадзя Бураўкіна, які ўзначальваў тады дзяржаўны Камітэт па тэлебачанні і радыё. На Беларускім тэлебачанні ў той час працавала і Вольга Іпатава — яшчэ адна каралішчавічанка, як усіх нас «ахрысціў» малады паэт Лёня Якубовіч. На курсах была адна асоба, такая прыгожая, танюсенькая, маладзенькая — проста Божы шэдэўрык, якім захапляліся нават жанчыны. Я і скажы пра гэта Міхасю па тэлефоне. Ён тут жа нечакана заявіўся са сваім сябрам Віктарам Карамазавым — паглядзець. Мне ў той час нездаровілася, а ўсе астатнія пайшлі на заняткі. Хлопцы нашу прыгажуню не засталі, але не засмуціліся. Карамазаў разаслаў на ложку сукенку прыгажуні, панчохі, паясочак пасярэдзіне... І давай з ёй «знаёміцца», кампліменты рассыпаць. Насмяшылі мяне хлопцы, нашумелі — і зніклі, як і з'явіліся, паабяцаўшы наведацца яшчэ.

Трэба зазначыць, што Міхась любіў жартаваць і ўмеў гаварыць жанчынам кампліменты, ды так, што адразу і не зразумееш, дзе жартам, а дзе ўсур'ёз. Аднойчы надпісаў мне сваю кнігу крытычных артыкулаў так:

Нікіцінай Ніне
І Шкляравай Ніне:
У тым я не вінен,

Што перад паненкай
Упаў на каленкі.

Я шчыра здзівілася: «Нешта я не помню такога. Калі гэта ты кленчыў?» «Толькі што!» — адказаў Міхась і — гоцнуўся на калені!

Замацаваць дружбу не давялося. Мой муж паехаў на заробкі ў Расію ды там і застаўся. Было не да сяброў. Атрымала неяк пісьмо ад Лены, затым паштоўку ад самога Міхася, абодва спачувалі мне і перажывалі за наш з мужам развод...

Неўзабаве і я пераехала ў Расію: прымусіла сябе выйсці замуж. Сёння смешна, але тады я вельмі баялася застацца адна. Думала: закончыць дачка педвучэльню ў Гомелі, паступіць у Літаратурны інстытут у Маскве... Так яно і здарылася, але са сваім новым мужам, палкоўнікам, я разышлася праз тры гады... Калі мы з маёй Аленай Алешынай наведалі родную Беларусь, Міхася Стральцова ўжо не было... Распытвала мінскіх знаёмцаў пра Лену і пачула, што яна з'ехала за мяжу, не пакінуўшы адрасу.

Алена Стральцова сама знайшла мяне — аж у 2015 годзе, не ведаючы таго, што я стаю над прорвай. Маёй дачушцы якраз зрабілі аперацыю. Наперадзе чакала хіміятэрапія. Я паабяцала сяброўцы прыехаць, але прызналася ёй па тэлефоне пра сваё гора не адразу. Неўзабаве яна ізноў зазбіралася за мяжу. І адтуль цераз добрых знаёмых перадала грошы на лекі, падтрымлівае мяне і цяпер, вярнуўшыся на радзіму, хаця сама неаднойчы апыналася на бальнічным ложку. Але ж не скардзіцца на здароўе, любіць успамінаць пра мужа. Прызналася, што знайшла мяне, дзякуючы Міхасю, які запісаў мой тэлефон у нататніку.

Міхась Стральцоў быў шчырым сябрам і клапатлівым бацькам. Дачка Алеся вельмі яго любіла, шануе і цяпер.

Мяне ў жыццёвай цераспалосіцы заўсёды падтрымлівалі сябры, іх жывое слоўка. І сёння я адчуваю іх спачуванне і падтрымку — праз іх вершы, аповеды, лісты. Перачытваю Стральцова...

Мікола Гіль

Мой сябра Міша Стральцоў

«Няма таго, што раньш было...» Гэтае просценькае сцвярджэнне паэта, дзякуючы песеннай акрыленасці, нечакана стала вядомым і набыло ці не абагульняючы, усеагульны сэнс. Куды ні кінь вокам, аб чым ні падумай, што ні згадай — сапраўды, няма таго, што было раней. Самае ж жахлівае, што няма не толькі таго, але і тых — аднагодкаў, саслужыўцаў, знаёмцаў, дружбакоў, сяброў. Пагорнешся перабраць старыя паперы, пісьмы, фотакарткі — і зжахнешся: і гэтага ўжо няма, і таго, і гэнага... Уздыхнеш, паківаеш горка і няўцешна галавою — блізіцца і твая пара! — завяжаш матузкі распатрошанай папачкі і пакладзеш яе на ранейшае месца ў шуфлядку, каб праз нейкі час зноў дастаць у адказ на покліч так і несупакоенай душы. Мо не на покліч — на напамін. Аб тым, што мо ўсё ж варта было б сёе-тое запісаць-занатаваць. З таго, што помніцца [...].

На васямнаццатым годзе жыцця быў я наіўна-неразумным, агорнутым дашчэнту сумненнямі і няўцямнымі мроямі падлеткам. Хацелася, вядома, стаць студэнтам, але — не верылася, што такое можа здарыцца са мною папраўдзе. Адчуваў сябе нявартым статусу студэнта самога БДУ! Той хлапечы комплекс прыгнятаў і прыніжаў мяне страшэнна. Пэўна ж недзе ёсць сур'ёзныя, сапраўды здольныя і разумныя юнакі, цвёрдыя і вызначаныя ў сваіх намерах і жаданнях, вартыя быць студэнтамі ўніверсітэта, прытым — акурат творчага, не абы-якога! — аддзялення журналістыкі. А хто і што я? Кволыя і не надта важкія, а папросту легкаважкія на думкі і высновы школьныя крэмзы — вось і ўвесь мой набытак і заяўка на творчы патэнцыял.

З гэтым непераадольным (і непераадоленым) адчуваннем боязі, няпэўнасці, нерэальнасці задуманага ехаў я і на экзамены. Пачуццё боязі было, бадай, большае, чым падчас падачы дакументаў у прыёмную камісію.

Прыцёгся з фанерным куфэрачкам (тагачасным «дыпламатам») ва ўніверсітэцкі скверык з бетонным хлопчыкам у сухім фантане, сеў на лаўку і... стаў чакаць. Чаго? А ліха яго ведае!

Ну не вялі мяне ногі ў тую прыёмную камісію, куды, паводле атрыманага запрашэння, я павінен быў звярнуцца. Не хапала ў мяне рашучасці вось так, з ходу, пайсці туды. Трэба было, няйнакш, супакоіцца, перадыхнуць, астынуць.

Каб не сядзець проста так, дастаў з куфэрка падручнік «Эканамічная геаграфія СССР», разгарнуў яго, спрабуючы засяродзіцца на лоўленых вачыма радках. І, мусіць жа, засяродзіўся папраўдзе, бо не адразу заўважыў, што паблізу ад мяне, на тую ж лаўку, прысеў хлопец. Схамянуўся тады, калі той, падсунуўшыся бліжэй, торкнуў пальцам мяне пад локаць і спытаў:

— Старичок, у вас и в школе география была по-белорусски?

Я зірнуў на яго. Відочна не вясковы хлапец. Апрануты не ў вельветавую футболку (ці камізэльку) з замочкамі-кішэнькамі на грудзях, а ў самы што ні ёсць касцюмец, і чаравікі — не брызянтовікі, навэцганыя для бляску гуталінам, а цалкам скураныя. І нават тварам не вясковы. Чысты, светлы твар, не ўрудзелы-абсівераны. І вочы — разумныя, учэпістыя. Чаго ж тады пра дурное пытаецца? Усё па-беларуску было, дык чаму геаграфія будзе выключэннем?! Сусед жа нечакана спытаў:

— На экзамены приехал?

— Ага.

— А куда поступаешь?

— На філфак, аддзяленне журналістыкі.

— Ну даешь, старче! Так и я же на журфак!..

— А ты адкуль прыехаў, што гэтак пытаешся?

— Со Славгорода Могилёвской области.

— Дык а ў вас што, не па-беларуску вучылі?

— По-русски, старичок. Всё по-русски. Я впервые такую книжку вижу. И ты понимаешь всё? Ну-ка, переведи по-русски этот абзац!

Дзівак нейкі, падумаў я пра нечаканага суседа па лаўцы. Магілёўшчына — гэта ж Беларусь, дык чаго прыкідваецца гэткім русаком? Не верыць, што я і па-руску ўмею? Ці бачыш, перакладзі яму! Я трошкі паспешліва і, напэўна, не надта складна пераказаў паказаны ім абзац па-руску. Хлапец усміхнуўся, сказаў, бы пахваліў:

— Да-а... А у нас такой практики нет. В смысле — навыков. Ты же и с русского на белорусский можешь так же?

Я кіўнуў.

— В приёмной был уже?

— Не яшчэ...

— Тогда пошли, покажу. Рядом койку займёшь. Была свободна. Кстати, меня Михаилом звать. А тебя?

Так адбылося маё знаёмства з... Міхасём Стральцовым, якое перарасло ў добрае сяброўства і доўжылася не адзін дзясятак гадоў. А калі дакладна, дык роўна трыццаць гадоў і тры гады, бо сустрэліся мы ў жніўні 1954-га, а развіталіся назаўжды ў 1987-м, таксама ў жніўні, калі яго забрала гэтак заўчасна, у самы, як кажуць, поўдзень веку бязлітасная смерць...

У той далёкі — Божа, прайшло болей за паўстагоддзя! — і незабыўны дзень Міша (гэтак звалі яго мы, сябры-аднакурснікі, асабліва напачатку, першыя тры-чатыры курсы сумеснай вучобы, да той пары, калі ён пачаў друкаваць апавяданні і крытычныя артыкулы і набыў новае, літаратурнае, афіцыйна замацаванае імя — Міхась) узяў нада мною шэфства (якое, зноў жа, доўжылася шмат гадоў), завёў у прыёмную камісію, дзе зафіксавалі маё прыбыццё на экзамены, дапамог атрымаць накіраванне ў інтэрнат і «определил» на суседні са сваім ложак у аграмаднай спартыўнай зале хімічнага корпуса.

А галоўнае — мы разам пераадолелі ўсе сем бар'ераў уступных іспытаў — экзаменаў было акурат сем: такая вось шчаслівая лічба-колькасць. Сталіся яны для нас сапраўднай эпапеяй, пра якую грэшна не расказаць.

Сачыненне па рускай мове і беларускую дыктоўку мы абодва напісалі на чацвёркі. Літаратуры — беларускую і рускую — здалі на выдатна. Згаданая геаграфія СССР прынесла нам, зноў жа, па пяцёрцы, як і гісторыя таго ж СССР. Засталася — замежная мова, а папраўдзе і для Мішы, і для мяне — нямецкая. Самае наша, як цяпер кажуць, слабое звяно: і мяне, і Мішу нямецкай мове вучылі, бадай што, былыя сяржанты-старшыны, якія вярнуліся з пераможанай Германіі і трошкі «шпрэхалі» панямецку.

Што рабіць, як адолець гэты апошні і самы небяспечны бар'ер? Міша прапанаваў:

— Пойдём, старичок, последними. Пусть немка устанет, и все мы ей осточертеем!

Экзамен прымалі дзве «немкі». І дасюль памятаю прозвішчы абедзвюх, але згадваць тут іх не буду. Адно скажу, што адна з іх лічылася «добрай», другая ж — «лютай». Мы з Мішам сталі ў чаргу, само сабою, да «добрай». Ды трапіць да яе нам не собіла. Калі паперадзе нас пад дзвярыма кабінета заставалася двое-трое такіх жа пакутнікаў, «добрая» прачыніла дзверы і сказала:

— Вас четверо? Даже пятеро? Извините, но всех принять я не смогу — мне к пяти надо быть в другом месте. Пожалуйста, вы, двое последних, перейдите в другой кабинет, я скажу, чтобы вас приняли там.

Ну што тут скажаш? Сапраўды: як сіраце жаніцца, дык і ноч кароткая! Панік я, павесіў нос. А Міша казырыцца:

— Ничего, старче! Будет и на нашей улице праздник! Идём, как договаривались, последними. А там — Бог не выдаст и свинья не съест!

Прыйшла ў рэшце рэшт і наша чарга. Зайшлі мы, як апошнія, разам, не паасобку, абілеціліся, селі за сталы рыхтавацца. Першым «лютая» запрасіла да свайго стала мяне. Тэкст я сяк-так пераклаў, нешта спрабаваў бэкаць-мэкаць пра скланенні-спражэнні... Не даслухала мяне «лютая», запыніла:

— Сядьте, обождите. Послушаю вашего товарища. Товарищ ведь, да?

Міша бэкаў-мэкаў ці не горш за мяне. Замежныя мовы, па ўсім, даваліся яму з цяжкасцю, сведкам чаго даводзілася быць і пасля, калі мы разам, ужо студэнтамі, спрабавалі асіліць англійскую і здавалі так званыя «тысячы» — аб'ём перакладаў вылічваўся ў тысячах друкаваных знакаў.

«Лютая» гэтак жа, як і мяне, не даслухала і Мішу. Нечакана звярнулася да нас абодвух:

— Вы не спешите? Пожалуйста, соберите чернильницы и словари и занесите в деканат. Я там буду.

І пайшла. Завіхнуліся мы з Мішам, паскідалі на падносік чарніліцы і ручкі, паскладалі ў стосы слоўнікі, занеслі ў дэканат. «Лютая» — там. Паглядзела на нас, сказала:

— Спасибо. Хорошие вы, видно, ребята, и ваши экзаменационные листки мне не хотелось бы портить, но больше тройки поставить вам не могу. Обоим! Видит Бог, не могу!

Я маўчаў. Бо — што тут скажаш? Праўда на яе баку. А Міша падаўся наперад, сказаў:

— Мы знаем, что больше тройки не заслуживаем. Но с тройкой — не поступим, конкурс не пройдём.

— Точно не пройдёте? — неяк няўпэўнена спытала «лютая».

— Стопроцентно! Тридцать один балл — непроходной! — адчаканіў Міша.

— Что же делать, ребятки? Жаль мне вас, но...

— Если поступим, мы перейдём в группу начинающих английского языка! — падхапіў Міша.

— Ах, так вы немецкого ещё и не любите?! Ну, знаете...

Села за стол «лютая», чырканула штосьці ў нашых экзаменацыйных лістках, хуценька падала іх і рукой махнула, выправоджваючы нас за дзверы:

— Берите! Всё!

Выскачылі мы на калідор, зірнулі ў лісткі, а там — і ў мяне, і ў Мішы — «хорошо»! Анямелі мы ад радасці, ногі ў нас здранцвелі. Першым ачомаўся, вядома, Міша, — зрэшты, я ці не з першае хвіліны знаёмства пакорліва падпарадкаваўся яму ва ўсім, бадай. Адчыніў ён дзверы дэканата — рыўком, без стуку — і сказаў-выгукнуў:

— Спасибо! Обещаем: изначально английский!

І сёння не ведаю, ёсць Бог ці няма яго, але тое, што нешта звышняе ўсё ж ёсць, не буду аспрэчваць. Як-ніяк, а студэнтамі мы сталі. Ці не адны з трыццацю двума баламі.

А праз нейкі пяток дзён паехалі мы на першую студэнцкую «бульбу» — памагаць так і не акрэплым за дзесяць паваенных гадоў калгасам выбіраць-ратаваць, каб не пайшоў пад снег, «другі хлеб».

Пра штогадовыя восеньскія выезды на «бульбу» варта, проста неабходна сказаць таксама асобна. «Бульбу» мы і праклінaлі (асабліва калі верасень надараўся дажджлівы і халодны), і блаславлялі. Месяц, праведзены ў калгасе, асабліва на пачатку, быў часам нашага збліжэння, сяброўскага яднання, акурат там завязваліся повязі дружбы, успыхвалі першыя сапраўдныя пачуцці, што прыходзілі на змену ранейшым школьным закаханасцям. Сумесная і нялёгкая праца, жыццё і сталаванне ў хаціне адзінокіх (часцей за ўсё) жанчын спрыяла таму, што кожны з нас адкрываўся, так бы мовіць, сваімі лепшымі і, вядома ж, нялепшымі якасцямі, і ў выніку ўзніклыя там узаеміны вызначалі стасункі аднаго з адным на многія будучыя гады — не толькі студэнцкія. Там проста нельга, немагчыма было прыкідвацца добранькім, лепшым, чым ты ёсць на самай справе. Калі ты гультай, дык гэта абавязкова неўзабаве выяўлялася. Калі хамула, нявыхаваны чалавек, нягжэчны кавалер і наогул абдзелены пачуццём мужчынскай годнасці — гэта таксама не магло надоўга схавацца ад чужога вока, найперш — ад дзявочага.

«Бульба», можна сказаць, была безумоўна таксама нашым «універсітэтам», найперш, вядома, маральна-выхаваўчым. Больш за тое! Хто не прайшоў праз «бульбу», той і свой галоўны ўніверсітэт прайшоў, як кажуць, не на ўсе сто. Недарэмна ж хлопцы-паэты прысвяцілі «бульбе» нямала вершаў, а Іван Якаўлевіч Навуменка, наш выкладчык, дарэчы, які акурат тады, у сярэдзіне 50-х, заявіў пра сябе і як таленавіты аўтар лірычнай прозы, напісаў нават аповесць з гэткай роднай, смачнай, дарагой і памятнай назваю — «Бульба».

Дык вось, літаральна на пяты дзень нашага студэнцкага жыцця апынуліся мы ў вёсачцы Сіняло пад Мінскам, паблізу славутых «Каралішчавічаў» — пісьменніцкага Дома творчасці. Дэсант наш складаўся з дзесяці чалавек, падзеленых акурат пароўну: пяцёра дзяўчатак і пяцёра нас, хлапцоў. Канкрэтна: Міхась (не, яшчэ проста Міша) Стральцоў, Слава Куцэнка, Грыша Казлюк, Віталь Канавалюк і я.

Мы атабарыліся ў адной — невялікай, не надта дагледжанай хаціне стараватай ужо кабеты-ўдавы, якая жыла са сваёй

дачкой-пярэстаркай, дзяўчаткі нашы — у другой, трошкі лепшай, прасторнейшай хаце, з чыстай палавінай. Мы ў сваёй бабы Ёўгі (гэтак, здаецца, звалі нашу гаспадыню) спалі на падлозе, на трох бярэмях разасланае саломы, а дзяўчаткі — на ложках, хоць і не ўсе паасобку, лягалі і па двое.

Харчаваліся мы разам, у «дзявочай» хаце: нашы аднакурсніцы па чарзе гатавалі немудрагелістыя стравы з калгасных прадуктаў (малако, мяса, бульба) на ўсю нашу дружную дзясятку.

Жылі мы (і працавалі) там сапраўды дружна. І весела. Удзень выбіралі бульбу — уручную, услед за плугам, што разганяў барозны. Конікам і плугам кіраваў вясковы хлапец, як і другім, запрэжаным у калёсы, на якіх выбраную бульбу адвозілі да будучага бурта. Сяды-тады і з адным канём, і з другім упраўляўся хто- небудзь з нас: усе пяцёра былі дзецьмі вёскі.

Зрэшты, не зусім. Найперш, хоць нарадзіўся і жыў у вёсцы (дарэчы, з незвычайнай назвай Сычын), не выглядаў вяскоўцам Міша. Па-першае, бацька яго быў настаўнікам, гэта значыць, вясковым інтэлігентам, што само па сабе вылучала ягоных дзяцей сярод астатняга дзіцячага гурту.

Не зусім нехлямяжым вяскоўцам выглядаў і Слава Куцэнка з Талькі на Пухавіччыне. Талька — вёска, вядома, але і не зусім вёска, бо і колішняе мястэчка, і чыгуначная станцыя ў дадатак. А галоўнае, гадаваўся Слава не ў чыста вясковай, калгасніцкай сям'і: маці, зноў жа, была настаўніцай, а бацька — чыгуначнікам.

Сякую-такую выкшталцонасць мелі і Грыша з Віталем: абодва былі з-пад Белавежскай пушчы, з былой Заходняй Беларусі (тым часам яшчэ адрознай ад Беларусі Усходняй, здаўна савецкай і акалгасненай). Палякі-акупанты, каланізуючы край, спольшчвалі, а лічылі, што «акультурвалі», і апратку, і паводзіны, і побыт «тутэйшых». У сім-тым, трэба прызнаць, сапраўды акультурвалі: прымушалі, напрыклад, бяліць вапнай сцены хат і платы ўздоўж вуліц, забаранялі гнаць самагон і вырошчваць тытунь на гародах. Зрэшты, у галоўным — у мове — пальшчызна асабліва не адчувалася. Наадварот, Грыша з Віталем, як і Міша, размаўлялі бадай што чыста па-руску, і гэта

красамоўна сведчыла аб тым, што савецкія бальшавічкі не гэтак стараліся вынішчаць на колішніх «крэсах усходніх» пальшчызну, як — беларушчыну.

Па-беларуску — заўсёды і з усімі — размаўлялі толькі мы са Славам. А калі і зусім папраўдзе, дык — адзін я, грэшны, бо і ў Славы язык неяк надта лёгка, нават на дзіва лёгка траціў нашую беларускую цвёрдасць і зацвярдзеласць у вымаўленні шыпячых ды літары «р».

І хоць стамляліся на полі за дзень, класціся спаць не спяшаліся: маладосць брала сваё. Вечаравалі звычайна ў хаце ў дзяўчат. Гулялі ў карты (часцей за ўсё — у «падкіднога»), зрэдку — у фанты, круцілі на падлозе бутэльку, у выніку чаго тыя, на каго паказвалі рыльца і дно, павінны былі цалавацца. Вядома: якія самі, такія і сані.

Былі мы дзецьмі вёскі (тады яшчэ далёка не ўсюды нават электрыфікаванай), і гульні нашы былі таксама вясковыя. Дзяўчаты нашы, за выключэннем адной, таксама паходзілі з вёскі.

Міша крывіўся, гледзячы на нашы забавы. І не таму, пэўна, што яны былі яму чужыя. Умеў ён рэзацца і ў «дурня», знаў і гульню з пустою бутэлькаю. Але ўсё гэта было для яго пройдзеным этапам, акурат дзіцячымі забаўкамі, якія ён даўно перарос. Ён наогул быў сталейшы сярод нас — не па гадах, не фізічна, так бы мовіць, а маральна, духоўна, псіхалагічна. Нас уражвала ягоная начытанасць (ужо тады па памяці шмат чытаў Фета, Цютчава, Баратынскага, Пушкіна, Лермантава, Ясеніна, у той час як пра вершы першых трох, ды і апошняга, Ясеніна, мы, Мішавы равеснікі і аднакурснікі, мелі вельмі цьмянае ўяўленне, альбо нават і ніякага), мы з павагаю і ўвагаю ставіліся да ягонай сталай, мужчынскай разважлівасці, выхаванасці, акуратнасці, інтэлігентнасці. Гадамі ён быў роўны з намі, нават трошкі маладзейшы, аднак жа мы былі побач з ім самымі што ні ёсць жаўтароцікамі, «недорослями».

Ягоны аўтарытэт і ў нас, хлапцоў, і ў нашых дзяўчатак быў неаспрэчны. Сталасць ягоная выяўлялася і ў іншым. Прыкладам, у тым, што ён заўзята, па-даросламу, са смакам курыў.

Акурат дзякуючы Мішу гэтым заганным заняткам спакусіўся і я з Грышам Казлюком. І як было не спакусіцца! Задажджыць на дзень-другі, і што рабіць? У полі працы няма. Якая праца, калі з хаты не выткнуцца? Ды і ў хаце сядзець няўтульна — у нашых бедных апратках дрыжыкі бяруць. Паратунак знаходзілі на печы, балазе ў бабы Ёўгі была яна, як зазвычай ва ўсіх старых хатах, вялікай, прасторнай. Усім нам хапала на ёй месца, нават яшчэ і аднакурсніца каторая месцілася, калі з якое нагоды прыходзіла ў нашу хлапечую «обитель» (Мішава слоўка): маўляў, лезь, пагрэйся, не з'ядзім цябе тут, нават не заказычам [...].

Само сабою, разам з папяросай з'яўлялася на шырокай Ёўгавай печы і пляшка са звычайнай вясковай самагонкай-сівухай. Не скажу, што і тут прэрагатыва належала Мішу, аднак жа ўпершыню здарылася тое не без яго ўдзелу. Умеў ён падлабуніцца да старой Ёўгі, асабліва ж — да ейнае дачкі Гэлі і выцыганіць у іх пляшку мутнаватай і далёка недухмянай вадкасці, якая, аднак, добра-такі гарэла сіняватым агнём не толькі на абмокнутай у яе паперыне, але і на пальцы.

Маладосць — залатая пара, вядома. Але ж яна і поўная небяспек, падманных спакус, гэтая самая маладая пара. І найпершая, і найжахлівейшая з іх — спакуса Бахусам. Калі тытунь разбурае цела, дык гарэлка — услед за целам, а мо найперш — душу. Пачынаецца з бяскрыўднага нібыта: пляшка — на пяцёх. Ды надта ж хутка там, дзе была адна, паяўляецца другая пляшка, трэцяя...

Гэтак было, бадай, і ў нас тым вераснем 1954 года ў Сіняле. Здаецца мне, што акурат там мы зрабілі першыя бяздумныя, а папраўдзе злачынныя крокі па шляху злоўжывання, як кажуць, алкаголем, а без эўфемізмаў — па шляху п'янства, якому кожны з нас (за выключэннем хіба Віталя Канавалюка) аддаў даніну спаўна, бо кошт гэтае платы-даніны сягае, не кажучы пра ўсё іншае, нават, на жаль, да кошту жыцця...

На той першай «бульбе» мы і ўлюбляліся. Па-хлапечы яшчэ, чыста платанічна. Прынамсі, магу сказаць гэта пра сябе і пра згаданага вышэй Віталя Канавалюка. Грыша Казлюк быў верны сваёй абранніцы-аднакласніцы, якая таксама стала сту-

дэнткай, але ў Брэсце. Славу Куцэнку не хапіла часу, каб скалануцца ад угледжанай дзявочай красы (быў ён магутным здаравяком, за пудоў шэсць вагою, скалануць «этакое богатое тело» мог толькі вельмі моцны любоўны ўдар), а Міша...

А Міша наш, здаецца, ужо ведаў дзяўчат, наогул жанчын нашмат глыбей, глядзеў на іх зусім іншымі вачыма, чым мы, маладыя неапераныя пеўнікі, — ну хоць бы я ды Віталь. Нам наогул не пашанцавала. Віталю ягоная Дульсінея з ходу не адказала ўзаемнасцю, а мая абранніца ўрэшце прызналася мне, што любіць... Мішу. А Міша зусім з іншымі намерамі пазіраў ці не на Ёўгаву Гэлю. Здаецца, і не толькі пазіраў...

Чым не шэкспіраўскія сюжэты і страсці?! І дайце веры: у нас з'явіўся свой Шэкспір. Спытаеце, хто? Вядома ж, гэта быў Міша.

Аднойчы на той самай Ёўгавай печы (хто думаў-гадаў тады, што печ з цягам стане славутасцю Сіняла: на ёй ляжаў сам будучы класік беларускай літаратуры Міхась Стральцоў!) ён прачытаў вершаваны вадэвіль пад назваю «Одна ночь, или Завоевание плоти».

Дзейных асоб было ў ім столькі ж, колькі было нас у Сіняле. І ўсе — з празрыстымі прататыпамі, як пішуць крытыкі-літаратуразнаўцы. Сябе Міша вывеў (не пашкадаваў) пад імем Міхаіла Леанардавіча П'янчужкіна, мяне ахрысціў Мікалаем Сапфіравічам Страсцішкіным, згаданая аднакурсніца (мая абранніца без узаемнасці) стала Наталляй Багданаўнай Капрызінай, Віталь Канавалюк паўстаў у вадэвілі айцом Вінцэсіем...

Былі там і іншыя з нашага «бульбянага» кагала, але ў якой іпастасі — ужо не ўспамінаецца. Шкада, што твор не захаваўся. Зроблены ён быў па-стральцоўску. Але, але, ужо і тады — па-стральцоўску. На рускай мове, вядома. Як я казаў ужо, Міша тады, на пачатку, беларускім словам не азываўся. І вершы, як неўзабаве высветлілася, пісаў па-руску, і друкаваў іх у першыя студэнцкія гады — прынамсі, ва ўніверсітэцкай газеце «За Сталінскія кадры» і ў «Сталинской молодежи» (цяперашняя «Знамя юности»).

З вадэвіля засталіся ў памяці ўсяго толькі асобныя радкі, пачатковыя.

ПЬЯНЧУЖКИН (*один, трагически*): Проклятие! С ума сойти от скуки. И чем заняться в этакой дыре? Пить? Но судьба хранит меня от пьянства: в кармане денег нет на зубочистку! Взять у хозяйки в долг одну бутылку? Не то! Башмак заговорит скорее, чем у неё сочувствие и совесть! Проклятие! А дождь всё льёт, скотина! На небесах куда умнее Боги: всё водку пьют, а воду льют на землю...

СТРАСТИШКИН (*входит, меланхолически*): И умер бедный раб у ног...

ПЬЯНЧУЖКИН (*перебивая*): Капризной, взбалмошной девчонки, в любви признаться не успев и не доев всего варенья! Я угадал? Ведь ты идешь оттуда?

СТРАСТИШКИН: Ты угадал, мудрец. Но что ты понимаешь в любви да, кстати, и в варенье?..

Далей, хоць забі, нічога не прыпамінаецца. Твор жа быў досыць доўгі, на некалькіх лістках школьнага сшытка, густа спісаных прыгожым і дастаткова ўборыстым Мішавым почыркам. Прачытаны ён быў не толькі на печы бабы Ёўгі, але і на полі, у часе адпачынку, у прысутнасці дзяўчат. Чытаў там Мішаў твор я. Слухачы, зашыўшыся, каб было цяплей, у сухую жытнёвую салому, дружна і весела рагаталі.

Ды неўзабаве рогат той ледзь не вылез нам бокам. Пра вадэвіль нейкім чынам стала вядома нашаму ўніверсітэцкаму куратару. Дайшло і да вышэйшага начальства: маўляў, прапагандуецца распуста, маральная разбэшчанасць — вадэвіль жа, памятаеце, якую меў назву: «Одна ночь, или Завоевание плоти»! Назва найперш і спарадзіла ўвесь пярэпалах, бо сам тэкст не даваў аніякіх падстаў для асуджэння ці выкрыцця нечага, — усё там было вельмі прыстойна, нават гжэчна. Іначай і быць не магло, з-пад Мішавага пяра аніяк не магло выйсці нешта пахабнае, паскуднае, не здатны ён быў — з прычыны сваёй выхаванасці, інтэлігентнасці і выключнага літаратурнага густу — на нешта падобнае.

Ды сігнал прагучаў, і, «кабы чего не вышло», камсамол быў абавязаны прарэагаваць-папрацаваць. Дзякаваць богу, да крутых мер не дайшло, адно паўшчувалі, прыгразілі, па-

пярэдзілі на будучыню: калі зноў нешта такое ўчыніце — пашкадуеце!

Такое вось было ў нас першае знаёмства з творчасцю будучага Міхася Стральцова. Усе мы, вядома, аддавалі Мішу належнае. «Адна ноч...» была напісана здорава, дасціпна і складна, у дадатак, зважаючы на лёгка пазнавальных прататыпаў, надта ж трапна, і таму ацэньвалася намі яшчэ вышэй, проста надзвычай высока. Тым не менш, нейкага асаблівага значэння твору мы, здаецца, не надавалі. І не надта звязвалі яго з Мішавай будучыняй. Тым больш, што надалей ён, здаецца, нічога чагосьці падобнага больш не пісаў. Прынамсі, не было ў яго звычкі з ходу, з прычыны ці без прычыны гуляцца-пракочвацца рыфмаю па сябрах ці знаёмых, як рабілі гэта іншыя нашы курсавыя ці факультэцкія паэты.

А паэтаў тых сапраўды было на факультэце ўга колькі! Калі ў 20-я гады XX стагоддзя кузняй літаратурных кадраў быў славуты Белпедтэхнікум, дык пазней пальма першынства перайшла да БДУ, і найперш, вядома, да ягонага філалагічнага факультэта.

Асаблівы ж усплёск літаратурнага жыцця на філфаку прыпаў акурат на гады нашае вучобы там — на 50–60-я, што было вынікам, вядома ж, так званай хрушчоўскай «адлігі». За тыя гады з філфака, наогул з БДУ прыйшла ў літаратуру велізарная кагорта пісьменнікаў, цэлае пакаленне так званых «шасцідзясятнікаў», якое ў нас атрымала назву «філалагічнага пакалення».

Не магу ўстрымацца, каб не сказаць, што разам з намі, гэта значыць, у другой палове 50-х гадоў, на філфаку, на курс вышэй, вучыліся такія будучыя выдатныя нашы празаікі, як Вячаслаў Адамчык, Іван Пташнікаў, Іван Чыгрынаў, а на курс ніжэй — Барыс Сачанка і Янка Сіпакоў, што нашым аднакурснікам па філфаку быў сам Рыгор Барадулін!

Ды што казаць пра ўвесь філфак, калі толькі наш курс, дзве групы аддзялення журналістыкі выпуску 1959 года, даў беларускай літаратуры амаль два дзясяткі літаратараў, з іх ці не дзесяць сталі членамі Саюза пісьменнікаў. Гэта — згадаю з радасцю,

любоўю і павагаю — Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Сымон Блатун (трагічна загінуў у 33 гады), Аляксандр Станюта, Алесь Дзятлаў, Герман Кірылаў, Юрась Свірка...

Карціна будзе яшчэ больш уразлівая, калі дадаць, што многія нашы аднакурснікі сталі кандыдатамі і дактарамі філалагічных і нават эканамічных навук, выкладчыкамі ВНУ, кіраўнікамі СМІ і нават дыпламатамі. Зрэшты, дыпламат усяго адзін — Генадзь Бураўкін, кар'ера якога, пачаўшыся з журналістыкі (карэспандэнт галоўнай газеты СССР «Правды» па БССР, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», кіраўнік Рэспубліканскага тэлерадыёкамітэта), завяршылася дыпламатычнай службай — ён быў пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

А што да кіраўнікоў СМІ і іншых устаноў і арганізацый, дык, калі ласка: наша Эма Луканская шмат гадоў была уласным карэспандэнтам «Комсомольской правды» па Беларусі і галоўнай рэдактаркай газеты «Зорька», Мікалай Сакалоў — галоўным рэдактарам «Знамени юности», Фадзей Савіцкі — дырэктарам акадэмічнага выдавецтва «Навука і тэхніка», Уладзімір Скапа — галоўным рэдактарам газеты «Віцебскі рабочы», Вячаслаў Куцэнка — выкладчыкам на родным журфаку, Галіна Нужкова — рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура», а Ганна Лазоўская ўзначальвала ў апошнія гады савецкай улады такую сур'ёзную і нават досыць страшную ўстанову, як памятны і сёння Галоўліт: была наша Аня галоўным беларускім цэнзарам!

І гэта, канешне ж, не ўсе колішнія Мішавы і мае аднакурснікі. Пералічваць усіх і падрабязна гаварыць пра ўзятыя кожным з іх жыццёвыя і службовыя вышыні тут не выпадае. А сяго-таго згадаць усё ж хацелася, каб хоць трошкі падаць тыхчасовае Мішава атачэнне.

У 1957 годзе мы ўсім курсам ездзілі ў Маскву на вучэбна-азнаямленчую экскурсію з наведаннем рэдакцыі «Комсомольской правды» і, канешне ж, Маўзалея, Крамля і Траццякоўкі. Жылі мы тыя некалькі дзён у інтэрнаце нафтавага інстытута на Ленінскім праспекце (быў такі і ў Маскве, не толькі ў Мінску).

Пад жытло нам выдзелілі, паставіўшы ложкі, два Ленпакоі на дзясятым паверсе [...].

Для большасці з нас гэта быў першы прыезд у Маскву, і ў кожнага было досыць падстаў і нагод для ўласных радасцей, узрушэнняў і засмучэнняў. Апошніх — найперш з прычыны малалікасці альбо поўнай адсутнасці грошай, і гэта ў той час, калі маскоўскія крамы спакушалі шмат чым. Прынамсі, яны былі куды багацейшыя за мінскія. Асабліва засмучаліся ад гэтага нашы дзяўчаткі: нават і для самых разумных з іх транты і касметыка былі не на апошнім месцы.

Міша, здавалася, на адсутнасць грошай глядзеў з алімпійскім, як кажуць, спакоем. А мо гэтак толькі здавалася? Крамы з трантамі ці з чым іншым яго не цікавілі дакладна, хаця маці ў падарунак (мо і яшчэ некаму) нешта ўсё-такі, памятаецца, шукаў — не зацята, не настырна, а бегла так, назіркам. А пра суседзяў па інтэрнаце кітайцаў неяк сказаў, пакурваючы і гледзячы кудысьці ўбок і ўдалеч: «Вялікі народ, старча! Вучацца з ахвотаю. Не тое што мы. Паказваў сябе Кітай у мінулым, пакажа і ў будучыні. Павер майму слову, старычок. Недарэмна мой дзед Міхал казаў: «Пойдзе Кітай — усё кідай!»

Я адно пасміхнуўся: цюцелька ў цюцельку тое ж самае чуў і я ад свайго дзеда Мікалая!

А сёння, прыгадваючы гэта, ужо ці і не вусцішна робіцца: літаральна закідвае свет Кітай сваім шырспажывам. Пакуль што — пераважна шырспажывам, але ўжо ўсё больш і электронікай, і бытавой тэхнікай, пачаў ужо і аўтамабілямі [...].

У маладосці мы наўрад ці ўмеем бачыць і ўспрымаць адэкватна сябе і сваіх сяброў. Маладосць зусім не схільная да аналітыкі. Вось і нашага Мішу мы хоць і вылучалі, але ж успрымалі і прымалі ўсяго толькі сваім аднакурснікам, дружбаком. Лепшым, разумнейшым, таленавіцейшым сярод нас, аднак наўрад ці прыбягала да каго думка аб тым, што некалі наш Міша Стралец стане класікам роднай літаратуры, паставіць сваё імя побач з імем самога Максіма Багдановіча.

Не прадказвалі яму такой будучыні і ягоныя вершы, што зрэдку пачалі той парою з'яўляцца ў друку. Вершы пісалі на

філфаку многія, нездарма ж нават эпіграма хадзіла па руках аб тым, што досыць кінуць тут кіем у якога-небудзь студэнта, дык абавязкова патрапіш у паэта. Рускамоўныя Мішавы вершы, калі праўду казаць, былі досыць ардынарныя, хоць і бездакорныя з боку тэхнікі вершаскладання.

Думаецца, што і сам Міша не надаваў ім асаблівага значэння.

Аднойчы ж, у канцы пяцьдзясят шостага ці ў пачатку пяцьдзясят сёмага, на нейкай агульнай філфакаўскай лекцыі ў вялізнай 26-й аўдыторыі біякорпуса, Міша падсунуў мне па стальніцы некалькі лісткоў са сшытка: «Пробеги, старче». Гэта было апавяданне «Дома». Правільней — «рассказ», бо — паруску. Я тут жа, з ходу, прачытаў яго, балазе, почырк у Мішы быў вельмі разборлівы.

Прачытаў з асалодаю, з радасцю, з захапленнем. Усё было знаёмае, роднае: лета, вёска, бацькоўская хата, першае пачуццё і першы сум, нават яшчэ не сум, а толькі подых яго, папраўдзе — подых надыходзячага сталення. Я шапнуў Мішу: «Здорава, старычок! Трэба друкаваць!» Ён пасміхнуўся: «Дзе, Шаноўны?» (Шаноўны,— такое трошкі, мусіць, і здзеклівае імя я нечакана займеў сярод аднакурснікаў, бо некалькі разоў ужыў гэтае самавітае слова-зваротак, пэўна, не заўсёды дарэчы.

Сапраўды, дзе друкаваць? Каб па-беларуску, дык можна было б прапанаваць «ЛіМу», занесці ў «Полымя» ці «Беларусь», а найперш — у «Маладосць». Міша нечакана сказаў: «А ты не мог бы перевести?» Я без ваганняў, здаецца, згадзіўся і літаральна на наступных лекцыях перапісаў апавяданне па-беларуску.

Было тое, па ўсім, усё ж на пачатку 1957-га, вясною. Бо восенню таго ж года, у кастрычніцкай кніжцы чатыры гады назад створанага часопіса «Маладосць» апавяданне «Дома» было надрукавана. Мы ўсе шчыра віншавалі Мішу з дэбютам у прозе, зычылі яму новых твораў і публікацый. Да ўсяго гэтага ў мяне асабіста дамешвалася і задавальненне ад таго, што апавяданне з'явілася ў часопісе амаль няпраўленым, у тым выглядзе, у якім было пераказана па-беларуску мною.

Праз чатыры з паловай гады, у чэрвені 1962-га, Міша падарыў мне сваю першую кніжачку «Блакітны вецер». Расчуліў

дарчы надпіс: «М. Гілевічу. Табе, на чыіх вачах нарадзіліся гэтыя крэмзы. Не будзь да іх занадта строгі, дружа. М. Стральцоў. 5.VI.62 г.».

Кніжачку склалі сем апавяданняў, і ўсе яны, бадай, сапраўды нараджаліся на маіх вачах. Ці не кожнае з іх Міша даваў мне чытаць яшчэ да друку, у рукапісным выглядзе. Даваў па-сяброўску, але і з просьбаю не проста азнаёміцца, а прачытаць уважліва, нават пільна, прыдзірліва, асабліва — да мовы.

Ужо другое сваё апавяданне — «Мацеевы дровы» — Міша пісаў па-беларуску, адчуўшы, зразумеўшы, што акурат беларускае слова — родная стыхія, у якой яму будзе вольна і ўтульна, хоць тады яшчэ пачуваўся ў ёй не зусім упэўнена. Таму і прасіў чытаць як мага строга і прыдзірліва. Прасіў, ды спадзяваўся ўсё ж на самога сябе. Пасля маладосцеўскага дэбюту ён асабліва старанна ўзяўся за вывучэнне беларускай мовы, хоць рабіў гэта і раней, з першых, бадай, студэнцкіх дзён. Запоем чытаў Кузьму Чорнага, Якуба Коласа, выпрошваў у навуковай зале аддзела беларускай кнігі Ленінскай бібліятэкі забароненых тады яшчэ Лукаша Калюгу і Міхася Зарэцкага, штудзіраваў у той жа «Ленінцы» і бібліятэцы БДУ слоўнік Насовіча.

І радаваўся:

— Дзіўная штука, старычок! У маленстве, недзе ў пяцігадовым узросце, жыў я ў дзеда на пасецы. Дзед з бабаю між сабою гаварылі не так, як у нашай хаце, па-беларуску. І са мною — таксама. За колькі месяцаў я налаўчыўся па-іхняму. А пасля, вядома ж, забыўся. І думаў — начыста. А цяпер от чытаю Гарэцкага і адчуванне такое, быццам усё тое дзедава вяртаецца да мяне, як і не забывалася. Бы ўсплывае аднекуль з прадоння.

— Дзіцячая памяць учэпістая, — кажу.

— Не, старычок, тут, мяркую, іншае. Нешта геннае. Мусіць жа, і бацькі раслі, гадаваліся-падрасталі ў беларускім слове, маленства, юнацтва было ў іх роднаслоўнае, гэта пасля, як «выйшлі ў людзі», перайначыліся на іншае, блізкае, не чужое, але — не сваё. З іх генамі апратка душы і перадалася, пэўна, мне, нашчадку.

— Ну, ты куды загнуў!

— Дзедаў гэта след, Шаноўны, дзедаў, канешне! Але адчуванне сапраўды такое, што нібыта з самага падыспаду душы, дзе пачатак усіх пачаткаў. Ад таго вузельчыка, што татка з мамкай завязваюць.

Што ж, спрачацца не выпадала: Мішу — відней, натура ў яго тонкая, адчуванне наўрад ці падводзіць яго, мо такія імпэтныя ягоныя моўныя поспехі акурат і вытлумачваюцца геннай спадчыннасцю.

А поспехі былі папраўдзе нечуваныя. Ужо студэнтам чацвёртага, а тым больш пятага курса Міша ведаў, а галоўнае — чуў, адчуваў беларускае слова лепш за многіх з нас, якія карысталіся ім штодзённа і паўсюдна. Ён адчуваў яго прафесійна. І ў сваіх апавяданнях паўставаў ужо як таленавіты пісьменнік, маляўнічы мастак-лірык, а ў дадатак — і як тонкі, адмысловы стыліст. Чуццё на слова ў яго было сапраўды бездакорнае, аб чым сведчылі і ягоныя рэцэнзіі, літаратурна-крытычная артыкулы, вызначальнай рысай якіх быў акурат і глыбокі, тонкі моўны аналіз твораў, таго, наколькі ўдала выкарыстоўвае той ці іншы аўтар выяўленчыя магчымасці роднага слова.

Ён любіў слова. Захапляўся ім, як найвялікшым, амаль невытлумачальным цудам. Ён «мацаў» слова, браў яго «на зуб», смакаваў, наталяўся яго водарам. Радаваўся адметнаму, трапнаму, незацяганаму слову, як дзіця радуецца новай і займальнай цаццы.

Памятаю, з якой радасцю ён адкрыў для сябе другога нашага вялікага Максіма — Гарэцкага. Міша проста закахаўся ў яго. І не ў апошнюю чаргу як у знаўце (і майстра, вядома ж!) роднага слова, да ўсяго магілёўскага. Але, але, было ў Мішы і пачуццё мясцовага, так бы мовіць, моўнага патрыятызму.

— Па адукацыі, старычок, усяго каморнік, па-цяперашняму — землямер, — казаў Міша, прыжмурваючы ад расчуленасці чамусьці адно, правае вока, — а якое веданне мовы, якое чуццё, адчуванне слова, яго арганікі! Усе гады «Нашай нівы» — час апрабацыі, выпрацоўкі, шліфоўкі мовы, а ў яго, нашаніўскага аўтара, адразу — класічная моўная празрыстасць. Тайна сія веліка есць, старычок!

І ягоны твар свяціўся такой непадробна шчырай шчаслівай усмешкай-радасцю, што — добры і прыгожы — рабіўся яшчэ дабрэйшым і прыгажэйшым.

Танюсенькую сваю кніжачку з невялікай, але таленавіта напісанай, шчымліва кранальнай аповесцю «Адзін лапаць, адзін чунь» Міша падарыў мне з адмысловым аўтографам — слоўнаграфічным: «Лапаць (у дужках — малюнак лапця з аборамі) — лапаць (у дужках — дзве рукі з растапыранымі пальцамі) — філалогія. Ах, якія мы убогія!» Гэта аніякі не намёк на нешта ці на некага. Гэта звычайная Мішава самаіронія. Не выпінастая, не крыклівая, а — сцішаная, прыглушаная, бы трошкі нават сарамлівая і прабачальная. Маўляў, што ж тут зробіш, калі я (мы) такі(я) — убогія, як у гэтым выпадку. Хай сабе трошкі, але ўсё ж — убогія, старычок! Няма ў нас, казаў няраз Міша, ці то моршчачыся-крывячыся, як ад болю, ці то ледзь прыкметна ўсміхаючыся, тае еўрапейскае выхаванасці і энцыклапедычнай адукаванасці, страчана гэта намі пасля Скарыны. «І адкуль можа ўзяцца, старча?! Усе нашы адраджэнцы-пачынальнікі — інтэлігенты ў першым калене. І мы з табою такія ж убогія асцеты, як кажа слаўнай і дапраўды паэтычнай душы чалавек Сцяпан Гаўрусёў, сын Захараў, заўважу — і мой землячок-мугілёвец».

Аднойчы, завітаўшы да мяне ў хату, Міша ўгледзеў на самай ніжняй паліцы кніжнага стэлажа агромністага памеру фаліянт — «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы». Не паленаваўся, выцягнуў яго з-пад стосу кніг (атлас ляжаў плашмя, бо паставіць яго на паліцы з-за памеру было немагчыма) і пачаў гартаць.

І гэтак захапіўся, што не заўважыў нават пляшкі нашага любімага балгарскага белага «Міскету», якая з'явілася на стале.

Атлас, як кажуць, зачапіў яго за жывое. Ён нястомна накладваў празрыстую цэлафанавую кальку з нанесенымі на яе кропачкамі райцэнтраў на карты-схемы дыялектных адметнасцяў і заўзята каментаваў вынікі гэтых сваіх практыкаванняў. Супастаўляў і супастаўляў лексічныя, граматычныя і іншыя моўныя формы Міншчыны, найперш маёй

Лагойшчыны, з адпаведнікамі Магілёўшчыны, а перадусім — сваёй Слаўгарадчыны, радаваўся, як дзіця, адзначаючы між імі мінімальныя адрозненні ці амаль поўную адсутнасць іх.

— Паглянь, старычок: мова сведчыць, што крывічы і радзімічы — дзеці аднаго роду-племені, — гаварыў Міша, водзячы пальцам па бліскучай, бы навошчанай, кальцы. — Якое слова ні вазьмі — як у вас, гэтак і ў нас. Во, назвы дзён тыдня, субота, скажам: і ў вас «субота», і ў нас — «субота». У вас зафіксаваны прыметнікі «ільняны, льняны і альняны», і ў нас дакладна тое ж. У вас кажуць «у кажусе», і ў нас. У вас часцей «матка», чым «маці», і ў нас таксама. У вас кароткія формы роднага склону — «хат, сцен», і ў нас — таксама, старычок. А во, зірні, вашы формы — «у лясох, на лугох, на нажох» (як святой памяці Ян Дамінікавіч пісаў) — поруч з формамі «у лясах, на лугах, на нажах». Цалкавіта тое ж фіксуецца і ў нас. А во — адрознасць: у вас — «яблык», мужчынскі род, а ў нас — «яблыка», ніякага роду. У вас — «кажа, меле, грэе», і ў нас, хоць паблізу гавораць і «кажыць, меліць, грэіць». У вас — «пасвіць» і «пасціць», і ў нас — цот у цот. Але затое: у вас — «малако, масла кароўе», у нас жа — кароўскае. У вас «вярба», у нас — «верба», у вас — «несла», у нас — «нясла», у вас — «таўсты», у нас — «тоўсты», у вас — «зашчытак», у нас — «закот», у вас — «калыска», у нас — «зыбка». Розніца? Ды амаль ніякай, старча: што калыхацца, што зыбацца... Сам купіў атлас, Шаноўны, ці сфундаваў хто? Малойца, Сымонаў сын! Кніжка — не адарвацца! Якая наша мова багатая, старычок! Во, у вас — «рэзгіны», а ў нас — «рэзвіны»: што лепш? Выбірай, таварыш пісьменнік, даказвай перавагу свайго. А во, брат: у вас — «квактуха», а ў нас — «квакуха». Што скажаш? Маўчыш? А я кажу: і адно добра, і другое... Каб не такі вялізны фаліянт, узяў бы яго ў цябе ў доўг, пагартаць вольнай хвілінай спакойна, прайсціся па ўсіх рэгіёнах, параўнаць маўленне па мерыдыянах і паралелях...

Ляпнуўшы ўрэшце цяжкой каленкоравай вокладкай фаліянта, бы вечкам нейкага старадаўняга куфра, Міша задуменна і трохі меланхалічна загаварыў аб велізарнай каштоўнасці гэтае (стукаючы костачкамі пальцаў па атласе) кнігі і працы,

што крыецца за ёй, аб тым, што матэрыялы атласа красамоўна і пераканаўча даводзяць і сцвярджаюць адзінства і цэласнасць нашай мовы на ўсёй этнічнай тэрыторыі беларусаў (як гэта даказаў і паказаў вялікі наш вучоны і такі ж вялікі сын Беларусі акадэмік Яўхім Карскі); аб тым, як ён, Міша, з захлёбам чытаў слоўнік Бялькевіча, з радасцю адзначаючы, што гэта, па вялікім рахунку, слоўнік беларускай мовы, а не толькі так званы «краёвы», хоць ён, безумоўна, зафіксаваў найперш адметнасці гаворкі Магілёўшчыны; аб тым, што пісьменнікам трэба часцей зазіраць у слоўнікі і кніжкі кшталту дыялекталагічнага атласу (і зноў ціхае пастукванне костачкамі пальцаў па масіўнай і цвёрдай вокладцы) ды чэрпаць адтуль, пералапачваючы слоўную руду, сапраўдныя моўныя залацінкі, бо ў многіх «братьев-писателишек» (Мішавы словы) мова шэрая і нясмачная, як «самагонка ў бабы Ёўгі з прыснапамятнага Сіняла, старычок».

Мы сядзелі, смакавалі балгарскі «Міскет» пад колішні сапраўдны (са слязьмі) швейцарскі сыр і гаманілі аб тым, як было б добра, проста выдатна («Нават слаўна, старычок!») прайсціся пешкі напрасткі, не надта трымаючыся бітых дарог, ад майго Лагойска да ягонага Прапойска. (Міша, дарэчы, рэдка калі гаварыў Слаўгарад, часцей іменаваў свой родны райцэнтр гэтым яго даўнім, спрадвечным імем, які ў старажытнасці зваўся таксама амаль гэтак жа, як мой Лагожаск, Прапошаскам, што лішні раз гаворыць за паходжанне ягонае назвы зусім не ад бальшыні там празмерных аматараў моцных напояў.) Прайсціся, паглядзець на Беларусь, паслухаць стрэчных простых беларусаў, няспешна падумаць аб імклівым бегу дзён, тыдняў, месяцаў і гадоў, а яшчэ на свае вочы і вушы пераканацца, што аніякіх моўных (і ўсялякіх іншых таксама!) меж між цэнтральнай Беларуссю і ўсходнім яе акрайкам не існуе і ніколі не існавала.

Прыжмурыўшы адно вока ў асалодзе ад пітва (Міша любіў добрае віно, ведаў у ім смак і мог ацаніць, пэўна, прафесійна), ён гаварыў нібыта фрагментарна, адрывіста, але, тым не менш, лагічна, слушна і пераканана:

— І адкуль ім быць, тым межам, старча? Хто скажа, дзе нашы межы ўвогуле, вызначаныя з навуковай скрупулёзнасцю

і дасведчанасцю тым жа Карскім? Ці чытаў ты Устаўную Грамату пра абвяшчэнне БНР? Ведаю, не чытаў, не мог чытаць. А мне добры чалавек даў. Там нашы межы акрэслены дакладна, старычок. І дзе ж яны, спытаем, дружа, яшчэ раз, — тыя нашы межы? У Расіі, старычок, у Літве, Латвіі, Польшчы, Украіне. Ува ўсіх нашых суседзяў. Усе нас абабралі. З усіх старон, як пісаў светлай памяці Ян Дамінікавіч [...].

А што да мовы твораў (у розных жанрах) самога Міхася Стральцова, дык яна дакладная, выразная, багатая, класічна чыстая і празрыстая літаратурная (у высокім і лепшым сэнсе гэтага вызначэння) беларуская мова, мова Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі, Максіма Гарэцкага. Асаблівага магілёўскага акрасу яна, бадай, не мае. Прынамсі, ён не кідаецца ў вочы, хоць сям-там пракідваюцца чыста мясцовыя, «сычынскія» слоўкі. Міхась зберагаў іх у душы нямала, часам з любоўю і асалодаю качаў іх на языку, але ў сваю паэзію, крытыку і нават прозу ўстаўляў вельмі і вельмі ашчадна. Чаму ж гэтак? А раптам там былі сапраўдныя моўныя жамчужынкі? Не штучныя, вядома, а натуральныя? Міша, пасмейваючыся вачыма і трошачкі куточкамі вуснаў, тлумачыў: «Мы літаратары беларускія, старычок, а не тутэйшыя...» Дарэчы, не ў прыклад многім кволенькім работнічкам пяра і алаўца, ён ніколі не гаварыў пра сябе, што ён пісьменнік, паэт альбо крытык. З той жа трошкі іранічнай і ледзь прыкметнай стральцоўскай усмешкай Міша мог на тэты конт іранічна зазначыць: «Сам Уладзімір Ільіч сціпла называў сябе ўсяго толькі літаратарам. Што ж тады нам караскацца, старычок, як той жабе, на купіну?..»

А, між тым, рознасць між намі, у пераважнай большасці дзецьмі вёскі, Міша заўважаў. І не толькі ў слове, у маўленні, хоць, вядома, найперш, вядома, акурат у гэтым.

Быў ён аднойчы ў мяне ў Слабадзе. На падворку, у дрывотні, у пуньцы, у якой мы начавалі на капе свежага сена, Міша разпораз пытаўся пра нашы, мясцовыя назвы прылад, начыння, розных пасудзін, жэрдак у плоце, пралётаў між слупкамі, пазоў і вуглоў зведзеных у вянкі бярвенняў хаты і гаспадарчых будынкаў, тут жа згадваючы свае мясцовыя, сычынскія,

прапойскія і наогул магілёўскія назвы. Аднолькава радаваўся і супадзенням, і рознасцям, асабліва, калі тая ці іншая рознасць мела ўсё ж адзіныя ці падобныя зыходныя карані.

Угледзеўшы прыржавелы пасля даўнаватага ўжо вясновага ворыва плуг пад сцяной дрывотні, папытаў, як у нас завуць яго вострую ніжнюю частку, лязо, што рэжа зямлю. «Нарог», — кажу. «А ў нас — лемеш. А яшчэ — бык, старычок! А сэнс адзін і той жа: рогам, валовым, бычыным рогам пароць, успорваць зямлю, раллю. Ах, якія мондрыя былі нашы продкі, старычок! Якія паэты!» — і Міша сцішана смяяўся, нейк загадкава-хораша жмурыў, бы ад цыгарэтнага дыму, вока.

Упадабаў ён маму. Нават пацалаваў ёй руку, калі мама падала на стол сваю каронную, можна сказаць, страву — засмажаны ў печы ў масле сыр, папярэдне добра-такі, да жаўцізны, падсушаны. Мама страшэнна збянтэжылася ад такога Мішавага парыву. А ён пасля сказаў мне задуменна і вельмі расчулена-пранікнёна: «Якія яны аднолькавыя, старычок, нашы мамы!..»

Я ў Мішы ў Сычыне не быў, але маму яго ведаў. Яна прыязджала ў Мінск, і мне надаралася быць у Мішы акурат у такія моманты, надаралася гутарыць і слухаць яго Марыю Міхайлаўну, і я ўслед за Мішам мог бы паўтарыць: «Якія яны аднолькавыя, нашы мамы!»

Ведаў я і сясцёр Мішавых — прынамсі, Валю і Ніну. Яны таксама неаднаразова прыязджалі ў Мінск, гасцявалі ў брата, і Міша часам запрашаў і мяне на тыя гасціны. Абаяльныя, прыгожыя былі дзяўчаты. Валя, калі не блытаю, была больш падобна да Мішы, чым Ніна. Абедзьве вылучаліся, як і іхні брат, нейкай невясковай выхаванасцю, інтэлігентнасцю, а ў дадатак і вабнасцю.

Бацькі ж Мішавага, Лявона Клімавіча, бачыць не давялося. Але чамусьці думаецца, што Міша і знешне, і ўнутрана шмат узяў акурат ад яго, вясковага настаўніка. Магу, вядома, і памыляцца, але нешта ўва мне — цьмянаватая згадка аб скупой і нешматслоўнай любові Мішы да бацькі — гаворыць за тое, што так яно і было.

Дарэчы, Міхась стаў Лявонавічам з цягам часу, можна сказаць, у апошнія гады жыцця. Дый то гэтак звалі яго сябры, калегі-пісьменнікі і добрыя знаёмцы. Афіцыйна ж ён быў Лявонцьевічам, а бацька, адпаведна, Лявонціем Клімавічам. Бацькава імя якраз і гаварыла аб тым, што Міхасёва малая радзіма — на ўсходзе Беларусі, бліжэй да мяжы з Расіяй. Толькі там мог быць Лявонцій ды яшчэ Клімавіч! Многае ўзяў Міша ад бацькі, ды ўсё ж за выняткам ці не галоўнага для яго — мовы, беларускага слова. Тут прэрагатыва была, вядома, за маці і за матчыным бацькам — дзедам Міхалам. Ці не ў гонар дзеда атрымаў Міша сваё імя? Па ўсім, так. Мне чамусьці хочацца іменна гэтак думаць. Ну хоць бы таму, што і сам я таксама атрымаў сваё імя ў гонар дзеда, матчынага бацькі Мікалая Давыдавіча. Дзеда Міхала Міша любіў, часта згадваў яго і ягоную пасеку, сваё жыццё ў маленстве ў дзедавай хаце. І таму зусім невыпадкова, што ці не самы пранізліва-шчымлівы твор Міхася Стральцова, — пра дзеда Міхалку. Маецца на ўвазе аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь»...

Але ж вярнуся на колькі гадоў назад, балазе, гэтыя нататкі сапраўды пакліканы найперш згадкамі маладосці.

К канцу ўніверсітэта Міша ўжо займеў, як кажуць, літаратурнае імя, і таму, натуральна, без нейкіх асаблівых турбот трапіў на працу ў «ЛіМ». Гэта для яго аблягчалася і той акалічнасцю, што Міша паспеў да тае пары ажаніцца і стаць законным мінчуком, гэта значыць, набыць пастаянную мінскую прапіску. Жонкай ягонай стала Галя Зязюлькіна, мінчанка, студэнтка педінстытута. Хлопцы нашы хадзілі туды, у педінстытуцкі «жаночы манастыр», на танцы. От там Галя і кінулася Мішу ў вока.

Зрэшты, мо і не так было. Зусім не на танцах пазнаёміўся Міша з Галяй. Мішу, як сыну настаўніка, паводле тагачасных законаў так і не далі інтэрната. Нейкі час ён сяк-так перакідваўся, начуючы ў пакоі то аднаго аднакурсніка, то другога: ці ўдвух на вузкім студэнцкім ложку, ці, ссоўваючы два ложкі, клаліся ўтрох. Урэшце вымушаны быў шукаць прыватнае жытло. І знайшоў яго на вуліцы Чыгуначнай, у адной з кватэр двух-

павярховага дома барачнага тыпу. Ці не ў сям'і Зязюлькіных? А ў іх была дачушка-студэнтачка Галя. Вось вам і знаёмства, вось вам і завязка з будучаю развязкаю. Выпадковыя, як усё ў жыцці.

Ды, урэшце, якая розніца, дзе і якім чынам яны пазнаёміліся і хто каго знайшоў? Факт застаецца фактам: студэнтам трэцяга курса Міша пабраўся з Галяй, чарнявай і кучаравай мінчаначкай, дачкою вайсковага адстаўніка з мілагучным і надта ж наскім прозвішчам Зязюлькін. І неяк надта ж хутка (ці гэтак толькі здаецца на чужое ўспрыманне) нарадзіліся ў іх дзве дачушкі-красуні Віка і Ніка, на поўны лад — Вікторыя і Вераніка, якіх Міша любіў самазабыўна. А з гадамі гэтак жа моцна ганарыўся імі, найперш, як часцей і бывае, малодшай Веранікай, якая ўзяла ад бацькі не толькі прыгажосць і абаяльнасць, але і талент — стала ўдумлівым, назіральным, з тонкім і глыбокім (акурат стральцоўскім!) адчуваннем спецыфікі мастацтва слова, наогул краснага пісьменства крытыкам-літаратуразнаўцам.

Ды гэта я зноў пабег, як у маладосці, наперад...

А тады, памятаю, пасля другога курса паехалі мы з Мішам на першую журналісцкую практыку — у «вялікі» горад Дзяржынск паблізу Мінска (былое Койданава), у раённую газету. Прызначылі нас у сельгасаддзел. Не ляжала да тэм і праблем гэтага аддзела душа ні ў Мішы, ні ў мяне: трэба было пісаць пра касьбу (нарыхтоўку кармоў), пра пасьбу кароў і надоі малака, праполку буракоў, падрыхтоўку тэхнікі да жніва... Але ж — пісалі. Каб трошкі разнастаіць гэтую надта ж посную тэматыку, прыдумалі для суботняга нумара рубрыку «Сёе-тое», дзе друкавалі кароценькія аповеды-замалёўкі пра розныя жыццёвыя здарэнні ды выпадкі, не так сумныя і трагічныя, як вясёлыя і смешныя.

Непасрэдным нашым начальнікам быў дужа сур'ёзны і заклапочаны загадчык аддзела, старэйшы за нас на гадоў восем Міхал Майсеевіч Замскі, які бязбожна крэсліў і нават перапісваў нашы «матэрыялы» і быў, па ўсім, зусім не задаволены такімі сваімі памочнікамі-практыкантамі. І дайце веры!

Прабеглі-прамільгнулі гады, і Замскі, неўзабаве ўслед за мною аказаўшыся ў «ЛіМе», узначаліўшы там аддзел публіцыстыкі, ужо прыносіў сваю журналісцкую «прадукцыю» мне як адказнаму сакратару, намесніку галоўнага і ўрэшце як галоўнаму рэдактару.

Жылі мы ў Койданаве — прабачце, Дзяржынску — не ў гасцініцы, хоць і была такая ўстанова ў тагачасным занядбаным райцэнтры. Жыць у гасцініцы было дарагавата, таму жылі мы на чыста вясковай пясчанай вуліцы кватарантамі ў хаце, дзе былі гаспадар з гаспадыняю, іх сын-пяцікласнік і бабуля — ці то цешча гаспадара, ці то свякруха гаспадыні. Гаспадара дома амаль не было, ён, здаецца, рабіў на чыгунцы, гаспадыня таксама ад цямна да цямна прападала на працы у КБА (камбінат бытавога абслугоўвання), таму часцей стыкаліся мы з бабуляю і ейным унукам, якія пастаянна сварыліся на... рэлігійнай глебе. Бабуля прымушала ўнука чытаць Біблію, а ён аднекваўся, не паддаваўся і ўпарта даказваў ёй, што ніякага Бога няма і што Біблія ніякая не святая кніга, а зборнік казак і небыліц. Сварка іхняя нас з Мішам пацяшала і весяліла, мы згадвалі гумарыстычную «Біблію» Кандрата Крапівы, часам знарок падтрымлівалі то бабулю, то ўнука. Я нават напісаў нешта кшталту гумарэскі «Бабуля, унук і Біблія» для тае нашай рубрыкі ў раёнцы, але, здаецца, яна не была надрукавана...

Туды, у Дзяржынск, да Мішы прыязджала Галя. Яшчэ не жонкаю, а, паўтару ўслед за слоўнікам, залётніцай. Тым днём, сонечным, спякотным, я быў, як казалі ў рэдакцыі, на раёне. Вяртаўся ў Дзяржынск пешшу (нейкі час ішоў берагам невялікай, але вельмі маляўнічай рэчкі Усы). І, дадыбаўшы ўрэшце ў райцэнтр, спаткаў іх — Мішу і Галю — на вуліцы: ён ужо праводзіў яе на станцыю. Мне падалося, што між імі няйнакш прабегла чорная котка — Міша, і без таго не весялун, быў нейкі асабліва пануры, нават ці не злосны.

Зрэшты, мо і не згадалася б гэта наогул, калі б не знаццё, што іхні саюз, нягледзячы на тое, што быў змацаваны дзвюма дочкамі, аказаўся ўсё ж недаўгавечным. Ніхто тут ім, Мішу і Галі, не суддзя. Мо не лепшым сямейнікам стаўся Міша —

душа ягоная лунала ў іншых вышынях, чыста гаспадарчыя, так званыя побытавыя праблемы займалі яго, па ўсім, мала. Мо і Галі штосьці перашкодзіла стаць сапраўднай спадарожніцай паэта — доля гэта нялёгкая, складаная, надзвычай адказная і не кожнаму падуладная. Не бяру грэх на душу казаць тут нешта пэўнае і я, хоць сёе-тое чуў і бачыў, не аднойчы бываючы ў Мішы з Галяй і тады, калі яны яшчэ жылі ў бацькоў на вуліцы Розы Люксембург, і тады, калі Міхась атрымаў двухпакаёвую кватэрку ў блочным доме на вуліцы Чарнышэўскага, і тады, калі іхняя сям'я пераехала ўрэшце ў трохпакаёўку (таксама малалітражку) паблізу так званага Конскага базару ў раёне бульвара Шаўчэнкі. Ніякіх трацейскіх суддзяў тут сапраўды быць не можа, і таму загадзя прашу прабачэння ў Галіны Сямёнаўны, а заадно і ў Міхасёвых дачок, калі раптам неўспадзеў пакрыўдзіў іх самою гэтаю згадкаю.

Той паўвекавой даўнасці прыезд Галі ў Дзяржынск, той момант, калі Міша падаўся мне не толькі чымсьці засмучаным, але нават і злосным, прыпомніўся, бадай што, зусім з іншае прычыны. Хацелася яшчэ раз сказаць, падкрэсліць, што Міша ніколі не быў весялуном-рагатуном. Пачуццё гумару меў уга якое, любіў жартаваць і дасціпнічаць, але — не беспрычынна, пустога зубаскальства не прымаў і не цярпеў. Як і гумару, саштукаванага вакол таго, што ніжэй паясніцы і вышэй каленяў. З выстаўленага пальца не смяяўся. Гумар любіў тонкі, які трымаўся на нюансах і выклікаў не рогат, а тую самую згаданую ўжо датычна да Мішы сцішаную, то цалкам шчырую, то злёгку прыхаваную, з акрасам ледзь улоўнай іроніі, усмешку.

Увогуле Міхась быў чалавекам больш мінорнага, чым мажорнага складу.

І ці не ўсе творы ягоныя, як у прозе, так і ў паэзіі, маюць адценне ціхай светлай журбы-смутку, аднак жа не роспачнага, а, тым больш, не трагедыйнага гучання. Ён умеў бачыць весялосць, як сам пісаў, і «ў восеньскай журбе» і меў светлы спадзеў на лепшае ў цяжкія хвіліны тугі і адчаю. І ўрэшце з ім, пры ім нам, ягоным сябрам нашай агульнай маладосці, было ўтульна і няскрушліва. Ягоную нешматслоўную і неназойлівую, а тым

больш ненавязлівую дабрыню і падтрымку памятаюць многія і ўспамінаюць Міхася добрым словам шчырае ўдзячнасці.

Вельмі ўдзячны я лёсу за тое, што ў свой час трапіў на працу ў «ЛіМ» і зрадніўся з ім на ўсё, фактычна, жыццё, аддаўшы пісьменніцкай газеце амаль чатыры дзясяткі гадоў, прайшоўшы там усе рэдакцыйныя службовыя прыступкі: ад шараговага літраба да галоўнага рэдактара. А з чые падказкі, з чые добрае рукі? Ніколі не забуду кароценькае Мішава пісьмо, што адшукала мяне ў роднай Слабадзе ці не на самым пачатку 1961-га, у якім было усяго некалькі радкоў, і сярод іх такія: «Дай лёгкага выспятка мясцовай Дульсінеі і джгай у Мінск: у «ЛіМе» вызваляецца месца, і яно лёгка можа перапасці табе». Я, вядома ж, паджгаў у Мінск, хоць і без асаблівага спадзеву. І што? Апынуўся ў «ЛіМе»!

Апекаваўся Міша мною і пасля. Прынамсі, з яго дапамогай у тым жа «ЛіМе» быў надрукаваны першы мой, практычна чыста інфармацыйны, допіс. З яго блаславення пабачыла свет у часопісе «Маладосць» (Міша тады ўжо працаваў там) падборка з трох першых маіх апавяданняў. Не без яго падказкі, а практычна з ягоным удзелам нарадзілася і першая мая кніжачка «Ранішнія сны».

Шмат гадоў і пасля Міша не абдзяляў мяне сваёй шчырай і зацікаўленай увагай, добрым словам сяброўскае падтрымкі. Дарагія і памятныя пазнакі гэтай увагі і падтрымкі і сёння са мною. Сярод іх, да прыкладу, хоць бы тыя ж дарчыя надпісы на падораных мне ягоных кніжках, пра некаторыя з якіх я ўжо згадваў. Стаіць у мяне на паліцы яго зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Жыццё ў слове». Адгортваю вокладку і чытаю напісаныя круглым, лёгкім, імклівым і вельмі пазнавальным Міхасёвым почыркам радкі: «Мікалаю Сымонавічу Гілю (Гілевічу) — крытыку, празаіку, публіцысту, гаспадару ўласнай кватэры, але, на жаль, халасцяку, — з добрымі пачуццямі. 2.02.67. М. Стральцоў». Прачытаю і сапраўды з добрымі пачуццямі зноў згадаю яго, незабыўнага сябра юнацтва і маладосці, са светлай скрухай пасміхнуся з некрыўдлівай Мішавай іроніі адносна крытыка, празаіка і публіцыста і спуджана сха-

мянуся ад раптоўна-знянацкага ўсведамлення, што напісана гэта Міхасёвай рукою больш чым сорак гадоў назад, і што самога яго няма ўжо больш чым дваццаць.

Яшчэ больш шчымлівыя пачуцці выклікае Міхасёў аўтограф на кніжцы «Загадка Багдановіча». Ён такі: «Дарагому Міколу, думаючы пра тое, што ў жыцці і ў творчасці павінны быць загадкі. Каб іх не было, іх трэба было б выдумаць. Дружба — загадка і таямніца. Яна і жывіцца загадкай. Трэба сябраваць. 12.VI.70. М. Стральцоў». Тут мне сёння ўжо не да ўсмешкі. Агортвае пачуццё сораму і дакору — датычна сябе. Пэўна, не лепшым я быў сябрам. Па маладой легкадумнасці не ўмеў сябраваць. Гэта толькі з гадамі прыходзіць разумение і цвёрдае ўсведамленне таго, што сябры — ці не найбольшы, найдарожшы душэўны набытак чалавека, што акурат у сябрах жыве нашая маладосць (бо сябры знаходзяцца толькі ў маладыя гады), што страта кожнага з сяброў — гэта тваё асірочванне, гэта страта часткі сябе.

Ды надпіс гэты скіроўвае думку і пачуццё і ў другім кірунку. «Загадка Багдановіча» — лепшае з напісанага Стральцовымкрытыкам. Гэтае літаратуразнаўчае эсэ — адна з узорных дзялянак нашай крытычнай нівы. З ім поруч можна паставіць хіба толькі эсэ Алеся Адамовіча пра Максіма Гарэцкага — «Браму скарбаў сваіх адчыняю». «Браму...» Міша высока цаніў і захапляўся ёю [...].

А яшчэ такой жа асаблівай любоўю Міша любіў Паўлюка Труса: за чысціню і шчырасць ягонага голасу, за народны склад ягонай маладой песні-споведзі і нават за тое, што уздзенскі хлопец адкрыта, не хаваючыся, перапяваў, часам надта ж блізка, разанскага «парня» Сяргея Ясеніна.

Валянцін Тарас у сваіх успамінах згадвае, як хадзіў з Мішам на магілу Паўлюка Труса. Я магу сказаць тое ж самае. Міша і мяне вадзіў туды, і мы з горыччу гаварылі пра надта ж непаглядны помнічак на магіле такога юнага і такога слаўнага, прыгожа-кучаравага паэта, улюбёнца ўсяе тагачаснае — другая палова 20-х гадоў XX стагоддзя — беларускае моладзі, і пілі віно з дастаных Мішам аднекуль, бы сапраўды з-пад

помніка, шклянак. І з Мішавых слоў тае гаворкі на магіле Паўлюка вынікала, што ён хацеў бы напісаць кніжачку (так і казаў — кніжачку) і пра Паўлюка Труса, жыццё якога гэтак рана раптоўна абарвалася.

Згадаю тут і тое, што Міхась аднойчы далучыў да двух згаданых Максімаў — Багдановіча і Гарэцкага — трэцяга, Максіма Танка, і параўнаў, ці супаставіў трох беларускіх Максімаў з адным расійскім. Памятаю тое выразна, бы сёння. Праўда, калі гэта было, у якім канкрэтна годзе — не скажу, а што было, і было ў маім лімаўскім пакоі-кабінеце, дык гэта дакладна.

Забег Міша да мяне надвячоркам. Цвярозы. Але з відочным намерам «прычасціцца», бо ці не з парога папытаў:

— Ёсць, старычок, якая пяцёрка ў кішэні?

Пяцёрка акурат і была. Міша, атрымаўшы яе, тут жа выйшаў, сказаўшы:

— Я хутка. Адна нага — там, другая — тут.

Вярнуўся ён сапраўды хутка. Зачыніўшы за сабою дзверы, папрасіў-параіў:

— Прымкні, старычок. Спакайней будзе.

Калі я выканаў гэтую просьбу-параду, Міша дастаў з кішэняў дзве пляшкі «чарніла», плаўлены сырок і пяток карамелек. Ставячы і выкладваючы ўсё гэта на стол, трошкі хапатліва, але амаль шчасліва патлумачыў:

— Пасядзім, старычок, пагамонім. Гарэлкі не браў. Гарэлка куляецца, а вінцо п'ецца. Нават цэдзіцца, старча. Мыслівец сказаў бы — смокчацца. І няхай сабе. От мы з табою, старычок, па старой звычцы і пацэдзім, і пасмокчам, і падымім заадно.

Мы за тымі «бутыленцыямі», як ласкава велічаў Міша брудна-вата-карычневыя пляшкі, ажно ацямнелі, і пакінулі мой кабінет пад настойлівыя напаміны прыбіральшчыцы — яна замыкала і адмыкала памяшканне рэдакцыі. Пра што толькі ні гаманілі! Пра дзяцей і жонак, пра жыццё-быццё і розныя яго звады-перапады, і пра літаратуру, вядома ж, пра нашу няшчасную, вясковую літаратуру і яе творцаў, у пераважнай большасці таксама лапатнікаў-вяскоўцаў. Лапатнікаў, на жаль, не толькі па паходжанні, але, часта, і па ўзроўні мыслення і, адпаведна,

творчасці. Міхась, не перастаючы ні на хвіліну цмыгаць цыгарэтаю, гаварыў-разважаў:

— Інтэлігенцыя — расійская выдумка, старычок. А ў нас была шляхта. От і ацэньвалі каго ці што: шляхетны чалавек, шляхетны ўчынак... У Расіі так званым дваранствам ганарыцца не выпадала, бо дваранін найперш — памешчык-прыгоннік. Помніш, старычок, як наш Кастусь нават пад шыбеніцай абурыўся-запратэставаў: «У нас няма дваран, у нас усе роўныя!»? От і прыдумаў гаспадзін Бабарыкін слоўца «інтэлігент». І як жа яно хуценька прыжылося, як упадабалася! І як прыдалося, дружа! Ужо ці трэба, ці не трэба — яно на языку: інтэлігент! І зборнае паняцце — інтэлігенцыя. Дваранства ўжо на другім плане, урэшце яго і зусім як не стала, знікла, прапала, вымерла-вырадзілася. Дарогу інтэлігенту-разначынцу! Гэтак, старычок, у Расіі-матухне. Ці мачысе, браце? Калі Бабарыкін прыдумаў слова? Недзе ў 80-я гады? А ўжо Чэхаў вунь як бэсціў рускую інтэлігенцыю, называючы яе фальшывай, хлуслівай, істэрычнай, нявыхаванай, лянотнай і нават неадукаванай. І не верыў ёй сапраўды інтэлігентны Антон Паўлавіч нават тады, калі яна пакутавала і скардзілася, бо лічыў, што і крыўдзіцелі яе выходзілі з яе ж нетраў, старычок... А ў нас? Шляхту, а гэта, лічы, палову народа, спольшчылі-вынішчылі і зрусіфікавалі-вынішчылі. А хто застаўся? Лакей, парабак, здольнік. Здольнікі, старычок! Вось нашы разначынцы. І куды яны імкнуліся, на каго раўняліся, да каго хінуліся? Ужо да польскай шляхты, а пазней — да расійскага каланізатара: чыноўніка, настаўніка, папа. І толькі самыя жыватворныя сягалі да каранёў і змаглі ўсвядоміць сябе прадстаўнікамі свайго народа. Як наш Максім, сын Адамаў, старычок... Тымчасове стварыўся грунт, ён аказаўся здатным на ўзгадаванне цэлай плеяды сапраўдных беларускіх інтэлігентаў, якія падрыхтавалі БНР (нас ніхто не чуе, старычок), поспехі адраджэння беларушчыны ў першыя гады БССР. Але яны не здолелі абараніць свой край і народ. Спачатку пасеклі край (і народ таксама) папалам, а пасля і ўсю, лічы, пад корань, нашу нешматлікую інтэлігенцыю. Тую, каранёвую, угрунтаваную (узрослую на сотнігадовым грунце

ахвяраванняў народных)... А сённяшняя наша інтэлігенцыя, старычок, у тым ліку і пісацельская? Мелкатраўчатая яна, незакаранёная, з наносным, павярхоўным глянцам. А самае горшае, старычок, не стамлюся тое паўтараць — неадукаваная яна. Нават з расійскай, якую ганіў Чэхаў, не параўнаць...

Міхась змаўкаў, бадай, толькі дзеля таго, каб цыркануць з «бутыленцыі» ў шклянкі ды прыпаліць новую цыгарэту. Ён прыкметна хмялеў, у гаворцы ўжо спатыкаўся, асобныя словы не прагаворваў, быццам праглытваў, але «ніць Арыядны» не губляў:

— Максімы нашы, старычок, акурат з нявыразанай дарэшты, з няспольшчанай да канца шляхты. Узор беларусаў, як этнаіндывідаў. Пераемнікі продкаў. А пасля ланцужок парваўся, Шаноўны. Абарвалі, перасеклі. Ушчэнт, на друзачкі пасеклі... А Максім — імя для нашай літаратуры знакавае, старычок! Як для рускай — Аляксандр: Аляксандр Пушкін, Аляксандр Грыбаедаў, Аляксандр Блок, Аляксандр Твардоўскі... Трэці Максім у нас — Танк. Танк, проша пана, дурнота, а вось Максім — от цо да! Таксама шляхетны паэт, як і першыя два. Еўрапейскі. Архіталенавіты, мудры і — лукавы. Так, старычок, не хітры, а менавіта — лукавы. Сабе на ўме. Ведае сабе цану. Адно пальшчызнай празмерна захапляецца. Як і дзядзька Брыль, каторы Ян Антонавіч... Імя шмат значыць, старычок. Аднаму — на славу, другому — на здзек. У нашых трох Максімаў пападанне выключнае! Якое імя, такі і чалавек. Ці наадварот: які чалавек, такое і імя... Кожны з нашых Максімаў мог бы пацягацца з самім Максімам Пешкавым-Горкім. А ўтрох, дык, глядзі, і адолелі б! А мы ўсё прыбядняемся, хнычам, румзаем: бедныя, гаротныя, няздатныя, слабыя... «Го! Я сеў бы на каня і паказаў бы яшчэ, чаго варт стары Талаш!» Во — беларус, старычок. Гэта што, выдуманае? Дзядзька Колас не выдумляў. Ён знаў, ведаў, адчуваў... Максім, каторы Горьков... А ў нас — тры Максімы! І якія, старча! Волаты! Адзін — Богам дадзены, другі — горам хрышчаны, гарэсны, гарэцкі... А трэці Максім, дык ажно Танк: усіх давіць! Як мядзведзь у казцы... Не, старычок, гэта ўсё невыпадкова, што такая вось тройца Максімаў...

А Кузьма — адзін. Не схацеў быць Мікалаем Раманоўскім — стаў Кузьмой, ды яшчэ і Чорным. А чаму? А ці не меў на ўвазе, старычок, от гэта, народнае: «На свеце, сынку, пажывеш, дык і Кузьму бацькам назавеш»? Жартую, вядома, старча, але ж яно і цікава, браце-коце, як ты любіш казаць...

А пасля, ажно датуль, пакуль нас папраўдзе не папрасіла прыбіральшчыца пайсці ўрэшце дадому, Міхась чытаў-мармытаў вершы сваіх улюбёнцаў — рускіх паэтаў «срэбнага веку». Кажу — мармытаў, бо так яно насамрэч і было: чытаў ён не гэтак мне, як сам сабе.

З ягоных вуснаў, дарэчы, упершыню пачуў і дасюль памятаю вось гэтыя фетаўскія радкі:

Не жизни жаль с томительным дыханьем.
Что жизнь и смерть? Но жаль того огня,
Что просиял над целым мирозданьем,
И в ночь идет и плачет, уходя.

Калі пачуў упершыню, асабліва не ўразіўся, як ні сорамна ў тым прызнацца. Што ж, да разумення такіх вершаў трэба, пэўна, дарасці, мо нават проста — пасталець. Міхасёва ж душа была з тых, якім рана ўсё зразумела. Яму была наканавана ранняя сталасць. Гэта, на жаль, я асабіста зразумеў шмат пазней, з гадамі [...].

Ён быў інтэлігентны і ў жыцці (тонкі і мяккі, датклівы і далікатны, душэўны і спагадлівы, шчыры ў сяброўстве, чулы і да чужое радасці, і да чужога болю, гжэчны і ў апратцы, і ў паводзінах, шляхетна-выкшталцоны з дзецьмі і жанчынамі), і ў літаратуры (талент яго, пры ўсёй сваёй сіле і моцы, быў невыбуховы, нягучны, можа нават крыху сцішана-далікатны, і творцам — празаікам, паэтам — быў ён, як хтосьці трапна заўважыў, акварэльным, з абсалютным слыхам, выключным адчуваннем слова і з бездакорным, бадай што таксама абсалютным густам).

Нікому з калег-пісьменнікаў Міхась не зайздросціў, заўсёды шчыра вітаў любы малады талент і гэтак жа шчыра радаваўся поспехам старэйшых таварышаў па літаратурным цэху

і, вядома ж, хлопцаў-равеснікаў, якія ці не ўсе вельмі цанілі ягоную думку-меркаванне і ад душы ўсцешваліся ягонай цёплай, хай сабе трошкі і з прымешкам іроніі пахвалою, кшталту: «А ты, старычок, малайцом... Вераб'і лісцем з яблыні пасля першага шэраню... Сам Брыль можа пазайздросціць...»

Верасаеў пісаў пра Пушкіна: «Усё жыццё яго і ўсё шчасце былі ў творчасці. У паэтычную творчасць ён сыходзіў ад жыцця, якога не ўмеў тварыць і ў якім не ўмеў жыць. І гэтая творчая праца давала яму такое шчасце, перад якім непатрэбнай, марнай і смешнай выдавала ўсялякая слава». Гэта ж можна сказаць і пра Міхася Стральцова, прытым цот у цот, як ён любіў казаць. Шчасце ягонае таксама было выключна ў творчасці, а жыццё чамусьці яго часцей за ўсё абыходзіла бокам. Прынамсі, пестуном яго ён адназначна не быў [...].

Памятаю вечарыну з нагоды ягонага 50-годдзя ў Доме літаратара. Гучала там надзвычай шмат цёплых, шчырых, сардэчных і, вядома ж,— як жа без іх? — пафасна-ўзнёслых слоў. Міхась быў на сцэне, прымаў кветкі і віншававанні. Але на твары ягоным асаблівае радасці не адбівалася. Быў Міша ўжо цяжка хворы...

Апошні раз я пабачыў яго недзе ў канцы чэрвеня (ці ў пачатку ліпеня) 1987 года каля Дома літаратара. Мы з жонкай ішлі туды абедаць. Міхась сядзеў на вялізным валуне паблізу ганка і, як заўжды, курыў. Мы з Марыяй Міхайлаўнай прыпыніліся, прывіталіся. Міхась гжэчна прыклаўся да рукі мае палавіны. Ён, няйначай, некага чакаў, бо пару разоў быццам азіраўся. Твар быў змарнелы, без ранейшае заўсёднае — у такіх выпадках, прынамсі — скупое ўсмешкі. А сустрэчы з намі быў, па ўсім, рады. Папытаў, як мы самі маемся, як вучацца нашы Максім і Міколка-паравоз (усе знаёмцы акурат гэтак звалі майго малодшага), пажартаваў, што Максіма, стрэўшы неяк на палымянска-лімаўскім калідоры, спачатку і не пазнаў: «Перарос, старычок, бацьку...»

На нешта сур'ёзнае гаворка так і не ўзбілася. Кідалася ў вочы, што хвароба яго не адпускае. Найперш гэта выдавалі вочы — ужо быццам не надта і стральцоўскія — жывыя, з хітрынкай,

з ледзь прыкметнай добрай усмешкай, а — згаслыя, сумна-паніклыя, трывожна-роспачлівыя. На жончыну заўвагу, што не трэба сядзець на камені нават летам, можна застудзіцца, Міхась усміхнуўся амаль як раней — хораша і светла — і сказаў: «Дзякую, Марыська», — і зноў у гжэчным паклоне цмокнуў яе ў руку.

На тым, бадай, і разышліся.

А зноў сустрэліся ўжо калі Міхась ляжаў у труне. І здарылася гэтак, што хавалі яго на Чыжоўскіх могілках 25 жніўня, акурат тым днём, калі маёй Марыі Міхайлаўне споўнілася сорак. Ён ужо нічога не мог ёй сказаць, сваёй амаль што хрэсніцы, бо гэта ж ці не ён першым назваў яе не пашпартнай Марыяй, а — Марысяй, кім яна жыла і жыве дасюль, калі пераваліла ўжо за шэсцьдзесят. А яна, гледзячы на яго прыгожы і амаль зусім малады (прынамсі, нязвычна памаладзелы) твар, ціха і несуцешна плакала: яна любіла Мішу...

Быў і ёсць (і будзе, калі будзе Беларусь) у нашай літаратуры адмысловы творца, выдатны майстар лірычнай і адначасова інтэлектуальнай прозы (адно «Смаленне вепрука» чаго вартае, яно «томов премногих тяжелей»), сапраўды акварэльны паэт, тонкі, удумлівы і ўніклівы, з надзвычайным адчуваннем слова і бездакорным мастацкім густам крытык, бадай што класік, што зусім не абвяргае, а толькі ўсё больш выразна і пераканаўча пацвярджае час, прамінулы з дня яго заўчаснага і такога балючага адыходу.

Ува ўсіх у нас быў, ёсць і будзе (паўтару зноў услед за Караткевічам, тым больш, што Уладзімір Сымонавіч і Міхась Лявонавіч былі вельмі блізкія і па моцы талентаў, і па трагічнасці лёсаў) выдатны пісьменнік Міхась Стральцоў. Мне ж на схіле жыцця ўсцешна яшчэ і ад таго, што лёс падарыў шчаслівую долю спаткацца і пасябраваць з Міхасём Лявонавічам у незабыўныя гады юнацтва і маладосці, калі ён быў проста Мішам — аднакурснікам, сябрам.

2007

Ніна Работа

«Гэй, дзень добры! Жыву!»

Маё знаёмства з Міхасём Стральцовым адбылося ў верасні 1961 года ў вестыбюлі студэнцкага інтэрната БДУ на вуліцы Свярдлова. Я выкладала беларускую мову і літаратуру ў Нацкай сярэдняй школе Крупскага раёна і кожную суботу прыязджала ў Мінск, бо не магла прывыкнуць да новага месцажыхарства, куды мяне накіравала на працу Міністэрства асветы.

У інтэрнат іншы раз наведваўся і Варлен Бечык. Ён другі год настаўнічаў у вёсцы Пліса Смалявіцкага раёна. У нас з ім былі сяброўскія адносіны з першага курса майго навучання ва ўніверсітэце. Тонкі знаўца паэзіі, Бечык адкрыў мне Сяргея Ясеніна і Валерыя Маракова, якіх у той час мала хто з выпускнікоў школы ведаў. Ён жа звярнуў маю ўвагу і на Міхася Стральцова, чыё імя было мне знаёма па публікацыях у «ЛіМе».

Ля стала, за якім сядзеў дзяжурны студэнт, стаяў малады чалавек крыху вышэй сярэдняга росту, з прыемнымі рысамі твару, цёмнавалосы, у кароткай асенняй куртцы, і ветліва ўсміхаўся Бечыку. Варлен пазнаёміў нас. Стральцова здзівіла, што я помню ўсе яго публікацыі за два гады. У нас нечакана атрымалася цікавая гутарка, нават дыскусія. Мы не раз пасля з гумарам успаміналі пра гэта.

У тую восень у маёй душы пасялілася радасць: я пазнаёмілася з чалавекам з роднаснай мне душой. Яго, як і мяне, цікавіла літаратура. У нас было многа агульнага. Мы закончылі адзін і той жа ўніверсітэт. Нам чыталі лекцыі адны і тыя ж выкладчыкі: Іван Гутараў, Янка Зазека, Міхась Ларчанка, Алег Лойка, Іван Навуменка, Давід Фактаровіч. З Міхасём Стральцовым на адным курсе вучыліся Таццяна Арлова, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Сымон Блатун, Аляксандр Станюта. Некаторых з іх я ведала. Барадулін і Бураўкін ужо друкаваліся і выступалі перад студэнтамі з чытаннем сваіх вершаў. Мікола Гіль прыходзіў да нас у пакой да маёй аднакурсніцы Людмілы Зайцавай.

Мы з Міхасём сталі перапісвацца. Я помню адчуванне радасці, калі паштальёнка прыносіла мне ліст ад Стральцова.

Стыль яго лістоў зачароўваў. Напісаны яны былі на адным дыханні, шчыра і ўзнёсла. Калі ж я пісала Міхасю, то абдумвала кожнае слова. Было прыемна аднойчы пачуць: «Мне падабаюцца твае лісты — яны лаканічныя».

У студзені 1962 года выйшаў першы зборнік апавяданняў Стральцова «Блакітны вецер». Ён падараваў мне асобнік, чамусьці не надпісаўшы. Мне няёмка было прасіць аўтограф. Зборнік мяне ўзрушыў. Перажыванні героя Лагацкага былі мне зразумелымі: непрыкаянасць вясковага чалавека ў гарадскім асяроддзі. Мне думалася: маё дзяцінства прайшло ў вёсцы, студэнцкія гады — у горадзе, і вось зноў я ў вёсцы. Што мяне чакае ў будучыні? Трэба псіхалагічна рыхтавацца да пераменаў, а як?

Дырэктару школы не падабаліся мае паездкі ў Мінск. Пасля зімовых канікулаў расклад урокаў змянілі, забралі мой метадычны дзень. І скончыліся мае сустрэчы са Стральцовым. Але я сачыла за ягонымі публікацыямі.

Неўзабаве ў маёй сям'і адбыўся разлад паміж «фізікам і лірыкам». У студзені 1970 года я пераехала ў Мінск і стала выкладаць у СШ № 111, дзе завучам працавала цудоўны педагог Надзея Аляксандраўна Куляшова — родная сястра Аркадзя Куляшова.

Аднойчы ля «Кнігарні пісьменніка» я сустрэла Варлена Бечыка. Загаварылі пра Куляшова (Варлен усё жыццё аналізаваў творчасць паэта; яго зацікавіла, што я працую з яго сястрой). Нечакана для мяне Бечык перавёў гутарку на Стральцова і паведаміў, што Міхась часова жыве ў студэнцкім інтэрнаце, што ў ягоным жыцці не ўсё ладзіцца... А на развітанне падзяліўся нумарам тэлефона.

Я пазваніла. Міхась мяне пазнаў. Я запрасіла яго да сябе ў госці на вуліцу Алтайскую, дзе здымала пакой у аднапавярховым шлакаблочным доме. Пазней па гэтым адрасе прыязджаў літфондаўскі доктар Нейфах да хворага Стральцова...

З'яўленне Стральцова ў мяне дома бачылася мне падзеяй. Я рыхтавалася да сустрэчы: абсталявала пакой стылёвай мэбляй, паставіла на кніжную паліцу кнігі пісьменнікаў, якія

маглі зацікавіць госця: Купалы, Коласа, Багдановіча, Пушкіна, Баратынскага, Грыгор'ева, Блока. Літаратурны густ Стральцова быў мне вядомы.

Падчас сустрэчы мы пілі каньяк з крышталёвых чарак, якія я адмыслова купіла. У той вечар ён прызнаўся: «Я пакінуў сваіх дзяцей». І замаркоціўся. Міхась быў зусім іншым, чым восем гадоў таму.

Я маўчала. Я не ведала, што сказаць. Ды і ці мела я права гаварыць? Міхась не любіў грубых умяшанняў у сваю душу, няўдала сказанага слова суцяшэння. У мяне ў самой заставаўся ў вёсцы сын. Чалавек не можа існаваць без радасці і маркоты. Для таго ён і нарадзіўся на свет, каб зведаць гэтыя пачуцці.

Ад мяне Міхась паехаў на працу. А вечарам прыехаў зноў. Чыталі вершы. Больш чытала я, а Стральцоў слухаў, зрэдку спыняючы мяне, каб зрабіць крытычную заўвагу, калі яму не падабаўся радок. Чыталі мы тады пераважна Блока. Любіў Міхась і Апалона Грыгор'ева (называў яго Апалончыкам).

У мяне быў кішэннага фармату зборнік вершаў Пушкіна. Міхась не выпускаў яго з рук, чытаў, перачытваў, нешта падкрэсліваў, нават рабіў праўкі — у адным з вершаў закрэсліў слова «народ» і напісаў «чернь». Гэты зборнік пазней я падаравала паэту і даследчыку літаратуры Міхасю Скоблу.

Стральцоў добра ведаў рускіх паэтаў Срэбнага веку. Блока ставіў вышэй за Ясеніна. Цікавіўся творчасцю Леаніда Андрэева. Хораша гаварыў пра Купалу, Коласа і Багдановіча, характарызуючы іх творчасць як тры «вымярэнні беларускай літаратуры».

Я запомніла Стральцова больш па-за побытам. Праўда, і ў побыце Міхась не выглядаў бездапаможным. Памятаю здзіўленне гаспадыні (Стральцоў называў яе «волоокой девой Афиной»), калі ён гатаваў у газавай пліце прыгожа нарэзаную кубікамі бульбу. Ён быў эстэт і любіў ва ўсім дасканаласць.

Аднастайнасць жыцця надакучвала Стральцову. Прага творчасці не стасавалася з умовамі, у якіх ён апынуўся. Аднойчы ён сказаў: «Я не магу належаць толькі адной жанчыне». Злаваўся на абставіны, што заміналі творчасці. «Пра што пісаць, і як пі-

саць, і дзе?» — гэта хвалявала яго. Мы ніколі не абмяркоўвалі падрабязнасцяў яго сямейнага жыцця. Ён у душу нікога не пускаў...

Пасля нашы сустрэчы зрабіліся выпадковымі — то каля «Кнігарні пісьменніка», то каля Дома літаратара. Мне пашчасціла прысутнічаць на яго юбілейнай вечарыне ў 1987 годзе — Міхась мяне асабіста запрасіў. Помніцца, вечарына закончылася, а ніхто не хацеў разыходзіцца. Здавалася — шмат што яшчэ наперадзе...

І раптам вестка — Стральцоў у Бараўлянах, у безнадзейным стане. Я некалькі разоў яго наведала...

А потым было развітанне з ім у Доме літаратара, пахаванне на Чыжоўскіх могілках. Я паклала яму ў труну чырвоныя вяргіні.

Міхась Стральцоў быў сапраўдным паэтам. Яго паэзія — бляск афарызмаў, у яго крытыцы — філасофскі роздум над літаратурнымі з'явамі. Як празаік ён таксама дасягнуў высокіх мастацкіх вяршыняў. Ад яго чакалі эпічнага твора. Пры пэўных умовах ён мог бы яго напісаць — апавяданне «Волька» нагадвае раман Флабэра «Мадам Бавары» ў мініяцюры.

Літаратурная спадчына Стральцова шматгранная. Ён «бульбін зоры браў у баразне» (Р. Барадулін) і сам стаў зоркай на літаратурным небасхіле.

Я чую яго голас: «Гэй, дзень добры! Жыву!»

2016

Данута Бічэль

Легенда Стральцова

Паэты — рамантыкі і адчуваюць сябе маладымі, пакуль б'ецца сэрца.

Калі я засталася сам-на-сам са сваёй адзінотай далёка ад літаратурнага тлуму, і сябры мае, не толькі равеснікі, але і маладзейшыя, паціху пачалі адыходзіць у лепшы свет, у доўгія ночы бяссонных болесцяў цела, сумаўляючыся з Богам, са

святым паэтам Францішкам з Асізі, чытаючы святога Яна Паўла II ды дзённік святой Фаўстыны, — цяпер разумею, што літаратурная творчасць, як жывое цела, мае свой поспех, сваю біяграфію, жыццё, асобнае ад аўтара; удала складваецца лёс літаратурнага твора, калі аўтар валодае мудрасцю прадбачання, нават провіду. Ён ставіць перад сабой ясна акрэсленую мэту і настойліва дасягае яе.

А яшчэ поспеху твора спрыяе асяроддзе, цеснае кола аднадумцаў. У беларускай літаратуры не толькі супрацьпалярныя творчыя саюзы, супольнасці, абласныя ды раённыя аддзяленні, але і гэтыя цесныя асяродкі чужых кусаюць, з'ядаюць, ігнаруюць.

Міхась Стральцоў апынуўся ў добры час у самым цэнтры літаратурнага жыцця, у сталіцы, у рэдакцыях газеты «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Полымя» і «Маладосць», у коле сваіх аднадумцаў і равеснікаў, і Бог яму даў шмат, каб быць сапраўдным творцам, быць узорам, і стаць легендай.

Цяпер легенда пераўтвараецца ў пасмяротную славу — ва ўспаміны, у перавыданні, пераасэнсаванні яго здабыткаў.

Я ацаніла талент Міхася Стральцова, калі ён напісаў «Загадку Багдановіча» (1968). Я тады працавала настаўніцай у вячэрняй школе, і нават у марах у мяне не было, што некалі Бог узнагародзіць мяне працай — збіраць і ствараць музей Максіма Багдановіча ў Гродне, ды я гэты музей збірала несвядома, калі толькі прачытала першыя вершы паэта: «Здароў, марозны звонкі вечар....», «Па-над белым пухам вішняў...». І эсэ Міхася Стральцова легла ў мае зборы цудоўным экспанатам.

Сустрэчаў з Міхасём у мяне было няшмат. Аднойчы ён прыехаў з пісьменнікамі ў Гродна на літаратурнае мерапрыемства, якое ладзіў Аляксей Карпюк — пасля паседжання ў Летнім кінатэатры нам паказвалі новы фільм па камедыі Андрэя Макаёнка. Стральцоў прысеў побач і ўзяў мяне за руку. Нешта знаёмае я адчула ў гэтым заляцанні. Мы выйшлі, не даглядзеўшы фільм, і ён мне прыгадаў, што аднойчы ў Мінску, у цёмным зале Саюза пісьменнікаў нехта патрымаў маю руку і ўцёк. Я не ведала, што гэта быў ён.

Горад наш у той час быў не такі расцягнуты, яшчэ не пабудавалі «шпулек», «Аўтамагнітолы», а за Нёманам, дзе я жыла, не было «Хімвалакна». Вуліца Паповіча забудавана была толькі па цотных нумарах, а з боку Фолюша цвіло поле. Мы і дайшлі да таго поля.

Пасля дня літаратурных спрэчак шпацыраваць па мосце і па вулках Гродна было прыемна. Праўда, я ўвесь час памятала, што гэта маршруты, па якіх я хаджу са сваімі дзецьмі і з мужам Эрыкам, крыўдзіць іх мне не хацелася. Але з гэтым спадарожнікам развітацца проста было немагчыма. Ён адразу захапіў маю ўвагу размовай пра паэзію і наша пакаленне. Прыдзіраўся:

— Паглядзеўшы на цябе збоку, ніяк не скажаш, што ты працуеш на ферме ці ў вясковай школе. Чаму ты пішаш так, як твая маці спявае — пра буслянку, цётчыну студню, цялушку. Паміж Коласам, Чорным і нашым пакаленнем стаяць салдаты вайны, якія праехалі на танках па Еўропе. Яны ўнеслі ў літаратуру новы пульс, няроўнае дыханне. Дык нам цяпер вяртацца да спакойнага сузірання, як цячэ паміж мурожных лугоў бацька Нёман?!

— Нам трэба раскідаць *сена на асфальце*?

— Ну, гэта ў падтэксце. Нашы дзяды сядзелі ў садзе, назіралі, як ападаюць жалуды, і пісалі пра тое, што бачылі. Яны не чыталі вершаў Гарсія Лоркі і Пабла Неруды. А цяпер нас падганяе савецкая літаратура — ад Сіманава і Твардоўскага да Межалайціса. А грузіны ды узбекі ўжо маюць рубрыкі ў маскоўскіх выдавецтвах. Разам з маскоўскімі габрэямі крычаць на стадыёнах у рупар свае вершасказы! І іх слухаюць!

— А навошта крычаць? Мы ціхія. Хіба Ахмадуліна лепшая за Ахматаву?

— Можа, не лепшая. Але яе ведаюць. Яны ідуць шчыльнай сценкай. Напэўна, унутры гэтай сценкі ёсць свае інтрыгі, але, гледзячы збоку, яны адна банда. А перад імі — армія ваеннай прозы, у якую залічаны з нашых адзін Васіль Быкаў. Ён з табой не дзеліцца тактыкай вядзення бою?

— Можа, і дзяліўся б. Ды мне гэта не трэба. Я пішу не для чытачоў, а для некага аднаго, хто стаіць у вачах, калі верш мяне

непакоіць. Ты праўду кажаш, мне ў вёсцы не было месца, і тут я не свая. Таму пішу аб тым, аб чым сню. Мае вершы — як дзявочы альбом.

— Але аддаеш у друк.

— Ну, не стрымалася. Захацела сябе праверыць збоку. Пасля ўцягнулі.

— Я пачаў прыдзірацца, каб ты не ўцякла. Нават у паэзіі трэба хітраваць. Зрэшты, вершы не мусяць быць прывязаныя да вёскі ці да горада. Вершам можна абняць усё і выйсці за межы часу.

— Варачы бульбу паміж урокамі ў вячэрняй школе, наўрад ці ўдасца.

— А ты спрабуй, не падай духам. Сама спланавала сабе біяграфію.

Самалёт ляцеў з Мінска, спускаўся на пасадку, за Фолюшам быў аэрапорт...

Калі я прыязджала ў часопіс «Маладосць», са мной размаўляў пераважна Мікола Аўрамчык. Стральцоў быў заняты: піў гарбату з пячэнькамі, якія прыносілі сталічныя паэткі. Мяне на гарбату не запрашалі. Але пасля той прагулянкі па Гродне ў яго знайшоўся час, ён спытаў, ці надоўга прыехала і дзе спынілася. У той дзень адлятала дадому, трэба было забраць сумку ў Ірыны Крэнь, ён сарваўся з-за стала, каб мяне правесці. У перапоўненым людзьмі трамваі нас прытулілі, яго рукі мелі ўсяленскую пяшчоту.

Трамвай, як сараканожка...
Не, не падабаецца мне гэтае параўнанне.
Параўнаю трамвай лепш з вожыкам,
што цвёрда і шпарка,
бяжыць па падлозе — тук! тук!

Ад Ірыны трэба было спяшацца. Сталі ў чаргу па таксоўку. І тут падбегла Вера Палтаран з сяброўкай. У руках трымала туфлі на высокім абцасе, купіла ў ЦУМе. Урэзаўся ў памяць гэты малюнак, бо з маімі нагамі на такія абцасы я станавілася рэдка. Вера крыху какетліва сказала:

— Нам, старым, і такая радасць засталася — прыгожыя туфелькі!

Я спазнялася на самалёт, спяшалася, але мы ехалі ў адной таксоўцы з Верай Палтаран — яна дадому, мы ў аэрапорт.

Як жа пашэнціла! Самалёт на Гродна затрымалі. Мы пайшлі наверх у рэстаран, адтуль было відно лётнае поле. Глыталі па кроплі каньяк, назіралі, як самалёты ўзляталі і садзіліся. За суседнім столікам чакаў таго ж рэйсу гродзенскі актор Грачынскі. Хацеў перасесці да нас, але мы размаўлялі.

З вуснаў Стральцова я пачула верш, якога тады не ведала. «Шынок» Поля Верлена ў перакладзе Максіма Багдановіча быў надрукаваны толькі ў «Творах» 1927 года. Я не мела магчымасці пачытаць гэтае выданне. Пасля ў Музей Максіма Багдановіча адзін том аддаў Янка Брыль, другі — Вольга Іпатава. Але гэта ў 90-я. З першых слоў у вершы дзейнічае магія перасялення ў дзіўны свет шынка:

Ужо кроўю ногі пыл шасы гарачай росяць.
І ўраз — чырвоны дах, мур белы між цянька.
І вывеска «Спакой» — вясёлы знак шынка.
Ёсць мяккі хлеб, віно і паспарту не спросяць...
Тут спяць, пяюць і п'юць, тут кураць і галосяць...
...Вы слышыце, саган, здаецца, ўжо чуваць,
Як ён гадзінніку вясёла падпявае!
Даль поля праз акно адкрытае відаць.

— Калі прадоўжыць нашу размову, то адзіны, каму ўдалося выйсці ў бязмежнасць, гэта Максім Адамавіч. І робіць ён гэта, карыстаючыся канкрэтнымі прадметамі і тыпажамі.

— Але не напісаў верша пра самалёт.

— Чаму? «Пагоня» — пра няспынны палёт нас, несмяротных, праз стагоддзі, у неперарыўнасці пакаленняў. Уяві: твой самалёт — гэта Максімавы коні.

Стральцоў напісаў таямнічы верш пра зорку — там ляціць самалёт:

Ноччу тым часам, як спаў,
Зорка свяціла ў акно.

Ціха самотны павук
Ткаў для той зоркі мярэжы.

Потым ляцеў самалёт —
Гул яго біўся аб шыбы.
Кінуў мярэжы павук,
На падваконні стаіўся.

Тою хвілінаю я
Вочы расплюшчыў, прачнуўся.
Плакала зорка ў акне —
Ну, а чаго, яшчэ ў сне
Я здагадаўся.

Пасля ў Стральцова пайшлі выпрабаванні, звязаныя з хваробай. Да Гродна даходзілі чуткі, што яго адправілі на прымусовае лекаванне...

Неяк занесла мяне на літаратурную сустрэчу ў доме адпачынку на Магілёўшчыне. Памятаю, чытала вершы, а ў паўзмроку залы пары прытуляліся, цалаваліся. Арганізатарка сустрэчы сядзела збоку з брыдкім выглядам зводніцы. І ў гэтым чадзе я сустрэла Міхася Стральцова. Ён быў стомлены, змучаны. Пасля заканчэння афіцыйнай часткі мы сутыкнуліся ў цесным праходзе паміж лавамі.

Вось тут, далёка ад сталіцы,
Ад ісцін новых і старых,
Жыву, як выгнаны патрыцый,
Грыбы збіраючы ў бары...

Стральцоў адразу пайшоў у наступ. Ён далікатна высмеяў маю прамову і мілосны рэпертуар. Параіў мне пагаладаць, каб ачысціць цела і розум ад шлакаў і выйсці ў творчасці на новы віток. Бываюць такія сустрэчы, якія ўсё марнуюць. Такая ж празаічная сустрэча адбылася яшчэ ў Наваполацку, але змыліся дэталі.

Мне цікава было вывучаць хлопцаў з усходу, таму што я з захаду. Гэтыя ўсходнікі, у якіх сэрцы б'юцца паверх рэбраў, прыкідваюцца прастачкамі, але хаваюць шмат таемных чараў

і хітрасці, якімі яны карыстаюцца, нібы еўрапейцы. У Стральцова ёсць адзін верш без назвы, у якім ён расказаў сам пра ўсіх сваіх дзяўчат, асабліва не дбаючы пра мастацкую форму верша.

Ты, ты, якую не спазнаў,
Якую блізка ці спазнаю,
Чаму цябе, навошта ўзяў
У суддзі строгія, — не знаю...

Ён пералічвае іх, на кожную адводзіць па два радкі, дае ім сваю ацэнку і звяртаецца да той, якую выбраў за суддзю над ім і над імі, а можа, гэтак заляцаецца да яе:

Ты па сабе або па мне,
Рукамі твар закрыўшы, плачаш?

Відаць, гэтыя жанчыны сёння жывуць, памятаюць яго чары, не мелі яны перад ім ніякай абароны, ніякага ратунку. Ён кожнай з іх, напэўна, шмат абяцаў, але не доўга трымаў абяцанні. Ён у цемры толькі дакрануўся да мае рукі. Мая рука памятае яго руку.

З сённяшняй адлегласці няма апраўдання той азіяцкай, татара-мангольскай неахайнасці паводзін, якая ад Масквы да Мінска была ў модзе ў савецкіх творцаў. Хацелася б пачаць ад пачатку ды перапісаць біяграфіі любімых паэтаў і празаікаў, каб у іх была адна шчаслівая жанчына, святая сям'я. Хацелася б, каб так пражыў жыццё таленавіты пісьменнік Міхась Стральцоў, каб ён аберагаў сваю адзіную каханую жанчыну, як аберагаў Зосю Міхайлаўну Уладзімір Калеснік, Ніну Міхайлаўну Янка Брыль. Любоў Андрэеўну Максім Танк. У савецкі час сям'ю знарок разбуралі, з адзінокім творцам справіцца проста.

Я запытала ў прадстаўніка наступнага пакалення літаратараў, што ён думае, чаму пісьменнікі співаліся. Ён адказаў, не думаючы:

— Занадта добра вы жылі.

Мы жылі добра. Нарадзіліся перад вайной і не памерлі ад голаду, агню і мору. Мы выраслі не зусім здаровыя, але нармальныя.

Мы не маглі, як след разагнацца, выкарыстаць духоўны патэнцыял. Адставалі ад другіх народаў. Мы былі вёскай. Наша літаратура заўсёды стваралася на патрэбу людзей, якія жылі тут і цяпер. Многія пісьменнікі зусім не ўмелі пісаць. У Стральцова бацька — настаўнік, ён пісаць навучыўся ў школе. Калі мы пачыналі, пачыналася адліга. Была цэнзура, але неяк яе абхітроўвалі.

Адам Міцкевіч напісаў «Пана Тадэвуша» за надта кароткі час і пасля ўжо амаль нічога не напісаў, згарэў, як высахлая пожня. Стральцоў таксама плённа папрацаваў у маладосці. Гэта — як бег на кароткія дыстанцыі. Спрынтары хутка заканчваюць сваю спартыўную кар'еру.

Добра, вядома ж, пражыць жыццё ў ціхім сузіранні, у працы, у болесцях і цярпенні, дапамагчы дзецям знайсці сваё месца, падзяліцца з імі сваімі памылкамі, папярэдзіць, хоць яны і не слухаюць...

Гучаць у маёй памяці галасы многіх сяброў, духоўных братоў і сёстраў. Голасу Міхася Стральцова не памятаю.

2016

Фёдар Яфімаў

Яснае святло з суседняй вуліцы

З Міхасём Стральцовым мы не былі асабліва блізкія, але мелі ўзаемную, як хочацца думаць дасюль, прыязнасць адзін да аднаго. Ён звяртаўся да мяне па імені, я таксама. Не адступлюся ад гэтага і цяпер...

Разрыў з сям'ёй Міша перажываў страшэнна. Па ўсходнеславянскім звычаі піў. Герцэн некалі пісаў, што піць з гора не такая ўжо дрэнная звычка, як аб ёй думаюць. Але віно не памагала, і такая тонкая душэўная арганізацыя, як у Мішы, адгукнулася, відаць, на непазбыўнае гора смяротнай хваробай. Ён быццам адчуваў гэта. У застойна-нерухомыя 70-я пасля работы ў «малым Доме друку» мы ішлі ў магазінчык на супрацьлеглым баку Плошчы Перамогі. Там разлівалі таннае віно. Міша

хутка п'янеў і, калі выходзілі пакурыць, штосьці прагаворваў для сябе і час ад часу, адлучана гледзячы не на субяседніка, а кудысьці ўдалечыню, паўтараў, зноў-такі для сябе аднаго: «Скоро стану добычею тленья. Тяжело умирать, хорошо умереть...» Някрасаў напісаў гэта за тры гады да смерці. Таксама адчуваў? Ці апраўдваецца сказанае камусьці з паэтаў Барысам Пастарнакам: не прарочце ўласную смерць — збываецца?..

Часта праходзячы па вуліцы Прытыцкага, гляджу на акно вуглавой кватэры на 8-м паверсе. Бываў там, калі ў ёй жыў Вячаслаў Адамчык. Аднойчы туды прыйшоў Міша з першай жонкай, было добрае застолле. Потым хадзіў ужо да Мішы з перакладамі для кнігі «Свет мой ясный». Перакладаў доўга і цяжка, таму што я, з дазволу сказаць, паэт графічны, а Міша — акварэльны. Акварэль — прадмет маёй зайздрасці: думаеш пра пяшчотны каляровы мазок, а выходзіць чорная «сацыялагічная» лінія. Як сапраўдны лірык, Міша жыў самадастатковым жыццём пачуцця і думкі, за якімі, аднак, неназоўная сацыяльнасць адчуваецца, можа быць, нават глыбей і вастрэй, чым у іншых адкрыта палітычных вершах. Міша стрымана хваліў пераклады і з усёй яго далікатнасцю змоўчваў пра графічнае ажыццяўленне ягоных акварэляў. Зрэшты, яго паэтычная палітра многае ўбірала і ад яго «зоркай» прозы, была ў ёй таксама яснасць выяўлення цяжкавымоўнага.

Мгновения мучительного счастья,
Что выпадают на твоем веку.
Ни целиком, ни даже малой частью
Не заключить и в лучшую строку.
Любое слово станет оскорбленьем
Для золотого чувства твоего, —
Тогда живет оно самодовленьем,
Тогда в ней только жизнь как волшебство.

Такіх імгненняў у кнізе «Свет мой ясный» шмат, яны апраўдваюць слова «свет» у яе назве, і хай не будзе банальнасцю сказаць, што сам ён быў СВЕТЛЫМ чалавекам, і чорныя гады яго жыцця толькі адцянілі гэта. За ўвесь немалы час няблізкага, але

і не шапачнага знаёмства я не пачуў ад яго ніводнага дрэннага, брыдкага, агіднага ці проста злога слова ні ў чый адрас. Не магу ўявіць яго пагардлівым, грубым, хітрым, двурушным. Канечне, у кожнага чалавека свае ўяўленні аб добрых людзях, але я перакананы, што ў стаўленні да Міхася Стральцова такія ўяўленні ў тых, хто ведаў яго, супадуць. Увесь сакрэт мастацтва, гаварыў Леў Талстой, — у ДУШЫ мастака...

Апошняя, як аказалася, наша сустрэча адбылася на праспекце Машэрава. Выйшлі з выдавецтва «Мастацкая літаратура», чакалі 39-ы тралейбус, нам было па дарозе. Гарбачоўская перабудова танула ў словаблуддзі. Міша быў хмурны, як заўсёды ў апошні час, адлучаны, паглыблены ў сябе (ведаў ужо?), негаваркі і толькі сказаў з прыкрасцю не зусім яму ўласцівае: «Ничего... чем хуже — тем лучше!..» — па-руску. Я зразумеў яго: горш за супакойлівую хлусню, якая працягвалася, ужо нічога не можа быць. І згадзіўся з ім: хай раскрыецца ЎСЯ глыбіня бездані, да якой мы коцімся!..

Усміхнуўся, кіўнуў галавой ад пярэдніх дзвярэй і сышоў на вуліцы Прытыцкага...

Для мяне Міхась Стральцоў — адзін з тых, чыё фізічнае і духоўнае аблічча ўспамінаецца разам са шчымлівым вершам В. Жукоўскага: «О милых спутниках, которые наш свет / Своим сопутствием для нас животворили, / Не говори с тоской: их нет, / Но с благодарностию: были». Прыгожы быў чалавек, і мая памяць аб ім — светлая.

Валянцін Тарас

Міша, Міша...

Вайсковыя могілкі, што на вуліцы Казлова (для мяне — на Даўгабродскай, бо ў даваенным дзяцінстве маім Даўгабродская пачыналася не там, дзе цяпер, а з таго вугла, дзе стаіць сёння Палац мастацтваў), дык вось, Вайсковыя могілкі гэтыя — мой вечны боль. Там быў пахаваны мой дзед, мамін бацька, Іван Панцялеймаў, і дзядзька мой, таксама Іван, — трапіў пад трам-

вай у ліпені 1938-га года, у семнаццацігадовым узросце. Там была пахавана і мама — у жорстка марозным студзені 1940-га, падчас «фінскай вайны», калі павымярзалі ўсе сады. Каб выкапаць маме магілу, доўга палілі касцёр, адгравалі зямлю хоць трохі, бо і лом яе не браў у тым студзені...

Помнікаў усім траім паставіць не паспелі — над дзедам і над дзядзькам стаялі драўляныя каталіцкія крыжы, а над мамай слупок з бляшанай таблічкай: *Галіна Іванаўна Тарас. 1913–1940.*

Магілы тыя згубіліся. Я не знайшоў іх у сорак чацвёртым, калі вярнуўся з партызан. Крыжы зніклі, слупок таксама, усё вакол парасло быллём і папараццю, і варонка ад бомбы чарнела на тым месцы, дзе былі магілы. Ва ўсякім разе, мне здавалася, што менавіта на тым. Дакладна паказаць месца магла б бабуля, але і яе я не знайшоў, вярнуўшыся з лесу, — яна была далёка, у Германіі, куды яе вывезлі немцы разам з маёй сястрычкай Таечкай і цёткай Люсяй, пра што я тады не ведаў. А потым яны апынуліся ў Польшчы, адкуль паходзілі бацькі бабулі, — яе, сястрычку і цётку я адшукаў у Познані толькі праз шаснаццаць год пасля вайны. Але і цётка, калі наведала Менск (бабуля была ўжо зусім старэнькая, нямоглая, так і памерла, не ўбачыўшы родны горад), магілы тыя не знайшла... Вось ужо і паўстагоддзя прайшло з тых дзён, як згубіліся яны, а боль па іх не адпускае, і час ад часу, калі бывае асабліва сумна і горка, я іду на Вайсковыя могілкі, на тое прыкладна месца, дзе былі, як мне здаецца, родныя магілы, і моўчкі размаўляю з мамай, з дзедам і з дзядзькам...

Аднойчы я пабываў там разам з Мішам Стральцовым.

Не памятаю дакладна, калі гэта было, — недзе ў 1978-м ці 1979-м годзе. Помню толькі, што было лета і што якраз у той дзень было мне асабліва горка і сумна.

Сустрэліся з Мішам на праспекце, тады — Ленінскім, перад скрыжаваннем яго з Даўгабродскай і Варвашэні. Міша ўзрадаваўся сустрэчы, сказаў: «Нешта ты нейкі дужа сумны, старычок! Здарылася што? Ці проста кошкі на душы шкрабуць? Мо прагонім нягодніц? У мяне ёсць чым!..» І паказаў на сваю кішэню — там была пляшка гарэлкі.

Я і сам думаў пра тое ж: каб неяк «прагнаць кошак», але спачатку трэба было завітаць на могілкі, і я хацеў сказаць яму, што іду на могілкі, што, калі ён згодны, пойдзем разам, а потым можна будзе падумаць наконт «кошак», але ён апярэдзіў мяне і здзівіў тым, што нібы прачытаў мае думкі, і сам прапанаваў пайсці на могілкі: «Давай, старычок, пойдзем на Вайсковыя, да Паўлюка! Там у мяне ёсць усё, што трэба: і кілішкі, і відэльцы, і адкрывачка. Пайшлі?» Я падумаў, што Паўлюк — гэта, напэўна, нехта з абслугі могілак, мо вартаўнік ці які адміністратар, у якога Міша трымае «ўсе, што трэба». Спытаў: «А што за Паўлюк?» «Там убачыш, — усміхнуўся ён. — Не бойся, ён свой хлопец!..»

І мы пайшлі. Купілі батон, кілбасы, бляшанку кансерваў, бутэльку мінеральнай вады...

На могілках я сказаў яму, што спачатку пойдзем «на маё месца», да Паўлюка потым, і пачаў расказваць пра гэтае «сваё месца» — пры тыя страчаныя ў сорак чацвёртым магілы, пра маму сваю, як і ад чаго яна памерла ў студзені саракавога, як палілі касцёр, каб даць рады чыгуннай ад марозу зямлі, пра няшчаснага свайго дзядзьку Івана, пра дзеда, якога амаль не помню — памятаю толькі пах тытуню і люльку ягоную ў выглядзе галавы Медузы-Гаргоны, блакітныя вочы і залацістыя вусы, іх мяккі, нібы шаўковы, дотык, калі ён мяне казытаў імі. І зноў пра маму, якую смерць прыбрала гэтак рана — на дваццаць сёмым годзе жыцця...

Расказваючы, азірнуўся на Мішу. І ўбачыў, што ён плача, што вочы ў яго поўныя слёз. І толькі тут у мяне ў самога выступілі слёзы, і горла перасмыкнула плачам. А Міша заплакаў амаль рыдам.

Вядома, нехта скажа, што гэта гарэлка плакала, а не Міша. Што ж, гэта праўда. Але і няпраўда таксама. Злосная няпраўда. Бо піў ён (а піў часам страшэнна, тут няма чаго наводзіць на яго «хрэстаматыйны глянец») праз неабароненасць сваёй душы, праз яе дзіцячую, ці, хутчэй, нейкую дзявочую чуллівасць. Нездарма ён і быў падобны на дзяўчыну, нясмелую, далікатную, сарамлівую, і чырванеў як дзяўчына — лёгкім пя-

шчотным румянцам, апускаючы вочы з даўгімі вейкамі. І хіба не жаноцкасць яго характару, яго натуры абумовіла і тонкасць яго прозы, пранізлівую пяшчотнасць яго паэзіі? І разам з тым ён быў чалавекам мужным, нават зацятым у сваёй мужнасці, калі бараніў тое, у што верыў, у чым быў перакананы. Але бараніў не дрынам, не кулаком, а шпагай — зброяй шляхетнай і рамантычнай, зброяй кавалераў Прыгожай Дамы. Ды тут — у гэтым маім успаміне аб ім кажу пра гэта між іншым... А тады мяне проста ўразілі і расчулілі яго слёзы, і не аналізаваў я, чаму ён плача, і не думаў, што гэта плача гарэлка, якая, дарэчы, для каго проста згубная прывычка, а для каго — лёс...

Пастаялі, памаўчалі... Міша ўздыхнуў: «Спачуваю табе, старычок. Пойдзем да Паўлюка, памянём тваіх». І ён павёў мяне да Паўлюка, але не ў старожку, як я думаў, а некуды ўглыб могілак, туды, дзе былі самыя старыя магілы, яшчэ дваццатых, пачатку трыццатых гадоў. І падышлі мы да непрыкметнай магілкі ў гушчары кустоў, пад густымі зялёнымі шатамі дрэў, і там на сціплым, заімшэлым помнічку прачытаў я імя нябожчыка: ПАЎЛЮК ТРУС.

«Ну, здароў, Паўлюк, — натуральна, нібы з жывым чалавекам, паздароўкаўся Міша. — Бачыш, нядоўга ты мяне чакаў. Сёння я не адзін, сябра са мною, Валя Тарас. Свой хлопец, Паўлючок, свой хлопец!.. Трэба нам тут разам з табою пагаманіць...»

Недзе каля самага помніка, у густой высокай траве, была ў Мішы схованка. Ён пакорпаўся там, дастаў гранёныя кілішкі, цэлафанавы мяшэчак, у якім былі відэльцы, адкрывачка, соль, нават папяровыя сурвэткі. Дастаў з кішэні і паставіў на траву бутэльку «Сталічнай». Усё гэта ўпарадкоўваючы, ціха прамовіў нібы сабе самому: «У школе вывучаюць, дысертацыі пра «Дзясяты падмурак» пішуць, а на магілу ніхто ніколі не прыходзіць. У Саюзе пісьменнікаў начальнікі нашы, відаць, і не ведаюць, дзе Паўлюкова магілка... Ну, сядай, старычок!.. Наразай батон, кілбаску...»

Мы доўга сядзелі каля той Паўлюковай магілы, выпівалі няспешна і гаманілі, гаманілі, гаманілі. Аб усім на свеце!.. Мне было лёгка з ім і проста, хоць і зусім розныя мы людзі, і ва

ўзросце розніца паміж намі была даволі значная: ён быў роўна на сем гадоў маладзейшы за мяне. Але ўсё ж нарадзіліся мы пад адным знакам — пад Вадалівам. Я — 9-га лютага, ён — у дзень святога Валянціна, 14-га, на мае імяніны. Таму, нягледзячы на ўсю розніцу характараў і жыццёвага вопыту, было ў нас і нешта агульнае, блізкае і аднаму і другому. Мо таму і ўдалося мне хораша (ён сам казаў, што хораша) перакласці на рускую мову радкоў трыста ягоных вершаў. На старонках «Нёмана» ён яшчэ ўбачыў іх, а ў асобнай — маскоўскай — кніжцы не ўбачыў, яна выйшла пасля яго смерці.

Але самае значнае, што я зрабіў для яго, — гэта пераклад выдатнейшага яго апавядання «Смаленне вепрука» (у перакладзе — «Смоление вепря»), якое было надрукавана ў часопісе «Дружба народов», а потым уваходзіла ва ўсе анталогіі лепшых беларускіх апавяданняў у перакладзе на рускую мову, у анталогіі лепшага савецкага апавядання. Перачытваючы «Смаленне...» сёння, бачу, што ў ім — увесь Міша, з усёй яго трапяткой, пяшчотнай, чыстай душою, з яго тонкім, пранізлівым адчуваннем жыцця — светлага і трагічнага адначасова. І калі перачытваю, успамінаецца мне той летні, ці то ліпеньскі, ці то жнівеньскі дзень, як сядзелі мы каля магілы Паўлюка Труса, як хораша, хоць і сумна нам было за той горкай, але і салодкай чаркаю памінання... І ўспамінаецца другі Міша, якога вылечылі ад гарэлкі. І той самы, здавалася б, чалавек, і — не той. Адбылася ўсё ж нейкая падмена асобы, нешта штучнае, ненатуральнае з'явілася ў ім. І думаецца, што не трэба чалавека — дарослага — лячыць ад яго самога, не трэба яго перавыхоўваць, калі лёс ужо акрэслены, вызначаны Богам, наканаваны нябёсамі. Хай чалавек застаецца такі, які ёсць, быў бы ён — ЧАЛАВЕК, а ўсё астатняе можна і трэба сцярпець. Хоць гэта і цяжка...

З таго дня Вайсковыя могілкі для мяне — не толькі апошні прытулак мамы маёй, дзеда Івана і дзядзькі Івана, не толькі боль па страчаных іхніх магілах, але і месца, дзе засталася часцінка Мішавай душы. І разам з уздыхам па маме, па дзеду і дзядзьку нараджаецца, цісне грудзі і ўздых успаміну пра сябра: Міша, Міша...

Уладзімір Мехаў

«Быццам апошні раз жыву на зямлі...»

Колькі разоў такое здаралася, асабліва апошнія год-паўтара яго жыцця!..

Прагна і неяк хапатліва зацягваючыся цыгарэтай, ён стаіць на бетонных сходах пры ўваходзе ў рэдакцыю «Нёмана» — па-мужчынску прывабны, падцягнуты, з неабыякавасцю да таго, што надыктавана модай, апрануты. Явачныя службовыя гадзіны на сёння скончыліся — будзем шчырыя, паўсюль, дзе ён служыў, яны заўсёды былі яму не надта па душы, цяпер тут, у «Нёмане», таксама. Відавочна не адышоўшы яшчэ думкамі ад таго, чым заняты быў у пакойчыку свайго крытычнага аддзела, — ад старонак недачытанага рукапісу ці ад нервовай размовы з якім не дужа сімпатычным аўтарам, — ён цяпер, відаць, у галаве прыкідвае, ці адразу яму спусціцца ў метро і кіравацца дамоў, ці спачатку зазірнуць яшчэ па не дужа пільным, але ўсёткі клопаце ў недалёкі Саюз пісьменнікаў, у недалёкую рэдакцыю «ЛіМа».

Жыхар таго самага дома, у якім размешчана рэдакцыя «Нёмана», я таксама іду гэтым часам са службы, заўважаю знаёмую постаць, узнімаю руку.

— Здароў, стары! — махае ў адказ Стральцоў, зычліва ўсміхаючыся; не думаю, што мне гэта здаецца. — Не бяжы, давай парукаемся...

Мы не былі з ім блізкімі сябрамі. Адносіны паміж намі ніколі не пераходзілі мяжы, так сказаць, паважлівай таварыскасці, хоць знаёмства цягнулася гадоў, мабыць, пад трыццаць. Нікуды іх не дзенеш — розніцу ва ўзросце, розніцу ў абставінах духоўнага фармавання, розніцу асяроддзяў, з якіх паходзілі, розніцу, урэшце, у ладзе бытавання. Аднак жа выйшла так, што па нейкім часе, калі гэты лад бытавання ператварыўся ў яго ў поўнае бязладдзе, — не будзем тут дашукваццa прычын, але не будзем і змоўчваць па-фарысейску пра тое, што ў ягоным жыцці бывала ўсялякае, — прасіць прытулку, месца для начлегу ён часцяком прыходзіў і да мяне. І ў тыя вечары, у тыя

познія, заўсёды за поўнач, размовы (унутрана ўскаламучанаму, напятаму, яму не спалася, сядзеў і сядзеў, чытаў, курыў) Міхась па-чалавечы раскрыўся мне паўней, чым гэта сталася б ва ўмовах нармальных: пры сустрэчах у рэдакцыйных кабінетах, у кулуарнай балбатні, пры розных іншых акалічнасцях нашай літаратарскай мітульгі. Хоць прыходзіў ён, як бы гэта сказаць падалікатней, у розным стане...

Ці ж забыцца мне, напрыклад, як аднаго разу гадзіны са дзве запар ён чытаў нам на памяць Пушкіна. У такім быў настроі. Узрушана прасветлены, з павільгатнелымі вачыма — толькі ў боціку-попельніцы большала і большала недакуркаў. Чытаў не школьнае, не з верхняга хрэстаматыйнага пласта, а Пушкіна, якога ў масавых аднатомнічках не знойдзеш, у праграмах эстрадных чытальнікаў не пачуеш. Чамусьці ўсё вяртаўся да верша «Палководзец» — пра высакароднага Барклая дэ Толі. Пра крыўдную несправядлівасць і людскую няўдзячнасць, якую слаўнаму палкаводцу выпала перацярпець. Хваляваўся, акцэнтуючы асабліва пранізлівыя радкі:

И в имени твоем звук чуждый не взлюбя,
Своими криками преследуя тебя,
Народ, таинственно спасаемый тобою,
Ругался над твоей священной сединою...

Ці ж забыцца, як прыгадаў я неяк ягоны даўні на час нашай размовы, бліскучы нарыс «Дзень у шэсцьдзясят сутак» і не згадзіўся толькі з ацэнкай, дадзенай там мімаходзь амерыканскаму фільму «Вялікі вальс» — што гэта звычайная пошласць, цудоўная ў фільме толькі музыка Штраўса. Ува мне ж з хлапечых гадоў «Вялікі вальс» жыў як грандыёзнае, ашаламляльнае свята красы. Міхась узняў брыво, не тоячы здзіўлення.

— Гэта гаворыш ты? Ну, стары!..

З дасведчанасцю, якую пад сілу выявіць не кожнаму аканды-дачанаму прафесійнаму кіназнаўцу, з інтанацыяй нейкай нават грэблівасці да банальнага, таннага ў мастацтве ён пераказаў славутую экранную гісторыю кахання кампазітара і спявачкі, як нешта невысокае, разлічанае на слінявую слязу абываталя.

Прытым відаць было, што ён не стаў у позу. Выспелая ў ім праз няспынную работу душы і думкі вышыня крытэрыяў даўно стала для яго арганічнаю...

Не помню, ці дыскутаваў з ім тады, але цяпер, як кажуць, у дужках зазначу, што, прымаючы таварышаву пазіцыю ўвогуле, я ў дачыненні непасрэдна да «Вялікага вальса» застаўся пры сваім меркаванні: лічу фільм прыкметнай у гісторыі кінематографа з'явай. І было мне цікава (прыгадалася і колішняя спрэчка) прачытаць нядаўна ў «Литературной газете» прачулае слова пра гэтую карціну Віктара Астаф'ева. Пра тое, як уварвалася яна некалі сонечным промнем у яго спецпасяленцкае хмарнае юнацтва. Міхась у «Вялікім вальсе» гэтай сонечнасці не адчуў. Належаў ужо да іншага пакалення — з іншымі меркамі, з іншымі пунктамі адліку. Кіно ж старэе хутка, як ніякае з мастацтваў...

Ці ж забыцца з тых вечароў проста на штрыхі яго натуры. Скажам, як нямнога яму трэба было, каб засмяяцца. Вядома, калі не гняло, не мучыла цяжкое.

Неяк прыйшоў ён нападпітку не адзін, з прыяцелем паэтам. Чалавекам мілым, даўно мне знаёмым, але госцем у маім доме ўпершыню. У цеплыні ды пасля чаю ў галовах прытуманілася. Міхасёву прыяцелю спатрэбілася пазваніць. Спытаўся, дзе тэлефон, я махнуў — у пакоі, маўляў, убачыш. Праз колькі часу заўважаем, нешта доўга яго няма і не чуваць, каб гаварыў. Іду ў пакой, дзе стаіць тэлефон, — нікога. Зазіраю ў суседні, дзе спіць ужо мой сын-школьнік, і ў паўцемры, у снопіку святла з калідора бачу карціну найпацешную: госць накручвае дыск апарата-цацкі, матчынага падарунка сыну з часу, калі хадзіў ён у садзік. Накручвае і не можа даўмецца, чаму не чуе адказу.

— Чорт, сапсаваўся, мусіць, тэлефон ці ў мяне, ці ў вас. З паўгадзіны набіраю нумар і без толку...

Што рабілася з Міхасём, не перадаць! Выціраючы слёзы і зноў пачынаючы рагатаць, ён даймаў небараку:

— Дзед, а ты педальную машыну ў парку Горкага за таксі не прымеш?

І, забрыдаючы наступнымі разамі — слалі мы яму ў сынавым пакоі, — неаднойчы ўсміхаўся, згледзеўшы цэлулоіднага ашуканца з дыскам: — Гэты?

У кагосьці з класікаў я чытаў, што па тым, як чалавек смяецца, можна вызначыць, ці добры ён чалавек. Калі гэта напраўду так, то Стральцоў смяяўся, як чалавек добры...

Цяпер тое даўно мінулася. Каламутнае ў яго жыцці, здаецца, асела, увайшло ў берагі. Цяпер, калі вось гэтак сутыкаемся каля ганка «Нёмана» і няспешна абгаворваем навіны і чуткі, Мішава быццё, дзякаваць богу, нібыта людское. Пры службе, пры доме. Публікуе артыкулы і вершы. Выпускае кнігі.

Ён ведае сабе цану як пісьменніку і, складваецца ўражанне, дабірае недабранае за гады, што зглуміў. Ахвотна згаджаецца, калі запрашаюць прыняць удзел у перадачы тэлебачання. Рады сардэчнай атмасферы ў Доме літаратара, калі там «прэм'ера» яго новага зборніка паэзіі. Рады ўрачыстасці, з якой там жа неўзабаве адзначаецца яго пяцідзесяцігоддзе.

Ці мо гэта ад неўсвядомленага маркотнага прадчування? У яго ж яшчэ на пачатку сямідзясятых напісаліся шчымлівыя верлібравыя радкі:

Прыпыніўся,
голаў падняў і слухаю так,
быццам апошні дзень жыву на зямлі.

Разумею, нельга лічыць, што гэта сказана непасрэдна пра сябе — наіўна атаясамліваць лірычнага героя з асобай аўтара. Аднак жа ў нейкай ступені, мусіць, і пра сябе таксама!..

Развітваемся, і, як у кожнае гэткае спатканне, ён вінавата пачынае пра тое ж. Што трэба было б яму завітаць да мяне дамоў і пасядзець, як некалі. Што ёсць аб чым пагаманіць і пагаманіць ахвота. Толькі ж на глупства, на графаманаў розных часу стае, а як зайсці да харошых людзей, то і...

Я перапыняю, дзякую. Кажу, што быў бы, вядома, рады, ды не трэба так вінаваціцца: у Бога дзён многа, насядзімся, нагаворымся.

Вось мы і гаворым, Міхась Стральцоў. Я чытаю том твайго выбранага. Ён выйшаў, калі цябе ўжо не было.

Аляксандр Дракахруст

Посвящение в поэты

Почти все пишущие начинают обычно со стихов и лишь потом переходят на прозу. За редкими исключениями, прозаики считают свои стихотворные опыты «грехами молодости» и весьма скептически относятся к ним.

Но был, был такой прозаик в Минске, уже явивший читателям «лица необщее выраженье», прочно утвердившийся в литературе, который стал вдруг писать стихи, и стихи прекрасные. И ради них надолго оставил прозу.

Михась Стрельцов. Миша...

Стоит мне подумать о нём, как в памяти сразу всплывают тонкие черты его красивого лица, добрая, пожалуй, даже немного смущённая улыбка, и я будто слышу произнесенное негромким глуховатым голосом: «Понимаешь, старик...»

Я действительно был старше его. Но в наших отношениях это нисколько не чувствовалось. Да и не только в наших! Душа Михася была открыта всем — и молодым, и старым. Но сокровенным, творческим он делился с немногими, очень немногими.

В своих интересных воспоминаниях о Стрельцове, которые я, к сожалению, прочёл довольно поздно, Анатоль Сидоревич много пишет о его поэзии, о том, как, восхищаясь автором «Сена на асфальте», «Свет Ивановича, бывшего донжуана», поначалу никак не мог принять его нового увлечения и даже не читал появлявшихся в печати стихов. И как потом понял, что они — явление в белорусской литературе, новая, неожиданно открывшаяся сторона яркого и щедрого таланта.

Для Сидоревича только одно осталось загадкой: каким образом у Стрельцова совершился этот знаменательный переход от прозы к поэзии, что послужило первотолчком.

Думаю, это — одна из творческих тайн, которая не открылась до конца и самому Михасю (тут можно было бы много говорить о лирической настроенности его души. Но такая настроенность ведь далеко не всегда рождает стихи). А вот как

произошло его посвящение в поэты, я помню. Оно совершилось на моих глазах.

Михась жил в Королищевичах в той самой боковушке, в которой любил жить и работать Короткевич, и переводил повесть Алеся Адамовича, сейчас уже не припомню — какую. Переводил неторопливо, скрупулёзно. Жаль, что не сохранились те страницы, исписанные красивым чётким почерком с аккуратно внесёнными поправками.

А над Стрельцовым, в такой же боковой комнате, жил Рыгор Берёзкин.

Однажды, когда я сидел у него, в комнату, вежливо постучав, вошел Михась. Берёзкин очень обрадовался его приходу — он любил Стрельцова, высоко ценил его прозу.

Гостю сразу же была предложена чарка (это было задолго до того, как пристрастие к ней принесло Михасю столько бед и, скорее всего, послужило причиной его ранней смерти). Но пить он тогда решительно отказался. Был напряжён и, как мне показалось, чем-то взволнован.

Завязался оживлённый литературный разговор, в котором Берёзкин по обыкновению остроумно и едко отозвался о стихах довольно известного тогда поэта.

— А как вы отнесётесь к таким стихам? — внезапно спросил Михась и начал негромко, без выражения, читать.

Что он читал, — в памяти не осталось. Но уже с первых строк Берёзкин превратился в слух и потянулся к нему, стараясь выбраться из глубоко продавленного кресла.

Прочитав пять-шесть стихотворений, Михась умолк и выжидающе взглянул на Рыгора Соломоновича. Но тот требовательно бросил:

— Ещё...

И чтение продолжалось до тех пор, пока у Стрельцова не запершило в горле.

— Ваши?.. — не то спрашивая, не то утверждая, произнёс Берёзкин.

Михась кивнул: — Мои...

Я не могу сейчас воспроизвести темпераментный монолог, прозвучавший вслед за этим. Но всю дорогу от Дома творчества до Могилёвского шоссе Михась (я провожал его) только и говорил о восторженных словах Рыгора Берёзкина, критика нелицеприятного и очень скупого на похвалу. И, как мне кажется, именно они убедили Стрельцова, что это — его путь, что не только проза, но и поэзия — его призвание.

Иосиф Бродский как-то заметил, что единственный случай в литературе XX века, когда замечательный прозаик превратился в великого поэта — это случай с Томасом Харди. Оказалось, не единственный...

Уладзімір Някляеў

Яго няма ў чым папракнуць

З Міхасём Стральцовым, як і з многімі іншымі славутымі ў той час паэтамі, я пазнаёміўся ў доме творчасці «Каралішчавічы», дзе ўсе рабілі выгляд, быццам нешта пісалі, хоць пісалі там зусім нямногія — большасць прыязджала выпіць і адпачыць. Прыехаў і Стральцоў, яго пасялілі ў адным з двух самых вялікіх пакояў, што былі на першым паверсе, — якраз у адным з тых, дзе звычайна жыў Якуб Колас. Так мы апынуліся з ім разам у тым Доме творчасці. І ў той час, як большасць, выпіваючы, плявузгала абы што, мы сядалі з ім наверсе — пад карцінай, на якой было намалявана дзесяць ці дванаццаць савецкіх пісьменнікаў (Гарэцкі, Чорны, Бядуля...), і ладзілі спаборніцтва: хто напамяць дачытае верш, які прапануе яму суразмоўнік — верш ці то Купалы, ці то Багдановіча... Шчыра кажучы, я кожнага разу думаў, што, паколькі Міхась Лявонавіч быў нападпітку, дык я лёгка яго перамагу. Але ніводнага разу мне гэта не ўдалося, таму што ў Стральцова былі ўнікальныя эрудыцыя і памяць. І да таго ж — розум, на які алкаголь ніякага ўздзеяння яшчэ не зрабіў...

*

Так прамінуў амаль месяц. Ужо не помню, хто з маіх сяброў прыехаў, каб забраць мяне з Каралішчавічаў, на машыне. І якраз ідзе па сцяжыне Стральцоў. Кажу яму, што еду ў Мінск, і прапаную падвезці, бо ён таксама збіраўся дахаты. «Добра, — ківае ён. — Падвязі». «Тады, — кажу, — збірайцеся...» — і падымаюся ў свой пакой на другі паверх, каб забраць рэчы. Спускаюся ўніз — Стральцоў ужо ў машыне. Пакуль я падымаўся-спускаўся, прайшло хвіліны паўтары — ён не мог так хутка сабрацца. Сядзіць. Маўчыць. У лес глядзіць. «Задумаўся пра нешта чалавек», — вырашыў я і, сеўшы ў машыну, стаў чакаць, пакуль ён выйдзе з задумення. Чакаю пяць, дзесяць хвілін... пятнаццаць... Нарэшце ён пытае:

— А чаго стаім?

— Вас, Міхась Лявонавіч, чакаем.

— Дык я тут.

— Але ж не сабраліся...

— Я сабраўся, — кажа Стральцоў і дастае зубную шчотку і расчоску — усё сваё, што ён насіў з сабой.

— Чакайце... — разгубіўся я. — Ну, добра, няма ў вас адзежы, абутку, але тое, што вы тут напісалі, дзе яно?

— А чаму ты вырашыў, што я тут нешта напісаў?

— Усе сюды прыязджаюць, каб нешта напісаць...

— Тады, — кажа, — ты не зусім зразумеў, што ў нас тут адбывалася.

— А што, — пытаю, — адбывалася?

— А тое... Я для чаго з табой начамі не спаў, вершы геніяльных паэтаў чытаў — беларускіх, рускіх, французскіх? Каб паказаць табе, што ўсё ўжо напісана — не намагайся. Вазьмі з сабой зубную шчотку, расчоску, хадзі, дыхай свежым паветрам і чытай вершы, лепшыя за якія мы з табой наўрад ці напішам.

— Калі так, — кажу, — тады паехалі...

*

Калі мы сустрэліся са Стральцовым у Каралішчавічах наступным разам, ён ужо моцна выпіваў, што мяне моцна не-

пакоіла. Калі б графаман які, дык няхай бы, але графаманы звычайна не п'юць. Ім няма калі, яны пішуць, пішуць, пішуць... А тут Стральцоў... Са Сцяпанам Гаўрусёвым на пару яны адзначалі святы жыцця. Кожны дзень — свята. Абодва ж таленавітыя, чэрці... Шкада. Дык я што прыдумаў? Аднойчы зачыніў Стральцова ў пакоі на ключ, каб не «святкаваў», а пісаў. Са сталовай прынёс паесці, а ён у фортку насустрач мне прагаўкаў. Адзін толькі раз: «Гаў!..» І тым самым усё мне пра мяне сказаў. Мяне на плямы пабіла — гэтак сорамна стала. Адамкнуў пакой і ключ на цвічок павесіў...

*

Між іншым, у Стральцова была шыкоўная бібліятэка — у ёй не было нічога выпадковага, ніякага «смецця». З гэтай бібліятэкі ён падараваў мне «Толковый словарь живого великорусского языка» Даля. Увесь расцярэблены, ён і цяпер у мяне ёсць — чатыры тамы. Мы доўга сядзелі з Міхасём Лявонавічам, гартаючы гэты слоўнік, і ён паказаў мне процьму слоў, якія захаваліся на сённяшні дзень толькі ў беларускай мове, у рускай іх нямашака. Ці ёсць, але не ўжываюцца. Значыць, ці сам Даль, ці карэспандэнты ягоныя збіралі гэтыя словы на нашай, беларускай зямлі. І Стральцоў, кажучы пра гэта, дужа засмучаўся, што ў дужках не пазначана ў слоўніку: «беларускае». І прапаноўваў слоўнік перавыдаць у адпаведнасці, як ён казаў, са статусам акадэмічнага выдання. «Павінна, — казаў ён, — павінна быць у дужках: «беларускае», «беларускае»...» Але з беларускім — у дужках і без дужак — і сёння кепскавата. Нават у Беларусі няма ў беларускага адпаведнага статусу...

Але ў Міхася Стральцова статус ёсць. І аўтарытэт. Не толькі літаратурны, але і маральны. Ён адзін з нямногіх — гэтаксама, як Караткевіч, — каго няма ў чым папракнуць. Не ў побыце, не ў тым, што выпівалі, а ў творча-чалавечым, калі можна гэтак сказаць, жыцці, якое яны пражылі бездакорна. Гэта вызначальныя постаці ў нашай літаратуры. Знакавыя.

У нечым знакавым сталася для мяне і пахаванне Міхася Стральцова. Менавіта ў дзень развітання з ім Генадзь Бураўкін

і Рыгор Барадулін узялі з мяне слова, што я ўсё зраблю, каб часопіс «Крыніца», пра стварэнне якога ўжо ўсе ведалі, не патрапіў, як яны казалі, «у чужыя рукі». Тады даволі багата было ахвочых узначаліць новае выданне, і мне не надта хацелася лезці ў кагал... Барадулін сказаў: «Лічы, што з намі Міхась, і мы ўтрох пастанавілі: трэба!» Супраць трох не папрэш... Мы яшчэ пагаварылі, што ды як, і я згадзіўся: «Клясціся не буду, але паспрабую зрабіць так, як мы тут, над гэтай магілай, дамовіліся». Не ўсё, канешне, удалося, але спадзяюся, што за «Крыніцу» Стральцоў на мяне не наракае. Зрэшты, спаткаемся — скажа.

З цыкла «Знакі прыпынку»

* * *

Міхась Стральцоў задаваў, здаралася, зусім нечаканыя пытанні. Ну, да прыкладу: «Калі ты паэт, дак скажы, што такое кондак?..»

Пра кондак ніхто (у тым ліку я) нічога не ведаў. Але я дазнаўся з энцыклапедыі, што гэта такое, і калі ў бары Дома літаратара Міхась Лявонавіч запытаўся пра той кондак у Міколы Федзюковіча, я за таго адказаў.

«Кондак — жанр візантыйскай царкоўнай паэзіі, назва якога паходзіць, магчыма, ад грэцкага kontakion, што значыць кароткі, але больш верагодна — ад цюркскага kondgar, што можна перакласці як настаўленне на шлях ісціны» (з энцыклапедыі). Прыкладна так, як напісана ў энцыклапедыі, я і сказаў.

Уразіў мой энцыклапедычны адказ не столькі Стральцова, які ўхвальна кіўнуў: «Малайчына, што прачытаў, паэту трэба ведаць прафесію», — колькі Міколу. Ён хадзіў ад стала да стала і ўсім прапаноўваў наліць і выпіць за мяне, стоячы, бо такіх разумных, як я, ён не сустракаў і ўжо наўрад ці сустрэне, хоць сам скончыў Літаратурны інстытут. Аляксей Дударaў, з якім мы тады вельмі блізка сябравалі, амаль заўсёды і паўсюль бывалі разам, выпіць за мяне згадзіўся, але ўставаць, седзячы з Жэняй Янішчыц, не захацеў, спытаўшы: «А з чаго ты ўзяў,

што Някляў такі разумны?» Мікола пачаў тлумачыць яму, чаму: «Бо Някляеў ведае... ведае... бо ведае... бо...» — ніяк не мог ён, нахадзіўшыся ад стала да стала, успомніць, чаму я разумны, а Дудараў усё чакаў, не ўставаў, шклянка ўсё не налівалася, і Мікола скончыў знясілена: «Бо ты кондак!..»

«Не энцыклапедычна, але лагічна», — пачуўшы гэта і ціха засмяяўшыся, сказаў Стральцоў.

* * *

Сваю кнігу «Яшчэ і заўтра» Міхась Стральцоў некалі падпісаў пры мне: «Дарагому майму Леаніду Дранько-Майсюку з любасцю да ўдумлівага ягонага таленту». Перад тым на кнізе Стральцова «Ядлоўцавы куст», узятай з хатняй бібліятэкі Дранько-Майсюка, я прачытаў: «...з павагай да ягонай чалавечай удумнасці». Было гэта ў 1983-м, паўжыцця таму, Дранько-Майсюку споўнілася ўсяго 25, у яго толькі-толькі выйшаў першы зборнік вершаў «Вандроўнік», і я не стрываў, каб не спытаць Міхася Лявонавіча, ці не зашмат ён заўважыў удумнасці ў гэткім, кажучы слоўцам Лынькова, *юнашы*, на што Стральцоў сказаў: «Пабачым...»

Прамінуў час, Леанід Дранько-Майсюк напісаў шмат кніг, бліскучых тэкстаў у вершах і прозе (чаго вартае хоць бы апавяданне «Анёлак і я», адно з лепшых ва ўсёй беларускай літаратуры), і аказалася, Міхась Стральцоў не памыляўся, вылучаючы ў таленце тады яшчэ зусім маладога паэта ягоную *чалавечую ўдумнасць*. Гэта значыць тое, з чаго ствараюцца не бурбалкі на вадзе, а ўсё глыбіннае, сапраўднае — у тым ліку сапраўдная літаратура.

Да гэтага такая дэталь. Міхась Стральцоў, чалавек лёсу адзінотнага, нейкі час знаходзіўся амаль за кратамі — у Мазыры, у так званым лячэбна-працоўным прафілакторыі. А памёр ён ад раку. На памінках па ім я спытаўся ва ўсіх, хто прамаўляў пра яго, як яно водзіцца, усялякія пранікнёныя словы, сябе ўспамінаючы ўлюбёным ягоным сябрам: а хто з вас хоць аднойчы наведаў Стральцова ў тым прафілакторыі?.. Калі яму кепска было, калі ён ледзь не канаў...

Аказалася, што ніхто. Апроч Леаніда Дранько-Майсюка, які не называўся сябрам, але вазіў Стральцову ў той «прафілакторый» і тытунь, і хлеб, і кнігі...

Чалавечая ўдумнасць, аказваецца, дапамагае ствараць не толькі сапраўдную літатуру, але яшчэ і сапраўднага чалавека ў сабе, што складаней і цяжэй за ўсе астатнія стварэнні.

* * *

Аднойчы я прысутнічаў пры размове Янкі Брыля і Міхася Стральцова. Брыль даводзіў Стральцову, што ён, Стральцоў, не проста літаратар, што ён — ахоўнік літаратуры. Чысціні стылю, мовы. Сціплы Міхась Лявонавіч адказаў Брылю, што той зблытаў яго з сабой. На што Брыль заўважыў жартаўліва: «Нас немагчыма зблытаць, я вершаў не пішу. І пісаць не збіраюся».

У адрозненне ад празаіка Янкі Брыля, які не пісаў і не збіраўся пісаць вершы, паэт Міхаць Стральцоў лічыў (і пра гэта сказаў неяк), што кожнаму прыстойнаму паэту не зашкодзіла б кніга прыстойнай прозы. І напісаў такую кнігу, адно з апавяданняў якой, «Смаленне вепрука», стала ці не найлепшым у беларускай літаратуры.

Марына Наталіч

Позірк за небакрай...

З Міхасём Стральцовым я блізка знаёмая не была. Так, чытала, чула — працуючы ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», што цікавы празаік, амаль яшчэ, здавалася, малады, водгукі і воклічы пра «Сена на асфальце» — сімвал яго пакалення, пра настальгічнае вясковае «Смаленне вепрука», кранальны і мудры «Адзін лапаць, адзін чунь».

Але ўпершыню пабачыла ў выдавецтве — зайшоў у пакой рэдакцыі чалавек, моцна вымучана-схуднелы, з амаль адсутным позіркам, ветліва прыцішана спытаўся знаёмую рэдактарку. І выйшаў.

Не заспеўшая Стральцова Вера Сымонаўна Палтаран, загадчыца рэдакцыі крытыкі, добрага сэрца і ўвагі якой хапала на процьму пісьменнікаў і іншых разнастайных творцаў, яшчэ доўга ўздыхала, цяжка вохкала і шкадавала, што не сустрэлася з ім, не пагаварыла, не пачаставала чаем.

А неўзабаве прыйшла вестка, што Стральцоў змешчаны ў «мазырскі прафілакторый», і глухія разважанні — трэба ці не трэба, ці ўратуецца там. Да яго пісалі, нехта ездзіў наведваць, спадзяваліся на лепшае, чакалі вяртання. І Міхась Лявонавіч вярнуўся праз год. І прыйшоў да Веры Сымонаўны. Яе радасць, любоў, замілаванне былі амаль мацярынскімі. Адразу арганізавалі чай з зефірам. Міхась Лявонавіч быў ціхі, светлы, маўклівы, з нейкім нібы закінутым у сябе позіркам. Такім ён і застаўся ў зрокавай памяці па сённяшні дзень, быццам я бачыла яго твар намаляваным на палатне. Веры Сымонаўне дужа хацелася дапамагчы Міхасю з працаю. «А каб жа да нас у рэдакцыю! Паэт, празаік, крытык — і ва ўсім выдатнейшы!» Ды вольных вакансій у выдавецтве не было.

Але хутка Міхась Лявонавіч уладкаваўся ў часопіс «Неман». Памятаю бясконцыя хваляванні Рыгора Іванавіча Барадуліна: «Бягу да Мішэля! Трэба загрузіць працай! Каб працаваў, а там увойдзе ў смак і пачне пісаць!..» І бег, і нёс — то рукапіс на рэцэнзію, то вершы на пераклад. І сам часам пасмейваўся з сябе, што, можа, надакучыў ужо свайму сябру да гаркоты, але ж — «трэба, трэба раскатурхаць, падахвоціць, не пакідаць сам-насам і друкаваць з-пад рук, і выдаваць!». І чакаў, настойліва падштурхоўваючы, новай аповесці Міхася Лявонавіча — «Конь гуляў на волі», нават арганізавалі абвестку ў часопісе, што хутка чакаецца... Жаданае, на вялікі жаль, не спраўдзілася.

Гады праз два Рыгор Іванавіч па дабраце душэўнай сам занёс Стральцову мае вершы, а праз кароткі час: «Зайдзі да Міхася...» Не памятаю, як, трапечучы, дабегла да «Немана», і адразу пабачыла Міхася Лявонавіча — на парозе невялічкага кабінета. Ён курыў, а потым, прабачаючыся, проста круціў цыгарэту ў пальцах — такі ж ціхі і быццам адсутны — і адначасова далікатна-

ўважлівы. Вершы ён не разбіраў, толькі зрабіў па памяці заўвагу пра «беларускі» націск у слове ды сказаў пра адкінуты вершык з радкамі «А над речкой белая берёза / Деревянным лебедем плывёт», што наследаваць хаця і Вазнясенскаму — не варта, трэба пісаць сваё. (Я нават пра сябе трошачкі ўзрадавалася, бо вершык быў напісаны на самым ранку 70-х студэнцкіх гадоў, калі пра Вазнясенскага грозна шумелі, а прачытаць, папраўдзе, і не было дзе.) «А падборачку дадзім... — сказаў Міхась Лявонавіч зусім будзённа, — і фота прынясіце... а зайдзіце да нашага фатографа, ён здыме».

Ад «замроенай» ціхасці Стральцова я сама нямела, і таксама толькі ціха падзякавала. «А ці не пагадзіліся б вы пісаць рэцэнзіі на якія кніжкі?» — раптам здзівіў мяне Міхась Лявонавіч. Але я і падумаць не магла, што здольная на падобную «творчасць», ды пэўна ведала, што гэтая справа не па мне.

У спякотным — балючым, *жальным, жалосным* — жніўні 1987 года Міхася Стральцова не стала.

У сярэдзіне 90-х, калі Рыгор Іванавіч пісаў свае «неканонізаваныя» ўспаміны, я жыла ў шчаслівым прадчуванні даверанага мне рэдагавання зборніка «Аратай, які пасвіць аблокі», бо, працуючы побач, мы ўдосталь наслухаліся вясёла-хмельных гісторый пра дарагіх сэрцу паэта сяброў і «літаратурных» знаёмцаў — Уладзіміра Караткевіча, Яўгена Шабана, Генадзя Кляўко, пра Рыгора Бярозкіна і Антона Бялевіча, Піліпа Пестрака і Станіслава Шушкевіча, Петруся Броўку і Анатоля Вялюгіна, і... і...

Аднойчы я спытала Рыгора Іванавіча, а хто ж быў для яго самым-самым блізкім па жыцці сябрам? Ён не адказаў — выдыхнуў імгненна: «Міхась! Міхась Стральцоў!» Я нават трохі здзівілася — так шмат чула ад яго шчырых прыпамінаў пра Караткевіча. «Канешне, Валодзя... але ні з кім не было такіх духоўна блізкіх размоў, як з Міхасём...» Прыкладна так ён адказаў, і было абсалютна зразумела, што ніякае сяброўства не адмяняе іншых, але ёсць чалавек, назаўсёды паселены ў самым сэрцы, з якім звязана вельмі дарагое, глыбіннае і высокае, духоўнае — амаль безназоўнае...

Заўважаю, што ўвесь час спрабую злавіць, як мятліка за крылцы і «прышпіліць» словам такі незабыўны позірк Міхася Лявонцьевіча — прыхавана-засяроджаны і ў той жа момант адсутны. Сказаць «замроены» — але ж не, зусім не тое, не «ружова-блакітны», не летуценны, а хутчэй прыцішана-балючы, спакутавана-прасветлены. Ён глядзіць на цябе, а бачыць неба за табою — хмарна-сіняе, пераменлівае, бачыць недасяжную даль-глыбіню, такую неабходную яго душы і ў той жа час небяспечную. І бесперапынна намагаецца спазнаць сутнасць таго вялікага Невядомага. І гэты позірк, нават калі Стральцоў пасміхаецца, я ўгадваю на ўсіх ягоных фота.

І ўсё стала зразумелым, калі я ўзялася перачытваць том яго «Выбраных твораў», выдадзены у знакамітай ужо серыі «Беларускі кнігазбор» у 2015 годзе.

Немагчыма ні працытаваць, ні перасказаць ўсе тыя вершаваныя радкі ці сказы, у якіх Міхась Стральцоў сам прагаворвае, малюе словам тое, у што так углядаецца, што бачыць яго душа — пераменлівыя падрабязнасці зямнога бытавання ці глыбіні сябе самой і далячыні неспазнанага свету. І як на маё адчуванне — чытаючы, я пазнаю тое, што шукала і ці знайшла яго душа — у свеце і па-за светам. Чытаю не вершы, не апавяданні, не літаратурныя згадкі, а толькі іду следам яго бясконцых пакутлівых душэўных пошукаў, якія я распазнала праз яго позірк — засяроджаны і адначасова лятучы за небакрай...

І можа, самымі нібыта простымі словамі ён сказаў пра чалавека («створанага» ім), а па сутнасці, пра сябе самога ў вершы «Аднойчы ноччу...»:

Чалавек да мяне нахіліўся:
струменіў з вачэй нейкі жаль,
падобны на той, што бывае ў асеннім ветры,
калі ён пралятае над сіратлівым іржышчам.
. . . . . .
«Ведаеш,
калі ты раніцай курыш,
разгублены і задуменны,
мне балюча глядзець на цябе.

І днём між людзей ты ходзіш
нейкім далёкім рэхам
і цыгарэт выкурваеш болей,
чым прамаўляеш слоў.
Скажы мне цяпер, калі ласка,
чаму ні ў натоўпе, ні дома
не хочаш мяне пазнаваць?»
. . . . . .
Я гляджу,
я маўчу,
я думаю,
што гэта мне сніцца сон.

P. S. З Аленай Дзмітрыеўнай Стральцовай, якую мне ў апошнія гады дазволена па-сяброўску называць Леначкай, мы сядзім у іх доме і гаворым бясконца — то весела, то ўзрушана пра яе Міхася, пра яго сяброў, пра ўсё ўперамешку — жыццёвае, востранадзённае і балюча-душэўнае. Мы нават спяшаемся перагаварыць усё-ўсенькае, бо Міхась адышоўся па справах, але во зараз прыйдзе і мы ўтраіх сядзем абедаць — і зноў гаварыць, нібыта ні пра што, ужо трошкі хітруючы па-жаночы ў яго прысутнасці, а ён будзе слухаць і адно лагодна пасміхацца. Яго прысутнасць рэальная да такой моцы, што ніколі нябылае бачыцца мне ва ўсіх падрабязнасцях.

Дальбог, толькі сапраўды вялікаму каханню па сіле ствараць падобную рэальнасць, і ніякага яго сыходу амаль трыццаць гадоў назад проста не здарылася...

2016

Леанід Дранько-Майсюк

Устойлівае суседства

У нашай літаратуры існуе ўстойлівае суседства імёнаў: Купала — Колас, Дубоўка — Пушча, Броўка — Глебка, Танк — Куляшоў, Арсеннева — Геніюш, Брыль — Панчанка, Шамякін — Мележ...

Утварэнню гэтага суседства пасадзейнічалі перш за ўсё школьныя хрэстаматыі, а таксама ж гістарычныя непрадбачанасці.

Словам, так ужо сталася, што калі мы ўспамінаем Янку Купалу, то праз хвіліну якую пачынаем успамінаць і Якуба Коласа, калі чытаем Уладзіміра Дубоўку, то ўслед за ягонай паэзіяй хочацца перачытаць і вершы Язэпа Пушчы, а калі, скажам, думаем пра Петруся Броўку, то міжволі думаем і пра Пятра Глебку і г. д.

Як зорка абуджае блізкую зорку, так імя абуджае блізкае імя...

За апошнія гады ўтварылася яшчэ адно такое суседства: Караткевіч — Стральцоў. Неаднойчы я ўдзельнічаў у гаворках, падчас якіх імя Караткевіча выклікала імя Стральцова і наадварот. Мяркую, гэта невыпадкова.

Караткевіч і Стральцоў — творча розныя, але сутнасна роднасныя; іх аб'ядноўвала адсутнасць у іхніх душах прагматызму і прысутнасць у іхняй крыві абыякавасці да сябе, да свайго здароўя, да забяспечанага жыцця; дарэчы, у іх было аднолькава-неўпарадкаванае жыццё.

Іх «аб'ядноўвае» (свядома тут выкарыстоўваю двухкоссе!) і Дзяржаўная прэмія — толькі ім у галіне літаратуры яна была прысуджана пасмяротна.

Зрэшты, не прэміі, не грошы і не пасады, а творчае летуценне — вось іхняе крэда!

24 студзеня 1982 года я прыехаў з Масквы ў Менск і зайшоў да Караткевіча.

Стральцоў у гэты час знаходзіўся ў мазырскім «санаторыі», і праз чатыры дні я збіраўся наведаць яго...

— А там ёсць лес? — раптам спытаў Караткевіч.

— Не ведаю... Мусіць, ёсць...

Тады ён разгарнуў сваю кнігу і прачытаў: «Ўсё, што было, і ўсё, што часам сніцца, забуду ў лесе...»

Гэта быў пачатак верша, прысвечанага Міхасю Стральцову.

Адзіноцтва зоркі

Пасля доўгага маўчання, якое мяне заўсёды вельмі інтрыгавала, сваім адметным глухаватым голасам Ён мог нечакана сказаць: «...памяркоўнасць, старычок, гэта наша асноўнае багацце...» — і, прыкурыўшы невядома якую па ліку цыгарэту (а курыў Ён вельмі шмат), тут жа змаўкаў.

Я цярпліва чакаў Яго новую думку, — выказаўшы якую, Ён зноў паглыбляўся ў сваё бяздоннае маўчанне, ахутанае тытунёвым дымам.

Наступнае выказванне, як і папярэдняе, узнікала з усё тою ж раптоўнай адвольнасцю, што ўласціва, заўважу, найбольш тым пісьменнікам, якія мала пішуць...

Мне падабалася, што ў гутарцы з Ім кожная хвіліна здавалася гадзінай, кожнае слова мела сэнс, само маўчанне было ўтульным, а Яго ласкавы да мяне зваротак «старычок» (так Ён, дарэчы, звяртаўся толькі да сяброў) прыводзіў да супакоенага пераканання: нашыя сяброўскія адносіны ніколі не перарвуцца.

Ён мала гаварыў, быццам не давяраў таму, што вымаўляецца ўголас; Яго даволі такі не зусім выразная вусная мова амаль заўсёды суседнічала з прабачальнай усмешкай; у гаворцы гэта ўсмешка часта служыла Яму заместа адказу...

І нібыта насуперак невыразнай дыкцыі Яго мастацкае пісьмо насычана паглыбленай прыгажосцю!

Пакутнік стылю, палоннік хараства, — Ён пазбягаў базарнасці.

У нашы дні, калі адсутнасць стылю і з'яўляецца стылем; калі брыда агрэсіўна заяўляе пра сябе, як пра дасканаласць; калі (падумаць толькі!) дзеці беларускіх пісьменнікаў здрадзілі мове Янкі Купалы і растлусцелі, выдаючы на ненавіснай ім расійскай мове кніжнае смецце — дык вось, у нашы базарныя дні Ён адчуваў бы сябе гэтак, нібыта апынуўся б на пахаванні нацыянальнага мастацтва...

У Яго няма дрэнных вершаў, эсэ, артыкулаў, аповесцяў; Ён, бадай што, адзіны беларускі літаратар, які не напісаў лішняга, непатрэбнага!

Ён пазбегнуў сацыяльнай сытасці, таму Ягоная творчасць пакідае ў чытацкай душы трывожную пяшчоту...

Ён аўтар лепшага ў нашай прозе апавядання — «Смаленне вепрука», а Яго надзвычай удалая аповесць «Загадка Багдановіча» — узорнае літаратурнае стварэнне.

Гэта кніга іскрыцца інтэлектам і шляхетна падказвае, як стаць, а — галоўнае! — як застацца беларусам.

«Загадка Багдановіча» — яшчэ і слова аб тым, пра што думае бескарыслівы чалавек у сваю апошнюю хвіліну.

У гэтым шэдэўры паказаны шлях паэта ад маральных пакут да пакут фізічных, і гэты шлях узбагачаны аптымістычнай хрысціянскай думкай: Галгофа — пачатак уваскрасення, пачатак вечнасці, у тым ліку і нацыянальнай.

У аповесці можна прачытаць: «У Багдановіча часта будзе так: ён ідзе разам з усімі, але тым часам ці наперадзе, ці трохі збоч...»

Бадай што, гэта сказана і пра сябе самога, бо Ён таксама ішоў «разам з усімі», але крышачку наперадзе, «ці трохі збоч...»

Яго становішча ў нашай літаратуры — гэта не адзіноцтва ганарыстага эстэта, а хутчэй адзіноцтва зоркі.

Мне, захопленаму выпускніку Літаратурнага інстытута, хацелася бачыць Яго ў сябрыне пісьменнікаў, якія б не абцяжарвалі бясконцымі просьбамі («напішы рэцэнзію...», «адрэдагуй рукапіс...», «прачытай маю кніжку...», «напішы ўступ да майго двухтомніка...» і г. д.); якія б не кралі Яго асабісты час — наадварот, сумленнай (г. зн., не надакучлівай) прысутнасцю спрыялі б творчаму ўмацаванню Ягонага часу...

Але гэтага не сталася...

У аповесці «Дзень у шэсцьдзясят сутак» Ён з сумам заўважыў: «...мне вельмі зразумела было, чаму чалавек можа адчуць сябе і адчувае часам адзінокім сярод людзей...»

Ён хацеў сябраваць і шукаў сабе заспакаення, калягуючы з літаратарамі, але, вядома ж, разумеў: ненадзейнае заўсёды знаходзіцца побач!

Паміраючы, Ён, магчыма, жахнуўся такой думцы: сяброў няма, ёсць проста людзі, якія памруць пазней...

І Яго, чалавека з цяжкім характарам, шмат хто ўспрымаў адпаведна: анёл з вачыма льва!

Яго філасофскае сіроцтва, стомленае, на жаль, сумнымі дарамі Вакха, хавала ў сабе злавесныя знакі абмежавання волі і ў канцы 1981 года па сутнасці ператварылася ў турэмнае зняволенне...

Больш за год Ён прабыў у мазырскім так званым лячэбна-працоўным прафілакторыі...

28 студзеня 1982 года я наведаў Яго.

Уражанне ад месца, у якім Ён апынуўся, было вельмі гнятлівым — высокі глухі плот з калючым дротам; на КПП узброеныя прапаршчыкі; закрытыя кратамі вокны; падобныя на астрожнікаў пацыенты; цьмяны глыбокі снег; злосны брэх вартаўнічай аўчаркі...

— Што, ад убачанага сэрца апала?! — Ён усміхнуўся і супакоіў мяне тым, што фрагментам вядомай пушкінскай страфы надпісаў мне сваю кнігу «На ўспамін аб радасці»:

...и я судьбу благословил,
Когда мой двор уединенный,
Печальным снегом занесенный,
Твой колокольчик огласил...

«...мой двор уединенный...» — так Ён ахрысціў лячэбна-працоўны прафілакторый, найбольш вядомы народу па савецкай абрэвіятуры ЛТП!

Я не мог не ўсміхнуцца...

Наркалогія лечыць (ці спрабуе лячыць!) алкагалізм, але ў часе гэтага лячэння ці не прытупляецца ў нашай душы тая вельмі каштоўная якасць, дзякуючы якой мы і з'яўляемся творцамі?!

Не, тады, у 1982 годзе, я так не думаў — гэта развага значна пазнейшага часу; тады я думаў-марыў пра іншае — пра нашу хуткую сустрэчу ў Менску...

Мы сустрэліся ў дзень яго вяртання з Мазыра, і Ён (геній маўчання!) гэтым разам гаварыў надзіва шмат.

Адчувалася: засумаваў па звыклым жыцці, па доме, па «літаратурнай» бяседзе.

Вось прыблізны ход таго Ягонага маналога: «...нястрымныя пачуцці трэба ператвараць у праўдзівыя думкі... баязлівасць — гэта слабасць інтэлекту... няма састарэлых слоў, ёсць састарэлае мысленне... грэкі вельмі дакладна вызначылі розніцу, якая існуе паміж гісторыкам і паэтам...» і г. д.

І раптам загаварыў пра Сальеры: ён не злачынец; легенда аб тым, што ён атруціў Моцарта, — проста выдумка ворагаў знакамітага італьянца; неабходна падтрымаць яго рэпутацыю; у нас Багдановіч першым паспрабаваў рэабілітаваць Сальеры...

І для большай пераканаўчасці працытаваў тое, што ўжо цытаваў у сваёй цудоўнай «Загадцы»:

...Сальеры ў творчасці усё хацеў паняць,
Ва ўсім упэўніцца, усё абмеркаваць,
Абдумаць спосабы, і матар'ял, і мэту
І горача любіў сваю свядомасць гэту.
У творчасці яго раптоўнага няма:
Аснова для яе — спакойная дума...

Зразумела, на чым засноўваецца Яго апалогія Сальеры, — на тым, што любімы Багдановіч паспрачаўся з Пушкіным, бо ў расійскага творцы «...Сальеры атрымаў несправядлівы суд...»

І таксама ж на тым, што Багдановіч уславіў Сальеры, параўнаўшы яго са знічкай...

І, вядома ж, на тым, што Багдановіч адзначыў: Сальеры — гэта ўвасабленне няспешнай, удумлівай, цяжкой працы...

Няспешная, удумлівая, цяжкая праца — як гэта блізка нам!

Ён меркаваў, што аўтар «Вянка» ўбачыў у стылі і характары знаслаўленага італьянца акрамя ўсяго іншага яшчэ і нешта беларускае — магчыма, залатую крупінку нацыянальна-звычаёвай нашай памяркоўнасці...

P. S. Міхась Стральцоў памёр пакутлівай смерцю 23 жніўня 1987 года, і вось ужо які год яго імя свеціць у нашай літаратуры тым самотным зорным святлом, без якога літаратуру нельга назваць класічнай.

Уладзімір Ягоўдзік

З дзённікавых запісаў

28.08.85. Па дарозе з «Нёмана» ў Дом літаратара да нас у лімаўскую рэдакцыю зайшоў Міхась Стральцоў. Прысеў каля майго стала, бліжэй да форткі, закурыў... Гаворка, зразумела, пайшла пра літаратуру. Я пытаўся, а ён адказваў:

«Пташнікаў — вельмі таленавіты празаік, але ў яго даўно зацяжная і, відаць, невылечная хвароба. Ягоная «Алімпіяда» — як выклік і чытачам, і крытыкам. А як яшчэ растлумачыць гэтую прагную звышнатуралізацыю ўсяго, што бачыць вока?..»

11.09.85. Як заўсёды з густам апрануты, з дабразычліваю ўсмешкаю на твары — Міхась Стральцоў. Толькі-толькі вычытаў на палосах свой матэрыял, што з'явіцца ў нумары за 13 верасня. Бачу — задаволены.

«Хацеў, каб атрымалася зліццё мастацкага слова з навукай, — закурыўшы, тлумачыць мне Міхась Лявонавіч. — Сухая крытыка цяпер нікому не патрэбна. Зразумела, прыходзіцца самому раскрывацца. А чаго баяцца? Максім Гарэцкі не баяўся. Прымайце такім, як ёсць. Цяпер жа некаторыя наіндычацца вучонасцю, а пачнеш чытаць — суцэльная кампіляцыя: ні думкі, ні пачуцця. Другая крайнасць — сачанкаўскія «Думкі ўроссып». Назва сама за сябе гаворыць: от ужо дзе боб з гарохам! Адзін факт з газеціны вышчыкне, другі па тэлевізары пачуе, трэці — смажаным яго ахрысцілі — нейкая бабка бабцы пераказала... Як называецца такое печыва? Ды называй хоць «залатым россыпам» — прозаю тут не пахла. У прозе найперш павінен прысутнічаць музычны лад. Калі хочаш — сімфанічнасць. І не важна, што ты пішаш, — раман ці мініяцюру. Вазьмі прышвінскія дзённікавыя запісы... Чытаеш — не адарвацца».

Алесь Пісьмянкоў

Настальгія па чыстым

З двара прыйду і сяду ля агню.
Палаюць дровы. Ссечана капуста
На градах — блаславенне дню.
Змрок у палях — там сіберна і пуста.
О роднае маё! Як доўга да цябе
Ішоў я, кволы падарожнік.
О весялосць у восеньскай журбе!
Агонь. Саган. Вуголле і трыножнік.

Кожны раз, калі да мяне прыходзяць гэтыя элегічныя радкі Міхася Стральцова, перад вачыма паўстае яго светлы вобраз. Успамінаецца зімовая паездка ў ягоны Сычын. Блізіўся 50-гадовы юбілей пісьменніка, і Алесь Шлег з тэлевізійнай групай здымаў фільм пра яго жыццё і творчасць. У той незабыўнай паездцы хвалявала многае: і сама прысутнасць Стральцова, яго блізкасць і прыязнасць, і, вядома, само запрашэнне наведаць радзіму разам з Рыгорам Барадуліным і Алай Сямёнавай было для мяне нечакана прыемным.

Памятаю, як з марознай стыні мы зайшлі ў яго бацькоўскую хату і з цікавасцю разглядалі рамачкі з фатакарткамі. Іх было многа — цэлы іканастас, цэлая галерэя фрагментаў і момантаў з жыцця роду Стральцовых.

Здаецца, гэта была акурат тая хата, што так любоўна апісана ім у шчымліва-пранізлівай аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь». Але не гэта мяне тады ўразіла — у нас на ўсходняй Магілёўшчыне такія іканастасы звычайная з'ява. На ўбітым у сцяну цвічку вісеў «лімаўскі» артыкул Алеся Станюты «Настальгія па прозе Міхася Стральцова». Міхась Лявонавіч неяк вінавата пасвяціў сваёй асаблівай стральцоўскай усмешкай і расчулена вымавіў: «Стары чытаў...»

І яшчэ быў на тым цвічку тоненькі школьны сшытачак, а ў ім запісы, зробленыя рукой нябожчыка бацькі: «Сёння на Сажы падняўся лёд» і г. д. Здавалася б, звычайны каляндар прыроды,

але веяла ад таго сшытачка нечым старажытна-летапісным, спадчынным...

Увечары мы доўга сядзелі ў гасцінай хаце суседа-настаўніка, былога вучня яго бацькі. Было светла ад шчырасці і цёпла ад бярозавага агню, што весела палаў у адкрытай грубцы. Якраз як у тым вершы: «З двара прыйду і сяду ля агню». Ён і сапраўды сядзеў ля агню. Шчаслівы і расчулены.

А потым праз чуйную вясковую цішыню мы моўчкі ішлі да нашага «рафіка». На лютаўскім марозе ярка гарэлі зоркі, а побач са мной трывожна ўспыхваў агеньчык стральцоўскай цыгарэты.

Гэта была яго апошняя сустрэча з родным.

Пазней я прачытаю ў Рыгора Барадуліна: «У кулаку Міхася Стральцова акурак зоркі».

Адам Глобус

Словы пра паэта Міхася Стральцова

Дзіцячая чыгунка

Стаяў цёплы пачатак лета, была нядзеля, Чэсь Адамчык і Міхась Стральцоў выправіліся на дзіцячую чыгунку. Чэсь быў з шасцігадовым сынам. Міхась — з шасцігадовай дачкой. Ні Чэсь, ні Міхась не пайшлі б на тую чыгунку. Іх выправілі жонкі — Міхасёва Галя і Чэсева Ніна. Яны нават сабралі дзецям і мужам у дарогу «зсабойкі» — хлеб з маслам ды сырам. Маленькі цягнік завёз маленькія вагончыкі з бацькамі і дзецьмі ў лесапарк. Там можна было з'есці бутэрброды, запіць іх купленым ліманадам і пагуляць пад высокімі соснамі. Так і рабілі: елі, запівалі, гулялі. Потым вярнуліся ў маленькія вагоны, і маленькі цягнік пацягнуў вагоны ў горад... Шасцігадовым сынам Чэся Адамчыка ў той нядзельнай вандроўцы быў я. Запомніліся цёплае святло, духмяны водар сасонніку і ўсмешкі Міхася Стральцова. Ён той летні падарожны дзень збольшага прамаўчаў і праўсміхаўся.

Пазначанасць

Міхась Стральцоў быў незвычайны чалавек. Незвычайнасць адразу кідалася ў вочы. У яго на шыі ружавела вялікая радзімая пляміна. Нібы апёк, нібыта вогненны малюнак, быццам таемны знак... Мне ў дзяцінстве, яшчэ ў школу не пайшоў, хацелася дакрануцца да гэтай пляміны. Здавалася, што цёмная ружова-фіялетавая скура павінна быць гарачай, як кіпень. Сяброўства са старэйшай дачкою Міхася Стральцова Вікай дазволіла мне бессаромна папрасіць пра магчымасць дакрануцца да радзімай пляміны. Яна была такая ж прахалодная, як і астатняя скура на шыі. Спатоліўшы цікаўнасць, я ўсё ж застаўся перакананым, што дзядзька Міхась — незвычайны чалавек, таму і пазначаны плямай.

Чытач

Нехта, здаецца, ці не Анатоль Сідарэвіч... (Дарэчы, гэта ж так па-стральцоўску: пачаць абзац са слова «нехта».) Пэўна, Сідарэвіч, седзячы ў пракуранай рэдакцыі часопіса «Крыніца», сказаў, што для яго ці не найлепшы вобраз, створаны Міхасём Стральцовым, такі: нехта пад ліхтаром чытае газету. Горад, ноч, ліхтар, чытач, газета. Самотны чытач у начным горадзе — стральцоўскі вобраз, безумоўна. Няважна, хто тое заўважыў — Анатоль Сідарэвіч ці Алесь Асташонак. Дакладна, што Сідарэвіч расказваў, як яны — студэнты, паэты і пісьменнікі-пачаткоўцы — чакалі апавяданняў Міхася Стральцова. Чакалі, а дачакаўшыся — чыталі, перачытвалі, зачытваліся, абмяркоўвалі... Хто цяпер чакае газетнае ці часопіснае апавяданне? Хто, стоячы ў начным горадзе пад запаленым ліхтаром, чытае газету? Усё змянілася. Большасць са зменененага і замененага пазабывалася. Усё яшчэ зменіцца пару-тройку разоў, пра нас забудуцца, можа, нават забудуцца пра пісьменніка Міхася Стральцова, але чалавек самотны будзе чытаць.

Шакаладны торт

Віцы Стральцовай споўнілася сем. На дзень народзінаў мяне запрасіла не Віка, а яе маці — Галіна Сямёнаўна. Быў куплены

шакаладны торт. У той безграшовы час такі торт — невераемная раскоша. Акрамя мяне, торт пакаштавала сама імянінніца, пакаштавала яе сястра Ніка, Галіна Сямёнаўна, мая маці і бацька імянінніцы — Міхась. Мы пілі гарбату і елі салодкае. На стале больш нічога і не было. Аскетычная раскоша. Больш за ўсіх з'ела Ніка. Яна замурзалася ў шакалад. Бацька сказаў ёй, каб пайшла і памыла твар. А яна заўпарцілася: «Не пайду, буду сядзець, як і ўсе!» Пэўна, каб надаць сабе дарасласці і вагі, Ніка сказала, што яе бацька з'еў чарвяка. Еў яблык. Чарвяк выпаўз на той яблык, а бацька ўзяў і з'еў яго. І Ніка, і Віка бачылі белага чарвяка, але не паспелі сказаць і папярэдзіць бацьку. Яны закрычалі: «чарвяк-чарвяк!», — але бацька яго ўжо праглынуў. Паглынанне чарвяка адбылося ў вёсцы пад Слаўгарадам. Дзяўчаты былі страшэнна ўражаны гэтым здарэннем, а Міхась Лявонавіч казаў, што так бывае, і нічога страшнага ў тым, што ён праглынуў чарвяка, няма. Невядома, колькі б яшчэ за святочным сталом згадвалі беднага яблычнага чарвяка, каб не Галіна Сямёнаўна. Яна — школьная настаўніца — загадала спыніць размовы пра чарвяка. Размовы спыніліся, Ніка пайшла мыць твар, і святкаванне шакаладнага дня народзінаў скончылася.

Месцы

Калі бацькі атрымалі кватэру на Маркса, у якой раней жыў Брыль, дык Стральцоў пераехаў у нашу вызваленую трохпакаёўку на Прытыцкага. Такое адбылося вялікае перасяленне пісьменнікаў. Зразумела, што з Міхасём Лявонавічам я любіў пагаварыць пра кватэры і пра месцы, дзе яму добра жылося. Ён хваліў раён мясакамбіната, яму там жылося добра. Здавалася б, і смурод, і аэрапорт з аглушальным самалётным гудзеннем над галавою, а Стральцову там добра жылося. Кепска жылося Стральцову на бульвары Шаўчэнкі. Ціхі раён, возера, конскі кірмаш з птушкамі, рыбкамі ды жывёламі. Камароўскі кірмаш з садавіной-гароднінай. Усё побач. Не жылося. Пілося. Сваркі дома. Для Стральцова бульвар Шаўчэнкі застаўся кепскім месцам. Раён вуліц Чарнышэўскага і Чорнага быў для

Стральцова нейтральны, як раён Прытыцкага ды Апанскага. Мне Мінск выглядаў інакш. Я любіў і вуліцу Чорнага, і вуліцу Прытыцкага, любіў бульвар Шаўчэнкі і зусім кепска ставіўся да раёна вакол мясакамбіната. Карацей, у кожнай вуліцы свой паэт.

Аўтапартрэт

«Ну і я стаю. Ні сумкі, / ні авоські у руках», — так пра сябе сказаў Міхась Стральцоў у вершы «На аўтобуснай станцыі». Дакладна сказаў, лепш не скажаш. Ёсць людзі з лёгкай летуценнай душою, у такіх рукі заўжды вольныя. Такім не вельмі трэба ўсе нашы матэрыяльныя даброты. Свет такіх людзей спрабуе лавіць у свае сеткі, але злавіць не можа.

Фама Варанецкі

Ён так маўчаў, што заслухаешся

У вялікага француза Экзюперы ёсць такія словы: «Самая вялікая радасць на зямлі — гэта радасць чалавечага сумоўя». Сапраўды, кожны добры чалавек, а тым больш таленавіты, працуе, стварае для людзей. Гэта яго радуе, у гэтым сэнс яго жыцця.

Успамінаецца ўсмешка Міхася. Яна адразу асвятляла не толькі ягоны твар, але і ўсё навакол — дабром, цяплом, душэўнасцю... Так усміхаюцца толькі дзеці.

З тым жа Экзюперы здарыўся такі выпадак: аднойчы яго захапілі ў палон, хацелі расстраляць. Антуан у канваіра, які вёў яго на расстрэл, жэстам рукі папрасіў закурыць. І ўсміхнуўся. Канваір зірнуў у твар Антуану і нечакана для сябе таксама ўсміхнуўся... І гэта выратавала жыццё палоннаму! На жаль, чароўная ўсмешка не выратавала Міхася ад цяжкой хваробы.

Сяброўства наша не было працяглым. Жылі побач, а знаёмымі не былі... Пазнаёміла нас сем'ямі Таццяна Дзмітрыеўна Арлова — яны вучыліся на адным курсе і сябравалі ўсё жыццё.

Мы пасябравалі адразу, як быццам абодва чакалі гэтага моманту. Міхасю падабалася мая жонка Ніна Мікалаеўна, а я быў у захапленні ад яго жонкі Алены Дзмітрыеўны. (Прызнаюся — у захапленні да гэтага часу: ад яе расповедаў пра Міхася, пра ягоных сяброў Уладзіміра Караткевіча і Рыгора Барадуліна, пра тагачаснае жыццё-быццё.)

А вось Міхась быў маўчун. Але маўчаў вельмі выразна. Маўчаў так, што заслухаешся.

Сядзім на лаўцы ў садзе, на лецішчы ў Арловых. Няспешна пра тое, пра сёе гутарым. Міхась курыць (шмат курыў). Размова зайшла пра аднакурснікаў — хто кім стаў, хто куды падаўся. Некаторыя выйшлі ў вялікія начальнікі. Чаму іх туды пацягнула? Маўчанне. Міхась курыць, напружана думае. Раптам узбуджана гаворыць: «Вось у нас, беларусаў, ёсць такая рысачка — як дабраўся да карытца, дык усіх, хто побач, лычом ва ўсе бакі» (паказвае, як парсюк лычом адпіхвае ад карыта другіх).

Я пярэчу: «Чаму толькі ў беларусаў? Гэтак не толькі ў беларусаў». — «Але чаму ў беларусаў?!»

І зноў маўчанне.

Я тое-сёе малюю... Прыйшоў Міхась да мяне ў госці. Пачаў разглядаць мае акварэлі. Перад адной спыніўся надоўга. Сюжэт акварэлі быў такі: сярод палёў, калі невялічкага возера — маленькая вёсачка, а высока ў небе — бусел, які адлятае ў вырай.

Міхась доўга маўчаў, думаў. А я ўважліва слухаў яго думкі. Нарэшце ён прамовіў: «Гэта пра мяне».

На што я адказаў: «Акварэль твая — забірай».

Карціна тая потым упрыгожвала кабінет Міхася.

Алена Дзмітрыеўна потым расказала мне дзіўную, містычную гісторыю, якая адбылася з карцінай. Незадоўга да смерці Міхася яна звалілася са сцяны, шкло разляцелася на драбнюткія аскепкі. Адначасова разбіліся на аскепкі люстэркі — у калідоры і ванным пакоі...

Міхася не стала... На жаль, сяброўства наша працягвалася вельмі кароткі час. Я палюбіў гэтага слаўнага чалавека і вялікага паэта на ўсё жыццё.

Для мяне любоў — панятак дзейсны, таму я рабіў для памяці Міхася ўсё, што мог. Мае студэнты з акторскага аддзялення Акадэміі мастацтваў чыталі яго творы на іспытах, на здачах курсавых работаў, на канцэртах, на тэлебачанні і радыё. Найчасцей — верш «Накцюрн»:

Над краем гэтак міла-міла
Увесну сонейка свяціла —
Свіціўся ліст, свіціўся свет.
І быў для сэрца не замкнёны,
І быў душою бласлаўлёны
Птушыны свіст і траўны цвет.
Уранку гэтак ветла-ветла,
Уранку гэтак светла-светла
Зырчэў туман, трымцеў прамень.
І з промнем гэтым заручоны,
Надзеяй ціхай пазлачоны,
Прыходзіў дзень, праходзіў дзень...
Дык не маніце, дык скажыце,
Што перапёлка змоўкла ў жыце,
Што восень лісця намяла,
Што нешта ў свеце адбылося,
Што нешта ў свеце не збылося
І што чаромха адцвіла.

Чаму душа мая так прыкіпела да гэтага верша? У ім — тонкае адчуванне прыроды, адчуванне прыроды як дзеяння, як здарэння. А сёння людзям так не хапае гэткага адчування, каб быць у ладзе з прыродай, быць з ёю заадно, берагчы яе як сябе, раўняцца на яе літаснасць і прыгажосць. На жаль, мы часта ставімся да матухны Прыроды, як да ворага, і заўважаем яе толькі, калі — снег на галаву. Вось чаму трэба чытаць паэтаў, вучыцца ў іх вобразнаму ўспрыманню свету, адносінам і пачуццям. У вершы Міхася Стральцова ўсё гэта ёсць. А яшчэ ёсць сум, адвечны сум душы паэта...

2015

Аляксей Гардзіцкі

Парада сябра

Міхась Стральцоў, хоць сам пісаў прозу, паэзію, крытыку, адначасова жыў творчасцю сваіх сяброў, калег, не пабаюся гэтых слоў, сваіх вучняў. Аднойчы ў мяне на дачы, за год да яго смерці, адпрацаваўшы паўдня на градах, мы, трое літаратараў, другую палову дня сядзелі за чаем, — а Міша любіў моцна заваpаны, — і гаварылі пра маладую літаратуру. Не было такога аўтара, якога б ён не чытаў і на якога не меў бы свой погляд, на творчасць якога ў час гаворкі ён бы не адгукнуўся. Нехта з нас пацікавіўся, як ён наогул глядзіць на сучасную маладую літаратуру. Міхась адказаў:

— Сярод маладых многа здольных, таленавітых людзей, аднак у іх няма лідара. Ім мог быць Варлен Бечык, але, на жаль, яго не стала.

Маладыя гарнуліся да Міхася Стральцова, да яго чулай душы, ішлі па дапамогу, па кансультацыю, асабліва ў апошнія гады яго жыцця, калі ён працаваў у «Нёмане». Бывала, зойдзеш у рэдакцыю часопіса, абавязкова нехта сядзіць поруч з ім. Аднойчы я спытаў, ці не замінаюць яму гэтыя наведвальнікі.

— Лёша, — неяк сцішана вымавіў ён. — Яны не прыходзяць з цэлым стосам напісанага, а прыносяць па адным вершыку і сціпла чакаюць, калі я вызвалюся.

На той самай дачы Міхась, абапёршыся на граблі, раптам сказаў мне:

— Табе трэба ісці далей, брацца за нейкі новы жанр. Вось ты публікаваў інтэрв'ю, гутаркі, дыялогі. Вазьміся за нешта новае, скажам, пішы мініяцюры пра пісьменнікаў. У цябе павінны яны атрымлівацца, база ўжо закладзена, а матэрыял сам у рукі ідзе, ты ж штодня сустракаешся з літаратарамі. Давай я табе адну гісторыю раскажу, потым запішаш.

Надыходзіла паўстагоддзе празаіку С. (ён назваў прозвішча. — *А. Г.*). Падумаў, беспамылкова будзе, калі закажу юбілейны артыкул яго аднакурсніку па універсітэце, найлепшаму, неразлучнаму сябру. Званю.

— Я табе хачу заказаць...

— Братка, не магу, не магу, не магу.

— Дык я табе хачу заказаць артыкул да юбілею твайго сябра. Сам ведаеш, там можна і не крытыкаваць.

— Не кажы, не кажы, не кажы.

— Паслухай, ты адразу згодзішся, калі я табе назаву прозвішча юбіляра.

— Не называй, не называй, лепш закажы другому.

Мусіў Міхась шукаць іншага аўтара. Такім ён быў, так глыбока пранікаўся ў творчую працу як старэйшых і маладзейшых літаратараў, так і сваіх таварышаў, сяброў.

У сваёй адзіноце ён цягнуўся да людзей, да прыроды. Відаць, невыпадкова марыў купіць на вёсцы хату, як ён паўтараў, дзенебудзь на ўскрайку. А пабыўшы на Лысай гары, папрасіў мяне, як толькі я пачую, што нехта прадае дачу, адразу сказаць яму.

Не давялося Міхасю займець сваю хату, неўзабаве ён пайшоў ад нас, пайшоў на вечны спачын.

Рыгор Барадулін

Конь гуляў на волі

У музычным свеце, у музыказнаўстве маецца паняцце «абсалютны слых». Паняцце гэтае льга прымяніць і да літаратуры, хутчэй за ўсё да вылучнага пісьменніка, хіба што з невялічкім удакладненнем — абсалютны слых і абсалютнае адчуванне слова, ягоных магчымасцяў, ягонай незаменнасці і дакладнасці ўжывання. Гэта, відаць, болей, чымся ў музыцы, у літаратуры талент надзвычай рэдкі.

Вырай беларускіх паэтаў і празаікаў пачатку 60-х гадоў шчаслівы быў тым, што ў ім з першага прылёту быў Міхась Стральцоў, які меў прыроджаны абсалютны літаратурны густ. Сказаць пра яго — талент, будзе правільна, асоба — таксама. Але, бадай, слова з'ява трохі акрэсліць маштабы Міхася Стральцова. У свой час сярод іншых сяброўскіх эпіграмаў пісаў я свайму сапраўды сябру і такую:

За Гамера спрачалася сем гарадоў.
Тры секцыі
За Міхася Стральцова:
Празаік Стральцоў,
Лірык Стральцоў.
Крытык Стральцоў?
За вечнасцю слова!

Вечнасць скажа сваё слова пра ўсіх. Але на тое яна і вечнасць, што не звыкла спяшацца, бо часу, калі можна так сказаць, у яе нямерана, няважана, нялічана. Міхась Стральцоў ведаў пра характар вечнасці, таму і не мітусіўся, не мітаўся, як адначаснікі ягоныя, каб хоць у імгненні затрымацца, каб палюбавацца на сябе ў люстэрку бяглівых дзён. Ён проста працаваў і думаў, шмат думаў. Не адна змена ў беларускай літаратуры вырасла пад апекаю ягоных слованастаўленняў, пад апекаю ягонай падтрымкі і ўвагі, пад апекаю ягонае творчасці.

Міхась Стральцоў даў інтэлектуальны пачатак сучаснай яму прозе, пачуццёвую глыбіню эсэістыцы, шырыню і гарызонтнасць крытыцы, акварэльнасць і адухоўленасць паэзіі ад класічнага радка да верлібра. Да Стральцоўскіх ацэнак прыслухоўваліся ад самакаранаваных убурэлых класікаў да самых утрапёных нізрынальнікаў усяго ў прозе і ў паэзіі. Дзе б ні працаваў Міхась Стральцоў, да яго хвасцілася чарга, як пасля вайны на млын. Так было ў рэдакцыях «Маладосці», «Літаратуры і мастацтва», «Полымя», «Нёмана». Які б аддзел ні ўзначальваў Міхась, у ім засяроджваліся ўсе аддзелы — і прозы, і паэзіі, і крытыкі, і публіцыстыкі.

Міхася, крытыка і даследчыка, бядзіла загадка Максіма Багдановіча. Думаю, што нашых літаратуразнаўцаў мусіць зацікавіць загадка Міхася Стральцова. Адкуль гэтакія веды, гэтакая празарлівасць, гэтакая нястомнасць? Асабліва нястомнасць. Бо фармальна спадчына Міхася Стральцова не дужа ўжо і шматтомная (помніцца, як прыжмурыста ўсміхаўся патрабавальны да сябе майстра з аднагодка, што налічыў сваёй прадукцыі на збор твораў у шасці тамах), яна пераважыць тысячу і адну ноч адначаснікаў-эпапеістаў. А варта ўлічыць толькі адну

акалічнасць — колькі раманаў, аповесцяў, кніг крытыкі і саветызаваных нарысаў ён перапісаў. Якраз перапісаў, пра праўкі, заўвагі, пра перапісаныя падборкі вершаў і не кажу. Стральцова расцягвалі, разбіралі, як той Акропаль турысты, сябры, знаёмыя, проста выпадкоўцы, каму хацелася быць сваім чалавекам у літпрацэсе. Праўда, адзіныя, хто, пэўна, даваў знаўцу ўсяго вытанчанага і ўзнёслага сілу і натхненне, былі дамы як з адвечным, так і з літаратурным клопатам. Цяпер, калі не стала Міхася ці Мішы (як каму пяшчотней было называць), некаторыя калегі, каб хоць як узвысіцца ў сваіх жа вачах, пачынаюць крычаць пра сваё ледзь не мецэнацтва, падкрэсліваць любоў Стральцова і да чаркі.

Гэтак жа плявузгалі і пра Караткевіча. У так званыя застойныя часіны ў застолле ішлі, як у партызаны, уцякалі ад хлусні, ад маны, ад абавязку славіць догмы, уцякалі, душу ратуючы. Было, што Стральцоў браў і лішнюю чарку, але ж ён не дапіўся да пасады рэдактара часопіса, сакратара Саюза пісьменнікаў, да члена ЦК КПБ — не выслужыў сабе тытулаў. Кіраўнікі Саюза пісьменнікаў, сакратары пісьменніцкай партарганізацыі абавязкова са згоды ЦК складалі спісы на выбраныя шматтомнікі і аднатомнікі, спісы, часткова прывязаныя да юбілеяў творцаў. Усім было адшчодрана па два і болей тамоў, акрамя Міхася Стральцова да ягонага пяцідзесяцігоддзя. Фармальна ўсё зацвярджалася ў Маскве, вядома, з падачы рэспублік. Не ў заслугу сабе стаўлю, але не забыўся, як давялося ехаць у СП СССР да Юрыя Верчанкі хадайнічаць за сябра. Добры па натуры чалавек, майстра кабінетна-апаратных гульняў Верчанка званіў у Камітэт па друку свайму сябру, прасіў, каб дадаткова ўключылі ў план аднатомнік Міхася Стральцова. Пачынаў з уступу, з успаміну, як ён, Верчанка, разам адпачываў з камітэцкім чыноўнікам на поўдні. Пад дазвол Стральцову ў нашым камітэце па друку старшыня дадаў другі том Гаўрылкіну. Па-зямляцку. Толькі карэктуру паспеў вычытаць Міхась свайго першага аднатомніка.

Засяроджаную роздумнасць характару Стральцова ведалі ўсе. Падчас і выкарыстоўвалі немітуслівасць і нетаропкасць

задуменца ягоныя ж сябры. Ляжаў у Бараўлянах. У Маскве, здаецца, літаратурныя шанавальніцы стральцоўскага таленту парупіліся падтрымаць — прапанавалі выдаць кнігу прозы і эсэістыкі. Сябры прыходзілі наведваць. Падзяліўся Міхась прыемнай весткай. І кінуліся сябры навыперадкі заняць гэтую пазіцыю ў маскоўскім выдавецкім плане, як на вайне. Перамог спрытнейшы і рухавісцейшы, бо хутка зрабіў расклейку. А Стральцоў да апошняга працаваў думкаю, багацеў душою: цікавіўся філасофскімі развагамі Розанава, перачытваў новае, паслязабароннае выданне «Столбцов» Мікалая Забалоцкага. Яму дачка прынесла паасобнік, папрасіў, каб і мне купіла, падарыў праз колькі дзён.

Сябры праяўляліся і пры апошнім развітанні. Можа, зашмат кажу пра сяброў. Але ж Міхась, думаю, і жыў сябрамі, і жыў для сяброў. Хвароба, як і смерць, былі раптоўныя. Жонка Алена Змітраўна з дачушкай Алесяй, пястункай Міхасёвай, засталіся без капейкі. І калі пачаў я збіраць нейкія грошы, адчуў цану сяброў нябожчыка. Пра актыўнага ўспаміншчыка не хачу казаць, а вось крытык і аж празаік, які сядзеў на шыі Стральцова ды прасіў уладзіць ягоныя «нетленки» абавязкова ў маскоўскіх выданнях, артыстычна-нарцысіста сказаў, што пры сабе мае нейкіх паўтара рубля. Прапанову прынесці грошы заўтра не пачуў. Адгукнуліся на гора Быкаў, Брыль, Адамовіч і на радасць (хоць на магільніку слова гэтае гучыць не зусім натуральна) шмат сяброў і проста знаёмых. Гэта да ўпамянёнага вышэй аднатомніка Алесь Адамовіч уночы пісаў прадмову, а раніцай ляцеў у Амерыку са сваім фільмам «Ідзі і глядзі». Пахаваны Міхась Стральцоў на Чыжоўскіх могілках, там жа, дзе ляжыць дужа малады сябра нашых маладых гадоў Сымон Блатун. І ніколі не бачыў я такіх выплаканых, да паветра, вачэй, як у жонкі Міхася Алены. І зноў непрыемна чытаць некаторыя ўспаміны, дзе кідаюцца камяні ў яе. Калі ўжо замінае чалавек, дык і жонка ягоная не такая. Народжаныя ў балоце без бузы не могуць.

Пішу пра сумнае, нават пра недарэчна брыдкае, а пад руку штурхаюць успаміны пра вясёлыя гады, пра сумесныя падарожжы, вандроўкі. Ездзілі ў Маскву на ўсесаюзную нараду ма-

ладых, на Гомельшчыну, з рэдакцыяй «Маладосці» ў шмат якія раёны Беларусі. Была і апошняя нашая паездка ў веснавую, яшчэ з плямкамі снегу, Вушачу.

А першае нашае падарожжа было ў 1957 годзе. Пра яго нагадаў мне Міхась у лісце з Палесся ад 15 лютага 1982 года, дзе ў прыватнасці пісаў: «Чулае слова ад цябе было мне асабліва дарагім, бо нібы другі раз пасля мышанскай эпапеі (памятаеш тое лета вайсковых збораў на Мазыршчыне?) злучыла нас — праз добрае слова і шчырае сяброўскае пачуццё — і вось я прыгадваю і патаемны наш начны паход у паляшуцкую вёску, і начоўку ў палатцы, і начную ці перадранішнюю трывогу з выпадку гэтага, і тваё дзяжурства на «Насцінай кухні», і тое, як чыталі мы з табою Фета, абмяркоўваючы прыроду ягонага вобраза, і, і... як падумаеш, чаго толькі ні пракацілася на «палянах» нашых вачэй... Трывога тады была сапраўды вялікая, бо я вырашыў пераначаваць у палатцы, дзе халадней і паветра досыць, а не ў душнай двух'яруснай казарме, таго не ведаючы, што гэта ледзь не ўцёкі.

У Стральцова быў своеасаблівы, чыста беларускі, магілёўскі нават гумар, пераплецены з лірычнасцю, як суровая нітка з ваўнянаю. На дне вачэй ягоных сонечна пераліваліся хітрынкі, прабіваючыся праз смугу смутку і душэўнага клопату. У тым жа лісце прыканцы далікатна годная просьба, сяброўская просьба з лёгкім пакепліваннем з мяне і з сябе: «Да цябе просьба: памажы давесці да ладу маю кніжку ў вас і, можа, возьмешся, калі захочаш, яе рэдагаваць. Там трэба дадаць друкаваных вершаў (у мяне нічога няма пад рукой): з «ЛіМа», здаецца, можна, можна з апошняй «палымянскай» падборкі, з вершаў, якія я пераслаў на перадрук Але Іванаўне. Дома ў мяне недзе ёсць недрукаваныя вершы, але дзе цяпер яны — эх, лепш не гаварыць. Але зразумей: я хачу, каб быў, аж і на мой ніякі-сякі ўзровень, больш-менш прыстойны зборнічак — тут ужо табе як рэдактару поўная воля, бо густу твайму я давяраю цалкам. Кажу гэта таму, што мы з табой часта і яшчэ гаварылі пра вершы і адзін другога разумелі. Выбірай на чатыры аркушы (не, 4,4 — для саліднасці): я не Цютчаў, а ты не празаік, як Тургенеў,

хоць і ён забаўляўся ў маладосці вершыкамі — можа, я і не акалечуся. Праўда. Памажы...». Зборнік Міхася Стральцова «Яшчэ і заўтра» выйшаў у «Бібліятэцы беларускай паэзіі».

Калі Міхась вярнуўся з Палесся, задумаў напісаць новую рэч. У часопісах анансавалася: «Конь гуляў на волі». Радок з вясёлай бяседнай песні. Бо Міхась Стральцоў любіў волю, не цярпеў ні хамута, ні цугляў, якімі яго хацеў ацішыць рэжым. У працу ўваходзіў цяжка. Ненавязліва стараўся я ўцягнуць сябра ў рабочы стан, просячы перакладаць што цікавага было ў «Братэрства». Пішу, што расцягвалі, расхоплівалі час Стральцова, а сам першы з тых злодзеяў. Колькі я натлуміў яму галаву сваімі вершамі, перакладамі, артыкуламі, просьбамі прадмоваў да іншых і да сябе таксама. Наіўна лічыў, што абуджаю смак да пісання, ды цяпер здаецца, што, можа, усё наадварот выходзіла. Дый адчуваў Міхась сваё расстанне. Ездзіў дадому выбіраць бульбу, а хутчэй за ўсё, паспець развітацца з бацькам.

Перад самым днём свайго пяцідзесяцігоддзя (нарадзіўся Міхась Стральцоў на Грамніцы — 14 лютага 1937 года) паехалі з тэлебачаннем у роднае гняздо. Па выгаленым лесе ехалі, як па Марсе. І лютаўскі Сычын сустрэў Міхася неяк маўкліва. Каля хаты радні адламаў сталічны госць галоднаму сабаку кавалак хлеба, кавалачак каўбасы, напханай невядома чым, але таўстой. Гэта з сабой прывёз зямляк закусь і колькі пляшак куплёнай. Пры слабым святле сельскай электралучыны вячэралі. Была маці, сястра, дачушка Алеся — прыехала з бацькам.

Нетутэйшы быў позірк у Міхася ў бацькавай хаце, расхрыстанай, расцягнутай, яшчэ з цэлымі шыбамі. Не нахінуўся, не ўзяў ніякой драбязінкі. Ведаў, што ўжо ніколі не адчыніць гэтыя дзверы, у якіх ужо няма замка, не сядзе за стол, што рабрыўся крыгаю ў крыгаходзе агульнага бязладдзя, безгаспадароўства. І маўклівы выйшаў з бацькоўскай хаты. Рыжая шапка. Да каўняра кароткаватай паддзёўкі прышыта таксама рыжая шкура аўчыны, каб зімовай апранаха здавалася. На галаве і на плячах агонь нябыту загараўся, каб спаліць. І прысак снегу засыпаў усё, што было...

І самая апошняя сустрэча з Міхасём Лявонавічам была самай кароткай. У Бараўлянах. Цяжка было гаварыць яму, стамляўся,

дагасаў. Але, самому сабе хлусячы, казаў, што з'ездзім яшчэ ў Вушачу, у Каралішчавічы, і адразу ж паправіўся — у «Іслач»... А мне і дагэтуль у натоўпе ўзнікае сябра. Забудуся. Узрушуся. Прыгледжуся — нечым падобны. Няйначай Тварэц Усявышні ўпадабаў такі вобраз, як самы дасканалы.

І раптам хлопец малады
З абліччам Міхася Стральцова
Расчырванелы ад хады
Узнікне,
Быццам выпадкова.

І пацяплеюць халады.
Замлеюць каташкі марцова.
Дамы заселяць гарады,
Як дамы Міхася Стральцова.

Праступяць праз траву сляды,
Ад снегу абтрасецца слова.
Пайду да Міхася Стральцова
На шклянку думкі.
Як тады...

1994

Багдановіч нашага часу

У нас дома было такое вушацкае слова — дружбіст. З сябрамі, з дружбістамі мы заўсёды сыходзіліся неяк стыхійна. Не тое што я выбіраў — вось з гэтым мне выгадна сябраваць. Выдатным маім сябрам быў Міхась Стральцоў — чалавек з тонкім густам, інтэлігент. Нават не ўяўляю, як можна было быць у савецкі час такім інтэлігентам, як Стральцоў! Бо інтэлігенцыя была, калі груба гаварыць, на ўзроўні парторга, а Стральцоў быў вяршыняй інтэлігентнасці, адукаванасці, начытанасці...

У характары любога крывіча трымаць усё ў сабе, сапраўдны крывіч да канца ніколі нічога не скажа. І сам будзе перажываць, але іншага вучыць, што не бяры да галавы, не перажывай! Я і сам так раблю, а пасля думаю: мне ж самому дрэнна! Але

няма з кім асабліва дзяліцца, так ужо выйшла. Тым больш калі памёр Васіль... Яшчэ раней былі Валодзя Караткевіч, Міхась Стральцоў... Цяпер я застаўся практычна адзін.

Для мяне Стральцоў быў і застаецца вяршыняй думкі, вяршыняй майстэрства. Гэта быў мой самы шчыры і адзіны дарадца, якога я проста даводзіў чытаннем сваіх вершаў. Ён быў дужа важным для мяне духоўным настаўнікам і рэдактарам. І канешне, самым шчырым, самым задушэўным сябрам. Калі яго не стала, зрабілася пуставата. Хоць, канешне, было з кім раіцца, але гэта было ўжо не тое.

Любы чалавек усё-ткі нараджаецца самотным. Іншая справа, што маладосць, сябры і нейкая мэта, якой хочаш дасягнуць, прыглушаюць самоту. Дарэчы, магчыма, і цяга да чаркі, таму што хочацца кампаніі, каб заглушыць тую самоту. І чым старэй, тым больш самотны. Але гэта нармальная з'ява. Ты павінен раіцца сам з сабой і пісаць, застаючыся сам-насам. Нельга ж пісаць на плошчы і для плошчы. Вось Маякоўскі пачаў пісаць для плошчы і гэтым сам сябе знішчыў. Самотны быў і Ясенін. Стральцоў — самы самотны з нашых.

Сапраўдны талент, ці унікальная асоба, ці геній — як хочаце называйце — адчувае, колькі часу яму адмерана... Вось тыя, хто акружаў, не ведалі, чаму ў Караткевіча была такая працавітасць. А ўсё таму, што сам ён ведаў, што яму мала часу засталося. Такі ж таленавіты быў Стральцоў, які зноў жа рана пайшоў... Ніхто вакол не здагадваецца, але сам гэты чалавек ведае, што лёсам яму менавіта такі час адведзены...

Зараз такі шумны час, і, мабыць, таму такія глыбінныя фігуры, як Панчанка, як Стральцоў быццам бы забываюцца. Але калі ўсё супакоіцца, калі ўсё стане на свае месцы, без Стральцова, канешне, не абыдуцца. Без яго нельга ўявіць гісторыю беларускай літаратуры, беларускай думкі. Проста ён, што называецца, не кідкі, ці, калі гаварыць сённяшняй мовай, не раскручаны, хоць фігура гэта ўнікальная — і як лірык, і як празаік, і як крытык. Недарэмна ён пісаў пра загадку Багдановіча, — Стральцоў і сам нейкім чынам як Багдановіч нашага часу...

2010

Анатоль Кудравец

За дальнім прычалам

Паміраў ён цяжка. Хаця яшчэ нядаўна, нейкі месяц назад, да аперацыі, калі мы — Янка Брыль, Вольга Іпатава, Віктар Карамазаў і я — прыехалі да яго ў Бараўляны, здавалася, усё павінна скончыцца добра. Так здавалася, так хацелася нам, так хацелася яму.

Быў прыгожы дзень ранняй восені, свяціла сонца. На прыбальнічных клумбах цвілі астры. Бярозы браліся на жаўцізну, і цёплае святло іх акварэльна накладвалася на густа-зялёную сцяну прыдарожнага ельніку.

Міхась правёў нас за вароты бальнічнага гарадка. Курыў, жартаваў, але сум не раставаў у ягоных вачах. Хаця сум, нібы затоеная думка, быў пастаянным яго спадарожнікам апошнія гады. Быў ён у вачах, быў у голасе — глухаватым, спакойна-напружаным, — можа, і тут ён да нечага прыслухоўваўся, да той жа хваробы і болю, пра што ён ведаў лепш, чым хто. Быў ён і ў паэтычным слове яго — нібыта будзённа простым, у нечым неканкрэтным, але дакладным, не паношаным, не размытым.

Снег асядае. І заспаны лес
Пахмурны з раніцы, здаецца, пазяхае.
Туман да самых макавак далез.
Унізе мох, ламачча — неахайна!
Унізе сыра — склеп або падвал.
Цень-цень! — і ўсё: маркоціцца сініца.
Зіма — падман. Ды і вясна — падман.
Вось-вось павінна нешта праясніцца.
Павінна нешта праясніцца...

Дактары, да якіх мы звярталіся, а сярод іх былі і аўтары часопіса, — свядома ці не надта свядома мы спрабавалі арганізаваць «блат» не блат, а павышаную ўвагу ў той цяжкай сітуацыі, дык вось, дактары ў сваіх прагнозах былі строга стрыманымі і стрымлівалі наша жаданне быць большымі аптымістамі, чым

магла быць рэальнасць. А рэальнасць магла быць самая жорсткая. Так яно і сталася. Хвароба і смерць блату не прызнаюць.

Пасля аперацыі, калі мы з Віктарам зноў наведалі яго, ён быў цяжкі, але гаварыў, нават усміхаўся, калі я сказаў, што Карамазаў за гэтыя дні стаў дзедам.

Рана не зажывала, зрабілі другую аперацыю. Вынік усё той жа несуцяшальны: стрававод не хацеў зрастацца са страўнікам, пачалося ўнутранае кровацячэнне.

Чалавек паступова згасаў. Не памагалі ні лекі, ні кропельніцы, ні мёд, ні ягады, ні самаахвярная — і днём, і ноччу — прысутнасць і ўвага жонкі Лены.

...Абсыпаны шэрай шчацінай твар, цяжка дыхае раскрытым, як нежывым ротам, у якім відны рэдкія пачарнелыя зубы; вочы падвернуты ўбок, быццам хоча нешта сказаць, а сказаць не можа. Стогне. «Міша, Толя прыйшоў», — сказала Лена. Ці то кіўнуў галавой, ці не. Лоб цёплы, рука сухая, халодная.

Такім я ўбачыў яго 21 жніўня. Дактары ўжо нічому не верылі. Загадчыца аддзялення Ірына Андрэеўна Галубовіч сказала: «Пульс ніцявідны. Мы ўжо думалі, што ён не перажыве гэтую ноч. Зайшлі пасля партсходу — не, лягчэй. Здараюіша ўсякія цуды, але... Яго яшчэ сутак на трое, можа, і хопіць».

Цуда не здарылася. 23 жніўня ён сутаргава ўздыхнуў апошні раз. Гэта быў 1987 год.

Зіма — падман, вясна — падман.

Павінна нешта праяснілася.

Нешта праяснілася канчаткова. Нешта засталося канчаткова непраясненым.

У рэдакцыі «Нёмана» ў рабочым стале Міхася Лявонавіча, на якім навалам ляжалі артыкулы і рэцэнзіі, падрыхтаваныя і непадрыхтаваныя да друку, і да якога я толькі праз некалькі дзён пасля пахавання набраўся рашучасці падступіцца, было дзве чырвоныя папкі. У адной — Ганаровая грамата Саюза пісьменнікаў Беларусі за подпісам яго тагачасных кіраўнікоў — Максіма Танка і Ніла Гілевіча, уручаная паэту з нагоды пяцідзесяцігоддзя. Узяў у рукі Грамату і падумаў: о, Божа! Якая гэта скупая ацэнка такога самабытнага, непараўнальна непадобнага

ні на каго ў свеце талента! Але калі глядзець сённяшнімі вачыма, пры сённяшнім часе і сённяшніх рэаліях, то што можа быць вышэй за дабразычлівую чэсную ацэнку працы прафесіянала прафесіяналамі, паэта паэтамі?

Быў у той папцы і рабочы сшытак загадчыка аддзела крытыкі часопіса — тоўсты школьны сшытак у клетачку з узлятаючай ракетай на вокладцы і алгебраічна-фізічнымі формуламі на другім яе баку. У гэты сшытак Міхась Лявонавіч запісваў, каму і на які нумар ці да якога юбілею заказана рэцэнзія, артыкул, ці яшчэ што.

Сшытак быў толькі пачаты, і на трэцім лісце яго быў перапісаны чыставы варыянт вядомага верша «Кіну, рыну — пакіну...». Гэты верш друкаваўся ў зборніку «Мой свеце ясны», увайшоў у «Выбранае» (1987), і там і там мае пяць строф. Тут жа, у сшытку, іх чатыры, — і наколькі розняцца гэтыя строфы ад тых ранейшых! Вось дзе ўдзячны матэрыял для параўнальнага аналізу даследчыкаў! Але не толькі для іх я хачу абнародаваць апошні варыянт верша.

Я вазьму і пакіну
Гэты дом на гары.
Горкі дым успаміну
Хай развеюць вятры.
І на рэчаньку Піну
Або на Вілію,
Або на лугавіну
Я слязу пралію, —
Каб зрабілася парай,
Маёй марай над ёй,
Узнялася да хмараў
Над зямлёй, над зямлёй,
І каб чайкі крычалі,
Прадчуваючы гром,
Каб на дальнім прычале
Страсянуўся паром.

Вось яна, сіла слязы паэта: у прадчуванні яе і чайкі крычаць, і на дальнім прычале гатовы страсянуцца паром...

Не надта шмат чаго было ў тых дзвюх чырвоных папках. Але, па ўсім, там было тое самае-самае, чым Міхась Лявонавіч даражыў і да чаго наўрад ці дапускаў каго блізка.

Вялікае, на старонку, фота Янкі Брыля — ягонага колішняга літаратурнага настаўніка і старэйшага паплечніка, глыбінна-беларускі талент якога заўсёды прыводзіў Стральцова ў захапленне. На фота Іван Антонавіч сядзіць на цяжкой чыгунна-драўлянай лаўцы, якіх шмат у парку Горкага, на фоне густой летняй зеляніны. Рукі сплецены на каленях, позірк задуменна-спакойнага добрага настрою скіраваны ў сябе і ўдалеч. Здаецца, зараз усміхнецца і скажа нешта сваё, брылёўскае, жартаўліва-мудрае, тыпу «... а і мышэй жа ляснула...» На адвароце фота паметка рукой Стральцова: «Верасень 1982 г.»

Яшчэ некалькі фота, зробленых з тэлекадраў перадачы, падрыхтаванай і паказанай студыяй да пяцідзесяцігоддзя Стральцова: ён каля дрэва, пад парасонам, кругом людзі, ідзе дождж; ён на фоне парка з фантанам, сабраўся нешта сказаць і вось-вось скажа; яны ўдвух з Барадуліным ідуць па набярэжнай Свіслачы, нешта ажыўлена абмяркоўваюць — два Паэты, два майстры — кожны са сваёй моўна-вобразнай краінай, кожны са сваёй чалавеча-адасобленай натурай, настолькі далёкія і розныя і настолькі неабходныя адзін аднаму, як два колы калясніцы, якую нясе па небясі нябачны Пегас. Нябачны для каго, толькі не для іх...

Святлом ад коцікаў вярбы
Мой роздум над радком атулен.
Пісаў калісьці Барадулін
Пра іх — ды мне такой журбы!
Я з камунальпага двара
Сюды прынёс іх неўпрыкметку,
Каб заключыць у верша клетку
Ў надзеі славы і дабра.
І вось надзеяю гарым
Над нашым столікам прытульным,
Што не падасца барадульным
Наш верш, а значыць — і старым.

Гэта чыста стральцоўскі экспромт, празаічна просты і паэтычна бездакорны, ад кожнага слова да Багдановічавай картаўліва-сур'ёзнай інтанацыі. І наўрад ці каму прыйдзе ў галаву шукаць у ім нешта *барадульнае,* бо *барадульнае* — гэта іншае, зусім іншае. Ну, напрыклад, такое:

Прывыкай на свет глядзець з абрыва,
Думай, пяцьдзясят — яшчэ палова.
Парадзела нашая сябрына,
Як дружына матчынага слова.
Як лісьцё на голлі, аддрыжым
І сваё з жыццём сваім аддружым.
І чужыя ў гомане чужым,
Па сабе адтужым сумам дужым.
Нашых год чупрына палысела,
Кожны валасок цяпер нам дораг.
Маладыя будуць шум зласела
Варушыць ды варажыць на зорах.
Смела аддадуць лісцё агню
Восенню рудою ці вясною,
Дню паверацъ, а не груганню.
Дым растане першай сівізною.

Гэты верш упершыню я пачуў на застольнай стральцоўскай сябрыне, у ягонай кватэры па вуліцы Прытыцкага. Прысутнічалі там і Брыль, і Зарыцкі, і Карамазаў, і Ала Сямёнава, і яшчэ некалькі чалавек, — невялікай, па-дамашняму ўтульнай цёплай кампаніяй, і цяпло гэта, і святло ішло перш за ўсё ад гаспадара-юбіляра, і відно было, што яму падабаецца гэтая роля — і юбіляра, і гаспадара, але бадай што роля гасціннага законнага гаспадара падабалася яму больш, чым роля юбіляра.

І гэты ж верш, акуратна перапісаны рукой аўтара на белым аркушы паперы, з прыпіскамі ўгары: «Замест тоста на сябрыне Міхася Стральцова» і ўнізе «14.2.87 г., Мінск, 26.2.87 Dubulty» і размашыстым барадулінскім подпісам сустракаю ў той чырвонай папцы — разам з паштовым канвертам, адпраўленым у Менск з Латвіі, з Юрмалы. Відаць, Рыгор

Іванавіч даводзіў свой застольны экспромт ужо на беразе бурштынавай Балтыкі.

Быў у папцы «ЛіМ» за 13.1.1984 года з артыкулам Стральцова «Ад маладзіка да поўні» — штрыхі да творчага партрэта Барадуліна. Складзеныя-перакладзеныя ў некалькі столак два газетныя аркушыкі, папраціраныя на рагах складак. Навошта былі патрэбны Стральцову гэтыя шэрыя газетныя аркушыкі, калі той жа артыкул у апошнім аўтарскім прачытанні, з дапаўненнямі і папраўкамі быў надрукаваны ў салідным томіку «Выбранага» з усёй неабходнай строгасцю выдавецка-тэхнічнай культуры? Навошта былі патрэбны? Відаць, былі патрэбны...

Нашмат часцей пачаў заглядваць у рэдакцыю «Нёмана» Барадулін, калі там у аддзеле крытыкі пачаў працаваць Стральцоў. Думаю, не толькі таму, што крытычна-ацэначнага стральцоўскага слова не маглі дачакацца вельмі многія, хто быў далучаны да капрызнай музы Паэзіі. І, думаю, не толькі таму, што Стральцову вельмі патрэбна была псіхалагічная і маральная падтрымка аднаго з самых аўтарытэтных заканадаўцаў паэтычна-літаратурнага клімату.

Яны цягнуліся адзін да аднаго, але не як розныя полюсы магніта, а як кроны двух побач пасаджаных дрэў: разам і цяплей, і весялей, і смялей. Яны ў нечым дапаўнялі адзін аднаго, і кожны стрымліваў розныя завіхрэнні, якія ўзнікалі пасля чарговай паэтычнай прабежкі паплечніка.

«Музы каранаюць адзінкі. А заваблiваюць легіёны. Муза паэзіі шчодрая на абяцанкі. Але і сама патрабуе невымернай цаны — адной і той жа ад «жалких писак и педантов» і ад найярчэйшага талента. Паэзія — лёс, а лёс бывае розны, і паэт парознаму прымае і нясе гэты лёс. Ёсць таленты светлыя, жыццядайныя — яны і змрок пераплаўляюць у святло, але ёсць і другія, тыя, што самі нібы ўвасабленне пакутнага духу, адрынутага паводле нейкай незразумелай прычыны ад самога жыцця і асуджаныя трапятацца ў вечнай празе зліцця з ім». Гэта радкі ўсё з таго ж артыкула, з артыкула пра «светлы, жыццядайны» талент Барадуліна. А хто ж гэта тыя, што стаяць за словамі: «увасабленне пакутнага духу, адрынутага паводле нейкай не-

зразумелай прычыны ад самога жыцця і асуджаныя трапятацца ў вечнай празе зліцця з ім»? І ці няма сярод іх аўтара артыкула, самога Міхася Лявонавіча?

Безумоўна, іх шмат — тых, «адрынутых», і ўчарашніх, і сённяшніх, але сам ён там перш за ўсё.

Складаныя перыпетыі жыцця, а больш за ўсё задушлівая атмасфера яго, якая ад кожнага на кожным кроку патрабавала душэўнага кампрамісу, надламала фізічныя сілы паэта, адрынула ад звыклага жыццёвага распарадку і кінула на свой сметнік, у сумна знакаміты ЛПП.

Многім, нават некаторым імянітым літаратарам, гэты змрочны эпізод у жыцці паэта падаўся вясёлым і нібыта заканамерным. І яны — хто ўголас, а хто цішком, але ўсе з тым жа непрыхаваным падсмейваннем, шамацелі з'едлівымі слоўцамі: «Глядзіце, вось да чаго даводзіць багемная вольніца і побытавая непераборлівасць. Хіба ж можна так? Вось мы, мы, напрыклад... Мы не такія...»

Непераборлівасці не было, і вялікай вольніцы таксама. Была творчая натура з усім мякка-чалавечым, далікатным і тонкім, уражлівым і падатлівым, што Бог дазваляе людзям. Не іхняя віна, што яны часам не вытрымліваюць перагрузак. Жалеза і тое крышыцца і плавіцца.

І была праўда: *яны* былі не *такія* — і ў творчасці, і ў маралі. А ён быў не *такі,* як яны, не такі ва ўсім, і гэтага яму не маглі дараваць.

Мала хто ведае, што гэта такое: з тлумнага, хай і дурнога, але і нешта абяцаючага сёньня-заўтрашняга свету рантам трапіць на глухі жыццёвы сметнік, дзе ты — не ты, дзе ты — ніхто, трапіць, пабыць там, усё вытрываць і не абваляцца ў брудзе, не абчапляцца дзікімі ваўчкамі, не зарасці каростай і не азлобіцца на сабе падобных і на ўвесь свет. Больш таго, захаваць душу і свежасць успрымання, і гатоўнасць да ўдзячнай рэакцыі на кожны спагадны позірк, на кожнае шчырае слова.

З пунктуальнай дакладнасцю адазваўся ён на прапанову прыйсці на працу ў «Нёман». Наколькі гэта было важна для яго, я зразумеў толькі тады, калі ён зайшоў у кабінет, — не як

пісьменнік да пісьменніка, не як равеснік да равесніка, урэшце, не як зямляк да земляка, а... як школьнік на экзамен. Тады я не ведаў, што ён пабываў ужо ў некалькіх рэдакцыях і адтуль яго далікатна адправілі.

Мала хто ведае пра страх, з якім «адрынутыя» вяртаюцца ў свет «неадрынутых».

Быў гэты страх і ў Міхася Стральцова, хоць знешне ён гэтага нічым не выказваў. Быў страх, але была і закваска. Мне здаецца, што іменна там, адкуль ён вярнуўся ў Менск, ён набраўся духу зазірнуць на ўсю глыбіню ў калодзеж сваёй душы. Зазірнуў — і не спалохаўся таго, што ўбачыў. Бо там ён убачыў той свет, ад якога яго хацелі адлучыць, але адлучыць ад якога яго ніхто не мог. Бо гэта быў ягоны свет. Гэта быў ён сам — мой свеце ясны.

Як промні сонца прасвечваюць тоўшчу вады, ажыўляючы кожны каменьчык, кожную няроўнасць дна, кожнае варушэнне вадарослага і зялёнага, так і ягоны талент умеў высвеціць тайнікі душы — не сляпучым рэгістратарскім насцярожаным вокам ваеннага пражэктара, а ўсё тым жа, толькі ачалавечаным, ласкавым, журботна-дабрачым сонечным промнем.

Пад шоргат кропель дажджавых
Ён з тэлефоннай будкі бачыў,
Як па галінках верхавых
Зялёны вецер пругка скача.
Ён наглядаў. Ён не спяшаў.
Нішто пагляд не абражала.
Як бы лячылася душа,
Яе як быццам суцяшала,
Што вецер згоды не пытаў —
Шалеў над горадам і, ніцы,
Ужо на вулках шкуматаў
Плашчы, кашулі і спадніцы.
І ў гэтай будцы пад дажджом,
У нейкай роспачы вялікай,
Сябе за дальнім рубяжом
Убачыў ён — і не паклікаў.

Не мог. А мо не захацеў.
Не абазваўся нейкім знакам.
А той у дзіўнай віднаце
Ці то ўсміхаўся, ці то плакаў...
І ў гэтым горадзе чужым,
Які ягоным быў калісьці,
Ішлі інакшыя дажджы,
Інакшай трапятала лісьце.

Некалі, малады, свет Іванавіч, былы донжуан, ён усё мог. Па крайняй меры, так яму здавалася. Але цяпер быў іншы час, і ён быў іншы, і «не мог» — гэта не паэтычны словаслоў, гэта само жыццё ў гэтым «горадзе чужым, які ягоным быў калісьці». «А мо не захацеў...» Як яно прывязана да «не мог»... Стары гонар не дазваляе здавацца вось так адразу і назаўсёды.

Паэт не можа не любіць — на тое ён і паэт. Паэта нельга не любіць — бо ён Паэт. Міхася Стральцова любілі жанчыны. І было за што: і гэты ягоны нявыдуманы то «блакітны», то «зялёны» вецер, і гэты нязбыўны душэўны сум па зямным і вечным, недасяжным, і гэта спакуслівая тайна, што жыла ў кожным слове ягоным — і празаічным, і паэтычным, і сказаным, і нясказаным, якога калі і няма, то яно прысутнічае, маецца на ўвазе, і сам ён — малады, прыгожы, далікатны інтэлігент, юнак і ў трыццаць, і ў сорак, і ў пяцьдзясят...

Было ў той сціплай рэдакцыйнай папачцы некалькі канвертаў з лістамі і паштоўкамі, напісанымі жаночай рукой. Былі сярод іх і вершаваныя... І сёння, на адлегласці гадоў, якія прамінулі, калі самога паэта не стала, тыя паэтычныя вітанні, дасланыя Міхасю Лявонавічу да дня яго народзін, чытаюцца асабліва шчымліва і скрушна, як лішні напамін пра скарацечнасць чалавечага жыцця і віртуальнасць радасці, дараванай ім:

Хоць і груз жыцця налёг на плечы,
Бегла думка лёгкая аб нечым...
Бегла думка прама, наўскасяк...
Аж гляджу: яна ля Міхася.
Аж гляджу: яна ля Міхасёчка...

Ды і ён, здаецца, недалёчка.
Колькі зім і летаў, і гадочкаў,
Як радзіла маці Міхасёчка!..
Ну скажы мне, што рабіць нам з лютым —
Нешта ён закручывае крута?
Толькі думка цёплая аб нечым...
Да сустрэчы, Міша, да сустрэчы!

Вітаньне памечана лютым 1986 года. А вось яшчэ адно вітанне — люты 1987 года — апошні год Міхася Стральцова:

Даражэнькі імяніннік!
Быў першы дзень... Затым гады без ліку.
І залаты гадзіннік нам націкаў...
Няхай пачнецца дзень, як і спярша...
І зноў квітнее добрая душа!
А наваколле?.. Глянь, як плача снег.
Яшчэ — вясна! І сонейка! І смех!

Былі пасля таго і вёсны, і сонейка, відаць, быў і смех: жыццё не любіць аднастайнасці. Але ўсё гэта было без паэта.

Снег плакаў нездарма.

Прайшлі гады, як яго не стала, але не-не ды і ўсплыве ў памяці яго хударлявая постаць ля акна з прачыненай на вуліцу форткай, у якую ён пускаў цыгарэтны дым. Пускаў і сам цягнуўся позіркам туды, дзе неба і прастора. А ў самога былі вочы зацкаванага звера з пастаянным туманам глыбокапатаемнай думкі.

Болей маўчаў, і было зразумела, што ён недзе там, сам з сабой, са сваёй душой. Гаварыў ціхім хрыплаватым голасам — і было ясна, што ён вярнуўся адтуль у зямную рэальнасць — няўтульную, чэрствую, але дарагую да слёз, як пакінутая шмат гадоў назад занядбаная родная хата.

Там, адкуль ён вярнуўся, быў ягоны храм, яго сабор, і туды ён нікога не пускаў. Там усё было саткана з блакітнага і зялёнага, празрыстага і сціхуткага, крышталёвага і крохкага. І там, як гаспадыня, прыжылася і забрала ўсё ў свае рукі самота. Не сум, не адзінота, не адчай, не журба, а самота. Там ён мог быць сам-

насам са сваёй душой як часавай, прасторавай і зямной рэальнасцю.

У 1985 годзе я скончыў працу над раманам «Сачыненне на вольную тэму». Пісаўся твор некалькі гадоў, але адчування, што вось яна, праца, нарэшце скончаная і можна не баяцца выходзіць з ёй у людзі, не было. Наадварот, быў нейкі страх, тачыла няўпэўненасць, як іржа точыць жалеза. Здаецца, і тое не так, і тое, і ўвогуле... хоць вазьмі і выкінь гэты немаленькі стос спісанай і шмат разоў перапісанай паперы.

Папрасіў Стральцова прачытаць і сказаць сваё слова. Чытаў ён доўга, ва ўсякім разе, так мне падалося. Праходзіць тыдзень, два, тры, а ён маўчыць. Хоць ты на працу не хадзі: працуем жа ў адным часопісе. Нарэшце заходзіць. І зноў прачынена фортка на вуліцу, там гудзе, шуміць, ідзе сваё жыццё, туды ж вылятае дым ад Міхасёвай цыгарэты.

— Ну, стары, віншую! Ад усёй душы віншую, — нарэшце гаворыць ён.

Я гатовы быў расцалаваць яго, і не толькі таму, што ён пахваліў раман, хаця і таму, што пахваліў, а болей за ўсё таму, што зняў камень з душы.

Міхась памаўчаў і даволі жорстка дадаў: — Гэта не тыя бясконцыя пугі, што пякуць, як бліны некаторыя нашыя раманісты. Аказваецца, на невялікай плошчы можна шмат што сказаць.

Міхась Стральцоў быў і заставаўся рашучым прыхільнікам «малога» жанру — апавядання, эсэ, верша, невялікай аповесці. «Адзін лапаць, адзін чунь» па стральцоўскіх мерках — гэта ўжо цэлая эпапея! І я б, можа, не ўспомніў пра гэты эпізод, калі б ён датычыўся толькі мяне. Міхась быў чалавек стрыманы і далікатны, але на літаратурным полі заставаўся бескампрамісным і строгім.

Міхась Лявонавіч вярнуў мне папку з рукапісам: — Не перажывай, усё добра... Пытальнікі на палях. Падумай толькі над канцом... — сказаў ён.

Дома я перачытаў усё ад пачатку да канца. Пытальнікі былі, але яны датычыліся слова, паўслова... А канец... Ён і самому мне не падабаўся.

Я думаў... Трэба было думаць...

Калі б мяне папрасілі адным словам азначыць, хто ён, Міхась Стральцоў, у літаратуры, я сказаў бы, што ён паэт самоты. Самоты не як мадэрна, не як позы, а як чалавечай сутнасці і як састаўной долі «пакутнага духу». Гэтае беларускае слова не мае раўнацэнных, адназначных аналагаў у блізкіх мовах. Ціхае і далікатнае, усеабдымнае і глыбока індывідуальнае, якое ўбірае ў сябе ўсяго чалавека, стан ягонай душы, яго самасць — далікатнасць, інтэлігентнасць, крохкасць, прыродную музычнасць і балесную рэакцыю на ўсякі знешні дысананс, — яно больш за ўсё прыдатна было стральцоўскай натуры.

Напэўна гусі на бяду
Крычалі — журавы маўчалі,
Калі ў дарозе чараду
І зім і лет маіх страчалі.
Што я хацеў, што я хацеў,
Што за праява адбылася?
Я сніў, што сам я адляцеў,
Душа ўзяла і засталася.

Колькі б ні стараліся расшыфраваць загадку чалавека, яна заўсёды застанецца загадкай. Яшчэ цяжэй расшыфраваць загадку асобы творчай. Тут можа быць толькі пазнанне яе, спасціжэнне яе. Бо іначай можа стацца, як у нырца на глыбіню: туды занырнеш, а назад вынясе. Пра Багдановіча Стральцоў так і сказаў: «Загадка...». І пакінуў кожнаму права шукаць адгадку.

Так і сам пра сябе.

Усім, хто яго ведаў, хацелася, каб ён зрабіў больш. Усе ведалі, што гэта будзе адкрыццё, гэта будзе жыццё, гэта будзе паэзія. Як было некалі, калі ён расказваў пра Максіма Багдановіча. Ці калі паведаў пра Вялікага чалавека з Малой Багацькаўкі. Ці калі нечакана, насуперак ліхому пасляваеннаму аптымізму і жорсткай рэалістычнай заземленасці, расказаў пра блакітны вецер, без якога нармальны чалавек — не чалавек. Ці... Шмат што можна было б далучыць у гэты пералік, і гэта было б тое

самае, што ўзяць творы пісьменніка ад першага да апошняга і перачытваць, і перажываць, і перадумваць.

Дык вось, па сваёй добрай волі, па сваёй зададзенай ахвоце мастак не можа адмовіцца ад працы. Што роўна — адмовіцца ад сябе. Не піша, значыць, не можа пісаць. І зноў жа гэта не значыць, што ён не працуе. І ці можна знайсці суд большы, чым суд мастака над самім сабой.

Не будзем крыўдаваць на жыццё, не будзем рабіць людзей святымі. Будзем старацца зразумець падатлівасць чалавека і жалезабетоннасць часу, у якім ён жыве. Асабліва калі чалавек гэты — Паэт.

Сэрца паэта сумуе заўсёды. Але надта шчымлівы сум перад адыходам чалавека ў дарогу, з якой не вяртаюцца.

Журботна крычаць журавы, адлятаючы ў вырай. У іх ёсць надзея вярнуцца. А ў Паэта?..

Самотна трымціць яго душа, збіраючы зямныя лахманы, каб было чым затуліцца на скразняках вечнасці. Сумныя вочы чапляюцца за ўсё, на што некалі пазіралі мімаходзь, незацікаўлена і разбэрсана, а цяпер яны ва ўсім знаходзяць залацінкі глыбіннага сэнсу і неспазнанай прыгажосці. І хочацца ўсё гэта забраць, утаптаць у сябе, патрымаць, паняньчыцца, як у дзяцінстве з любімай лялькай, а пасля вярнуць назад, але ўжо як сваё, наванароджанае, пакінуць нейкім напамінкам пра сябе, як пра ружовы ўсплёск на вячэрнім небе, перш чым яго затушыце чарната ночы...

Пакінуць... Каму і навошта? Каму? Тым, хто застаецца. Навошта? Навошта... Можа, каб мець прычыну яшчэ раз некалі вярнуцца?.. Каб сказаць: «Я нікуды адсюль не пайшоў, я ніколі з вамі не разлучаўся»...

Вада асенняе крыніцы,
Яе злавесныя агні,
Калі пад вечар неба ніца
Глядзіць з панурай глыбіні, —
Мне нагадалі даўні лёс,
Якога памяць ці жывая...
Я схамянуўся і абтрос

Жуду, як дрыжыкі, бывае.
Я павярнуўся і далей
Пайшоў, ды хмары навісалі
І не празрысцей, не святлей
Той на нябёсах лёс пісалі.
І дальні лес, і блізкі луг,
І ў вечаровых барвах поле,
І ўсё наўкола і наўкруг
Жыло тым лёсам мімаволі,
Маўчала ўдалечы сяло.
Але чамусьці мне здалося,
Што ўсё тут памяццю жыло
Не аднаго, а мноства лёсаў.
А падалося: гэты дзень,
Святло якога дагарае, —
Не пакідаючы надзей,
Са мною разам памірае.

Услед за Максімам Багдановічам і Максімам Гарэцкім Міхась Стральцоў больш чым хто спасціг драматызм беларускай душы. Драматызм гэты гістарычна абумоўлены. Ён у пастаянным адчуванні сябе выгнаннікам, чалавекам з Радзімай, але без роднай хаты. Чужы на сваёй зямлі, чужы сярод сваіх. Пра гэта цяжка думаць, яшчэ цяжэй пра гэта некаму сказаць.

За ўсякае адкрыццё трэба плаціць. Нават калі гэта адкрыццё самога сябе.

І паэт заплаціў самым дарагім, што меў. Заплаціў самім сабой.

1997

Алена Стральцова

Мая радасць і мой боль

Упершыню я ўбачыла Міхася Стральцова ў 1964 годзе, у кватэры яго сябра. У той час у мяне ад хваробы страўніка памірала бабуля, яна ўжо не магла нічога есці, і мы, каб хоць неяк яе

падтрымаць, ціснулі для яе апельсінавы сок. А апельсіны ў той час, як і многія іншыя прадукты, былі ў вялікім дэфіцыце. Мая сяброўка сустракалася з хлопцам, які сябраваў з пісьменнікамі і нейкім чынам меў доступ да дэфіцытных прадуктаў. У той дзень мы з сяброўкай якраз і зайшлі да яго па так патрэбныя мне апельсіны.

І так здарылася, што я першай зайшла ў кватэру, якую чамусьці адчыніў не гаспадар, а Міхась. Я ўбачыла вельмі прыгожага маладога чалавека з узнёслым тварам, які стаяў у сонечным святле, і было такое ўражанне, што ў яго над галавой — німб.

Я тады вучылася на першым курсе філалагічнага факультэта БДУ і на лекцыях па сучаснай беларускай літаратуры чула ўжо пра таленавітага маладога празаіка Міхася Стральцова. Але тады, у кватэры, я не ведала, хто перада мной. Там былі яшчэ нейкія маладыя людзі, усе размаўлялі па-беларуску. Я таксама стала гаварыць з імі па-беларуску, на што Міхась заўважыў, маўляў, адчуваецца, што дзяўчына вырасла ў настаўніцкай сям'і, прычым у вёсцы. Як жа ён здзівіўся, калі я прызналася, што нарадзілася ў Расіі, у Яраслаўлі на Волзе. Гэтая акалічнасць яго адразу зацікавіла. Я ж не магла ведаць, што ён ужо тады, магчыма, задумваў сваё эсэ пра Максіма Багдановіча, чыё жыццё звязана з Яраслаўлем.

У Стральцова за два гады перад нашай сустрэчай выйшла першая кніжка апавяданняў «Блакітны вецер». Я чула пра яе, але не чытала — тады мяне гэта не цікавіла. Больш цікавіла мяне іншая кніга — Шэкспір па-беларуску, што незадоўга перад гэтым выйшла ў свет. Я тады думала, што пераклад рабіўся з рускай мовы і безапеляцыйна заявіла ўсёй кампаніі, што ў такім выпадку Шэкспір шмат страціў. Я тады гаварыла тое, што думала, хоць сяброўка мне ўсе ногі пад сталом адтаптала, маўляў, замаўчы. Я ж не разумела, чаму я павінна замаўчаць, і працягвала ўдаваць з сябе шэкспіразнаўцу. А Міхась усё слухаў і прыгаворваў: «Як натуральна!»

Потым Міхась правёў мяне дамоў і папрасіў тэлефон. Мне хацелася працягу знаёмства, але я саромелася адразу даць

тэлефон. Таму пажартавала, маўляў, дам, а потым акажацца, што ў вас жонка і поўная хата дзяцей. На што ён сур'ёзна адказаў: «Не, толькі двое». Я падумала, што ён усё ж жартуе...

Назаўтра я адразу кінулася шукаць той «Блакітны вецер». Кніжка мне вельмі спадабалася. У апавяданнях было шмат рамантыкі, не штучнай, а шчырай, якая брала за душу. І калі Міхась мне патэлефанаваў, у нас ужо лёгка знайшліся агульныя тэмы для размовы. Але, дзіўна, я чамусьці стала звяртацца да яго на «вы». Відаць, кніжка таксама спрычынілася да гэтага, але шмат значыла і тое, што Міхась быў чалавекам сямейным, бацькам дзвюх дачок.

*

Прайшло нямала часу, і аднойчы на працы мяне паклікалі да тэлефона. Званіў паэт Валодзя Паўлаў. Ён сказаў, што з Міхасём кепска, і прасіў, каб я паехала да яго на бульвар Шаўчэнкі, бо ў самога Паўлава не атрымлівалася. Зразумела, што я нікуды не паехала. Якое права мела я ўмешвацца ў чужую сям'ю? Праз нейкі час Міхась патэлефанаваў сам і паведаміў, што разыходзіцца з жонкай, што яны размянялі кватэру, і цяпер ён жыве ў аднапакаёўцы на вуліцы Шчорса. Папрасіў прыехаць дапамагчы. Гэтым разам я паехала. У кватэры паўсюль ляжалі нераспакаваныя кнігі, рэчы. Мы разам збольшага добраўпарадкавалі тую аднапакаёўку.

Праз нейкі час мы ізноў стэлефанаваліся, і ён паведаміў, што яму няма дзе жыць. Пакуль ён быў у ад'ездзе, былая жонка скасавала размен. Больш за тое, яна чамусьці не аддала яму ніякіх дакументаў — у яго не было ні пашпарта, ні ваеннага білета, ні пасведчання аб нараджэнні... Міхась знайшоў часовы прытулак у студэнцкім інтэрнаце на Свярдлова, у журналістаў. Да таго ж, ён зламаў нагу...

У такой сітуацыі адклад не ішоў у лад. Я хуценька сабрала прадуктаў, і мы з Валодзем Паўлавым паехалі ў той інтэрнат. Помніцца — у шматлюдным пакоі на стале стаяла вялікая патэльня са смажанай бульбай. Зразумела, усе мае пачастункі

тут жа трапілі на агульны стол і зніклі за якіх дзесяць хвілінаў. А мне ж так хацелася, каб ён сам пад'еў... З інтэрната я ехала ў тралейбусе і ўсю дарогу плакала — так мне было шкада бездапаможнага Міхася.

*

Мы з Міхасём сустракаліся ў парку Янкі Купалы. Там у нас была свая лавачка, каля якой звычайна скакалі вераб'і. І потым, дамаўляючыся пра чарговую сустрэчу, Міхась звычайна казаў: «Прыходзь туды, дзе верабейкі скачуць».

Падчас адной з сустрэчаў я наўпрост сказала: «Хай бы знайшлася жанчына, якая ўзяла б цябе ў рукі. Ты адзін прападзеш». На гэта Міхась адрэагаваў нечакана: «Дык ты і вазьмі!» І мы сталі жыць разам — у маёй мамы.

Запомнілася знаёмства з Янкам Брылём, які як мог спрыяў Міхасю. Іван Антонавіч параіў мне сам-насам: «Абавязкова завядзіце дзіця. Для Міхася гэта вельмі важна»... Аднак хлопчык Алесік нарадзіўся ў нас толькі праз чатыры гады. Міхась быў вельмі шчаслівы! У мяне захаваліся лісты, якія ён пісаў мне ў бальніцу. Я іх сёння не магу чытаць... Наш Алесік не пражыў і чатырох месяцаў. Ён аказаўся алергікам і не пераносіў прышчэпкі, якую давалі ў гэтым узросце ўсім дзецям — у яго здарыўся анафілактычны шок. Мы страцілі сына.... Калі прывезлі дахаты маленькую труну, Міхась абхапіў яе і доўга стаяў перад ёй на каленях...

Ён быў вельмі пяшчотным і трапяткім бацькам. Калі нарадзілася дачка Алеся, ён аж дрыжаў над ёю, вазіў у возіку на прагулкі, пазней забіраў з дзіцячага садка. Многа часу яны праводзілі разам, пра нешта размаўлялі. Мяне да тых размоваў не запрашалі. Ім добра было ўдвух. Памятаю, калі Алесі споўнілася тры гады, мы паехалі ў дом творчасці пісьменнікаў «Каралішчавічы». Там быў і Рыгор Барадулін. Неяк мы прагульваліся разам, Міхась з Алесяй ішлі паперадзе, а мы з Рыгорам ззаду. І Барадулін кажа: «Глядзі, і крошачкі бацькавы пабрала, нават паходка бацькава». Калі Алеся падрасла, Міхась часта чытаў ёй, цярпліва выслухоўваў усе яе навіны, пра якія я магла

і не даведацца. Нават з Мазыра дасылаў адмыслова для яе напісаныя вершы і казкі.

*

Самым блізкім Міхасёвым сябрам быў Рыгор Барадулін. Ён нам тэлефанаваў часам па пяць-шэсць разоў за дзень. Калі раніцай, то першым яго пытаннем было: а што ў цябе на сняданак? І калі Міхась пералічваў, Рыгор Іванавіч цешыўся: «Ну, дык ты жывеш, як пан». Часта слухаўку брала Алеся і адразу крычала на ўсю кватэру: «Мішачкін! Цябе Грышачкін да тэлефона кліча!»

Вельмі цаніў Стральцова-пісьменніка і шмат дапамагаў нам Алесь Адамовіч. Каб падтрымаць матэрыяльна, прасіў Міхася перакладаць яго кнігі на беларускую мову. Помніцца, за адну з іх Адамовіч атрымаў ганарар (800 рублёў — на той час вялізныя грошы!) і ўвесь аддаў Міхасю.

Блізкімі сябрамі былі Віктар Карамазаў, Анатоль Кудравец, Карлас Шэрман, асабліва — Аляксей Зарыцкі. Зарыцкія бывалі ў нашым доме, мы часта бывалі ў іх, заўсёды з маленькай Алесяй. Сем'ямі сябравалі і з Таняй Арловай — Міхасёвай аднакурсніцай. Неяк цэлае лета мы пражылі ў іх на лецішчы ў Ждановічах. Там збіралася цікавая кампанія — прыязджаў Віктар Тарасаў з жонкай і маленькай дачушкай, Ніна і Фама Варанецкія, якія таксама сталі нашымі блізкімі сябрамі.

*

Помніцца наша першая паездка на Міхасёву радзіму — у вёску Сычын на Слаўгарадчыне. Калі мы прыехалі, нам з хаты насустрач выйшлі бацька і маці. Бацька, Леў Клімавіч, быў тыповы беларус — спакойны, памяркоўны, адчувалася ў ім нават у побыце настаўніцкая жылка. Маці, Марыя Міхайлаўна, мела мяккі характар, але пры патрэбе магла і пастрожыцца. Яны з цікавасцю на мяне паглядалі. У хаце былі таксама Міхасёвы сёстры Таіса і Ніна, прысутнічалі яшчэ нейкія сваякі. Нас пасадзілі за стол, пачаліся размовы, успаміны.

Маці вельмі радавалася прыезду сына, панаракала, што рэдка бывае ў роднай хаце. Але і парадавалася, што Міхась лагодны, добра апрануты. Мы прыехалі, зразумела, з падарункамі. Потым мне сястра расказвала, што калі мы з Міхасём пайшлі ў краму, мама зірнула нам услед у акно і сказала: «Як яны падходзяць адзін да аднаго!»

Мы прабылі ў Сычыне тады, можа, з месяц. Стаяў цёплы верасень, бацька хадзіў у школу, ён быў дырэктарам і выкладаў некалькі прадметаў. Што мяне здзівіла, ён да кожнага ўрока старанна рыхтаваўся — пісаў планы-канспекты.

Хадзілі на рэчку, дапамагалі бацькам у вясковай працы. Помню ідзем аднекуль, а нас даганяе дзед Ганчарык на возе. Маладзіцы, што ішлі разам з намі, папрасіліся на воз. А дзед: «Я лепш гарадскую падвязу, яна больш пагляднaя!» Але я да дзеда не села, бо мне было прыемна з Міхасём ісці.

*

У 1986 годзе ў Міхася выйшла кніга «Мой свеце ясны» з вельмі прыгожымі ілюстрацыямі. Аздабляў кнігу мастак Аляксандр Шэвераў, на жаль, я яго не ведала. Стральцоў любіў узяць кнігу ў рукі, часта яе пераглядваў, задаволена ўсміхаючыся. Нават папрасіў мяне адзін асобнік разабраць па старонках і зрабіць нешта накшталт паспарту, каб потым у рамках павесіць на сценку ў кабінеце. Там сапраўды вельмі прыгожыя ўсе малюнкі — і буслінныя крылы, і маладзік, і абрусы саматканыя.

Увогуле, Міхась быў заўзятым чытачом, любіў купляць кнігі. Ён быў абыякавы да адзення, да іншых рэчаў не першай неабходнасці, але за кнігі ён мог аддаць апошні рубель. З усіх крамаў улюбёнымі ў яго былі кнігарні. Кніг у хаце заўсёды было многа. Чытаў ён адразу некалькі выданняў. Любіў гэта рабіць лежачы. Ляжыць на канапе з томам Блока, а тут жа, на падлозе разгорнуты Зошчанка, побач з ім Чэхаў. Антон Паўлавіч быў яго самым улюбёным пісьменнікам, ён яго перачытваў часцей за ўсіх. З беларускіх сучаснікаў вельмі любіў Брыля, Адамовіча, Барадуліна, быў у захапленні ад Максіма Гарэцкага. Чытаў, перачытваў, рабіў выпіскі,

зачытваў іх мне. Я ўжо не кажу пра Багдановіча, якога ён проста абагаўляў.

Калі Міхась жыў на Веры Харужай, у першай сям'і, у яго была вялікая бібліятэка. Сталася так, што з яе яму не аддалі ніводнай кніжкі. А ў мяне была свая няблага падабраная бібліятэка, што Міхася, помню, прыемна ўразіла. Потым мы разам дапаўнялі наш агульны кнігазбор. Ён і цяпер у мяне захаваўся, і я яго патроху пачынаю разбіраць і сістэматызаваць.

*

Калі Міхась пісаў, то не цярпеў, каб яму перашкаджалі. Але адначасова не любіў, каб мы з Алесяй сыходзілі з кватэры. Казаў: «Вы мне не замінаеце».

Вельмі дзіўна выглядаў сам працэс пісання. Машынка стаяла ў кабінеце. Звычайна, я займалася сваімі справамі на кухні. І вось бачу, Міхась уподбежкі ляціць на кухню да акна, стаіць пры ім, паліць у фортку і думае. Раптам, не дапаліўшы цыгарэту, бяжыць у кабінет да машынкі, і я чую, як яна стракоча, як кулямёт. Гэта ён так артыкулы пісаў. А калі пісаў прозу, то таксама бегаў з кабінета на кухню, але пісаў ад рукі. Звычайна дома ён хадзіў у тоненькай кашульцы. І я бачыла, як у яго па спіне ішла палоска поту, быццам ён дровы сек. Проза яму цяжка давалася. Нават фізічна.

Міхасю часта заказвалі рэцэнзіі, юбілейныя артыкулы. Ён іх з задавальненнем пісаў. Мог нават напісаць цэлы артыкул пра адно чатырохрадкоўе! Але калі той ці іншы твор быў яму не па гусце, ніхто ў свеце не мог прымусіць яго напісаць хоць бы радок. З гэтай нагоды прыгадваецца выпадак з рукапісам адной беларускай паэткі. Міхася папрасілі ў «Мастацкай літаратуры» напісаць унутрывыдавецкую рэцэнзію. І выдавецтва прыспешвала, і сама паэтка была дужа настойлівай, а ён — маўчаў, бо не мог крывіць душою! Я бачыла, як ён зноў і зноў перачытваў той рукапіс, спадзеючыся знайсці хоць бы адзін верш, на які адгукнулася б яго душа. Я адказвала па тэлефоне, што яго няма, што ён спіць, што ён некуды выйшаў... На жаль, тая паэтка так і не дачакалася гэтак патрэбнага ёй водгуку ад Стральцова.

*

Былі перыяды, калі Міхась доўгі час не працаваў. Працадаўцы баяліся, што ён не зможа трымацца рэдакцыйнага графіку, сарвецца. Ён і сам не хацеў кагосьці падводзіць, дужа не напрошваўся. Стала працавала толькі я, і грошай, вядома ж, не хапала. Калі-нікалі перападалі ганарары за надрукаваныя творы, але калі Стральцоў прыходзіў іх атрымліваць, аказвалася, што ўсё забралі ў кошт доўгу па аліментах... Заставалася вучыцца жыць эканомна. Гатаваць я ўмела, праўда, у нас не было лецішча з агародам, які звычайна гараджанам дапамагаў выжываць. Хоць я і гарадскі чалавек, але ў нас заўсёды былі насушаныя і насоленыя грыбы, нагатаванае сочыва, настаўленыя кампоты.

Неяк зайшоў да нас у госці саліст мінскай оперы Міша Галкоўскі са сваімі дзецьмі, яны з Міхасём сябравалі. Я выставіла на стол усё, што мелася ў хаце. Дзякуючы за пачастунак, Галкоўскі спытаўся: «У вас сёння такі абед! Хіба нейкае свята?» А Міхась пасміхнуўся: «Не, Міша, гэта ў нас грошай якраз няма!» — «А што ж бывае, калі ёсць?» — «О, тады ў нас «пір на ўвесь мір!»

*

Міхась не быў атэістам, але тое, што ён сын настаўніка і дырэктара школы, адыграла сваю ролю. Наколькі я памятаю, у бацькоўскай хаце ў Сычыне не было іконаў. Вялікі ўплыў на Міхася ў маленстве аказаў дзед Міхал Кузьміцкі — пра гэта мне расказвала маці. Водгалас гэтага сяброўства дзеда з унукам — у аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь». Асабліва ўражвае там малітва дзеда — дзіўна, як яе прапусціла тагачасная цэнзура.

Наўпрост пра Бога мы з Міхасём ніколі не размаўлялі. Але была ў нашым жыцці гісторыя, якая пра шмат што гаворыць. Міхась тады працаваў у рэдакцыі, быў сябрам афіцыйнага Саюза пісьменнікаў БССР, я працавала ў выдавецтве ЦК КПБ. Вядома ж, у той час мы баяліся хрысціць дзяцей. Наш маленькі сын памёр няхрышчаным. І калі нарадзілася Алеся, мы баяліся яе пахрысціць, бо ведалі, што пры цэрквах былі людзі, якія

даносілі. А мая маці настойвала... І аднойчы я не вытрымала і дазволіла ёй пахрысціць унучку, але нікому пра гэта не казаць. І вось аднойчы раніцай выходнага дня яны разам недзе пайшлі. Вярнуўшыся, Алеся мне расказвала па-дзіцячы, што яны з бабуляй былі ў тэатры. Там усе — і дарослыя, і дзеці — лёталі высока-высока. Я слухала і думала, што яны, мабыць, у цырк хадзілі. А потым, кажа дачка, выйшаў дзед у вышытай сукенцы і напусціў дыму, а потым пачаў вадой пырскацца... Тады я зразумела, дзе яны былі, але Міхасю нічога не сказала.

А калі Алесі споўнілася гадоў дзевяць, да нас прыехаў крытык Валянцін Аскоцкі з Масквы. Яны сядзелі і размаўлялі з Міхасём. І Валянцін чамусьці пачаў расказваць, што ў Маскве пайшла мода хрысціцца — і дарослыя хрысцяцца, і дзяцей пачалі хрысціць. А Міхась гаворыць: «А ў нас у Мінску ціха. Я і сам няхрышчаны, і малая наша». Тут я не вытрымала: «Ты, можа, і няхрышчаны*, а пра Алесю чаму так кажаш?» Ён зірнуў на мяне: «Хіба Марыя Іванаўна пастаралася?» Я пераказала яму Алесіну гісторыю з «тэатрам». «Ну Марыя Іванаўна, ну малайчына!» — толькі і сказаў Міхась.

*

Адна з няспраўджаных Міхасёвых задумак — аповесць «Конь гуляў на волі». Ён пра яе любіў са мной пагаварыць, кампазіцыйна тэкст быў гатовы, заставалася перанесці на паперу. Але ён усё нешта дадумваў, нават аднойчы папрасіў мяне запісаць з радыё падрабязны прагноз надвор'я — трэба было для аповесці. Я запісала, не вельмі цямячы, як той прагноз можна выкарыстаць. На жаль, свайго «каня вальналюбнага» ён так і не напісаў, хоць даў анонс у «Маладосці». Помніцца, я яго папракнула: «Як ты анансуеш аповесць, не маючы ні радка?» Ён адказаў: «Усё ў мяне ў галаве».

*

Калі ў нашай дачкі Алесі нарадзіўся сын, яна прыклала ўсе намаганні, каб ён атрымаў прозвішча Стральцоў. Сёння гэта

* Пазней ад свекрыві я даведалася, што Міхась усё ж быў пахрышчаны.

ўжо падлетак, яму споўнілася чатырнаццаць гадоў. І хоць жыве ён далёка ад Беларусі, у Адэсе, але стараецца чытаць творы дзеда па-беларуску, просіць дасылаць яму беларускія кнігі. Мы часта падоўгу размаўляем з ім у скайпе, яго цікавяць і мінскія курсы «Мова-нанова», і новыя публікацыі пра дзеда, і фестываль «Вершы на асфальце». Мне здаецца, Міхасю было б надзвычай прыемна ведаць, што дзесьці на свеце жыве яго крывінка, прадаўжальнік роду — Мацвей Стральцоў.

2016

Віктар Карамазаў

І прадчуванне, і лёс

З гадамі ўсё часцей не знаходзіш згоды са светам, з людзьмі, з самім сабою. Ну а хто, ну а што вызначае меру нязгоды? Ці не той самы свет? Ці не тыя самыя людзі? Ці не ты сам? І калі гэта так — дзе логіка?

Свет, аднак, ратуецца тым, што вазе ёсць процівага, нязгодзе — згода.

Я не адразу, пасля пэўнага роздуму, адкрываю сінюю, колеру жнівеньскай ночы, вокладку, але адразу пазнаю за ёю, адкрытаю, яшчэ з пахам друкарскай фарбы, блізкі голас:

О роднае маё! Як доўга да цябе
Ішоў я, кволы падарожнік.

Чую... і бачу: бальшак, узараны дзвюма глыбокімі каляінамі, бярозавыя прысады, за старымі бярозамі — жыта з пажоўкла-спалавелым коласам, за жытам — зялёныя чубы алешніку, а далей, за алешнікам, ваколіцу вёскі. І ўсё гэта не абы-якое, не абы-чыё, не безназоўнае, усё канкрэтнае, дзе ўсяму свая назва. Вёска — Сычын, бальшак — сычынскі, жыта — сычынскае. А за Сычынам — Сож, найпрыгажэйшы ў Дняпра сын.

І ён, Міхась Стральцоў, канкрэтны сычынскі чалавек, пад бярозамі, сышоўшы з бальшака, каля жыта, не то разгублены, не то задумлівы, з жытнёвым коласам на далоні. Стаіць...

За вёскаю, на адзіноце,
Асеннім днём...

Не ілюстрацыю — гук шукаю ў паэтавай, любай ягонаму сэрцу, прасторы, агароджанай хоць бы і вокладкамі апошняй паэтычнай кнігі «Мой свеце ясны». Ён, адчуваю, можа дапамагчы зразумець разгубленасць, заякараную думкай, перад роднаю вёскай, у якой паэт не быў гадоў дзесяць, перад сустрэчаю з маці і бацькам, якіх так даўно не бачыў.

Ні развітання, ні спаткання,
А толькі вусцішнасць быцця:
Нібы пра згубнае каханне
Пяе няўцямнае дзіця.

Дык вось ён... і яно: гук зямнога быцця, стан нематы і прадчування, аснова, ад якой няма збавення раскалыханай душы, дакладней — мелодыя родных дарог, палёў, лясоў, ваколіц, прысад, асацыяваная з мелодыяй прадчування. Яна, гэтая мелодыя, так сугучная з блокаўскай: «О, Русь моя! Жена моя! До боли нам ясен долгий путь...», кіруе паэтам, затрымлівае ў глыбокім роздуме на сцяжыне да маці, бацькі, роднага парога, хоць тым самым і ствараецца пагроза кінуць цень на яго сыноўнюю вернасць. Пагроза ўзнікае і знікае. Бо ёсць талент, які перасцерагае ад кроку за пагранічную лінію, дзе, калі б не ён, было б цяжка апраўдацца нават нормамі паэзіі, паэтычнай душы, якія — паэзія і душа,— бывае, не лічацца і з нормамі людскасці. У тым і сакрэт, што ёсць дакладная мера рызыкі, якую дыктуе талент, хоць ён з-за сваёй прыроды як быццам і не пільнуе — не яго гэта прызванне — разумную меру. Ён жыве інтуіцыяй, а не разлікам. Тут — інтуіцыяй меры. Яе ўладай.

Там, на бальшаку пад Сычынам, я аб гэтым не падумаў. Я тады быў здзіўлены, што сын не спяшаецца ў родны дом, да якога пяць хвілін хады. Тады думалася іначай: ну, чаго ты, дружа, стаіш, марудзіш?..

Назаўтра мы пакідалі Сычын. Выехаўшы за вёску, зноў спыніліся на тым самым бярозавым бальшаку, ля таго самага жыта. Прыглушана грала ў машыне старадаўняя лютня, гэтак

засяроджана і прачула ў стрымана-ціхай вусцішы поля і бальшака, што не думалася пра нейкі там магнітафон, нібыта ён — віноўнік, музыка ўспрымалася як жывое дыханне жытнёвай сцяблінкі-саломінкі ці аргана жытнёвай сцяны, што стаяла ўскрай поля ў чэзлых валошках. Усё тут было развітальным. І нават думка — нечаканая:

— Ці ўбачу яшчэ калі-небудзь? Ці гэта — апошні раз?..

Пра бярозы на бальшаку?..

Праз год памёр бацька, працавіты і мудры вясковы настаўнік і араты Лявон Клімавіч. Неўзабаве пакінула Сычын і маці, Марыя Міхайлаўна,— паехала, цяжкахворая, жыць да дачкі ў Слаўгарад. Сплыла да чужых рук родная хата. Круг вёскі... замкнуўся?..

Уразіла дакладнасць прадчування: «Ці гэта — апошні раз?..»

Прадчуванне заўсёды наведвае сапраўдную паэзію і не адпускае сэрца паэта. У паэзіі Стральцова — маю на ўвазе і ягоную прозу, і ягоную эсэістыку, бо ўсё, што ён піша, можна назваць паэзіяй,— дар і магія прадчування асабліва ўражліва звязаны з вёскаю. Ён ніколі не фарсіраваў тэму вёскі, як і любую іншую тэму, у сваёй творчасці, не выходзіў — проста не ставіў перад сабою гэтакай задачы — на яе кардынальныя, гістарычныя ці бягучыя сацыяльныя напрамкі, яго вясковы свет на першы погляд звужана-асабісты, амаль камерны. Але вострае адчуванне лагічнай перспектывы, выдатны зрок і слых на рэальнасць выводзяць аўтара, а за ім і яго чытача, да балючых кропак вёскі і ўсяго грамадства.

Як з тым сенам на асфальце. Дакладны мастацкі вобраз спакушае, каб на яго спаслацца. Але ж ёсць яшчэ іншая спакуса — паставіць пытанне: ці ў гэтай мастацкай формуле ўся вышыня сацыяльнага адчування і прадчування Стральцова?

Нават — у рамках апавядання «Сена на асфальце».

«Мне хацелася, даўно хацелася прымірыць горад і вёску ў сваёй душы, і гэта была мая самая патаемная і самая душэўная думка»,— прызнаецца сімпатычны і аўтару, і чытачу герой Стральцова. А я ўпэўнены, што сам аўтар доўгія гады жыў гэтай думкаю. Ёю жыло і жыве не адно пакаленне людзей. Можа, боль

гэты ў людской душы з таго часу, як на зямлі з'явіліся гарады? Ва ўсякім разе, мала хто з пісьменнікаў нашага з ім пакалення абмінуў гэтую тэму. Не адно дзесяцігоддзе літаратура адчувала яе даволі востра. Адчувае сёння. І не Стральцоў яе адкрыў. Ён, мабыць, проста ўвасобіў яе ў найбольш удалы мастацкі вобраз. А што далей? Ці знайшоў Віктар, герой апавядання, гэтае прымірэнне ў сваёй душы? Хто знайшоў? Паставіўшы пытанне, аўтар ужо тут, у апавяданні, беспамылкова адчуў усю складанасць праблемы. І адказу на яе не даў. Другі герой апавядання Ігнат, больш бывалы і мудры, як малады Віктар, робіць выснову, якая супярэчыць патаемнаму жаданню Віктара: «А можа, праўда дзядзькі Ігната, і чалавеку па-сапраўднаму трэба штосьці адно: горад ці вёска?..»

Большае пісьменнік прадчуваў і ў першых апавяданнях, але пэўна, як лёс, тое большае выявілася ў аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь». «Шукаю шэрую вёску, вёску сваю. Баюся: вышэзны і лёгкі, не прысяду там на парог, як самалёт рэактыўны не сядзе на травяністым аэрадроме... Я плачу. Зоркі — слёзы мае».

Прадчуванне страты вёскі? Так. Яно будзе ўсё часцей трывожыць паэта, напаўняць яго паэтычныя радкі то «змрокам у палях», дзе «сіберна і пуста», то «маркотай асенніх лугоў», то днём, «святло якога дагарае,— не пакідаючы надзей, са мною разам памірае».

Як быццам ты стаіш каля
Апошняй рысы ці парога.

Адкуль гэтае прадчуванне і адчуванне страты? Ці ёсць падставы, каб гаварыць пра «апошнюю рысу»?

Зноў мне бачыцца Сычын.

Вось настаўнік Дзмітрый Бандаркоў — насустрач: «Каго бачу-у!..— Доўгія рукі расставіў, як абхапіць госця, а з ім і ўвесь свет, забыўшы на каромысел з паўнюткімі вёдрамі на плячах. — Нам, Міхась, трэба пагаварыць. Даўно я цябе чакаю...»

Мужчыны ідуць да хаты. «Здароў, Цепа!.. — Гэтак, Цепам, аднавясковец Васіль Іванавіч, па-вясковаму — Чапай, заве ўсіх. Танклявы, смешна-вясёлы, з адной рукою, пад якой у падпаш-

шы пара новенькіх, з крамы, боцікаў — падарунак жонцы. Абдымае Міхася — боты падаюць пад ногі. — Дай я цябе пацалую. Ну, дзякуй, што разукрасіў у сваіх кніжках нашу зямлю. А я ж таксама стараюся жыць па совесці...»

І цётка Дуня — з радасцю да пляменніка. Расказала пра жыццё ў вёсцы, пра карову, параілася, трымаць яе, адной жывучы, ці збываць, калі збыць, то дзе малака шклянку купіш, ці прадасць хто, бо ў вёсцы цяпер людзі за капейчынай не ганяюцца, дадуць так, не за грошы, а так, без грошай, возьмеш раз, другі — трэці браць пасаромеешся. І пра дровы пагаварылі. І пра сад. Клопату ў вёсцы — не пазычаць. А пасля, нагаварыўшыся, душу ў цёплай размове адвёўшы, дастала цётка Дуня з куфра прыгажэнны ручнік: «Табе, Міша, берагла. На памяць. З чыстага палатна. Сама ткала, вышывала».

І дома — усе насустрач. Над матчыным ложкам, у галовах, дзе старыя абразы вешаюць, фотаздымак сына, яшчэ маладога, калі ў твары такая бязмерная любасць да свету, да людзей, да ўсяго жывога.

Вёска вітала, прымала, як свайго. Дык, можа, ён сам... не мог ужо з ёю па-ранейшаму?..

Споведзь у паэта — вершы.

А там — з апошняга:

Ды як аддаць, мой свеце любы,
Аднойчы ўзяўшы падарож,
Святло той рэчанькі Галубы,
Якую прыгалубіў Сож?
Ці тыя засень або ясень,
Той луг, аблогу, мурагі,
На сенакосе Касю з Ясем,
За імі — копы і стагі...
Яны са мной — і мною сталі...

Гэта — так. Гэта — споведзь.

Тут усё намнога складаней, як сувязі вонкавыя, усё не высвеціш і масткамі ў маленства, хоць на мастках тых, святых, пэўнасць і яснасць.

Калі мы здзіўляліся нейкай незразумела-дружнай настальгіі маладой і не маладой літаратуры па гадах маленства, Стральцоў таксама скіроўваў сваю ўвагу ў тыя гады — пісаў пра Іванку, падобнага да «жаўтлява-светлай саломінкі, вытыркнутай са страхі», пра дзеда Міхалку, якога Іванка любіў «даўно і так кроўна», не ведаючы пра тое сам, пакуль не вырас, пра чуні, падораныя дзедам Трахімам,— найвялікшую радасць маленства. Пісаў «На чацвёртым годзе вайны». Усё гэта было як быццам на тую самую тэму, што і ў іншых, але не выклікала ні пытанняў, ні папрокаў у настальгіі — адразу прыходзіла да нас як з'ява мастацтва. І заставалася з'явай у літаратуры.

Тут цяжка ўстрымацца, каб не згадаць фразу, якая ў галаве здаўна, усё жыццё, не забываецца: «Маленькі васьмігадовы Цёма стаяў над зламанай кветачкаю і з жахам думаў аб безвыходнасці свайго становішча». Гэтак — памятаеце? — пачынаецца «Дзяцінства Цёмы» Гарына-Міхайлоўскага.

Дзіўлюся, як гэтая фраза не забылася за сорак ці нават болей гадоў? У чым яе сіла? У дакладнасці светаадчування хлопчыка і адчування сябе самога ў свеце? Ці ў парадаксальнай для нас, дарослых, і такой бясспрэчнай у маленстве адэкватнасці паміж адной-адзінай сцяблінкай-кветачкай і цэлым жыццём? Ці ў злоўленым моманце, калі кропелька болю маленькага чалавека зліваецца з сэнсам самога жыцця, з усім зямным болем? І ці не тое самае — ды тое ж, вядома,— адбываецца з Іванкам. Што яго акружае? Двор, вуліца, разлапістая Піліпчыкава лясоўка, чародка вераб'ёў, сумёты снегу ды сцюдзёны пранізлівы вецер? А як арганічна гэты свет Іванкі падключаны да свету высокага, да сусвету з усёй яго дыялектыкай і філасофіяй, да духоўнай вышыні жыцця наогул. І ўсё, амаль усё, праз адчуванне сябе ў свеце і свету ў сабе.

Гэтае арганічнае, больш за тое — высакароднае, сумяшчэнне свету дзіцяці, адной-адзінай жывой істоты, з сусветам — не толькі ў аповесці Стральцова. Уся яго паэтыка, ва ўсіх жанрах і творах, пранізана незвычайна абвостраным гуманізмам, даверам да пачуццяў і сваіх, аўтарскіх, і свайго героя, да яго і свай-

го болю, смутку і радасці, да адчуванняў ва ўсёй іх складанасці і суб'ектыўнасці.

А гэтая гуманістычная мастацкая пазіцыя і пазбаўляе герояў Стральцова замкнёнасці ў сваім прыватным свеце, выводзіць іх боль на арбіту агульначалавечую.

Адсюль напружаны ўнутраны — не вонкавы — рух у творах, рух, якім насычаны і вобразы, і сюжэты, і аўтарскія разважанні. І не толькі рух. Адсюль у значнай меры лаканізм пісьма, высокі эстэтычны эквівалент слова, натуральная аўтарская раскаванасць, асабліва ў прозе і эсэістыцы.

Культура пачуццяў стварае культуру слова.

«Ідуць ужо халады, бяруцца прымаразкі — ападаюць інеем сырыя туманы. Чарсцвее зямля, і цёмным, ільсняна-халодным зяленівам б'е ў вочы парадзелая пры дарозе трава. Ужо выпетрала зябліва... І вечарамі, і ўранку марозліва, хмельна, бы першаком, пахне ў наваколлі дымам. Такою парою ў вёсках свяжуюць вепрукоў».

Узяць адразу, з першага сказа, дакладны і арганічны тон, рытм, адразу стварыць настрой, вобразны свет, пранізаны выразным аўтарскім пачуццём, сугучным з музыкаю зямлі, прыроды, пары года, як гэта зроблена ў апавяданні «Смаленне вепрука», можна адно маючы ў душы вельмі чуйны камертон. Ад прыроды? Вядома. Але і не толькі.

«Бабуля — высахлая, з учарнелым ад работы і старасці тварам — адсцябала матузамі малога ўнука за тое, што паабшчыпаў, не дачакаўшыся вячэры, акрайчык ацеслівага, спечанага з бульбы і ячменных шароек хлеба. Малы не заплакаў, толькі не сваім голасам войкнуў...»

Памятаеце? Ён заплача ўжо на двары, пасля. Ды так, што слёзы яго з таго часу не прасохнуць у нашых вачах. І гэта — таксама толькі пачатак апавядання. Іншага: «На чацвёртым годзе вайны».

Цяжка ў літаратуры пазбягаць паралеляў. Калі пішаш, калі чытаеш, разважаеш. Яе свет агромністы. Тут усё дарэшты можна з чымсьці параўноўваць, узвышаць ці прыніжаць паралелямі.

Неяк, чытаючы прозу Стральцова, мне цікава было трымаць на стале пад рукою томік прозы Буніна. А чытаць — то аднаго, то другога. То «Адзін лапаць...», то «Жыццё Арсеннева». Спачатку рабіў гэта інтуітыўна. Спыніўся на фразе ў самым пачатку аповесці Буніна: «У нас нет чувства своего начала и конца. И очень жаль...»

Крыху пазней: «Не рождаемся ли мы с чувством смерти? А если нет, если бы не подозревал, любил ли бы я жизнь так, как люблю?..»

Далей — зноў прыпынак: «Как передать те чувства, с которыми смотрел я, мысленно видя там, в этой комнате, Лизу?» І далей: «Как выразить чувства, с которыми мы вышли утром из вагона?» Нарэшце: «Я вдруг почувствовал эту Россию».

Пачуццё! Як магутна яно рухае думкі Буніна, усю яго прозу! Ён шукаў яго пастаянна, нечаканае і дакладнае, ім правяраў усё і ўсіх, самога сябе. І калі гаварыць пра ўладу яго прозы над чалавекам, дык гэта ж улада сэрца над сэрцам. Ці не гэта ён хацеў сказаць аднойчы і маладой пісьменніцы: «Вы умница и многое отлично чувствуете».

І ці не блізкае да гэтага — хоць бы ў «Роздуме» Стральцова: «І так хораша, жыва паўстаюць у памяці ранейшыя радасць і смутак, і так шкада, як падумаеш, што не вернеш ужо назад ні такой, як тады, радасці, ні такога смутку. А яны ж так трэба цяпер мне: навошта мне, каб радасць, пасталеўшы, стала ціхамірнасцю, а смутак — журбой? І так трывожна і боязна...»

Заўважым: радасць і смутак? І прыгадаем іншыя творы пісьменніка: як часта палярныя пачуцці суіснуюць пад адной сарочкай? Не проста суіснуюць — ствараюць свет, глыбокі і ёмісты. І гэта ўжо не тыя пачуцці, адчуванні, што толькі ад прыроды, ці, як кажуць, ад Бога. Лёсам трэба спазнаць, што надта радавацца рызыкоўна, а доўгая журба невыносная, як «размінаецца душа з другой душой — і плача вецер», што «дарога — то хмель на ёй, то дзераза», а «надзея... тыя ж болькі...». Сімбіёз перажыванняў параненай душы і душы мудрай? А чаго яшчэ?.. Адзіноты?..

Адзінота — лёс гордага генія. Адзінокімі былі Талстой, Дастаеўскі, Бунін. Ці адны яны? На вяршыню Парнаса амаль усе, здаецца, узыходзілі пад ярмом адзіноты. Натоўпам туды не ішлі. Леў Талстой казаў, што раіцца драбяза, вераб'і, напрыклад, толькі арлы не пакідаюць гордае вышыні адзіноты.

Сёння, у нашым прагматычным грамадстве, гэтая вышыня не ў пашане. Дружным табуном лягчэй пражыць. Постаць мастака, які адбіўся ад талакі, чарады, застолля, групоўкі — як тут ні назаві,— стала рэдкасцю. Але ж ярмо адзіноты блаславёнае найвышэйшым знакам літаратуры. Самім Львом Мікалаевічам. І Пушкіным: «Поэт!.. Ты царь: живи один».

Не пра тое размова, каб мастак жыў адзін, як пустэльнік. Пра тое, што ён не павінен баяцца адзіноты. Каб з гонарам нёс яе крыж. Тым больш што адзінота мастака пладаносная.

І тут з нейкай прачула-абвостранай павагай, з пачуццём светлага вызвалення бачыш Стральцова, яго задумліва-самотную постаць у нашай сённяшняй літаратуры. Ну а што такое «Загадка Багдановіча», стварэнне, бясспрэчна, залатога пяра, як не рана, прыкладзеная да раны? Што гэта, як не Максімаў боль, зразуметы сваім болем? І ці было б гэтае эсэ нашай нацыянальнай класікай, калі б «ядлоўцавы куст» ягонага чалавечага лёсу выдаўся не такі жорстка-калючы, а ягоная паэтава сцежка на нейкім цяжкім віражы прымкнула да дружна-змоўніцкай талакі? Яшчэ адна асаблівасць Стральцова здзіўляе і радуе: пакутлівая вернасць мастацкаму слову, высокамаральнай місіі пісьменніка, вернасць, якая ніколі і ні ў чым ні ў якай меры не трацілася, як бы ні складваўся асабісты лёс. Жыць і пісаць даводзілася ў розным стане душы, розных абставінах, спрыяльных і немагчымых, у стане творчага ўзлёту і ў стане прыгнечанасці, але патрабавальнасць да слова заставалася самай высокай, мастацкія крытэрыі не размываліся. Пісаў рэцэнзіі на кнігі сяброў, але ў ніводнай з іх няма ніводнай ацэнкі, па-сяброўску завышанай. Пісаў пра творы тых, з кім сэрца не дзяліў, але і гэта не ўплывала на аб'ектыўнасць ацэнак. Літаратура заставалася вышэй за асабістае.

Проза, паэзія, крытыка, эсэістыка. Так, талент Стральцова шматгранны.

Каб рэалізаваць сябе ў слове дарэшты, патрэбны не толькі ўмовы, талент, але і сілы. Ну, а калі іх не стае? Пісаць напаўсілы? Маўчаць? Гэта можна. Гэта не амаральна. Але ж Сальеры радуецца, калі маўчыць Моцарт. Можа, дагадзіць Сальеры? Не варта, маючы мужчынскі характар. Ёсць іншае выйсце: пісаць тое, што можна пісаць і не маючы свайго пісьмовага стала, на калене, скажам, тое, на што, магчыма, і сіл хопіць. Вершы? Ну, а калі і на вершы не момант? Тады — эсэ? А яшчэ выйсце — рэцэнзія?..

Жанравы чатырохсценак нагадвае майстэрню Моцарта, у якой душа творцы кідаецца ад сцяны да сцяны, чуючы цень Сальеры.

На падтрымку свайго адчування адкрыем яшчэ раз паэтычны зборнік «Мой свеце ясны»:

І рытмы тыя, ды ўжо лад
Другі. І ў сэрцы холад цупкі...

Першыя радкі верша, пачатак — на разгон думкі і пачуцця. А што ў канцы, у апошняй страфе?

Ды скруха скорыцца журбе,
Душа ізноў рахманай стане,
І твой зласліўец на цябе
У неспакоі раптам гляне!

Верш стрыманы. Годнасць паэта на вышыні. Але ў жыцці ўсё гэта куды больш жорстка і канкрэтна.

Палеміка — не галоўная якасць паэзіі і прозы Стральцова, нават ягонай крытыкі і эсэістыкі. Іх найпершая якасць — лірычнасць. Лірыка акварэльнай прыгажосці. Асабліва — у прозе. Акварэльная пластыка, акварэльная чысціня і празрыстасць, акварэльная адухоўленасць і лёгкасць слова-мазка, слова-вобраза.

Мне ўспамінаецца выдатны беларускі акварэліст Мікалай Лукіч Тарасікаў. Калі мы — Міхась Стральцоў на год пазней, а я на год раней — вучыліся на аддзяленні журналістыкі ўніверсітэта ў Мінску, ён выкладаў нам факультатыў па выяў-

ленчым мастацтве. Гэты таленавіты жывапісец і найдабрэйшы чалавек быў зусім не педагог, студэнты на яго лекцыях рабілі што хацелі, а ён губляўся і чырванеў. І вось аднойчы нехта з нас, студэнтаў, разглядаючы акварэльны партрэт маладой жанчыны, спытаў у выкладчыка: «А скажыце, як гэта так намалявана, што пад сукенкаю відаць жаночае цела, нават яго колер? Сукенка блакітная, мы бачым, што блакітная, але пад ёю бачым ружовае цела. І грудзі... якія грудзі!.. Які колер і тон!..» Тарасікаў разгубіўся і маўчаў, усё мацней чырванеючы. А студэнт не супыняўся, заўважыўшы, як разгубіўся выкладчык: «На чым, скажыце, гэтыя фарбы разведзены? Не на вадзе ж, вядома?..» І тады наш незвычайна сціплы выкладчык рэзка ўскінуў галаву, чырвань умомант схлынула з яго твару, твар збялеў. Ён рашуча рушыў на студэнта і ў самы твар яму выкрыкнуў: «На чым разводзяцца фарбы?.. Вы не ведаеце?.. На слязах, малады чалавек!.. На болі!..»

Амаль што разам з кнігай «Мой свеце ясны» выйшла і яшчэ адна новая кніга Стральцова — «Пячатка майстра», пад вокладкаю якой сабраны літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ апошніх гадоў. Кніга пра пісьменнікаў, якія ў сэрцы аўтара, каго ён аднойчы спаткаў на сваёй дарозе і з імі побач, радуючыся гэтай блізкасці, доўжыў свой шлях служэння нацыянальнай літаратуры. Пра Купалу, Бядулю, Гарэцкага, Чорнага, Хадыку, Мележа, Пысіна, Брыля, Панчанку, Вялюгіна, Зарыцкага, Барадуліна. Пра іншых. Аналітычна, з грунтоўнай літаратуразнаўчай эрудыцыяй, а разам з тым без акадэмічнай мудрагелістасці, разбураючы звыклыя літаратурна-крытычныя штампы, віртуозна спалучаючы навуковы аналіз з публіцыстычным, а дзе і белетрыстычным словам, Стральцоў аргументавана вызначае месца выбраных ім празаікаў і паэтаў у рэчышчы гістарычных нацыянальных традыцый і жывой літаратурнай плыні, у той жа час даючы іх жывыя партрэты. Культура думкі, свой лад і стыль, высокія, без збою, крытэрыі, тонкі, адметна стральцоўскі густ і такт ва ўсім робяць кнігу своеасаблівым самапартрэтам Стральцова — даследчыка і мастака, які, калі пакарыстацца ягоным вызначэннем ролі Максіма Багдановіча,

«творыць і аналізуе, аналізуе і творыць. І пастаянна трымае руку на пульсе літаратурнага працэсу». І тут ужо тое высокае вызначэнне літаратурнай працы, што вынесена ў назву кнігі, хочацца адрасаваць самому аўтару: так, «пячатка майстра» — і ў ягонай руцэ.

А гэта ён усім нам даводзіць ужо шмат гадоў.

За начнымі шыбамі маёй крычаўскай хаты злуе халодны восеньскі вецер, нервова лепіць у шыбы дажджом і размяклым лісцем з яблынь. Я адчыняю старую, яшчэ бацькаву, кніжную шафу і раптам, побач з кніжкамі і бутэлькаю некалі недапітага віна, бачу аркуш паперы з пасевам раўнюткіх радкоў машынапісу:

«...А пакуль проста молішся няўзнак не запарушанай зайздрасцю жыццёвай удачы: памажы нам яшчэ калі-небудзь тут зноў, няхай хоць ва ўспамінах, а найболей памажы нам там, дзе будуць з намі гэтыя ўспаміны і яшчэ, можа, звыш таго. Нешта пакідаю я тут, нешта бяжыць наўперад мяне па дарозе. Тутэйшае, яно ці не хоча, апярэдзіўшы, пазнаць мяне дома і адчыніць вароты».

Вось і яшчэ напамін аб тых, двухгадовай даўнасці, вандроўках па Магілёўшчыне. У тое лета тут, на стале каля шафы, стаяла мая пішучая машынка. Мы з Міхасём тады вярнуліся з Лімені. А вось і пра яе — далей:

«У Мінску пазваню табе, дружа, каб падзячыць за радасць сустрэчы з нечым неад'емна сваім, нашым, што там, у Лімені, цярпліва чакала нас і, дзякаваць богу, не прачакалася. Наталіўшы, яно адпусціла нас, хочацца думаць, з лёгкім сэрцам, але наказала вяртацца сюды, можа, і з цяжарам на душы — па цудадзейныя свае лекі. Няхай будзе бласлаўлёная ўлада ўсяго роднага нам».

Вярнуўшыся з Лімені, мы тады ж вярнуліся і з Сычына. Але... што там, раней, у гэтых нататках я не дагаварыў, апраўдаўшыся шматкроп'ем? Пра страту паэтам вёскі?..

А можа, гэта страта неабходнай чалавеку, кожнаму, тым больш — паэту, упэўненасці? Ад таго, што вёска не так, як жадае душа, ды і яна сама, калі ў яе запытацца, мяняецца? Можа,

адчуванне страты — ад разгубленасці, як перад той забруджанай канаваю, у якой дзіця Галубы не магло пазнаць сваёй любай рачулкі?..

Помню яго пытанне — немаведама да каго:

— Навошта загубілі Галубу?..

І думку цяжкую:

— Ці гэта лад?.. Ці гэта бязладдзе?..

Дык ці не ў гэтай разгубленасці прычына страты і вёскі, і многіх-многіх ненапісаных акварэляў у прозе, якіх мы, чытачы, даўно чакаем ад Міхася Стральцова?

І ўсё ж... няхай...

«Няхай будзе бласлаўлёная ўлада ўсяго роднага нам».

1987

Пейзаж знаёмы

Пісаць пра пісьменніка пры яго жыцці альбо пісаць пасля яго смерці? Здаецца, пытання няма. Пішы пры жыцці, пішы і пасля. Але калі да гэтага пытання дадаць яшчэ адно: пра каго размова? Калі ўдакладніць, што пра Стральцова? Тут крытыкі падзеляцца на тых, хто мог гэта рабіць пры ім, жывым, і на тых, хто пры ім, жывым, рабіць гэта не мог альбо з прычыны той, што не знаходзілася глыбокіх думак і дакладных слоў, альбо перашкаджала рэўнасць, зайздрасць. А яшчэ выплываюць і тыя, каму пісаць цяпер, як ён пакінуў нас і адышоў з зямнога раю ў нябесны, нялёгка, душой і сэрцам цяжка, і тыя, каму якраз цяпер рабіць гэта прыйшлі жаданне, смеласць. Быў ён жывы — быў сам сабе суддзя. Чый суд у літаратуры быў вышэйшы? І вось — яго няма. Цяпер хто суддзі? Вядома — мы, жывыя.

Пісаць пра Стральцова пры ім, жывым, маглі Адамовіч, Бярозкін, Брыль. Майстры пра майстра. Калі гэта адбывалася, для чытача, які адчуваў мастацкае слова і мастацкую праўду, было свята. Як і тым, хто пісаў, пра каго пісалася. Пісалі і Барадулін, і Станюта — сябры. Пісаў і я. З прыемнасцю. Бо шмат што збліжала нас, найперш — абодвум родны край,

Прысожжа чэрыкаўскае ды слаўгарадскае. Пра яго пісаў як для сябе, сваё і сябе адчуваючы праз яго. І тое, што сказаў тады, калі ён быў побач, тое, што ён мае думкі і слоўкі пра яго і наша чытаў, тое, як чытаў, як напісанае ўспрымаў, дае мне сёння не толькі права і жаданне, але і абавязак сказаць яшчэ раз пра яго з нечаканай нагоды, хоць звонку і звычайнай — успамінчык з самых апошніх, свежых, былога сябра.

У літаратуру яны прыйшлі ў адзін час, з адной студэнцкай аўдыторыі і, як піша Барыс Сачанка, былі ў сяброўстве: «Мы, сябры...» Потым працавалі разам, хадзілі адным «сяброўскім гуртам на Камароўскі рынак,» «насілі чайнікамі віно», «свежавалі паўкабанчыка». Цудоўна, адным словам, жылі, бо былі ўжо пры літаратурных ганарарах, выпадала, што і не пры малых. Ну, а далей, пазней? «Яго пачала акружаць новая кампанія». Куды ж дзявалася старая? Старую Стральцоў пакінуў? Усё так: пакінуў, адышоў. І тут, каб зразумець Стральцова, задумаемся: чаму адышоў? На гэта Сачанка хоць не адказвае, але, сам гэта не заўважаючы, шмат што праясняе: «любіў кампанію», «спакойны, задумлівы стаяў...», узяўшы цыгарэтку, «маўчаў, з прыемнасцю зацягваўся дымком і слухаў, пра што казалі або спрачаліся, зрэдку ўстаўляючы сваё кароткае, але важкае, абдуманае слова. Яго больш цікавіла, што ў выніку, якая праўда, ісціна». Так. Стральцоў ужо тады не любіў слоў выпадковых, пустых, шукаў не лжывы шлях да мастацкай праўды, цудоўна разумеючы, як цяжка яго знайсці, не лжывы і не падманлівы, як лёгка ў жыцці хлуслівым самому збіцца на хлусню.

«Мы адарваныя ад сапраўднага жыцця, жывем не так, як трэба жыць», — скажа ён Сачанку, і дарэмна Барыс Іванавіч, згадаўшы яго думку, не надасць ёй значэння, на ёй не запыніцца, над ёй не задумаецца, бо для Стральцова яна і тады, і пазней была не выпадковай, магчыма — карэннай у жыцці літаратурным. Старэйшае пакаленне прынесла ў літаратуру жорсткі вопыт вайны, тым вопытам напоўніла свае творы. А з чым, з якім жыццёвым вопытам прыйшлі шасцідзясятнікі, так званае філалагічнае пакаленне? З ве-

даннем хатняй, у роднай вёсцы, гаспадаркі? З успамінамі маленства? З настальгіяй, часам падобнай на старэчую, па рачулцы ды гаёчку ў роднай вёсцы, па першым каханні? З ведамі жыцця, атрыманымі са школьных ды ўніверсітэцкіх падручнікаў! Не толькі, вядома, але набытага жыццёвага вопыту было замала, каб рэалізаваць сябе ў літаратуры, асабліва ў прозе, як хацелася. І вось, робячы беглае апісанне стральцоўскіх думак і яго «заблытанага» жыцця, Сачанка ставіць тую думку сябра, што жывём «не як трэба», у іранічны падтэкст разам з назваю аповесці «Конь гуляў на волі...», якую Стральцоў нібыта задумаў напісаць і не напісаў, не паспеў, як не паспеў напісаць і шмат што іншае. Зрабіўшы гэты ўвенчаны шматкроп'ем радок назваю сваіх успамінаў, былы сябра дорыць нам, чытачам, і сваё, як бы таму радку лагічны працяг, недвухсэнсоўнае адкрыццё: конь гуляў... і дагуляўся.

Кожны вольны прачытваць творы, іх аўтарскія задумы і асобныя з іх выняткі па-свойму. Ёсць усяму гэтаму сваё прачытанне і ў мяне.

Што такое воля — Стральцоў ведаў з маленства. Хата ў Сычыне, вёсцы, стаяла на самай ускраіне, за ёю пачыналіся луг і лес. Пад вокнамі бегла да лесу Галуба, рачулка, спяшалася ў абдымкі прыгажуна Сажа. Свой хатні кот сядзеў на беразе і лапаю выцягваў з рэчкі то рыбіну, то рака. Зусім блізка жылі бабры. Ранічкаю, на ўзыходзе сонца, яны выплывалі з нораў, мыліся, пялёскаліся ў рэчцы, а Міхась неаднойчы сядзеў на гэтым самым беразе за кусточкам і ўглядаўся ў іх вольнае жыццё. Была і ў двары гаспадарка, тыповая для вёскі, сялянская, з каровай, свіннямі, цяляткамі, курамі ды гусямі. Але маці і бацька былі настаўнікамі, вясковымі інтэлігентамі, і побыт у доме быў чымсьці іншы, як у сялян. Яго вызначалі не толькі гаспадарка, але яшчэ, не ў меншай меры, кніга, сшыткі, размовы і пачуцці ўзвышаныя, якія таксама жыццю давалі свой асаблівы сэнс і лад. Воля воляю, але тут і яна ведала рамкі школьнага, інтэлігентнага выхавання. Міхась гэта з маленства адчуваў не толькі як дзіця вясковай прыроды,

але і як сын строгіх настаўнікаў. Ён быў інтэлігентам у другім, як мы кажам, калене, што шмат у чым вызначала духоўнасць ідэалаў з маленства. І той самы адыход ад некаторых сяброў — ці не адыход маладога інтэлігента ад яшчэ не інтэлігентаў і ўжо не сялян (хай яны даруюць мне гэтую вольнасць думкі), хоць і людзей ужо інтэлектуальнага выбару? Задумацца ёсць над чым, асабліва калі прасачыць далейшы шлях Стральцова, куды і да каго пайшоў, разышоўшыся з некаторымі сябрамі, і ў які бок пайшлі далей яны — што шукалі? А ёсць і гэтакае пытанне: ці быў ён з самага пачатку сваім у той тусоўцы, як мы тады казалі? Аб гэтым у аналітыка ёсць красамоўныя дэталі: «Ён браў у рот цыгарэтку, маўчаў і слухаў, слухаў, пра што казалі альбо спрачаліся суразмоўнікі... Не, ён ніколі не падліваў алею ў агонь. Яго часцей цікавіла ісціна, праўда». Пра гэта прыгадваецца неаднойчы: слухаў, маўчаў, думаў. І тут узнікае яшчэ пытанне: ці не пра тое думаў, куды, у якую тусовачку трапіў?..

Але спачатку: якімі дарогамі пайшлі далей — яны і ён? Ну, разышліся. А далей? Якія каштоўнасці вызначылі яго ды іх выбар?

Жыццё Стральцова да самага апошняга дня было неўладкаваным у сэнсе побыту. Калі-нікалі сябрам, якія яго блізка ведалі, здавалася, што яно пачынае наладжвацца, але раптам ізноў разбуралася. Ён зведаў усё, што мог зведаць чалавек, якому ўсюды не шанцуе: бяздомнасць, холад і голад, страту сям'і і сяброў, працы, якая корміць і поіць, разводы не толькі з жонкамі, але са звычайнымі жыццёвымі ўтульнасцямі. Ён ад усіх нягод ратаваўся ў слове і думцы, у працы розуму і сэрца, але бываў пазбаўлены нават магчымасці пісаць свае цудоўныя апавяданні, эсэ, вершы. І разам з тым яго не назавеш няўдаліцай. Усё, што трэба, каб жыць прыстойна, ён мог займець раней за іншых. Былі розум, талент, абаяльнасць, аўтарытэт. Але ўсё, што іншыя шукалі доўга і ўпарта, чаго дамагаліся, чым даражылі, ён сам з ахвотаю, не зразумелай іншым, губляў лёгка і хутка. Навошта? Гэта ведаў толькі ён. Але пытанне наша, не яго. І які мы знаходзім адказ? Вышукваем у яго фатальнасць,

шчарбінкі ў характары, цынічна смакуем яго ЛТП — такая ахвота ў іншых праведнікаў ад літаратуры штосьці ў яго жыцці паставіць на сваю, толькі ім вядомую палічку. А для яго тых схем не існавала. Ён схемы адкідаў як хлам. І ў творчасці, і ў побыце. Што знаходзіў? Найперш — духоўную свабоду. І на руінах побыту? Так. Быў у гэтым небяспечна высокі кошт? Але гэтакае рэальнае жыццё — яно кошт выстаўляе. Стральцоў зразумеў гэта рана і выбар свой зрабіў даўно. Там і яго адказ на пытанне, якое закранае былы сябар: «Не гэтак мы жывём, як трэба жыць».

Калісьці паэт рэвалюцыі і яе ахвяра сказаў, што лодка паэзіі разбілася аб побыт. Стральцоў свядома разбіў свой побыт аб лодку паэзіі, каб не здарылася адваротнае. Іншага выйсця ў літаратуры не бачыў. Што адбылося б з ім, калі б застаўся ў ранейшым хаўрусе, дзе шанаваўся найперш побыт? Зрабіў бы тыя свае высновы? Гадаць нам цяжка. Але ўсе, хто там застаўся, ягонага выбару не паўтарылі. Там усё было па формуле паэта рэвалюцыі. Паэзія працавала на побыт, была яго служанкаю. Беглі радкі за радкамі, з'яўляліся кнігі за кнігамі, новыя і прыгожыя, каля канвеера стаялі напагатове нанятыя і загадзя аплочаныя рэцэнзенты-алілуйшчыкі, у выдавецтвах і рэдакцыях сядзелі свае выдаўцы і рэдактары, падвышаліся тыражы і ганарары, вярсталіся двухтомнікі, трохтомнікі. І гэта там, у тых тусоўках, з'яўляліся крылатыя ў той час радкі, падобныя на гэты: «Я твой трубач, таварыш камсамол!..»

А ўрэшце: каго жыццё на бераг вынесла і хто пайшоў на дно? Стральцоў сёння на беразе. З намі. Кажуць, што яго апошняе апавяданне «Смаленне вепрука» — лепшае беларускае апавяданне. Гэтак катэгарычна, магчыма, і не трэба. Хіба таго мала, што адно з лепшых нашых апавяданняў? Літаратура не любіць ацэнак катэгарычных, вызначэнняў са слоўкам «самае». Прывабнасць апавядання Стральцова ў непасрэднасці такой звычайнай, простай, без ілжы, рэальнасці, у таямніцы і загадках сціплай прыгажосці, якую мы так часта не заўважаем і якая жорстка разбіваецца аб грубы, халодны, пячорны побыт.

Стральцаў прыгожы быт любіў, любіў яго ўтульнасць і чысціню, любіў прыгожыя рэчы, чыстую вопратку, разумна-прыгожыя твары, разумна-прыгожыя думкі і словы, якія ўзвышалі і літаратуру, і побыт, сам узвышаўся духам, святлеў настроем ад іх прысутнасці ў сваім жыцці. Любіў з добрай кнігай у адной руцэ і цыгарэткаю ў другой сядзець у чыстым пакоі на канапе альбо ў мяккім крэсле, чытаць, спыняючыся на прыгожым слове, і лашчыць на калене вострую мордачку сваёй любімай Ліскі, сабачкі. Усміхаўся ёй і прачытанаму радку. Хоць усмешка ў яго на твары была часцей з гарчынкаю, схаванай у душы глыбока, там, дзе душа разгублена дваіцца. З большай ахвотай усміхаўся Лісцы, нібы малюнку з жывой кнігі маленства на беразе Галубы. Дык вось — быт. Стральцоў яго, утульны, непрымусовы ва ўзаемаадносінах з людзьмі, абставінамі, душою, дэмакратычны, любіў, у ім адпачываў. Але тады ці не занадта жорсткім, як ахвярнасць, выглядае яго пастаяннае разбурэнне свайго побыту? Ці не спрачалася ў душы адно з другім? Не. Тут, як у яго ўсюды і заўсёды ўсё арганічнае, сваё. Гэтакім шляхам ён ратаваў сваю лодку паэзіі і ў ёй — таго самага вепрука. Пайшоў на іншую глыбіню жыцця. Адтуль, з новай глыбіні, падаваў сігналы бяды і ратунку былым сябрам: «Калі душа маўчыць, гібее розум наш...»

Але тыя, яшчэ нядаўна свае, яго не чулі. Душы тлусцелі, пачуцці не адгукаліся, вусны нагаворвалі новыя ды новыя томікі, ішло спаборніцтва — хто выдасць больш, томік не лепшы, а таўсцейшы. Ён зноў папярэджваў: «Але ж.... Але ж смяротныя і мы. Пенсіянерам па Інфарктэнштрасэ пацягнеш за сабою ўсе свае тамы...» Не чулі. Тамы сыходзілі з канвеера адзін за адным — усё было мала. Ён ужо казаў з іроніяй: «Спярша на рукі хукай, пасля ўжо твары...» Яны яму не даравалі гэтага, і ўжо яго кніжачкі не з'яўляліся на свет, выляталі з выдавецкіх планаў, бо тыя сябры былі ўжо пры пасадах ва ўсіх часопісах і выдавецтвах. Толькі аднойчы задумаў сабраць напісанае ў двухтомнік, і ён ужо стаяў у выдавецкім плане, але ў самы апошні момант знік з плана. Тую гісторыю я добра ведаю, бо тады і мой двухтомнік з таго пла-

на вылецеў. Выкідвала адна рука — сяброўская. У выдавецтве «Мастацкая літаратура». Мы са Стральцовым, памятаю, ішлі па праспекце Машэрава і гадалі: хто гэта зрабіў, які мярзотнік? Зайшлі ў выдавецтва: плячыма паціскаюць — не ведаюць. Міхась з горыччу пасміхаўся, мяне супакойваў: «Не бяры да сэрца. Прывыклі жыўца заглытваць». Зайшлі ў парк. Над галовамі крумкала вараннё. Камякамі гразі сядзела, чорнае і тлустае, на кожным старым дрэве: крум-крум-крум...

Дык што знайшоў Стральцоў у сваім нялёгкім, з цёрну, вянку? Духоўную свабоду і ў ёй — вепручка? А што яшчэ? Мала пісаў? Так, на жаль, мала. Але на гэтае «мала» як паглядзець. Адзін погляд у бухгалтара, другі — у мастака. Ды і што гэта — працяглае маўчанне ў літаратуры? Дабро ці зло? А можа вялікае мастацтва? Хіба няма часам адчування, што гэтае мастацтва шмат хто дарэмна ігнаруе? Хіба Стральцоў не папярэджваў: «Але ж, бывае, слова — срэбра, маўчанне — золата, браток!» У гэтым былыя сябры яго не разумелі. Для іх маўчанне было вялікай стратай: кніг, ганарараў, смяхотнай, для іх — патрэбнай, гульні ў сваю значнасць. Для яго — аховаю сваёй творчай свабоды і маралі, свайго адметнага слова. Маўчаў, казалі, ад страты, згубы сябе і слова? Але ж тады, калі парушаў сваё маўчанне і пра сябе нагадваў хоць вершыкам, хоць эсэ, хоць мімалётнай фразай, кожны раз сведчыў, што вышыні палёту не губляў, ніколі і ні ў чым не апускаўся да слова недакладнага, бясколернага, выпадковага. Хіба не тады бывае гэтак у паэта ці празаіка, калі маўчанне — праца сэрца і розуму, напружаная і натхнёная?

Ну а тыя, хто маўчаць не хацеў альбо не ўмеў? Пісалі што і як? Рознае і па-рознаму, але і тое было бачна, што лепшае з напісанага належала да часоў Камароўкі і малдаваніна з чайнікам. Адзін з іх у той час пісаў добры раман і неблагія апавяданні, пазней — раман за раманам, і ўсё слабейшыя, каціўся пад адхон. Другі пачаў з цікавых апавяданняў, шмат абяцаў, але далей пайшлі надуманыя аповесці, слабы раман, прахадныя апавяданні — ужо не адчувалася рэальнага жыцця. Вядома, жыццё — і камерсант татальны: хочаш бязбедна

жыць, мець утульны побыт, шмат мець і мала аддаваць — плаці згодна рахункам. А рахункі пры сацыялізме не рыначныя, больш жорсткія — дзяржаўныя, плаціць па кожным трэба сваёй свабодаю, сумленнем. За міласці ўлады, за радасці наменклатурныя. За ўсё.

Вось — два рэчышчы нашай літаратуры. Не ў апошні час яны ўзніклі. Былі і будуць. Але ў кожнага ёсць выбар, якім плыць рэчышчам. І ўсяму ёсць мера. Павінна ўсяму быць мера.

Вось — «Конь гуляў на волі...» Не той, што мог адбыцца ў Стральцова, а той, што адбыўся ў яго былога сябра. Вось радок пра гуманітарнае ахвяраванне — як гэта мы не ведалі раней? «Я пазычаў яму грошы. І раз, і два...» Далей — сцвярджэнне: «Ён з цяжкасцю вяртаўся да ранейшага пісьменніцкага жыцця. Спрабаваў зноў уладкавацца на працу, але рэдактары, ведаючы Міхася, пыталіся, «ці не сарвецца» зноў. Гэта яго зневажала, злаваў. І замыкаўся ў сабе. Цяпер, сустракаючыся, рэдка што-небудзь казаў, рэдка што-небудзь пытаўся. Яго пачала акружаць новая кампанія. Ён захапіўся перакладамі, паэзіяй. Амаль перастаў піць». Далей — дзяжурныя словы пра тое, што «мы, яго сябры», што ён ужо перад смерцю «выходзіў на светлую і ясную дарогу».

Таксама — стыль. Чытай і думай, як гэта зразумець, ранейшае і гэта, як з усім гэтым, Стральцова ведаючы, пагадзіцца. Што пазычаў грошы — дробязь жыцця. Хто паспрыяе пісьменніку чырвонцам, як не пісьменнік грашавіты? Гэтакае наша жыццё: то самі пазычаем, то пазычаем іншым, то вяртаем пазычанае, то забываем вярнуць. Але далей? Хадзіў па рэдактарах, шукаў працу? Ці не блытае тут былы сябра Стральцова з кімсьці іншым?

У апошнія гады Стральцоў працаваў у рэдакцыі часопіса «Нёман», туды, на пасаду загадчыка аддзела літаратурнай крытыкі і мастацтва, яго запрасіў сам галоўны рэдактар Анатоль Кудравец, залічыў на пасаду без усялякіх пытанняў, сарвецца альбо не сарвецца. У рэдакцыі яго прыходу ўсе былі радыя, ён працаваў у аддзеле разам з Алай Іванаўнай Сямёнавай, яны выдатна разумелі адно аднаго і публікацыі па аддзеле ішлі

цікавыя. Ніхто ані словам яго там не «абражаў», ён працаваў спакойна і не «злаваў» ні на каго.

«Замыкаўся ў сабе»? Ах, хто з нас не замыкаецца, калі працуе думка? Быў нешматслоўны па характары з маленства, і гэта зусім не тая замкнёнасць, што ад нейкай драмы. «Цяпер, сустракаючыся, ён рэдка калі што-небудзь гаварыў, рэдка што-небудзь пытаўся...» Дык і што з таго? Мабыць, не меў у тым патрэбы? Ён ніколі славесны бісер не раскідваў, ведаў, з кім і пра што гаварыць, калі маўчаў, то думка працавала, і гаварыў найбольш ахвотна з сабою. «Яго пачала акружаць новая кампанія»? Ох, гэтая маніякальная прыхільнасць да кампаній. Але з таго часу, калі Стральцоў пакінуў тую, што пасвілася на Камароўцы з чайнікам ля малдаваніна, кампанію, ён ужо бачыў у ёй, любой, хаўрус, бо кампаніі па маладосці ды творчасці лёгка ператвараліся ў хаўрусы па камерцыі, выгадзе ў асяроддзі хапуна і варажнечы. У хаўрусы збіваліся і пісьменнікі, каб лягчэй праз хаўрусныя сувязі пражыць, а Стральцоў быў чалавек самадастатковы, на сяброў не разлічваў, усяго, тым больш у літаратуры, дасягаў сам. У яго былі проста блізкія людзі, сябры, блізкія па духу, маральна. І я ў тыя гады з ім сябраваў. У нашым сяброўстве бывалі хвалюючыя старонкі.

Памятаю халодную восеньскую ноч на чыгуначным вакзале ў Мінску. Была чацвёртая гадзіна ночы. Імжыў вераснёвы дождж. Мы з Лідай, жонкай, выйшлі на перон. Яна праводзіла мяне на цягнік. Я ехаў у Парыж на канферэнцыю ЮНЕСКА, на два з лішкам месяцы. Раптам з цемені з'явіўся Стральцоў. Божа мой: у глыбокую ноч, у халодны дождж. Падышоў, усміхаецца: «Ну, старычок, не мог я, разумееш, не правесці цябе». Кажу: «Мы ж з табою развіталіся». Усміхаючыся, дастае цыгарэтку, закурвае. Ужо ў вагоне, утульным — для дыпламатаў, пхае мне штосьці ў кішэню. «Там, — кажа, — у Парыжы паглядзіш». На вакзале ў Парыжы я дастаў з кішэні яго пакуначак: папера, у ёй — кавалачак чырвонай калійнай солі, скол пароды. На паперцы — радкі: «Хай гэты драбочак скамянела-салёнага поту нашай беларускай зямелькі будзе табе ў Парыжы салодкім напамінкам усяго роднага. Люблю Парыж. Міх. Стральцоў».

Гэты драбочак ляжаў у мяне ў атэлі на стале. Гледзячы на яго, я ўспамінаў Міхасёву «Згадку пра Поўнач» і ў ёй радкі: «Я сядзеў і чытаў пра Парыж далёкіх дваццатых гадоў, пра маленькія кафэ, булачныя, пра брукаваную старую вулачку Нотр-Дам-дэ-Шон, на якой быў дом нумар 113, а ў тым доме...» Далей — пра тое, як Парыж любіў Хэмінгуэй. Чытаючы, я адчуваў, як і Стральцоў любіў Парыж праз таго ж, магчыма, Хэмінгуэя, або праз Бальзака, Гюго, Мапасана, Ван-Гога, Рэнуара, або праз перапіску Тургенева з Палінай Віардо. Ніколі не быўшы ў Парыжы, ён любіў свой Парыж, створаны ўяўленнем, і праз драбочак роднай нам абодвум зямлі, начным развітаннем у Мінску на вакзале, хацеў зноў далучыцца да хвалюючай яго тэмы Парыжа. Там, у Парыжы, я ў тую восень пісаў эсэ пра Аляксея Пысіна, якога мы з Міхасём любілі і як паэта, і як чалавека, нашага з ім земляка, і драбочак роднай зямлі, пакладзенай сябрам мне ў кішэню, падказаў увесці ў эсэ Парыж. Цяпер мне здаецца, што тое маё жаданне Стральцоў прадбачыў.

На гэтай ноце мне б і закончыць свой роздум. Але не магу не вярнуцца яшчэ раз да апошняй, напэўна галоўнай думкі нашага мемуарыста: «З цяжкасцю ён вяртаўся да ранейшага пісьменніцкага жыцця». І крыху далей: «Ён якраз выбаўляўся з блытаных сцежак жыцця, зноў выходзіў на светлую і ясную дарогу...»

Няма патрэбы казаць яшчэ раз, якую дарогу ў літаратуры Барыс Іванавіч лічыць светлай і яснай. Тут усё зразумела. Ёсць патрэба сказаць і падкрэсліць: якая гэта злая няпраўда!

Стральцоў заўсёды актыўна жыў літаратурай, яго галоўнай дарогай заўсёды была дарога Празаіка і Паэта. Так, з вялікай літары. Таму што мала хто ў наш час свядома валодаў такой незалежнасцю, цяжкой, але непахіснай, унутранай, па сэрцы і думцы, свабодай творчасці. Якую ж яшчэ «светлую і ясную» мог знайсці Стральцоў? Тую, з якой сышоў маладым, дзе ёсць усё, акрамя свабодай народжанага слова? Калі гэтая «светлая і ясная дарога» ўсяго толькі стэрэатып мыслення, велікадумна прапанаваны, як той чырвонец, тады бяда невялікая: сказанае забудзецца. Але калі гэта глыбокае перакананне, тады лішнім не

будзе падкрэсліць яшчэ раз: «блытаных сцежак» у Стральцова не было. Яго хада ў літаратуры заўсёды была прынцыповай і яснай, высакароднай і сумленнай, калі літаратуру не разумець як нейкі яе сурагат, а пошукі мастацкага слова і вобраза лічыць працай нялёгкай, рызыкай натуральнай, непазбежнай. Гэтай дарогаю ён ішоў непахісна і мужна.

Проста ў яго была заўсёды свая дарога. А гэта — шчаслівы лёс. Хоць і цяжкі.

Вядома, натоўпам гэтакай дарогай не ходзяць. Але няўжо яе так цяжка зразумець вопытнаму пісьменніку? Ці, можа, няма жадання гэта прызнаць за ісціну?

Зноў, не ў свой час, адліга, якая для самапачування горшая за мароз. Возера не першы раз за зіму вызвалілася ад лёду, зноў плаваюць качкі, якіх мы з Алёнкай, унучкай, падкормліваем.

На чорных вільготных дрэвах крычыць вараннё. Я пакідаю возера, каб не чуць брыдоту. Але ад чарады, што расселася і валтузіцца на дрэвах, нейкі адзін воран ляціць за мною. Я іду ад яго ў глыбіню парку, а ён пералятае з дрэва на дрэва і ўсё крумкае нада мною, цяжка і злосна, да хрыпаты. Чорны дзень прарочыць? Я іду хутчэй, пятляю сцежкамі, а ён мяне ўсё не адпускае. З-за таго крумкання зусім хачу пакінуць парк і выходжу на алею, што вядзе ў бок праспекта Машэрава, але і воран ужо на алеі. Нарэшце замоўк. І раптам як крумкне, ледзь не ў самае вуха, праляцеўшы нізка міма мяне, з нейкай пячорнаю хрыпатою: я здрыгануўся, спыніўся. Быццам з мае галавы сарваўшыся, ён ляціць над алеяй у той бок, куды іду я. Э-э, думаю, у пачвары вышэйшы пілатаж, пікіруе, нібы ў голаў хоча дзюбай дзеўбануць. Маёй крыві захацеў? Бачу: назад, мне насустрач, вяртаецца. Схапіў я камень, замахнуўся, а ён, ведаючы, што каменем у яго не пацэлю, зноў пікіруе і зноў як крумкне.

Я выйшаў на праспект, звярнуў, гуляю паўз бераг Свіслачы. Крумкач з галавы не выходзіць. І думкі... пра смерць.

Пісьменнік заўсёды павінен думаць пра смерць. Шэдэўры літаратуры часцей ствараюцца з вострым адчуваннем блізкай смерці.

Адчуванне смерці робіць пісьменніка дэмакратычным, роўным з усімі смяротнымі. Яно дае выйсце ў самыя патаемныя глыбіні людскога жыцця.

Адчуванне смерці пазбаўляе пісьменніка спакусаў разбэшчанага жыцця і ўлады. Яно прымушае быць вышэйшым за атлусцелы натоўп.

Адчуванне смерці робіць пісьменніка філосафам непадманнага рэалізму, праўды жыцця.

Адчуванне смерці прымушае пакідаць тусоўку, не баяцца адзіноты, жыцця самадастатковага, каварстваў тусоўкі і свайго вяртання ў прыроду яе арганічнай часткай, пясчынкай неабдымнага і магутнага цела.

Адчуванне смерці вядзе пісьменніка да Бога, але не дзеля ратунку ад смерці, дзеля служэння свайму першавытоку ў жыцці і ў смерці.

Цяжка жыць з пастаянным адчуваннем смерці. Але цяжка толькі ў той меры, у якой цяжка быць сапраўдным пісьменнікам. Вянок з цёрну — самы варты яго вянец.

Гэтак жыў Максім Гарэцкі, якога любіў Стральцоў. Гэтак і сказаў:

«Слава жыццю!

Слава і смерці!»

У смерці наша вечнасць. А жыццё — толькі для таго, каб зразумець гэтую жорсткую ісціну і, яе зразумеўшы, у кожным сваім дні бачыць найдаражэйшы дар Божы.

1993

«Мой голас у веку наступным пачуецца»

Міхась Стральцоў у родных бярозках на родным бальшаку пад Сычынам — светлы акорд нашага з ім лета 1985 года.

Тады, пакінуўшы на беразе Сажа пад Чэрыкавам маю Лімень, мы ехалі ў ягоны Сычын. Калі пад'язджалі да вёскі, ён папрасіў спыніць машыну. Выйшлі з яе каля бяроз. Ён стаяў, усміхаючыся, абхапіўшы іх, як сястрычак, за бялюткія ў сонечнай чысціні ствалы, светлы і сам у белай сарочцы пад галь-

штукам, сонечны, і я проста не мог не схапіцца за фотаапарат. Цяпер гляджу на фатаздымак і бачу тую дарогу ў Сычын, тыя бярозы, той ясны летні дзень, нічым як быццам не азмрочаны, але яшчэ, зусім нечакана, шукшынскага Ягора Пракудзіна, як ён абдымае родныя бярозкі перад смерцю, яе блізкасці не прадчуваючы. Навошта як быццам мне тут той Ягор? Я ведаю навошта, бо з болем адчуваю лёсавы і псіхалагічны збег шукшынскага кінакадра з фатаздымкам. Ну, вядома, пачуцці Стральцова на здымку, у той наш дзень, былі свае, у іх не было кіношнай лірыкі і драмы, была ціхая, вельмі сціплая, да вусцішнасці непаказная засяроджанасць на шчымліва сваім, размова з родным, вышэй — з радзімай, без слоў, душой і сэрцам, са слязой, якую я неаднойчы бачыў у ягоным воку. Блізкай бяды мы тады не адчувалі. Ён перайшоў на другі бок дарогі — зноў я шчоўкнуў фотаапаратам, зноў ля бяроз, ужо іншых, здзіўлены тым, што Міхась і тут ззяў той самай радасцю. Звычайна яго ўсмешка была нядоўгая, яе заўсёды пільнавала драбінка горычы, падсцерагаў цень смутку — таму, магчыма, што пастаянна пра штосьці думаў, а ў думках усяго хапала, святла і змроку.

За дарогаю, за бярозамі, даспявала жыта, за ім прыдарожным спалавелым шнурам стаялі зялёныя кусты алешніку, далей быў лог, за логам уроскід — сычынскія хаты, хлявы, платы.

Той дзень, тую дарогу ў Сычын, тыя бярозы, жыта я ўжо ўспамінаў у першым сваім эсэ пра Стральцова. Вось — зноў. Бо кожны ўспамін выводзіць на нейкія яшчэ малюнкі, дэталі, глыбіні роздуму. І ўсё з гадамі, кожная драбніца, падаецца значным.

Міхась зайшоў у жыта і, цярэбячы ў руках каласок, задумліва глядзеў на вёску, можа — і на сваю хату, потым павярнуўся тварам да мяне, і гэта ўжо быў іншы твар — пагасла-шэры, змрочны, быццам там, за жытам, дзе шукаў сваё, знайшоў чужое. Альбо, заўважыўшы сваю страху, злавіў і нейкі ўспамін пад ёю? Ці нашы ўспаміны роднага заўсёды светлыя? Гэта было так звыкла для яго: з жыццёвае кудзелі высмыкваць нітку ўспаміну. Хіба не з гэтае, з-пад роднае страхі, кудзелі і радкі: «...ён бачыў

сябе жаўтлява-светлай саломінкай, вытыркнутай са страхі, — яна трымцела, грала, смуткавала і гарэзіла разам з ветрам; вецер шкуматаў яе, але ўсё адно любіў, і яна любіла яго, і баялася, і не баялася ягонай моцы».

Калі аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь» была надрукаваная ў часопісе «Маладосць», і мы, сябры, чыталі з захапленнем, не проста зразумеўшы, але адразу палюбіўшы Іванку, ягонымі вачыма і ягоным сэрцайкам бачачы і перажываючы сваё, кожны сваё, ваеннае ды пасляваеннае маленства, тады ўсе ўбачылі ў Іванку самога Міхася, а наша да яго прыхільнасць і любоў прыраслі яшчэ і любоўю да Іванкі. І нават тая жаўтлява-светлая саломінка, вытыркнутая са страхі на вецер, каб ён яе шкуматаў то гарэзліва, то балюча, здавалася ў маіх вачах і сэрцы вобразам самога Стральцова.

Так, ён да скону быў той саломінкаю на вятрах, яшчэ адтуль, ад бацькавай ды матчынай страхі, вятры яго не шкадавалі, а ён ад іх і не хаваўся, бо ведаў, што гэта лёс мастака-беларуса — заўсёды быць на сваіх, хоць і на могілках, вятрах.

У вёску мы прыехалі, калі ўжо добра шарэла. Пачынаў імжыць дробны, нейкі восеньскі, грыбны дождж. Пад'ехалі да хаты. Міхась звякнуў на варотцах клямкаю, праз двор адразу падаўся ў хату. Я затрымаўся каля машыны. Неўзабаве Міхась выйшаў з хаты разам з маці Марыяй Міхайлаўнай. Яна сказала, што бацька ў лесе, з суседам рыхтуе на зіму дровы, паказала, у якім лесе, як туды праехаць, і мы пакацілі шукаць дрывасекаў.

Пілу пачулі, як толькі заехалі ў лес. Лявон Клімавіч і маладзейшы мужчына крыжавалі бярозу. Заглушылі пілу, пагаманілі — сцямнела. Трэба было дарэзаць дзеравіну, але піла ўжо на заводзілася. Вяртацца ў вёску? Мне якраз прыглянуўся вялізны кап на жывой бярэзіне, з'явілася ахвота яго ўзяць, і Лявон Клімавіч пачаў настройваць пілу. Залілі ў яе бензін, паставілі новую свячу — завялася. Звалілі дрэва ўжо як было цёмна, выразалі кап, уклалі ў багажнік машыны, пакрыжавалі і тую бярозу. Дождж імжыў, мы змоклі, ужо я дакараў сябе, навошта спатрэбіўся той кап, але пасля, як вярнуўся дадому ды агледзеў у дзівоснай бярозавай нарасці абрысы ды фор-

мы бабра, як вылушчыў формы з непатрэбнае закарэласці, не выгаблёўваючы, абшкроб наждаком, пацягнуў лакам, дык і зарадаваўся: ну якраз бабёр, пра якога ў той сычынскі дзень казаў Міхась, — як жыў звярок у Галубе, рачулцы Міхасёвага маленства, пад самай хатай, як Міхась хлапчуком падпільноўваў яго, за ім сачыў, і як той, яго заўважаючы, да сябе не падпускаў блізка, заўсёды паспяваў даць нырца з берага ў рэчку.

Галубы тым летам ужо не было — звялі меліяратары. Але яна, жывая і паўнаводная, засталася ў памяці, і да апошніх дзён з яе, жывой, выплывалі думкі ды вобразы, радасць і смутак паэта:

Прысніўся, верш — не верш, а два радкі:
Абломак лодкі ўсплыў са дна ракі,
І кружыць вір счарнелую траву.
З абломкам лодкі к берагу плыву.
Прачнуўся... Дзень трывогаю прапах,
І два радкі гаркотай на губах.

Ад рэчкі маленства на той час заставаліся канава, зялёная лагчына паміж пажоўкла-бурых берагоў, грудок лам'я на былым дне ды ламіны, можа, ад былой лодкі, на былым беразе. Гаркоту страты паэт адчуваў усё жыццё.

За вячэраю ў Сычыне мы не заседзеліся. Я ведаў, што Міхась шмат гадоў не быў у вёсцы, у роднай хаце, даўно не бачыўся з бацькам і маці, ды і заехалі на адну ноч, каб ужо назаўтра раніцай развітацца, і я пакінуў Міхася з бацькамі. Загнаў машыну ў двор, раскінуў у ёй спальны мех і ўлёгся.

Распагодзілася, узышоў месік, выбліснулі ў высокім небе зоркі, ноч настроілася ціхая, светлая. Доўга свяціліся вокны ў хаце, і так да душы было ляжаць з адчуваннем, што свет ва ўсе бакі адкрыты насцеж, што ляжыш паміж агнёў у вокнах і агнёў у небе, са свайго зацішку ды прыцемку бачыш шырозны абсяг і ў ім — вёску Стральцова, матэрыяльную і духоўную планету яго вачэй, яго душы, яго памяці, яго паэзіі і прозы.

Запомнілася і раніца. Прачнуўся я ад гоману гусей. Вялізныя белыя птахі сабраліся ў чараду пасярод двара і, павыцягваўшы

ў мой бок доўгія шыі, хутчэй абурана, як мірна-згодна, гагакалі і шыпелі, абмяркоўваючы напэўна маю нечаканую прысутнасць на іх двары. Я вылез з машыны. Тут і Міхась на ганак выйшаў:

— З кім гамоніш?

Паперадзе чарады стаяў самы вялізны, смелы і дзіўна белы, чысты, аж ззяў, гусак, пагагакаў басам, грамчэй за ўсіх астатніх, выкаціўшы шырокія грудзі, надзьмуўшы таўстую шыю.

— Ды вось, — кажу, — паслухай і ты Шаляпіна.

Міхась рагатаў, аж цыгарэтка вывалілася з рукі пад ногі.

— Ну, так, Шаляпін. Бацькаў любімы бас.

Паснедаўшы, загаварылі пра ад'езд. Прыйшоў сусед, з якім Лявон Клімавіч збіраўся зноў ісці ў лес да сваіх дроў. Усе выйшлі ў двор і тут яшчэ раз сфатаграфаваліся, як кажуць, на памяць. Лявон Клімавіч прысеў на ганку з сякерай на плячы, з ім побач — сусед, Марыя Міхайлаўна — побач з сынам ля плота, на якім сохлі гарлачы, слоікі, вёдры. Сумна было развітвацца маці ды бацьку з сынам, як сыну з маці і бацькам, з роднаю хатай, прадчуваючы, што гэта — апошняя сустрэча, аб чым Міхась сказаў мне па дарозе: прызнаўся ў змрочных прадчуваннях. Праз два гады я гэта ўспомніў і жахнуўся — як чула яго сэрца!

Сэрца Стральцова: два пачуцці — пачатку і канца — вельмі моцныя, абвостраныя, што асабліва выявілася ў мастацкай прозе, найвыразней у творах, якія Алесь Адамовіч назваў хрэстаматыйнымі не толькі ў часе, калі напісаныя, але і для стагоддзя наступнага: «На чацвёртым годзе вайны», «Адзін лапаць, адзін чунь», «Смаленне вепрука». Эмацыянальная памяць маленства ў іх выключная. Здзіўляе багацце найтанчэйшых нюансаў у пачуццях хлапчука, хоць і Іванкі, іх глыбіня, дакладнасць, натуральнасць выхадаў да высокіх адчуванняў дабра і зла, жыцця і смерці, зямнога і нябеснага. Адкуль яны ў малога? Ад мудрасці самой прыроды, інтуіцыі, не прыбітай хлуснёю, — ёй Стральцоў давярае ва ўсім і таму пастаянна думае пра сябе — малога, настойліва шукае з ім сустрэчы і размовы.

Хачу я з тым, з маленства, хлапчуком,
Свае гады ў дарозе пераняўшы,
Спаткацца.
. . . . . .
Сагрэцца б толькі ім.

Жаданне не аднаго імгнення, не аднаго верша. Гэты матыў скразны праз усю творчасць. Ён моцна гучыць і ў аповесці. «Ты пазнаеш мяне?» — спытаў чалавек ў Іванкі, трымаючы шапку ў руцэ і трохі павярнуўшы ўбок галаву, як бы прыслухоўваючыся да нечага. «Дзядзечка, я не ведаю вас», — ледзь не заплакаў Іванка. «Не трэба мне гаварыць — дзядзечка, — сказаў чалавек. — Я — гэта ты, Іванка. Толькі я дарослы, а ты малы».

Сон? Так, сасніў Іванка. Але гэтаму сну пісьменнік надае вялікі, не толькі для сябе, сэнс, адвёўшы яму не адну старонку надзвычай лаканічнай прозы. Святою чысцінёй Іванкі, шырэй — маленства, ён правярае і судзіць усё і ўсіх, сябе і тое, што напісаў, кожнае сваё слова. Ці шмат хто вытрымае гэтакі суд? Стральцоў вытрымлівае. «Ні ў чым, ні ў чым ён тут не вінаваты», — высакародна ўзвышае свайго суддзю і з палёгкаю, з поўным на гэта правам прызнаецца: «І я яму ніколечкі не вінен». Ці шмат хто гэтак яшчэ скажа?

Па дарозе з Сычына, не даехаўшы да Чэрыкава, мы спыніліся на скрыжаванні асфальтоўкі з лесавой, пясчанай, накатанай лесавозамі дарогай. Налева яна, лесавая, вяла ў Лімень, адкуль выязджалі ў Сычын, але цяпер звярнулі направа і неўзабаве пад'ехалі да брамы. Я выйшаў з машыны, адчыніў браму. За ёю ўзвышаліся старыя яліны, пад імі, на узгорку, стаяў дамок, за дамком праз алешнік блішчэў крынічна чысты ручай, стаяў стажок сена. У агароджы, якая замыкала гектараў дзесяць рознапароднага, пераважна лісцвянага, лесу, жылі алені, а хатка была прытулкам вальерных егераў, хоць называлася дамком паляўнічых. Мне гэта быў свой дамок, тут я жыў, бывала, што і падоўгу, тут пісаў «Пушчу» ды і не толькі гэты раман, адсюль выязджаў з егерамі паляваць кабаноў, ваўкоў, сюды вяртаўся з палявання, а Міхасю хатка была навіною.

Цяпер у хатцы нікога не аказалася, але ключ ад замка ляжаў у вядомай мне шчыліне, і мы яе адчынілі. Сцежкай спусціліся да рачулкі, абышлі кармушкі для аленяў, стажкі, хлявы, вярнуліся, селі за вялізны, на добрую каманду паляўнічых стол пад ялінамі. Міхасю спадабаліся і стол, і над ім яліны. Я прынёс вядро халоднай, з крыніцы, вады, пілі ваду, а тут і егер — Пятрок Ерафееў. З хаткі ён вынес каструлю са смажанай дзічынкаю, паўпляшкі сівухі. Сказаў, што быў на возеры, узяў качку, ужо не худая, не сорамна гасцей пачаставаць.

Міхась ад сівухі адмовіўся, разлілі на двух з Петраком. Калі з размовы ён дазнаўся, хто перад ім са мною побач, падняў каструлю са смажанкаю, выхапіў з-пад яе кніжку, на якой каструля стаяла, паклаў на стол перад Міхасём. Кніга аказалася Міхасёва, апавяданні ў перакладзе на рускую мову, — «Двое в лесу».

Міхась глянуў на мяне, я на яго. Крыху я разгубіўся, баючыся, што гэтакім прызначэннем кнігі, замест падстаўкі пад гарачую каструлю, Міхась будзе абураны, але ён спакойна ўзяў кнігу ў рукі, адгарнуў вокладку, за ёю знайшоў і асцярожна паклаў сабе на далонь шыгалінку, старонку адгарнуў, другую, знайшоў паміж старонак бярозавую галінку, з засохлымі пупышкамі, пагартаў кнігу далей, усміхнуўся засохлым у ёй камарыкам і крылцам матылька, знайшоў яшчэ кветачкі, лісцінкі, усё гэтае багацце пакінуўшы паміж старонак, склаў кнігу, перавярнуў яе ўверх апошняй вокладкай, падзівіўся на сляды тлушчу ад каструлі, меншыя — ад конавак, шклянак ды кубкаў, чырвоных — ад віна. І тут ужо я здзівіўся яшчэ раз і абрадаваўся: сябра быў у захапленні — выплеснула з усіх берагоў:

— Ну, Пятрок Кірылавіч, ну, дзякуй вам за гэтыя лясныя аўтографы. Ну, дагадзілі вы мне! Ну, парадавалі! Яшчэ я ні ў кога не бачыў гэтакіх аўтографаў. Га, у каго яшчэ? Ну, хто пахваліцца?

Міхась кідаў позіркі то на мяне, то на егера, і па яго вачах я бачыў, што кажа ён шчыра, але Пятрок пачаў апраўдвацца:

— Ты паглядзі на першую вокладку, чыстая? Адна толькі пячатка ад віна, пляшка стаяла. А што ад скавародаў, чыгуноў,

дык яны ўсе на апошняй вокладцы, дзе твайго — ні слова. Сам ведаеш, як гэта бывае, калі голай рукою выхапіш з агню пасудзіну. Сунеш пад яе што пад рукою, а пад рукою ў нас што? Твая кніга. Лесечка, абласны доктар, тут паляваў і чытаў, на ноч клаў пад падушку. Як ад'язджаў, нам пакінуў: чытайце.

Стральцоў стаміўся рагатаць — хіхікаў:

— Ну, кніжачка, ну кабета! Пабыла і пад чыгунамі, і пад патэльнямі, пад пляшачкамі. Нават пад доктарам!..

Жарт егеру спадабаўся:

— А хочаш, я раскажу пра генеральшу? Не, не анекдот, чыстая праўда. Быў генерал у нас, стары, паляваў лася, ліцэнзія была, а генеральша ў яго маладая. І хлопцы тады тут начавалі, егеры...

З маіх тутэйшых, на Ліменшчыне, лесавых сяброў Міхась найбольшую цікавасць меў да Петрака і Ягора Захаравіча Лісікава. Яны абодва людзі бывалыя, лясную акадэмію прайшлі ў лесе, у народзе, як кажуць, «ад» і «да», Пятрок з маленства ляснік і паляўнічы, а Ягор ляснік і рыбак. Ад прыроды і філосафы, натуральныя. Пятрок — яшчэ і ад вайны, на якой прайшоў праз Майданак, Дахаў, за што немцы, ужо новыя, мірныя, з ім да гэтага часу разлічваюцца і маркамі, і падарункамі. А Ягор пражыў сто чатыры гады, філосаф ад часоў рэвалюцыі.

Я знаходжу ў сваім архіве касету, стаўлю ў магнітафон, слухаю галасы дзеда Ягора, Стральцова, ліменскага ляснічага Карпенкі, таксама сябра-нябогі. Запіс зроблены ў Мірагошчы, ад Лімені — цераз Сож: Лімень з-за ракі глядзіць на Мірагошч, Мірагошч — на Лімень. Там, у Мірагошчы — дарэчы, Стральцову вельмі спадабалася назва вёскі, усё вышэптваў яе сабе ды ўсміхаўся, націскаючы то на «міра», то на «гошч», — жыў Ягор, тут, у Лімені, Пятрок. Запіс зроблены ў Мірагошчы, у Ягоравай хаце. Стары «баіць байкі», а Міхась зрэдку аздабляе іх вершыкам, часцей — рогатам. Вось стары кажа:

«Дзела было за рэвалюцыяй, і я, значыцца, як малады, шукаў выйсце насіць хромавыя боты, каб са скрыпам. Прыйшоў да новай уласці і кажу: хачу абезаружваць кулакоў, як ворагаў беднага пралетарыя і мужыка. У мяне пытаюцца: якім пуцём?

А такім, кажу, вельмі простым. Кулака сцеражэ сабака, а я буду яго абессабачваць. Уласць бачыць, што галава мая шурупіць — дала паперку, дакумент, што я маю на гэта дазвол рэвалюцыі, з пячаткаю, і пачаў я вайну супраць кулацкіх сабак».

Стральцоў рагоча, а Васільевіч, ляснічы, на поўным сур'ёзе вядзе допыт:

«Тут ты, Ягор, як той дзед Шчукар...»

Старому гэтакі недавер да яго не падабаецца:

«Я ў партыю не падаваў, і Шчукар мне не таварыш».

Пра шолахаўскага Шчукара нашы леснікі чыталі, ведалі, калі хто не чытаў, дык чуў. Чуў і дзед Ягор.

«І ты страляў кулацкіх сабак?» — дапытваўся ляснічы.

«Ну, так...»

«А не хлусі. Душа ў цябе мяккая, добрая, з гэтакай душою страляць сабак ты не мог».

Ляснічы быў мудрэц, псіхолаг, зманіць перад ім было цяжка, кожнага ў лесе, у вёсцы бачыў навылёт, леснікі гэта ведалі, ведаў гэта і дзед Ягор, таму і пачаў раптам даваць задні ход:

«Дык я... дык я сабак сам не страляў, у мяне былі сябры, у іх былі ружжы, яны мяне за тое паважалі, што я быў рукавадзіцель, і яны стралялі...»

«А ты сабак лупіў?» — працягваў допыт ляснічы.

«Н-не, не лупіў...»

«Вырабляў скуры?»

«Н-не, не вырабляў, — губляўся стары. — У мяне быў друг яўрэй...»

«Ну, ты, Ягор Захаравіч, заліваеш. Сабак не страляў і не лупіў, скуры не вырабляў, а боты хромавыя насіў ды яшчэ са скрыпам?»

Ужо Стральцоў не можа стрымаць рогат, а дзед Ягор не можа стрываць, каб яму не верылі, аж з-за стала ўсхапіўся, даказваючы: «Дык я ж меў працэнт як рукавадзіцель!.. Што такое рэвалюцыя, таварыш ляснічы?.. Я яе зразумеў — гэта ўмець рукавадзіць!..» Тут у старога, ад празмернага жадання даказаць, горла перацяло, закашляўся, ажно са свістам.

Дзедава хата разломвалася ад рогату. Нават старая Хадора прыбегла з двара, стаяла на парозе з сахаром, сціскала яго аберуч, не ведаючы, каго ёй тут ратаваць. Пакрысе рогат суціхаў, але даўжэй за ўсіх екатаў, угнуўшы голаў у плечы, Міхась — аж слёзы з вачэй каціліся. І ўжо плакаў насупраць яго, праз стол, дзед Ягор, ад таго, што ляснічы пры людзях сумняваўся ў тым, як гэта было, не хацеў даць веры чутаму пра хромавыя, са скрыпам, боты і кулацкіх сабак. Праўда, праз тыя свае слёзы і пасміхаўся блішчастым вокам на Міхася, маючы думку: хто не паверыў, а хто і паверыў — хай будзе так.

Іванкава неба — дзед Міхалка. Гэтае адчуванне Стральцоў добра ведаў, да скону насіў у сабе. Бязмежная дабрыня — на той мяжы, якую Міхалка адчувае ўжо як нешта небяспечнае, знак з неба, дарогу туды, на неба. Іншы, але таксама цікавы як тып дзед Трахім. І ці не ў гэтым шэрагу мудрых, усім патрэбных, вясковых дзядоў убачыўся Стральцову дзед Ягор? Бо вочы на яго загарэліся — вочы мастака.

Ёсць у Стральцова верш «Размова з часам» — споведзь і не толькі, прароцтва і не толькі:

Я — голас і думка, я — праўда і зрок.
Даў мову я камню, траве і расінцы.
Мой дзень — не імгненне, планеты віток,
Друкую свой крок на сусветным гасцінцы.
Спасцігнуць усё праз цябе я хачу,
Табою маё ўсё няхай апякуецца.
Знай пункты гульні.
А паруш — закрычу,
Аж голас у веку наступным пачуецца.

Век новы, наступны, пачаўся. У ім добра чуецца голас Міхася Стральцова. Ён не проста жыве ды радуе. І ў новым веку ён вядзе, як той лоцман, карабель мастацкага слова, нашай нацыянальнай літаратуры, людскія душы і пачуцці да вышыняў, якія аднойчы назваў «гамбургскім рахункам» і замацаваў залатою «пячаткаю майстра».

2002

Ала Сямёнава

Пры ўрачыстым святле дня

Сустрэліся мы, канечне ж, выпадкова. Я спяшалася дахаты з Дома кнігі, пасля чарговай ночы з «хуткімі дапамогамі», без сну, зусім «не в лице», і пабачыла спачатку нейкі недарэчны руды калматы каўнер са штучнага футра на шэрым паліто, а потым за каўняром згледзела знаёмую ўсмешку: Міхась. І ён быў заняты нейкімі сваімі думкамі, сваім клопатам. Неяк гмыкнуў іранічна: «Ну вось — сустрэліся». Таксама, мабыць, згадаў «урачыстае святло дня».

Пазней прынёс Айзэнрайха і маленечкаую драўляную скульптуру: жанчына, з палец, у стылі ўлюбёнага ім прымітывізму. Сапраўды я збірала яму чытаць нейкія часопісы, ён прыносіў мне толькі што набытыя ў кнігарні кнігі. Стасункі нашыя набылі ранейшы, звычны прыязна-дыстанцыйны кшталт, з інтэрлюдыямі-гаворкамі па тэлефоне, выпадковымі сустрэчамі. Часам, праўда, па тэлефоне ён згадваў напаўжартам, як той вялікі, з Польшчы: «Збяжым у Тамашуў». Былі, можа, як у Тувіма, свой Тамашуў і яшчэ якія падарожжы. Але гэта былі ўжо іншыя гісторыі. Больш рэальныя. З канкрэтнымі дзейнымі асобамі. Не са мной. І тут — толькі канстатацыя факта. Не роспач. Не журба. Не шкадаванне. Не «уничижение» — нават тое, што «паче гордости». Інакш не магло быць. У жыцці кожнага з нас кантрапункты пазначаліся паасобку. Лініі існавання ішлі паралельна. Паводле Эўкліда. Толькі часам выяўляючы логіку казанскага матэматыка — і перакрыжоўваючыся. Каб зноў сысці ў далёкія паралелі. І эпісталярныя нашы стасункі скончыліся выхавана-гжэчным шматкроп'ем. Ніякіх меладраматычных клічнікаў і пытальнікаў. Ніякіх кропак над «і».

Тым часам здавалася — хаця дыстанцыя нашага зямнога існавання перайшла даўно на другую палавіну, і ўсё ж — да той, канечнай, падзеі далёка.

А пакуль — кожны са сваёй самазасяроджанасцю. Раўнавага быцця. Раўнавага суіснавання. Ідылія духоўнай блізкасці. На адлегласці.

Ажно «провидение» да ідылій і ілюзій не так часта ставіцца паблажліва. Драмы лёсу не было. Але фінал нашых адносін усё ж стаўся трагедыяй. 23 жніўня 1987 года Міхась Стральцоў пайшоў з жыцця. І трагедыя — не таму, што надышоў канец зямнога існавання: гэта натуральна. Трагедыя — таму, што не зжыў пазначанага біблейскага веку. (Хаця ў нас ад нязбытнага сацаптымізму і пра васьмідзесяцігадовых пішуць: заўчасна памёр.)

Перад тым — мы рабілі разам у часопісе «Нёман». Перад тым — ён святкаваў свой пяцідзесяцігадовы юбілей. Перад тым — была ўсё ж вандроўка.

У Слаўгарад. У Сычын. Рабілі тэлефільм пра Міхася Стральцова. Ці — больш правільна — передачу пра Міхася, дзе быў дваццаціхвілінны фільм. На тэлебачанні вырашылі выехаць на радзіму Стральцова. І былі тры цудоўныя дні: 20, 21, 22 студзеня 1987 года. Перад тым стаялі страшэнныя маразы — да 30 градусаў. А як нам ад'язджаць — пацяплела, недзе толькі 10. Усё сляпуча-белае, блакітнае. Тэлебачанне едзе на сваім «рафіку», мы — Міхась Стральцоў з малодшай дачкой (ад другога шлюбу), светлай, лагоднай Алесяй, Рыгор Барадулін, Алесь Пісьмянкоў і я — аўтобусам. І гаворка, здаецца, ідзе звычаёвая, і п'ем мы звычайную каву з тэрмаса, што прынесла Алена Дзмітрыеўна (разам з іншымі ванзэлкамі, прызначанымі сваякам Міхася Лявонавіча), і ямо звычайныя піражкі з яблыкамі (майго вырабу), і нічога асаблівага не адбываецца, але прысутнічаюць у аўтобусе нейкія флюіды паразумення і разумення, што не выяўляюцца ў словах і ўчынках, але адчуваюцца неяк інакш (сёмым, дзясятым чуццём?). Настрой гэты — недзе ў паветры, у кіламетрах, метрах дарогі, у сыпучым, ясным снезе, у праменьчыках сонца. Мы ж едзем да тых дрэў, да тых стромаў, дзе гуляюць блакітныя вятры даўняй стральцоўскай мары. Маладога яго наіву. І юных парыванняў душы. І за вокнамі аўтобуса — стоеныя, таямнічыя лясы, абрусы заснежаных палёў, утульныя вёсачкі, гасцінныя гарады. Ідылія заснежаннай прасторы, ідылія з адлегласці, ідылія нязгаданага і згаданага, ідылія падарожжа — турботы і штодзённы

клопат засталіся на тых кіламетрах, што адлічылі колы нашага «Ікаруса», а мы недзе ў рэальных, але і прымроеных нашым уяўленнем прасторы і часе. У вэлюме дабразычлівасці і нават крыху сентыментальных ілюзій «радаснага саду», аддзеленага ад астатняга свету не толькі аўтобусам, але і агульнасцю вось гэтых, нядоўгіх, крохкіх, ламлівых сувязяў, суадносін — гэтага падарожжа.

І былі сустрэчы з аднавяскоўцамі Міхася Стральцова, з яго маці, што так спакойна, нібыта яна ўсё жыццё давала інтэрв'ю тэлебачанню, гаварыла: «Я заўсёды лічыла, што ён некім будзе. Літаратарам нейкім», з жанчынай, у якую ў юнацтве быў закаханы ўпершыню Міхась, з тымі дрэвамі, хатамі, — з той зямлёй, што памятала Міхася Стральцова, якому яшчэ толькі наканавана было стаць творцам, Майстрам.

Там, у Сычыне і Слаўгарадзе, ішло сваё, недатычнае да нас і незалежнае ад нас жыццё. Быў звычайны клопат дня. Але ў дачыненні да героя нашага падарожжа ўсё набывала асаблівы сэнс: жанчына, што мыла бялізну ў палонцы, цікаўныя вясковыя дзеці (іх было няшмат), вольныя, не прывязаныя, але не бадзяжныя, хатнія сабакі. Пажоўклыя здымкі ў хаце, дзе гадаваўся Міхась, каляндар прыроды, што вёў яго бацька. Нават зусім пашорхлыя, амаль неарганічныя ўжо, вязкі нейкіх зёлкаў пад столлю хаты, нават старыя табурэты і яшчэ нейкія седалы ў хаце і ў сенцах. І тая круча ў Слаўгарадзе, над якой Міхась чытаў свой верш, і старыя гасцінцы Магілёўшчыны. Там цяпер — і надоўга — нячутная і нябачная бяда. Але я не хачу распавядаць пра яе тут — тады пра гэта яшчэ мала хто ведаў (чарнобыльскія сакрэты захоўваліся пільна), — мы таксама занятыя былі іншым.

Нават і вячэры — у Сычыне, у Слаўгарадзе, у Доўску (на шляху ў Менск) — былі не тое каб рытульна-ўрачыстыя, але ў іх адчувалася магія прысутнасці талентаў — Міхася Стральцова і Рыгора Барадуліна, незаўважны гіпноз падпарадкаванасці ўсіх астатніх іх асобам. Усё другаснае набывала нечаканую галоўнасць існага і важнага, усё ўзбуйнялася, набывала новыя адценні, нюансы, стваралася асобная атмасфера. Хаця не было

сур'ёзных гаворак, спрэчак — нейкія аскепкі, бліскаўкі, іскры. Але бліскаўкі — вясёлкі, іскры — месячнага святла, аскепкі — вялікай казкі жыцця.

Гэта было і пазней — калі ў Менску запісвалі сваё слова Васіль Вітка, Віктар Карамазаў, Карлас Шэрман. І потым працягвалі студыйную гаворку ў кавярні. І маўклівая мудрасць Васіля Віткі, нейкія філасофская лагоднасць і ціхамірнасць Карамазава, якая раптам выбухала нечаканай весялосцю. Усё гэта жывілася прысутнасцю Міхася Стральцова. Героя, юбіляра. Ён з нейкай добрай радасцю глядзеў на свайго сябра, які ўзяў ды і прайшоўся кругам упрысядку ў кавярні. «Віця», — неяк заўсёды пяшчотна і лагодна згадваў Карамазава Міхась.

Так, былі перад'юбілейныя дні. І перадача з фільмам выйшлі да юбілею. І я гарэла ад сораму. Усе выдатна гаварылі, усе былі на экране роўныя самі сабе ў жыцці. Але той перадачы і таго фільма, які я сабе ўяўляла, не атрымалася. Не толькі таму, здаецца, што я не мела вопыту ў кіно і на тэлебачанні. Рабіла я сцэнарый (па просьбе Міхася — гэта была яго ідэя, калі ён даведаўся, што збіраюцца рабіць фільм пра яго) паэтычна-лірычны. Прыехаўшы ў Слаўгарад і пазнаёміўшыся з рэжысёрам, я зразумела, што мы маем на ўвазе розныя рэчы. Добра перамовіліся, я ўсю ноч не спала і вырашыла вяртацца ў Менск. Дзеля чаго я тут? Няўломак, няўдаліца. Міхась Лявонавіч і Рыгор Іванавіч неяк усё гэта «стушевали», але я па сутнасці толькі прысутнічала пры тым дзействе. Уладзімір Таміла рабіў усё, што ён лічыў патрэбным. Рэдактар Саня Шлег ажно квітнеў ад радасці — фільм пра сябра. Аператар лавіў настрой героя і прыроды. Рыгор Іванавіч высакародна ўзяў на сябе ролю вядучага. І абодва яны — Міхась Стральцоў і Рыгор Барадулін — разумеючы мой афронт, зрабілі рабочую няўдачу ўдалай жыццёвай імпрэзай.

Міхась пазней усё суцяшаў мяне: «Не перажывай. Мы паедзем да цябе ў Наваградак, зробім фільм пря Янку Брыля». Янка Брыль — не толькі любоў удзячнага вучня. Ён быў «дарагі яму літаральна кожным радком». І ў гэтым абзацы з «Пячаткі майстра» — стаўленне да пісьменніка і чалавека выяўляецца,

можа, найбольш выразна: «Брыль наогул пісьменнік, надзелены вялікай здольнасцю пастаяннай апрабацыі вышэйшых маральных каштоўнасцяў і ўдакладнення іх для сябе і для сваіх герояў. Гэтая якасць, пры яшчэ надзвычайнай духоўнасці брылёўскага мастацкага свету, выгадна вылучае яго сярод сучасных нашых празаікаў — гэтым ён прыналежны да непарушных традыцый вялікай літаратуры».

Вось гэтае — «апрабацыя вышэйшых маральных каштоўнасцяў і ўдакладнення іх для сябе і для сваіх герояў», мастацкі свет Брыля — было для Міхася Стральцова неабходным, патрэбным, меціла яго ўласную філасофію існавання, надавала ёй, мне так здаецца, важкасць і пэўнасць. Часам ён, мабыць, і не пагаджаўся ў душы з Іванам Антонавічам, але ўласныя, яго, Стральцова, разгубленасць і разумовыя пошукі, яго «няшчасная свядомасць» (Гегель), яго «пункцірны» сацыяльны і асабісты побыт — знаходзілі тут і сталую грунтоўнасць усведамлення, і ахоўную свядомасць, і нібыта блізілі яго да нейкіх першасных, анталагічных асаблівасцяў нашага быцця ў свеце. І блізкасць мастацкага метаду недзе набліжала, а недзе адштурхоўвала Міхася Стральцова ад Брыля («Смаленне вепрука», напрыклад). Але Брыль быў заўсёды неабходны Стральцову. І ў апошнія дні Міхася Лявонавіча — калі яму на нейкі час стала лепш — яны паўтары гадзіны вялі размову. Гэта было 2 жніўня 1987 года, пазней мы ўсе заходзілі ў палату на хвіліну — аддаць паклон. Рыгор Барадулін з жонкай Валянцінай Міхайлаўнай, актор Павел Дубашынскі, Вераніка Стральцова і я.

Янка Брыль вёў рэй і ўлетку, у ліпені 1986 года, калі быў вечар Міхася Стральцова. І пазней, на вечарыне ў дзень юбілею ў доме Міхася Лявонавіча і Алены Дзмітрыеўны за хатнім багатым сталом. Знешне нішто, дарэчы, не нагадвала пра «падводныя плыні» ў іх сямейным жыцці. Было гасцінна, утульна, смачна. Было весела і цёпла. Праўда, дарослых дачок ад першага шлюбу — Вікторыі і Веранікі — не было.

У 1987 годзе Міхась Стральцоў — гэтаму вельмі спрыяў Рыгор Барадулін — наладжваў некалькі вечароў. У сакавіку — у Доме

літаратара, пазней — у Гародні, недзе яшчэ. Тады многім здавалася: мнагавата. Нават і мне. Хаця ў Доме літаратара, прыканцы красавіка, я таксама брала чынны ўдзел. Здаецца, крыху больш удалы, як у тэлевізійнай перадачы.

Міхась Стральцоў ціха-здаволена згаджаўся на ўсе вечары. Ці таму, што ўсё гэта было пацвярджэннем ягонага вяртання ў літаратуру і літаратурны свет, ці таму, што прадчуваў — ужо апошнія месяцы жыцця. Так ці інакш — добра, што былі вечары, што ён зноў адчуў сябе прызнаным, слынным літаратарам.

Між іншым, калі Стральцоў вярнуўся з Мазыра, як сведчыў у гаворцы са мной Вячаслаў Івашчанка (ён на тую пару заходзіў да Міхася Лявонавіча, што якраз супала з нашай працай над кнігай Івашчанкі), быў той замкнёна-разгублены, пачуваў сябе адстаронена і адчужана ад звычнага літаратурнага атачэння. І тут нельга перадаць увагі ўчынкам Рыгора Барадуліна і Анатоля Кудраўца. Рыгор Барадулін, як мог, спрыяў заказам на нейкія пераклады, уключэнню ў план яго кніг, тэлефанаваў Міхасю і ўранку, і ўвечары, нават, як гаварыў сам Стральцоў, купляў яму месячны білет для праезду ў менскім транспарце.

Анатоль Кудравец, галоўны рэдактар часопіса «Нёман», вядомы празаік, не збаяўся папярэджанняў адміністрацыйных асоб: што, Стральцова на сталую працу? А было гэта ў гады, калі за складам рэдакцый пільна сачыла не адна ўстанова. Міхась Лявонавіч быў узрадаваны і ўражаны — пазваніў! запрасіў! сам галоўны радактар!

Праца ў аддзеле крытыкі — спачатку літсупрацоўнікам, потым рэдактарам (загадчыкам) аддзела — вярнула яму яго грамадскае рэнамэ. Не творчае — гэта ў яго ніхто не мог забраць, а менавіта літаратурна-грамадскае. Ён вярнуўся ў пэўнае кола. Не толькі як таленавіты творца, але і як чалавек, што здольны выконваць службовыя абавязкі. Чалавек, што адпавядаў пэўным нормам. Для таленту нават і супрацьпаказанае — норма, але для вяртання «на круги своя» патрэбны ўчынак. Міхась Лявонцьевіч адчуў грунт пад нагамі.

Ды і з грашмі стала лягчэй. З'явіўся невялікі, але сталы заробак. Як мне здаецца, на той момант, калі ён пасля ўсіх пярэкрутаў лёсу вярнуўся ў Менск, сталая праца, служба былі яму неабходныя. Як неабходныя былі стасункі з Янкам Брылём, Васілём Віткам, Алесем Адамовічам... З сябрамі: і толькі што згаданымі, і з Віктарам Карамазавым, Анатолем Грачанікавым, Васілём Зуёнкам, Таццянай Арловай, Міхасём Тычынам, Аляксеем Гардзіцкім, Аляксандрам Станютам... Яму былі неабходныя прыязнасць і разумение Алеся Разанава, Генадзя Шупенькі, Варлена Бечыка, Анатоля Сідарэвіча... Пільная ўвага маладых: Леаніда Дранько-Майсюка, Сяргея Дубаўца, Уладзіміра Арлова, Адама Глобуса, Алеся Асташонка...

Міхась Стральцоў збіраўся вызваліцца ад службы, зноў вярнуцца выключна да творчай працы. Гэта ўжо падчас хваробы. У шпіталі.

Як адбылося б, каб Бог і Лёс адшкадавалі яму яшчэ добрую рэшту жыцця — цяжка здагадвацца...

Прадчуванне канца — ці было яно ў яго? Мне здаецца, калі і было, падсвядомае, інтуітыўнае. Не выслоўленае. Не выяўленае канкрэтна. У красавіку і траўні 1987 года ён пару разоў прыходзіў на працу страшэнна бледны. Тлумачыў — нешта з сэрцам. Гэта, мабыць, і радыяцыйны боль (у яго быў рак страваводa). Потым нечакана лёг у бальніцу. Нікому нічога не сказаўшы. Ляжаў у 2-ім шпіталі. Калі мы з Тамарай Аляксееўнай Нікіфаровіч (карэктаркай «Нёмана») наведалі яго, быў знерваваны, раздражнёны. Хаця неяк пасвятлеў, палагаднеў, кажучы: «Бачу адсюль тваю хату, Томік» (да Тамары Аляксееўны). Выпісаўся таксама нечакана. І знік.

У ліпені Міхась лёг у анкалагічную клініку ў Бараўлянах. Ездзіла да яго — ён ужо мала што еў; везла кавун, чарніцы, чарэшню. Нейкім разам мы сышліся ў яго выпадкова: Карлас Шэрман, Анатоль Сідарэвіч і я. Карлас Шэрман зрабіў слайды і пазней аддаў іх Сідарэвічу, у часопіс «Крыніца», там, дзе мы ўдваіх з Міхасём Стральцовым, — падараваў мне. Дзе Сідарэвічавы — не ведаю, адзін давала «Крыніца», мой рап-

тоўна знік пасля таго, як я паказвала яго навагоднім вечарам разам з маімі італьянскімі слайдамі. Я перавярнула дагары нагамі ўвесь дом — няма, хоць плач. Няма.

Перад аперацыяй я ўвечары прыходзіла да Міхася Лявонавіча, ён пагладзіў кветкі, паглядзеў на чарэшню... Быў супакоены, лагодны. Спадзяваўся на дактароў. Папрасіў, каб Алена Дзмітрыеўна — яна была ў яго — праводзіла мяне. Мы абедзве супакойвалі Міхася, спасылаючыся на ўсе шчаслівыя выпадкі.

17 ліпеня Міхасю Стральцову зрабілі аперацыю. І з рэанімацыйнага адзялення ён ужо не выйшаў... 6 жніўня, калі яму стала лепш, прыехалі да яго ўсе ўжо згаданыя. У апошнія дні прыходзіў Дранько-Майсюк.

Усё лета я тэлефанавала Вераніцы, Рыгору Барадуліну, Карласу Шэрману. Яны — мне. Ніхто не ад'язджаў далёка ад Менска.

Вестка пра смерць Міхася Стральцова заспела мяне на Іслачы — той Іслачы, пра якую пісаў Міхась Лявонавіч. У Дом творчасці (ён толькі адчыніўся) Стральцоў так і не паспеў прыехаць. Я ж апынулася там з прычыны рамонту: у маёй хаце яго распачалі яшчэ ў траўні, калі Стральцоў быў, здавалася, здаровы — узяла адпачынак. Так і ездзіла адтуль на працу. Трэба было весці аддзел. За абодвух.

Пасля таго, як усе мы, яго сябры, праводзілі Міхася Стральцова ў апошні яго шлях, лёсу было заўгодна кінуць мяне паводле лепшых традыцый «сядзібнай культуры» (Міхась любіў яе) — за мяжу. У Італію. Можа, дзеля таго, каб там, дзе на кожным камені — адзнака тысячагоддзяў, згадаць аб ratio vivendi. Зірнуць на свет sub specie aeterni. А можа, каб проста парадавацца жыццю. І за яго таксама... За Стральцова... «Небо Италии, небо Торквата. Прах поэтический древнего Рима...» Баратынскі...

Каго працытаваў бы тут Стральцоў? Што «загадаў» бы паглядзець?

Працытаваў... Загадаў... Непапраўны прошлы час... Мінулы...

* * *

Загадка Стральцова... Ён панёс яе з сабой. Пакінуўшы нам класічныя ўзоры майстэрства. Многа ці мала? Як вымераць радкамі высокае мастацтва?

Ён быў супраць слотнай няўклюдзіцы слоў. Супраць цягамотных, раскілзаных сюжэтаў, супраць бясконцых аповедаў пра некага, пра нешта, дзеля нечага... Ён спавядаў лірычна-філасофскі водгук на жыццё, на такое перажыванне светапарадку, што мела б на ўвазе і надзейнасць класічных арсеналаў, векавых канонаў — і пазалагічна-мантажныя выяўленні ўражанняў і падзей: не разумовае бязладдзе, але ўменне знайсці новыя пошукава-неканонічныя ўстаноўкі.

Я зноў перачытваю невялічкае эсэ, шэсць слупкоў тэксту, непрэстыжны падпольчык літгазетаўскай (маскоўскай) паласы (гэтая газета, дарэчы, ніколі не адшкадавала цэлай паласы ні Івану Мележу, ні Янку Брылю, ні Максіму Танку, ні нават Янку Купалу ці Максіму Багдановічу). Сціплы такі на выгляд артыкульчык. Аднак і цяпер, праз некалькі год, калі столькі пісалася і друкавалася — забойнага, сенсацыйнага, разумнага — радкі Стральцова выдаюць спакойнай прадуманасцю, глыбінёю думкі, дыстынктоўнасцю стылю.

«Я не пастрашуся прамовіць, што мяне цікавіць пытанне мастацтва самога па сабе» (там, на расейскай мове, гэта гучала так: «Я не побоюсь сказать, что меня интересует вопрос достоинства искусства как такового»). Міхась Стральцоў ніколі не баяўся гэта сцвярджаць — словам прозы, словам крытыка. Ці былі ў яго магчымасці, моц на спраўджванне? Мне здаецца, былі. У спрыяльных умовах. Моцартавы склад таленту ўвесь час цярпеў ад усмешкі скептыка-аналітыка, які сядзеў у Стральцове і перапыняў занатоўванне імгненнага. Цярпеў ад крыўдлівых усмешак нядобразычліўцаў. Ад кпінаў лёсу. Ад прадонняў у самасвядомасці. Сам ён у згаданым артыкуле пазначыў так: «Я... быў заняты, і нават досыць сур'ёзна, годным уладкаваннем уласнай асобы і свайго ўнутранага свету...»

Міхась Стральцоў (пра гэта сведчаць і яго лісты) не быў з тых, хто ўмее старанна і абавязкова кожнага дня гнаць свае радкі. А настрой той палётны, натхнёны, ён лёгка парушаўся... Памятаеце? «Аповесцейку сваю я колькі разоў губіў тым, што, загарэўшыся ёю, ужо як бы адчуўшы цалкам, не садзіўся ў час за стол — і перагараў. Вось яшчэ чаму самадысцыпліна ў працы — усё ж вялікая рэч».

Чаму не садзіўся за стол? Хто вінаваты? Ці толькі абставіны? Ці ўсё ж ён сам? Ці тыя сацыяльныя прычыны? Абставіны трагічнага лёсу беларусаў? Памятаю, як нейкім выпадкам, яшчэ да Мазыра, асцярожненька «агітавала» яго пісаць. Ён скрушна давёў: «А каму гэта патрэбна?»

Міхась Стральцоў — пісьменнік элітарны. І — *беларускі* пісьменнік. То дзе ж ён — быў ці ёсць — ягоны чытач? Дзе тыя беларусы, што разумеюць «філасофію ўсясветнай выпадковасці быцця» (А. Роб-Грые), што ўмеюць спасцігнуць тыя абліччы існага, што ўмеў стварыць Міхась Стральцоў? Іх так мала. І было, і ёсць. І таму так выйгравалі ў «масавасці», «папулярнасці», «знакамітасці» тыя, хто займаўся простым паўтарэннем, пералічэннем розных карцін рэчаіснасці, канкрэтных, на узроўні будзённага ўсведамлення.

Ці быў ён абыякавы да гэтага? Ён не быў зайздроснікам. Ведаў цану таннай славы. Крыўда, па-мойму, была. Нават больш — пакута. Ён не быў у суладдзі са светам. А свет — з ім. Аднак ён жыў *адчуваннем* гармоніі. Меў тое, дадзенае выбраннікам, сузіранне што «ахоплівае *субстанцыю* рэчы ва ўсёй яе цэласнасці, меў магчымасць выціснуць *сэрца* альбо *душу* рэчы з усяго, што зацяняе сутнасць» (Гегель).

Што было б, калі б ён быў жывы?

Наўрад ці сёння падаўся б у члены якой партыі, наўрад ці займаў бы трыбуны, наўрад рабіў бы нататкі «на злобу дня». Ён быў філосафам, сузіральнікам, мысляром. Ніколі не лавіў за крылы момант.

Што б ён рабіў? Цяжка сказаць...

Проза, вершы, крытычная проза... Эпісталярная проза. На ўсім пячатка майстра.

Многае не спраўдзілася. Але — «душа сбылась».

Бэзавы попел... Згадваю «матыў лірычны, адмысловы», і «красу арабінак», і лес «у асеннім агні». І сыплецца, спадае бэзавы попел успамінаў...

І ўспамінае душа святло...

1992

Янка Брыль

З запісаў

* * *

Пазваніў Анатоль Сідарэвіч — у Міхася пачалася агонія... Дзяжурства пры тэлефоне. Увечары прыйшоў Карамазаў, ад Міхася, каля якога прасядзеў дзве гадзіны. Высокая тэмпература, трызненне, «глядзіць бялкамі, нічога не адказвае»... Прасядзелі з Віктарам за поўнач. Назаўтра зноў дзяжурства. І ў палавіне чацвёртай Лена пазваніла, плачучы, што закрыла яму вочы...

6-га я быў пры ім. Калі, вітаючыся, пацалаваў яго ў лоб і, заплакаўшы, апаў вачыма ў падушку, расхваляваўся і ён. Калі развіталіся, ён сказаў: «Мне без вас нельга». А ў гутарцы нашай нялёгка было трымацца на нейкім аптымізме.

Перад тым, як ехаць у Бараўляны, пазваніў Віктару, і ён параіў папрасіць Лену на спатканні пакінуць нас з Міхасём адных. Віктар думаў, што Міхась захоча, можа, сказаць мне штосьці важнае для яго. Лена разумна згадзілася, мы пабылі ўдвух з паўгадзіны, потым яна ўвайшла, і Міхась папрасіў яе быць з намі. Пры ўсёй складанасці іхніх адносін яна яму патрэбна была вельмі, і яна з пяшчотнай мужнасцю жанчыны справу сваю рабіла як след.

Распластаны, парэзаны, падключаны да кропельніцы, да гноесцёку, да гумавай трубкі кармлення, бездапаможны, як дзіця. Асабліва бачыліся мне, упершыню ў жыцці, яго босыя ногі... І пры ўсім гэтым — ягоная ўсмешка. Праз усе пакуты.

А колькі ж, Божа наш, адзіноты! Якое нашаму брату хапае і так.

На могілках зноў успомнілася, адчулася з новай сіла народнае: «Не плач, яго ўжо няма, гэта ўжо не ён». Тое, што ідзе ў зямлю.

А ён ад нас адарваны з крывёю. Мне горка ад таго, што я замала, засуха адказваў на яго прыхільнасць. А пра яе мне і Віктар сказаў, калі мы з ім сядзелі ноччу.

Вось так пра гэта,— праз тыдзень, зноў у вёсцы, — як не самому сабе, а для кагосьці, пратакольна...

* * *

Прынёсшы з пасёлка малако, дапоўніўшы з калонкі бочкі на паліўку, падумаў, што вось і паднімуся цяпер на сваё гарышча, да старога, заслужанага пісьмовага стала, да акна, расчыненага ў сонечна-зялёна-галасістую толькі ад птушак раніцу, і буду, як молячыся, дачытваць Міхасёвы вершы.

Аднатомнік — трошкі за трыццаць аркушаў прозы, паэзіі, крытычнай эсэістыкі. Гасцюючы ў мяне, наш польскі друг Флёрыян Няўважны ўбачыў у кніжнай шафе салідны том выбранага Лукаша Калюгі і сказаў адно толькі «О!». Тут я адчуў сябе каўказцам і падаў яму гэты том. Далей стаяў другі аднатомнік, і па таўшчыні, і па колеры вокладкі вельмі падобны. Міхась Стральцоў. Мой Флёрак толькі зірнуў на мяне, а я на гэты раз сказаў «О!» і аддаў яму і Міхася.

Потым, вядома, было шкада, як ні справядліва гаворыцца, што іменна той падарунак блізкаму найбольш дарагі, якога шкада. Доўга і дарма стараўся я потым знайсці тыя аднатомнікі ў нашых кнігарнях. І толькі дзякуючы маладому сябру, паэту Міхасю Скоблу, які на той час стаяў бліжэй да кніжнай справы, абодвух любімых намі ўдалося дастаць і ў маю шафу Найлепшых.

Аднатомнік. Шэсцьсот старонак. І няма ў мяне гэтым разам сумнага адчування, як гэта мала для пяцідзесяці гадоў. Такая паўната душы праяўлена, ва ўсіх жанрах, здаецца, з роўнай сілай, так многа тут для расшыфроўкі ўдумліваму чытачу. Вось

перайшоў я да «Чалавека з Малой Багацькаўкі», і няма адчування, што гэта зноў жа перачытванне, а ёсць, як новае і паэтычна мудрае, можа, і нароўні з мастацкай прозай ці з вершамі бачанне жыцця — на сусветны яго размах і агульналюдское паглыбленне.

...Тыя далёкія, на дальнім водшыбе, Чыжоўскія могілкі, дзе ён, Міхась, назаўсёды прылёг каля маленькага сына, адзінага сярод дачок. Хутка ўжо будзе і дзесяць гадоў, калі я маўчаў на яго пахаванні...

І цяпер, памаўчаўшы, можна зноў да яго і Максіма Гарэцкага.

НАСТУПНЫ, ЯШЧЭ НЕ АБ'ЯЎЛЕНЫ ЗМЕСТ
Літаратуразнаўчы дыскурс

Алесь Адамовіч

Міхась Стральцоў — учора і заўтра

Мы можам ужо гаварыць пра сапраўднае багацце нашай беларускай літаратуры, і не толькі на паэзію, як калісьці, але і прозу.

Але вось што адбываецца ў літаратуры, з літаратурай, калі яна раптоўна пабагацее — руская зноў жа можа быць тут павучальным прыкладам: нават цікавыя, «дабротныя» пісьменнікі, творы XIX і пачатку XX стагоддзяў выцясняліся ў «запаснікі», не вытрымліваючы параўнання з больш вартымі чытачоўскай увагі, а такіх на рускім небасхіле паяўляецца ўсё больш і больш — цэлае сузор'е, галактыка! Калі ёсць Пушкін і Гогаль, ды Талстой з Дастаеўскім, ды Чэхаў з Буніным і шмат хто яшчэ, калі нават «сярэдні ўзровень» — гэта творы, якія маглі б упрыгожыць любую добра развітую літаратуру, тады проста «дабротным» — А. К. Шэлеру-Міхайлаву, І. А. Солаву, А. А. Ціханаву-Лугавому, У. М. Патапенку проста ўжо не хапае месца ў нашай калектыўнай памяці. Час ад часу іх зноў выцягваюць, дастаюць з «запаснікаў» (як мы сёння): глядзіце, хіба не вартыя ўвагі? І глядзім, перачытваем: сапраўды вартыя, каб іх ведалі, помнілі, дабротныя: дай бог і нам такіх!

Аднак ёсць, ёсць у гэтай жарсткаватай працы самога часу па адборы і сартыроўцы, па *параўнальным адборы* (назавём гэта так) свая неабходнасць і справядлівасць. Гэта як бы своеасаблівая

«пераатэстацыя», літаратурна-гістарычная: пакажы, дакажы, што адпавядаеш! Для нармальнага, здаровага функцыявання літаратурнага арганізма гэта во як карысна!

Нешта падобнае калі ўжо не адбываецца і ў нас, у беларусаў, дык непазбежна пачне рабіцца ў бліжэйшыя часы. Ды і цяпер, калі 20-я і 30-я гады ўжо не штучны вакуум, як было да 1956-га, а 60-я і 80-я дык і наогул сталі па-добраму «завозныя», багатыя на новыя імёны і творы, як колішнія базары-фэсты на ўсякі плён працы гаепадарскай — ужо і цяпер параўнальны адбор ідзе. У чытацкай свядомасці. У крытыкаў, навукоўцаў, саміх пісьменнікаў памяць на такія рэчы, вядома, больш учэпістая, аб'ёмная, але дойдзе.

Ну, а што застанецца «на плыву» і што пойдзе ў «запаснікі» (ці наогул знікне, як кажуць, «кане»)? Шмат чаго, бо ёсць ужо з чаго выбіраць.

Калі гадаць-прыкідваць, кожны зробіць гэта па-свойму. Я дык, напрыклад, упэўнены, што сярод таго лепшага, што будзе выразней заўважацца заўтра, хрэстаматыйна загучыць назва такіх твораў: «На чацвёртым годзе вайны», «Адзін лапаць, адзін чунь», «Смаленне вепрука», «Загадка Багдановіча»...

Так — гэта творы Міхася Стральцова. А названае — жамчужыны сярод напісанага ім. Гэтаму, такому жыць доўга і побач з лепшым у літаратуры.

Іншы з сучасных, асабліва маладзейшых чытачоў, добра такі аглушаных інфармацыйным шумам (у тым ліку і літаратурным), можа недаўменна затрывожыцца-заклапаціцца: Міхась Стральцоў? Чытаў я ці не? Нешта не вельмі пра яго каб і пісалі!

Калі не чыталі — вось том яго выбранага. А наконт таго ці пісалі: учора — шмат, а што не вельмі сёння, дык будуць заўтра! Прачытаеце яго — думаю, спрачацца не пачнеце, згодзіцеся.

У літаратуру Міхась Стральцоў прыйшоў — ён нараджэння 1937 г., з Магілёўшчыны — разам з тымі, сярод каго нямала сёння ўжо знакамітых пісьменнікаў. Тых, хто выбралі паэтычную ліру (ці каго яна выбрала), Міхась нагадвае сам у адным з бліскучых сваіх артыкулаў (не чакаючы, каб пра яго, сам пра іншых часта піша):

«Калі-небудзь хто-небудзь напіша пра тую пару, калі ў нашым сталічным універсітэце на адным курсе ці паралельным (філолагі — журналісты) вучыліся Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Юрась Свірка, Сымон Блатун, Таццяна Арлова, Мікола Гіль, Алесь Станюта...»

Не, тут не толькі паэты будучыя, але і празаікі, крытыкі.

Пакаленне гэтае адразу ж атрымала вызначальную назву (ці не ад Яскевіча?) — «філалагічнага». Ну, а потым узнікла вызначэнне і больш паэтычнае: пакаленне, абпаленае вайной!

Дабавім: душу, свядомасць іх, як і ўсіх нас, абпаліла яшчэ і пякучая праўда, што адкрылася ў другой палове пяцідзесятых гадоў — пасля XX з'езда партыі...

Нам, трохі старэйшым, хлопцы гэтыя былі блізкія шмат якімі рысамі, былі ў нас агульныя і надзеі, і заблуджэнні. Хіба што імунітэт у Быкава, ці Брыля, ці Панчанкі, альбо ў Карпюка да рэцыдываў ранейшых ілюзій і паводзін быў трохі больш праяўлены — бо мы больш і вірусаў таго «культу» захапілі, і куды сур'ёзней, вастрэй перахварэлі...

А так, і мы і яны — дзеці адной нязбытай да канца бяды і агульнай невымернай радасці: вайны і Перамогі. Мы ніяк з гэтым не можам у творчасці «расстацца», але не могуць і яны.

«Не скора, не адразу, — удакладняе сам Стральцоў, — абазваўся ў нашай творчасці той ваенны і пасляваенны вопыт. Усведамленне важнасці яго расло разам з намі, з чалавечым і грамадзянскім пасталеннем. Так было з усімі пісьменнікамі майго пакалення. Ужо дарослымі мы па-сапраўднаму адчулі сябе дзецьмі вайны. І тады напісалася апавяданне «На чацвёртым годзе вайны», аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь». Там — уражанні ваеннага дзяцінства, першапачатковы, можа, самы галоўны жыццёвы вопыт. Там шмат свайго, дакладна біяграфічнага».

Так, дакладнасць, «перажытасць» усяго — моцная адзнака лепшых твораў Міхася Стральцова. Але іх асаблівасць — яшчэ і ў шырокім, вольным дыханні думкі, па-сапраўднаму мастацкай. Гуманізм, чалавечнасць, што ідзе ад самой душы народнай, ёю выпраменьваецца, — вось тая *нацыянальная ідэя*, на якой ён пагаджаецца найперш і канчаткова.

Не выпадкова так радасна для сябе Міхась Стральцоў адкрыў Гарэцкага, калі гэты наш класік вярнуўся да свайго чытача. І якраз драма «Антон» яго асабліва зацікавіла — мабыць, запознена адкрытым супадзеннем сваёй і Гарэцкага думкі пра нацыянальны характар беларуса. Дзед Міхалка з аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» — ці не самая затоеная і ўстойлівая праўда-думка Міхася Стральцова пра тое лепшае, што пранёс народ, збярогшы праз невымерныя пакуты свайго гістарычнага жыцця, лёсу.

Потым з'явіліся «старыя» Валянціна Распуціна і нашых — Віктара Казька, Анатоля Кудраўца, Алеся Жука, але гэта потым, пасля... А напачатку быў — калі браць не проста «тэму», а ўзровень мастацкай думкі — ён, Міхась Стральцоў, ён, дзед Міхалка...

І што яшчэ характарызуе глыбіню і ўзровень прозы Міхася Стральцова, дык гэта тая лёгкасць, з якою можам уявіць лёс яго герояў у зусім іншай сітуацыі і нават у іншым часе. Бо яны жывыя — кожнай сваёй думкай-клопатам, кожным пачуццём-перажываннем.

Чытаеш пра хлопчыка, маці, бабулю, якія неяк трымаюцца за жыццё і на чацвёртым годзе вайны, хоць столькі іх, куды мацнейшых, ужо сцёрта на порах яе бязлітаснымі жорнамі, і такое рэальнае пачуццё страху за іх — бо ўяўляеш, як гэта проста бывала: наляцелі карнікі і сям'ю гэтую таксама сцерлі з зямлі, і не за нешта, а заадно ўжо — бо некага там лавілі ці палілі.

Таксама без намаганняў уяўляеш іх і ў пасляваенны час, ужо мірны, але такі нялёгкі для іх такіх. «Ташноцікі» — дранікі з мёрзлай, вясной адкапанай бульбы, — пра якія ўспамінае не раз як пра адзнаку-памяць свайго дзяцінства сам аўтар, — і гэтаму доўга яшчэ будуць рады ў такой вось хатцы. Жорсткая спадчына ваеннага ліхалецця ў гэтых «ташноціках» і той самы бяздушны «культ» — перапляліся.

Шмат у каго з пісьменнікаў ёсць тайны субяседнік і дарадца. У літаратуры. На ім правяраеш сябе і сваё: не сорамна яго вачыма паглядзець?!

Пачынаў Міхась Стральцоў, як і многія з яго аднагодкаў, пад моцным і дабратворным уплывам мастацкага слова Кузьмы Чорнага і іменна яго ранняй, «імпрэсіянісцкай», умоўна кажучы, прозы, апавяданняў найперш.

Потым адкрыў для сябе Максіма Гарэцкага.

І заўсёды з ім можа, як самае радаснае, творча блізкае — Максім Багдановіч. Гэта так не выпадкова для найбольшага «філолага» (у высокім значэнні) з асяродку таго самага «філалагічнага пакалення»!

Калі жывое жыццё гаспадарыць у думках, у пачуццях пісьменніка, тады кніга, кніжны вопыт яму не на шкоду як творцу — бо гэта таксама жыццё, яго неабходная частка. Тым больш што «філалагічнае» (таксама як і наша) пакаленне да кнігі, да бібліятэкі, культуры прарывалася, як да хлеба, да самога жыцця праз здзічэнне наўкол, праз спусташэнне душ, якое спрабаваў узаконіць, нормай зрабіць фашызм.

Толькі той, хто люта галадаў, адчувае ўвесь смак хлеба. Тое ж самае можна сцвярджаць і пра «хлеб культуры». Не, «кніжнасць» Міхася Стральцова зусім не тое, што ў некаторых сённяшніх літаратурных дзяцей НТР: наіўныя «спробы, — як піша Міхась Стральцоў, — па-мастацку ілюстраваць рознага гатунку абывацельскія сенсацыі або пераказваць, як-кольвек белетрызуючы, вычытанае ўчора ці сёння ў «Иностранной литературе» або ў «Науке и жизни»...

Якая культура думкі, пачуцця, эстэтычная культура стаіць за адным толькі эсэ «Загадка Багдановіча»! І якое разуменне, што ў паэта не біяграфія, а — лёс. І тужліва-шчырае жаданне сабе іменна гэтага.

«Сплятайце свае вянкі. Не старайцеся адшчыкнуць хоць адзін лісток ад тых лаўраў: тыя лаўры, перш чым стаць імі, былі цернямі».

Адно з апошніх па часе апавяданняў Міхася Стральцова — «Смаленне вепрука». Піша мастацкі твор, але мучыць яго тое, ад чаго пакутуюць толькі сапраўдныя майстры: немагчымасць дацягнуцца словам да ўсёй, што ўжо адкрылася пачуццю, паўнаты жыцця. Тое, што раней служыла спраўна, дапамагала

творцу, сёння «муляе», перашкаджае — сама жанравая акрэсленасць апавядання, табой і не табой выпрабаваная, ужо перашкода. І таму не апавяданне піша, а ўжо як бы міма яго і наогул «міма» ўсёй літаратуры прарываецца да жыцця, да самых яго вытокаў, каб з ім застацца і чытача пакінуць з жыццём адзін на адзін... Не апавяданне, а «калі б я пісаў апавяданне». І гэта не адмаўленне ад дасканалай формы, не разбурэнне ў імя разбурэння — гэта абнаўленне. І формы. І сябе як мастака. Гэта — крызіс. Слова, якое крытыку нашу найчасцей палохае. І якім яна палохае.

У Міхася Стральцова да гэтай з'явы зусім іншае стаўленне.

«Надзвычай напружаны тэмп, надзвычайны дынамізм зрухаў, пераўтварэнняў, расчараванняў і надзей. Не, гэта не так проста. І крызісныя з'явы тут непазбежныя».

«У мяне пракінулася слова пра наяўнасць пэўных крызісных рысаў у сучасным беларускім рамане — і нездарма. Але толькі крызіс гэты не варта разумець як застой. Ідзе прыхаваная, несціханая творчая спрэчка (на жаль, не заўсёды хоча гэта заўважаць крытыка) пра мастацка-метадалагічны ўзровень спасціжэння рэчаіснасці. Менавіта пра ўзровень».

У стральцоўскім эсэ пра смяротна хворага Багдановіча паэту здаецца, што ў яго ялцінскім пакойчыку затаіўся Сальеры («Здагадаўся: днём ён яшчэ больш чым ноччу баяўся таго чалавека — Сальеры»).

І сёння мы, услед за Пушкіным, ніяк не супакоімся, не ўсвядоміўшы да канца: дык атруціў Сальеры Моцарта ці не было гэта на самай справе? А можа, не гэта і Пушкін, і шмат хто іншыя, пішучы, мелі на ўвазе? Не факт, а з'ява іх цікавіла. У каго толькі не стаяў ён на дарозе — Сальеры! Не стаяў хіба толькі ў таго ж Пушкіна, у Ясеніна, Кальцова, Гарсія Лоркі — у паэтаў, якія самой прыродай быццам створаны былі, як нейкі «орган паэзіі» (нешта падобнае ўжыў М. Горкі, гаворачы пра Ясеніна).

Астатнім жа ўвесь час прыходзіцца ці ўступаць, адступаць перад «Сальеры» (і тады пагражальна насоўваецца «рацыё», цясніць творчую інтуіцыю), ці, змагаючыся з ім, выкарыс-

тоўваць яго магчымасці ў імя таго ж самага мастацтва — толькі ўжо «аналітычнага», «інтэлектуальнага».

Сапраўды, не так усё проста — у гэтай бясконцай барацьбе паміж «рацыё» і «інтуіцыё» («Моцартам» і «Сальеры»), якая бушуе і на старонках і ў душах таксама і сучасных пісьменнікаў.

І ўсё ж (нават пры такім поглядзе на «Сальеры») сэрца таленту — гэта «Моцарт».

Калісьці паспрачаўся я з Міколам Грынчыкам (думаю, пацвердзіць), нават на заклад пабіліся: я сцвярджаў, што У. Караткевіч па таленце больш празаік (гэта ў той час, калі ён яшчэ толькі вершы пісаў), што ў вершах Караткевіча, — хоць і выдатных, «запісана», што быць яму празаікам, і больш таго — эпікам. Бо там быў яго «Моцарт», адтуль яго клікаў...

Ну, а хто па таленце Міхась Стральцоў — найперш паэт, якім ён выступае перад намі ўсе апошнія гады, ці ўсё ж празаік? Ці па праву паэт настолькі глуха перакрыў дарогу празаіку?

Я цаню паэзію Міхася Стральцова. Не менш, чым Алеся Разанава, ёсць, ёсць у іх агульнае.

Але калі б паэзія Буніна ды адабрала ў нас Буніна-празаіка? Не здалося б нам, што «Сальеры атруціў Моцарта»? Бо пры ўсёй сіле бунінскага паэтычнага слова, «Моцартам» быў ён усё ж у прозе, а не ў паэзіі.

Ці не тое ж і з Міхасём Стральцовым? Яго паэзія — гэта «паэзія мыслі» найперш. Такая паэзія таксама, калі на ўзроўні, законная дачка Музы. Але іменна ў прозе Міхася Стральцова жыве «Моцарт», і, значыць, гэта яго асноўны талент, у гэтым асноўнае прызванне.

Дык чаму ж, Міхась?..

Вельмі не стае чытачу Стральцова-празаіка — яго празаічнага слова *сённяшняга*. Бо мы ведаем магчымасці гэтага слова — па ўжо напісаным ім.

І літаратуры беларускай не стае гэтага слова, стральцоўскага. О, як не лішняе было б яно — побач з брылёўскім, быкаўскім... У літаратуры так: нават усе разам і нават выдатныя не могуць замяніць аднаго — калі гэта сапраўдны талент. А калі ён яшчэ, як Стральцова талент, акрылены высокай культурай думкі

і пачуцця, калі за ім выключная чысціня сумлення і незвычайная патрабавальнасць да сябе — хіба ж шматгадовае маўчанне такога празаіка не вялікая страта нават для багатай, як сёння наша, літаратуры?

Не, моцартаўскі пачатак у пісьменніку, такім як Міхась Стральцоў, усё-такі наймацнейшы. І ён верне нам Стральцова-празаіка, прадоўжыць яго — у новых апавяданнях, аповесцях.

Янка Брыль

З добрай, сумнай усмешкай

Увосень шэсцьдзясят другога года, у залатым, утульным лесе, у адзіноце я чытаў бунінскі «Храм сонца», прымаў яго слова, нібы духмяны ліпавы мёд, маленькімі дозамі, па некалькі старонак у дзень, пасля працы, шчасліва адчуваючы, што гэтае чытанне — не толькі выдатны адпачынак, але і работа, і вучоба, і жыццё ва ўсёй яго паўнаце.

У такіх умовах, што вельмі спрыяюць успрыманню сапраўднага мастацтва, у такім настроі мне давялося пазнаёміцца і з першым зборнікам апавяданняў Міхася Стральцова «Блакітны вецер». Я з радасцю адчуў, як быццам толькі што адкрыў для сябе, што нават адразу пасля Буніна апавяданні нашага ціхага хлопца чытаюцца з хваляваннем, амаль на той самай хвалі прыёму.

Справа, вядома, не ў тым, каб некага з некім параўноўваць,— не варта рызыкаваць авансамі і раздражняць таго, хто думае інакш,— мне толькі хочацца сказаць, што проза Стральцова лірычная ў самым высокім значэнні гэтага паняцця, што яна безумоўна адтуль, дзе пачынаецца сапраўдная літаратура. Пісьменнік гэты не проста піша, сачыняе свае апавяданні і аповесці — ён так арганічна, так натуральна ідзе ад жыцця, як быццам яно само падказвае яму, што і як трэба рабіць. Яму толькі застаецца выконваць загады жыцця, што ён і робіць, часта з зайздроснай дакладнасцю. Ён з тых, для каго літаратура не прафесія, а прызванне, не пісаць ён не змог бы, не быць незадаволеным сабою — таксама.

Шчырае і разумнае, шматфарбнае і тонкае слова Стральцова законна, па праву ўзаемнасці, патрабуе ад чытача павагі. Яго нельга чытаць абы-як, для забавы, толькі ідучы за фабулай,— пры такіх адносінах да яго слова гэтае сарамліва, але ж і рашуча замыкаецца ў сабе, раўніва не выдае сваіх таямніцаў. Пра такую прозу адны, сыценька пазяхаючы, гавораць, што яна, бачыце, цяжкавата чытаецца; другія ж бачаць у ёй і іншую асаблівасць — яе, здараецца, і перачытваюць, нават даволі ахвотна і часта. А гэта ўжо адна з тых станоўчых якасцяў, якою вызначаюцца далёка не ўсе займальныя кнігі.

Пра што б, пра каго б ні пісаў Стральцоў, на кожнай яго старонцы я перш за ўсё бачу аднаго галоўнага героя — абаяльны вобраз самога аўтара, чалавека высокакультурнага і сардэчнага, з позіркам вострым на праўду і няпраўду, інтэлігента з народных працоўных нізоў, які няблага засвоіў нялёгкую і складаную мудрасць часу. Шчыры чалавек, відушчы пісьменнік ідзе па жыцці з добрай і сумнай усмешкай. Так хадзілі яго вялікія папярэднікі, з гэтым сумам, з гэтым шчаслівым болем за ўсіх і за ўсё горка і радасна адчуваць сябе літаратарам. І гэта — не сузіральнасць, якою нас палохаюць некаторыя крытыкі, гэта павышаная любоў да красы, да чыстага, новага, на чым і трымаецца жыццё.

1967

Рыгор Барадулін

На сініх лугах маленства

Постаць Міхася Стральцова адметная, адрозная, загадкавая, бо непаўторная.

Лірычная ўзрушанасць, філасофская разважлівасць, творчая апантанасць і шанаванне жыцця — усё гэта незвычайна суладна спалучалася ў адной таленавітай асобе.

Міхась Стральцоў прыйшоў у свет літаратуры аднойчы і назаўсёды. Прыйшоў з маленства, знявечанага вайной. Прыйшоў з відушчай памяццю, з датклівай натурай, з босай душою.

Прыйшоў даверлівы і адкрыты. Прыйшоў з маленствам, прывёў маленства сваё ў сталасць, вывеў у людзі яго. І колькі жыў, спасцігаў вытанчаны самаінтэлігент сябе, а значыць, увесь свет.

Мне б так сказаць: «Я здолеў заручыць
Сябе з уласнай думкай і свой голас
Птушынай песняй здолеў надтачыць, —
Сабраў расу, якою ўмыўся колас».

Ён пакепліваў нязлосна з тых паэтаў, якія з усіх лапатак пяліся казаць ад імя пакалення, ад імя ледзь не ўсяе эпохі. Глядзеў на іх, як сталы глядзіць на немаўлятак, у якіх прарэзаўся петушыны голас, паэзію такую называў прыметнікавай паэзіяй.

Пры жыцці ў Міхася Стральцова хапала часу на ўсіх — на сяброў і прыхлябаеў, марнатраўцаў і пажыральнікаў ягонага дарагога часу, на гутарку, на прачытанне новага верша і таўшчэзнага рукапісу прозы здрадлівага паплечніка і выпадковага наіўнага падарожнага, на рэцэнзію, на водгук, на радыё і тэлевыступленне. Адно не ставала часу на сябе, на сваё ўзважанае і назапашанае, перажытае і перадуманае.

Цыгарка, як тая хмурынка роздуму, ніколі не затухала. Заклапачоны ў асноўным чужымі клопатамі і гаркотамі, спагадлівы, безадхланны Міхась быў цесна, я сказаў бы, блакадна акружаны маладымі і старымі, зычлівымі і зайздрослівымі літаратарамі, мастакамі, акторамі, лірыкамі і фізікамі.

Падчас ён нагадваў добрага рахманага мядзведзя, якога не ў пару ўстурылі з берлагу — лагодна бубнеў, мармытаў, але ніколі нікому не адмовіў ні ў падтрымцы, ні ва ўвазе, бо сам быў заўсягды «на самай трэшчынцы ўвагі».

Шмат хто злоўжываў ягонай дабрынёй, ягонай усеахопнай дасведчанасцю, ягонай натуральнай еўрапейскасцю.

У натуры Міхася Стральцова было нешта ад Янкі Купалы (калі меркаваць па ўспамінах пра генія беларускага духу), бо быў Міхась глыбінным беларусам, які ўвабраў у сябе ўсё спрадвечнае, наскае, невынішчальнае. І ў людской гамане, у мітусні зямной быў ён заўсягды сам-насам з сабой, нейкім

чынам «быў сіратою і між людзей». Гэта герой кажа ўсё-ткі ад імя аўтара: «Было сіратліва і холадна ў мяне на душы». Жыў Міхась «у душэўна прыдуманым жыцці». Гэта пра сябе кажа пісьменнік: «У мяне падбілася душа... я жыць спяшаўся, я пачуццямі падганяў сябе — я стаміўся...» Міхась бывала паўтараў радок Мікалая Забалоцкага: «Не позволяй душе лениться», бо адчуваў «непамернасць адчутых на ўсё жыццё наперад і радасцяў, і шчасця, і тугі», адчуваў «напружанне духоўнага зроку».

На зломах гісторыі вырастаюць асобы. Вайна 1941–1945 гадоў, як гэта ні парадаксальна гучыць, пэўным чынам абудзіла нацыянальную свядомасць у ацалелай ад рэпрэсій бальшыні беларусаў. На нейкі час была знята з абвесткі дня барацьба з нацдэмамі. Беларусам дазволена было, паміраючы за імперыю, называць сябе беларусамі. Дый сама схамянулася беларуская душа, змагаючыся са смерцю. Адначаснікі Міхася Стральцова, і ў першую чаргу сам Міхась, родам з вайны. Жах і гора на кавадле бязлітаснасці выкоўвалі малечую душу ўражлівай, спагадлівай, балючай.

Біяграфія душы пісьменніка ў ягоных творах, ці ідзе расповед ад першае асобы ці голасам героя ягонага. Гэта на сябе малога глядзіць сталы майстар слова: «У дзяцінстве, у сваім вясковым дзяцінстве, гэта быў надзвычай уражлівы хлапчук... парывісты і адначасна ціхманы, зацяты і ў той жа час быстры на слёзы. Можна сказаць, што душа ягоная ўбірала ў сябе многа, і можна сказаць, што яна была надзелена здольнасцю разумення і хацення дабра, і разумення людзей, але не таго хцівага, саманадзейнага разумення, заручанага з адным днём, а другога, журботнага і трохі безнадзейнага, без выгодаў для сябе: яно благога чалавека прымушала шкадаваць гэтак жа, як і добрага, — хаця б за тое, што ён благі... Расказаць трэба было пра юнака, які безразважна і смела рынуўся ў жыццё і не ашчаджаў сябе, шчыра беручы ад людзей і гэтак жа шчыра аддаючы ім жыццё... Яму здавалася, што не можа быць на свеце чалавека, які, уведаўшы, не палюбіў бы яго: ну хаця б за гэтую ягоную прагу спагады і ласкі для сябе і для ўсіх! Толькі

часам, у шумлівым разгары ягонай з людзьмі злагады і любові, нечакана задумлівым рабіўся ягоны пагляд, і здавалася тады, што цішыня, высокая і сцярожкая, вырастала за ім, і адчуванне было такое, нібыта нехта ў яго стаяў за спіной. І час надышоў, і пабурылася за спіною цішыня, і бяда пастукалася ў дзверы, і зазнаў ён тое, што хоць аднойчы ў жыцці зазнае кожны чалавек: і расчараванне, і адчай, і нудліва-вінаваты позірк сяброў, і нетрывалую ласку жаночага сэрца...»

У Міхася Стральцова няма традыцыйнага ў беларускай літаратуры супроцьпастаўлення вёскі гораду. Як прызнаецца герой апавядання «Сена на асфальце», яму «хацелася, даўно хацелася прымірыць горад і вёску ў сваёй душы, і гэта была... самая патаемная і самая душэўная думка». Бо без прытулку іх у душы, яны халодныя сіроты — вёска і горад. Сена на асфальце — гэта сталася азначэннем не аднаго пакалення вяскоўцам, якія пацягнуліся ў горад па навуку, па капейку, нарэшце на ўцёкі з калгаснага прыгону. З вёскай іх лучыў сум, горад маніўся са скупасцю ліхвяра даць нешта накшталт радасці. Але дзеці вёскі ведалі, што «навучыцца смутку нельга, як нельга навучыцца і радасці». Вока помніла пару «ружовага промня і сумна-звонкай дзявочай песні», «панаванне прыцемку на мяжы святла», «халодны вобмарак травы», «яблык пераспелы і светлы, як даўняя журба», вуха чула «вясною... самае маладое рэха», «спалоханы гэгат гусака на тарфянішчы, настылы звон калодзежнага вядра», голас памятаў, што «раніцай нельга моцна гаварыць», каб не спалохаць, каб не абразіць яшчэ сонную цішыню.

Відушчая памяць чуйная да шолахаў, пахаў, фарбаў.

Такая цёплая вада,
Такая жоўтая вада —
Ад сонца, можа, у якога
Агністым вехцем барада.
Стаю ў вадзе, малы і босы,
Між пальцы шчэміцца трава.
А жабы кумкаюць. Як восы,
У вочы промні. Галава
Цвіце здзічэлаю сурэпкай.

Ад рабаціння твар пячэ...
І ўладай нечай, гэткай чэпкай,
Я і дагэтуль там яшчэ.

Вяртанне ў маленства — вяртанне да сябе, да вытокаў, да каранёў, якімі прараслі аблачынкі летуценняў, бо «на сініх лугах маленства вырастаюць надзеі».

Гэта ў маленстве «стаяў маладзічок у купцы тоненькіх воблакаў, стаіўшыся, як рыбіна ў траве». Ён так і застаўся стаяць ва ўспамінах і згадках праз усё жыццё падлетка-маладзічка, няспуджаны, не прагнаны суравеямі зямных клопатаў.

Цвердзяць, што душа можа пакідаць цела і глядзець на ўсё зямное з недасяжных вышыняў. І стральцоўскае адчуванне ў падтрымку таго: «Былі ў мяне незабыўныя, поўныя глыбокага сэнсу хвіліны: як бы збоку паглядзеў я на сябе, на сваё жыццё і злётаў душою і думкаю ў маленства». Пісьменнік, як гэта і належыць сапраўднаму творцу, уздымаўся над усім побытавым, зямным, уздымаўся над сабой самім плоцевым. І зусім натуральна гучыць, скажам, такое: «І яшчэ я адчуваў твой твар».

Міхась Стральцоў быў летапісцам душы, яго цікавіла «жыццё душы, дрымотнае, як звон вады, тамлівае, як сіняя намітка смугі».

Відушчая душа ўсё помніць, усё бачыць. Аднолькава няўтульна ёй і ў вёсцы, і ў горадзе. Адзіны паратунак — думка. Пакутная і суцешная, пякучая і халодная, як вечнае святло зорак. Майстра кінуў як бы мімаходзь, каб акрэсліць нараджэнне думкі: «Гэта было падобна на боль і не падобна на думку».

Гадаванец сініх лугоў маленства ўсё прыкмячае ў горадзе, абжывае яго сваёй душою, пасяліўшы душу кватараваць у горадзе. Пісьменнік бачыць, як «ліхтары гарэлі асуджана-роўна, нібы не верачы ў сваё святло», як п'е газіроўку ўраніцы «сасмяглы ад кахання студэнт».

Міхась Стральцоў пашанліва ставіўся да цішыні Сусвету, бо яму «пра ўсё расказвалі гукі». Лугі жыцця ў творах акварэліста і філосафа поўняцца краскамі і гукамі, яны, лугі жыцця, ахінутыя смугою думкі, якая зрэдчас дазваляе сабе пакунежыцца ў мурожнай духаце.

Тыя, чыё маленства было абвуглена вайной, заўчасна пацягнуліся да шклянкі — спачатку самагонкі. Датычылася гэта і герояў Міхася Стральцова, як зрэшты і самога аўтара. І ішло гэта не ад добрага жыцця. У гэтым была сама змрочная наканаванасць. І ніхто з адначаснікаў у літаратуры не перадаў так балюча дакладна першы рух рукі да шклянкі пад нязлым прымусам старэйшых, як «дрыжэла ў яго рука; паднёс шклянку да рота і неўсвядомлена, сутаргава хапнуў паветра. Яму адразу ж заняло дых, і калі ўжо горла апякла вострая і душная гарката, калі на вочы навярнуліся злыя слёзы, невыносна стала ад думкі, што гэта, мабыць, не скончыцца ніколі...»

У маладыя гады здаралася аднагодкам Стральцова ўцякаць у гарэлку, як у партызаны, ад рэчаіснасці, чарнейшай за гудрон, нудзьгуючы па сініх лугах маленства. Здаралася і нам праводзіць афіцыянтку з рэстарана, праўда, не ўсе заўважалі, што ў афіцыянткі «незразумела халодныя рукі».

Усё сваё нядоўгае жыццё Міхась Стральцоў шукаў узаемапаразумення з душой. Нялёгкія былі пошукі, і спатыкаўся на зямной дарозе, і падаў з абрываў духу. Ды ўсё ж знаходзіў узаемапаразуменне гэтае. Часта сняцца сны стральцоўскім героям. Сон — гэта кароткі адмежак часу, калі душа як бы ідзе ўпрочкі, падаючы чалавеку весткі пра сябе. Сон — як бы рэпетыцыя тых вечных прочак, у якія ўрэшце пойдзе душа. У сне чалавек спачатку расце, а потым старэе. У сне чалавек вяртаецца дамоў.

І мне прысніліся дубровы
І на таку дзіцячы след,
Раней не сказаныя словы
І на касьбе скупы абед.

Дзень сарамлівы, дзень уцешны
Глядзеў з-пад дзедавай страхі.
І сон мой быў не так і грэшны,
Хоць сніліся мне і грахі.

Гэта вечнае прадчуванне развітання з зямным жыццём. Яго адчуваюць усе сапраўдныя паэты.

Некалі Тарас Шаўчэнка ў выгнанні ўбачыў на гарачым пяску дзіцячы след і не мог стрымаць слёзаў. Ледзь не стаў той след, як у казках, капытковым з вадой зачараванай.

Вуснамі аднаго са сваіх герояў Стральцоў кажа: «Я зразумеў, што галоўнае не ў тым, каб дасягнуць, не ў выніку, які з'яўляецца проста як вынік, адасоблена ад усяго, а ў адпаведнасці гэтаму выніку нас саміх. У адпаведнасці мэты выніку».

У Міхася Стральцова была высокая мэта — далучыць беларускую душу да Сусвету годна і раўнапраўна, мудра і прасветла. І талент дасягнуў мэты.

Па крыўднай традыцыі нашай (ды ці толькі нашай?) літаратуры творы Міхася Стральцова ацэньваліся па іхняй сапраўднай вартасці за межамі Беларусі. (Такое ж стаўленне было да Уладзіміра Караткевіча — пры жыцці новага класіка нашае літаратуры.)

Хаця б адзін з багатых прыкладаў. Калі ў Англіі выходзіла як бы анталогія беларускай прозы, яна называлася імем апавядання Міхася Стральцова «Смаленне вепрука». Мне аж захацелася было тады напісаць усмешлівы панігірык:

Ні воўны, ані малака
З Пегаса —
І паэт натхнёна
Дагэтуль смаліць вепрука,
Аж дым ідзе да Альбіёна.
Навэндзіць лірык кумпякоў
І зноў за прозу —
Для вякоў!

У сапраўднай загадкавасці сама яснасць, у сапраўднай яснасці сама загадкавасць.

Нарадзіўшыся, чалавек пачынае развітвацца з жыццём. Творца рана адчуваў, як «краналася яго сваім крылом празрыста-халодная вечнасць, ці іначай — небыццё». Невыпадкова адну са сваіх кніг паэзіі Міхась Стральцоў назваў «Цень ад вясла». Ад вясла, якое падганяла човен па рацэ жыцця. І, неназвана, ад вясла, якім спаконвеку вяслуе Харон...

У адным сваім вершы Міхась Стральцоў пісаў:

Я сніў, што сам я адляцеў —
Душа ўзяла і засталася.

І глядзіць на нас душа Міхасёва. У позірку гэтым нязлы дакор і нястомлены сподзеў, чулае спачуванне і панавіты прымус наступнікам: жывіце і думайце, чуйце і адчувайце! І памятайце...

Леанід Дранько-Майсюк

Выгнаны патрыцый

Пра Яго звыклі пісаць — паэт, празаік, эсэіст, крытык.

Жанрава так яно і ёсць, але сутнасна быў Ён і застаўся перш за ўсё паэтам, хаця (парадокс?) найпаўней выказаўся ў прозе і эсэістыцы.

Пра гэту дзіўную асаблівасць Яго таленту скажу крыху пазней.

Што да Ягонай крытыкі, то мушу адзначыць — большасць артыкулаў, прысвечаных творчасці Янкі Брыля, Панчанкі, Барадуліна, Карамазава, Кудраўца ды іншых, абумоўлены аўтарскай прыязнасцю да названых пісьменнікаў і праз гэта шмат страцілі ў сэнсе мастацкай аб'ектыўнасці...

Пра сябе, паэта, Ён сказаў:

Мне звышнадзённай тэмы не падняць,
Як не пазбыцца і лірычных трантаў.
Як барытону можна заспяваць
Напружана-задзірыстым дыскантам?

Каб так зрабіў, каб гэтакі наіў
Мяне завабіў на сцяжынку моды,
Дальбог, павыміралі б салаўі
На ўчастку мне адведзенай прыроды.

Мне б так сказаць: «Я здолеў заручыць
Сябе з уласнай думкай, і свой голас

Птушынай песняй здолеў надтачыць, —
Сабраў расу, якою ўмыўся колас».

Самаатэстацыя вычарпальная, і сваёй, у першай і другой страфе, іроніяй яна не надта заахвочвае пісаць пра Яго паэзію.

Бо што можна сказаць пра гэту паэзію, якую генетычную тайну адкрыць, калі сам аўтар раскрыў ці не галоўную сваю творчую крэда-таямніцу: «...Я здолеў заручыць сябе з уласнай думкай...»?!

Але, мусіць, ёсць неблагое выйсце ў тым, калі паспрабаваць аўтару пакінуць аўтарава, а сабе сваё — гэта значыць, няпэўныя здагадкі, заснаваныя на больш-менш уважлівым прачытанні вершаў.

Хай будуць гэтыя, менавіта няпэўныя здагадкі, бо нешта ж таксама няпэўнае карціць, не дае душы супакоіцца, з трывогай прымушае думаць пра паэта, што «...сабраў расу, якою ўмыўся колас», што імкнуўся «...пабачыць, як свой кіне цень лясная елка на паляну», акумулюючы ў гэтым сціплым жаданні «пабачыць» і сэнс творчасці і, магчыма, сэнс жыцця.

Так, няпэўныя здагадкі (пэўныя пакінем жывым класікам) найбольш прыдатныя ў гаворцы пра мастака, чый зямны шлях завершаны і чыя прыжыццёвая драма ўраўнаважваецца высокім спакоем...

Калі б злы ці добры чараўнік ператварыў Яго ў музычны інструмент, то на гэтым інструменце можна было б граць толькі мінорную музыку.

Я не хачу сказаць, што вясёлыя хвіліны (ці наогул радасць) заўсёды абыходзілі Яго. Вядома ж, не.

Радасць (творчая, сямейная — нарэшце, інтымная) была.

Адна з кніг яго, дарэчы, так і называецца «На ўспамін аб радасці».

Аднак жа відавочна і тое, што не радасць дамінавала ў Яго характары, не весялосці выпадала быць запаветным пачуццём.

Калі весялосць і з'яўлялася, то абавязкова ў журботнай афарбоўцы.

Невыпадкова ж Ён прамовіў: «О весялосць у восеньскай журбе!»

Невыпадковае і такое прызнанне: «Я вінават, што скрухай змучан...»

А вось гэтыя радкі гучаць, як нейкі выдых псіхалагічнай устойлівасці:

За днём зара ідзе, а ноч вядзе заранку
Свяціць табе спагадай, мне — журбой...

Яго мастакоўская свядомасць знаходзілася па-за межамі штучнай драматызацыі канкрэтнай з'явы ці прадмета, гэтаксама як і песімістычнай зададзенасці ў выяўленні самага імгненнага свайго пачуцця.

Проста самім жыццём Яму быў наканаваны выбар на карысць смутку, і таму нават звычайная сасна, якая ў іншых паэтаў выклікае столькі аптымізму, уяўлялася Яму не чым іншым, а тарпейскай скалой — вобразам нейкай прадвызначанай асуджанасці, і асуджанасць гэтую (сваю ці наогул чалавечую) Ён успрымаў як бездакорную справядлівасць, не наракаючы ні на Бога, ні на будзённае жыццё.

Непазбыўная нота жалю ўвесь час працінала Ягоную надламаную постаць, і Ён звыкся з гэтай нотай.

Ён не проста сумаваў, а жыў сумам — не сумна, а менавіта сумам, як начныя кветкі жывуць расой.

Ягоны сум быў тоесны маўклівасці, а ў больш пашыраным (надбытавым) значэнні — тоесны творчаму маўчанню.

Ён называў сваё маўчанне звонам навыварат.

Звон навыварат — адсутнасць музыкі.

Ёсць людзі, якія і ў маўчанні здаюцца вясёлымі.

Ён не ведаў такога псіхалагічнага стану.

Ягонае маўчанне было без дамешкаў гарэзіі ці прыхаванай блазноты; яно нічым не сагравалася, акрамя тытунёвага дыму.

У вершы «Аднойчы ноччу...» Ён убачыў сябе, маўклівага, праз свайго двайніка:

... калі ты раніцай курыш,
разгублены і задуменны,
мне балюча глядзець на цябе.
І днём між людзей ты ходзіш

нейкім далёкім рэхам
і цыгарэт выкурваеш болей,
чым прамаўляеш слоў.

Адчуваецца нейкая гранічная безвыходнасць у тым, што раніца пачыналася з курэння, разгубленасці і задуменнасці, што ўсё гэта пераходзіла ў дзень, калі Ён апынаўся сярод людзей, але не самім сабой, паэтам, а «нейкім далёкім рэхам», і таму ў надзеі знайсці сябе даводзілася цыгарэт выкурваць больш, чым прамаўляць слоў.

Так, ён шмат курыў.

Попельніца і цыгарэта геральдычна аздаблялі Яго пісьмовы стол.

Гэту характэрную дэталь не прамінуў мастак Аляксандр Шэвераў, калі афармляў кнігу «Мой свеце ясны».

На форзацы гэтай цудоўна аздобленай кнігі — бела-сіняя попельніца, у якой запаленая цыгарэта.

Побач з попельніцай аркуш паперы з завостраным алоўкам.

Дарэчы, папера чыстая, на ёй — ніводнага слова.

Алкаголь —— гэты класічна-славянскі прывід радасці — доўгія гады не абмінаў Яго, але не ператварыўся ў вобразны лад вершаў.

Толькі ў прозе, у аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь», ёсць сакавітая, па-жыццёваму дакладная сцэна выпіўкі.

Курэнню ж у вершах адведзена даволі радкоў, і сама гэта згубная, з пункту гледжання медыцыны, звычка, з'яўляючыся, відаць, не адной толькі фізіялагічнай патрэбай, стала не проста ўласцівай Яго паэзіі (прозы таксама) асаблівасцю, а неад'емным, хочацца нават сказаць, сакраментальным матывам Яго творчага існавання.

Памятаю, як у адным маім празаічным чарнавіку Ён прачытаў пра папяросы «Нёман». Вельмі здзівіўся: «І ты, старычок, памятаеш пра іх!»

І доўга глядзеў на мяне з нейкай асаблівай настальгічнай уважлівасцю.

Яму было прыемна, што я памятаў папяросы, папулярныя ў Яго шасцідзесятыя гады.

Да знаёмства з Ім я быў амаль абыякавы да тытуню, але назіраючы, як Ён з цыгарэтай засяроджана думае, смуткуе, моўчкі жыве сабою, маё стаўленне да курэння памянялася з абыякавага, скажам так, на філасофскае...

Ён быў упэўнены: шчаслівая хвіліна прыходзіць да чалавека ў яго апошні дзень, але пры той абавязковай умове, калі чалавек будзе бачыць сонца, слухаць птушку і звон вясновай вады.

Сам жа гэтай шчаслівай хвіліны не дачакаўся.

Не было ні сонца, ні птушкі, ні вады.

Заместа вясновай прыроды — быў казённы анкалагічны ложак.

Нешта накшталт прадбачання свайго фізічнага фіналу выдыхнулася ў адным з вершаў:

І што тут казаць? Бывае...
Палата, рэжым і пасцель.
І ўсё-такі хай нас мінае
Вось гэта журботная бель.

Журботная бель не мінула і відавочна ўзбуйніла маральную якасць Яго паэзіі — паэзіі, пазбаўленай хлусні.

Да старасці Ён не дажыў і, мяркую, памёр у сваю пару, у той час, калі паэзіяй сталі пагарджаць самі паэты.

Зрэшты, мог пакінуць нас і раней, у тым жа 1984 годзе, калі памёр Караткевіч, ці на тры гады пазней, як і памёр.

Не гэта істотна.

Істотна іншае — памёр Ён з крыўдай на сяброў.

Яго сябры-літаратары, людзі з талентам і душой, пачыналі з рамантычнага паразумення, з магіі слова, а скончылі (цяпер гэта відавочна) холадам лічбаў і банальным прагматызмам.

Ён лічыў гэта здрадай самой прыродзе мастацтва.

Не, Ён не зайздросціў прагматыкам, але адчуваючы, што з імі, абачлівымі філолагамі, у Яго застаецца ўсё менш і менш душэўнай еднасці, пачынаў думаць пра старасць — гэта значыць, развітваўся з маладосцю, асноўнымі дзейнымі асобамі якое з'яўляліся былыя сябры.

Цяжка ўявіць Яго старым ды яшчэ з кавенькай, тым не менш Ён марыў пра сваю арэхавую кавеньку — увасабленне журботнай немаладосці.

Ён з ліку тых рэдкіх літаратараў, якія маюць духоўны ўзрост, а гэта, як вядома, нешта зусім іншае, чым проста гады, што складаюцца ў звыклае жыццё; гэта талент той кранальнай памяркоўнасці, якая дае магчымасць паверыць у неверагоднае — ну хоць бы ў тое, што сярод людскасці (слова Гарэцкага, якога Ён вельмі любіў) можа існаваць толькі адзін кепскі чалавек.

Ён жыў з гэтай верай, жыў не ідэямі — пачуццямі, дзеля адлюстравання якіх цярпліва чакаў свайго слова.

Менавіта слова, а не слоў.

Ягоная лексічная ашчаднасць, здаецца, перавышае ўсе магчымыя ўяўленні аб стылёвай лапідарнасці.

«Я хачу напісаць радок, толькі адзін радок...» — прызнаўся Ён у кнізе «Ядлоўцавы куст».

Заўважце, не верш, а толькі радок.

І ў той жа кнізе можна знайсці яшчэ адно характэрнае прызнанне: «Прысніўся верш — не верш, а два радкі...»

Ніхто з нашых паэтаў так не набліжаўся да патрабавання Малармэ шанаваць чысціню паперы.

І як тут зноў не ўспомніць, здзіўляючыся інтуіцыі мастака Аляксандра Шэверава, афармленне кнігі «Мой свеце ясны», на форзацы якой сярод іншых дэталяў змешчаны і ліст паперы, не крануты (!) алоўкам.

Ён не загаворваў пачуцці, а далікатна выяўляў іх; калі адчуваў, што слова шкодзіць пачуццям, тады змаўкаў.

Ужо з першых сваіх твораў зразумеў вартасць маўчання, гаючую непатрэбнасць слоў. Пра гэта добра сказана ў апавяданні «Восеньскі ўспамін»: «Ёсць хвіліны прыемнай блізкасці паміж людзьмі, нейкай ціхай узрушанасці і лагоды... Гэта добрыя хвіліны і добрая блізкасць, якой не трэба слоў».

Іншы раз маўчанне перарывалася вершамі, выпадковымі для Яго.

Назаву гэтыя няўдалыя вершы дзеля ўдакладнення сваёй чытацкай незадаволенасці — «26 красавіка, 1966», «Размова з часам», «Партызанская гармата», «Усім сказаць: была, была бамбёжка...», «Эпіграма».

Тут навідавоку ваенна-сацыяльная канкрэтыка, плоская спроба іроніі, адным словам, нешта тое, што наогул неўласціва Яго пісьму, якое ў свае шчаслівыя парнаскія моманты жывілася не гэтай груваcткай канкрэтыкай, не выдуманай іроніяй, а датклівай эмпірыкай — усё той жа разгубленасцю, псіхалагічнай няпэўнасцю, усё тым жа непадманным сумам.

Яму заўсёды патрэбна была адлегласць паміж выпадковым уражаннем і неабходным назіраннем, і калі яна з'яўлялася, то выяўленне яе іншы раз было самым шчасліва-немудрагелістым:

Стоячы перад люстэркам,
ён доўга сябе пазнаваў...

Ён паэт неаўтабіяграфічны.

Зрэшты, уся наша паэзія такая.

Паспрабуйце, напрыклад, у вершах Янкі Купалы ці Анатоля Вярцінскага знайсці дакладныя прыкметы іхняга жыцця.

Не знойдзеце.

Аўтабіяграфізм, калі і прысутнічае ў беларускай паэзіі, то абавязкова з нейкім асаблівым, цяжкім для чытання кодавым знакам.

У гэтым сэнсе наша паэзія даволі зашыфраваная, ва ўсякім разе не такая адкрытая, як, напрыклад, руская.

У Яго вершаваных краявідах, і ў празаічных таксама, дамінуе ўмоўнасць — Ягоная вёска не мае канкрэтнай назвы, як і Ягоны горад.

Гэта Вёска ўсіх нашых вёсак, і Горад усіх нашых беларускіх гарадоў.

Дакладна пазначаны хіба што літаратурна-міфалагічныя алюзіі і вобразы.

Але калі вобразы літаратурныя ўвайшлі ў Яго паэзію тэматычна, як у вершах «Пачатак», «Купала», «Міцкевіч на Беларусі», «Вечаровае», «Экспромт» — то вобразы міфалагічныя ўзбагацілі Яго пісьмо на больш высокім — сэнсавым узроўні.

Тут я маю на ўвазе і радок пра сонечнага Феба («Развагай сталае пары...»), і верш пра неасцярожнага Фаэтона («Фаэтон»),

і згадку пра Кастальскую смагу («Прыехаў сябра»), а таксама згадку пра гаючы эфірны скавышок («А будзе час, калі і без нагоды...»).

Ягоная паэзія — творчасць стомленай душы, разгубленай не так перад жыццём, як перад сваімі пачуццямі.

У зборніках «Ядлоўцавы куст» і «Цень ад вясла» ёсць яшчэ нейкі бунтоўны штуршок, надзея на ўсё тое ж каханне, аднак у апошняй кнізе «Мой свеце ясны», нягледзячы на яе праставата-бадзёрую назву, ад гэтай надзеі застаўся толькі цень.

Дарэчы, цень — любімае Яго слова, таксама, як і сініца — птушка, вобраз неабароненасці і душэўнага святла.

Ён не трымаў сініцу ў руцэ і не імкнуўся лавіць яе — проста любіў слухаць, любіў вітацца з ёю, стоячы ў ценю.

Цень — прытулак для патрыцыяў, пазбаўленых матэрыяльнай улады.

У адным з вершаў, якраз у тым, дзе сасна ўявілася Яму тарпейскай скалой, Ён жартоўна ахрысціў сябе выгнаным патрыцыем, не падазраючы ўсёй праўдзівай дакладнасці такой самаатэстацыі.

І сапраўды ў нашым прыгожым пісьменстве Ён быў выгнаннікам з літаратурнага сената — самакрытычным арыстакратам слова, якому было балюча глядзець на свае ранейшыя здабыткі, асабліва празаічныя.

На зборніку прозы «Журавлиное небо» трэцяга верасня 1983 года Ён зрабіў мне такі надпіс: «Браце Леанід! Мне здаецца, што ўсе ўжо забыліся пра маю прозу, і мне ж самому згадваць пра яе балюча — ці надару цябе чым новым? Маліся за мяне. Твой Міхась Стральцоў».

Ён дарэмна хваляваўся, пра Яго прозу не забыліся ні даўнейшыя чытачы, ні пакаленне маладзейшых пісьменнікаў.

Немагчыма было забыцца, бо ў гэтай прозе перажытае тоесна лексіцы, і аўтарская інтанацыя бездакорная роўна настолькі, наколькі гэтага патрабавала цнатлівасць пачуцця.

Дык вось, калі Ягоная паэзія — творчасць стомленай душы, для якой боль, выказаны ў слове, не застаецца словам, застаецца

самім сабой — болем, то проза (у тым ліку і «Загадка Багдановіча») — маладое свята сінтаксісу, у якім і боль, і радасць, і тужлівы роздум яшчэ неад'емныя ад слова.

З цягам часу ідэалізм гэтай неад'емнасці даўся ў знакі, ледзьве не ператварыўся ў таўталагічны прыгнёт, і Ён зразумеў, што неабходны змены — стылёвыя, жанравыя, нават светапоглядныя.

У «Смаленні вепрука» — апавяданні апавяданняў беларускай літаратуры, — пішучы эпітафію няздзейсненаму твору, Ён напісаў эпітафію і сабе, празаіку.

Мастакоўская метамарфоза адбылася — ідэалізм прозы канчаткова саступіў свядома абранай паэзіі.

Вядома, у гэтай метамарфозы былі і больш значныя падставы: назаву іх нацыянальна-спадчыннымі.

Ён, беларус, як ніхто з нашых пісьменнікаў адчуваў, што належыць да нацыі, якая ўсё яшчэ лепш сябе выказвае ў паэзіі, чым у прозе.

Гэта асаблівасць, як вядома, тлумачыцца перш за ўсё маладосцю беларускага этнасу, больш пачуццёвай, чым разумовай спецыфікай яго мовы.

На жаль, Ягоная творчая метамарфоза не была пазбаўлена істотнай супярэчнасці. Свядома выбіраючы паэзію ў адрозненні ад прозы, дзе выбар жанру быў непрадузяты, мала залежны ад рацыянальных умоў, жадаючы выказацца лепш, абсалютна па-беларуску, Ён не пазбег і не мог пазбегнуць своеасаблівай антыноміі.

Назаўсёды развітваючыся з прозай, не падазраваў, што Яму, як мастаку, найпаўней наканавана было выказацца не ў паэзіі, а менавіта ў прозе, дзякуючы якраз непрадузятасці выбару апавядальнага жанру.

Прадчуваю пытанні: дык што, паэзія — памылка ў Ягонай творчай анкеце і Ён не паэт?! А як жа тады разумець пачатковую думку гэтага артыкула, што сутнасна Ён быў і застаецца паэтам?

А так і разумець, што перш за ўсё Ён паэт, і не толькі ў вершах — у апавяданнях і ў эсэ таксама.

І чыста жанрава Ягоная паэзія ніякая не памылка, а запозненае дзіця, народжанае не ад юнацкай страсці, а ад сталага жадання мець яго.

Яшчэ могуць быць пытанні: што значыць «назаўсёды развітваючыся з прозай, Ён не падазраваў...» і г. д.?!

А калі Ён не мог далей пісаць?!

А калі Ён скончыўся як празаік!

Не, не скончыўся і пісаць мог такія ж, як і пісаў, апавяданні, нават аповесці.

Але Ён не мог сабе дазволіць паўтораў, таму развітанне з прозай было прадвызначана.

Пра «Загадку Багдановіча», бясспрэчную Яго мастацкую ўдачу, трэба сказаць асобна — асобна ў тым сэнсе, што гэта не хваласпеў самаму трагічнаму нашаму песняру, гэта, калі хочаце, інтэлектуальны ўздых, нават плач па нашых страчаных магчымасцях.

Асноўны матыў «Загадкі» скрушлівы — нарэшце лёс даў Беларусі паэта, праз творчасць якога Беларусь магла б эстэтычна рэалізавацца ў свядомасці свету гэтаксама, як, напрыклад, Францыя рэалізавалася праз творчасць Верлена.

Магла б, каб не занадта кароткі век паэта!

У выніку праз Багдановіча, праз тое, што ён паспеў напісаць за свае няпоўныя дваццаць шэсць гадоў, Беларусь здзейснілася толькі дзеля сябе самой — гэта значыць, не ў свядомасці свету, а толькі ў сваіх яшчэ не надта нацыянальна-ўстойлівых думках і адчуваннях.

Для мяне, чытача, тэкст «Загадкі» — звычайны; незвычайная ж пазатэкставая прастора, у якой аўтар і герой набываюць непарыўную еднасць.

Мастацтва, радзіма і жанчына — вызначальныя каардынаты гэтай еднасці.

У адносінах да мастацтва яны, аўтар і герой, сышліся на апалогіі Сальеры (праўда, пры гэтым не адмаўляючы і мацарціянскаму падыходу да творчасці); у адносінах да радзімы іх аб'яднала пакута; у адносінах да жанчыны — расчараванне, якое вынікла з неадпаведнасці выпадковай асалоды сямейнаму шчасцю.

Але ў гэтым яна і ёсць, доля паэтаў — за хараство кароткай асалоды расплочвацца перадсмяротным расчараваннем.

1994

Алесь Асташонак

За мяжою звычайнага

Сказаць, што Міхась Стральцоў мой кумір?..

Калі перачытваю «Смаленне вепрука» мо ў які пяцідзясяты раз, не пакідае ўражанне: гэтай рукою тады Творца вадзіў. Рукою Творцы Стральцова вадзіў найвышэйшы Творца. Напэўна, не выпадкова крахатуліна-глыба стала стральцоўскім развітаннем з прозаю. «Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг».

Стральцоў для мяне адзін з нямногіх богаабраннікаў у сучаснай нашай, як мог бы ён, сцішана ўсміхнуўшыся, сказаць, «изящной словесности».

Дзякуючы Багдановічу і Коласу я пакінуў пісаць на расейскай мове, а Стральцоў быў першы з сучасных суайчыннікаў-літаратараў, хто ўразіў мяне:

«Расказаць трэба было пра юнака, які безразважна і смела рынуўся ў жыццё і не ашчаджаў сябе, шчыра беручы ад людзей і гэтак жа шчыра аддаючы ім сваё. Ды і што тут было ашчаджаць ці шкадаваць! Яму здавалася, што не можа быць на свеце чалавека, які, уведаўшы, не палюбіў бы яго: ну хаця б за гэтую ягоную прагу спагады і ласкі для сябе і для ўсіх! Толькі часам, у шумлівым разгары ягонай з людзьмі злагады і любові, нечакана задумлівым рабіўся ягоны погляд, і здавалася тады, што цішыня, высокая і асцярожная, вырастала за ім, і адчуванне было такое, нібыта нехта ў яго стаяў за спіной. І час надышоў, і пабурылася за спіною цішыня, і бяда пастукалася ў дзверы, і зазнаў ён тое, што хоць аднойчы ў жыцці зазнае кожны чалавек: і расчараванне, і адчай, і нудліва-вінаваты позірк сяброў, і нетрывалую ласку жаночага сэрца».

Мала каго Бог надзяляе гэткім тонкім пяром, гэткай глыбока ўнутранай, прыроднай (не нажытай-паказной-падманнай) інтэлігентнасцю, якую не запэцкаць анічым, бо яна іскрыцца шчодра з скупой-закрытай-адкрытай душы. Тут няма ніякае блытаніны. Гэта быў дужа нестандартны чалавек. Вельмі ўжо НЕПРАНУМАРАВАНЫ.

Можна сказаць, была загадка Багдановіча, «Загадка Багдановіча», была і загадка самога Стральцова. І не было адначасова ніякае загадкі. Быў Талент. А ён заўсёды — загадкавы і дзесьці ясны. Ну чаму так назваў Стральцоў сваю кнігу — «Мой свеце ясны»?..

Быў яшчэ Чалавек пад Богам. Быў яшчэ і Д'ябал перад ім. Чорны чалавек. Пра якога сам Стральцоў пісаў. Без змагання Бога з Д'яблам не бывае і самага прымітыўнага жыцця. А тут вунь якое яно: «Адзін лапаць, адзін чунь» — і жыццёвая мітрэнга. Зрэшты, мітрэнга гэтая і адбілася жыватворна ў лепшых стральцоўскіх творах. Творы сталі гожым люстэркам ягоных, даруйце, пакутаў, памкненняў «мятущейся души». Без мітрэнгі, што перакінулася ў высокае душэўнае напружанне, не было б і люстэрка. Люстэрка, у якое так прагна-балюча, шчымліва-соладка хочацца зазірнуць.

Нельга ні аб чым шкадаваць. Ён ёсць — ёсць такі — у адваротным выпадку яго зусім магло б не быць.

Цяпер багата хто, распавядаючы пра яго, не разумеючы зусім ладу жыцця, на ягонае падобнага, і ладу душы пры такім жыцці, піша, дзе трэба і дзе не трэба, пра ягоную слабасць, вульгарна спрошчваючы ўсё да прымітыўнае фізіялагізацыі. Спачувальна, а то і прыхавана-паблажліва разважае — ураўнаважаны і дабраўладкаваны. Нібыта па-сяброўску (і ці ж па праве?), а на самой справе выступае ментарам. Эфемерная годнасць, розумміраж. Як той, хто ніколі не бачыў мора, можа разважаць пра яго? «Вам не дано понять, что вдруг со мною стало...»

Не бывае так, на жаль: каб не пакутуючы ў жыцці пакутаваў мастак У ВЫНІКАХ ТВОРЧАСЦІ сваёй. Можа, і бывае, але тады гэта падман, які раскрываецца непазбежна і хутка. Стральцоўскай душы было што распавесці, ды толькі распавядаць мала калі было — і зусім тут не слабасць прычынаю, а сіла душэўных хістанняў, чысціня сумлення. «А ці ж можна пісаць, калі нічога не чуеш?» — сказаў ён аднойчы ціха. О, каб яшчэ колькі людзей у нашай літаратуры так чулі!..

Мы сустракаліся з ім мала. Ён па-дзіцячы цёпла расказваў пра любімага майго Юрыя Казакова, які «паліць цяпер грубку

недзе на лецішчы ў сваім Падмаскоўі». (Параўнайце: «Смаленне...» і «Во сне я горько плакал...» Не бачу раднейшых душ у нашай і расейскай літаратурах.) Прасіў называць яго панам Міхалам. З якім выразным позіркам паціснуў мне руку, калі я ішоў з літарацкай трыбуны, абараніўшы «зашытага» Лёню Галубовіча ад нападак няздары, што вялізнай сваёй заслугаю называў сваю месячную прысутнасць у Нью-Ёрку, на асамблеі ААН. (Дарэчы, цікавая драбніца: Стральцоў, здаецца, за мяжою і не бываў ніколі. Хіба што за мяжою звычайнага.) Нарэшце, расказвалі мне, у рэанімацыі, трызнячы, шкадаваў, што ён не дапісаў разам са мною п'есы. Ён, які казаў мне колісь, што не ягоны гэта жанр...

Як холадна казытнула мне сэрца паведамленне пра страшную гэтую праяву нашае блізкасці!..

Цяпер, як згадаю яго, часта прыходзіць на памяць ягоны эпіграф з малавядомага нам і любімага ім выдатнага паэта Случэўскага: «И капля вод полна страданий / и неизбежностей полна...»

І ўсё ж...

«Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг».

Алесь Разанаў

Наступны, яшчэ не аб'яўлены, змест

Рэаліі ў творах Міхася Стральцова маюць уласцівасць прыкмет. З іх можна выводзіць сімвалы, як, напрыклад, з назвы апавядання «Сена на асфальце» і, акцэнтуючы ўвагу на сацыяльным, казаць, што гэта сімвал беларускай інтэлігенцыі, якая выйшла з вёскі, а жыве ў горадзе, альбо, калі карыстацца «эстэтычным» ключом, ікэбана — дзівосны букет, што неспадзявана склаўся сам.

Аднак па сваёй прыродзе і сутнасці — гэта прыкметы. Яны самадастатковыя, поўныя жыцця, аднак яно тоіць у сабе наступны, яшчэ не аб'яўлены, змест.

Паглядзіце, якія выверанныя, важкія, дакладныя рэаліі ў тым жа «Смаленні вепрука». Яны прадчуваюць і прадбачаць тое, чаго яшчэ няма, але што мусіць здарыцца і, уцягнутыя ў вір-

туальную сферу надчасу, становяцца часткамі нейкага невідавочнага механізму.

Нават тыя персанажы, якія ведаюць, што будзе далей, у апавяданні паводзяць сябе, як быццам сумняваюцца ў сваім веданні, і шукаюць доказаў, якія пацвердзілі б, што яны не памыляюцца. Яны ўслухоўваюцца ў нешта, што прысутнічае ў наваколлі і ўведзенf ў сістэму прыкмет. І насампраўдзе не яны, а рэаліі, чуйныя, пільныя і адстароненыя рэаліі — галоўныя дзейныя асобы апавядання.

Міхась Стральцоў распазнаваў тое, што ўжо распазнала яго, прыкмячаў тое, што ўжо прыкмеціла яго. Яно, тое *тое*, было сваім, але сваім па нейкай іншай, чым у штодзённым жыцці, суадпаведнасці, па нейкай інакшай прыналежнасці; з ім было звязана самае істотнае, але, як у хованках, яно абвяшчала аб сабе і не абвяшчалася само.

У завулках старога горада, у размаітым людскім натоўпе, у жыццяпісах творцаў Міхась Стральцоў заўважаў свае знакі, якія станавіліся знакамі яго творчасці. І ўжо блізка ад яго, як надзвычайная вестка, праслізгваў човен Харона, цень ад вясла якога ён прыкмеціў. Ад яго патрабавалася адно — заставацца мастаком надалей, верыць свайму відушчаму пачатку — інтуіцыі, прымаючы ўмовы гульні, усё глыбей распазнаваць яе ўмовы, бо тое, што ў ёй загадвалася, і разгадку мела ў ёй самой. Па-за ёй — няздзейсненыя задумы, чужая рэчаіснасць...

Семантычнае поле прыкмет значнейшае і багацейшае за поле фактычных рэалій. Сюды ўваходзіць і ненапісанае.

Валянцін Акудовіч

Вусцішнасць быцця

Увесь Ён — нязбыўны сум з прычыны непазбежнасці вяртання ў нежыццё.

Мы ўсе прамінаем гэты шлях, але да пэўнае пары лішне не смуткуем з такога наканавання. А ён ці не ад пачатку ўзяў занадта блізка да сэрца неадпрэчнасць смерці — і тым жыў.

І таму так жыў, як жыў і пісаў пераважна з тае нагоды, што трэба будзе памерці (калі не фанабэрыўся, не падрабляўся, не блазнаваў).

Раней я думаў, што ягоная засяроджанасць на татальнай прысутнасці смерці ў жыцці паходзіць ад хранічнай любові да жыцця. Толькі гэта, здаецца, не зусім так. Жыццё ён, натуральна, любіў, але не больш хваравіта, чым нехта іншы. А вось *адчуваў* яго — з усімі пахамі, фарбамі, гукамі, — як мала хто яшчэ. З гэтага фатальна абвостранага ўспрыняцця існага і вынікала такое ж вострае пачуццё непазбежнасці страты ўсяго, што ёсць «пад гэтым небам сінім і любімым». Адсюль нязбыўны сум і нават у спякоту падняты каўнер, якім ён атуляўся ад сцюжы за спіной, адсюль жанчыны і віно, як марная вымога сагрэць заўсёды восеньскае сэрца, адсюль і сцішаны дакор, вымаўлены на паваротцы ў вечную засень: мой свеце ясны...

«Ёсць таленты... што самі нібы ўвасабленне пакутнага духу, адрынутага паводле нейкай незразумелай прычыны ад самога жыцця і асуджаныя трапятацца ў вечнай празе зліцца з ім».

Ён не стамляўся (і ў траве, і на асфальце) выглядаць жыццё, прагнучы адшукаць вечнае вымярэнне сваёй прысутнасці ў ім, але ўсюды з-за нечага паўставала *нішто*. Найдалей ад *нішто* было дзяцінства, і ён не аднойчы ўцякаў з дарасласці туды — у свае раннія ды маладыя гады. Аднак і там заўжды нешта (ці нехта) канала: само дзяцінства, юнацкае каханне, дзед Міхалка...

Кажуць, у яго было шмат жанчын. Напэўна, гэта насампраўдзе так, бо ён не любіў жанчын. Ён толькі персаніфікаваў жыццё ў той ці іншай жанчыне і такім чынам «заляцаўся да жыцця» «ў вечнай празе зліцца з ім». Але чым тужэй згортваўся ў каханні, тым тужлівей ападаў на сэрца сум. Бадай, з гэтага амаль адчайнага суму ён мог здагадацца, што той, хто хаваецца ад тэрору небыцця ў каханне — самахоць прыспешвае сваю невараць, бо чалавек найперш памірае ў жанчыне, а ўжо потым — сам у сабе... Ён не здагадаўся, хоць сэрцам адчуваў небяспеку і таму доўга не трываў жанчыну побач, хаваўся ад адной за другую, ці сыходзіў ад усіх да мужчын (сяброў) і віна.

Чуллівы і пяшчотны, ён шукаў у сяброўстве абароны і прытулку, а разам з тым непадманнага духоўнага хаўрусу, агульнай інтэлектуальнай прасторы, урэшце — высакароднага чыну.

І вобраз дружбы — даўні і нягоркі.
Бо мы ж яшчэ, напэўна, не забылі,
Як некалі яе адну любілі —
Ну, дружбу нашу.
Помняцца спатканні
Дзвюх нашых душ.
Любоўныя расстанні
Адна з адной. Да заўтра.
Ненадоўга.

(«Прыехаў сябра»)

Але як цялесны саюз з жанчынай, так і духоўная мужчынская сувязь істотным чынам не мянялі перспектыву небыцця. Хованкі ў каханні набліжалі да смерці, хованкі ў сяброўстве трохі адсланялі яе, аднак ні тое, ні другое не яднала з жыццём. Яднала хіба — віно; праўда, ненадоўга, і таму віна трэба было многа, і ўсялякі раз, калі яно закончвалася, гульня таясамасці экзістэнцый (ягонай і жыцця) перапынялася яшчэ вялікшай тугой...

Жыццё, смерць, каханне, сяброўства, віно... Засталося — *слова*...

Ці *слова* было наперадзе ўсяго: і сродкам, і мэтай жыцця?

А калі адно спосабам немагчымасці жыць?

Часам мне здаецца, што ён нарадзіўся не жыць, а выглядаць смерць (у восеньскай смузе, у ціўканні сініцы, «у мінулым, сённяшнім, наступным»). Крэмзанне паперы «прозай» ці «вершамі» было ўсяго толькі адным са спосабаў (а, можа, як для яго, то і адзіным) гэтай «немагчымасці жыць». І ці не таму ён кангеніяльны, тоесны свайму скрушнаму лёсу-генію там, дзе ў яго адрэфлексавана развітанне, расстанне, кананне; там, дзе памірае маладым Максім Багдановіч («Загадка Багдановіча»); там, дзе памірае дзед Міхалка («Адзін лапаць, адзін чунь»); там, дзе гіне УСЁ — вяпрук, жыццё, надзея («Смаленне вепрука»).

Дух смерці лунае над гэтым геніяльным апавяданнем, напоўненым пахамі, фарбамі і гукамі нежытва: «Ідуць ужо халады, бяруцца прымаразкі — падаюць інеем сырыя туманы. Чарсцвее зямля, і цёмным, ільсняна халодным зяленівам б'е ў вочы парадзелая пры дарозе трава. Ужо выпетрала зябліва, пасівела ў гародчыках і пазванчэла бадыллё, і панішчымніла паветра. Неба ўдзень ужо ніжэй прыпадае, ціснецца да зямлі. Яшчэ выганяюць на пашу кароў — далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле».

У «Смаленні вепрука» ён перажыў свой метафізічны сыход. Тут невараць урэшце запанавала ўсюды і найперш у ім самім. Ён сам быў тым, каго забіваюць, ён сам быў тым, хто забівае, ён сам з сябе склаў ахвярнае вогнішча і сам быў тым ахвярным дымам, што завершыў яшчэ адзін кругазварот быцця.

З тым дымам ён і адышоў у нябёсы, «а душа ўзяла і засталася», затрымалася на нейкі час і вярэдзіць маю душу ягоным сумам па немагчымасці інакш пазбегнуць смерці, як толькі памерці.

Анатоль Сідарэвіч

Абраннік сонечнага феба

1

Вось жыву я цяпер у адным добрым месцы
на адзіноце з лесам, восеньскай цішынёй,
з незразумелым пакуль мне самому
набыткам свае душы.

«Дзень у шэсцьдзясят сутак», 1964

«Добрае месца» — Каралішчавічы. Не вёска, з якое родам Язэп Пушча (ягоныя «Лісты да сабакі» я не чытаў яшчэ, але хутка прачытаю «з-пад крыса»), а Дом творчасці і адпачынку пісьменнікаў, што непадалёк ад гэтае вёскі. У гэтых Каралішчавічах у лістападзе 1964 года мы і сустрэліся першы раз.

Тады я ўжо ведаў, што ёсць пісьменнік Міхась Стральцоў, яшчэ малады, не сацрэаліст, бо ў апавяданнях ягоных няма камсамольцаў, партыйцаў, трыбуннасці і лозунгаў. Такая літаратура вабіла мяне.

У тагачасным Слуцку было дзве кнігарні: адна на Садовай вуліцы, амаль насупроць пятае школы, другая — на базары (о, Слуцкі базар!). Дык на Садовай я купіў кніжачку «Блакітны вецер». А на паўгода раней — напрадвесні 1964-га — я прачытаў у «Маладосці» апавяданне «Сена на асфальце», загаловак якога крытыка ўзяла «на ўзбраенне»: сенам на асфальце пачалі называць учорашніх вяскоўцаў, што ўцяклі ад фінагентаў і калгасных пустапарожніх працадзён у горад. У апавяданні літаральна адным мазком быў напісаны і вобраз фінагента, што здзіраў з вяскоўцаў падаткі, забіраў у іх за нядоімкі дабро. Звалі таго фінагента Куфар. Можна ўявіць, як ён вышуквае ў куфрах нядоімшчыкаў рэчы, прыдатныя для продажу ў гарадскіх камісійных крамах...

«Сена на асфальце» — гэта пакаленне, якое не магло прыжыцца або кепска прыжывалася ў месце. Гэта пакаленне і М. Стральцова, і маё. Тое апавяданне не толькі назваю ды настраёвасцю запомнілася. Яно вылучалася ў нашай навелістыцы і формаю. Незадоўга ж да нарады ў Каралішчавічах — у верасні 1964-га — мы чыталі ў «Маладосці» яшчэ адно апавяданне М. Стральцова — «На чацвёртым годзе вайны». Уразіў ужо эпіграф — радкі з невядомага нам Канстанціна Случэўскага: «И капля волн полна трагедий / и неизбежности полна».

У Каралішчавічах у мяне з М. Стральцовым, здаецца, не было ніякіх літаратурных размоў. Затое ён навучыў мяне гуляць з пушкаю з-пад запалкаў: пакласці пушку этыкеткаю дагары на краёк стала і знізу даць пстрычку; як, падляцеўшы, пушка ўпадзе этыкеткаю дагары, гульня пераходзіць да твайго партнёра, а як на этыкетку — 5 пунктаў, як на доўгі вузкі кант — 10 пунктаў, як на кароткі вузкі кант — 15 пунктаў.

Хударлявы, светлагаловы з трохі хвалістымі валасамі, шляхетна белатвары М. Стральцоў меў нягучны голас. Не прамоўца. Мог нешта казаць, казаць лагічна, паслядоўна, адале збіцца

з тэмпу, нібыта збянтэжыцца і ўжо гаварыць больш самому сабе, каб змоўкнуць.

Я спачатку не мог зразумець, чаму гэтак. Потым, здаецца, зразумеў. Нешта тлумачыла любоў Стральцова да нехрэстаматыйнае расійскае класікі — Яўгена Баратынскага, Пятра Вяземскага, Фёдара Цютчава, Апалона Майкава, Афанасія Фета, Аляксея К. Талстога ды іншых. Заўважыў я, што два радкі з расійскае класікі («Мысль изреченная есть ложь» і «Чем слово наше отзовется») заўсёды былі ў памяці ў Стральцова. Яго турбавала адвечная праблема адэкватнасці, сумеру думкі і слова, пачуцця і слова, праблема правільнага разумення ды інтэрпрэтацыі выказвання суразмоўцам. Калі падчас размовы не знаходзіў патрэбнага вызначэння ці параўнання, бянтэжыўся. Гэтым я тлумачу ягоную пэўную скаванасць у дыялогу. Гэтым я часткова тлумачу і непладавітасць, неразмашыстасць Стральцова-празаіка, Стральцова-крытыка.

Пад канец свайго жыцця ён нарэшце выкажацца пра суадносіны слова і пачуцця, слова і настрою сам:

Імгненні ёсць пакутлівага шчасця —
Ірвуцца ўвысь і слова, і душа.
Ды толькі тое ўсё ў радок не ўкласці,
Як ты яго, радок, не падвышай.

Бо адмыслова, самадастаткова,
Само сабой гаворыць пачуццё.
Тады абразай можа стацца слова,
Тады адно — цудоўнасць і жыццё!

Я не мог яшчэ сфармуляваць, але інтуіцыя мне падказвала, што пісьменніцтва для Стральцова — справа інтымная, духоўная. Але разам з тым і грамадская. Не ў тым вульгарным разуменні гэтага слова, што мастак, маўляў, павінен служыць грамадству, вызнаваць прынцыпы партыйнасці і народнасці, а грамадская ў тым значэнні, што Стральцоў служыў слову. Сказана, магчыма, велягурыста, але мяркую, што сутнасць перададзена дакладна.

Хто ведаў, што ў той час у Каралішчавічах ужо быў напісаны нарыс «Дзень у шэсцьдзясят сутак» і што гэты нарыс

неўзабаве — у студзені 1965-га — будзе апублікаваны? (Пазней аўтар аднёс гэты твор да жанру апавядання.)

Нас, маладзейшых, прывабілі развагі пра літаратуру, пра Хэмінгуэя, параўнанне амерыканскага пісьменніка з Талстым і Чэхавым. І найперш ці не гэтыя словы:

«Хіба можна ўявіць Хемінгуэя, як і Чэхава, у позе натхнёнага, красамоўнага прапаведніка вядомых ісцін? Ён ведаў, што ісціны добрыя самі па сабе, але яны перастаюць быць ісцінамі, калі імі неасцярожна кідацца, як мячыкам. А можа, хто ведае, што Хэмінгуэй любіў разважаць пра натхненне? Не, ён проста працаваў, хоць, вядома, многія выдатныя старонкі ягоных твораў не абышліся без таго, што завецца натхненнем. Чэхаў мог пісаць толькі тады, калі яго ніхто не бачыў. Нельга таксама ўявіць, каб ён, скажам, толькі што напісаны твор чытаў перад так званымі прыхільнікамі яго таленту. Хэмінгуэй, як мы ведаем, асцерагаўся чытаць што-небудзь «зацікаўленай публіцы» і выслухоўваць водгукі, накшталт такіх: «Гэта геніяльна, Эрнест. Праўда, геніяльна. Вы проста не ведаеце, што гэта такое». Сёння тая ж «зацікаўленая публіка» ім гаварыла б: «Гэта каласальна, Антон Паўлавіч! Гэта жалезна, Эрнест. Без дурняў. Са страшнай сілай»».

Пісанне — гэта тое, што называюць працаю душы. А пра гэтую працу ўголас не скажаш, не распавядзеш. Пра яе мы даведваемся, чытаючы радкі, прасякаючыся настроем аўтара, настройваючыся на лад ягоных думак, пачуццяў. Так адбываецца дыялог пісьменніка і чытача. Мажліва, самы інтымны, прадуктыўны дыялог.

Яшчэ да асабістае сустрэчы з М. Стральцовым я ўжо вёў дыялог з ім.

2

Недзе на трэцім курсе я адпусціў доўгія валасы — тады гэта было модна. І падняў каўнер курткі — гэта таксама, здаецца, лічылася, што няблага. Тады катастрафічна, увачавідкі вузелі ў хлопцаў штаны, затое так прасторна было плячам пад шырачэзнымі пінжакамі. Праўда, гэта ўжо мяне не датычыла. Доўгія

валасы — няблага. І падняць каўнер — таксама. Я чытаў тады французскія раманы. Эміль Бландэ, Люсьен Рубампрэ... Галантны век, дасціпнасць. І скепсіс. «Страчаныя ілюзіі». Партрэт «бацькі ўсіх народаў» пыліўся ў інтэрнацкай шафе-кладоўцы. «Как мало пройдено дорог, как много сделано ошибок». Не было саладзейшай спакусы, чым журба.

«Свет Іванавіч, былы донжуан», 1965

Гэта было няйначай як напружанне духоўнага зроку...

«Адзін лапаць, адзін чунь», 1966

Так здарылася, што кожны празаічны твор М. Стральцова, напісаны ў 1965–1973 гадах, быў (прынамсі для нас, маладзейшых) падзеяй.

— Ты чытаў «Свет Іванавіча...»?

Першае, пра што папытаўся Алесь Жук, калі мы сустрэліся з ім на менскім асфальце.

— Ты чытаў «Свет Іванавіча...»?

Гэта ўжо Мікола Гіль. У «ЛіМе».

Апавяданне з'явілася ў «Маладосці» пад канец 1965-га. Ужо не было Хрушчова. Патыхала палітычнымі замаразкамі. Восьвось на лаву падсудных пойдуць Андрэй Сіняўскі і Юлі Даніэль, а з Масквы прагоняць Алеся Адамовіча.

У гэтым апавяданні вабіла фронда. І тая галантнасць, дасціпнасць, з якою яна была прадэманстравана.

Зноў чытаю тыя радкі — і ахоплівае журба. Гэта не толькі пра пакаленне, што нарадзілася да вайны. Гэта і пра нашае, на дзесяць-дванаццаць гадоў маладзейшае за Стральцова. Тады прыўзнялася «жалезная заслона». Пасля Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве (1957) з'явіліся «стылягі». Катастрафічна вузелі штаны не толькі ў кавалераў, але і ў нас, падшпаркаў. А ў дзевак — спадніцы. Што і казаць — нават прэзідэнт Дж. Ф. Кэнэдзі, у вайну ўжо лейтэнант, хадзіў у вузкіх штанах і падымаў каўнер свайго палітончыка. Малады быў Дж. Ф. Кенэдзі, абаяльны. Жонка ягоная — прыгажуня. У кіно паказвалі замежную кінахроніку, прэпараваную,

але ж і з цікавымі эпізодамі. Можна было параўнаць Мікіту Сяргеевіча і яго Ніну Пятроўну з сужэнствам Кэнэдзі...

Лімітаваны (гэта значыць — абмежаваны ў накладзе і маладаступны шараговым падпісчыкам) часопіс «Иностранная литература» перадаваўся з рук у рукі. Выходзілі і кніжкі. Эрнест Хэмінгуэй, Жан-Поль Сартр, Альбэр Камю, Наталі Сарот, Сімона дэ Бавуар... І яшчэ «прагрэсіўны» Гайнрых Бёль. Па «галасах» таксама можна было сёе-тое ўчуць. Рок-н-рол...

Мы прыйшлі ў самастойнае жыццё, калі насталі замаразкі і маразм, але ў нас быў ужо сякі-такі набытак, але «жалезную заслону» ўжо нельга было апусціць дарэшты, але побач з намі былі старэйшыя — і аднадумцы, і суддзі.

Гісторыку цікава зірнуць, як мяняліся абставіны і як у гэтых абставінах мяняліся людзі.

Магчыма, найцяжэй у новых абставінах было чалавеку з талентам эпіка — Івану Мележу. Не толькі хваробы заміналі яму ў працы. Як было мастаку пісаць пра падзеі трагічных 30-х гадоў, калі на асвятленне, на асэнсаванне іх практычна наклалі табу? Вунь і Янку Брылю давялося і так, і гэтак кроіць свае «Птушкі і гнёзды»: то немцы надта гуманныя «атрымаліся», то прачытваюцца нейкія алюзіі ці то паралелі паміж гітлераўскай Нямеччынай і сталінскім Саюзам... Лягчэй было людзям, якія за прыкладам Міхася Лынькова ўзяліся пісаць, кажучы словамі Стральцова, буйнаблочную «ваенную» прозу (у літаратурным асяроддзі гэтае шматпуддзе назвалі апупеямі).

І ўсё ж «жалезная пята» не задушыла праўду дарэшты. Апупеі яшчэ толькі планаваліся, калькуляваліся (кожны з іх аўтараў дакладна ведаў, што трэба падкрэсліць «кіруючую і накіроўваючую ролю партыі», у якой прапорцыі павінны быць станоўчыя і адмоўныя героі), а мы тым часам прачытаем аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь» са свабоднымі вершамі на пачатку і ў канцы твора і з малітваю дзеда Міхалкі ў пятым раздзеле.

Я і цяпер не магу знайсці адказу на пытанне: як яе, тую малітву, прапусцілі ў друк? Пачытайце яе — гэта сапраўды хрысціянства. Я ж памятаю, як выкасоўвалі хрысціянска-рэлігійныя

матывы ў мяне... Нават у гады перабудовы нават карыфеяў — Чынгіза Айтматава, Васіля Быкава ды Віктара Астаф'ева — вінавацілі ў «Комсомольской правде» за «кокетничанье с боженькой». А тут хрысціянства ў 60-х гадах. Падкрэслю: народнае, сялянскае хрысціянства, немудрагелістае.

Гэтую малітву можна разбіць на дзве часткі: спавядальную і просьбітную. Адну цяжка адарваць ад другое, але рызыкну і працытую другую частку:

«Прашу Цябе за ўнука. Ён сірата, Ты ведаеш, і не зрабі так, каб каб ён быў сіратою і між людзей. У яго добрая душа, Ты ведаеш гэта. Пашлі выпрабаванні яму па сіле. Не зрабі так, каб надламалася яго душа пад цяжарам дабра. Але не зрабі і так, каб душа яго стала зласлівай. Палажы яму тую меру, якую не палажыў Ты мне. Я баюся дабра, але я не вінаваты ў гэтым. Не за сябе я баюся, за ўнука. Супакой сэрца дачцэ маёй: яна шмат за вайну перажыла, стала зласлівым яе сэрца. Пашлі добрага чалавека ёй, пашлі ўнуку майму бацьку. Дай яшчэ пажыць маёй старой — не будзе Табе шкоды ад гэтага, Божа... Амінь!»

Мо я памыляюся, але мне здаецца, што гэтая малітва можа быць самастойным творам. Ва ўсякім разе я не сустракаў у найноўшай беларускай літаратуры твора, роўнага ёй, такога камернага, інтымнага дыялогу чалавека (кроплі хваляў) з Богам. «Магутны Божа» Наталлі Арсенневай надаецца для калектыўнага, харавога выканання, бо там просім мы для нас, для Беларусі, а тут чалавек, выспавядаўшыся Богу, просіць для сваіх унука-сіраты, дачкі-ўдавы і жонкі. Для сябе — адно «Даруй мне, божа...» Вось гэтая камернасць, інтымнасць і надае твору высокае гуманістычнае гучанне. Гуманістычнае гучанне надае і тое, што дзед Міхалка любіць канкрэтных людзей, а даўно вядома, што любіць чалавецтва лягчэй, чым асобных чалавекаў. (Яшчэ Пётр Вяземскі пісаў: «И презирал он человека, / И человечество любил».)

Пакаленне тых хлопцаў, што адпускалі доўгія валасы і падымалі каўняры куртак ды пінжакоў, хлопцаў, у якіх «ката-

страфічна, увачавідкі вузелі... штаны», але «затое так прасторна было плячам пад шырачэзнымі пінжакамі», расло без рэлігіі, было ў пераважнай большасці сваёй атэістычным. І Стральцоў быў у ім ці не адзіным празаікам, хто пэўным чынам пераадолеў уплыў атэістычнае школы, камсамолу, партыі.

Не памятаю, каб ён заводзіў размовы на рэлігійныя тэмы. Не чуў, каб ён калі хаўрусаваўся з якімі рэлігійнымі дзеячамі, клерыкаламі. Дый з кім было хаўрусавацца? Пратэстанцкія прапаведнікі былі спрэс малаграматныя дзядзькі, варожа настаўленыя да свецкае культуры, у тым ліку да мастацкае; у папоў, якія вучонасцю і прыхільнасцю да беларускае культуры не вылучаліся, бегалі вочы (пра тое, што многія з іх працуюць на «органы», не ведаў толькі дурань); з каталіцкіх святароў пісьменнікам найбольш вядомыя былі паляк Казімір Свёнтак і беларус Уладзіслаў Чарняўскі — з іх «органы» вока не спускалі...

Жыццё складвалася так, як складвалася. Пераадольванне ўплыву школы, камсамолу і партыі, мусіць, не магло пачацца раней, чым пачалося. Юны М. Стральцоў верыў у Сталіна. Першы надрукаваны ягоны твор меў загаловак «Товарищу Сталину». Аўтару тады, у 1952-м, было пятнаццаць гадоў. Але «недзе на трэцім курсе» ён (а ў Свет Іванавічу, ведама ж, нямала ёсць ад аўтара) не толькі «адпусціў доўгія валасы» і «падняў каўнер курткі». У ягонай свядомасці адбываецца пераварот. На трэці курс М. Стральцоў пайшоў пасля XX з'езда КПСС, пасля пачутага на камсамольскім (ці партыйна-камсамольскім) сходзе закрытага пісьма ЦК КПСС пра культ асобы Сталіна, пасля адпаведнае пастановы ЦК.

«Страчаныя ілюзіі» — гэта не назва бальзакаўскага рамана, а стан душы чалавека, выхаванага ў савецкай школе, піянерыі і камсамоле. Камуністычныя ілюзіі страцілі прываблівасць і каштоўнасць, развеяліся. Партрэту «бацькі ўсіх народаў» не заставалася іншага месца, як інтэрнацкая шафа-кладоўка. А журба стала для маладога Стральцова антытэзаю, апазіцыяй казённаму партыйна-камсамольскаму аптымізму, «бодрячеству».

У тым ліку ў творчасці. Бо ён, Стральцоў, у гэты час адыходзіць і ад бальшавіцкае ідэалогіі, і ад спароджанай ёю эстэтыкі сацрэалізму. Ён шукае іншую эстэтыку, і дзеля гэтага ён чытае замежныя раманы. (Пра ягоную любоў да нехрэстаматыйнае расійскае паэзіі я ўжо казаў. Можна дадаць тут і пра Льва Талстога, асабліва навеліста, і пра Івана Буніна... А нашаму Максіму Гарэцкаму ён прысвеціць два эсэ.)

Напружаным духоўным зрокам ён убачыў фальшывасць бальшавіцкае эстэтыкі і ўжо не здолеў стаць сацрэалістам, партыйным пісьменнікам, байцом ідэалагічнага фронту.

У выпадку з М. Стральцовым мне рупіць параўнаць ягоны жыццёвы і творчы шлях са шляхам некаторых ягоных раўналеткаў, аднакашнікаў. Спакуса вялікая. Можна было б паказаць, як хлопцы-франдзёры, што ў канцы 50-х — на пачатку 60-х галёкалі на задніх лавах у СП БССР, хутка прыстасаваліся да сістэмы і мелі з яе някепскі спажытак. Зрэшты, у схеме іх развіцця няма нічога новага: на пачатку 1930-х і Пятрусь Броўка, супраць якога змагаліся аднакашнікі Стральцова, быў у ліку тых, хто, паводле даносаў сексотаў, праводзіў лінію на кампраметацыю асобных пісьменнікаў-камуністаў, крычаў у часе іх выступленняў «камісары», «адміністратары», спрабаваў сарваць іх выступленні (напрыклад, у часе выступлення Лукаша Бэндэ выкрыкваў: «Даеш Купалу», «Купалу слова»). І гэты ж Броўка потым сам стаў саюзпісьменніцкім камісарам і літаратурным адміністратарам.

І ўсё ж не буду супрацьпастаўляць Стральцова канкрэтным ягоным равеснікам, бо можа атрымацца так, што я ўзвышу Міхася Лявонавіча коштам прыніжэння іншых. Пра ягоных равеснікаў я напішу калі асобна. А тут заўважу, што для характарыстыкі грамадскае і эстэтычнае пазіцыі Стральцова дастаткова і таго, што ён, па-першае, не быў у ліку шумных франдзёраў канца 50-х — пачатку 60-х, што ён, па-другое, не ўступіў у КПСС і што ён, па-трэцяе, не стаў сацрэалістам.

3

...я пішу эпітафію апавяданню...

«Смаленне вепрука», 1973

Прысніўся верш...

«Ядлоўцавы куст», 1973

Тое першае знаёмства з рэдакцыяй «Маладосці»...

Карла Маркса, 40. Будынак ЦК камсамола Беларусі. Падымешся па лесвіцы на другі паверх, павернеш направа, у крыло, што ўздоўж вуліцы Маркса (пазней я дазнаюся, што за царом яе называлі Падгорнаю). З правага боку на дзвярах чатырох, калі не памыляюся, кабінетаў шыльдачкі з лагатыпам часопіса. У самым першым кабінеце — машыністка Лідзія Сяргееўна, Таўлаіха, загадчык аддзела публіцыстыкі Уладзіслаў Нядзведскі, фотакарэспандэнт Аляксандр Дзітлаў (ягоная лабараторыя — на цокальным паверсе), у другім кабінеце — адказны сакратар Уладзімір Юрэвіч, рэдактар аддзела крытыкі Вера Палтаран і карэктаркі, у трэцім — рэдактары паэзіі і прозы Мікола Аўрамчык ды Міхась Стральцоў. Тры гэтыя кабінеты злучаныя паміж сабою, утвараюць, калі можна так сказаць, анфіладу, і кожны з іх мае асобны ўваход з калідора. Чацвёрты кабінет займаюць галоўны рэдактар Пімен Панчанка ды ягоны намеснік Алесь Асіпенка. У 1966 годзе, калі Пімена (у той час усе казалі Пімен) абяруць сакратаром СП БССР, Алесь Харытонавіч стане галоўным, а намеснікам да яго прыйдзе Васіль Зуёнак.

Тут, у гэтым будынку, у гэтым жа крыле месціцца таксама рэдакцыя «Вясёлкі». Кабінет ледзь не насупраць «Маладосці» займаюць Васіль Вітка, Алесь Пальчэўскі ды Сяргей Грахоўскі. На першым паверсе — рэдакцыя «Бярозкі».

Тады яны маглі змясціцца ў адным будынку, а пазней камсамольскі апарат разросся гэтак, што рэдакцыям давялося выбірацца з абжытага дома.

Я любіў заходзіць у тую рэдакцыю «Маладосці». У нейкім часопісе я бачыў такі здымак М. Стральцова: пісьменнік стаіць

ля вялікага акна, праз якое відаць дах нейкага будынка; віецца воблачка дыму; сам Міхась Лявонавіч прыгожа-зажурана ўсміхаецца... Здымак зроблены ці не Аляксандрам Дзітлавым у тым самым маладосцеўскім кабінеце, з якога відзён двор ЦК ЛКСМБ. У гэтым кабінеце я чуў апавяданні Міколы Аўрамчыка пра даваеннае літаратурнае жыццё (пра Масея Сяднёва, Віктара Казлоўскага ды іншых). Мне дзіўнавата было чуць, што пра Кузьму Чорнага ён кажа: «Мікалай Карлавіч прачытаў...» У кабінет заходзіў шумны, поўны смешных гісторый Алесь Асіпенка, які так і не пераадолеў свайго віцебскага вымаўлення, і мне цікава было слухаць яго нават безадносна да зместу прамоўленага. Былы дыктар Беларускага радыё (ён будзе весці папулярную перадачу «Жывое слова») Уладзімір Юрэвіч гаварыў добра пастаўленым голасам, можна сказаць — узорна-акадэмічна. Ад Уладзіміра Міхайлавіча таксама можна было пачуць шмат цікавага з даўняга часу. Вера Палтаран амаль заўсёды ініцыявала абмеркаванне новых кніжак і публікацыяў у часопісах. З «Вясёлкі» прыходзіў Вітка. Ён мог задаць і такое пытанне: «А чаму гэта вы добрую прозу надрукавалі ў самым канцы часопіса?» Усе здзіўлена глядзелі на яго: жартуе чалавек, ці што? Нехта казаў: «Цімох Васільевіч, быць таго не можа». Цімох Васільевіч бліскаў шкельцамі акуляраў і настойваў на сваім. «Хіба ж нарыс Янкі Сіпакова — не проза?» — пытаўся нарэшце ён, і ніхто не мог яму запярэчыць.

З другое паловы 60-х я пачаў раўнаваць Стральцова. Да паэзіі. Ніяк не мог пагадзіцца, што ён яшчэ і паэт. Нават і сказаць не магу, хто з добрых празаікаў пераходзіў у паэты. А тут чалавек пачаў пісаць рыфмаваныя тэксты... Мо да яго стасуюцца перайначаныя словы Ганны Ахматавай: «Паэзія заўсёды здавалася мне і таямніцай і спакусай»? А мо «потребовал поэта к священной жертве Апполон»? А мо яго чытанне Багдановічавых вершаў натхніла? Шкадую, не папытаўся.

Так і не ведаю адказу: Багдановіч натхніў Стральцова пісаць вершы ці так само па сабе атрымалася. Адно магу сказаць: стральцоўская «Загадка Багдановіча» спрычынілася да рэнесансу Багдановічавай паэзіі. Так, былі публікацыі Алеся Ба-

чылы, Ніны Ватацы, але стральцоўскае эсэ стала самаю прызнанаю працаю, што папулярызавала творчасць Багдановіча. Дзіўным чынам здарылася так, што ў тым самым годзе, як было напісана эсэ (1968), у свет выйшлі Багдановічаў двухтомнік і зборнік выбраных твораў «Маладзік» з прадмоваю Алега Лойкі.

У дзённіку Варлена Бечыка можна прачытаць, што ў эсэ М. Стральцова няма нічога новага. Згаджаюся: у сэнсе фактагогіі — нічога новага. Дык жа — гэта не навуковая праца, не артыкул, а эсэ, твор, аднесены пазней да жанру аповесці.

Нехта добра сказаў, што сапраўднай навіной ёсць талент: гэта тая навіна, якая заўсёды ўтрымлівае новае. Эсэ Стральцова ўтрымлівала і ўтрымлівае новае і для матэматыка, які цікавіцца паэзіяй, і для выпускніка філфака, які гэтую паэзію павінен ведаць як спецыяліст.

Няхай мне даруюць смелае параўнанне, але не магу тут не згадаць твор Пушкіна пра Сальеры, якога, між іншым, рэабілітоўваў Багдановіч. Уся логіка характару, рэальных абставінаў, у якіх жыў Сальеры, настаўнік Людвіга ван Бетховена, абвяргае версію Пушкіна пра тое, што Сальеры мог атруціць Моцарта і атруціў яго насамрэч, але мастацкая праўда, праўда вобразаў мае сваю логіку, а самі вобразы — свае каардынаты быцця. Пушкінскі Сальеры — самаісны. У Стральцова — таксама самаісны вобраз, вобраз Багдановіча, а не сума звестак пра паэта, якую трэба «адбарабаніць» на іспыце. З другога боку, студэнт «дакладвае» экзаменатару пра вобраз Багдановіча ў аповесці Стральцова, бадай, гэтак жа, як і пра вобраз Моцарта ў маленькай трагедыі Пушкіна. Параўнанне, паўтараю, мажліва, надта смелае, але Стральцову ўдалося тое, што не ўдавалася (і не ўдаецца) іншым беларускім літаратарам: стварыць самаісны мастацкі вобраз пісьменніка, які рэальна жыў і тварыў. І ў гэтым ёсць новае.

Тое, што Стральцоў піша вершы, настройвала на мінорны лад. А тое, што ў адным годзе ўбачылі свет і паэтычны зборнік «Ядлоўцавы куст», і апавяданне «Смаленне вепрука», падказвала мне, што празаік Стральцоў больш нічога не напіша. Дарма кружлялі чуткі пра аповесць «Конь гуляў на волі», якую нібыта

піша Міхась Лявонавіч. (Мікола Гіль не раз паўтараў гэты загаловак: надта ж хацеў, каб Стральцоў вярнуўся да прозы.) Не памятаю, калі ў мяне адбылася размова з Алесем Асташонкам, які цытуе мае словы пра тое, што стральцоўскія словы са «Смаленння вепрука» пра накрэслены круг я інтэрпрэтаваў як завяршэнне кругу ў творчасці самога пісьменніка. Так, чытаючы «Смаленне вепрука», бліскучае апавяданне, жанр якога сам аўтар вызначыў як «эпітафію апавяданню», я ўнутрана — нават у грудзёх зашчымела — зразумеў: круг замкнуўся. Не хацелася верыць прадчуванню. Кволая надзея яшчэ была. Не ў аднаго мяне. Быў жа ў Стральцова-паэта радок «Люблю я прозы дух цвярозы».

4

Усё радзей мы кажам слова «друг»,
Ёсць сябра, ёсць сусед, ёсць прыяцель, таварыш.
Сустрэнешся — «Здароў!» Гаворкі — тары-бары.

«Ядлоўцавы куст», 1973

І так захочацца пагрэцца
Ля ўласнай цёплае душы.

«Мой свеце ясны», 1986

З 1973 года перанясуся амаль на дзесяць гадоў наперад — у 1982 год.

Пінск. У гатэлі «Прыпяць», у нумары, у якім спыніўся Уладзімір Калеснік, сабралася немаленькая грамада беларускіх ды ўкраінскіх літаратараў, якія прыехалі на святкаванне 100-х угодкаў з дня нараджэння Якуба Коласа. Была і чарка. Узнікла нагода пагаманіць і пра тое, чаму не адзін пісьменнік меў такую слабасць — выпіваць на шкоду свайму здароўю, творчасці, дабрабыту. Дацэнт Калеснік, спасылаючыся на прыклад Міхася Рудкоўскага, генералізаваў ды выводзіў прычыну гэтага з'явішча з таго, што чалавек, бачачы прорву паміж належным і рэальным, не можа прыстасавацца да гэтага рэальнага. Адсюль я рабіў выснову, што такі чалавек не мог стаць і не быў маральным рэлятывістам: не меў аднае маралі ў адных

выпадках і іншае — у іншых. Але гэты чалавек і не змагар, не прапаведнік. Бачачы разрыў паміж належным і сапраўдным, ён не фармулюе палітычных, эканамічных, сацыяльных ідэяў, не кліча да змагання за іх здзяйсненне. Дацэнт Калеснік даў зразумець: былі б іншыя магчымасці для самарэалізацыі чалавека, мажліва, больш спрыяльна склаўся б і ягоны асабісты лёс.

У 1982-м Стральцоў быў у Мазыры, у ЛТП (абыдземся расійскаю абрэвіятураю словаў «лячэбна-працоўны прафілакторый»).

Вестка пра тое, што Стральцоў там, не прагучала для мяне навіною.

Да лістапада 1981 года я бываў у Менску наездамі. Перапісваўся сяды-тады з двума Алесямі: Разанавым і Жуком. Я нагул па натуры не кампанейскі чалавек. І ўжо зусім не вадзіў кампанію з аматарамі літаратурных плётак (хто з кім колькі выпіў, хто з кім спаў, ажаніўся, развёўся). Такія навіны не цікавяць мяне і да сёння, хоць, ведама, асабістае жыццё ўплывае на творчасць.

Вось і не магу сказаць, хто была першая жонка Стральцова. Бачыў другую. І пра яго бяду, пра ягоную слабасць я даведаўся ўжо тады, калі пра гэта ведаў «увесь Менск», калі ён стаў «вольным мастаком». З гэтага вынікае, што я аніразу не браў чарку са Стральцовым. Прыязджаючы ў Менск, я мог выпіць з равеснікамі. Са старэйшымі не піў, калі яны мяне не запрашалі ў кампанію.

Тут трэба зрабіць удакладненне. Ведама, можна было пачаставаць старэйшых, асабліва калі табе трэ было прабіць у выдавецтве кніжку ці «падмазаць» рэдактара, каб ён давёў тваю пісаніну да кандыцыі, або падзякаваць рэдактару за давядзенне да гэтае самае кандыцыі. Не адзін літаратар гэтак і рабіў. Мне — не даводзілася. Не было патрэбы. Дый нават калі б была, я ніколі не адважыўся б прапанаваць пачастунак маім рэдактарам Рыгору Барадуліну, Сяргею Грахоўскаму, Міхасю Стральцову, Вячаславу Адамчыку, Уладзіміру Дамашэвічу, Янку Сіпакову: вельмі высока я ставіў іх, каб прыйшла ў галаву думка абразіць такою прапановаю.

Мусіць, першасная бяда Стральцова была ў тым, што ён не мог адмовіць напорыстым аўтарам. І рабіў з іх пісьменнікаў, г. зн. перапісваў іхнія тэксты. Мне называлі імёны тых людзей. Тыя людзі — Брыль з іншае трагічнае прычыны назваў іх памочнікамі смерці — дзякавалі свайму рэдактару.

Ведама, апынуўшыся на «вольным хлебе», стаўшы «вольным мастаком», можна было пражыць і літаратурнымі заробкамі, але пры трох умовах: што ты шмат пішаш, што ў цябе выходзяць кніжкі, што ты жывеш сціпла. У час «вольнага мастакоўства» (бяру 1973–1980 гг.) у Стральцова выйшла тры арыгінальныя зборнікі паэзіі і крытыкі («Ядлоўцавы куст», «У полі зроку», «Цень ад вясла») і кніга выбранага «У чаканні радасці». І ў перакладах нешта было. Быццам і няблага, але...

Другая палавіна 70-х. 1977 ці 1978 год. (У «ЛіМе» — Асіпенка; газета аджывае, і ўжо можна зайсці ў рэдакцыю.) Славуты «подыум» — узвышэнне, з якога пачынаецца шлях у калідоры «ЛіМа», «Беларусі» і «Полымя». Ці не пяць літаратурных нікчэмнасцяў і іхні дабрадзей Стральцоў. Усе яны, нават малодшы за мяне ці не на дзесяць гадоў П., з ім на «ты». І гэтае «Міша»...

І собіла ж мне са Стральцовым на іх натрапіць!.. Акружылі Міхася Лявонавіча, гаворка адразу ж пайшла пра адно. Я не магу і не хачу бачыць Міхася Лявонавіча ў застоллі з гэтымі людзьмі, у кепскім стане, а таму паціхеньку сыходжу. Не развітваючыся. І не мецьму з ім кантактаў да 1982 года.

І вось 1982 год, і мы размаўляем у гасцінічным нумары Уладзіміра Калесніка. А потым я адкрыю для сябе, што ў Стральцова папросту не было сябра. Не было душэўнага сябра. Што ён, кажучы словамі дзеда Міхалкі, быў сіратою між людзей.

Жахлівая сітуацыя: ёсць кампанія — і няма сяброў, ёсць размовы, выпіўкі — і няма бяседаў. Не было каму пастаяць каля душы. Не было каму сяброўскім словам накіраваць, як кажуць, на шлях ісціны і падтрымаць на гэтым шляху. Чалавек застаўся адзін. Ён мог пагрэцца толькі «ля ўласнай цёплае душы». Але душа не заўсёды была ў спакоі, раўнавазе. Хутчэй — заўсёды не была.

Не спіцца, ліха на яго, —
Трызненне — быццам празарэнне.
Патрохі маеш усяго,
І нават ноч, як сутарэнне.

І недзе за акном ліхтар.
Хаця б міргнуў, дык не міргае.
Ты з адзінотай твар у твар —
Хвіліна гэткая благая!

Перацірай, перабірай
Запас душэўнай гаспадаркі,
Сябе судзі, сябе карай
За дзень, за сваркі і за чаркі.

У гэтым стане душы была зарука ацалення. Трэба было адно: каб чалавек перастаў быць «з адзінотай твар у твар».

5

З двара прыйду і сяду ля агню.

«Мой свеце ясны», 1986

Было яно гэтак. Генадзь Пашкоў выпусціў зборнік сваіх вершаў і вельмі хацеў, каб у «ЛіМе» з'явілася рэцэнзія на яго. Добрая рэцэнзія. І за рэцэнзента ён абраў сабе М. Стральцова. Было ў яго такое спадзяванне, і жаданне, і, мусіць, дамоўленасць была, што Стральцоў напіша. І ўсё «даставаў» ён нас, лімаўцаў: калі? Галоўны рэдактар тыднёвіка Алесь Жук сказаў, каб я напісаў адпаведны ліст Стральцову. Туды. І я такі ліст напісаў (хто даў той мазырскі адрас — не памятаю; магчыма, так і сказалі: Мазыр, ЛТП, Стральцову). Алесь Пісьмянкоў, з якім я разам працаваў у аддзеле крытыкі і бібліяграфіі, прасіў перадаць Міхасю Лявонавічу прывітанне. І я склаў ліст ад нас абодвух. Не выключана, што ён захаваўся ў стральцоўскіх паперах. Звычайны ліст-заказ аўтару. Незвычайнае ў ім толькі тое, што аўтары яго — абодва супрацоўнікі аддзела. Мы разумелі, што гэта не проста ліст-заказ, а пэўным чынам — дэманстрацыя салідарнасці і спагады.

Адказ прыйшоў 19 траўня 1982 года. Рэцэнзіі не было — быў ліст, і былі вершы. Усё змесціва канверта сакратарка рэдакцыі Тамара Нікіціна пазначыла нумарамі 1367–1371, а на лісце, адрасаваным мне з Пісьмянковым, Алесь Жук напісаў рэзалюцыю: «Скажыце Міхасю сваю думку пра яго вершы... Я іх надрукую». Алесь намякаў: пахваліце Стральцу (такая была мянушка ў Міхася Лявонавіча) ягоныя вершы.

Ці трэба казаць, што той аркуш-ліст з рэзалюцыяй я ў Тамары выпрасіў?

Цяпер мушу прызнацца як на споведзі: да таго дня, да 19 траўня 1982 года, я не прачытаў аніводнага верша паэта М. Стральцова ад пачатку да канца. Матыў просты: любячы празаіка і крытыка Стральцова, я баяўся расчаравацца ў Стральцове-паэце. Дый рэўнасць да паэзіі. Такі псіхалагічны суплёт...

19 траўня 1982 года я мусіў прачытаць дасланыя вершы. Прачытаў. І Пісьмянкоў прачытаў. Пісьмянкоў быў захоплена-ўзрадаваны (не перавёўся порах у парахаўніцы!), я — задаволены: добрыя вершы, не давялося расчаравацца. Вось з гэтым набыткам я пайшоў да стральцоўскага аднакурсніка і спачувальніка, намесніка галоўнага рэдактара Міколы Гіля. Тым болей, што сам Міхась Лявонавіч прасіў паказаць ягоныя творы Гілю. Настрой у мяне быў радасны, мне хацелася жартаваць, а таму я звярнуўся да Міколы па-расійску (а мог бы і па-польску):

— Николай Семенович, тут у меня написались стишата. Послушайте. Может, в них есть толк. Вот...

Што я чытаў? «Два подступы да верша», «Экспромт», «Міцкевіч на Беларусі», «Пара асвойваць і прагрэс...», «Хоць ад пары, калі мяне...»? Дальбог, не памятаю. У мяне быў добры настрой, я чытаў добры верш, у мяне быў уважлівы, удзячны слухач. І гэта было галоўнае.

Калі я скончыў чытанне, Мікола (ён ніколі ў гутарках са мною не пераходзіў ані на польскую, ані на расійскую, хоць і падтрымліваў тон размовы) сказаў:

— Здаецца мне, Анатоль Міхайлавіч, што гэты верш напісаў не ты, а хтосьці іншы. Ці не Міхась Лявонавіч Стральцоў?

— Мікола! — у здзіўленні выгукнуў я. — Як ты здагадаўся?

І мы загаманілі пра Міхася Лявонавіча...

Стральцоўскія лісты да мяне і Алеся Пісьмянкова я надрукаваў у «Дзеяслове» (2003, № 4). Таму, хто будзе іх чытаць, сёе-тое трэба патлумачыць. Напрыклад, чаму доўга ад нас не было адказу. А быў юбілейны год: 100-годдзе Купалы і Коласа, 60-годдзе СССР і нават 50-годдзе абрання Максіма Горкага ганаровым акадэмікам АН БССР. А газета — жорны: толькі падсыпай. І паспрабуй не насыпаць — іскры паляцяць. Начальніцкага гневу.

Ліст са сваёю крыўдаю ці гневам Стральцоў напісаў якраз у дзень купалаўскага юбілею. А да гэтае даты рабіўся цэлы — на ўсе шаснаццаць старонак — нумар. Асноўная нагрузка падала на аддзел крытыкі і бібліяграфіі. Але і ў папярэднія нумары давялося падрыхтаваць да публікацыі нямала і добрых матэрыялаў, і юбілейшчыны. Пасля 7 ліпеня трэба было брацца за коласаўскую тэму і не забываць пра 60-годдзе СССР... І не забываць пра жывы літаратурны працэс: жывыя пісьменнікі патрабуюць артыкулаў пра іх, рэцэнзіяў на іхнія кнігі і г. д. Я, здаецца, напісаў пра гэта Міхасю Лявонавічу, бо ліст ад 20 ліпеня ён пачаў словамі: «Разумею цябе...»

Стральцоўскія вершы (названыя вышэй) былі апублікаваныя 6 жніўня. Наш фотакарэспандэнт, фоталетапісец літаратуры і мастацтва Беларусі Уладзімір Андрэевіч Крук дзеля гэтае публікацыі дастаў са свайго архіва фота маладога, прыгажэннага — абраннік сонечнага Феба! — Міхася Стральцова. Вера Сымонаўна Палтаран была ў захапленні ад тае публікацыі. Слова «прыгажэнны» — ейнае.

Думаючы пра Коласаў юбілей і 60-годдзе СССР, я не забываў і пра тое, што нас чакаюць 90-я ўгодкі Максіма Гарэцкага, ды загадзя папрасіў Міхася Лявонавіча, каб ён напісаў хоць штонебудзь: усё-ткі ў яго «Чалавек з Малой Багацькаўкі» ў набытку. Гэтым заказам я выказваў спадзяванне на супрацу і добры творчы кантакт.

А публікацыі стральцоўскіх вершаў у «Полымі», пра якія аўтар турбаваўся ў лістах да Пісьмянкова і да мяне, у 1982 годзе

не было. Яна з'явілася там ці не ўвесну наступнага года, калі, зарабіўшы «на дарогу ды на штаны», пісьменнік вярнуўся ў Менск. Як я зразумеў з размовы з Адміралам (гэтак у літаратурных колах звалі Анатоля Вялюгіна) і з далейшае хады падзеяў, лёс падборкі залежаў не ад яго. Пра вершы Стральцова я размаўляў з Анатолем Сцяпанавічам на святкаванні Купалавага юбілею ў Вязынцы.

А хада падзей была такая. Недзе ў канцы 1983-га ці на пачатку 1984-га, недзе праз год па вяртанні Міхася Лявонавіча адтуль, быў у Саюзе пісьменнікаў адкрыты партыйны сход, на якім па абавязку службы прысутнічаў і я. Памятаю, як Віктар Карамазаў (ён быў сакратаром партбюро) упікнуў кіраўніцтва часопіса «Полымя»: у рэдакцыі ёсць вакантнае месца ў аддзеле крытыкі, а добры крытык Стральцоў ходзіць без працы. Слова ўзяў намеснік галоўнага рэдактара «Полымя» Генадзь Пашкоў і сказаў такое: мы з павагай ставіліся да Мішы і тады, калі ён піў, і зараз яго паважаем... У зале ўсталявалася цішыня, трывожлівая, напятая. Генадзь зразумеў, што сказаў не тое. Заірдзеўся і збіўся (а так добра пачаў!). Скончыў тэму словамі накшталт: мы не супраць, уладкуем.

Генадзь не падумаў пра маштабы творчае асобы Стральцова і Пашкова. І проста асобы — таксама. Словы «Міша» і «піў», прамоўленыя з трыбуны, зала ўспрыняла як абразу. Так я зразумеў тую напятую цішыню. І парадаваўся за Міхася Лявонавіча: калегі паважаюць яго.

Не вытанцавалася ў М. Стральцова рэцэнзія на кнігу Генадзя Пашкова. Не натхніўся крытык. Але ж і не пайшоў Стральцоў працаваць у «Полымя». Неўзабаве ён стаў загадваць аддзелам у «Нёмане». Анатоль Кудравец прыняў яго адразу ж, як адкрылася вакансія. А на Адмірала М. Стральцоў не крыўдаваў. Ён напісаў пра А. Вялюгіна цудоўнае эсэ «У спелым леце спелы бор» і прысвяціў яму верш «Адвячоркам круціцца пласцінка...»

Можна было зразумець і Генадзя Пашкова, і ягонага шэфа Кастуся Кірэенку: не верылі, што чалавек вытрывае, не сарвецца. Але ўсё ж...

Мы — сябры, таварышы, прыяцелі — ледзь не маліліся: хаця б устаяў, не сарваўся.

Калі Міхась Лявонавіч быў у тым Мазыры, маладыя літаратары на сустрэчы з Янкам Брылём спыталіся, як ён глядзіць на стральцоўскую праблему. «Міхась — мой боль», — адказаў класік, і аўдыторыя, было відаць, падзяляла ягоныя пачуцці.

Калі Міхась Лявонавіч вярнуўся, мы баяліся ў ягонай прысутнасці прамовіць словы «гарэлка», «віно», «выпіўка» і г. д.

У нас, у лімаўцаў, быў звычай — хадзіць абедаць у кавярню Дома літаратара. Ішлі Мікола Гіль (часта са сваёю Марысяю, Мар'яй Міхайлаўнай), сяды-тады Пісьмянкоў, часцей Валодзя Ягоўдзік, які прыйшоў да нас, часта Андрэй Ганчароў і, бадай, заўсёды — я.

Абеданне абеданнем, але кавярня служыла і месцам сустрэчаў. Вось заходзіць Брыль з Калеснікам, а вось — Жэня Янішчыц, вось Рая Баравікова вядзе дыялог з Аляксеем Дударавым, і той на хаду складае эпіграму з прычыны таго, што Раіса Андрэеўна стала жонкаю фізіка...

Іншы раз грэх было перад абедам не прыняць на грудзі кілішак-другі. Асабліва калі заходзіў шумны, усмешлівы, з зіхоткімі акулярамі на носе Віктар Карамазаў. Ёсць людзі, з якімі добра і лёгка ў кампаніі. Віктар Філімонавіч — якраз такі. Мікола Гіль на гэткія вольнасці — што ягоныя падначаленыя чарку бяруць — глядзеў не ўхвальна, але і не асуджальна — паблажліва. Сам ён сабе такое раскошы не дазваляў: перш-наперш сэрца, артэрыі сігнал падавалі. Мо нават трохі і зайздросціў тым, хто мог сабе дазволіць. Або заходзіў у кавярню яшчэ адзін прыкметны чалавек — Рыгор Барадулін. Рыгор Іванавіч, сам даўно непітушчы, не мог спакойна глядзець, як гэта маладзейшыя абедаюць у кавярні (!) ды без кропляў. Ён браў ініцыятыву на сябе і фундаваў кампаніі пляшачку гарэлкі. І любасна наліваў тую гарэліцу ў чаркі. І калі ягоныя «сабутэльнікі» кулялі чаркі і хадуном пачыналі хадзіць іхныя коўцікі (кадыкі), паэт аж падкрэктваў: такое задавальненне атрымліваў ад відовішча, нібы сам прычашчаўся горкага зелля.

І вось абед замоўлены, пляшка — таксама, ідзе размова... Зноў адчыняюцца дзверы, у кавярню заходзіць Стральцоў, ён з парога заўважае нас, усміхаецца, кіруецца да нашага стала, бо ёсць вольнае месца (а няма — можна прыставіць крэсла)... І тады хуценька ідзеш на кухню ды шэпчаш афіцыянтцы Галі: «Гарэлкі не трэба». І Галя, несучы якую халодную закуску, заўважыўшы новага чалавека за сталом, ухвальна ківае нам. Яна ведае тут усіх, і Стральцову таксама, як і мы, сімпатызуе.

І наогул, я пераканаўся, што ў яго шмат дабразычліўцаў.

Вось я сказаў, што ў Стральцова было шмат дабразычліўцаў. А можна было б сказаць: і нямала сяброў. І сябровак. Што жанчыны яго і любілі (як чалавека, літаратара), і кахалі (як мужчыну), дык тое не сакрэт. Кажучы аб рэдакцыі крытыкі выдавецтва «Мастацкая літаратура», я мушу згадаць абрэвіятуру МЛД — мілыя літаратурныя дамы. Так супрацоўніц рэдакцыі крытыкі назвала Святлана Марчанка. Дык вось, у той рэдакцыі ў жанчын быў, можна сказаць, культ Стральцова. Зрэшты, не аднаго Стральцова. І Брыля, і Разанава, і Галубовіча... Але калі ўлічыць, што загадчыца рэдакцыі Вера Сымонаўна Палтаран працавала з маладым Стральцовым у «Маладосці», што рэдактарка Ала Сямёнава — ягоная каляжанка-таварышка з філфака БДУ... Карацей: той пакой, які займала рэдакцыя крытыкі, можна было называць кумірняю. Я так і называў яго. Жанчыны не пярэчылі.

Нават самаму каханаму, самаму ўлюбёнаму чалавеку, мужчыну патрабуецца яшчэ і сябар.

Дух стральцоўскіх лістоў выдае адзіноту чалавека, патрэбу ў кімсьці, з кім можна было б пагаманіць шчыра, хто ўзяў бы на сябе ролю духоўніка — не толькі спаведніка, але і (гэта найбольш важна) настаўніка (не ментара, крый бог!), які б мог наставіць, дапамагчы і падтрымаць на гэтым шляху.

У Гегеля чытанае: падлетак можа прамаўляць глыбокія багаслоўскія ісціны, але гэта будзе глядзецца ненатуральна, і не будзе даверу да таго, што ён прамаўляе, іншая справа, калі тыя ж ісціны прамаўляе чалавек з жыццёвым досведам.

Да таго згадваю Гегеля, што, разумеючы адзіноту М. Стральцова, я мала чым мог парадзіць яму. Па-першае, бадай, усё жыццё пражыў без сям'і. Я б з радасцю прыняў Стральцова ў сваім доме, з радасцю звазіў бы яго на Палессе. Але ў мяне даўно не было свайго дома, свайго прытулку на Палессі і не было сваёй страхі ў горадзе (на той час я не меў нават пакойчыка). Дый псіхалагічны момант: у дачыненнях са Стральцовым я пачуваўся хутчэй пахолкам, чым паплечнікам. Гэта не ў апошні чарод тлумачылася ўзроставым чыннікам: што ні кажы, а адзінаццаць гадоў — розніца. Заўважыў я, што нават добра ўсітуяваныя мае равеснікі (як Алесь Жук, да прыкладу, ці Сяргей Законнікаў), якія былі са Стральцовым у добрых, сяброўскіх адносінах, не надаваліся на ролю ягоных душэўных сяброў, духоўнікаў. Патрэбен быў хтосьці з раўналеткаў, са старэйшых, хто б дапамог і тут, у Менску, быт наладзіць, і аднавіць разладжаныя сувязі з родным кутом.

Ці мог дапамагчы стральцоўскі аднакурснік Мікола Гіль? Міколу Сымонавіча найбольш характарызуе адно ягонае пытанне.

Было гэта ўжо на пачатку XXI стагоддзя. Тэлефаную і прашу: «Мікола, дай для «Крыніцы» свае развагі пра сваё — філалагічнае — пакаленне». — «А хто я такі?» — пытаецца Гіль. Па праўдзе сказаць, я не адразу знайшоў, што і адказаць яму: аглавушыў ён сваім пытаннем. А потым («хорошая мысля приходит опосля») я знайшоў адказ: ты ж колькі іх рэдагаваў, сяброў-таварышаў сваіх, ты ж іх як аблупленых ведаеш. Ясная рэч, што чалавек з такою ўстаноўкаю не мог стаць духоўнікам.

Вячаслаў Адамчык быў надта сямейны чалавек, каб праймацца чыімі там праблемамі. Дый адчувалася: яны — Адамчык і Стральцоў — раўніва сачылі адзін за адным. Што ні кажы, а два выдатныя навелісты ў сваім пакаленні. У канцы 50-х — на пачатку 60-х гаманілі найбольш пра іх. Іван Пташнікаў, хораша заявіўшы пра сябе як пра навеліста, доўга да гэтага жанру не вяртаўся. Якраз у 1983-м, калі не памыляюся, і вярнуўся: прынёс нам (у «ЛіМ») «Эфку», якая не магла не парадаваць

аматараў жанру. А Кудравец і Карамазаў пачалі як навелісты пазней за іх.

Падумаць пра Івана Пташнікава як пра духоўніка нейк і не выпадала.

Барыс Сачанка? Дык з лістоў М. Стральцова відаць, як ён ставіўся да празаіка Б. Сачанкі тае пары.

Іван Чыгрынаў? Пра Святлейшага (такая мянушка была ў Чыгрынава) я тут зацемлю, што ён ведаў цану Стральцову — празаіку, крытыку і паэту. Дарма Міхась Лявонавіч пісаў, што «вершы ў наш час у актыў не залічваюцца». Залічваліся і залічваюцца. Чыгрынаў спрабаваў у маладыя гады рыфмаваць — не ўдалося, а Стральцову — удалося і не ў маладыя. Потым — і такое меркаванне: чалавек запамінальна напісаў пра Багдановіча, Гарэцкага... А пра яго, Святлейшага? Вось на чым залежала Чыгрынаву: надзелены густам і стылем Міхась — ды не піша пра ягоныя творы.

Чыгрынаў, як я здагадваюся, дапамог Стральцову на пачатку, па вяртанні адтуль. Але не за дарма (не за гэ, як кажуць на маім Палессі). Стральцову давялося пацешыць самалюбства Святлейшага: у кнізе «Пячатка майстра» сярод іншых твораў вы сустрэнеце «Свой і агульны клопат» — водгук на кніжку І. Чыгрынава «Новае ў жыцці — новае ў літаратуры» (1983). Да гонару аўтара, водгук напісаны на належным узроўні, з годнасцю. А кніжка? Звычайная кніжка «сакратарскае крытыкі». Не горшая за іншыя выданні такога кшталту, а мо нават і лепшая за некаторыя з іх.

Такім чынам, з Чыгрынавым у Стральцова былі дзелавыя адносіны.

Рыгор Барадулін? Яны цанілі адзін аднаго. Два таленты, у якіх была адна бяда. Рыгор Іванавіч спахапіўся першы. У тым бліскучым, пра які гаманіла «ўся Беларусь», зборніку «Нагбом» быў верш «Лодкі», прысвечаны Міхасю Стральцову. Барадулінская работа! Зрэшты, каб зблытаць стыль Барадуліна з чыімсьці, трэба наогул не чытаць вершаў і добра не ведаць айчыннае паэзіі. Толькі Барадулін мог напісаць і ўразіць чытача радкамі:

Маладзік прарэзаўся танклявы,
Быццам малады Міхась Стральцоў.

Гэтыя радкі з'явіліся ў друку пасля вяртання М. Стральцова адтуль. А перад вяртаннем Міхась Лявонавіч напісаў «Экспромт», які, мусіць, пацешыў Рыгора Іванавіча, бо там былі такія радкі:

І вось надзеямі гарым
Над нашым столікам прытульным,
Што не падасца барадульным
Наш верш, а значыць — і старым.

А пасля вяртання ён прысвеціць свайму калегу-аднакурсніку верш «Стаяў і я на гэтай кручы...».

Ці многа ў творах М. Стральцова эпіграфаў? Мне запомніліся два: з К. Случэўскага (я цытаваў яго) і з Барадуліна:

Зязюлямі гадоў пракукаваны
бор галавы маёй.

А з эсэ Міхася Лявонавіча «Ад маладзіка да поўні» звязаны ў свой час славуты літаратурны анекдот. Што тое эсэ, апублікаванае спачатку ў «ЛіМе», а потым як прадмова да двухтомніка Р. Барадуліна, а затым і ў «Пячатцы майстра», — твор добры, тое я ведаў ад самага пачатку, як толькі атрымаў яго з рук аўтара і прачытаў. У «кумірні» мяне ледзь на «ўра» не падкінулі, быццам я — аўтар ці быццам нехта быў супраць публікацыі гэтага эсэ, а я, такі смелы, узяў і надрукаваў. Эсэ было надрукаванае без адзінае праўкі. І чытачам спадабалася. А потым было вось што. Сустрэў Міхася Лявонавіча ягоны цёзка Міхась Іванавіч. Калачынскі. Сустрэў дый кажа:

— Слухай, Міша, добра ты напісаў пра Грышу. Напішы ты, браце, і пра мяне.

Так мне пераказалі тую просьбу. У ёй мне асабліва спадабалася рыфмаванка: Міша-Грыша. Як у дзіцячым вершыку-забаўлянцы: «Міша, Грыша і Шчыпай
Ехалі у лодцы...»

Міхась Лявонавіч сутнасці тае просьбы не абвяргаў. І не каментаваў. Гарэзліва ўсміхаўся ды з усмешкаю казаў: а ты думаў! хутка чарга да мяне выстраіцца...

І ўсё ж Рыгор Іванавіч таксама не мог стаць духоўнікам свайму даўняму сябру. Бо — не арганізатар, не кіраўнік, бо, кажучы словамі М. Стральцова, «трохі мітуслівы».

Мо яшчэ адзін стральцоўскі аднакурснік — Генадзь Бураўкін? З Бураўкіным у Міхася Лявонавіча былі паважлівыя адносіны. З-за гэтых адносінаў я неспадзявана стаў аўтарам «Нёмана». Набліжаліся 50-я ўгодкі паэта (ён жа старшыня Дзяржкамітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні). Вось і кажа мне Стральцоў:

— Разумееш, старычок, тут мяне адзін аўтар падвёў і не напісаў абяцаны артыкул, а нумар вось-вось трэба здаваць. Не тое турбуе, што Генадзь пакрыўдзіцца, хоць і турбуе, а тое, што ён, сам ведаеш, і паэт, і на службе многа для культуры зрабіў.

Такая сітуацыя называецца нявыкрутнаю: і Міхасю Лявонавічу няёмка адмовіць, і Генадзь Мікалаевіч — паважаны чалавек... І давялося мне рабіць аўральную работу.

Бураўкін — арганізатар, кіраўнік, ён мог бы дапамагчы Стральцову, але (што зробіш?) ён быў чалавек статусны, у мундзіры, хоць і ў цывільным хадзіў. Дзень у яго распісаны, графік жорсткі. Быць духоўнікам такі чалавек не можа.

Ды вось сышліся дзве душы, два вонкава — паводле тэмпераменту — непадобныя чалавекі. Працытую з аднаго маленькага твора М. Стральцова:

«...асоба дынамічная ды мабільная. Ледзь не сказаў — аўтамабільная, згадаўшы чамусьці ягоную «Ніву»...»

Пра каго гэта? «...пра Віктара Карамазава, чалавека, лёгкага на хаду...».

Пра «Ніву» Стральцоў не «чамусьці» згадаў, а не выпадкова. І Карамазаў на тым партыйным сходзе не выпадкова палымянскае начальства дакараў. Бо рупіла яму, бо шанаваў талент М. Стральцова і зычыў яму душэўнага камфорту. І «Ніва» (хто не бачыў карамазаўскае «Нівы», той не бачыў машыны, якая *видывала виды*), тая «Ніва» паслужыла гэтай мэце — вяртанню пісьменніка ў родны кут.

Калі Міхась Скобла ўкладваў анталогію беларускае паэзіі XX стагоддзя, мне было цікава, ці ўлучыць ён у гэтую кнігу верш Стральцова «Бацькаўшчына».

Вось ён. Я цытаваў яго ў водгуку на зборнік «Мой свеце ясны» ў «Звяздзе», цытую зноў:

З двара прыйду і сяду ля агню.
Палаюць дровы. Ссечана капуста
На градах — блаславенне дню.
Змрок у палях — там сіберна і пуста.

Узыдзе месяц позна. На парог
Я ноччу выйду. У нямым здранцвенні
Паветра, далеч. Серабрыцца лог
За сажалкай — на ім снуюцца цені.

О роднае маё! Як доўга да цябе
Ішоў я, кволы падарожнік.
О весялосць у восеньскай журбе!
Агонь.
Саган.
Вуголле і трыножнік.

«З двара прыйду...» Гэта з таго, «ЛТПоўскага двара». «...І сяду ля агню». Гаворка — пра агмень. Цяпло і святло гэтага агню-агменю падкрэслена ў чацвёртым радку: «Змрок у палях — там сіберна і пуста». У трэцяй страфе зноў агонь, зноў агмень... Адбылося вяртанне «у свет знаёмы і радзінны», туды, дзе

Як мары белыя бярозы...
Такая ціш! Чуваць здаля
Звон ад вядра і рып марозны
Бацькоўскай студні жураўля.

(Як тут не звярнуць увагу і на цытату з Багдановіча ў першым радку, і на далікатны намёк на апошні радок «Слуцкіх ткачых» у чацвёртым радку?)

6

І так хацеў спазнаць я многа,
І так хацеў сказаць, нябога, —
І шмат чаго я не сказаў!

«Мой свеце ясны», 1986

Лёс быў не асабліва каб спагадлівы да яго.

«Дудар беларускі», 1962

Хто зрабіў той здымак, якім адкрываецца кніга выбраных твораў М. Стральцова (1987), які змешчаны і ў Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі, і ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі? Здымак сталага чалавека, які нямала перажыў і перадумаў, чалавека з глыбокаю складкаю паміж бровамі. І чалавека, які ўсё ж здольны ўсміхнуцца вясёлаю ўсмешкаю.

Усё складвалася добра.

Была праца. Была павага калегаў. Былі дабразычліўцы і душэўныя сябры. Пра Карамазава я ўжо напісаў. Сам Віктар Філімонавіч напіша лепш. Зрэшты, гэта ён, Карамазаў, напісаў, як я думаю, найлепшае эсэ пра Стральцова. Да 50-х угодкаў сябра. І напісалася яшчэ.

Вось калі кажу пра сяброў, грэх не ўспомніць Брыля. У 1980-х іх, Янку Брыля і Міхася Стральцова, часта можна было бачыць разам. Калі Брыль казаў «Міхась», гэта азначала — Стральцоў. Астатнія Міхасі менаваліся з прозвішчамі. Было ў іх, Брыля і Стральцова, адносінах нешта ад патрыярхальнае сям'і, у якой на 20 гадоў старэйшы брат апякуецца малодшым. Іх, Брыля і Стральцова, збліжала калі не роднасць, дык падабенства густаў, стыляў. Старэйшы не бачыў у малодшым, як трэба было б чакаць, канкурэнта і не раўнаваў яго, а, наадварот, прапагандаваў, хваліў.

І не забудзем Карласа Шэрмана. Сябар Рыгора Барадуліна, ён быў сябрам і Стральцову.

Нельга было не радавацца творчым поспехам Стральцова. На пачатку 1986 года Міхась Лявонавіч падпісаў мне свой новы, цудоўна аздоблены зборнік — «Мой свеце ясны». Калі

падпісваў яго, я сказаў: прэмія імя Аркадзя Куляшова кнізе гарантаваная. «А дзяржаўная, Купалаўская»? — спытаўся паэт у мяне. «Дык нібыта спачатку Куляшоўская ідзе...» Вось не памятаю дакладна, што сказаў Міхась Лявонавіч, але выказаўся ён у тым сэнсе, што «Мой свеце ясны» — той выпадак, калі магчымае выключэнне з правілаў.

Цяпер, калі чытаю зборнік, бачу: сапраўды, ён — выключэнне. Стральцову яшчэ не было пяцідзесяці, ён не мог, як стары скептык Вяземскі, сказаць:

Все сверстникі мои давно уж на покое,
И младшие давно сошли уж на покой;
Зачем же я один несу ярмо земное,
Забытый каторжник на каторге земной?

У паэтычным патоку таго часу ягоны зборнік вылучаўся роздумам пра вечныя загадкі быцця. Ведама, чалавек, паэт не можа не пытацца ў сябе: што будзе потым? Здаецца, і адказ маецца («А толькі болей чым імгненне / не прыме вечнасць ад цябе»), але ж нешта і не дае спакою: і «непрыкметна, спакваля расце і шырыцца трывога», і «скаланецца раптам сэрца, ліхой збаяўшыся мяжы». Хоць і не верыцца зусім «у тое наша адцвітанне», але апаноўваюць сумлевы: «Вось год мінуў. Яшчэ міне?» І як бы там ні было, «ужо і сэрца абняла, і пранізала тайны сіла».

Ці было ў тых вершах прадчуванне? Няма ў мяне адказу. Гэта цяпер я такое пытанне фармулюю, а тады, у 1986-м, такія матывы ў стральцоўскай паэзіі ўспрымаліся як філасофская лірыка.

У студзені 1986 года выйшаў зборнік вершаў, а недзе праз месяц у друк была падпісаная яго кніжка крытыкі і эсэ «Пячатка майстра». А яшчэ Міхасю Лявонавічу належала ўкласці кнігу выбранага: набліжаліся пяцідзясятыя ўгодкі, і паводле звычаю належала падсумаваць зробленае. Напачатку меркавалася, што гэта будзе двухтомнік. Але на двух- ці шматтомнік патрабаваліся ўзгадненні ў шмат якіх інстанцыях. Інстанцыі ж вырашылі, што Стральцоў да двухтомніка «не даспеў».

У Брыля, у кнізе «Дзе ваш скарб», прачытанае: «Танк неяк даўно казаў, што Багдановіч пісаў адразу выбранае». Вось я і думаю: калі б было дазволена выдаць двухтомнік Стральцова, у яго ўвайшло б, бадай, усё надрукаванае ім, і гэта быў бы прыстойны Збор твораў, бо тое, што не ўвайшло ў кнігу выбранага, не такое ўжо і слабое. Атрымліваецца ледзь не па Танку: і Стральцоў пісаў адразу выбранае. Ці я памыляюся?

І ўсё ж, нягледзячы на дробныя прыкрасці, у сярэдзіне 1980-х Міхась Лявонавіч меў прыемны клопат: чытаў карэктуру аднае кнігі, чакаў карэктуру другое і рыхтаваў для выдавецтва трэцюю. І думаў — не мог не думаць — пра наступныя.

І ў асабістым жыцці ўсё складвалася нязгорш. Здаецца, спраўджвалася тое, пра што пісаў сам Стральцоў:

А будзе час, калі і без нагоды,
А проста так, ад шчодрасці быцця,
Успомняцца ранейшыя нягоды
Раней нязнанай мерай пачуцця.

І тое, што ўсё некалі балела
І што гняло варожай варажбой,
Падасца смуткам — скрухай пераспелай,
А ўвогуле — харошаю журбой.

«Пры ўсёй складанасці іхніх адносін яна яму патрэбна была вельмі...» Гэта — зноў цытата з Брыля. Гаворка — пра жонку Міхася Стральцова, пра Лену. Цешыла Міхася Лявонавіча меншая дачушка, Алеся. Бацьку за сорак пяць, а яна — малая (Кнопкаю называў). У такім узросце бацька ўжо па-дзедаўску мудры, ведае псіхалогію маленькага чалавека, умее з ім паразумецца.

Калі хто будзе чытаць стральцоўскае эсэ «Спадчыннасць», звярніце ўвагу на першыя два абзацы. Пісьменнік цытуе Галіну Гарэцкую, яе ўспаміны:

«У чэрвені 1936 г. бацька са мною паехаў у М. Багацькаўку. 19 чэрвеня прыехалі ў Смаленск а 7-й раніцы. Пайшлі ў горад. Падняўшыся на гару, ішлі па роўнай вуліцы, злева ўсцяж тратуара зрэдку зялёныя дрэвы. Насустрач групкамі і па адным чыр-

вонаармейцы. Некаторыя мне падміргваюць: «Гэй, курносая!» Глянула сарамліва на бацьку, а ён ідзе справа побач, стройны, дужы і ўсміхаецца. Крыху вышэй сярэдняга росту, вочы карыя, даволі вялікія, хоць і глыбокія. 42 гады было яму, а мне 15».

Пасля цытаты Міхась Стральцоў піша: «Не ўяўляю чытача, у якога не зашчымела б сэрца ад гэтых радкоў: «42 гады было яму, а мне 15». Гэта наша сённяшняе веданне пра Гарэцкага віною таму. Лічы, малады яшчэ чалавек ідзе, амаль дарослая дачка побач, і радуецца звычайнай чалавечай радасцю, хоць і скупа адпушчанай на той час яму, а мы, сённяшнія, ведаем ужо аб той жыццёвай мяжы, якую неўзабаве пакладзе яму лёс. І сэрца ўздрыгвае. І малюнак уздрыгвае і доўжыцца ў часе, нібы стоп-кадр».

Тое эсэ Міхась Лявонавіч прынёс на пачатку 1983 года для юбілейнага — да 90-х угодкаў з дня нараджэння Максіма Гарэцкага — нумара «ЛіМа». А нейк паслей Стральцоў завітаў у рэдакцыю «ЛіМа» не адзін — з прыгажуняю Веранікаю. Мусіць, змеціўшы ў маіх вачох захапленне ці замілаванасць, ён шчасліва ўсміхаўся, нібыта казаў: вось, старычок, якая ў мяне большая дачка вырасла.

Так і хочацца казаць стральцоўскімі словамі: «Лічы, малады яшчэ чалавек... дарослая дачка побач, і радуецца звычайнай чалавечай радасцю...»

Ён, Стральцоў-бацька, глядзеў на Гарэцкага як на бацьку, якому таксама яшчэ не было пяцідзесяці, і добра прасякнуўся гэтым бацькоўскім пачуццём, бацькоўскаю радасцю Максіма Іванавіча...

Тады, калі пісалася і друкавалася гэтае эсэ, ні аўтар, ні мы яшчэ не ведалі тае «жыццёвай мяжы, якую неўзабаве пакладзе яму лёс».

Усе мы ведаем, што «зімовае завеі крадзецца подых за спіной».

Ад каго я пачуў пра хваробу М. Стральцова? Ці не ад Карласа Шэрмана? Ці ад Віктара Карамазава? «Цяжка гэта — ілгаць замоўчваннем блізкаму чалавеку... пра хваробу». Зноў цытата з Брыля. Сябры замоўчваюць, родныя — кажуць няпраўду,

а яны, хворыя, «калі не ведаюць, дык здагадваюцца пра сваю асуджанасць». Ды як не здагадвацца? Адно слова «Бараўляны» можа каторага забіць. Бо ўрэшце дактары вымушаныя будуць сказаць: «Вам трэба легчы на абследаванне». Яны ўжо напэўна ведаюць дыягназ, і гэтае «абследаванне» гучыць для супакаення: маўляў, нічога страшнага пакуль яшчэ няма.

Гэтае журботнае падарожжа ў Бараўляны з Алаю Сямёнавай і Карласам. Мы ведаем дыягназ: рак стрававода. Прычыны? А хто ведае прычыны? Мо і курэнне (маглі мы напусціць поўны кабінет дыму; з форткі, як з коміна, ішоў).

Стральцоўская ўсмешка (няўжо ён не ведае праўды?). І мы, удавана бадзёранькія. Ага, Карлас узяў з сабою фотаапарат. А вось адзін з тых апошніх фотаздымкаў Міхася Стральцова (часопіс «Крыніца», 1989, № 2). Па ўсмешцы відаць: яшчэ кволіцца надзея.

А потым Карлас паведаміць мне пра аперацыю і пра ўскладненне пасля яе. Медыкі ў такіх выпадках кажуць, што аперацыю рабілі нямытымі рукамі. Быў занесены нейкі кок. Патрабаваліся і моцныя антыбіётыкі, і інтэнсіўная тэрапія. Неабходна было лячыць ад дзвюх хваробаў адразу. Мне чамусьці сказалі: нельга. Нельга паехаць да яго. А я вінаваціў сябе: не так развітаўся з Міхасём Лявонавічам. Трэ было яму сказаць, што я заўсёды любіў у ім чалавека і мастака. (Ах, як мы саромеемся быць сентыментальнымі, баімося здацца смешнымі.) Адно спадзяванне: ён здагадваўся пра маё стаўленне да яго і ягонае творчасці.

У яго ў палаце — Карамазаў. Віктар Філімонавіч быў там, калі пачалося трызненне, калі чалавек пачынае глядзець бялкамі. І наступае час, калі з чалавекам застаецца той, хто ведае яго найлепш. Засталася Лена. Каб назаўтра закрыць яму вочы.

А 24 жніўня 1987 года Янка Брыль і я ішлі па вуліцы Румянцава. І тут, амаль ля Саюза журналістаў, адбылася прызначаная сустрэча Брыля з жонкаю Стральцова. Я першы раз бачыў яе. Яна казала, у які касцюм адзене Міхася Лявонавіча, ягонае цела... Казала, што развітанне будзе заўтра і што будзе яно нядоўгае, бо занесеная інфекцыя такая, што нельга, каб цела больш працяглы час ляжала ў нармальных — пакаёвых — умовах.

...У мяне даўно не было такога ўзрушэння, як на пахаванні Адамчыка. Вячаслаў Уладзіміравіч быў абсалютна не падобны на сябе жывога, якім я яго ведаў. Калі б не жонка ягоная, не дзеці, я б каму чужому і ў іншых абставінах нізашто не паверыў, што ў дамавіне — Адамчык.

Тады, у жніўні 1987-га, у мяне было не меншае ўзрушэнне. Раніцай у дзень пахавання я зразумеў, што мне лепш не ісці на грамадзянскую паніхіду. Мне не хацелася бачыць «памочнікаў смерці», якія — я гэта ведаў — абавязкова прыйдуць, каб вынесці Мішу. Але, мусіць, я больш баяўся бачыць мёртвага Міхася Стральцова. Я бачыў мёртвага, непазнавальнага Адамчыка. І цяпер гэты вобраз у маіх успамінах неадменна паўстае і засланяе вобраз Адамчыка жывога. Міхась Стральцоў застаўся ў маёй памяці жывым.

2003

Сонечны Стральцоў

Гутарка Юрася Залоскі з Уладзімірам Бойкам

Юрась Залоска: Вам, Уладзімір Андрэевіч, давялося працаваць разам з Міхасём Стральцовым у аддзеле літаратуры «ЛіМа», бачыць яго як чалавека, назіраць як творцу... І вось наш часопіс прадстаўляе Міхася Стральцова як Постаць — паэта, празаіка, эсэіста. Скажыце, ці не зарана (запозна?) усчынаецца гэта гутарка?

Уладзімір Бойка: А ці існуюць крытэрыі для паняццяў «зарана», «запозна»? У літаратурным жыцці так часта «зарана» і «запозна» ў лёсе творцаў пераблытваюцца... «Зарана» ці «запозна» прыйшло шырокае прызнанне да Уладзіміра Караткевіча? Мабыць, многае «запозна» для лёсу такога чалавека, такога пісьменніка... «Зарана» тут ніколі не бывае, калі, канешне, творца і сам умее паглядзець на сябе збоку дастаткова патрабавальна.

Калі гаварыць пра Стральцова, дык увага да яго творчасці і асобы ніколі не можа быць перадчаснай. Што датычыць запозненасці, дык вось паралельны прыклад, мне здаецца, досыць

красамоўны: паэт Алесь Разанаў. Памятаю ягоны зборнік, які не мог выйсці ў свет, пакуль да яго прадмову не напісаў Пімен Панчанка, а пасляслоўе — Варлен Бечык (ролю грамадскага рэдактара ўзяў на сябе Уладзімір Караткевіч, і трое рэцэнзентаў паставілі на ім свае подпісы). Бачыце, якое атачэнне патрэбна было, каб адпаведныя «інстанцыі» дазволілі паэту прыйсці да чытача?.. Вось, па сутнасці, і пазнілася кніга... Значыцца, і ўвага чытача тармазілася... Але «інстанцыі» гэта мала турбавала. А вершы ўражвалі нетрадыцыйнасцю, актыўнымі пошукамі формы. Сёння гэты паэт не абыдзены ўвагаю, але ці адэкватна чытае яго крытыка? Канешне, нямала істотнага і важкага пра яго творчасць сказана. Ды яна — праява больш шматслойная, больш аб'ёмная... У такім сэнсе моцна запазняецца і гаворка пра Міхася Стральцова. Хто быў на вечары ў гонар ягонага 50-годдзя ў Доме літаратара, памятае, як прагнуў пісьменнік пытанняў пра творчасць... А пытанняў такіх было так мала...

Ю. З.: Але тым не менш гаворка пра Стральцова пачалася, І пачалася з пэўным пафасам і ў пэўным тоне. Наколькі яны слушныя?

У. Б.: Усё ж пачыналася яна трошкі раней, а цяпер прадаўжаецца. Што датычыць пафасу і тону, дык здаўна ўтварылася нейкая «іерархія», «табель аб рангах» — літаратурнымі чыноўнікамі; пэўныя пабочныя прычыны часта ўплывалі на характар, змест і нават «памеры» гаворкі вакол таго ці іншага пісьменніка. Па сёння гэта не зжыта ў літаратурным побыце.

Адсюль, мабыць, далёка не заўсёды адэкватнае адлюстраванне рэальнай «удзельнай вагі» таго ці іншага творцы ў літаратурным працэсе.

Праява Стральцова была адразу відочная, хоць і гаварылі пра яго «пад сурдзінку». Адразу не падлягала сумненню, што гэта — адметная індывідуальнасць. Па-першае, апавяданні. Іх аўтар — вытанчаны стыліст (наўмысна падкрэсліваю гэта, таму што культура беларускай прозы шмат у якіх праявах знівелявана...). Вакол апавяданняў Стральцова адразу пачалі ўзнікаць «завіхрэнні» ва ўспрыняцці нават блізкім да пісьменніка колам чытачоў. Памятаю вострыя спрэчкі вакол апавядання «Свет Іва-

навіч, былы донжуан». Аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь» стала падзеяй вельмі прыкметнай... Па-другое, стральцоўскія артыкулы і эсэ. Працуючы ў «ЛіМе», нельга было не пісаць рэцэнзій, пэўных матэрыялаў да літаратурных дат. І з першых жа публікацый гэтага жанру акрэслілася адметная эсэістычнасць стральцоўскага пяра, вытанчанасць стылістыкі, культура мыслення, інтэлігентнасць... Нельга было не дзівіцца, колькі гэтым зусім яшчэ маладым чалавекам было назапашана душэўнага досведу, колькі было начытана, адчута, перадумана. Бліскучая арыентаванасць у еўрапейскай літаратуры, у рускай, не кажучы ўжо аб роднай... Стральцоў адразу заняў у беларускай літаратуры сваё месца, сваю нішу, і, мабыць, можна дастаткова рашуча акрэсліць, АДКУЛЬ ён ідзе... Але яшчэ пару слоў пра яго эсэістыку.

Ці не пра Кузьму Чорнага ўзяўся ён напісаць для газеты. Памятаю, Міхась знік на колькі дзён з рэдакцыі. І вось прыходзіць, дыктуе — тры-чатыры старонкі машынапісу. Невялічкае эсэ. Але — такое шчыльнае! Адным духам чыталася. Не магло не ўразіць: трапныя назіранні, сваё свежае, важкае слова, актыўнасць перажывання...

Ю. З.: Напэўна, таму спрыяла яго ўнутраная паэтычнасць, паэтычнае ўспрыняцце рэчаіснасці?

У. Б.: Можна валодаць развітым паэтычным успрыняццем рэчаіснасці (і рэчаіснасці літаратурнай таксама), але пры гэтым кепска арыентавацца ў рэальнай праблематыцы жыцця. У Стральцова ж — менавіта начытанасць, арыентаванасць у свеце літаратуры, а галоўнае — арыентаванасць у *балючых кропках душы сучасніка,* найвялікшая спагаднасць да гэтай душы. Колькі ён пакутаваў з-за душы чалавечай — сваёй, чужой,— па вялікім рахунку, па дробязях... Дробязяў у людзях для яго не было. Ён умеў паспагадаць, суперажыць, усцешыць, зразумець... Інтэлігентнасць арганічная... Ніколі не стамлюся вымаўляць гэтае слова ў дачыненні да Стральцова.

Ну і, нарэшце, паэзія. Яго першыя вершы парушалі звыклае і напрацаванае беларускай паэзіяй, тут не было ўсялякіх «гімнаў», але чуваць было, «як гарыць цыгарэта, кінутая некім

на вуліцы», відочныя былі «зялёныя кругі жыцця»... Для мяне, як чытача, стральцоўскія парушэнні звыклага ў паэзіі гэтак жа заўважныя нечаканасцю, як і рэчы Разанава. Пры ўсёй індывідуальнасці кожнага гэта праявы РОДНАСНЫЯ — па культурнай глебе, якая іх жывіць, па ўнутраным напале і напяцці радка... Многімі аўтарамі друкуюцца кіламетры вершаў і дзясяткі тысяч тэм, матываў уздымаецца, і хвалюючых, і цікавых, але з гэтых кіламетраў столькі напісана як бы адной рукой і перажыта як бы адным (нейкім сярэднеарыфметычным) узроўнем біцця сэрца... Фармальна — нібыта пісьменныя вершы, але каб прыйсці ў паэзію і сказаць: «Я — той, хто шлях, і хто па ім ідзе» (А. Разанаў), альбо: «Кіну, рыну — пакіну / Гэты дом на гары, / Горкі дым успаміну / Хай развеюць вятры» (М. Стральцоў)... Здавалася б, гранічна традыцыйна, але — якое напяцце пачуцця і якая натуральнасць інтанацый!..

Такім чынам, тры іпастасі Стральцова: проза, эсэістыка, паэзія. Гэта праявы аднаго — высокага! — кшталту, аднаго ўзроўню.

Ю. З.: Ці не знаходзіце, што, апроч начытанасці, у Стральцова само жыццё, варункі жыцця былі балючай кропкай? Маю на ўвазе развітанне з вёскай, тым векавечным ладам жыцця, з якога паэт выйшаў і мусіў быў назаўсёды яго пакінуць.

У. Б.: Ну, калі пісаў пра гэта, значыцца — не пакінуў... Тут я вымушаны крануць матывы, якія прагучаць дысанансам з распаўсюджанымі і як бы ўжо ўсталяванымі поглядамі...

Справа ў тым што ў каго пальцам ні пакажы з нашых сучасных паэтаў і празаікаў — ледзь не перад кожным так ці інакш стаяла гэта праблема. І перад пасляваенным пакаленнем таксама. І нават раней. Задоўга да вайны было засведчана цяпер ужо сапраўды класікам: «Зноў шкода мне родных аселіц, / скрыпучых на полі калёс. / Туман серабраны абеліць / атаву звінячую, плёс... / Зара на куросаднях ціха / збіраецца ўжо начаваць, / а мне яшчэ хочацца крыху / на ржышчы старым пастаяць...» Хочацца, «каб і без мяне мае зоры гарэлі над вёскай маёй...» Я гарадскі чалавек, а ўсё жыццё са мною гэтыя радкі. Аднекуль адтуль, з дзяцінства, калі давялося і вясковага жыцця

паспытаць удосталь. Пасля прыйшло пакаленне, якое засведчыла вуснамі Рыгора Барадуліна: «Трэба дома бываць часцей, / трэба дома бываць не госцем...» (Гэтае натуральнае пачуццё не замінае яму засвоіць сэрцам большыя абшары і ў прасторы, і ў часе...) А шмат хто так і застаецца на мяжы паміж горадам і вёскай: і сваёй несумненнай сувязі з народнай культурай не рэалізуе, і выкшталцонасці культуры гарадской не дасягае. Так і застаюцца недзе паміж горадам і вёскай... Не хапае, мабыць, таго, чым так багаты быў Міхась Стральцоў.

Ю. З.: Я, аднак, меў на ўвазе менавіта тое, што Міхась Стральцоў можа, як ніхто ў пару 60–70-х гадоў здолеў адчуць драму вёскі...

У. Б.: Мне здаецца, не ўсё так проста. Тое, што ён адчуваў драму і, можа, адным з першых, калі не першы, па-мастакоўску выявіў яе, — гэта факт. Але «драма вёскі» — толькі часцінка тае драмы, што выяўлена ў творчасці Міхася Стральцова. Пра гэта, мабыць, даследчыкі яго творчасці яшчэ скажуць. Ім яшчэ трэба ПРАЙСЦІ ШЛЯХ Стральцова. Яны — на пачатку шляху. Наўрад часцінку драмы варта выдаваць за ледзь не пануючы матыў, хоць знешне гэтая драма здольна падацца зручным стрыжнем, на які можна «насадзіць» аналіз творчасці гэтага пісьменніка. Вельмі зручна залічыць Стральцова да так званых «деревенщиков», але ён, востра адчуваючы і выяўляючы драму вёскі, выходзіць усё ж на інакшыя абсягі чалавечай драмы... Разумееце, як назваць тую драму, што вынікае з ажыццяўлення мары Паўлюка Труса: «О, край палёў, калі ж ты станеш / краем фабрык дымных і машын?..»? Ну, стала Беларусь «краем фабрык»... Цікава было б суаднесці гарадскія матывы лірыкі Труса і Стральцова. Не зразумейце так, быццам рупіць мне тут экалогія матухны-прыроды. Яна, канешне, рупіць. Але Стральцоў адчуў прадонне ЭКАЛОГІІ ДУШЫ... У «сямі восьмых» айсберга ягонай паэзіі і прозы адчувальная праблема праблем: абездухоўленне чалавека — ці не ёсць гэта працэс незваротны. Міхась востра адчуваў: для любога чалавека, апроч здольнасцяў і таленту, патрэбна *культура абыходжання* са сваімі здольнасцямі і талентам. Патрэбна *работа*

душы. А яе выцясняе празмерна сур'ёзнае да сябе стаўленне, эгацэнтрызм, страта здольнасці адчуваць чужы боль як свой... Паўтару: да адэкватнага прачытання Стральцова — яшчэ ШЛЯХ І ШЛЯХ...

Ю. З.: Нагадаю: вы сказалі, што можна акрэсліць, АДКУЛЬ ён ідзе.

У. Б.: Натуральна. Найперш Міхась Стральцоў узнік як пачатак самога сябе. Для яго надта ж прыдатнае азначэнне Разанава: Я — ТОЙ, ХТО ШЛЯХ, І ХТО ПА ІМ ІДЗЕ... Так-так: Стральцоў быў і шляхам, і тым, хто па ім ішоў. Дык АДКУЛЬ ЖА, усё-такі?

Некалі моцна выцяла па сэрцы кніга «Загадка Багдановіча». З'яўленне гэтай рэчы здзівіла. Не ведаю, як знаўцы Багдановіча ўспрымаюць яе, хоць у кніжкі, здаецца, добрае імя, — магчыма, пэўныя даследчыкі і з пачуццем рэўнасці ставяцца да высноў Стральцова, які зусім нечакана выйшаў да чытача з адметнай, нестандартнай, тыпалагічна новай літаратуразнаўчай работай... Калі б мы былі меней заклапочаныя «табелем аб рангах», празмернай увагай да «іерархіі», дык за такую работу не грэх было б прысудзіць аўтару навуковае званне. Пры нашай жа культуры літаратурнага і навуковага побыту дарэмна было чакаць такой павагі да адкрыццяў калегі... А ў «Загадцы Багдановіча» адкрыцці ёсць. І Міхася Стральцова, чалавека, з якім сустракаўся кожны дзень, я тады ўбачыў інакшымі вачыма. Якая найтанчэйшая духоўная, душэўная структура, з якіх балючых, найтанчэйшых ніцяў выткана гэтая душа... І кожная з ніцяў трымціць і баліць усімі болямі рэчаіснасці — сённяшняй, учарашняй, заўтрашняй, — і ўсімі болямі культуры. Дзякуючы яму бачыш трагізм культуры, засведчаны праз вострае маральнае адчуванне канфлікту бацькі і сына Багдановічаў. Тое, што ўсе імкнуліся загладзіць, прыхарошыць, Міхась Стральцоў не пабаяўся выявіць. Чаму? Адказ у паэзіі Багдановіча: «Проці цячэння вады зможа толькі жывое паплыць...» З тым балючым, што было ў лёсе Багдановіча, Стральцоў не пабаяўся сутыкнуцца. І гэта не прыватны матыў канкрэтнай біяграфіі канкрэтнага паэта і пісьменніка (маю на ўвазе і Багдановіча, і Стральцова);

інтэнсіўнасць іх болю з нагоды чалавечай драмы — гэта мадэль нечага істотнага ва ўсёй нашай культуры. Тут можна бачыць нейкія прыкметы кону... Прыкметы таго, што стагоддзямі навісае над беларускай культурай... Вунь калі не «зарана» было гаварыць пра Стральцова НА ПОЎНЫ ГОЛАС — калі ён адкрыў «свайго» Багдановіча. І па сёння ці адэкватна перажыта чытачом стральцоўская «Загадка Багдановіча»?..

Міхась Стральцоў па самой існасці свайго таленту — з нішы Багдановіча. Ён увесь — з тых імпульсаў, што ад Максіма-кніжніка сыходзяць. АДТУЛЬ яго шлях...

Ю. З.: Такім чынам, на пытанне «АДКУЛЬ Стральцоў?..» вы адказваеце — «Ад Багдановіча»?

У. Б.: Так. Некалі шмат хто ішоў за Багдановічам. Але, як ведаеце, былі 20–30-я гады. Арбіты літаратурнага развіцця былі груба парушаны, і многія творцы былі адштурхнуты ад «багдановічаўскага шляху». Аднадумцам Багдановіча быў Бядуля — яны сябравалі. Гарэцкі — сучаснік Багдановіча — маліўся на яго, распрацоўваючы свой накірунак (дарэчы, Гарэцкі і Стральцоў — асобная тэма для даследчыкаў). І быў цэлы шэраг маладых паэтаў 20–30-х гадоў, якія адбыліся як творцы, але не цалкам раскрыліся... Ну, а на спадчыну Багдановіча тагачасныя «ідэолагі» глядзелі праз павелічальнае шкло, вышукваючы што б там вырваць з літаратурнага ўжытку (прыгадайце, як доўга не перавыдавалася літаратурна-крытычная і публіцыстычная спадчына Багдановіча)... Дык вось, Стральцоў — гэта не што іншае, як актыўнае аднаўленне глыбіннага разумення традыцыі, менавіта накірунку багдановічаўскай традыцыі як адной з вядучых у беларускай культуры (на мой погляд, дык і самай плённай). Сёння зусім відавочна, што багдановічаўская традыцыя — адзіны нармальны шлях, на якім могуць быць вырашаны праблемы адраджэння, нашы сённяшнія і заўтрашнія праблемы; вырашаць нашы сённяшнія праблемы калісьці пачаў Максім Багдановіч! Вось што важна зразумець, шукаючы адказу на вашае пытанне аб своечасовасці ні несвоечасовасці цяперашняй увагі да Міхася Стральцова...

Так, праблемы нашага адраджэння пачаў вырашаць Максім Багдановіч. Задаў танальнасць і ўзровень вырашэння гэтых праблем. Уладзімір Караткевіч ледзь не класічна ўпісваецца ў намаганні, да якіх далучаю Міхася Стральцова. І пра Караткевіча можна сказаць, што яго пачатак — ад Максіма-кніжніка... Мы столькі дзесяцігоддзяў пагарджаем кніжнікамі. Мы любім — каб «ад вёскі», «ад сахі», «ад бараны»... Ці зжытыя, урэшце, славутыя заклікі «ўдарнікаў» у літаратуру?! Канешне, мо і занадта завастраю. Ды не зразумейце так, быццам Купалу і Коласа процістаўляю Багдановічу. Яны ж таксама — «ад кніжніка»...

Ю. З.: У мяне склалася такое ўражанне, што Стральцоў быў досыць адзінокім творцам у сваім часе...

У. Б.: Ну які ж ён адзінокі, калі побач — Караткевіч, Разанаў, Барадулін, Адамовіч, Быкаў?.. Сёння развіваецца ў гэтым рэчышчы творчасць Уладзіміра Арлова. І дай яму Бог надалей асталявацца... І сярод самых маладых сёй-той спараджае аптымістычныя надзеі...

Ю. З.: Баюся, Уладзімір Андрэевіч, што ў нашай гутарцы скора перабяром усіх сяброў рэдкалегіі новай «Крыніцы» — Разанава, Арлова... Чытачы могуць не так зразумець...

У. Б.: Даруйце, але я не ведаю, хто сябры рэдкалегіі. (*Смяецца.)* А што, Дранько-Майсюк, выпадкам, не сябра рэдкалегіі?.. Мне карціць і яго тут назваць. Дарэчы, калі з Міхасём працавалі ў «ЛіМе», тыя матэрыялы, дзе аўтары былі з намі нязгодныя, палемізавалі, мы ў першую чаргу рыхтавалі да друку, старанна захоўваючы папрокі ў свой адрас. Падшыўкі газеты могуць пацвердзіць, што чыстую праўду кажу. Я кажу пра Разанава і Арлова не як пра членаў рэдкалегіі, а як пра пісьменнікаў, якіх чытаю... Прадмет гаворкі вымагае таго, каб іх імёны тут назваць — іншыя ў кантэксце гэтых разваг не стасаваліся б. Гэтак удакладняецца адказ на вашае няпростае пытанне: гэта сёння добра відаць, што Стральцоў не быў адзінокі. А тады, мабыць, і Стральцоў, і Караткевіч, і Разанаў, і Барадулін — кожны пасвойму быў адзінокі... Разанаў сёння хіба не адзінокі? (Прашу шаноўнага сябра рэдкалегіі захаваць і гэтае, можа, занадта суб'ектыўнае меркаванне. Што зробіш, так успрымаю...)

Ю. З.: Як Міхась Стральцоў пачуваўся ў кантэксце свайго часу і свайго пакалення; як ён рэагаваў на пэўную заангажаванасць — ці то палітычную, ці суполкавую; як ён існаваў?

У. Б.: Чалавеку, які займаўся літаратурнай крытыкай, існаваць у тыя часы было вельмі не проста. І шляхі выяўлення свайго стаўлення да таго, што з'яўлялася ў літаратуры, былі розныя. Для Стральцова гэта было няпроста па-свойму, у яго былі свае шляхі. Яго інтэлігентнасць дапамагала яму знаходзіць выйсце, здавалася б, з безвыходных сітуацый... Як ён рэагаваў на «заангажаванасць»?

У нас так часта гэтае паняцце напаўняецца неадэкватным зместам. Мне здаецца, выдатна разумеў сваю заангажаванасць і адказна да яе ставіўся Максім Багдановіч. Ён бліскуча выканаў усе задачы сваёй заангажаванасці. Гэтак жа і Уладзімір Караткевіч, і Алесь Разанаў, і Васіль Быкаў, і Алесь Адамовіч, і кожны, хто па-сапраўднаму заангажаваны РОДНАЙ КУЛЬТУРАЙ. Заангажаванасць, на жаль, разумеюць часта зусім механічна. Гэта ж і ёсць той самы «сацыяльны заказ», які чамусьці блытаюць з заказам адміністрацыйным. А справа ў тым, што сацыяльны заказ (заангажаванасць) і заказ адміністрацыйны — рэчы зусім розныя. Адпаведным «інстанцыям» у свой час, мабыць, было выгадна за сацыяльны заказ выдаваць заказ адміністрацыйны, які і зыходзіў з «інстанцый». А сацыяльны заказ НЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ ні ад якой адміністрацыі, бо ён фармулюецца не ёю, не ЦК партыі, не парламентам ці Саўмінам незалежнай Беларусі — гэта, калі заўгодна, ПАТРЭБА ЭПОХІ. Эпоха ангажуе творцу. БЕЛАРУСЫ НІКОГА НЕ МАЮЦЬ?.. — «НЯХАЙ ЖА ХОЦЬ БУДЗЕ ЯНКА КУПАЛА»!.. Вось вам вырашэнне сацыяльнага заказу.

Аніякая адміністрацыя не была зацікаўлена ў такім вырашэнні. Затым Багдановіч з'явіўся. Яго выклікала да жыцця патрэба няшчаснай культуры, якая ніяк не магла асталявацца, заціснутая ў «Северо-Западном крае». Патрэба пашыраць рамкі роднай культуры, ставіць яе на «пачэсны пасад між народамі» (гэта Купалавы словы і больш познія) — Багдановіч гэта адчуў найвостра, заангажаваны роднай культурай. Вось жа была тая ноч

у жыцці Багдановіча, калі ён стварыў «Пагоню»... «Хай пачуюць, як сэрца начамі / аб радзімай старонцы баліць». Хай пачуюць! Вось вам вырашэнне сацыяльнага заказу. Трэба было зафіксаваць БОЛЬ. І гэтым болем былі заангажаваны і Купала, і Колас, і Багдановіч, і Бядуля, і Гартны, і Гарэцкі, і Гарун... Мы заангажаваныя сёння, як некалі Алесь Гарун: «Дык шануй, Беларус, сваю мову — / Гэта скарб нам на вечныя годы; / За пашану радзімаму слову / Ушануюць нас брацця-народы!» Не чую гэтага чатырохрадкоўя сёння, хоць зборнік Гаруна перавыдадзены...

Стральцоў і вырашаў (у самых нетрах таталітарызму) сацыяльны заказ — сапраўдны, а не адміністрацыйны. У гэтым сэнсе ён быў заангажаваны, як і Багдановіч, і Купала, і Колас... Як Быкаў сёння заангажаваны. Уся творчасць Алеся Адамовіча — хіба гэта не заангажаванасць?.. Шчасце лёсу Стральцова ў тым, што ён адэкватна адчуваў і рэалізаваў сваю заангажаванасць. Ён вырашаў сацыяльны заказ эпохі, зразуметы не вульгарна-сацыялагічна, а — сутнасна...

У гэтым сэнсе своечасовая ці не своечасовая ўвага да Стральцова — не зусім тое пытанне. Аб'ектыўна ён існуе і застаецца нашай сучаснасцю. Ён — наша ПЯКЕЛЬНАЯ, БАЛЮЧАЯ СУЧАСНАСЦЬ. Варта разгарнуць любы зборнік яго вершаў, эсэістыкі, каб пераканацца: Міхась Стральцоў — еўрапейскага кшталту пісьменнік. І гэта — ад арыентаванасці на культуру, на творчасць, на літаратуру як ДАР (Багдановічава слова). Дар можа быць, калі мы патрабавальныя да сябе, калі на еўрапейскім узроўні працуем і творым, калі не даем сабе паслаблення, як Міхась Стральцоў... Міхась не даваў сабе паслаблення за рабочым сталом, востра адчуваючы, што не ў гісторыі, а побач і Купала, і Колас, і Багдановіч, і Адамовіч, і Быкаў, і Барадулін, і Разанаў, і... тыя, што яшчэ прыйдуць... Не ў тым справа, у першым ці другім пакаленні ён інтэлігент. Інтэлігентнасць — гэта не толькі адукаванасць; гэта — формула душы, яе вартасць, якасць, здольнасць адчуць БОЛЬ.

Адчуванне болю ў Стральцова ўвесь час было. І, можа, ад таго — яго асабістая трагедыя... Міжволі прыгадваецца лёс Сяргея Ясеніна. Піў Ясенін не ад таго, што быў разбэшча-

ны, як многія сцвярджаюць, — ЯМУ БАЛЕЛА. Каб зразумець асабістую трагедыю Стральцова, ёсць адзін толькі шлях: паглыбіцца ў яго паэзію, пагарджаючы любымі плёткамі. Перш чым вымаўляць папрокі, варта як след падумаць, якія невырашальныя праблемы перад гэтай душой стаялі... Наўрад ці акрэслім карані гэтай драмы. Але мусім зразумець, як жа было чалавеку цяжка і балюча, што не заўсёды ён быў здольны спраўляцца са сваім душэўным станам...

Ю. З.: Хацелася б пачуць і пра тое, якім быў Міхась Стральцоў у звычайным, паўсядзённым жыцці, якія ў яго былі манеры зносін з сябрамі і калегамі, як ён ставіў сябе ў літаратурным асяроддзі...

У. Б.: Вельмі няпростае пытанне. Яно — прадмет асобнай гаворкі. Абмяжуюся найістотнымі (і, на мой погляд, найкаштоўнымі) штрыхамі.

Ён быў іранічны. Гэта была адмысловая іронія, вытанчаная — спецыфічна стральцоўскэя. Але найперш — самаіронія. «Ну, як жа: мы ж з табою сябры, а гавару з табою як класік!..» Гэта была культываваная самаіронія. І — нярэдка балючая: з разуменнем таго, што нічога не пераробіш у пэўнай жыццёвай сітуацыі. Адсюль — далікатнасць. Адсюль — магутны, але прыхаваны БОЛЬ. Адсюль — бескампраміснае ўзіранне ў сябе...

Калі чужы артыкул трапляў на рабочы стол Міхася — ці ў «ЛіМе», дзе разам працавалі, ці ў «Нёмане», дзе ён працаваў апошнія месяцы жыцця, — аўтар мог быць спакойны, бо ведаў: артыкул будзе прачытаны адэкватна, адэкватна зразуметы і вельмі далікатна і асцярожна, без страт для аўтарскай думкі, падрыхтаваны да друку. Я, напрыклад, ведаў загадзя, калі пісаў па яго замове: Стральцоў усё зразумее дакладна і можна сябе не абмяжоўваць... Бывае, пэўны чыста эмацыянальны «піруэт» замяняе сабой пяць-шэсць абзацаў лагічнага разважання. Стральцоў такія моманты заўсёды разумеў, умеў ім радавацца...

У нас неяк не замацавалася ў побыце завядзёнка званіць па тэлефоне, прачытаўшы кнігу ці артыкул калегі. А Стральцоў не стамляўся званіць. (Яшчэ такі быў — Рыгор Бярозкін.) Можна было з ім год не сустракацца, але вось недзе выходзіць твой артыкул, які прыцягнуў яго ўвагу, — і раптам званок: «Гэта

Стральцоў... Стары, я прачытаў, маю сказаць...» Не было слоў пустой пахвалы ці павярхоўнага незадавальнення — было аргументаванае ПЕРАЖЫВАННЕ таго, што табе ўдалося, а што — не...

Можна выводзіць Стральцова і... ад Чэхава. Бо прынцыпы яго літаратурнага і чалавечага існавання былі замацаваны на маральных імператывах лёсу і творчасці Чэхава. Не ўспрымаць сябе занадта ўсур'ёз. Ён, Стральцоў, ніколі не ўспрымаў сябе «занадта ўсур'ёз» (як успрымаюць сябе многія сённяшнія літаратары). Да пісьменніцтва як да генеральства ён не ставіўся, у яго не было той надзьмутасці і пыхі, якой вее ад усякага «псеўда»... Ён быў сапраўдны пісьменнік і добра ведаў, што гэта накладвае шмат адказнасці. І ён тую адказнасць нёс. Балюча нёс — мы слушна кранаем гэты матыў...

Ю. З.: І смерць яго была пакутнай...

У. Б.: Вельмі. Гэтая душа не заслужыла такіх пакутаў цела...

P. S. Дыялог адбыўся «знянацку». Перачытаўшы тэкст, хацеў быў нешта дадаць. Аднак гэта стаў бы ўжо не той дыялог. Таму — постскрыптум.

...Было шчаслівае лета, калі штораніцы сустракаліся на Камсамольскім возеры, не зважаючы на надвор'е, плавалі ў празрыстай, яшчэ не парушанай купальшчыкамі вадзе... Пасля ішлі снедаць і — праз утульныя зялёныя дворыкі Старажоўкі — да плошчы Перамогі, на вуліцу Захарава, у «ЛіМ»...

...Бывала, і пад выхадныя ўвечары ішлі з работы да яго — на Чарнышэўскага, размаўлялі, чыталі вершы да раніцы, а з ранішнім сонцам — ішлі да мяне, зноў гаварылі, чыталі вершы... Пра што гаварылі? Пра ўсё тое, што эскізна закранута ў гэтым дыялогу (натуральна, у інакшых фармулёўках), пра жыццё, пра ўсё чыста... Калі і напішу ўспаміны пра Міхася, дык размовы (напаўзабытыя) выдумляць, як гэта часам робяць мемуарысты, канешне ж, не стану. Але арыенцір для ўспамінаў, пра што гаварылі і часта, і падоўгу, знайшоў, напрыклад, у яго «Вузельчыку на памяць», пазначаным познімі датамі — 1982, 1985. Вось яно: «У Макса Фрыша... Ён — герой — пасля ночы блізкасці з каханай як бы мімаходзь адзначае сабе, «спадзяецца, што ў сне не хроп». І далей думае пра нешта падобнае. Вось

такая дробязь. А мне падумалася, як часта мы абыходзім вось такія дробязі, якім у мастацтве няма цаны. Каторы наш аўтар ці проста не звярнуў бы ўвагу на такое (банальна! дробязна!), ці такое, каб напісалася, выкрасліў бы маральна пільны рэдактар. Бо такое часам наша разуменне маральнасці і мастацкасці».

Пацверджанне таго, што *не перабольшваю значэння* Багдановіча для Стральцова, аказваецца, ёсць у Алеся Адамовіча: «І заўсёды з ім — можа, як самае радаснае, творча блізкае — Максім Багдановіч. Гэта не выпадкова...»

Пра Багдановіча (са Стральцовым) гаварылі шмат. Мабыць, асабліва шмат, калі даспявала яго «Загадка Багдановіча». З далёкіх часоў помняцца паэтычныя радкі Міхасёвы пра «жыцця зялёныя кругі», якія самкнуцца над галавой, калі «перагару я, ападу я» (як жа няблізка тады ўсё гэта вымалёўвалася...), пра яго адчуванне, што за ім «тыл з любві, пяшчоты, дабраты», нарэшце — пра выказанае ў адным з самых кароткіх яго вершаў: «Ноч. Сон не йдзе. Чую, як гарыць цыгарэта, кінутая некім на вуліцы, — пад ліпу, на ссохлы прыпылены дол. Нянавісці да сябе праз сцяну не пачую...»

Недзе ў Хэмінгуэя: «Мир был ясный и четкий, лишь слегка затуманенный по краям...»

І ўсё чыста, і апошнія сустрэчы (ён так хацеў, каб яшчэ ў якой рэдакцыі папрацавалі разам!..) асветлены былі пачуццём тых першых гадоў, калі столькі заставалася наперадзе, калі свет сапраўды здаваўся незамутнёным, «лишь слегка затуманенным по краям» (адліга! гэта пасля адлігі ўжо — розная муць...), калі над чыстаю, вымытаю дажджом травою, над спакойным люстэркам вады, сарваўшыся з пясчанай водмелі, чайка стартавала некуды ў блакіт...

Сонца... Нам шэнціла на сонечныя раніцы і дні і пазней, насуперак усялякай муці, што затуманьвала абсягі жыцця таксама пазней, пазней... «Мы, старычок, яшчэ папрацуем...» — чую Міхасёў голас.

Не, Хэмінгуэй не памыляўся: «Трудно найти настоящие слова...»

Стральцоў — сонечны...

«Стральцова будуць чытаць заўжды...»

Гутарка Міхася Скоблы з Леанідам Дранько-Майсюком

Міхась Скобла: Леанід, дваццаць гадоў таму ў прадмове да стральцоўскага аднатомавіка Алесь Адамовіч пісаў, што Стральцова чытачы вельмі добра ведалі ўчора, сёння ведаюць не вельмі, затое будуць ведаць заўтра. Як ты лічыш, гэтае «заўтра» наступіла?

Леанід Дранько-Майсюк: У любой сферы чалавечай дзейнасці існуе, як вядома, попыт на майстэрства. У літаратуры — таксама, і нават у першую чаргу, чым дзе... Бо літаратура — гэта перш за ўсё: не *што* напісана, а *як* напісана. І ў гэтым сэнсе Міхася Стральцова будуць чытаць заўжды. Чаму? Ды перш за ўсё таму, што ён — майстар. Для вытанчаных нашых чытачоў творы Стральцова цікавыя хараством пісьма, дасканаласцю думкі — увогуле, прыгажосцю беларускай мовы. А для людзей, якія проста любяць чытаць па-беларуску, Стральцоў цікавы сваёй нявыдуманасцю, сваёй цудоўнай жыццёвай зразумеласцю. І таму ягоныя апавяданні «Смаленне вепрука», «Свет Іванавіч, былы донжуан» чытаюцца як папулярныя раманы, а ягоныя аповесці «Загадка Багдановіча», «Дзень у шэсцьдзясят сутак», «Адзін лапаць, адзін чунь» успрымаюцца як эмацыйна-інтэлектуальнае падарожжа. У адным са сваіх артыкулаў Міхась Стральцоў пісаў пра Янку Брыля — маўляў, Янка Брыль — гэта той пісьменнік, чый талент не папсаваны таннай парадаксальнасцю. І талент самога Стральцова — празаіка, паэта, эсэіста, крытыка, выхавальніка літаратурнай моладзі — таксама не папсаваны таннай парадаксальнасцю. Досвед Міхася Стральцова вучыць: у літаратуры трэба пазбягаць і псеўдасур'ёзнасці, і элементаў цыркацтва. Калі я думаю пра будучыню беларускай літаратуры, то перш за ўсё думаю пра Міхася Стральцова — то бок, уяўляю літаратуру без надзіманай сур'ёзнасці і цыркацтва.

М. С.: Стральцоў працяглы час быў беспрацоўным, лічылася, ён — на творчай працы. У адзін з перыядаў беспрацоўя (1973–

1980) у яго выйшлі тры кнігі. Прыгадай той час, ці можна было пражыць на ганарары?

Л. Д-М.: Калі не піць, не гуляць, не заводзіць пустых жанчын — словам, калі жыць сціпла і абачліва, асабліва калі не пазычаць грошай, то на ганарары можна пражыць і сёння. У савецкі ж час літаратары на ганарары жылі, і жылі даволі ўдачліва; я кажу не пра тых пісьменнікаў, якія часта выпускалі свае кніжкі, а пра тых, якія друкавалі свае зборнікі гады ў рады, а пераважна пісалі для выдавецтваў закрытыя рэцэнзіі. Напрыклад, шмат такіх рэцэнзій пісалі Сцяпан Гаўрусёў, Мікола Федзюковіч, Фёдар Яфімаў...

М. С.: Гэта такая платная паслуга выдавецтву?

Л. Д-М.: Так, за гэта плаціліся неблагія грошы. Сярэдняя рэцэнзія каштавала 30 рублёў. Можна сказаць, што ў 70-я гады мінулага стагоддзя Міхась Стральцоў быў вольным мастаком, а можна сказаць, што быў ён вандроўнікам. Дух вандроўніцтва жыў у ім; невыпадкова ж ён усклікнуў аднойчы: «Кіну, рынупакіну / гэты дом на гары. / Горкі дым успаміну / хай развеюць вятры. / Хіба гэтак няможна? / Дзе пасцелецца цень / ад капы прыдарожнай, / там і будзе пасьцель...» Да слова сказаць, пахвалюся: Міхасю Стральцову вельмі спадабалася назва майго першага зборніка вершаў «Вандроўнік».

М. С.: Апошняя прыжыццёвая кніга Стральцова — паэтычны зборнік «Мой свеце ясны». На кнізе пазначана: рэдактар Леанід Дранько-Майсюк. Ці лёгка было рэдагаваць Стральцова?

Л. Д-М.: Мне не спадабаўся адзін верш, і цяпер я вельмі шкадую, што сказаў пра гэта Стральцову. Міхась Лявонавіч тут жа гэты верш выкінуў са сваёй кніжкі. Нават не памятаю, аб чым быў той верш, памятаю рыфму з яго «віза — тэлевізар». Яна мне здалася няўдалай. Зрэшты, у працэсе рэдагавання не гэта было галоўнае. Сам аўтар быў незадаволены сваёй кнігай. Страшэнна незадаволены! Я яго супакойваў, як мог. Выхад кнігі па тэхнічных прычынах расцягнуўся амаль на два гады (па тым часе тэрмін неверагодна вялікі!), і ўвесь гэты час Стральцоў скардзіўся мне і пры сустрэчы, і па тэлефоне — на сябе, на свае

вершы... У маёй рэдактарскай практыцы такога сябененавіснага аўтара не было. Галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Серафім Андраюк прапанаваў выдаць «Мой свеце ясны» ў палепшаным афармленні, мастак Аляксандр Шэвераў зрабіў цудоўныя ілюстрацыі, Мікола Федзюковіч напісаў узнёслую рэцэнзію, Рыгор Барадулін — чулую анатацыю. Вясною 1986 года кніга выйшла, у Доме літаратара адбылася прэзентацыя ўжо адразу дзвюх кніжак (якраз паспеў з'явіцца і зборнік артыкулаў «Пячатка майстра»). Памятаю, тая прэзентацыя не палепшыла настрой Міхася Стральцова. Можна было падумаць, што ён не любіў сваю творчасць.

М. С.: «А знаеш што, а знаеш што, / мой дружа мілы, / ты ля душы маёй пастой / у час панылы...» Анатоль Сідарэвіч успамінаў, што акурат і не было каму «пастаяць ля душы». Сябра не было. Няўжо Стральцоў быў такі адзінокі?

Л. Д-М.: У Міхася Стральцова быў няпросты характар, і ў ягоных сяброў таксама — няпростыя характары. Гэтым шмат што тлумачыцца. Стральцоў не шукаў самоты, самота жыла ў ім, ён быў самотнікам. Вядома, ад людзей, якіх паважаў, ён хацеў разумення, і ад яго таксама чакалі разумення. Гэта звычайная, класічная сітуацыя. Яна скарачае жыццё мастака, але ўпрыгожвае ягоную біяграфію.

М. С.: Міхась Стральцоў асабліва і не перакладаўся на другія мовы. Хіба што на расійскую. Некаторыя беларускія пісьменнікі, каб выдацца ў Маскве, прыкладалі, скажам так, пэўныя намаганні. Тры стральцоўскія кнігі пабачылі свет у маскоўскіх выдавецтвах. Для іх аўтара такі выхад да чытача быў важным?

Л. Д-М.: Пра тое, каб надрукавацца ў Маскве, наколькі мне вядома, Міхась Стральцоў асабліва не клапаціўся. Але маскоўскія літаратары, якія любілі яго творчасць, усё рабілі дзеля таго, каб творы Стральцова з'яўляліся ў маскоўскіх выданнях. Эдуард Карпачоў, Пятро Кошаль, Вячаслаў Івашчанка, Павел Кабзарэўскі прапагандавалі імя нашага слаўнага пісьменніка. А калі ў часопісе «Дружба народов» у перакладзе Валянціна Тараса з'явілася апавяданне Стральцова

«Смаленне вепрука», то гэта сталася сапраўднай літаратурнай падзеяй у Маскве.

М. С.: Пра адносіны Стральцова з маскоўскімі выдаўцамі па маёй просьбе згадаў Уладзімір Някляеў:

«Я вучыўся ў маскоўскім Літінстытуце, ездзіў туды-сюды ўвесь час, цягнула дахаты. І мяне скарыстоўвалі многія, як паштара: хто перадаваў кавалак сала сваім перакладчыкам, хто — пляшку «Белавежскай», хто — пальцам пханай каўбаскі. Такія тады былі законы жыцця... Стральцоў ніколі нікому нічога такога не перадаваў. Ён перадаваў толькі кнігі, і яму адтуль перадавалі толькі кнігі».

М. С.: У паэзіі Міхася Стральцова адчуваецца туга па сусветнай культуры. У гэтым сэнсе яго можна было б назваць акмеістам «у адзінкавым экземпляры»: «Жыву, як выгнаны патрыцый...» — мне ў гэтым радку чуецца шкадаванне, усё ж савецкая рэчаіснасць была ізаляваная ад сусветнага культурнага працэсу. Хто бачыцца табе папярэднікам Стральцова ў беларускай літаратуры?

Л. Д-М.: Перш за ўсё Максім Багдановіч, але таксама ж і Максім Гарэцкі, і Кузьма Чорны, і Уладзімір Дубоўка, і Уладзімір Жылка. Безумоўна, Багдановіч у гэтым залатым пераліку займае выключнае месца, невыпадкова ж аўтару «Зоркі Венеры» Стральцоў прысвяціў сваю лепшую аповесць «Загадка Багдановіча». Постаць Максіма Багдановіча Стральцоў успрымаў як тую нацыянальную праграму, паводле якое беларусы могуць вярнуцца і да сваёй мовы, і да сваёй культуры.

М. С.: Стральцоў ці не адзіны з крытыкаў пісаў пра «нацыянальнасьць метафары», цытаваў пры гэтым Купалу: «і стагнаў яловы плот, / хохлік бегаў ля варот». Ці праваамерна гаварыць пра «нацыянальнасць» выяўленчых сродкаў у паэзіі?

Л. Д-М.: Метафара, як вядома, гэта паэтычны моўны выраз, ужыты ў пераносным значэнні. Менавіта ў пераносным, таму невыпадкова ў 1920-я гады гэтае грэцкае слова па-беларуску менавалася «пераносняй». Метафара — гэта не толькі мастацкая з'ява, але і псіхалагічная, таму Міхась Стральцоў меў рацыю,

калі пісаў пра «нацыянальнасць метафары». Згадаем самога Стральцова: «І ранняй восені пара / з яе бадзёрай адзінотай / з прысадаў, саду і двара / ужо глядзіць зусім не ўпотай — / не зварухні, не закрані! / Няхай халодна грані граюць, / пакуль кляновыя агні / красой апошняю палаюць!»Дык вось, гэтыя радкі — як увасабленне нашай нацыянальнай памяркоўнасці: маўляў, не трэба чапаць тое, што створана не намі. А вось прыклад украінскай метафары, з паэзіі У. Самійленкі: «Люба веселочко! Будь ти й мені за ознаку надії, / що не потоне народ наш без сліду в народностях інших!» А вось польскі прыклад, з паэзіі Галчыньскага: «O, tajemniczosci staroswiecka tych lisci nad murem browaru. Za tym murem oszalaty Augustyn topi w studni zofte pantofle». Адразу чуецца нязвыклая для нас містыка і бачацца незразумелыя для ўраўнаважанага беларускага характару выбрыкі... А вось самапахвальба імперскага паэта: «Я памятник воздвиг себе нерукотворный...» Параўнаем са сціпласцю Янкі Купалы: «Я не паэта, о крый мяне Божа!.. — і яшчэ раз пераканаемся: меў рацыю Стральцоў — ёсць яна, ёсць нацыянальная метафара.

М. С.: Наколькі прысутны Стральцоў у сучаснай беларускай літаратуры? Наколькі ён прачытаны, засвоены, зразуметы?

Л. Д-М.: Прозу, паэзію, эсэістыку Міхася Стральцова павінны ўважліва прачытаць найперш нашыя літаратурныя пачаткоўцы, маладыя пісьменнікі. Імі, на жаль, Стральцоў не надта засвоены, бо не надта прачытаны. І таму я прашу маладых: не трэба жыўцом класціся ў труны, а трэба кожны дзень уважліва чытаць, вывучаць творы Гарэцкага, Чорнага, Стральцова, каб нарэшце ўпэўніцца ў простым: мы жывыя, бо ёсць наша цудоўная літаратура!

2007

Ціхан Чарнякевіч

«Журба і пасміханне павінны быць у гэтым…»

Гісторыя тэксту аповесці «Конь гуляў на волі»

Гэтак павялося: няспраўджаны твор вядомага пісьменніка вярэдзіць душу чытача значна больш за тыя, што даступныя, апублікаваныя, даўно знаёмыя кожнаму. Хвалююць пажар Александрыйскай бібліятэкі, другі том «Мёртвых душаў», страчаныя (ці прыхаваныя) архівы пісьменнікаў «расстралянага адраджэння», працяг «Каласоў пад сярпом тваім»... Адным з такіх літаратурных міфаў сталася і ненапісаная аповесць Міхася Стральцова «Конь гуляў на волі». Пра яе згадваюць многія блізкія знаёмыя пісьменніка, а мемуарныя тэксты Р. Барадуліна і Б. Сачанкі нават і носяць аднайменную назву.

Увага на гэты твор М. Стральцова звярталася перадусім таму, што пасля 1973 года, калі было апублікавана «Смаленне вепрука», Стральцоў адышоў ад прозы і так і не вярнуўся да яе. Гэты крок быў, мякка кажучы, зусім нехарактэрны для літаратурнага жыцця таго часу. Пісьменнікі, якія былі заўважаныя і зарэкамендавалі сябе ў пэўным жанры, у большасці сваёй імкнуліся да часцейшага публікавання, выдання новых кніг і, адпаведна, да пэўных выгодаў, што прадастаўляліся пісьменніцкай арганізацыяй, літфондам і г. д. На шляху да гэтых выгодаў творцы нярэдка збочвалі з вузкай сцяжыны высокай літаратуры на вытаптаны гасцінец макулатурна-літаратурнай шэрасці. Паводле сведчанняў мемуарыстаў, М. Стральцоў заўсёды заставаўся ў рашучым супрацьстаянні падобнай завядзёнцы, патрабуючы ад пісьменніка ашчаднасці на слова і адказнасці за слова.

Пенсіянерам па Інфарктэнштрасэ
Пацягнеш за сабою ўсе свае тамы —

папярэджваў ён сваіх калег. У 1973-м Стральцоў-празаік замаўчаў. Аднак у кулуарах хадзілі чуткі, што рыхтуецца, пішацца нешта новае, была і назва — аповесць «Конь гуляў на волі».

У часопісе «Маладосць» неаднаразова анансаваўся яе выхад. І неаднойчы пераносіўся. Рукапіс у рэдакцыю не паступаў. Урэшце, пасля смерці Стральцова ў 1987 годзе, сам твор стаўся своеасаблівым міфам. Што перашкодзіла з'яўленню гэтага твора — нежаданне паўтарацца? Боязь правалу пасля трыумфальнага «Смалення...»? Самакрытычнае стаўленне да напісанага?

Сёлета, працуючы ў архіве над укладаннем збору твораў Міхася Стральцова, мне пашчасціла крыху праясніць сітуацыю.

Наогул фонд Стральцова ў Беларускім дзяржаўным архівемузеі літаратуры і мастацтва — адзін з самых сціплых. Гэтаму «пасадзейнічалі» многія фактары. Бадай, што сам пісьменнік не асабліва рупіўся пра збіранне і захаванне ўласнага архіва. Гэта па-першае. Па-другое, жывыя яшчэ дзясяткі родных, сяброў, сучаснікаў і знаёмых Міхася Стральцова і, адпаведна, многія ягоныя аўтографы застаюцца па-за сценамі архіўнага фонда. Напэўна, гэта нармальна. Але ў той жа час, калі брацца за сапраўды навуковае вывучэнне рукапіснай (і машынапіснай) спадчыны Стральцова, яго біяграфіі, то даследчык апынецца ў незайздросным становішчы. Напрыклад, у фондзе захоўваецца ўсяго два лісты пісьменніка, з апавяданняў — толькі некалькі. На пальцах можна пералічыць фатаздымкі. Крыху лепшая сітуацыя з вершамі і крытычнымі артыкуламі. Яны захаваліся ў дастатковым аб'ёме і ў асабістым фондзе, і ў фондах літаратурных часопісаў, дзе друкаваўся Міхась Стральцоў. Фактычна на сённяшні дзень Багдановіча значна прасцей даследаваць і рыхтаваць да выдання, чым Стральцова. Парадокс, пра які пісаў некалі Сяргей Аверынцаў, — тэкстаў пісьменнікаў XX стагоддзя нярэдка застаецца менш, чым Геракліта і Анаксагора.

Але вернемся да прадмету размовы. Як і да знаёмства з архівам, так і пасля лёс аповесці «Конь гуляў на волі» застаецца нявысветленым. Аднак удалося адшукаць сляды работы Міхася Стральцова над ёй.

Першы накід з'яўляецца ў нататніку 1970-х гг.:

Конь гуляў на волі

Шукаў канструкцыю і сюжэт. Сюжэт павінен быць просты, як просты, трохі элегічны, светлы павінен быць агульны тон. Ні меладраматызму, ні ўяўнага завастрэння дзеяння. Гэта не трэба, ды гэта і не маё.

Пры знаёмым табуне
Конь гуляў на волі...

Журба і пасміханне павінны быць у гэтым.

І чаканне лепшага (спакойнае чаканне) і надзея.

Юныя ў юнацтве, старыя ў старасці, мы і г. д.

Трагічнае падаць праз Паўла.

Былое і сённяшняе замаруджана цячэ над усімі. Сухое лета. Трывожліва-спакойныя дні. Лясы гараць. Сена косяць.

Экспазіцыі (дзве) — аб'ектыўна. Усё астатняе — ад «я».

1. Дзядзька Рыгор

2. Цётка Каця (прытварэнніца, ласуха, любіць хадзіць у магазін, любіць падоўгу гасцяваць у горадзе, сабірае лекі)

3. Пасёстры (Ніна з Сашкам?)

4. Тома (Трохі ад Веткі?)

5. Арсей (Гарэлік). Вясковы філосаф і летапісец. Да яго прыязджае Павел.

6. Нябожчыца маці і бацька

Гэта — асноўныя.

Няхай будзе любоўны трохкутнік — не страшна. Без пэўнай рэалізацыі яго. Стылізацыя, так сказаць.

Не забыць: лазня, сенакос, наведванне магілы маці, старая хата. Старыя ў вёсцы (як паміраюць).

Дзе-небудзь увесці Пятра Іванавіча (можа, разам з Арсеем).

Чалавек, калі перажывае страту, нязладжанасць у сабе, знаходзіць гэта лягчэй за ўсё і перш за ўсё гэта і ў другіх. Тут як бы напружанасць пачуцця, агаварыць гэта.

Параспытаць у мамы яшчэ пра партызан (Калечык), пра Куцалапа, пра Здрася.

Пра ўмовы касьбы на Клінаўскім лузе.

Паўлу шукаць больш пэўны прататып, падрабязнасці яго жыцця.[1]

Першы план аповесці не датаваны. Прыблізную дату яго напісання падказваюць папярэднія, дзённікавыя, запісы ў нататніку, звязаныя з падарожжам М. Стральцова на Магілёўшчыну, у свае родныя мясціны:

26.VIII.72

І тут сухмень. Як ехалі ад Слаўг[арада], у лесе [неразб.] пташкі — недзе гарэў лес. Пахла дымам. Вечарэла і было ціха і прасторна ў лесе, які паціхэў і парадзеў з той пары, як ведаў яго малым.

Гэта сапраўды так ці своеасабл[івая] аберацыя ўспрыняцця? З часам усё здаецца, што некалі было не так: і людзі лепшыя, і травы, і лес гусцейшы.[2]

Абодва фрагменты напісаныя адным стрыжнем і аднолькавым почыркам. І ў накідзе твора, і дзённікавым запісе ёсць згадка сухіх летніх дзён і лясных пажараў. Спасылка на «аберацыю» пазней сустрэнецца ў 2-м і апошнім з выяўленых накідаў аповесці «Конь гуляў на волі». Такім чынам, першы накід плану можна датаваць жніўнем-вераснем 1972 г.[3]. Той час для Стральцова — прагал паміж публікацыяй аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970) і «Смаленнем вепрука» (1973). Дзякуючы гэтаму відавочна, што аповесць «Конь гуляў на волі» першапачаткова не задумвалася М. Стральцовым як развітальная.

Другі, больш разгорнуты план твора, пазначаны аўтарам дакладнай датай:

11.VI.75

Да аповесці
Чацвёра прыезджых:
1. «Я»
2. Жэнька (Жэнька і Каласіярка — нешта ад іх дваіх)
3. Эдзік (Арнольд?)
Зрабіць аднакашн[ікам] (Іза і г. д.) — («Ну-ну?»)
4. Танька (гісторыя з Толікавай жонкай)
Астатнія:
1. Цётка (маці) і дзядзька (бацька, ён тут — школьны рахункавод).

2. Гарэлік (ён сусед)
3. Люба
4. Муж яе
5. Моладзь
6. Шавёнка і г. д.

План (прыбл[ізны])
I. Два прыезды (асобн[а])
II. На ганку
(Цётка, двор, агарод, халабуда на вышках у пуні, чытанне (старая кніжка Купалы, прыход дзядзькі і Гарэліка, размовы [неразб.] у варотах і г. д.)
III. Бацька (вечар на сынка)
IV. Жэнька (рыбалка, стары брадняк)
V. Люба (ферма і г. д.)
VI. [Касавіца, Арнольд] Гарадскі раздзел (аборт)
VII. Касавіца
VIII. Другая вячэра з выпіўкай (Арнольд, «я», Люба)
IX. Нейкая інтэрлюдыя (якая?) — Танька?
X. Грэх.
XI. Вечарынка і бойка
XII. Лес.
XIII. Выгнанне блудн[ага сына?]
XIV. Яшчэ інтэрл[юдыя]
XV. Ад'езд.
Гэта — прыбл[ізна]. Падумаць.[4]

План твора не мае загалоўка, але з пэўных прычын яго таксама можна аднесці да няспраўджанага «Каня...» Да гэтага падштурхоўвае тое, што пачатак гучыць як «*I. Два прыезды (асобн[а])*». У другім варыянце ўступу да аповесці захавалася згадка пра «два прыезды» (гл. ніжэй). Хоць імёны персанажаў зменены ў параўнанні з 1-м планам, але гэта не павінна схіляць да таго, што тут вядзецца гаворка пра іншы твор.

Што да тэксту самой аповесці, то ён фактычна адсутнічае (прынамсі, у архіве). Захавалася толькі два подступы да яе, два накіды першай старонкі: машынапіс і рукапіс. Нягледзячы

на тое, што яны амаль ідэнтычныя па змесце, вялікая розніца палягае ў інтанацыі. Відаць, паміж напісаннем гэтых двух варыянтаў быў вялікі адрэзак часу, калі адбыліся змены і ў самім падыходзе аўтара да разумення, якім павінен быць твор. Параўнаем. Вось як гучыць 1-шы, машынапісны варыянт аповесці «Конь гуляў на волі»:

І такі прастор, які краявід! Унізе, пад абрывам, рака — несамавіта-плоская, падупалая перад безнадзейнай роўняддзю таго, другога, лугавога берагу; і сцежкі, і тарнейшыя пуцявіны дзенідзе пярэсціліся на той роўнядзі, і круглыя купы лазы серабрыста ільсніліся і гэтаксама былі значны, як і перад крыва абрынутым з далягляду лесам далёкія свечкі стагоў, як і адзінокі, пярэсты бакен на павароце ракі — гэта справа, як і прыцененая смугой палоска насыпу — гэта ўжо там, злева, дзе ў апошнім высілку туга віляла рака перад мостам...

І хмара ішла, хуткацечная хмара, з лёгкім, прасветленым сонцам мысам, нібыта крыга, загнутым. Гэткім параходзікам ішла хмара — цень перад ёю лёгка бег па зямлі, рызыкоўна і нястрашна, — і меўся дождж неўзабаве праліцца на поплаў і на ваду, на лугавыя дарогі і сцежкі, на [пярэсты статак] нячасты табун — добра, браце, што ён ашчадзіў яго на астачу. Так люба ж было позірку спыняцца на гэтым раскіданым па лузе статку, дзе кожная [каравяка] і хацела быць разам з усімі сваімі і была тым часам сама па сабе (што зробіш — вольніца!), але ж, бач, не цяміла, што тыя дзве дзяўчынкі [(павадыры статку)] таксама былі самі па сабе — ці не віною таму быў хлапчына ў картовіку і ледзь не ў міліцэйскай злінялай, але ж усё адно самавітай фуражцы, — бач, збочыўся наводдаль на купіне, чуе, як гарыць ад спякоты нос пад няпэўным ценем казыркастай фуражкі, стругае складанчыкам дубчык, ну, думае, вазьму я сёння сваё на вечарынцы ў клубе!

Ну і што з таго, што таго хлапчыны і тых дзяўчатак табе не надта добра відаць! Так быць можа і, можа, так быць павінна!

І хмара ідзе, пратараніла, аблажыла сонца — і гэта зноў жа не страшна — вось і будзе дождж (няхай будзе дождж!)

Дык што, паглядзім, што ж тут з намі побач...

Ну, гарадок за табою, ну, на абрыве стаіш, пад табою рэчка, — але далягляды, далягляды якія! Ну, яшчэ паглядзі! Ну, і коні гуляюць на волі... Так.[5]

Пра тое, што гэта сапраўды першы варыянт з двух наяўных сведчыць не дата (якой няма), але некаторыя заўвагі і аўтарскія праўкі, а таксама нататкі на адвароце аркуша[6], ўведзеныя ў рукапіс; апошні па гэтай прычыне можна лічыць пазнейшым. Інтанацыйна ён вытрыманы ў светлым, аптымістычным ключы, які для позняга Стральцова быў неўласцівы. Бадай, яго нават можна аднесці да самага пачатку творчай працы пісьменніка ў прозе (1950-я гг.), тут шмат што сугучна[7].

Другі варыянт мае загаловак і захаваўся ў выглядзе двух рукапісных аркушаў з аўтарскімі праўкамі

Конь гуляў на волі

Было два прыезды, было два ад'езды... Фраза цягне за сабою фразу, і сугучча, як заўсёды, мусіць, дрэнна. Не трэба так. Што два прыезды былі, я, аўтар, добра і нават дакладна ведаю; сказаць пра ад'езды пакуль не бяруся. Пагледзімо, бадай, разам і разам параімся. Няхай будзе першы прыезд.

I

...і такі прастор, такі краявід! Унізе, пад абрывам, — рака, несамавіта-пляскатая, падупалая пад куды шырэйшай роўняддзю таго, другога, лугавога берагу. I сцежкі, і тарнейшыя пуцявіны дзе-нідзе пярэсціліся на той роўнядзі, і круглыя купы лазы гэтаксама ільсніліся і гэтаксама былі значны, як і далёкія свечкі стагоў перад крыва абрынутым з далягляду лесам, як і адзінокі бакен на павароце ракі — гэта справа — як і прыцененая смугой палоска насыпу, гэта ўжо там, злева, дзе ў апошнім высілку туга віляла рака перад мостам...

I хмара ішла, хуткацечная хмара, з лёгкім, прасветленым сонцам мысам, нібыта крыга, загнутым. Гэткім параходзікам ішла хмара — цень перад ёю лёгка бег па зямлі, рызыкоўна так і не баючыся, — і меўся дождж неўзабаве праліцца на поплаў і на ваду, на лугавыя дарогі і сцежкі, на кашару з няпэўнай яе і непатрэбнай

тут агароджай. Бо і статак разумеў гэта і пасвіўся недзе там, куды яшчэ не дапяўся цень ад хмары, і нейкія жанчыны — прыслужніцы статку — відны былі за кашарай, — добра, браце, што ты ўсё гэта бачыш, там, злева, але паглядзі ж і направа...

А хмара ішла, і тое, што было пад хмарай і пад ценем ад яе, не супраціўлялася ім і не выказвала сабой аніяк а ні радасці, а ні здзіўлення. Дзіўна гэта было яму, і ён глядзеў ужо туды, дзе раней прастору, гэту, што справа, дзе як бы раней каранаваў, а цяпер нячутна высвятляў сабою бакен.

Але ж і галоўнае, што раптоўна адкрылася, галоўнае цяпер было перад ім... Нейкай дазволенай нядаўна сонечным днём вечаровасцю набрыняла цяпер хмара: тут была элементарная электрычная з'ява (ведаў жа, у які жыве век!), але як усё пераіначылася ў гэтых, залежных ад хмары, межах прасторы!?

І ён тады ўбачыў каня.

Галоўнае адкрылася тады яму, тое галоўнае, чаму ён не знайшоў [назвіска] і абсягу ў зацененых зрэнках вачэй, і ў душы, прытомленай... аберацыяй...

Ён тады ўбачыў коней...[8]

Падвядзем вынікі. Становіцца зразумелым, што задума напісання аповесці «Конь гуляў на волі» ў Міхася Стральцова сапраўды была. Першыя весткі аб ёй, першы накід плану можна датаваць 1972 годам, калі пісьменнік яшчэ не збіраўся назаўжды пакідаць мастацкую прозу (пра гэта ён гаворыць і ў вершы «Ода прозе» са зборніка «Ядлоўцавы куст» (1973): «...Яшчэ мне з ёю па дарозе...»). Пачатковая задума разраслася ў план маштабнай аповесці са складанай кампазіцыяй і шматлікімі дзеючымі асобамі, заснаванай на побытавым матэрыяле (у жанры т. зв. «вясковай прозы»). Бліжэйшы па часе прыклад — аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970). Магчыма, «Конь гуляў на волі» напачатку быў пакліканы стаць больш разгорнутым, эпічным творам. Але з цягам часу пісьменнік, пераходзячы на эсэістычную дарогу, відавочна, сумняецца ў мэтазгоднасці падобнай шматслоўнасці і побытавасці. Другі, рукапісны варыянт аповесці можна лічыць подступам да лірычна-філасофскага твора, які сапраўды мог апынуцца выніковым, падагульняль-

ным. Ці ўдалося яго дапісаць Міхасю Стральцову — пытанне застаецца адкрытым.

[1] БДАМЛМ, ф. 361, воп. 1, спр. 34, л. 15–16-адв.

[2] БДАМЛМ, ф. 361, воп. 1, спр. 34, л. 7.

[3] Гэтая датыроўка ўдакладняе час пачатку працы над аповесцю. Гл., напрыклад, ва ўспамінах Р. Барадуліна: «Калі Міхась вярнуўся з Палесся [маецца на ўвазе зняволенне ў мазырскім ЛПП на пачатку 1980-х гг. — *Ц. Ч.*], задумаў напісаць новую рэч. У часопісах анансавалася: «Конь гуляў на волі». Радок з вясёлай бяседнай песні. Бо Міхась Стральцоў любіў волю, не цярпеў ні хамута, ні цугляў, якімі яго хацеў ацішыць рэжым. У працу ўваходзіў цяжка». Ці ў Б. Сачанкі: ««Конь гуляў на волі...» — так павінен быў называцца твор, над якім думаў, працаваў апошнія дні свае Міхась Стральцоў. Пра што ён, той твор? Ні разу пра гэта мы не гаварылі».

[4] БДАМЛМ, ф. 361, воп. 1, спр. 34, л. 39–41.

[5] БДАМЛМ, ф. 361, воп. 1, спр. 2, л. 7–8. Машынапіс з аўтарскімі праўкамі. Без загалоўка.

[6] Бо і статак разумеў гэта і пасвіўся недзе там, куды яшчэ не дапяўся цень ад хмары, і нейкія жанчыны — прыслужніцы яго, відны былі за кашарай, — добра, браце, што так гэта ты аглядаў. І не выказвала сабой аніяк а ні радасці, а ні засмучэння, не прасіла ні ў наваколля, ні ў неба. Бо ён глядзеў ужо туды, дзе раней прастору, тую, што справа, як бы каранаваў, прыцягваў да сябе бакен. Нейкай дазволенай нядаўна сонечным днём вечаровасцю набрыняла цяпер хмара (БДАМЛМ, ф. 361, воп. 1, спр. 2, л. 7-адв.).

[7] Параўнайц, напрыклад, з інтанацыяй накіду апавядання 1950-х гадоў «Брыгадзір і гусі» — з таго ж архіўнага фонду: «З вышыні птушынага палёту вёску бачаць каршукі і ластаўкі, галубы і буслы, вераб'і і яшчэ розная там не вартая ўспамінку драбяза.

Ці не ўсё роўна, як завецца гэтая вёска, — няхай нават Целяшы.

Чатыры разы на дзень, летучы з раённага цэнтра ў абласны горад, над вёскай стракоча, валюхаецца з крыла на крыло (знізу гэта добра відаць) аднаматорны рэйсавы самалёцік; да яго прывыклі ўжо і, зда-

раецца, зацікаўлена праводзяць позіркам толькі тады, калі ведаюць, што якога-небудзь Самусіхі Пятра ці Хведаркава Івана, ці якую-небудзь цётку Ганну пільная [патрэба] сарвала з дому на дзень на два [да сваякоў ці ў бальніцу] і не ў блізкі свет, а ў той жа самы абласны горад. Тады хто-небудзь возьме ды і памахае з зямлі самалёту рукой. Не можа быць, каб там не ўбачылі, абавязкова ўбачаць! Казаў жа Прыкуткін Паўлюк, а, можа, смяяўся, халера на яго, што бачыў з самалёта, як Васіль Жаласны хадзіў за пуню на двор: па кастылю, нібыта, таго пазнаў, — убіў той кастыль у зямлю перад сабой, як апазнавальны знак.

Мала веры, канечне, гэтаму Паўлюку. Смяюн і пракуда, халера б на яго! Выдумаў, можа, ці чуў *[неразб.],* як зімою Васілёвага сабаку воўк схапіў, як гаспадар галасіў у хаце, баючыся паткнуцца на двор, нібы тая баба лемантаваў: «А цюцечка мой даражэ-энькі, як жа я табе памагу-у-у! А воўк жа ты, воўк, — ваўкарэзіна ты, а не во-о-ўк!»

Гэта проста так, да слова прыйшлося: не патрэбен нам Васіль.

Летась увосень, калі гарэлі лясы, садзіўся ў вёсцы ля самай школы ў полі верталёт. Верталётчык, ці як яго там, абедаў у настаўніцы Клары Пятроўны. Настаўніца Клара Пятроўна праводзіла потым таго верталётчыка пад саменькі верталёт, а як верталёт у неба падняўся, махала рукой. Дзела, канешне, маладое, чаму не памахаць!» (БДАМЛМ, ф. 361, воп. 1, спр. 2, л. 3).

[8] БДАМЛМ, ф. 361, воп. 1, спр. 2, л. 4–6. Рукапіс.

Заўвагі аўтара

Коратка пра Міхася Стральцова

14.2.1937 г. — нарадзіўся ў вёсцы Сычын, што на Магілёўшчыне. Бацька — Лявон Клімавіч Стральцоў — дырэктар мясцовай школы, маці — Марыя Міхайлаўна — хатняя гаспадыня.

1954 г. — скончыў Нова-Ельненскую сярэднюю школу і паступіў у БДУ на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта.

1957 г. — у «Маладосці» (№ 1) надрукавана першае апавяданне «Дома».

1959 г. — скончыў вучобу ў БДУ і да 1987 года працаваў у рэдакцыях беларускіх газет і часопісаў.

1962 г. — прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР; выдаў першы зборнік прозы «Блакітны вецер». У гэтую кнігу, аформленую Барысам Заборавым, увайшло сем апавяданняў — «Дома», «Мацеевы дровы», «Восеньскі ўспамін», «Блакітны вецер», «Двое ў лесе», «Суседзі», «Перад дарогай». У артыкуле «Ці існуе блакітны вецер?» Анатоль Вярцінскі адзначаў, што Міхась Стральцоў «...шукае свой стыль на шляху вобразна-асацыятыўнага мыслення».

1965 г. — выйшла ў свет кніга літаратурна-крытычных артыкулаў «Жыццё ў слове», у якой выявіліся першыя подступы да стварэння аповесці «Загадка Багдановіча»: «Алгебра і гармонія... у Багдановіча настолькі з'яднаны, настолькі зрабіліся ягонай паэтычнай сутнасцю, што здаецца натуральным дапусціць, нібы не алгебрай павяралася гармонія, а гармонія павярала алгебру. Здаецца, каб можна было перакласці на мову алгебры гармонію, дык вершы Багдановіча разгарнуліся б у лагічную паслядоўнасць матэматычнай формулы. Здаецца, з кожнага верша Багдановіча можна вывесці закон «залатога сячэння» паэзіі».

1966 г. — выдаў другую кнігу прозы «Сена на асфальце», змест якой склалі наступныя творы — «Трыпціх», «На вакзале чакае аўтобус», «Там, дзе заціпак, спакой», «Сена на асфальце», «Добрае неба», «На чацвёртым годзе вайны», «Што будзе сніцца», «Роздум», «І зноў, зноў горад», «Свет Іванавіч, былы донжуан», «Дзень у шэсцьдзясят сутак». З гэтай кнігай у нашу літаратуру вярнулася (пасля ўзвышанскай прозы) прыгажосць стылёвага індывідуалізму: «Вось жыву я цяпер у адным добрым месцы на адзіноце з лесам, восеньскай цішынёй, з незразумелым пакуль мне самому набыткам свае душы. Днём лес свіціцца, засланы скурчаным сухім лісцем, халадок цверазіць

скроні, і такое адчуванне ў мяне, што калі разгадаю я цяперашнюю патаемнасць лесу, адзінокага на галінцы лістка, калі спасцігну простым словам пругкую выразнасць чорнага крушынавага ствала, калі спалучу я ў адным адчуванні скупы водар халоднай зямлі, журблівае святло неба і далёкі рокат трактара, і сарочы порсткі чэкат і — скрозь восень гляну я сабе ў душу, нібы ў крыніцу, адвяду рукой апалыя ў ваду пажоўклыя лісты...»

1968 г. — выдаў аповесць «Загадка Багдановіча», якая выклікала захапленне ў Алеся Адамовіча: «Якая культура думкі, пачуцця... І якое разуменне, што ў паэта не біяграфія, а — лёс. І тужлівае жаданне сабе іменна гэтага».

1970 г. — асобным выданнем выходзіць у свет аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь».

1973 г. — выходзіць першая кніга вершаў «Ядлоўцавы куст»; у 9-м нумары «Маладосці» надрукавана апавяданне «Асеннім днём» (канчатковая назва «Смаленне вепрука»). Маскоўскі крытык Вячаслаў Івашчанка адзначаў: «Традыцыйная «вясковая» і наватарская «інтэлектуальныя» плыні ў прозе Стральцова — не дзве асобныя мелодыі аднаго аўтара, а дзве тэмы, якія перакрыжоўваюцца, перагукваюцца і ўзбагачаюць адна адну... У аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь», у апавяданні «Смаленне вепрука» адчуваецца відавочнае імкненне Стральцова да сінтэзу, імкненне спалучыць у прасторы аднаго твора і мінулае і сучаснае...» Алесь Адамовіч разглядаў «Смаленне вепрука» ў кантэксце пошукаў і знаходак Кузьмы Чорнага: «Здаралася, што малады Чорны свядома «супернічаў» з класікамі... пісаў апавяданне «Буланы», вядома ж, маючы на ўвазе «Халстамер». Тым самым правяраў самога сябе, беларускую мову, беларускую прозу... Міхась Стральцоў «супернічае» ўжо з Чорным — вучачыся такому ж смеламу суперніцтву ў таго ж Чорнага, — але пачуццё сучаснай прозы, мабыць, ужо не тое: бо ёсць ужо ўсё, «што і ў людзей»...»

1974 г. — выходзіць у свет кніга выбранай прозы «На ўспамін аб радасці». Праз дзесяць гадоў, перачытваючы гэтую кнігу,

Аляксандр Станюта сказаў пра яе аўтара: «Як сапраўдны нацыянальны талент, ён нікога не паўтарыў, не даўшы тым самым нікому паўтарыць сябе».

1976 г. — выходзіць зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў і эсэ «У полі зроку». Каштоўнасць зборніка ў прызнанні, якое відавочна супярэчыла тагачасным афіцыйным стандартам адносна «правоў» мастака: «Трэба верыць у сваё права быць мастаком, і тады чытачы будуць пазбаўлены таго не вельмі прыемнага і не вельмі маральнага відовішча, калі пісьменнік, паэт ці празаік — усё адно баючыся, што чытачы-суайчыннікі не паверацъ у добрыя намеры апошняга, праз радок клянецца ў сваёй вернасці гэтым суайчыннікам-чытачам, кідаючы, тым часам адным вокам і на рэдактара».

1979 г. — выходзіць у свет другі зборнік вершаў «Цень ад вясла».

1981–1982 гг. — прымусовае знаходжанне ў мазырскім «лячэбна-працоўным прафілакторыі». У лісце ад 7.01.82 (ліст адрасаваны Л. Дранько-Майсюку) паэт так характарызаваў сваё мазырскае існаванне: «Тут, на адзіноце сярод людзей, асабліва пачынаеш цаніць усялякі нязмушаны, шчыры знак спагады ці ўвагі — у малых радасцях вялікі сэнс... Я нават думаю: вось месца, дзе найпрасцей падацца ў экзістэнцыю, як філасофію пражытага і перажытага імгнення ў яго самацэннасці. У неизбывной, кажучы па-руску, каштоўнасці. Нешта ў гэтым сэнсе, хоць экзістэнцыялізм, вядома, не толькі ў гэтым... Жыццё маё цячэ патрохі ў не мной прызначаным рэчышчы, для працы сваёй часу амаль няма — што зробіш? — ды і думка валюхаецца, як мокрае гарыць. Праўда, напачатку, як быў у каранціне, можа, болей імпульсіўна, са злосці, чым па натхненні, пісаў вершы (пісалася), цяпер — не... Як будзе далей — пабачым. Тое-сёе мроіцца ў галаве: з прозы — не прозы, з крытыкі — не з крытыкі — *эсэі* нейкія. Як жартуе Вера Сям[ёнаўна] Палтаран...»

1983 г. — у серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» выйшаў зборнік «Яшчэ і заўтра».

1986 г. — выходзяць з друку апошнія прыжыццёвыя кнігі «Пячатка майстра» (літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ) і «Мой свеце ясны» (вершы).

1987 г., вясна — цяжкое захворванне. Вычытаў падпісную карэктуру «Выбранага» (проза, паэзія, эсэ).

5 траўня — выходзіць у свет пераклад рамана Ч. Айтматава «Буранны паўстанак» («І вякуе дзень даўжэй за ноч»). Мяркую: праца над перакладам адыграла для М. Стральцова тую ж негатыўную ролю, якую ў свой час падобная праца адыграла ў творчым лёсе Ю. Казакова, творы якога, дарэчы, М. Стральцоў вельмі любіў. Перакладаючы трылогію казахскага пісьменніка А. Нурпеісава «Кроў і пот», Ю. Казакоў не ўзбагачаў свой лірычны талент, а незваротна яго выдаткоўваў, «губляў» у глыбіні чужога эпасу. Падобнае адбылося і з Міхасём Стральцовым на прыкладзе айтматаўскай прозы.

23 жніўня — смерць. Пахаваны на Чыжоўскіх могілках у Менску.

Леанід Дранько-Майсюк

«У ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАГАДКІ»
Архіўныя тэксты Міхася Стральцова

Аўтабіяграфія

Нарадзіўся я ў 1937 годзе ў вёсцы Сычын Слаўгарадскага раёна, на Магілёўшчыне. Вучыўся ў мясцовых школах, пераходзячы з адной у другую, бо нават сямігодкі ў роднай вёсцы тады яшчэ не было.

У 1954 годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ул. І. Леніна на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта.

Першае апавяданне маё з'явілася ў 1957 г. у часопісе «Маладосць». З той пары пачаў выступаць у друку з апавяданнямі, крытычнымі артыкуламі, рэцэнзіямі.

У 1959 г., пасля заканчэння ўніверсітэта, стаў працаваць у газеце «Літаратура і мастацтва». Цяпер працую ў часопісе «Полымя».

У гэтым годзе ў Белдзяржвыдавецтве выйшаў зборнік маіх апавяданняў «Блакітны вецер».

1962

Пра Еўдакію Лось

У маёй памяці Еўдакія Лось неадлучная ад успамінаў пра пачатак пяцідзясятых гадоў. Неблагі тады быў час. Нешта такое асаблівае, падобнае на казытлівую прысутнасць надзеі, нейкіх спадзяванняў на перамены, лунала ў паветры, востра казытала пачуццё і думку.

Увачавідкі большала моладзі ў нашым пісьменніцкім Саюзе. Будаваўся дом на вуліцы Чарнышэўскага, дзе неўзабаве пасяліліся разам з выдавецкімі работнікамі і нашы літаратары.

Першым пасля наваселля летам шчыра цвілі на клумбах кветкі, на двары буяла кустоўе.

Зранку і падвечар Караткевіч выходзіў на балкон да сваіх галубоў.

На лаўцы ля пад'езда, сцішаны і ўсмешлівы, сядзеў Язэп Пушча.

Чарнявы, як грак, Антон Алешка, паціскаючы плячыма, ківаючыся, загаворваў да яго.

Выдавец і бухгалтар Пеўзнер паліваў клумбу.

Змрачнаваты Уладзіслаў Нядзведскі аднекуль у адзінкавай колькасці, самапасам, вяртаецца дамоў, іранічна-сур'ёзна выглядаючы нешта «канкрэтна на мясцовасці».

Еўдакія Лось з кветкамі ў руках вяртаецца з нейкага выступлення — святочная, зіхоткая, шамоткая (тады была мода на нейкія блішчастыя сукенкі). Бачу яе выразна, нібы было гэта ўчора, а ў памяці паўстаюць радкі з яе верша, які яна любіла сама і часта на сваіх выступленнях перад чытачамі згадвала на памяць. Там — пра малодшую сястру, пра яе бясхмарнае юнацтва, пра недададзенае самой паэтэсе і яе пакаленню ў пасляваеннай маладосці.

На танцы пайшла, харошая,
З журбою пайшла маёй.

А ёй, паэтэсе, і сапраўды, можа, было недададзена пры жыцці — і дабротаў жыццёвых, і літаратурнага і іншага прызнання. І, можа, таму з вялікай ахвотай ішла яна сама да свайго чытача, ездзіла, выступала, перапісвалася. Насуперак абыякавасці крытыкі, самога літаратурнага асяроддзя. Не будзем вінаваціць яе за гэта, як і за тое, што, ведаючы сабе цану, яна лішні раз і нагадвала пра тое нам. А нам замест таго, каб раздражняцца, варта было б зразумець яе, стаць да яе бліжэй, падтрымаць. А мы думалі, што яна сама сябе абароніць, што ёй гэта нічога не варта. Што гэта не так, мы зразумелі, калі яна захварэла.

Зразумелі яе мужнасць, яе дабрыню, шырыню яе пагляду на жыццё, зразумелі, што яна, можа, найбольш чым хто іншы з яе паэтычнага пакалення, была ўражана і памяццю вайны, і памяццю гаротных пасляваенных год, здолеўшы сказаць пра свой першапачатковы жыццёвы вопыт непаўторна і балюча. Але мала гэтага. Тую меру разумення жыцця і чалавечага трывання яна перанесла і ў дзень сённяшні, зрабіўшы яго і паэтычным, і чалавечым працягам роздуму пра час, — не застаўшыся думкай і вопытам толькі там, на пачатку сваёй дарослай свядомасці.

Літаратар ведае, якой цаны можа каштаваць такая перамога над сабой. А Еўдакія Лось заплаціла гэтую цану, будучы чалавекам грамадскім і грамадзянскім у сапраўдным значэнні гэтага слова. Адсюль і яе паэтычная раскрытасць, і адкрытасць усяму новаму ў жыцці, пачуццё адказнасці, адчуванне думкі народнай.

Як усяго гэтага не хапае нам сённяшнім, нягледзячы на тое, што вось зноў нешта зрушылася ў добры бок у грамадстве, што вось зноў час патрабуе і асабістага, непазычанага пафасу, і рызыкі, і болю. Я ўпэўнены, што Лось, не чакаючы дазволу, напісала б і пра Чарнобыль, і пра сасмаглае сёлетняе лета трывогі нашай.

На травінцы пад вясёлкай
Крошка-кропелька дрыжыць.
І спявае перапёлка
Ў Бараўлянах:
Жыць ды жыць!

Вусцішна трохі чытаць гэта наогул, а сённяшняй парой асабліва. Ёсць змрочныя сімвалы ў нашым жыцці, але ж ёсць і надзея, і адказнасць, і памяць — пра тых, хто быў да нас, пра тых, з кім разам ішлі, але хто дачасна падбіўся ў дарозе, завяшчаючы нам, аднак, ісці далей і далей. Еўдакія Лось аднойчы напісала:

Уся мая прафесія
Ў адным-адзіным сэрцы...
Але яно, на жаль,
Безабароннае.

На жаль... Але сэрца наша, на шчасце, безабароннае і перад праўдзівым і шчырым радком паэзіі, у тым ліку і паэзіі Еўдакіі Лось. Яе слова непрымусова і вольна пасяляецца ў ім, нашым сэрцы, прарастае нашай удзячнасцю і нашай любоўю да ўсяго вартага ў нашым жыцці.

Дзённікавы запіс

23 чэрвеня 1987 г.

Глухата вырастае наўкол усё больш.

Заўтра трэба было б класціся на абследаванне ў анкалогію.

Ішлі перамовы праз Гардзіцкага. Ладуценка сёння не званіў.

З работы не чутно ні гуку. Рашылі з Аляксеем перанесці маё лячэнне на 25 (раніцу).

Нечакана правакацыйны званок. Нахабны, добра пастаўлены голас:

— Як здароўе? Дзе жонка?

Падазрэнне закралася адразу. Здароўе нічога, жонка дома, ляжаў у бальніцы.

— Ну як, за гэты час многа напісаў?

Падазрэнне расло.

— Хто гэта? Барыс?

Мне падалося, хоць і не верылася, што Б. Фірштэйн. Падобны трохі голас, але, прыслухаўшыся, — не. І што другі Барыс, з якім быў у Мазыры. Але не. А той пацвердзіў, што Барыс.

Тут ужо я ўзарваўся... Той пачаў пагражаць:

— Забыўся пра Мазыр?

Пры чым тут Мазыр? З Мазыра са мной ніхто б не стаў так гаварыць. Не даваў я для гэтага падстаў. І падобнай спробы нічыёй да гэтага не было і знаку.

А той: — Ты так? А ты разумееш, што я ведаю дарогу, па якой ты ходзіш дамоў?

Нахабства нечуванае. Я вылаяўся і кінуў трубку.

Цяпер думаю: хто? чаму? адкуль?

Яўна, што падлюга, што ведае пра хваробу і хоча, каб я не меў спакою.

Але хто за ім?

Нахабнік, але не дурань, добра пастаўлены голас — «інтэлігент», са стукачоў не іначай (сексот): хто?

Дарчыя надпісы на кнігах

На кнізе «Блакітны вецер»: «Рыгору Барадуліну, каб ведаў, што на свеце ёсць блакітны вецер, — М. Стральцоў. 5.06.62».

На кнізе «Блакітны вецер»: «Анатолю Сцяпанавічу [Вялюгіну] са шчырай павагай і ўдзячнасцю — М. Стральцоў. 5.06.62».

На кнізе «Блакітны вецер»: «Дарагому Генку [Бураўкіну] ад колішняга «лімаўскага старога» М. Стральцова. Памаліся, каб твой пакорны слуга меў магчымасць падпісаць табе не такую мізэрную, худасочную, як гэта, кніжку. 6.05.64 г.»

На кнізе «Жыццё ў слове»: «Дарагому Феліксу [Мюндару], якога нязменна, непарушна люблю і паважаю. М. Стральцоў. 1.12.65».

На кнізе «Жыццё ў слове»: «Дарагому Барысу [Сачанку] шчыра — на ½ празаік, на ½ крытык — М. Стральцоў. 7.12.65».

На кнізе «Жыццё ў слове»: «Дарагому майму Рыгору [Барадуліну]. — Прачытай, стары, і рашы, колькі не хапае да інтэлігента напаўінтэлігенту з чацвярцінкай. Гэта афарызм пра мяне прыдумаў не. Але якая розніца! 11.12.65. М. Стральцоў».

На кнізе «Сена на асфальце»: «Дарагому Генадзю [Бураўкіну] з прыемнасцю ахвяруе ў бібліятэчны сяннік клок сена з асфальта — М. Стральцоў. 26.07.66».

На кнізе «Сена на асфальце»: «Дарагому Феліксу [Мюндару] з пажаданнем, каб быў заўсёды настроены на добры лад нашай старой дружбы. М. Стральцоў. 1.11.66».

На кнізе «Жыццё ў слове»: «Мікалаю Сымонавічу Гілю (Гілевічу) — крытыку, празаіку, публіцысту, гаспадару ўласнай кватэры, але, на жаль, халасцяку, — з добрымі пачуццямі. 2.02.67. М. Стральцоў».

На кнізе «Сена на асфальце» [Ніне Рабоце]: «Хай жыве талент! Г. Бураўкін. Ул. Паўлаў. Хай жывуць беларускія партызаны! А. Вярцінскі. Я за партызан Бягомля. Ю. Свірка. Уласнаручны подпіс Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, Ул. Паўлава, Ю. Свіркі сведчу — М. Стральцоў».

На кнізе «Что будет сниться»: «Дарагому Феліксу [Мюндару], як заўсёды — на брудэршафт. М. Стральцоў. 24.04.68».

На часопісе «Sowjetliteratur»*: «Дарагому Феліксу [Мюндару], з якім так-сяк гаварылі па-нямецку, няблага па-беларуску, зусім добра па-сяброўску. М. Стральцоў. 2.07.69».

На кнізе «Загадка Багдановіча»: «Дарагому Міколу [Гілю], думаючы пра тое, што ў жыцці і ў творчасці павінны быць загадкі. Каб іх не было, іх трэба было б выдумаць. Дружба — загадка і таямніца. Яна і жывіцца загадкай. Трэба сябраваць. 12.06.70. М. Стральцоў».

На кнізе «Ядлоўцавы куст»: «Алесю Адамовічу з любоўю і дружбай. М. Стральцоў. 16.10.73».

На кнізе «У полі зроку»: «Тамары Міхайлавай на згон маркотаў, турботаў — на прыход вясны. М. Стральцоў. 10.04.76».

На кнізе «У полі зроку»: «Нікіцінай Ніне і Шкляравай Ніне сказаць я павінен, што ў тым я не вінен, калі прад паненкай упаў на каленкі. 19.11.77. М. Стральцоў».

На кнізе «Журавлиное небо» [Тамары Міхайлавай]: «Тома! Тибе дарью подарок эта, в глаза сматрью тибе с привета. Висёлой будь!!! Ни позабудь!!! 13 сент. 1978. М. Стрельцов».

---

* У нямецкім часопісе «Sowjetliteratur» (1969, № 2) была надрукавана аповесць М. Стральцова «Адзін лапаць, адзін чунь».

На кнізе «На ўспамін аб радасці»: «Ніне Шкляравай ад аўтара, якога даўно ўжо неўзлюбіла проза, ашукала паэзія, але якому ўсё ж дала прытулак крытыка. 3.11.78. М. Стральцоў».

На кнізе «На ўспамін аб радасці»: «Леаніду Дранько. — «...И я судьбу благословил, Когда мой двор уединённый, Печальным снегом занесённый, Твой колокольчик огласил». — На ўсё добрае, з удзячнасцю — М. Стральцоў. 28.01.82».

На кнізе «Ядлоўцавы куст»: «Леаніду Дранько-Майсюку з любоўю да ягонага таленту і з павагай да ягонай чалавечай удумнасці — шчыра М. Стральцоў. 3.09.83».

На кнізе «Журавлиное небо» [Леаніду Дранько-Майсюку]: «Браце Леанід! Мне здаецца, што ўсе ўжо забыліся пра маю прозу, і мне ж самому згадваць пра яе балюча — ці надару цябе чым новым? Маліся за мяне — твой М. Стральцоў. 3.09.83».

На кнізе «Жыццё ў слове»: «Леаніду Дранько-Майсюку. Ты нагадаў мне гэтай кніжачкай нешта маё маладое — ці то ўпірлівасць, ці то настырнасць маладую, і мне па-старэчы прыемна. Дзякуй за ўвагу. — М. Стральцоў. 20.09.83».

На кнізе «Яшчэ і заўтра»: «Дарагім Варанецкім з надзеяй здабыць куточак у іхнім сэрцы — М. Стральцоў. 10.11.83».

На кнізе «Яшчэ і заўтра»: «Уладзіміру Ягоўдзіку са шчырай прыхільнасцю, літаратурнай і чалавечай, на ўсё добрае — М. Стральцоў. 24.11.83».

На кнізе «На ўспамін аб радасці»: «Уладзіміру Ягоўдзіку, празаіку, крытыку, эсэісту, чалавеку, з якім заўсёды прыемна сустракацца і гаварыць — на службе і па-за службай. — М. Стральцоў. 8.01.86».

На кнізе «Мой свеце ясны»: «Анатою Сідарэвічу з тым, каб ён неўзабаве падрыхтаваў да друку зборнік сваёй крытыкі. Прозы — таксама. М. Стральцоў. 24.06.86».

На кнізе «Мой свеце ясны»: «Любаму Рыгору, паэту Барадуліну, земляку з удзячнасцю за пачуцці дружбы і еднасці — М. Стральцоў. 23.04.86».

На кнізе «Мой свеце ясны» [Наталлі Давыдзенцы]: «Наталі з добрымі пачуццямі, па сяброўску — М. Стральцоў. 26.06.86».

На кнізе «Мой свеце ясны»: «Любаму Рыгору [Барадуліну], адчуваючы гонар быць ягоным сучаснікам і сябрам, — М. Стральцоў. 15.08.86».

На кнізе «На ўспамін аб радасці»: «Пятру Рыгоравічу Макарэвічу са шчырымі пачуццямі — М. Стральцоў. 13.05.87».

На кнізе «Яшчэ і заўтра»: «Пятру Рыгоравічу Макарэвічу на добры ўспамін пра літаратурную сустрэчу — М. Стральцоў. 13.05.87».

На кнізе Ч. Айтматава «Буранны паўстанак» («І вякуе дзень даўжэй за век»): «Дарагому Карласу Шэрману, перакладчыку, сябру, мастаку паводле натуры — дынамічнай і артыстычнай — М. Стральцоў. 14.07.87. Дзень узяцця Бастыліі».

Міхась Стральцоў. Фота А. Каляды.

Бацькі — Лявон Клімавіч і Марыя Міхайлаўна.

Аднакурснікі — Сымон Блатун і Міхась Стральцоў. 1955 г.

Міхась Стральцоў, Генадзь Бураўкін, Анатоль Грачанікаў, Раман Тармола, Васіль Сідарэнка, Іван Шальманаў, Мікола Маляўка і Рыгор Барадулін у гасцях у Міхаіла Ісакоўскага. Масква, 1964 г.

Яўгенія Янішчыц, Уладзімір Караткевіч, Валянціна Коўтун, Мікалай Маляўка (Гомель), Вацлаў Жыдліцкі з Ілонай Барадулінай, Міхась Стральцоў, Мікола Прашковіч, Ала Сакалоўская, Сяргей Панізнік. Травень 1968 г.

Міхась Стральцоў. 1960 гг.

З Генадзем Бураўкіным. 1974 г.

Ніл Гілевіч, Уладзімір Дубоўка і Міхась Стральцоў сярод дэлегатаў пісьменніцкага з'езду. 1965 г.

Аўтар першай кнігі. 1960-я гг.



«І цыгарэт выкурваеш болей, чым прамаўляеш слоў...»

Міхась Стральцоў і Іван Пташнікаў. Фота У. Крука.

З Піменам Панчанкам. Фота У. Крука.

З Міколам Гілём і Сцяпанам Гаўрусёвым. Фота У. Крука.

«Журба — пачуццё здаровае...»

Міхась Стральцоў. 1976 г.

Сымон Герус, Васіль Хомчанка, Язэп Семяжон,
Алесь Яскевіч і Міхась Стральцоў. 1968 г.

З жонкай Аленай і дачкой Алесяй. 1981 г.

З Рыгорам Барадуліным ва Ушачах.

З землякамі ў Чэрыкаве. 1984 г.

З маці ў Сычыне. 1984 г. Фота В. Карамазава.

На юбілейнай вечарыне ў Слаўгарадзе. Сакавік 1987 г.

Аўтографы землякам... Слаўгарад, сакавік 1987 г.



Паштоўка Валянціну Аскоцкаму. Малюнак М. Стральцова. 1977 г.



* * *

У скверы гэтым мугавіна
Мне, нешта выпадкам, нак сайе,
Задобрыць дзіку цыганінкам
Ад даўняй лінейнай касіце, —
Якая радасць і адбуха,
Якая горыч і журба!
Сядзі і ўласным сэрцам слухай,
Як адсюль нас ўжа сэрца,
Д з ёй — і гурк, і бядзя.
Якай! Дзе шолкі дзе, мой хлопча,
Падстрэшак мой і дзе кроа?
Другі дзе шекіт конь пэйча,
Другі ў цыгар спачыну хоча,
Другі дзе пэлм — ш то дзе сам.
Ах, дзіка мой! Тысяю верай
Парадзь мной пэй дзеці лук
Пасляўся гэтымаю пэрай,
Каб я радзім цракнес мерэ,
Каб'ў зэ двух
І жэлэ зэ двух!

7.07.87

Апошні верш. Аўтограф. 7.7.87 г.

Надмагільны помнік на Чыжоўскіх могілках. Скульптар Г. Лойка.

«ГАЛУБІНАЯ ЛЁГКАЯ ПОШТА МНЕ ПРЫНЕСЛА ТВАЁ ПІСЬМО»
Лісты Міхася Стральцова

1. Паўлу Кабзарэўскаму

21 марта 1966 г.

Уважаемый Павел Семёнович!

Мне было очень лестно получить Ваше письмо, дружеское и доброе, — оно мне напомнило и те ласковые слова, которые Вы когда-то сказали по поводу моей первой книжки рассказов. Очень и очень Вам благодарен.

Сожалею, что «Свет Іванавіч»[1] переведён был у нас, в Белоруссии. Если бы я знал, что Вы заинтересуетесь им, этого бы не случилось. Но, кажется мне, публикация в «Нёмане» — издании не столь распостранённом, не помеха к опубликованию рассказа в другом мсте. Так что я не возражаю, конечно, отнюдь.

Месяца через два-три выйдет новая моя книжка рассказов[2]. Непременно пришлю её Вам, если получу на то согласие.

Желаю Вам всего доброго. *М. Стральцов.*

[1] «Свет Іванавіч, былы донжуан» — апавяданне М. Стральцова, апублікаванае ў «Нёмане» (1966, № 1) у перакладзе У. Жыжэнкі.

[2] «Маецца на ўвазе зборнік апавяданняў «Сена на асфальце» (1966).

2. Паўлу Кабзарэўскаму

14 июня 1967 г.

Уважаемый Павел Семёнович!

Извините, что задержал высылку журнала. Впрочем, если кто и будет наказан за это, так я. Посмотрите, пожалуйста, что

представляет собою эта моя вещь. Буду рад получить от Вас несколько слов.

Не расстроилось ли вообще дело со сборником[1]? Есть ли уже план его? Будете ли Вы переводить что-либо в нём сами? Если моя вещь подойдёт, распоряжайтесь ею в смысле перевода как угодно. Конечно, я был бы рад, если бы за перевод взялись Вы.

Всего Вам доброго. *М. Стрельцов.*

[1] Магчыма, гаворка пра будучы зборнік «Белорусские рассказы» (Масква, 1971), куды ўвайшло апавяданне М. Стральцова «Госць».

3. Паўлу Кабзарэўскаму

12 февраля 1968 г.

Уважаемый Павел Семёнович!

Прошу извинения за промеделение: не мог найти рукопись рассказа. Выписал её из Москвы; была у переводчика. Рассказ этот в мою книгу не вошёл, я снял его, не желая повторяться тематически и т. д. По-русски, таким образом, он не публиковался. Судить о пригодности или непригодности этой вещи будете Вы: наперёд со всем согласен. Строгим судом обижаться не буду.

О Богдановиче я написал не повесть, а что-то вроде эссе[1]. В свободной форме. Вещь уже почти готова. На днях буду перепечатывать. Пришлю Вам экземпляр. На досуге как-нибудь почитаете и напишете, возможно, мне, стоит ли овчинка выделки.

Спасибо за письмо. Всегда уважающий Вас — *М. Стрельцов.*

[1] Маецца на ўвазе эсэ «Ад Максіма Кніжніка пачатак», пазней вядомае як «Загадка Багдановіча» (1968).

4. Паўлу Кабзарэўскаму

9 апреля 1968 г.

Уважаемый Павел Семёнович!

Извините, что долго не отвечал Вам — почти месяц меня не было в Минске.

Теперь вот Вам мой добросовестный отчёт. Не могу представить себе, куда девалась последняя страница рассказа. Помниться, я осматривал рукопись перед тем, как отсылать. Не осталась ли страница в конверте, приклеившись к нему? Впрочем, бог с ней.

Я высылаю Вам белорусский вариант рассказа. Перевода у меня нет. Буду просить Вас, если ещё не поздно и если согласитесь, сделать новый перевод. На Ваше усмотрение даю и главу из книги о Богдановиче. Писал я её, заботясь о её ценности (новеллистической) безотносительно к книге. Её можно печатать как самостоятельную вещь. Только название надо изменить, дать такое: «Тень Сальери». Если новелла понравиться Вам, переведите её и дайте в книгу вместо «Сена на асфальте»[1]. Решайте сами.

Почему не прислал до сих пор рукопись книги о Богдановиче? Два экземпляра я сдал в издательство, один — в «Полымя». Остался мой первоначальный, который печатал сам. Но он испещрён моими правками, и послать его Вам не решаюсь. Сделаю так. Я заберу один экземпляр из издательства (после оформления) и сразу же отошлю его Вам.

Если я правильно понял, Науменко предлагает в книгу рассказы «Ять» и «Рельсы» (или-или, на выбор).

Вот, кажется, и всё. Ещё раз прошу извинить меня. Ваш *М. Стрельцов*.

Минск-68, ул. В. Хоружей, 48, кв. 8.

[1] «Сена на асфальце» (1963) — апавяданне М. Стральцова.

5. Паўлу Кабзарэўскаму

[1968 г.]

Дорогой Павел Семёнович!

Мне звонили из «Нёмана» и просили поторопить Вас с переводом моих заметок о Богдановиче. Предполагают давать их в № 11 или № 2[1]. Всё, говорят они, будет зависеть от срока до-

ставки перевода. Возможно, они свяжутся с Вами и сами. Я же сообщаю Вам их разговор со мной.

Напишите мне несколько слов. С уважением —
М. Стрельцов.

Минск-68, ул. Хоружей, 48, кв. 8.

[1] Эсэ «От Максима Книжника начало» («Загадка Багдановіча») у перакладзе П. Кабзарэўскага і А. Бялова было надрукаванае ў № 5 «Нёмана» за 1969 г.

6. Паўлу Кабзарэўскаму

28 октября 1968 г.

Уважаемый Павел Семёнович!

Спасибо за весть о себе. Вполне извиняю обстоятельство, которое задержало перевод, но, ради бога, сделайте его побыстрее. Нам в «Нёмане» дают всего лишь неделю с тем, чтобы мы попали в № 2. № 11 мы уже прозевали.

Пишите в «Нёман» и пишите мне. Присылайте перевод.

С приветом — *М. Стрельцов.*

7. Паўлу Кабзарэўскаму

13 ноября 1968 г.

Уважаемый Павел Семёнович!

«Нёман», конечно, будет ждать, — что тут поделаешь! Но я думал, что работа пойдёт у Вас скоро, и мы не очень опоздаем.

Насчёт переводов стихов[1]. Они, по-моему, необязательны в таком издании, как «Нёман». Можно оставить по-белорусски. Вам случиться делать переводы белорусского текста, сделанные мной с русского. Не смущайтесь этим: русские оригиналы я потом сам отыщу и неточности исправлю.

На пленуме была некоторая драчка. Брыль сделал очень обстоятельный и строгий доклад. Молодец Шамякин, теперь второй секретарь (Танк часто болеет). А так — всё тихо.

С дружеским приветом — *М. Стрельцов*.

[1] Гаворка пра вершы М. Багдановіча, цытаваныя ў эсэ «Ад Максіма Кніжніка пачатак».

8. Валянціну Аскоцкаму

[28 декабря 1973 г.]

Дорогой Валентин!

Ты не представляешь, как я рад был твоей весточке, как радостно поразила она меня. Не дай бог нам недоразумений, охлаждений и того возрастного фатализма, имя которому безразличие.

Дорогой друг, поздравляю с новогодним праздником, обнимаю, непременно будь счастлив и душевно крепок. Помнишь у Василия Тредиаковского?

Плюнь на скуку —
Морску суку,
Держись черен
И знай штуку...[1]

Так-то!
Твой *Михась*.

[1] Недакладная цытата з верша В. Трэдзіякоўскага «Песенька, якую я склаў у маскоўскіх школах, на мой выезд у чужыя краі» (1726): «Плюнь на суку / Морску скуку, / Держись черней, а знай штуку: / Стань отишно / И не пышно; / Так не будет волн и слышно».

9. Віталю Фёдараву

[1974?]

Дарагі Віталь!

Прабач, што я цябе нейкім чынам падвёў. Сычынцы і нямілінцы кінуліся касіць луг, шафёр грузатаксі — таксама. З рэчамі ад вуліцы давялося вяртацца дамоў.

Рукапіс табе перадасць Таська[1]. Яго я прачытаў. Вядома, лепей было б пагаварыць... У аповесці адчуваецца натуральнасць, веданне тэмы. Увогуле добрая мова. Шкодзіць пэўная расцягнутасць, аднастайнасць прыёму (галоўным чынам апісальнага) у падачы сюжэта. Сон у пачатку непатрэбен. Наогул — трэба большай кампаноўкі.

Напішы мне па адрасу: *Мінск, вул. Казінца, 45, кв. 29. М. С. Міхась.*

[1] Таіса Стральцова — сястра пісьменніка; гаворка ідзе пра аповесць В. Фёдарава «Студэнты».

10. Валянціну Аскоцкаму

[1976 г.]

Дорогой Валентин!

Поздравляю с Первомаем, с весной, с молодой травкой! Радости тебе и твоим семейным на земле, в небесах благоволения! Обнимаю. Твой *Міхась.*

P. S. Я получил новую квартиру[1]. Ещё не переехал. Адрес сообщу.

[1] Гаворка пра кватэру ў доме № 6 на вул. Прытыцкага.

11. Валянціну Аскоцкаму

13 февраля 1979 г.

Дорогой Валентин!

К сожалению, тебе пока придётся довольствоваться вырезкой из того номера «ЛіМа», о котором ты просишь. Вырезку я заготовил впрок, а газета у меня пропала.

О каком это Каткове ты пишешь? О Михаиле Никифоровиче? О его либеральных грешках или рептильных делишках? Сам чёрт ногу сломает в пореформенных годах.

Хреновым, надо сказать, похмельем кончился пир 19 февраля[1]. Публицистическую мысль, которая возликовала, почувствовав некоторое послабление узды, понесло прямо-таки в патологическое словоблудие; все радели о народе, хоть того народа, за исключением, может, Достоевского, Толстого да Лескова, никто в глаза не видел, а хоть бы и видел, да не знал о чём и как его спросить. Народу также было мало дела до устроителей его судьбы, как и до Апраксина рынка[2], который не он же, вероятно, поджигал, как и до твердынь Зимнего дворца[3], который, впрочем, спасовал взорвать Бабушкин (?) своей бомбой, услышав *человеческое* слово царя, как и до чумазого прогресса в обличье чугунки, от которой мог поживиться разве что грузилами для рыбной ловли[4].

То, что всё перевернулось, это правда, по Писареву вкупе с Базаровым вольно было резать лягушек и ратовать за положение знания и «умственного пролет.», а Чернышевскому уповать на бунт, который в своё время вызывал у Пушкина всего лишь брезгливость. Один Достоевский по-настоящему мучился и настоящим моментом, и думал об «отдалённейших исканиях человечества». И вот такой «экстремизм» я понимаю, это была самая умная крайность при тогдашних крайностях. И «почвенность» его мне симпатична, совсем не ограниченная, а основанная на пушкинском понимании предназначения России (его спор с Чаадаевым).

Многозначна и скорбна проекция этих лет на будущую историю России, но это уже другой вопрос, и не стоит здесь говорить об этом.

И рецензию твою (для кого ты пишешь?), и книгу Твардовского я, разумеется, прочитаю: где она вышла?

Мою рецензию на Брыля постарайся пристроить; если не сгодится для «Литературного обозрения», передай, пожалуйста, в «Дружбу народов»[5]. Авось там возьмут. Конечно, её надо сократить, но сам я не знаю, как приноровиться к тамошним требованиям.

Обнимаю тебя, старик. Твой *Михась*. Привет от Лены.

P. S. Твою статью планируют в «Нёмане» на летние месяцы. Она понравилась вообще и взглядом со стороны, тем, что не вписал меня, грешного, в общенациональный процесс, в частности. Только вот название вызвало возражение. Пожалуй, они правы. Жестковато как-то, газетно, возможно. Отклеивается от твоего текста. Геннадий [Бубнов] будет тебе по этому поводу звонить.

М.

[1] 19 лютага (3 сакавіка) 1861 г. у Расійскай імперыі быў абвешчаны царскі маніфест аб адмене прыгоннага права, пасля чаго пачаліся масавыя сялянскія паўстанні (гісторыкі налічваюць іх 1176), жорстка задушаныя войскам.

[2] Апраксін кірмаш у цэнтры Пецярбурга ў 1862 г. моцна пацярпеў ад пажару.

[3] Зімовы палац — рэзідэнцыя расійскіх імператараў у Пецярбургу.

[4] Сяляне з адкручаных на чыгунцы гаек рабілі грузілы для рыбалоўных прыладаў.

[5] Рэцэнзія М. Стральцова на кнігу Я. Брыля «Трохі пра вечнае» была апублікавана ў маскоўскім часопісе «Литературное обозрение» (1979, № 8).

12. Але Сямёнавай

[Верасень 1981 г.]

Дарагая Ала Іванаўна!

Ну, ну, не хмурней брывом у выпадку такога сур'ёзнага звароту. Проста мне ўспомнілася, як міла ты мне выгаворвала аднойчы за Алу Іванаўну — вось і закарцела падражніцца.

Нешта падобнае да невялічкага катаклізму адбылося надоечы ў маім жыцці. Для здароўя і самаадчування майго карысным было прызнана двухгадовае знаходжанне ў паўднёвых мясцінах спагаднага і мілага нашага краю[1]. Вось і абзываюся адтуль, з самага дна колішняга мора Герадотавага, спакойна і павольна, як у зачараваным сне[2], апетага сённяшнімі тэбульцамі [так у тэксце] X., Z., R. і інш[ымі] шаноўнымі

турамі пяра. О, я на родине этих мужей, телом тучных и голосом рыкающих. Хвала им! Бессмяротнае слова іх падтрымлівае і мяне ў сумную хвіліну, а пазней, думаю, натхніць і на сціплы подзвіг пяра — чаму не натхніцца вартым пераймання прыкладам? Так што хутка я запішуся, калі прымуць, у секцыю «чающих воды». (Як гэта хораша і глыбакадумна сказана ў рамане Z.: «Усюды — куды ні глянь — была вада»! А было гэта ў часы сусветнага патопу, і Z. нейкім чынам давялося прысутнічаць пры гэтым у якасці духу боскага, ці як? — «И божий дух носился над водою»[3]. Глыбака капаюць і высака лятаюць палешукі!)

А слухай усё ж: мясціны гэтыя мне былі і раней трохі знаёмыя — быў некалі непадалёк адсюль на вайсковых зборах. І тое-сёе ў маім тутэйшым бытаванні нагадвае колішняе. Але толькі тое-сёе. На жаль.

КПП. Там круціцца пласцінка,
Хрыплаватым голасам пяе.
«Ты — галінка, я — твая расінка»,—
Мне чуваць у голасе яе.
Я міну лінейкі і газоны,
Гэткія, як некалі раней,
Успамінак даўні, гарнізонны
Ціхім смуткам сэрца мне кране[4]

і г. д.

Але хопіць. Ты павінна здагадацца ўжо, што напісаў гэта я толькі затым, каб атрымаць ад цябе ліст. Не палянуйся га? Пішы — мне ўсё будзе цікава.

Міхась.

[1] Маецца на ўвазе Мазырскі лячэбна-працоўны прафілакторый № 2, дзе М. Стральцоў знаходзіўся са жніўня 1981 па лістапад 1982 г.

[2] Цытата з аповесці Я. Коласа «Дрыгва» (1933).

[3] Цытата з Бібліі (Быццё, 1:2).

[4] Гл. верш «Адвячоркам круціцца пласцінка...» ў зб. «Мой свеце ясны».

13. Але Сямёнавай

31 кастрычніка 1981 г.

Дзень добры, Ала!

Не сумую сягоння: навошта?
Мо цягнік пастараўся, а мо
Галубіная лёгкая пошта
Мне прынесла тваё пісьмо.

А чаму не паслаць было чаіц
Ад шумлівых тваіх берагоў,
Каб вясёласць маю прывячалі
Над маркотай асенніх лугоў?

Іх маркота хаця б з нагоды,
Што, зняверыўшыся ў жальбе
Лістападаўскае прыроды,
Свет зняверыўся і ў сабе,

Што ўжо рэкі, палі і сёлы,
І прадзьмуты вятрамі лес
У задумнасці невясёлай
Пакарыліся восені спрэс, —

Хоць ад замеці ліставея
Скразнякамі святло ў барах,
Хоць і ў сэрцы трымціць надзея,
Як лісток на тугіх вятрах.

Гэта ўсё так табе знаёма!
Не падумаю я з тугой,
Што ты бліжай цяпер да дому,
Чым я дома да дому свайго, —

Проста гэту асенню замець,
Гэты лес у асеннім агні
Пасылаю табе на памяць:
Мне вясною яго вярні![1]

А ты ўжо ў Мінску... І з вершыка майго можаш заключыць, што натхненне маё не паспявае за тваімі перамяшчэннямі:

Пегас мой кульгае. Ат, вершык усё ж прымі — хіба я дарма стараўся? І ў адказ напішы, што я харошы хлопчык, і што ты гладзіш мяне па галоўцы. Мне будзе прыемна, дальбог. Я сантыментальным яшчэ не стаў, але здагадваюся ўжо, што нешта падобнае чакае мяне наперадзе. Гэта, мусіць, ад адзіноты: уяві сабе многа-многа мужчын у адным месцы, да таго ж, падобных адзін на аднаго, як шпакі. И все с болячками, с пупырышками — душевными, конечно, — бр-р!

Хочаш даручэнняў? Прысарамаць Паўлава (а ён адзіны, хто называе мяне «дзедам» — такой прывілеі мне давядзецца яго пазбавіць!) — прысарамаць тым, што «дзяды» «дзядоў» не забываюць, калі на тое пайшло, што грэх на душу стары бярэ з большай абачлівасцю, чым юны стрыкуліст. Справа ў тым, што ён не адказаў на мой ліст — і не лысы.

А прасіў жа я яго дазнацца пра лёс маіх вершаў у Вялюгіна[2]: даўнавата аддаў і забыўся пра іх, хоць і абяцаў (цяпер успамінаю) Вялюгіну дадаць да падборкі новыя вершы. У Мінску гэтага не зрабіў, ибо мнози там бороли мя страсти[3], — час вунь які мінуўся, Вялюгін, можа, пра тыя вершы і забыўся. Калі наогул іх не згубіў (а дзе я іх цяпер вазьму, тыя вершы?). Я, на жаль, не Ставер, каб ведаць свае вершыкі на памяць. Дык вось: трэба націснуць на Вялюгіна (ці ёсць у яго вершы? калі будзе даваць?). І цвёрда ад майго імя паабяцаць колькі новых вершаў у дадатак. Я гэта зраблю. Толькі няхай з друкам не цягне. Вялюгіну напісаў бы сам, але ведаю яго эпісталярную глухату: лепш браць галубка голымі рукамі на месцы.

Вось тады я табе і вершыкі прышлю, і пазлоўжываю тваёй дабрынёй, просячы іх перадрукаваць. Згода?

А пакуль падстаўляю галоўку пад твае далоні і развітваюся. Не забывай мазырскага палонніка.

Здаровенькая будзь. *Міхась.*

[1] Канчатковая рэдакцыя верша — у зб. «Мой свеце ясны».

[2] А. Вялюгін быў загадчыкам аддзела паэзіі ў часопісе «Полымя».

[3] Цытата з царкоўнага песняспеву падчас Усяночнай службы (глас 4, антыфон 1).

14. Але Сямёнавай

14 сакавіка 1982 г.

Пішу табе на выдавецтва ў надзеі, што пісьмо неяк перададуць. Сказаць, што ты мяне засмуціла, мала: мне пачало здавацца немаведама што, і вялікая крыўда ўзнялася на пана Бога, маўляў, калі ён бэсціць і карае мяне, можа, і не надта вернага свайго халопа, дык навошта яшчэ і людзей, якіх я шчыра люблю і за якіх малюся? А любая, па-мойму, са шчырых малітваў павінна даходзіць да яго, калі ў ягонай нябеснай канцылярыі вядзецца правільна іх улік і талкова складаюцца дайджэсты. А мо не чытае, а мо не перадаюць?

Я і тут табе скажу, таечка, што рабіць. Ты з ангеламі, з душкамі іх нечапанымі, гаворку вядзі. Калі анёльчык сумны трохі, пёрка з крыльца выскубі і пёркам яму так лагодненька за вушкам павядзі — за жывоцік адразу і схопіцца. А ты яго казычы, казычы. Запросіць пардону — ты яму просьбу сваю. І тут ён табе паабяцае, як Барадулін, усяго, а ты ўжо яму, як Асіпенка: не, ты абажджы, цяперыцька я цябе, як у зеркалі, панімаеш, бачу — што ў цябе ў думках праваліруе, прававладае, га? Не падзяляеш?

З імі трэба толькі так.

Смешкі смешкамі, а я як найхутчэй чакаю весткі ад цябе — і харошай. Вясна ж ідзе! Мне, чалавеку, што зарокся, можа, і радасці, і то на душы шчымліва — хораша бывае, як вясновы ветрык шыбане ў наздру, як у вушах палошча, як перавярне някепскіх успамінаў адну-другую скібу — душа тарганецца весела, а чарвячка сумненняў тут жа склюе, падскочыўшы паслужліва і ў добры час, непаседа-грак. Мацуйся і кінь дурное, як нехта казаў, зрабі ласку мне і людзям, якім ты патрэбна — ачуньвай хутчэй і мне пішы.

Я табе кветачку пасылаю. Пазаўчора праклюнулася ў мяне на акне. Будуць і яшчэ. Сіняя кветачка, харошая. А на сонейка сама часцей глядзі.

У наступны раз я табе вершык напішу, калі хочаш. Даўно ўжо не пісаў, а табе напішу.

Здаравейшай будзь, пішы.

Міхась.

15. Але Сямёнавай

5 мая 1982 г.

Дарагая Ала!

Адчуў я за радкамі твайго пісьма, як турботліва і нясоладка зараз табе самой, і сорамна мне крыху стала за сваю дакуку і пісьмовы імпэт. Ты, калі ласка, даруй.

Будзем спадзявацца, што ўсё неяк уладзіцца, улагодзіцца і пацішае: клопаты, вядома, застануцца, але, можа, дадуць перадых і сабе, і нам. Хоць трохі палёгкі.

У нас тут бадай што вясна, і надоечы, колькі дзён таму, выдарылася нейкая асаблівая прасветлінка ў прыродзе, і так зранку ўзялася нясмела-соладка, з прыхапкам журбы, торгацца сэрца, такая надзея нейкая, па-маладому дурная, патрэпала крылы, што я аж спалохаўся і тут жа сцяўся ўнутрана: баюся я такіх хвілін! Баюся сурочыць тыя харошыя хвіліны, якія, можа, яшчэ наканаваны недзе пасля. А страпянуўся, паляцеў душою насустрач шчымліваму падману — пішы прапала! Не далей як праз дзень-два тыцнецца да цябе жытуха з такою абразай-прозай, што закаешся «возлетать»! Далібог. Са мной заўседы так, праверана гэта — і тут я забабонны.

Таму і душу «прекрасные порывы»[1]. Пераймаць мяне ў гэтым не трэба, вядома, гэта мая ўласная містыка, але ж ці не занадта мы танкаскурымі сталі — вось пра тое я думаю іншы раз. С. у такіх выпадках раіць пакутаваць, ледзь не свядома, — браткі-славяне на ўсё і дзеля ўсяго прыдумаюць [*неразб.*] — і куды там якому-небудзь біццю па левай і па правай шчацэ! Мы уже и ногу попирающую лобызать считаем превеликой милостью, и корни и акриды кажутся нам пищей райской, а зловоние подземелий — дуновением райских крыл! Абрыдлі мне

гэтыя прапаведнікі пакут [...]. Да сокрушится царствие их! Але калі — о божа!

Добра. Хопіць. Пішы мне, што надарыцца, і калі выпадзе час — я палагоднею на тую пару і табе што-небудзь лірычнае напішу.

Што ў вас там за пленум? Абмалюй.

Прывітанне вашаму крытычнаму цэху — небось, воскуряете самодельными зажигалками фимиамы, а як наконт прыкурыць?

Ну, добра, добра. Бывай здарова і пішы.

P. S. Яшчэ раз віншую са святам. *М.*

[1] «Души прекрасные порывы» — радок з верша А. Пушкіна «Да Чаадаева» (1818).

16. Але Сямёнавай

5 чэрвеня 1982 г.

Дзень добры, Ала!

Аж самому няёмка, што так надакучаю табе пісьмамі, — і гэта я, катораму яшчэ нядаўна старонку Дзюма (во дзе кара!) было б адолець лягчэй, чым адказаць каму-небудзь на ліст або напісаць па сваёй ахвоце. Таму будзем думаць, што ўплываеш ты на мяне дабратворна, калі змагла абудзіць ва мне гэтую, я думаў, атавістычную страсць або хэнць. Я, можа, глядзі, і раскалыхаюся душэўна, а ты, значыцца, як гаварыў незабыўны Броўка: а ты пішы, а ты пішы[1]...

І па тэатрах ты, вядома, хадзі, не надта турбуючыся, што паселіш у маёй душы чорную зайздрасць. Тэатрал я невялікі, мне ўсё роўна, ходзяць больш у тэатр ці кіно, або наадварот. І хто там каго пераможа, якая дзясятая ці адзінаццатая муза — мне справа сапраўды дзясятая. Сучасны тэатр не ведаю, не бачыў, вядома, нічога з рэжысёрскіх феноменаў Гратоўскага, панявежцаў[2] якіх-небудзь нават не бачыў, не ведаю, што там выробляў у тваім тэатры Любімаў, а вось з ягоным вуч-

нем Раеўскім (так ён сябе сам называў) рабіў Купалу[3], бо тут сапраўды было нешта (у Купалы) ад «паэтычнага» тэатра. І спрэчкі розныя пра дыктат рэжысуры і акцёрскае самавызначэнне неяк абыходзяць мяне: я не за надакучнае выдыганне і выкаблучванне аднаго правінцыйнага Рэйнхарда перад другім, я і не за «салонны» нейкі рэжысёрскі стыль, асабліва ў трактоўцы класікі, як і не за аголена мадэрны, а проста ўбогі, т. зв. сучасны. Я быў бы проста, можа, за тэатр, але што гэта такое? [...].

Я не ведаю, дзе той сучасны тэатр і дзе той стыль. У макаёнкаўскай «Верачцы»[4] хіба? Даруйце. На санвузле, прабач, і якая-небудзь Пегі[5] сучасная глядзіцца не надта каб, а тут яшчэ Пульхерыя нейкая Іванаўна[6] чамусьці завецца аж Арынай Радзівонаўнай[7]. Авохці мне!

Гэта, вядома, не значыць, што я не хацеў бы, скажам, пайсці з табой у тэатр — хоць на «Запарожца за Дунаем»[8] — калі ласка! І людзі няхай ходзяць у тэатр і ў кіно, і на танцпляцоўкі ці на «карчы», як іх называюць у парках.

Во — хацеў я аднойчы напісаць апавяданне пра танцпляцоўку (даўно), і задума, здавалася, цікавая была. Нябожчыку Рылько нападпітку неяк расказваў, а ён уталопіў вочы ў мяне, доўга глядзеў, неяк тужліва-хітравата, як гэта ён умеў, а потым кажа нешта накшталт гэткага: а ты даўно, хлопча, каровы пасвіў, касіў ці дровы пілаваў? І пра Дастаеўскага нешта сказаў, і пра ягоную «хромоножку» са Стаўрогіным[9] — маўляў, вывіх і выбрык.

Разумны быў чалавек, і мы, гадамі розныя, сябравалі, можа, па-сапраўднаму, а больш ён нібы бацька мне быў. А пра Даст[аеўскага] ён сказаў нездарма: у мяне ў той задуме нейкім саматужным Фрэйдам патыхала, ён гэта неяк адразу зразумеў. А задума ці не забылася, памятаю толькі і цяпер чамусьці ўпэўнены, што, далібог, неблагая была. Калі-небудзь, можа, успомню, нечага з другога вопыту дадам і, дадаўшы, можа, напішу. Бо начытаешся, як Z. з F. «живописуют» жанчын і каля, дык не па сабе неяк робіцца: і тэмы шкада, і праўды шкада, той праўды, пра якую стары Талстой (у адносінах да жаноча-мужч[ынскай]

прабл[емы]) выказаўся неяк так: я пра тое голас падам, калі адной нагой у труне буду і выкажуся, шасну ў труну і векам накрыюся.

Так, здаецца, Горкі перадае — чалавек, які выдумаў сябе і выдумляў другіх, страшная ў яго гэтая ўласная выдуманасць, упэўненасць дзяка ці царкоўнага начотчыка. Можа, адзіны з рускіх літаратараў, [які] вёску не разумеў і не любіў. Яно дык любіць, канечне, мала за што можна, але... ягоная яўная, а часцей схаваная, варожасць да інтэлігенцыі даказвае толькі тое, што ён самавук, і тое, што інтэлігентам трэба нарадзіцца. Прапаведваць веды, з аднаго боку, услаўляць волю і нейкага чалавека, паднаўляючы, зноў жа саматужна, Ніцшэ, і забыць пра Акакія Акакіевіча[10], як гэта было ў Горкага, — гэта і не па-руску неяк, і не па-асветніцку нават. Пану грамата цяжка даецца, а калі даецца, дык прымаўкай робіцца нездарма [...].

Надвор'е ў нас даўно ўжо сапсавалася — сырасць, макрэча, не ведаю, як у вас. Радыё я не слухаю, ды і ўключаюць яго прапары цэнтралізавана, так сказаць, калі захочуць. Футбол я не гляджу. Вось пішу табе раніцай, палова восьмай, да паверкі — дождж шастае, а ў мяне круцяцца рубцоўскія радкі:

Седьмые сутки дождь не умолкает —
И некому его остановить!
Все чаще мысль угрюмая мелькает,
Что может всю деревню затопить.

Цытую па памяці, таму і сумняваюся. Неяк так. Там яшчэ, здаецца, ёсць радкі: «На кладбище, как будто крокодилы, ворочаются, спятивши, гробы»[11]. Бр! Мальчишка. Часто «смешной и милой» кажется у него эта страсть пугать или легкомысленничать. Вроде:

Прозрачно небо голубое,
Прозрачен воздух голубой.
Какое место вам? — Любое!
Любое время, край любой![12]

Ах ты, божа мой!

Як яму ў тым абраным ім ці некім другім краі цяпер — адзін бог ведае. Напрадракаўся: «Я умру в крещенские морозы»[13]. Так, здаецца, і было.

Някрасаўскі пейзаж нейкі над намі, да Кальцова не дараслі ці перараслі, — паспяшаліся. Але нешта я сумнае пад дождж пачаў — не буду. Вось табе зноў славянская рыса.

І не пытаюся ўжо аб падарожжах тваіх. Здаецца, што і цябе дожджык заспеў. Калі не, напішы. А я скарачацца буду. Бо і час: паверка тая ж.

Бывай. Успамінай калі. *Міхась.*

Кветкі ў мяне на стале стаяць. Ахвярую колькі пялёсткаў. *М.*

[1] Парафраз верша П. Броўкі «А ты ідзі» (1965).

[2] Маецца на ўвазе вядомы на ўвесь СССР Панявежыскі драматычны тэатр, заснаваны ў 1940 г. літоўскім рэжысёрам Юозасам Мільцінісам.

[3] Гаворка пра тэлеспектакль «Па шчасце, па сонца» (1971), пастаўлены паводле твораў Я. Купалы (рэжысёры — В. Раеўскі і В. Акімушкін, аўтар сцэнара — М. Стральцоў, кампазітар — С. Картэс).

[4] «Верачка» — лірычная камедыя А. Макаёнка, апублікаваная ў «Нёмане» (1980, № 3).

[5] Відаць, маецца на ўвазе Пегі Эшкрафт (1907–1991) — англійская акторка, уладальніца прэміі «Оскар» (1985).

[6] Пульхерыя Іванаўна — гераіня аповесці М. Гогаля «Старасвецкія памешчыкі» (1835).

[7] Арына Радзівонаўна — гераіня п'есы А. Макаёнка «Верачка».

[8] «Запарожац за Дунаем» — украінская опера кампазітара С. Гулак-Артымоўскага (паст. у 1863 г.).

[9] Стаўрогін — галоўны герой рамана Ф. Дастаеўскага «Бесы» (1870–1872).

[10] Акакій Акакіевіч Башмачкін — галоўны герой аповесці М. Гогаля «Шынель» (1842).

[11] Дакладная цытата з верша М. Рубцова «Седьмые сутки дождь не умолкает...»: «На кладбище затоплены могилы, / Видны еще оградные столбы, / Ворочаются, словно крокодилы, / Меж зарослей затопленных гробы».

[12] М. Стральцоў недакладна цытуе верш М. Рубцова. Трэба: «Прекрасно небо голубое! / Прекрасен поезд голубой! / — Какое место вам? — Любое. / Любое место, край любой».

[13] Радок з верша М. Рубцова «Я умру в крещенские морозы» (1970).

17. Але Сямёнавай

12 чэрвеня 1982 г.

«Добры вечар — кажу гэты раз і гляджу ў акно, за якім сапраўды вечарэе, але на захадзе ні барваў, ні бліскавак, хоць па-навальнічнаму пахмурна і ветрана. Зеляніна нейкая вайскова-адчужаная, без тонаў, колеру, бо замгліла неба, а ці надоўга, не ведаю.

Учора атрымаў тваё пісьмо, адпісаў, нават заклеіў, і вось яно ляжыць на стале, як не маё ўжо, без маёй улады на яго, якраз такое, якім прачытаеш яго, якім яно табе падасца. А якім, не ведаю. Рэчы, мусіць, таксама ведаюць адчужэнне, як і пранікліваcць, можа, сваю. Я, напрыклад, редка бываю ў згодзе з імі, і яны, мусіць, адчуваюць гэта, бо ніколі не затрымліваюцца ў мяне, як бы баяцца нейкай неўладкаванасці самога гаспадара — мо, найперш, душэўнай.

Дык вось, пісьмо табе ляжыць неадпраўленае і будзе ляжаць аж да панядзелка, прыйдзе разам з гэтым, а мо і не — на тое ёсць свае паштовыя дзівосы.

Значыцца, так. Надвор'е, мяркую, і ў вас сапсавалася, і ты, мусіць, так і не здзейсніла мой наказ павандраваць на крэсах нашага раёна з «французской книжкою в руках»[1] a-la belle Таццяна[2], памаркоціцца ля возера ў часы, калі там мала ўжо вульгарных купальшчыц і купальшчыкаў, але яшчэ і не затаіўся ў прыбрэжных хмызах сумна-задумлівы Пан, каб высочваць нетутэйшых наяд, — не пагражае табе, хіба сустрэча з маім імгненна-прывідным ценем над той вадой: ён нагадвае табе, можа, лермантаўскія радкі, якія згадваў я некалі над тым, з дазволу сказаць, возерам. Вось такія радкі:

Окончен труд дневных забот.
Я часто о тебе мечтаю.
Бродя вблизи пустынных вод,
Вечерним выстрелам внимаю.
И между тем, как чередой
Глушит волнами их седыми,
Я плачу, я томим тоской,
Я умереть желаю с ними[3].

Кажется, так. А ўспаміналіся мне там, можа, «иные берега, иные волны»[4]. А цяпер я хачу бачыць цябе менавіта на нейкіх здратаваных берагах нейкага менскага возера, — і крый Божа, не ў Палангах і не ў Адэсах шумных! Крый Божа!

Ці не эгаізм гэта? І па праву якому, га?

Як бы там ні было, пасылаю табе трохі «божых слёзак». А наогул жа, няхай анёлы з табой гуляюць, а ты, калі хочаш, узнося з імі на неба — ненадоўга, праўда, бо ў мяне забаляць вочы глядзець на анёльскае гэта відовішча.

Бывай. Пішы. Жыць асабліва не спяшайся. А маркоціцца — тым болей.

Міхась.

[1] Радок з рамана ў вершах А. Пушкіна «Яўгеній Анегін» (1823–1831).

[2] A-la belle Таццяна (з франц.) — нібы прыгожая Таццяна (гераіня «Яўгенія Анегіна»).

[3] Цытата з верша М. Лермантава «Любил с начала жизни я...» (1829).

[4] Радок з верша А. Пушкіна «Вновь я посетил...» (1835).

18. Але Сямёнавай

21 чэрвеня 1982 г.

О, у мяне не такі ўжо і благі быў дзень! Як бы там ні было, тое-сёе ўтаргаваў усё ж у цябе. Цяпер хаджу, надзімаюся, як паўлін, ну а ты — ці адчуваеш сябе павай? Магчыма, можа, але не з той нагоды, як хацелася б мне. Во пакруціў я тваё пісьмо і так і гэтак і бачу, што вялікі ты дыпламат. Абвяла мяне вакол

пальца, папярэдне не паманіўшы нават! Хітранькая ты! Усе захады мае абышла ды яшчэ мне, як Анегін[1] нейкі ў спадніцы, марал вунь які за мае прамаскавецкія сімпатыі (быццам бы) прачытала. А наастачу яшчэ напалохала тамтэйшым востранькім каблучком, які непазбежна патопчацца па мне. Да апрашчэння завеш, але не з сабой (sic!), *акулярчыкі* мне спрытненька ўціраеш, а сама смяешся. Кіпцюрыкі-шпілечкі, маўляў, нехта іншы пакажа няхай... Не, давядзецца мне, мусіць, аб'яву ў тую рыжскую газету, якую ты згадвала неяк, пісаць. А што? Закажы на будучае выразкі ў менскім бюро даведак — пацеха будзе!

Але чакай. Я нейкі іншы ход прыдумаю супроць цябе. Мы яшчэ паваюем! Напалохалася?

Тады будзем пра іншае.

Барадулін ліст прыслаў. Шчодры, як сам гаспадар. Але добра, што азваўся. Вершы новыя абяцае ўключыць. Адсутнасцю дат папікае. Але табе я ўжо наконт датаў тых пісаў. На назве раіць спыніцца: «Яшчэ і заўтра»[2]. Гэтым ён палесціў мне. Мне самому пакрыёма падабалася з усіх. Пакідайце, калі можна.

Слухай, даражэнькая, Вялюгіну, вядома, я напішу, але ці не «напусціць» на яго Рыгора [Барадуліна]? Вялюгін, мусіць, баіцца майго цяперашняга «рэнамэ», але ж не вечна я буду сядзець тут! Пакуль ён друкаваць збярэцца (ведаем ягоны разварот!) ды надрукуе пакуль, дык я яго, можа, ля Круглай плошчы[3] з галаварэзам якім-небудзь тутэйшым (тут называецца «кент», «кенцяра») перайму. Якім данясе сябе новай жонцы? Жарт, вядома — няхай не страхуецца, а вершы друкуе. Рыгора, Рыгора трэба напусціць!

Рэцэнзію для Масарэнкі я найхутчэй як-небудзь агораю, перасілюся. Бяда — не лезе нічога ў галаву. Лаяцца не хочацца, а ваду ліць я неяк не ўмею. А гэта не заўсёды добра.

Ну бывай.

Хочаш ведаць, які вершык прыслаў мне Барадулін?

Лёг спакой на халадок атавы,
Вытрасшы трывогі з рукаўцоў.
Маладзік прарэзаўся танклявы,
Быццам малады Міхась Стральцоў[4].

Во дае! Во ў каго ты дыпламатыі вучышся! Ведаю цяпер.

Рыгору пра вершык не кажы. Што ягоны выбар загалоўка спадабаўся, скажы. Тут ён сапраўды як бы палесціў мне. Я рады.

Міхась.

[1] Яўгеній Анегін — галоўны герой аднайменнага рамана ў вершах А. Пушкіна.

[2] «Яшчэ і заўтра» — кніга выбраных вершаў М. Стральцова; выйшла ў 1983 г.

[3] Круглая плошча — ранейшая назва Плошчы Перамогі.

[4] Страфа з верша Р. Барадуліна «Маладзічком» (гл. зб. Маўчанне перуна» (1985).

19. Але Сямёнавай

12 жніўня 1982 г.

Добры дзень, Ала!

Гм, гм!.. Каралішчавічы[1]. Усе мы праходзілі праз іх, як праз эдэмскія вароты, у сваім паляванні на забаронна-салодкую садавіну-пладавіну, якой спакушае нас здзеклівы змій творчасці. І мы, надкусіўшы, грашым, а хітры змій-спакушальнік, асляпіўшы і азеляніўшы, адно падсоўвае нам яблычкі-зелянухі замест райскіх пладоў ды воўчую ягаду замест блаславёнай смоквы.

Творчага палявання я табе, вядома, вунь як жадаю, а так, у вольны час, бязлітасна спаганяй аброк з матухны-прыроды ў выглядзе звычайных грыбоў, ягад, дажджоў вятроў і азону, прагульвай вечарам і ранкам розных там Джэры і Джульбарсаў, мо не перавяліся яшчэ? (І барані цябе бог сябраваць з літаратарамі-п'яніцамі (нават для Сцяпана Захаравіча [Гаўрусёва] выключэння не рабі, выключэнне — для мяне), не ўваходзь у кантакты з прыезджымі інжынерамі і забеспячэнцамі з Мінскага трактарнага і аўтамабільнага [заводаў], якія чамусьці маюць звычку там у гэты час адпачываць, успамінай лепш іншым часам мяне, а дзеля гэтага паглядзі, хто жыве ў 14-м, здаецца, пакоі з верандай (на першым паверсе) — там апошнім часам

заўсёды жыў я. Але заходзіць туды не заходзь — крый божа! Духу майго там усё роўна даўно няма, таму і сцены цябе могуць не прызнаць. Не заходзь, каб там нават жыў і настойліва запрашаў Міх[аіл] Навум[авіч] Герчык — чалавек прыкладны ва ўсіх адносінах і велькі працаўнік.

У Каралішчавічах, гэтым патрыярхальным месцейку, вядома, можна і жыць-пажываць, і працаваць, як, урэшце, у любым месцы, якое не паспела апрыкраць. Мне, напрыклад, не тое што апрыкрала, а звыклася, і адзінае, чым я займаўся ў апошні наезд, гэта шастанне па лесе, а занятак гэты я люблю. Нават калі не знаходзіў грыбоў, дык знаходзіў у якім-небудзь нечаканым месцы ўспамін пра тое-пра сёе — аж да бутэлек, якія закопвалі ў лісце з якім-небудзь Ігарам Дабралюбавым ці яшчэ з кім. Ох, даруй, не буду пра гэта!

Але, сказаць праўду, калі-нікалі працавалася — са смяшком душэўным з тых, хто гнаў кожны дзень «норму», з самога сябе, што рашыўся-заахвоціўся, і, дасць бог, якое-небудзь апавяданнейка дагоніш да канца.

Наогул жа, — не люблю я працаваць; вось абдумваць, бывае, падабаецца, бывае, што думаецца нішто, што як бы расхінаецца на момант далеч, нешта вабіць і зырчыць, — о, гэта харошыя хвіліны! Тут пастка, эйфарыя ці што і небяспека палюбіць гэты працэс «парення» больш за пакутлівае «рабочае» набліжэнне да яго: а інакш, без работы, як яго ўтрымаць? Утрымаць можна ў памяці (ці надоўга?) або на паперы. Апошняе — і цяжэй, і ўдзячней, ці не так?

Аповесцейку сваю я колькі разоў губіў тым, што, загарэўшыся ёю, ужо як бы адчуўшы цалкам, не садзіўся ў час за стол — і перагараў. Вось яшчэ чаму самадысцыпліна ў працы — усё ж вялікая рэч. І справа тут нават не ў тым, можа, каб кожны дзень, як сцвярджаюць каторыя, пісаць, — па-мойму, гэта лухта. Танк, напр[ыклад], кажуць, пракламуе: страляй і галку, і варону — мо і ў каршука ці арла патрапіш. Можа. Але качак і варон неабавязкова страляць «на паперы» і неабавязкова ўсенародна прад'яўляць справаздачу аб гэтай страляніне сваёй. Іншая справа — змарнаваць па-сапраўднаму творчую хвіліну

(а як ты да яе рыхтуешся — справа твая), тут ужо нешта падобна на злачынства перад сабой і на здраду сабе. У мяне, на жаль, многа такіх здрад. Справа, канечне, непадсудная, але, ведаеш, часамі бывае прыкра. Толькі хопіць пра гэта. Пра ўсё гэта мы мала што ведаем, бо ўсё, сапраўды, у руцэ і волі божай, і нават сказаўшы слова, «нам не дано предугадать...» і г. д.

Можа, адзінае, што вартае, — старацца жыць і рабіць так, каб патрохі «расла душа»[2]. Гэта словы, здаецца, Буніна, і сказаны яны, калі не памыляюся, пра Чэхава — пры ўсіх раўнівых па-свойму адносінах першага да другога. Карацей, варта дбаць пра «душу живу», і калі, скажам, слова памагае гэтаму — хвала слову. Праўда, і слова памагае не заўсёды, і слова можа быць (як і ўсё, што звязана з ім!) ворагам нашым, асабліва калі паверыш занадта ў сваю ўладу над ім. Крайні прыклад — графаманія. Вось яшчэ чаму я мала веру ў розныя афішкі накшталт «ні дня без радка»[3]. Можна сказаць і па-другому (другое), і вось М. Ушакоў сказаў нешта наконт маўчання-крызісу: «Чем продолжительней молчанье, тем удивительнее речь»[4] — паводле формы і энергіі Цютчаў — спачатку і зблытаць можна, палічыўшы за цытату з «Silentium![5]». Можа, гэта і сапраўды адтуль — генезісам, генетычна, так сказаць. Няхай усім гэтым займаецца Саша Яскевіч, ён любіць рознае шаманства, а мы будзем думаць пра ўсё гэта «па-хатняму», а за работу ўзяўшыся, калі не перахрысцімся на абразы, дык на пальцы паплюем.

Нагаварыў я табе многа, мо пара і канчаць.

А ўсяму віной — Каралішчавічы. Папраўдзе, мне дык нечага спакайней, што ты тут, недзе адносна блізка, а не лётаеш па замежжу ці яшчэ дзе. Дальбог, каб тваім мужам быў, прывучыў бы сядзець побач перад камінком і варушыць на подзе агонь ці вуголле. Гэта — зімой. А летам ты б у мяне ў агародзе да цыпак на нагах корпалася, я капаў бы міжкалгасны ці міжсаўгасны магістральны канал, а надвечар, сабраўшыся ў хату, мы выходзілі б пасядзець на ганак і мо лагодна гаварылі б пра нешта пад мяккае вечаровае шасценне кажановых крыл ці пад лугавое дорганне дзеркача, — калі іх яшчэ не атруцілі прадукцыяй Мазырскага нафтаперагоннага ці Салігорскага калійнага

[заводаў], тых мясцін, блізка якіх ёсць, дарэчы, установы, у якіх вучыцца правільным поглядам на жыццё наш брат. Я ў тым ліку, вядома. І заслугоўваю тую ідылію, пра якую табе пішу, а ты гэта ацані — калі не ідылію, дык мару маю. Зразумела?

Толькі цяпер вось скажу, што твая карацелька-пісьмо здалася мне чамусьці мілай, заклапочана-пахапліва-мілай, і я, канечне, удзячны табе, у тым ліку, і за прысланы «ЛіМ». Два *твае* вершыкі не сышліся чамусьці разам. Я засмуціўся спачатку быў, але, падумаўшы, суцешыўся тым, што ты іх ведаеш, а надрукаваць — надрукуецца ў свой час. Памылачак друк[аваных] трохі нарабілі, але без гэтага «ЛіМ» не быў бы ім: там бязбожна правяць аўтараў ці так «давяраюць» ім, што не вычытваюць здадзенага ў друк.

А я ніводнай рэцэнзійкі нават не напішу, мусіць, тут — не даходзяць рукі ды і часу няма. Можа, наастачу ўсё ж ірвану, дзеля ўласнага супакаення, хаця б і дзеля скасавання рэдакцыйнай запазычанасці. Праслаўлю, скажам, «комсомольчика» Пашкова[6]. Іншага выйсця няма, бо згаджацца ніхто за язык не цягнуў, а ўзяўшыся, трэба рабіць, каб не сарваць рэцэнзаванне кніжак у «ЛіМе» наогул. Бо тады буду я, сапраўды, як бы наўмыснік нейкі — і паспрабуй што растлумач. Вось яшчэ якія праблемы, але сама іх ведаеш, у маёй скуры, мусіць, была.

У «ЛіМе» неблагая рэц[энзія] на Гаўр[усёва]. Парадаваўся за яго. Ён варты разумнага і добрага слова. І справа, урэшце, не ў ім, а ў паэзіі сапраўднай: робім з розных G. ледзь не нац[ыянальных] Іванаў Франко ці Сімеонаў Полацкіх новых, а літаратару воляй боскай трэба радавацца, як манцы нябеснай, успаміну ўласнага прозвішчу ў друку. І тое, што хлопец малады пра яго напісаў[7], і тое, што не дзеля службовай нейкай выгады ці «ласкацельства», — даказвае, што зерне не заўсёды падае на камень, што напісанае, можа, і застаецца.

Адным словам, за Сцяп[ана] Зах[аравіча] я рады. Ён моцны чалавек, але і моцнаму трэба тады-сяды расслабіцца і перадыхнуць — «пусть благосклонная рука потреплет лавры старика»[8].

Ну, добра. Даражэнькая, ты таксама перадыхні: плюнь на рукапісы, адно мне колькі слоў напішы. А так — гуляй па

лесе, вершыкі мармычы, а то і без іх абыходзься — ці толькі тая праўда ў адных вершах?

Будзеш пісаць, не забудзь накрэсліць мне свае тэлефоны — і хатні, і службовы. Бо спатрэбяцца скора. Буду званіць з дарогі (тры разы плюнь! — я таксама). Ох, каб не сурочыць! Можа, у верасні.

Пішы. Беражы сябе. *Міхась.*

[1] У Каралішчавічах пад Мінскам знаходзіўся Дом творчасці пісьменнікаў.

[2] Словы І. Буніна пра А. Чэхава: «До самой смерти росла его душа» (нарыс «Пра Чэхава», 1901). Падобнае выказванне ёсць і ў вершы М. Гумілёва: «Памяць» (1921): «Чтоб душа старела и росла».

[3] «Ні дня без радка» — кніга біяграфічных замалёвак рускага празаіка Ю. Алешы, выйшла ў 1965 г.

[4] Радок з верша рускага паэта М. Ушакова «Віно» (1926).

[5] «Silentium!» — верш рускага паэта Ф. Цютчава.

[6] Г. Пашкоў у 1980 г. атрымаў прэмію Ленінскага камсамола Беларусі.

[7] Аўтарам згаданай рэцэнзіі быў Алесь Пісьмянкоў.

[8] Радкі з рамана ў вершах А. Пушкіна «Яўгеній Анегін» (1823–1831).

20. Але Сямёнавай

22 жніўня 1982 г.

Дзень добры, Ала!

Пошты ўчора, як заўсёды ў суботу, не было, а сёння прыйшло ад цябе аж два пісьмы. Чытаю і перачытваю іх у бібліятэцы — пад нуднае чваканне і пялёхканне дажджу за акном, а перад вачмі — твае Каралішчавічы, на якія міжволі пераношу і тутэйшую непагадзь: не вельмі ўтульна, мабыць, там і табе.

Уяўляю «нубійскую конніцу»[1], якую дождж загнаў пад дах, да тэлевізара і транзістараў — во дзе калоцяцца сцены! Памятаю гэта па і тых жа Каралішчавічах у канікулярны час, калі мае ўласныя дзеткі, увогуле слухмяныя, выраблялі там бог ведае што, каб не адстаць, вядома, ад іншых. Цяпер у тых дзетак

свае дзеткі, а бацька адлучаны ад бацькоўскіх ды дзедаўскіх клопатаў і, сучасны чалавек, можа, і не надта перажывае з-за гэтага. Пазбавілі нейкай там выхаваўчай ролі? Дык выхавацеляў у нас і так даволі. Куды ні кінь вокам, усюды Песталоцы то з пернікам, то з дубінай і, дальбог, чалавеку сама пара хавацца ад іх, што ён і робіць, пачынаючы са школы, — спачатку ў славутай «падваротні», а, пасталеўшы, і за тымі варотамі, што надзейна акантаваны казённым арнаментам. І там ужо яго справа думаць ці не думаць пра добрыя намеры выхаваўцаў і пра тое, «что под жизнью беспутной и путной разумели людские умы».

Даражэнькая, нешта робіцца з «ячэйкамі» нашымі. У дзяцей няма бацькоў, бацькі ходзяць нейкімі навейшымі каралямі Лірамі[2], і выходзіць, што сапраўды ворагі чалавеку «сямейнікі» ягоныя, што наогул жыве ён не ў сям'і, дзе ў падпечку дома тоіцца старэнькі, трапятлівы, з дзіцячым мудрым сэрцам дамавік, і кватаруе на «съезжей» — з клапамі, з «околоточным», з прыбіральшчыцай Дунькай, якая зранку крычыць не дакрычыцца, каб пусцілі яе ў нейкую Еўропу[3] — ці не затым, каб адукаваць тамтэйшых наконт нейкага раўнапраўя? Бо розныя Аўроры Дзюдэван[4] даволі слаба дзейнічалі па гэтай частцы, і сказаць ім дзякуй можна хіба за моду на мужчынскія штаны — гэтую ваяўнічую мімікрыю чаму не ацаніць? Даражэнькая, даруй, не фемінафобства гэта, а проста нешта накшталт раздражнення з выпадку таго, якія часам пачварныя формы набывае «жаночае пытанне», узведзенае неразумнымі людзьмі ў неразумны ранг — так, што, урэшце, найбольш церпіць ад гэтага і сама жанчына, і «ячэйка» нейкая, і псіхалагічны тонус грамадства.

Кажу гэта не як «пацярпеўшы»: проста такі-сякі ўласны вопыт прымусіў паглядзець на каторыя праблемы, як ні дзіўна, не па-суб'ектывісцку, суб'ектыўная псіхалогія мне ўсё ж павінна быць бліжэй, паводле майго занятку. Памятаеш, у «Фаўсце»? «Мне нечего сказать о солнце и звездах — я вижу на земле страданье человека»[5]? Я пісаў табе, здаецца, ужо неяк пра гэта.

У мяне тут было не тое каб даволі часу (яго забіраў распарадак і розная звязаная з ім нікчэмнасць і лухта), даволі ўсё ж, каб па-

разважаць над тым, над гэтым. Той час, што фільтраваўся з гэтай нікчэмнасці і лухты, проста шкада было аддаваць дробязям свайго «я», тут, можа, было і падсвядомае жаданне нейкай кампенсацыі вымушанага марнатраўства — падсвядомы разлік.

Ведаеш, я зразумеў, што адзінота не так і згубная ў маім узросце. Цяпер я ведаю гэта, тым больш, што яна звыклай была для мяне і раней, бо твой пакорлівы слуга пазбаўлены так званах талентаў «общительности» і трошкі «загартаваны» ў гэтым сэнсе. Мой «экзістэнцыялізм» памагаў мне.

Нешта загаварыўся я і «воспарил». Не буду.

Давай пра што іншае.

У Пальміры розныя я без цябе не паеду. Вось што мушу табе сказаць. Сёлета ўсё роўна позна. Гэта вучыцца толькі ніколі не позна, як, дарэчы, мондра разважалі тыя «соревнователи просвещения», якія дбаюць пра твой надзённы і духоўны правіянт. Вучыся і адпавядай пасадзе. Хлеб апраўдваць трэба, і вялікім пачынанням спрыяць трэба таксама.

Пра Скрыгана скажу, што гэта ў яго «пункцік» — з імёнамі мудраваць. Сам ён то Янка, то Ян (а жонка, здаецца, заве *Янчыкам*) то ён Ів[ана] Сіпак[ова] падаб'е Янкам звацца, то Цвірку закапыліць нос на манер Гадзіцкага нейкага[6], то мяне Міхалем хрысціў, а на благі выпадак — Міхалам — слухай толькі яго! А ты завіся ўжо лепей Алінай, калі хочаш, а я табе нагадаю пушкінскі вершык:

Алина, сжальтесь надо мною!
Не смею требовать любви:
Быть может, за грехи мои,
Мой ангел, я любви не стою[7],

Ну и т. д.

Макарэвічу не звані. Навошта яму вершы друкаваныя? Я пасылаў яму «лімаўскія», думаючы, што паспее да публікацыі пракруціць[8], дадаўшы, можа, што з таго, што змарнавалі мінулы раз. (З «палымянскіх» — памятаеш?) Ён змоўчаў. З гэтым народам ні ў лазні парыцца, ні ў мінскім метро (дарэчы, што яно?) на «чарніла» прасіць. Цьфу! — прабач!

Бывай. Пішы хутчэй. А часу — часу яшчэ хапае. Я ў верасні яшчэ буду тут, мусіць, сядзець.

Міхась.

[1] Ваяўнічае племя нубійцаў жыло на берагах Ніла і здзяйсняла частыя і імклівыя набегі на Егіпет; славіліся таксама нубійскія лучнікі.

[2] Кароль Лір — герой аднайменнай п'есы У. Шэкспіра.

[3] «Пусціце Дуньку ў Еўропу» — цытата з п'есы «Любоў Яравая» (1926) рускага пісьменніка К. Трэнева. Азначала іранічныя адносіны да чыйгосьці захаплення жыццём ў замежных краінах.

[4] Аўрора Дзюдзеван — сапраўднае імя французскай пісьменніцы Жорж Санд.

[5] Дакладная цытата з трагедыі Ё. В. Гётэ «Фаўст»: «Мне нечегог сказать о солнце и звездах, / я вижу лишь одни мученья человека» (пер. М. Халадкоўскага).

[6] Пісьменнік К. Цвірка часам выкарыстоўваў псеўданім Цвірка-Гадыцкі.

[7] Цытата з верша А. Пушкіна «Прызнанне» (1826).

[8] Паэт В. Макарэвіч працаваў у літаратурнай рэдакцыі Беларускага радыё.

21. Але Сямёнавай

2 верасня 1982 г.

Дарагая Ала!

Я, можа, і сапраўды *дабіваю* недзе апошнія свае дні тут (не падумай, што я крыўляю якого-небудзь Хаіма ці Шлёмку). Як хочаш: наогул, дабіваю, дабываю, але каб сапраўды так.

Пісьмы твае я атрымаў усё ж, неўзабаве пасля пісьма Веранікі[1]. А вось ці атрымала ты мае? Я там табе агаворваў ролю нейкай бадай што патранэсы, настаўніцы моладзі і г. д., але вось ты пішаш, што размова ваша тэлефонная была паспешлівай, няўцямнай, ці што. Усё ж Вераніка мне напісала, што голас у А. І. *прыемны і малады* — ты гэта адзнач. Гаворыць усё ж, заўважай, жанчына. Нешта ды значыць.

Напісала мне яшчэ ледзь не трактат наконт пасрэдніцтва, неўмяшання і г. д. Як табе гэта падабаецца? Мне, бадай што, спадабалася. Гэта добра, калі малыя прынсіпы свае заяўляюць.

Калі ўсё ж табе пазвоніць яшчэ (а я хацеў бы), прынаравіся неяк не на хапок пагаварыць: яна летам была ў тваёй любімай (чаму?) Рызе — паахайце адна перад адной з выпадку тамтэйшых дзівосаў розных. Вы, жанчыны, гэта ўмееце.

Навін у мяне ніякіх. Бібліятэку, лічы, перабралі[2], — на тым справа і стаіць. Трэба акты, спісанне і г. д., а мае рэвізоры каторы дзень не паказваюцца. Сягодня сыбота, заўтра нядзеля, а што ў панядзелак — невядома.

Думаў я трапіць да вас пасля 7-га [кастрычніка], ды, мусіць, не. Каб хоць у сярэдзіне месяца. І то б нічога.

Як сустрэнемся? Ты мне столькі, яшчэ больш, чым Ніка, «маралаў» начытала (за ўвесь час), можа, не «маралаў», а блакаду нейкую павяла, пэўна — можа, столькі напамахвала перада мной і амаль незаўважна, як харошая дрэсіроўшчыца, смирительным стэком, што старыя рэфлексы мае затармазіліся, новыя — не выпрацаваліся, і я стаю перад фактам разбурэння асобы, як яна ёсць. Вось што ты нарабіла!

Узваж, узваж усё гэта, даражэнькая, і перамянні гняўлівасць і жорсткасць на літасць.

Ну, але тым часам чакаю тваіх лістоў пакуль, пішы — не лянуйся.

Скажу табе што-небудзь харошае ў другім лісце, калі твой, праўда, не будзе надта сіберным.

Бывай пакуль.

Міхась.

[1] Вераніка — дачка М. Стральцова.

[2] У лячэбна-працоўным прафілакторыі М. Стральцоў загадваў бібліятэкай.

22. Але Сямёнавай

27 верасня 1982 г.

Добры дзень, дарагая!

Гэта, як уздых, — трохі стомлены, трохі безнадзейны, трохі з надзеяй на палёгку. «Даражэнькая» і «дарагая» — адчуваеш розніцу? Адчуўшы, адчуеш і мой настрой. Ну іх к Богу, нашыя праблемы і нашыя клопаты, наша свядомае ці міжвольнае хітраванне з самім сабой! Бо як падумаю, што чалавеку ў гэтым жыцці, па сутнасці, так мала трэба і што гэтае «малое» з такімі вялікімі пачаткамі (Дастаеўскі неяк прагаварыўся, што гэтае «малое», «простае», можа, настолькі сапраўды простае і малое, што чалавеку ў яго немагчыма паверыць), бо калі падумаеш так, сапраўды робіцца не па сабе і ад усялякіх нашых слоў, і ад нашых зважанняў на чужыя ці свае акалічнасці, і ад апраўдання гэтых нашых зважанняў — і тады нейкі лісток «засохший, безуханный»[1] гаворыць нашаму розуму і пачуццю больш, чым усе нашыя акалічнасці. Ты добра зрабіла, што прыслала мне тэты лісток, запытаўшы тым часам, ці не пакрыўдаваў і г. д.

Пакрыўдаваў-такі, мусіць, *даражэнькая* (вось тут яно на месцы), і гэта ты, можа, адчуеш з майго трохі бурклівага пісьма, не гэтага. Адчуй і будзь са мной трохі шчырэйшай. Крый мяне Божа папракаць цябе ў няшчырасці наогул! Мне проста здаецца, што ты ў нечым шадишь мяне ці аберагаеш, а ў чым, зразумець не магу, — і ў гэтым недагаворанасць нейкая. Мо мне і здаецца. Вось пабачу цябе на ўласныя вочы, пачую твой голас — і зразумею, можа, у чым тут справа і сакрэт.

Не памятаю, ці пісаў табе (а больш, здаецца, каму?), што мая малодшая дарослая дачка пачала мне пісаць апошнім часам і нават прыслала свае вершы. Што яна піша, я ведаў і раней, а тут пабачыў на ўласныя вочы. Здаецца, нешта ёсць (кажу гэта аб'ектыўна). Але больш мяне суцяшае яе сур'ёз, неблагая філалагічная адукацыя, наогул, па-мойму, даволі мізэрная ў наш час у дзяўчатак (і не толькі) яе ўзросту. Я напісаў «адукацыя», а трэба было — пісьменнасць: адчуванне стылю, што мне асабліва даспадобы. Я гэта ўсё да таго, што хацеў бы, каб ты

неяк пазнаёмілася з ёй і ўзялася кіраваць хоць збольшага юнай душой: я гэта не ўмею ды і баюся адчужэння пэўнага — у жанчын узаемапаразуменне, можа, прасцей. Я прасіў Вераніку пазваніць табе (даруй, што без твайго дазволу, бо, дарэчы, прасіў даведацца, чаму вашэці маўчыць), прасіў, а званіла яна ці не, не ведаю, бо ты нічога не пішаш, а яна не адпісала пакуль.

Прыгарні, калі пазвоніць, да сябе дзіцё: мне, дальбог, хочацца, каб нехта меў на яе харошы жаночы ўплыў — інтэлектуальны і псіхалагічны.

Што ты думаеш пра ўсё гэта, напішы, але ведай, што мне хочацца настойваць на сваім хаценні.

Вершы «дитё» піша чамусьці па-руску, а варта было б скіраваць на што іншае, тым больш, што і вучыцца ў універсітэце на бел[арускім] аддзяленні. Вядома, я скажу пра ўсё гэта ёй і сам, толькі не ў лісце, можа, і не адразу. Не адразу, бо хачу, пабачыўшы пасля году адсутнасці, уцяміць, што і як. А ты зачапі яе як-небудзь цяпер — зразумей толькі мяне правільна: я, можа, бянтэжуся трохі сваёй ролі і таму прашу ў цябе дапамогі, але не толькі таму. Галоўнае — у маёй упэўненасці, што твой уплыў можа быць найбольш дзейсным. Ты, можа, пасмяешся з маіх гэтых стараннyў; але ж мне ў глыбіні душы ўсё ж нешта лесціць, што ў малой прысутнічае-такі філалагічная жылка і што яна можа аслабнуць без пэўнай увагі, бо вучыцца малая на вячэрнім (а мо цяпер і завочным?) аддзял[енні], а дзе там літаратурнае асяроддзе і г. д.?

Пра маю ўяўную чытацкую дасведчанасць ты, здаецца, трохі перамяніла думку, бо сапраўды — якое тут у мяне было чытанне? Канечне, я не чытаў тут, як не чытаю наогул, розную выпадковасць, лухту. Тое-сёе цікавае для сябе я і тут прачытаў, але вось навінкі?! А навінкі ўсе ў цябе, ды яшчэ вунь якія! Якраз усё тое, што трэба мне. Я чытаў з таго, што ты згадваеш, толькі Гесэ — і «Воўка», і «Гульню ў бісер»[2].

Фільмы, вядома, не бачыў. «Амаркорд»[3] асабліва хацеў бы паглядзець. Феліні чамусьці мой любімы рэжысёр. «Хрысціянскі» пачатак у ім цаню, адсутнасць бяздумнай жорсткасці і чалавечнасць і адухоўленасць сімволікі. Наіў, можа, пры гэтым. Наогул

наіў у мастацтве люблю — гэта нешта накшталт супермастацтва, ці што.

Але — даволі. Бібліятэку я перадаю, але — марудна, ты пакуль мне пішы. Зразумела? Калі прыйдзе час «закругляцца» — вестку падам.

Не журыся, а я буду думаць пра сустрэчу.

Міхась.

[1] М. Стральцоў спасылаецца на верш А. Пушкіна «Кветка», які пачынаецца радкамі: «Цветок засохший, безуханный, / забытый в книге вижу я».

[2] «Стэпавы воўк», «Гульня ў бісер» — раманы нямецкага пісьменніка Германа Гесэ.

[3] «Амаркорд» — адзін з самых вядомых фільмаў італьянскага рэжысёра Федэрыка Феліні, зняты ў 1973 г.

23. Але Сямёнавай

11 кастрычніка 1982 г.

Дзень добры, Ала!

Можа здарыцца так, што пісьмо гэта сам даганю ў Менску. Але — пішу «с той горькой радостью» і т. д. Бацюхны-светы! Больш за год прайшло, адмалацілася, адгрукалася — і года, папраўдзе, не так шкада, як таго, што час упушчаны не для пісаніны нават (Бог з ёй!), а для вырашэння спраў жыццёвых і неадкладных. Вось выйду, а сам у цянётах большых і шчыльнейшых, чым быў раней. Вось што раз'юшвае! О багі!

Пазваню табе з дарогі, калі надарыцца, пакуль жа — і сумна, і няпэўна ў мяне на душы, і адчуванне, што воля як быццам і не радуе, што быццам нечага і шкада — няволі? Кветкі мае тут завялі ўсе (незнарок як у Рубцова выйшла: «Алые цветы мои в садике завяли все»[1]) — наогул, сіратлівасць і пустэча. У каго гэта яшчэ... «Мокнет, осыпается весь мой бедный сад, листья пожелтевшие по ветру летят»[2]? Але гэта так, дзеля мінору, можа, прафілактычнага — журба. Будзем лічыць, што журба — пачуццё здаровае.

Каб у цябе хоць усё добра было! Матухна. Малю некага і малюся! Мысленна не на вежах Гедымінавых нават, не на ірвах наваградскіх, а на кручы маёй надсожаўскай — на паляпшэнне лёсаў чалавечых, а не на злом галавы! Быць таму! І — аман!

А так — клопату таго, што R. будуць хадзіць у майстрах нароўні з якімі італійскімі ці фряжскими[3]. У нас усе майстры [...]. Ну іх! Я радуюся, што ў мяне хоць зайздрасці чорнай няма. Я — аматар ад пісьменства прыгожага. І даволі.

Бывай мо да сустрэчы.

Міхась.

[1] Недакладная цытата з верша М. Рубцова «В горнице» (1965); трэба: «Красные цветы мои...»

[2] Радкі з верша рускага паэта А. К. Талстога «Восень» (1858).

[3] Маецца на ўвазе г. зв. фражская школа іканапісу, якая з'явілася ў Расійскай імперыі пад уплывам заходнееўрапейскіх майстроў.

24. Але Сямёнавай

14 кастрычніка 1982 г.

Дзень добры, Ала!

Я дарэмна абнадзейваў цябе, думаючы, што траплю ў Менск 12-га. Гэтага не здарылася, бо не сабраўся высокі суд. Не хачу зноў лунаць во облацех, але спадзяюся на 19–20-га. Калі так, адказаць мне ўсё роўна не паспееш. Таму развітваюся да сустрэчы.

Пішу таму, што не хачу, каб ты нервавалася дарэмна: можа, не праз мяне наогул, а праз маю нягжэчнасць, нядбайнасць аб прыстойнасці — хаця б у тым, што датычыць перапіскі.

На сконе свайго тутэйшага жыцця я чамусьці стаў спакойны, як трансфарматарная будка. Ох, не к дабру гэта, мусіць. Паглядзім.

Пакуль бывай. Як сустрэнемся?

Міхась.

25. Але Сямёнавай

22 кастрычніка 1982 г.

Дарагая Ала!

Увёў, увёў я сябе і цябе ў зман дачасна і міжволі! Заела мой лёс, як патрон у казённіку — ні стрэліць, ні назад падаць. Адно добра — бібліятэку я перадаў і ўздыхнуў з найвялікшай палёгкай. Камісіі прайшоў. Чакаю суда. А суддзі то хварэюць, ці з чужымі бабамі, паводле Чэхава, недзе ў фінскай лазні начуюць. Можа, і не так. Кажуць, усё ж хварэюць. А я хварэю на нудоту, на халодную злосць, на боязь асенне-зімовай слаты і прымаразкаў — і душа асенняя, падшэрхлая і ачарсцвелая. Пахукай мо на яе, га?

Можа, у аўторак, 26-га, можа, не.

Як і абяцаў, пазваню ці з дарогі, ці адразу, прыехаўшы.

Так хочацца цябе пабачыць. Бывай. З табою мае малітвы.

Міхась.

P. S. Два дні, як пацяплела. Цёпла і пахмурна. Падгнілай лістотай хораша пахне, раніцай зямля пацее — апошняя задуха перад зімой. Сініцы ганяюцца па дрэвах адна за адной і неяк па-сарочы чачэкаюць. *М. С.*

26. Ніне Шкляравай

31 мая 1984 г.

Дарагая Ніна!

Заўтра я з Карамазавым на колькі дзён еду на Магілёўшчыну — божа, праз восем год, калі быў там апошні раз! Боязна. Баюся сустрэч, найболей — дома. Адносіны з бацькамі чамусьці заўсёды былі даволі складаныя, бо заўсёды ўточвалі свае «тры капейкі» то жонкі, то сёстры, а я лічыў нявартым нешта высвятляць, тлумачыць, каяцца ці абурацца. Як яно будзе?

А дамоў хочацца. І так хочацца пісаць гэтае «дамоў» без двукосся, бо што ні кажы, дом у нас адзін, той, што ля калыскі.

Туды б, урэшце, і прывалакчыся варта ў недзе наканованую нам апошнюю часіну, на той парог, на які бог уссадзіў: няхай бы і прымаў ужо адтуль.

Міноры не міноры, проста, мусіць, узрост, а калі праўду, дык і «насалодаў», як кажа Караткевіч, у жыцці дарослым наўрад ці назбіралася болей за тыя, якімі надарае нас любое, нават самае беднае і журботнае, дзяцінства. Талстой нават казаў, што 97 % дарослага чалавека ў дзяцінстве. Гэта Ясеніны плачуць па «расстраченной свежести»[1] — мо таму, што не паспелі быць дарослымі.

З табой мы не пагаварылі. Ці не таму, што ты не дарасла яшчэ да дзяцінства, твае 15 табе ўсё яшчэ торкаюць пад бок. Супыніся, дзяўчо! Адчуй у сабе мадонну (матрону?), спаважную і памякчэлую сэрцам! Мір на душу тваю!

Мяне ты, ведаю, не ўспамінаеш, але, бач, пішу. Ты не адкажаш, таму і не кажу, што пісаць трэба на рэдакцыю.

З Магілёўшчыны, аднак, буду глядзець у бок Гомеля. Чалом!

Кудравец падпісаў у друк *чатыры* Кіеневых вершы (№ 9)[2]. Павіншуй.

Ад цябе вершаў я не дачакаюся мо. Бывай.

P. S. Божа, што ў цябе за звычка развітвацца: унурыцца і нават не азірацца! Я ўсё яшчэ гляджу табе ўслед. Азірніся! *М. С.*

[1] М. Стральцоў спасылаецца на верш С. Ясеніна «Не жалею, не зову, не плачу...» (1921).

[2] А. Кудравец на той час займаў пасаду галоўнага рэдактара часопіса «Нёман», дзе М. Стральцоў працаваў у аддзеле крытыкі.

27. Ніне Шкляравай

[Без даты]

Дарагая Ніна!

Рады віншаваць цябе і з Новым годам, і з Калядамі, і з поспехамі ў творчасці, і ў варажбе. (Сам я збіраюся выварожыць табе жаніха.) Жадаю шчаслівых сноў і вясёлага ад іх абуджэння,

заклінаю не верыць ні ў бога, ні ў малітвы, а верыць адно ў чарцей і чараўніц: кажу гэта табе як чалавек, які ведае, што без зла не бывае дабра. Салют!

Міхась.

28. Валянціну Аскоцкаму

27 декабря 1984 г.

Дорогой Валентин!

Пытался тебе звонить несколько раз: то не получалось, то не заставал дома. Просил и Славу Иващенко найти тебя. Старик, отзовись. Хоть я и ленив по части эпистолярной, но, право, я очень ценю твою дружбу и всегда теплею от мысли, что где-то есть человек, который в хорошую минуту вспомнит о тебе с родственным чувством душевного внимания.

Я год уже как в «Немане», в отделе критики, где недавно посадили меня на полный правёж (Бубнов стал у Кудравца замом). Всё это пустяки, конечно, но меня пока утешает некий дух порядочности, который ещё не выветрился из неманских редакционных кабинетов — не в пример «Полымю» и пр.

Сам пишу мало, привожу в порядок прежние пустяки. Выходит новая книжка стишков, собрался и сборник *эссеев* (как говорил покойный Короткевич), и прочих мелочей. Проза всё отдаляется и отдаляется: мне кажется, что я безнадёжно отстал от жизни, потерял внутреннюю тему, закрыт для впечатлений бытия. Надо что-то делать, а что? Что делаешь ты? Читал тебя в «Литературном обозрении». Что у тебя ещё?

Да, братец, а Чигринова-то ты должен мне. Юбилей был в этом месяце, но поскольку ты статью к сроку не представил, обошлись редакционным приветствием юбиляру и перенесли твою публикацию на № 5. К числу 23 января *надо обязательно* прислать. Напиши «взгляд и нечто» на трилогию, на Чигринова в любом жанре — до листа. Хочешь — и больше. Воля твоя.

Ах, старик, хочется встретиться и поговорить. Столько ветров прошумело над головой! Но хоть напиши пока.

Жизнь литературная растеклась по каким-то щелям. Дружб мало, отношений тоже — все хитрят, подличают, заключают временные союзы.

Иногда вижусь с Брылём, Адамовичем, Бородулиным. От прочих далёк. Быкова давно не понимаю, и чуждо в нём всё мне.

Привык к одиночеству, и панцирь его не в тягость будто. Плохо, видать, это. Но ничего.

Обнимаю тебя. С Новым годом поздравляю. Подними за меня чару. Я за тебя осушу бокал минералки, колюче холодный, искристо-матовый, немножко печальный, как звон снежинок в зимнем бору. И лоб будет покалывать холодок, а в сердце будет тёплое, доброе чувство.

Будь здоров. Твой *Михась.*

Мне звонить можно так: 33–41–88 (редакция, с 14.00); 54–45–34 (дом.)

29. Пятру Кошалю

19 мая 1985 г.

Уважаемый Пётр Агеевич!

Сейчас, когда я заново пересмотрел состав книжки[1], а заодно и замечания Ваши, уже после сделанных переводчиками поправок, я воспринял эти замечания гораздо спокойнее, чем тогда, когда прочитал их впервой. Не скрою, тогда я был несколько обескуражен, хоть и утешало Ваше желание идти автору навстречу и видеть его книжку изданной у вас. Теперь я искренне благодарен Вам, ибо во многом Вы были правы.

Я подключил к переводам Ф. Ефимова, зная его как добросовестного литератора и переводчика, лишённого авторских амбиций (чрезмерных, разумеется). В полном смысле слова я работал с ним. Мне кажется, эти переводы удовлетворят Вас.

Ещё. Я включил некоторые ранее сделанныя переводы В. Спринчана. Ими я производил кое-где и замену переводов Н. Кислика и В. Тараса. Вы увидите.

Включил я и несколько переводов В. Казакевича (публ. в «Литер. газете»). Они мне нравятся.

В некоторых случаях я даю две переводческие версии в надежде, что выбор варианта Вы оставите за собой.

Ещё раз благодарю Вас. Напишите или позвините. Буду звонить и сам.

Окончательный порядок расположения стихов в рукописи оставляю на Ваше усмотрение. Вот почему я не сделал в конце рукописи реестрика (содержания). Но расположением стихов я занимался, должен сказать, серьёзно, стараясь выдержать некий музыкально-композиционный принцип, оркестровать сборник. Впрочем, на Ваше усмотрение.

Итак, благословясь — *М. Стрельцов*.

[1] Гаворка пра кнігу М. Стральцова «Свет мой ясный», якая выйшла ў 1985 г. у маскоўскім выдавецтве «Советский писатель».

30. Валянціну Аскоцкаму

[Декабрь 1985 г.]

Дорогой Валентин!

Давно уже меня грызёт некий червь из-за того, что мы потеряли друг друга. Не будем выяснять, как и почему: примиримся на том, что оба хуже, будем — лучше. Откликнись, старик!

Я тебя встречаю довольно часто в журналах, радуюсь, вспоминаю, даже не обижаюсь, что ты не написал для «Немана» про нашего лукавого друга Чигринова. Юбилей его мы отметили (в журнале) портретом под Леонова, редакционным словом, пообещав позже прославить по самой высокой мерке. Если забудем, сам напомнит.

У меня в типографии две книжки (стихи и критика)[1], но первая болтается там уже около двух лет (вздумали как-то по-особенному оформлять), а вторая печатается после первой корректуры. Пришлю прежде стишки.

Поздравляю с Новым годом!

М. Стрельцов.

[1] Маюцца на ўвазе кнігі «Мой свеце ясны» і «Пячатка майстра» — абедзве выйшлі ў 1986 г.

31. Валянціну Аскоцкаму

20 марта 1986 г.

Дорогой Валентин!

Рад представить тебе корректуру — предстать с нею перад тобой в обличье редактора (благодарного) и друга (нелукавого). Читай, не задерживай, присылай обратно.

Жду к концу месяца первые экземпляры своей новой стихотворной книжки, которая пролежала в типографии около двух лет. Не удивляйся: чёрт дернул согласиться на *улучшенное* оформление — и вот награда. Критическая книжка выйдет в этом же году. Она для меня пока *роднее* почему-то. Вот и похвастался своими литновостями.

Напиши колькі слоў. Обнимаю тебя.

Твой *Міхась*.

32. Валянціну Аскоцкаму

[Без даты]

Дорогой старик!

Извини меня, недотёпу, за всяческие промедления: виноват.

Поздравляю твою семью с Новым годом. Будь здоров и счастлив.

Твои *Михась* и *Лена*.

«ТЫ — САМАЯ ДАЛІКАТНАЯ ДУША Ў ГЭТЫМ ЧЭРСТВЫМ СВЕЦЕ...»
Лісты Міхасю Стральцову

1. Павел Кабзарэўскі — Міхасю Стральцову

9 декабря 1968 г. Ленинград

Дорогой Михаил Леонтьевич!

Простите, пожалуйста, что с таким непростительным опозданием посылаю Вам перевод вашего «От Максима Книжника начало»[1]. Ваша интересная, очень интересная работа о моём любимом поэте меня очень увлекла, но я, к сожалению, неожиданно захворал и, не желая больше затягивать завершения работы над переводом, попросил помочь мне моего друга и неоднократного соавтора по переводам ленинградского писателя А. Белова.

Когда Вы прочитаете перевод и авторизуете его, прошу от моего имени передать его редакции «Немана», как и договорились, для 3-го номера.

Если у Вас будут существенные замечания по переводу, пожалуйста, сообщите мне, мы всё, что Вы посчитаете нужным, выправим.

Перевод цитаты на странице 68 нашей рукописи пришлю Вам через несколько дней, как только начну работать.

Надеюсь, что новую Вашу книгу я переведу один и с таким же большим интересом, с каким я переводил «Максима Книжника».

Очень жду Вашего письма. Желаю Вам всего доброго. Дружески всегда Ваш — *П. Кобзаревский*.

[1] Гаворка пра эсэ, якое пазней атрымала назву «Загадка Багдановіча».

2. Марыя Стральцова — Міхасю Стральцову

19 марта [1972 г.]

Здравствуй, мой дорогой сын Миша!

Ты, наверное, и не ждёшь от меня письма, но зато я жду от тебя неустанно[1].

Поздравление твоё з спраздником 8 марта я получила. Сердечно благодарю тебе, сынок. Как твоя поясница?

Всё я тебе прощаю и простила, вот только не могу просить за одно — за то, что ты продолжаешь беспорядочно тратить здоровье, т. е. ты продолжаешь пить. Вот это, сынок, не очень приятно.

Твои нервы совсем сдают. Ты несдержанно сябя ведёшь, а это очень некрасиво и ничтожно. А главное, гробишь своё здоровье без оглядки. Радикулит — это нервная болезнь, и он тебя скрючит совсем, если ты не бросишь выпивать.

Приезжай домой из Минска, поживи дома, полечись деревенским воздухом, попей молока. В больницу ты не хочешь, то нужно находить другой выход из такого кошмарного положения.

Да надо и самому себя и нервы взять в руки. Не раздражай свои нервы водкой. Без водки ещё ни один не умер, а вот от водки-то и умирают. Если ты от всей души дорожишь мать, то ты непременно послушаешь меня. Ну, об этом пока хватит.

В январе месяце 14 числа умер Антон. Переношу тяжёлую скорбь по брату. Жена его присылала телеграмму, как он умер, на моё имя. Надо было съездить, провести его в последний путь, но вот беда, что я не могу доехать никуда, если бы ближе хотя бы. Так нихто и не ездил. Я написала письмо жене и детям Антоши, что не смогла приехать. Очень обидно и тяжело, что нихто не был на похоронах. Пусть уже отдыхает и не обижается на меня. Он был всегда добр ко мне. Поэтому тяжела утрата его. Умер он от диабетической комы.

Ну вот, письмо моё подходит к концу. Крепко целую тебя. Пиши. Жду. Твоя мать *М. Стрельцова*.

[1] Марыя Міхайлаўна Стральцова (з Кузьміцкіх) — маці М. Стральцова.

3. Еўдакія Лось — Міхасю Стральцову

26 ліпеня 1973 г.

Дарагі Міхась!

Сардэчна віншую цябе, прызнанага празаіка і крытыка, з выхадам у свет першай кніжкі вершаў[1]! Аж зайздросна: ты — малады паэт! Спрабуй, вярніся ў маладосць!..

Чытаю і за радкамі бачу цябе, чую цікавы мужчынскі голас. Пазнаю чалавека, мужчыну — *страдающего*, у добрым разуменні гэтага слова. Гутару з асобай тонкай, узнёслай. Цікавы твой стыль, чыстыя вобразы. Канешне, ты бачыш, дзе «ляжыць» паэзія... І значыць — ты такі. Пакуль што. У паэзіі. (Дарэчы, мне падабаецца рыцарская адданасць першаму твайму жанру. А зрэшты, і ў першым ты едзеш звычайна і на Расінанце[2], і на Пегасе!)

Але я спадзяюся, што з гадамі ты «разгонішся», пазначнееш, перажывеш і выкажаш у радках нешта па-грамадзянску большае. Сугучнае гэтаму вялікаму часу. Інтым уступіць месца матывам больш важкім... Ды ты, я думаю, і сам гэта разумееш. Таму прабач за заўвагу. Я не пішу рэцэнзію, а толькі гэты сяброўскі ліст. Бо падумала, як забываем мы гаварыць адзін аднаму добрыя словы. (Дзякуй богу, гэта не тычыцца нашых з табой адносін!) Сама чытаю прыязныя артыкулы таго ж Гамолкі, таго ж нашага слаўнага Пысіна — і выціраю слёзы...

Будзем трымацца! Хай жыве паэзія, хай жывуць сябры. Шчыра — *Еўдакія Лось.*

[1] Маецца на ўвазе кніга «Ядлоўцавы куст» (1973).

[2] Расінант — конь Дон Кіхота, сярэднявечнага рыцара, героя аднайменнага рамана іспанскага пісьменніка Сервантэса.

4. Сяргей Баруздзін — Міхасю Стральцову

5 марта 1974 г.

Дорогой Михась Леонтьевич!

Спасибо Вам за хорошее письмо, за книги! А с выходом «Куста можжевельника» поздравляю особо: первая Ваша поэтическая книга!

Так что теперь в «ДН»[1] мы вправе видеть Вас в трёх измерениях. Ждём новый рассказ, который Вы пишете. Ждём стихи. Ждём критику. В общем — ждём! Хорошо?

Всего Вас самого доброго и хорошего! Добрый поклон всем белорусским друзьям и знакомым!

Искренне Ваш — С. Баруздин.

[1] Сяргей Баруздзін быў галоўным рэдактарам маскоўскага часопіса «Дружба народов».

5. Мікола Федзюковіч — Міхасю Стральцову

4 лютага 1975 г.

Дарагі Міхась, добры дзень!

Пішу табе з вёскі, дзён дваццаць ужо сяджу тут. Ты, відаць, ведаеш што з «Чырвонкі»[1] я пайшоў і добра зрабіў, а то зусім здзічэў бы. Тут мне добра, ніякіх клопатаў, ніхто не замінае — адна матка, вершы ідуць — як арэхі. Якой спеласці гэтыя арэхі — не мне судзіць...

9 лютага (нядзеля) буду ўжо ў Мінску. Калі ты не надта заняты, калі да 9-га атрымаеш гэты ліст, пазвані мне: 66–19–80. Лепш адразу ў нядзелю. Здарыцца, што пазней — калі ласка, увогуле ж, трэба сустрэцца.

Купіў у Драгічыне тваё выбранае[2], перачытаў — яшчэ раз атрымаў задавальненне.

Ну, цісну руку. Добрага табе здароўя! *Мікола.*

[1] Гаворка пра газету «Чырвоная змена».

[2] Маецца на ўвазе кніга выбранай прозы «На ўспамін аб радасці» (1974).

6. Янка Сіпакоў — Міхасю Стральцову

12 мая 1975 г.

Дарагі Міхась!

Зайдзі, калі ласка, да нас у «Маладосць» і прачытай карэктуру твайго цудоўнага артыкула пра Гарэцкага[1], якім усё яшчэ захапляюцца ўсе твае сябры.

З любоўю — *Янка Сіпакоў.*

[1] Эсэ «Чалавек з Малой Багацькаўкі», апублікаванае ў № 6 «Маладосці» за 1975 г.

7. Мікола Федзюковіч — Міхасю Стральцову

11 лістапада 1975 г.

Дарагі Міхась, прывітанне!

Атрымаў твой ліст, дзякуй! У мяне тут усё па-ранейшаму — як быццам нармальна, хоць таксама цяпер без грошыкаў. Але тут яны і не дужа трэба. Толькі на цыгаркі. Вось канчаюцца, заўтра схаджу ў сельмаг, разжывуся.

Праўда, мне ў гэтым сэнсе раптам пашэнціла. Узяў быў з сабой 1-шы том Куляшова, разгарнуў, а там — тры чырвонцы. Хаваў неяк ад жонкі, ды і сам забыўся. Назаўтра ж гайсануў у райцэнтр Іванава, пагуляў з хлопцамі тры дні, цяпер зноў дома, натхняю сябе, каб нешта зрабіць.

Учапіўся за паэму пра «Граніт» (ужо даўно ездзіў ад «Маладосці» ў камандзіроўку, паабяцаў напісаць). Гэта нешта накшталт таго майго дзённіка пра нафту. Вядома, лухта, але штосьці вырысоўваецца. Цяжка таму, што ўсё дакументальна, але раблю з большым абсягам. Думаю дабіць да свята, а там будзе відаць...

Надакучыла і тут, адразу ж пасля свята і прыеду, пазваню табе. Суседка абяцала прынесці пляшку ці дзве самагону, сам піць не буду — няма з кім, прывязу, паспытаем. Разбалеліся зубы, можа, датрываю. Тут ёсць нейкі дзед-урач, але не хочацца

вылазіць. У Мінску мне надакучылі суседзі — Капыл[1] і Шлег, ледзь уцёк ад іх.

Ведаю, што ў Маладосці (здаецца, у № 10) ёсць твой артыкул пра «Я з вогненнай вёскі»[2]. Не бачыў, але думаю — добра.

Надвор'е тут някепскае. Відаць, тое ж, што і ў Мінску. Але, чуецца, скора будзе снег. Рыхтуйся. Ну, пакуль! Твой *Мікола*.

[1] Відаць, маецца на ўвазе празаік Мікола Капыловіч.

[2] Гаворка пра рэцэнзію М. Стральцова на кнігу А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі» «Забыць — небяспечна» («Маладосць», 1975, № 10).

8. Ніна Мацяш — Міхасю Стральцову

30 красавіка 1977 г. Белаазёрск

Дзень добры, Міхась!

Захацелася павіншаваць Вас са святамі маёвымі. Тыдзень таму пісала рэцэнзію на Пабла Нэруду, надзвычай спадабаліся Вашы пераклады[1]. Такія паэтычна эквівалентныя — ва ўсім! — арыгіналам! Віншую Вас! І як падарункам, хочацца падзяліцца з Вамі сваім нядаўнім вершам.

Лякаюцца — вярнулася зіма...
А ў доказ гэтай з'явы абуральнай
Паказваюць на снег, як на замах
На жаўруковы спеў світальны.

На кані крык і на бусліны крок
Па ўчора адагрэтай лугавіне, —
А сёння покавак зялёных кроў
Ад маразоў раптовых гіне.

Вярнулася зіма? Так, зацвіла
Натхнёнай, апантанаю завеяй!
Ды ў халады працяглыя, з крыла
Буслінага страсаныя, не веру!

Не марна прагнуў распусціцца бэз,
На ледаход так галасілі кані

Не марна: каб прачнулася ў табе,
Што сонца ўсё-такі цябе шукае!

Жадаю Вам, Міхась, светлых пор году! *Ніна.*

[1] Для кнігі чылійскага паэта П. Неруды «Крыві бунтоўнай кропля» (1976) М. Стральцоў пераклаў шэсць ягоных вершаў.

9. Рыгор Барадулін — Міхасю Стральцову

12 лютага 1982 г. Мінск

Любы мой і назаўсёды дарагі дружа Міхась!

Калі ласка, напішы — і хутчэй — назву сваёй кнігі па серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі»[1]. Дамо і са старых кніг тваіх, і новыя вершы. Пад вершамі пажадана паставіць даты.

Што магу сказаць? Не хапае цябе. Часта ў думках і гутару з табой, і раюся з табой, самая далікатная душа ў гэтым чэрствым свеце. Пішы вершы! Пішы мне.

Мой адрас: *220113, Мінск, Мележа, 4, кв. 256, тэл. 692829.*

Абдымаю цябе. Твой *Рыгор.*

[1]Кніга М. Стральцова ў названай серыі выйшла пад назвай «Яшчэ і заўтра» (1983).

10. Іван Шамякін — Міхасю Стральцову

25 сакавіка 1982 г.

Дарагі Міхась!

Прашу прабачыць, што не адразу адказаў на тваё пісьмо. Атрымаў яго, уважліва прачытаў. Разумею цябе, разумею ўсю сітуацыю, што ўзнікла. Не магу цалкам апраўдваць цябе, ведаючы пэўную слабасць. Хоць у каго яе няма, слабасці? Але цалкам веру тваёй споведзі [...].

Ці звяртацца ў С[аюз] п[ісьменнікаў]? Да каго? А ўрэшце, не варта табе гэтага высвятляць. Упэўнены, што подпісу свайго ніхто з нашых ні на якім дакуменце не ставіў. Не мог паставіць.

Але ўсё гэта — «філасофія», ад якой табе мала карысці. А па сутнасці просьбы тваёй?[2] Я кансультаваўся з юрыстамі высокай установы. Безумоўна, я напішу афіцыйную просьбу. Але, як мне растлумачылі, станоўчы вынік будзе залежаць ад установы, дзе ты зараз працуеш — ад іх, кажучы афіцыйнай мовай, характарыстыкі.

Ждаю табе ўсяго добрага: упэўненасці, веры, жадання тварыць.

З прыветам — *Іван Шамякін.*

[1] М. Стральцоў прасіў І. Шамякіна паспрыяць яго хутчэйшаму вызваленню з Мазырскага ЛПП.

11. Карлас Шэрман — Міхасю Стральцову

8 чэрвеня 1982 г. Мінск

Дарагі Міхась!

Дзякуй вялікае за цёплы ліст, за добрыя словы твае. Я задаволены тым, што прынёс кроплю радасці.

Выбачай, што пісаў месяц назад; я разумею, як цяжка чакаць адказу ў такой сітуацыі, але... акрамя звычайных і, як сам ведаеш, заўсёды тэрміновых спраў, мяне знайшлі і іншыя: якраз калі ты пісаў ліст, я трапіў у вір нечаканай чорнай паласы. Прыехаўшая да нас дачка яшчэ ў бальніцы, маленькі мой унук застаўся ў нас, адразу «падлажыў свінку» і слухаецца толькі дзеда, у Ніны Мацяш памёрла маці, гэта значыць, нельга было не ехаць у Белаазёрск і г. д. Адначасова заканчваю вельмі адказны пераклад невядомай дасюль п'есы Гарсія Лоркі (тэкст знайшла і перадала мне маскоўская іспаністка). Карацей кажучы, завал.

Дачку абяцалі выпісаць на днях; мо тады заеду?

У Саюзе [пісьменнікаў] усё няпроста, і ты гэта таксама добра ведаеш. З Чыгрынавым гаварыў. Ён паспрабуе нешта зрабіць[1], але я не ўпэўнены, што менавіта ён зможа. Таму раю напісаць Івану Антонавічу ці, скажам, Пімену [Панчанку], і дакладна растлумачыць, што ўзнікла пэўная магчымасць, і твая справа ўладзіцца толькі з дапамогаю Саюза, калі будзе хадайніцтва.

Мае размовы з кіраўніцтвам — што таполевы пух для гарадскога «вумніка»: лезе ў вочы ды асядае на асфальт. Ялавы, значыць, і прыкры. Барадулін абяцаў дапамогу, але ён амаль не бывае ў Мінску, наш фігара. Сёння буду ў Караткевіча, пагавару з ім.

Не забывайся на тое, што дзяльцы ад літаратуры, мусіць, радуюцца: ты на пэўны час, кажучы па-руску, «вне игры». З гэтае прычыны некаторыя «вялікія» не захочуць працягнуць бессмяротную руку. Калі ты і не напішаш сваю галоўную кнігу, лепей будуць выглядаць бездапаможныя шэдэўры квазікласікаў. Гэта не мараль, браце, гэта не падуладная маралізацыі ісціна: ты Майстар, павінен разумець.

Лена — мужная жанчына, яна робіць усё, каб ты вярнуўся хутчэй да яе, да нас, да літаратуры роднай.

Змагайся, браце! Да хуткай сустрэчы!

Твой *Карлас*.

[1] Гаворка ідзе пра датэрміновае вызваленне М. Стральцова з Мазырскага ЛПП.

12. Рыгор Барадулін — Міхасю Стральцову

15 чэрвеня 1982 г. Мінск

Дарагі Міхась!

Хоць вялікі тэарэтык і практык казаў: «незаменных няма», але хочацца яму запярэчыць на тваім прыкладзе.

Нельга цябе замяніць ні ў прозе, ні ў крытыцы, ні ў паэзіі. Нельга замяніць цябе ў звычайных сустрэчах і ў паразуменні.

Не хапае цябе, любы старэча. Чакаю з глыбока затоенай радасцю таго моманту, калі вынырнеш ты са свайго тхла.

На ліст не адказаў адразу па дзвюх прычынах: закруціўся і не закончыў верш, які так закругляецца:

Лёг спакой
На халадок атавы,
Вытрасшы трывогі з рукаўцоў.

Маладзік прарэзаўся
Танклявы,
Быццам малады Міхась Стральцоў.

Гэта прыблізна.

Наконт твайго зборніка ў «Бібліятэчцы паэзіі» ўсё нармальна. Дададзім і новыя. Гэта не праблема.

Мне болей даспадобы загаловак «Яшчэ і заўтра». Тут ёсць міхасестральцоўская лірычная ўсмешынка.

Адно, што вымагае серыя, — даты пад кожным вершам. Нізкамі з кніг бібліятэка не даецца. Тут табе трэба праставіць даты.

Пішу нешта не тое, што сказаць хачу, пра [што] думаў і перадумаў.

Адну фразу хачу сказаць: хутчэй вяртайся, дарагі, незаменны, неабходны Беларусі і ўсім паспалітым чытачам!

Заўсёды твой *Рыгор*.

P. S. Не цярпіцца яшчэ сябе працытаваць.

Пра падонкаў слоў няма —
Іх не трэсла, не касіла.
Рухае іх род сама
Дзярма
ядзерная сіла.

Хай знікнуць усе падонкі! Хай у вяках будзе Міхась Стральцоў!

13. Карлас Шэрман — Міхасю Стральцову

20 ліпеня 1982 г. Мінск

Дарагі Міхась!

Доўга не пісаў без аніякай крыўды, проста супакоіўся, як толькі перамаглі ў С[аюзе] п[ісьменнікаў]; па тэлефоне Лена казала, што адразу напіша, парадуе. А тут бягучыя справы замучылі, і я адклаў адказ. Не ламай голаў, усё нармалёва. Справа ў тым, што ты не ведаеш дробязную акалічнасць —

у мяне алергія на эпісталярны жанр, гэтым звычайна займаецца Тамара, і то без належнага энтузіязму. Рыгор [Барадулін] жа вельмі тады дапамог, а цяпер паехаў у Чэхаславакію.

Мушу пісаць нядобрую вестку: сёння я быў у Мікалая Дзмітрыевіча[1], майго старога друга (ці памятаеш галоўнага ўрача Літфонда?). Ён казаў, што Лена ляжала ў бальніцы дасюль, і яе справы дужа кепскія: ва ўсякім разе ёй патрэбна грунтоўнае лячэнне нервовай сістэмы, інакш яна можа трапіць на аперацыйны стол зноўку. Я і не ведаў, што раней хварэла сур'ёзна, нават на што хварэла — не ведаю. Мікалай гаварыў, мабыць, думаючы, што я ў курсе, я ж не стаў дапытвацца — гэта як шпіёніць, таму што вы самі ніколі не падзяліліся гэткімі трывогамі.

Магчыма, ты ўсё гэта ведаеш ад яе, а можа, і яна сама ведае (урачы звычайна не адкрываюць усе карты). [...] Канешне, я не ведаю, як ты мяркуеш жыць далей, гэта, дарагі, твая справа, а ўсё ж мы сябры, таму я не раю, не, крый божа, а мушу прасіць: падумай — ёй, хоць здалёк, патрэбна твая ласка, без тваёй дапамогі яна не выратуецца. Паклапаціся, праяві клопат, не замыкайся ў сваіх праблемах, інакш наклічаш злыбяду.

І яшчэ вось: не прагаварыся, што я хоць нешта ведаю, мне будзе няёмка.

У СП мёртвы сезон, але Васілеўская абяцала прапанаваць усім твой маршрут; я ж пакуль хварэю. Недзе 5 жніўня дачка з унукам паедуць дамоў, на Поўнач, тады, магчыма, я змагу выступіць там, але чамусьці веру, што хутчэй убачымся ў Мінску. Чакае Алеся, чакае Лена, чакаюць сапраўдныя сябры, чакае матухна-літаратура... Пакінь усе гаркоты на месцы, Міша, чакае Слова!

Твой *Карлас*.

[1] М. Ладуценка — галоўны лекар паліклінікі Літфонда.

14. Пімен Панчанка — Міхасю Стральцову

7 ліпеня 1984 г.

Дарагі Міхась!

Я шчыра ўдзячны Вам за вельмі добры артыкул пра маю творчасць, пра мяне («Беларусь», № 6)[1]. Артыкул арыгінальны, не падобны да артыкулаў іншых аўтараў. Няма перажоўвання банальных ісцін, а ёсць свой погляд, сваё разуменне, свой голас.

Я люблю Вашу паэзію і прозу. І тое, і тое вельмі самабытнае і таленавітае. Дай Вам бог здароўя і добрага новага ўраджаю.

Шлю Вам прывітанне з Каралішчавіч. З павагай і любоўю — *Пімен Панчанка.*

[1] Гаворка пра артыкул «Слова з нагоды» (пазнейшая назва — «Разам з людзьмі»).

15. Марыя Стральцова — Міхасю Стральцову

30 августа 1985 г.

Здравствуйте, мои дорогие!

Что у вас нового? Я опять пишу вам. Может, вы и не нуждаетесь моим письмом, но скучно мне очень. Я тянусь своей душой к детям, ища утешение у их. Ведь мне очень тяжело морально, никак не забыть всего утраченного[1]. Недавно Нюра ехала в Сычин и забежала на минутку к Нине[2], я была дома одна, она только повернулась, спешила в Сычин, так как время было под вечер. Оттуда ехавши, опять забегала, тоже в спешке — боялась опоздать на автобус на Кричев. Говорила, заходила на наш двор, когда шла от фермы, постояла, посмотрела на всё. Двор, говорила, зарос травой, и в огороде стоит укроп. Как это всё жутко и больно, что укроп в огороде извещает о жизни здесь нашей. Как коварна жизнь, что она может приносить людям неисправимые душевные удары, которые нельзя никак отсечь от себя.

Много за этот год мной передумано, перестрадано, переплакано, но неотвязчивая тоска не покидает меня. Остались дома и наши вещи, они там и згниють. Все туда бояться ехать, что так очень больно отзовётся всё в душе, что нет там уже никого.

Если бы я могла там жить, то я бы поддерживала память нашего двора, но вот склалась моя судьба так нелепо. Поэтому я и плачу без конца. Почему именно так получилось? Вопрос загадочный, и разгадать его невозможно. Видно, и наследственное есть невезение. В нашей родительской семье не было счастливых никого. Бывала, мой отец всегда говорил на Бондарькова Л. (Дрюка), что они очень счастливые, и это есть в самом деле.

Вот уже на исходе год, как умер отец, скоро годовщина со дня смерти его. Отмечать годовщину, видимо, нужно 21 сентября, так как 23 сентября сеголета попадает в понедельник, а хочется у выходные справить обед, потому что всем нужно в понедельник на работу. Будет обед у Нины. Приедете ли вы с Леной? Нужно приехать, чтобы отец не обижавсь. Напишите, приедете ли.

Ну, на этом буду заканчивать своё письмо. Алесе счастливо в школу. Целую.

Ваша мать и бабушка *М. Стрельцова*.

[1] Маці М. Стральцова ў 1985 г. пераехала з Сычына да дачкі ў Слаўгарад.

[2] Ніна — сястра М. Стральцова.

16. Віктар Стрыжак — Міхасю Стральцову

9 лютага 1987 г. г. п. Акцябрскі

Міхась Лявонцьевіч, добры дзень!

Крыху перарабіў набытую машынку. Але, як самі бачыце, почырк у яе застаецца кульгавым ці, хутчэй, нагадвае почырк вядомага бычка... Ну, ды нічога не паробіш. Каб давесці яе да ладу, патрэбен майстар. Я ж пакуль і такой картавіцы вельмі рады.

Як Вы прасілі, пасылаю 12 вершаў. Спецыяльна не выбіраў, а аддрукаваў тое, на што рука трапіла. Акрамя «На магілу

Ул. Высоцкаму». Што датычыць гэтага верша, то ён напісаны адразу пасля смерці. Праўда, у некаторых радках былі варыянты. Здаецца, гэты верш я Вам некалі чытаў. Толькі тады строфы гучалі з апаясанай рыфмай. Ад якой пазней па некаторых прычынах давялося адмовіцца.

Словам, вось вершы, і, можа, нешта знойдзецца сярод іх, вартае пэўнай увагі.

На гэтым заканчваю. Зараз нагадаю аб сабе Астапенку, а то мо пакрыўдзіўся, што маўчу. Усяго добрага. *Віктар.*

P. S. Наколькі я памятаю, Міхась Лявонцьевіч, Вы нарадзіліся ў гэтым месяцы. Віншую з днём анёла. Шчыра жадаю Вам моцнага здароўя і творчага шчасця. Пазваню. Вышліце, калі ласка, кнігу.

17. Пімен Панчанка — Міхасю Стральцову

9 лютага 1987 г.

Дарагі Міхась Лявонавіч!

Ад усяго сэрца віншую Вас, выдатнага празаіка, паэта, крытыка з Днём нараджэння, з 50-годдзем!

Люблю Вашу прозу, асабліва «Сена на асфальце» (гэта была першая ластаўка пра сапраўднасць нашага жыцця), «Адзін лапаць, адзін чунь» і многія іншыя.

Заўсёды любіў і люблю Вашы артыкулы — свежыя па думцы, разумныя і таленавітыя.

У апошні час палюбіў і Вашу паэзію — сапраўдную, светлую, зразумелую, без ніякай падробкі пад актуальшчыну. Жывыя пачуцці нашых дзён (і вечныя).

Жадаю Вам моцнага здароўя, новых творчых узлётаў, радасці! Рад, што некалі мне давялося разам працаваць. Шчасця і радасці Вашай сям'і. Паклон Вам і віншаванне ад Зоі Кірылаўны[1].

Моцна абдымаю — *Пімен Панчанка.*

[1] Жонка П. Панчанкі.

18. Данута Бічэль — Міхасю Стральцову

11 лютага 1987 г.

Дарагі Міхась!

Прабач, што так звычайна і прозай віншую цябе з 50-годдзем, на жаль, такі празаічны ў мяне пайшоў век. Але я памятаю нашу маладосць і твой натхнёны вобраз. Быў ты для мяне такім ідэальна беларускім сучаснікам-героем, што паставіць магла цябе толькі адразу за бацькам у сваім уяўленні — от, нейкі такі свойскі, сапраўдны, надзейны ты бачыўся мне на вялікай адлегласці нашага быцця ад Мінска да Гародні.

Спадзяюся, што нешта чыстае, тое юнацкае шчырае і таленавітае ты пераносіш праз гэты бар'ер 50-годдзя. Жадаю табе шчасця, здароўя і натхнення, працы і працы. Хай тваё жыццё будзе запоўнена працай і хай праца прыносіць радасць не толькі табе сваім плёнам.

Данута.

19. Анатоль Вялюгін — Міхасю Стральцову

[12 лютага 1987 г.]

Ну, што, дарагі Міхась Лявонавіч?..

От і сталасць палачкай пастукала ў твае дзверы, і ўсе 50 — як «сіні сон» на прылессі, за якім — веру! — кроніста зарунее пушча тваёй працы ў літаратуры, бо да талстоўскага жніўня яшчэ 32 гады!

Абдымаю — *Анатоль Вялюгін.*

20. Янка Брыль — Міхасю Стральцову

14 лютага 1987 г.

Шчыра віншую, дарагі Міхась, па-братняму хачу бачыць цябе шчаслівым, у добрым творчым настроі, хачу пачытаць

тваё — прозу, паэзію, крытыку, з асаблівым націскам на першае, памятаючы незабыўнае адкрыццё...

Абдымаю — *Янка Брыль.*

21. Сяргей Баруздзін — Міхасю Стральцову

2 января 1989 г.[1]

Дорогой Михась!

Поздравляю з рецензией на «Избранное»[2] и «Мой свет ясный» в № 1 нашей «ДН»! Кстати, обратите внимание на наш нынешний тираж...

И очень прошу Вас прислать мне в редакцию эти Ваши книги, а также последние издания на белорусском с автографами для наших нурекчан[3]: «Библиотеке «ДН» в интернациональном Нуреке от старого дружбинца...» и т. д.

Хорошо? Очень жду!

С наступающим Вас Новым, 1989-м! И пусть этот Год Змеи будет добрым для Вас!

Искренне Ваш — *Сергей Баруздин.*

[1] М. Стральцова ўжо паўтара года не было на свеце, а галоўны рэдактар «Дружбы народов» працягваў пісаць яму лісты...

[2] Гаворка пра «Выбранае» 1987 г., якога аўтар ужо не пабачыў.

[3] Рэдакцыя «Дружбы народов» збірала бібліятэку для будаўнікоў Нурэкскай ГЭС.

«Гатовы вам заўсёды дапамагчы...»

Лісты Леаніда Дранько-Майсюка

Часам хочацца, каб тыя лісты, якія ты пісаў у маладосці і пасылаў чорт ведае каму, зніклі — бо зазвычай яны паказваюць нягегласць думкі і нязграбнасць стылю, няшчырасць, а то і ўвогуле прыхоўваюць да пары нешта такое, ад чаго ўмомант на душы робіцца і сорамна, і брыдка.

Аднак жа большая трывога ў сэрцы, як згадваеш свае даўнія пасланні людзям любімым...

Калі паэт Міхась Скобла паведаміў, што адшукаў маю карэспандэнцыю да Міхася Стральцова, я напалохаўся, бо не памятаў ніводнага радка з таго, што пасылаў аўтару «Загадкі Багдановіча»!

Вядома, не памятаў і колькасць пасланага — як выявілася, напісаў М. Стральцову трынаццаць лістоў.

Што я, студэнт маскоўскага Літаратурнага інстытута, а крыху пазней рэдактар мінскага выдавецтва «Мастацкая літаратура», крэмзаў у сваіх пісьмах?

Хіба што мог з пятага на дзясятае ўгадаць па атрыманых адказах — у сваім архіве маю дзесяць стральцоўскіх лістоў, і яны, гэтыя лісты — мастацтва і такая ж проза, як, скажам, «Смаленне вепрука» ці «Свет Іванавіч, былы донжуан», а часам — філасофскія разважанні, эмацыянальная эсэістыка і далікатная паэзія...

Я не імкнуўся быць вучнем М. Стральцова, але незаўважна ён стаў эпісталярным маім настаўнікам, і, перачытваючы ягоныя пісьмы, я пераконваўся: лісты ж увогуле — нашы лепшыя творы, праўда, пры той умове, калі мы сапраўдныя самі.

М. Стральцоў якраз такім і быў...

Я палюбіў яго адразу, як толькі ўбачыў у часопісе «Маладосць» яго партрэт — так, спачатку, як толькі скончыў школу, напаткаў у часопісе фота пісьменніка, а творы пазней, і не апавяданні з вершамі — артыкулы.

Калі ўжо служыў, маці прыслала мне ў казарму прыгожае выданне «У полі зроку» — стральцоўскі зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў і эсэ. Па службе сваёй гэту кнігу я пакінуў маёру Казіміру Маслоўскаму, беларусу з Лагойшчыны, майму камандзіру...

У Маскве, у Літінстытуце, студэнты з захапленнем гаварылі пра стральцоўскае апавяданне «Смаленне вепрука», і я пастанавіў: калі буду жыць у Мінску, то першае што зраблю — пазнаёмлюся з ім, Міхасём Стральцовым...

Знаёмства ў Мінску і адбылося, улетку 1981 года — тады Міхась Стральцоў вандраваў, жыў сабе вольна і адначасова паходзіў на Поля Верлена і Сяргея Ясеніна...

Праз паўгода я даведаўся, што ён апынуўся ў лячэбна-працоўным прафілакторыі (ЛПП) — знаходзілася тая сумная ўстанова ў нейкіх Міхалках пад Мазыром.

Я напісаў туды — так і пачалося яно, наша ліставанне...

А ранкам 28 студзеня 1982 года я сеў у аўтобус Давыд-Гарадок—Мазыр, а ўжо з мазырскай аўтобуснай у тыя Міхалкі за дзесяць рублёў мяне давёз таксіст.

Пра гэта, пра сваю сустрэчу з Міхасём Стральцовым у казённым доме, я расказаў у нарысе «Устойлівае суседства», таму паўтарацца не буду.

Скажу толькі: з Міхалак вяртаўся замаркочаны; ужо зусім сцямнела, і даехаў я толькі да Лельчыц і там заначаваў — за рубля касірка аўтобуснай пусціла мяне ў дарожную спальню з мулкай лавай.

Я не спаў там — думаў пра яго...

У Міхалках ён ужо быў падобны не на Верлена і Ясеніна, а на доктара Казіміра Ірмалевіча, героя рамана Кузьмы Чорнага «Сястра» — прынамсі, ён мог услед за гэтым чорнаўскім персанажам прамовіць: «Я звяў ад стомленасці, я пачынаю паддавацца ўсяму вакольнаму...».

На жаль, была ж неабходнасць у яго знаходжанні на прымусовым лячэнні.

У Міхалках ён хацеў пісаць сваё, бо так і паведамляў у адным з лістоў: «...а пісаць хочацца...», аднак на мастацкае пісьмо бракавала спакою, хоць працу меў у спакойным кутку — у бібліятэцы...

Другі персанаж «Сястры» вандроўны рамантык Ваця Браніславец ведаў пра сябе «...што не ўсё ў ім і ён не ўва ўсім, а ўсё вышэй і шырэй, а ён у маленькім кутку ўсяго, нізкім, цёмным і няважным...»

Такімі, ці амаль такімі, былі і думкі Міхася Стральцова там, у Міхалках, за калючым дротам ЛПП, і мне хацелася хоць як-небудзь і хоць у чым-небудзь паспрыяць яму.

Але што я мог, акрамя паштовых слоў: «Гатовы Вам заўсёды дапамагчы...»

Першы ліст[1]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Зусім выпадкова даведаўся я пра Ваша апошняе месца знаходжання[2]. Пішу з такой мэтай: павіншаваць Вас са святам, а таксама даведацца — ці маеце Вы зараз больш-менш спрыяльныя ўмовы для *сваёй* працы.

Хто я такі? Мусіць, Вы помніце мяне[3] па апошнім леце. Тады я праходзіў практыку ў «Мастацкай літаратуры» ў рэдакцыі паэзіі[4].

Мы з Вамі нават некалькі разоў сустракаліся. Зараз я дабіваю сваю вучобу ў Маскве, у Літаратурным інстытуце. А недзе пасля 20 студзеня [1982 г.] збіраюся дахаты, на Палессе.

Мне хочацца з Вамі сустрэцца. Ці будзе на гэта згода з Вашага боку[5]? Калі будзе, то мо нешта патрэбна Вам, пішыце, і я захаплю тое з сабой у дарогу[6].

А пакуль што буду развітвацца, спадзеючыся на Ваш ліст[7].

Адрас мой такі: *117393, Москва В-393, ул. Профсоюзная, д. 60, к. 1, кв. 67.*

Леанід Дранько-Майсюк.

[1] Гэты ліст — навагодняя каляровая паштоўка «С Новым Годом!» Даты няма, але на штэмпелі маскоўскай пошты можна ўбачыць такое чысло: «28.12.81» — значыць, напісаў я гэту паштоўку 27-га ці ранкам 28 снежня 1981 года. Ліст пасланы на адрас: *Гомельская вобласць, г. Мазыр — 11, ЛПП-2...*; штэмпель мазырскай пошты на канверце адсутнічае.

[2] Пра тое, што М. Стральцоў нечакана апынуўся пад Мазыром, у вядомай установе, паведаміла мне мая цешча Валянціна Шчадрына. У тыя гады яна працавала ў Саюзе пісьменнікаў СССР і перакладала на рускую мову прозу У. Караткевіча.

[3] У сваім першым да мяне лісце 7 студзеня 1982 г. М. Стральцоў пісаў: «...Ты трошкі крыўдзіш мяне, як бы нанова пачынаеш наша знаёмства. Ну, вядома, я памятаю цябе, нашы харошыя сустрэчы ў Мінску, памятаю пачуцце даверу адзін да аднаго, што засталося пасля іх — хіба гэта мала?..»

[4] У 1981 г. я, студэнт маскоўскага Літаратурнага інстытута імя М. Горкага, прыехаў у Мінск, у выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Збіраўся ў часопіс «Полымя», але паэтэса В. Коўтун параіла адбыць рэдактарскую практыку ў выдавецтве.

[5] У тым жа сваім першым да мяне лісце ад 7 студзеня 1982 г. М. Стральцоў пісаў: «...Бачыць цябе буду рады і нават вельмі...»

[6] На гэта ў двойчы ўжо згаданым лісце М. Стральцоў паведамляў: «...Везці мне нічога не трэба — могуць не ўзяць. Дробязь хіба якую...»

[7] Паводле штэмпеля маскоўскай пошты першае пісьмо ад М. Стральцова я атрымаў 14 студзеня 1982 г.

Другі ліст

14.1.[19]82 г.

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Ліст Ваш мяне вельмі ўсцешыў — Вы адгукнуліся, і разам з тым трохі засмуціў, асабліва радок «...для працы сваёй часу амаль няма». Сапраўды, нейкае безнадзейнае экзістэнцыяльнае становішча[1]. Дзякуй богу, што яно часовае. Дзякуй богу, што дзень пераходзіць у ноч, а ноч зноў у дзень. Прыйдзе час, і з'явіцца ў Вас тое новае, па маштабу свайму роўнае «Загадцы Багдановіча»[2]. Дарэчы, пра Багдановіча...

Здаецца, у першым сваім лісце я гаварыў Вам аб вечары Багдановіча, які адбыўся ў ЦДЛ[3]. Прыйшло шмат людзей. Нейкая частка з іх, вядома, невялікая, чытала Багдановіча; большасць складалі людзі, якія толькі чулі пра паэта і то адным вухам; астатнія нават і не ведалі — хто гэта такі. Улічваючы ўсё [...], як мне здаецца, у гэтай маскоўскай зале ў першую чаргу павінен быў прагучаць шчыры *асветніцкі* матыў: трэба было масквічоў натхніць Багдановічам, па-чалавечы расказаць пра яго, спыніцца на яго лепшых творах. Я разумею, што гэта задача велізарнай складанасці і ўрэшце рэшт разбэшчанай маскоўскай публіцы напляваць на (нашага паэта). Але ўсё ж... Танк і Гілевіч [...] (проста) [...] вяшчалі [...][4]. Мой сябар са Славакіі[5], якога я запрасіў на вечар, толькі ўздыхнуў: «Бедны Багдановіч!» А што мне было яму адказаць. За тыдзень да гэтага вечара я прынёс яму Вашу «Загадку», перакладзеную на рускую мову[6]. Ён прачытаў, і чытанне гэтае яшчэ больш

узмацніла яго жаданне перакладаць Багдановіча. Тэадор (імя сябра) хоча бачыць Багдановіча па-славацку. Са свайго боку я спрыяю (ягонаму) жаданню. Раблю падрадкоўнікі, тлумачу асобныя словы. І ёсць яшчэ ў мяне задума — паказаць Тэадору Беларусь; як перакладчыку, яму гэта спатрэбіцца. Замінка толькі вядома ў чым — няма грошай. А на паездку іх трэба багата[7].

Ну ды годзе. Я ўжо надакучыў Вам сваімі плёткамі. Дахаты збіраюся пасля 20-га студзеня. Колькі дзён пабуду ў сваім Давыд-Гарадку, супакою бацькоў (даўно мяне бачылі)[8], а пасля да Вас[9]. Думаю, што перашкодаў ніякіх не будзе, і мы сустрэнемся, як і некалі сустракаліся.

У «Полымі» (адзін з апошніх нумароў) знайшоў Вашыя вершы[10]. Здзівілі мяне радкі пра Купалу і Ахматаву[11]! Але пра гэта шчэ пагамонім.

Яшчэ раз Вам дзякуй за ліст, ён даў магчымасць узнікнуць нашаму дыялогу.

Буду рады кожнаму Вашаму радку. Да пабачэння.

Ваш *Дранько-Майсюк*.

[1] Пра «мазырскі прафілакторый» М. Стральцоў пісаў, як пра «...месца, дзе найпрасцей падацца ў экзістэнцыянісцкую веру...»

[2] «Загадка Багдановіча» — аповесць М. Стральцова, якая ўбачыла свет у 1968 г.

[3] ЦДЛ — Цэнтральны дом літаратара ў Маскве. Тут у снежні 1981 г. прайшла вечарына, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча.

[4] Меркаванне студэнта, які знаходзіўся ў палоне максімалізму. На той вечарыне, дарэчы, змястоўную вусную лекцыю, прысвечаную вершу М. Багдановіча «Агата», прачытаў Мікалай Улашчык, а Н. Гілевіч зрабіў цікавы разбор рэцэнзіі М. Багдановіча на пераклад М. Гумілёвым паэтычнай кнігі французскага паэта Тэафіля Гацье «Эмалі і камеі».

[5] Тэадор Крыжка (нар. 1956) — славацкі паэт.

[6] «Загадку Багдановіча» на рускую мову пераклаў П. Кабзарэўскі.

[7] Паездка адбылася ў красавіку 1982 г.

[8] З Давыд-Гарадка ў Маскву я выехаў 29 жніўня 1981 г. — значыць, бацькі мяне не бачылі паўгода.

[9] У мазырскім ЛПП мы сустрэліся 28 студзеня 1982 г.

[10] Згадка пра публікацыю вершаў М. Стральцова ў часопісе «Полымя» (1981, № 12).

[11] Маецца на ўвазе верш «Жалейка» (пазнейшая назва «Купала»).

Трэці ліст

9 лютага [19]82 г. Масква

Паважаны Міхась Лявонаваіч!

Едучы ад Вас у свой Давыд-Гарадок, я ўвесь час шкадаваў, што мала Вам пакінуў сала. Маці[1] мне давала вялізны кус, але я неяк пасаромеўся везці Вам столькі багата. Маці раіла — бяры больш і г. д. ... Гэтае прыкрае пачуццё і дагэтуль не знікла. І ліст да Вас пачаў я пад яго ўплывам[2].

У Маскву [...] выбраўся не зусім удала. Прыехаў у Мінск — была нядзеля. Да Барадуліна не дазваніўся, Сямёнаву не ўбачыў. Зайшоў да Вадзіма Спрынчана. Вашу просьбу Вадзіму пераказаў (заяўка, пераклад, кніга выбранага і г. д.) і папрасіў, каб ён пагутарыў з Алай Сямёнавай[3].

Яшчэ з Давыд-Гарадка пазваніў В. М. Шчадрыной. І тут, у Маскве, мне ўжо казалі, што яна выходзіла на Законнікава (здаецца, ён з ЦК) і, відаць, была ў яе размова з Макаёнкам[4]. Пра ўсё гэта можа Вы ўжо ведаеце з яе ліста[5]. А калі ліста гэткага не было, то, я мяркую, варта напісаць свой да яе і распытаць аб усім.

Выйшаў «Дзень паэзіі-81». Кніга нечаканая, асабліва для мяне — мяне ў ёй перахрысцілі з Леаніда ў Міхаіла. На 73-й старонцы так і стаіць — Міхаіл Дранько-Майсюк[6]. Жарт лёсу або маладой наборшчыцы.

Сёння зранку пазваніў Аскоцкаму. Ён запісаў Ваш адрас, распытаў — дзе Вы, што Вы, як Вам...

Тэлефон В. Івашчанкі я не знайшоў. [...] Шукаў у старым даведніку, трэба зазірнуць у новы. Там, пэўна, будуць яго каардынаты[7].

З Мінскам пакуль што ў мяне нічога не атрымліваецца. Прапіска? Хата? Работа? Відаць, застануся ў Маскве[8]. Буду вам пісаць і буду гатовы Вам заўсёды дапамагчы.

Ваш *Леанід.*

[1] Мая маці — Люба Дранько-Майсюк (дзявочае прозвішча Нічыпорка) (1933–2009).

[2] У сваім другім лісце, напісаным 16 лютага 1982 года, М. Стральцоў супакойваў мяне: «Дарагі Леанід! Ну чаго ты так засмучаешся, браце, — ты і так для мяне надта многа зрабіў і, галоўнае, па ўнутранаму парыванню, нязмушана, шчыра: для мяне ў мае ўжо не такія харцэрскія гады гэта важна і ад гэтага цяплей на душы...»

[3] Гаворка вялася пра будучую кнігу выбраных твораў М. Стральцова.

[4] В. Шчадрына вяла перамовы і з І. Шамякіным наконт датэрміновага вызвалення М. Стральцова з ЛПП. Па яе просьбе І. Шамякін званіў пракурору Гомельскай вобласці. Таксама ж па просьбе В. Шчадрыной М. Стральцова ў ЛПП у першай дэкадзе снежня 1981 года наведаў яе старэйшы брат В. М. Кохненка (1922–1987) — на той час рэнтгенолаг супрацьсухотнага дыспансера ў Нароўлі.

[5] В. Шчадрына напісала М. Стральцову каля дзесяці пісьмаў.

[6] У лісце за 16 лютага 1982 г. М. Стральцоў так мяне разважыў: «... Наконт памылкі ў друку не перажывай, хоць я і ведаю, як прыкра бывае гэта. У мяне вунь горш: ёсць Б. Стральцоў, з якім мяне (ці яго) доўга блыталі, пакуль не прайшоў час і не стала ўсё на месца, а цяпер вось аднекуль выкаціўся нехта М. Стральчэня, а Вялюгін нічога лепшага не прыдумаў, як надрукаваць нас у адным нумары. А можа тут ёсць і мондры разлік, і сярмяжная праўда: няхай чубяцца, можа хто і адступіцца. Я жартую, вядома. Не надавай твайму факту значэння: у цябе ўсё наперадзе, будзе час і напамінаць аб сабе чытачу, і запомніцца яму...»

[7] Да В. Івашчанкі я ўсё-ткі дазваніўся і паведаміў яму, што М. Стральцоў знаходзіцца ў Мазыры. У тым жа лісце за 16.02.1982 г. можна прачытаць такія радкі: «Слухай: нечакана і хораша адгукнуўся

Слава Івашчанка! Я чакаў найперш ліста ад Аскоцкага, а Слава, добрая душа, яго апярэдзіў. І я крыўдую трохі на Валянціна [Аскоцкага]: усё ж добра, што ты да яго [В. Івашчанкі] «дапяў»...»

[8] У вышэйзгаданым лісце М. Стральцоў прапаноўваў: «Прапіску табе мо неяк зробім, толькі была б цвёрдая гарантыя работы. Прапісацца можна, урэшце, і ў Каралішчавічах, а жыць у Мінску. Я сваю кватэру мяняю, седзячы тут, і аднапакаёўка ў мяне будзе — значыць, будзе дзе прыткнуцца па першым часе і табе...» Улетку 1982 г. я завяршаў сваю вучобу ў Літаратурным інстытуце і меркаваў з Масквы перабірацца ў Мінск. Так яно пазней і сталася. З работай дапамог Міхал Дубянецкі — уладкаваў у выдавецтва «Мастацкая літаратура», дырэктарам якога на той час ён з'яўляўся, а з прапіскаю паспрыяў Уладзімір Караткевіч — прапісаў у сваёй кватэры.

Чацвёрты ліст

23.02.[19]82 г.

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Ваш ліст[1] мяне супакоіў, дакладней сама яго інтанацыя — нібы мы зноў сустрэліся і пагаманілі. Сумаваць Вам апошнім часам не давялося — я маю на ўвазе візіты сяброў, а таксама патрэбныя лісты з Мінска[2]. Гэта ўсё добра, і разам з тым цяперашняе Ваша жыццё не падстава для супакаення. Калі я званіў Івашчанку, гаворачы пра Вас, ён абяцаў пайсці да Сураўцава ў вялікі Саюз[3] і праз яго дапамогу нешта зрабіць. Не ведаю, ці хадзіў ён? Сёння абавязкова сустрэнуся з Валянцінай Міканораўнай Шчадрыной, даведаюся ў яе, што чуваць на фронце нашай агульнай справы. Апрача Законнікава яна званком з Масквы турбавала яшчэ нейкага пана. Думаю, Вам яна аба ўсім напіша.

Што робіцца ў мяне асабіста? Рыхтуюся да свае абароны, яна 4-га сакавіка. Учора прачытаў два водгукі на свой дыплом. Яны станоўчыя, але першы (пісаў В. Дзяменцьеў) вельмі павярхоўны, адпісачны, другі ж — мяне па-сапраўднаму здзівіў. Напісаны з цеплынёй, з веданнем справы і г. д. Зрабіла яго выкладчыца нашага інстытута Г. І. Сядых. Дзякуй ёй!

У Маскве ў колах літаратурных і калялітаратурных зараз горача абмяркоўваецца артыкул Кожынава («Наш современник», № 11[4]), прысвечаны русафільскім праблемам. Гаворка ў артыкуле ідзе таксама пра касмапалітызм і нацыяналізм. Паводле Кожынава, з'явы гэтыя, кожная ўвасобку, небяспечныя. Трэба, каб яны не размяжоўваліся. А ўсім славянам наогул трэба згуртавацца. На якой падставе? Здаецца, Кожынаў пра гэта не гаворыць. Але, вядома, што ў (такім) яднанні руская нацыя павінна адыграць выключную ролю, ролю гегемона, ці як. Шчыра кажучы, гэта мне не зусім падабаецца, і наогул пра гэта [...] не хочацца думаць. Галоўнае ўсё-ткі — [...] добрыя вершы. А хто іх напісаў — беларус ці яўрэй, дальбог, знаку вялікага не мае[5].

Аперацыя «перасяленне ў Мінск» пакуль што замарожана. Хоць мне трохі і крыўдна робіцца, быццам ужо беларусы Мінску непатрэбны. Жонка мая[6] перадае Вам сваё прывітанне, і хлопчык мой Васіль[7] таксама дзядзьку Міхасю маша ручкай.

Буду чакаць Вашых лістоў. Да пабачэння, Міхась Лявонавіч.

Леанід.

[1] Маецца на ўвазе пісьмо М. Стральцова ад 16 лютага 1982 г.

[2] У вышэйзгаданым пісьме М. Стральцоў паведамляў: «Па дарожцы, праторанай табой, нядаўна пабывалі ў мяне ўніверсітэцкі аднакурснік Іван Шуцік (рэдакт[ар] «Железнодор[ожника] Белорусс[ии]) і Анат. Аўруцін... Прывезлі лісты ад Барадуліна, Паўлава, Эд. Валасевіча...»

[3] Тут у сэнсе: пайсці ў Саюз пісьменнікаў СССР.

[4] Згадка пра артыкул В. Кожынава «И назовёт меня всяк сущий в ней язык» (часопіс «Наш современник», 1981, № 11).

[5] Імя і філасофія В. Кожынава ў стральцоўскім трэцім лісце (7.03.1982 г.) адгукнуліся гэткім чынам: «...хай бы... ўсё ж мяне адсюль неяк хутчэй выдзіралі. На сваіх айчынных я таксама, як і ты, вялікай надзеі не маю, бо «несть пророка в отечестве своём» — няхай масквічы аб'ядноўваюцца, хоць і па кожынаўскіх рэцэптах, але дапамагаюць...»

[6] Вольга Шчадрына.

[7] Гаворка пра нашага з Вольгай сына, якому на момант напісання гэтага ліста было сем месяцаў.

Пяты ліст

[16.03.1982 г.]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Учора ўвечары званіў я В. Івашчанку. Чалавек ён, мяркуючы па голасу, цудоўны і вельмі спагадлівы. З такімі людзьмі хочацца сябраваць. У Мінск на імя Я. Сіпакова ён даслаў ліст, у якім (што ў ім было канкрэтна, я не ведаю, але здагадваюся) амаль што рускім матам прайшоўся і па самому Янку[1], і па другіх нашых «затлусцеўшых» класіках, якія зараз дзеляць дзяржпрэміі, пасады, кватэры і якім цяжка пальцам зварухнуць, каб зрабіць нешта сапраўды добрае і карыснае. Сіпакоў, за што яго можна паважаць, адказаў Івашчанку — нешта ён там тлумачыў, нешта абяцаў, адным словам, пачаў варушыць пальцам. Але ж Вы самі разумееце, Міхась Лявонавіч, гэтае варушэнне яшчэ не дапамога. Івашчанка пра [...] свой ліст і пра іншыя свае заходы ў гэтым кірунку, як мне здаецца, лепш раскажа сам, калі ўжо не расказаў. Я яшчэ ведаю, што ён сустракаўся з Валянцінай Міканораўнай, а пра што яны гаварылі?.. Недзе ў канцы сакавіка ён едзе ў Мінск, а адтуль мае намер наведаць Вас[2]. Валянціна Міканораўна ліст Вам напісала, Вы яго павінны атрымаць. Яна вельмі заклапочана Вашым становішчам, і ўсё што можна было ў Мінску абзваніць, яна абзваніла. Але ізноў жа — людзі дзеляць пасады, прэміі і г. д. Гэта якраз прыклад да Вашага разважання пра браткоў-беларусаў, пра іх свінства і зачуханства[3]. Са свайго боку я амаль нічым дапамагчы не здолею, хіба што толькі яшчэ раз прыеду да Вас, прывязу нейкія не зусім патрэбныя маскоўскія навіны, вось і ўсё[4]. Ніхто са мной ні тут, ні ў Мінску размаўляць не будзе. Я ўжо спрабаваў нешта рабіць [...], але выніку станоўчага не было. Здаецца, 20 сак[авіка] ў Мінску адбудзецца нейкі пленум[5], прыме ўдзел у яго рабоце Валянціна Міканораўна. Яна, відаць, паспрабуе выкарыстаць гэты час для Вашай справы.

А ў мяне набеглі нейкія свае клопаты. 18 сакавіка трэба будзе выступаць на тэлебачанні. Гэта будзе толькі запіс[6], а калі выйдзе перадача, яшчэ невядома. Справа для мяне зусім незнаёмая, але павінен я вытрымаць [...].

Міхась Лявонавіч, за гэты «міхалкаўскі час», а ён немалы, на жаль, што-небудзь зроблена Вамі? Мне гэта вельмі цікава ведаць. Можа, апавяданнне вырасла ці артыкул? Хоць я разумею — для жывой работы ўмоў няма.

Буду Вам пісаць, буду чакаць Вашых слоў, буду спадзявацца разам з Вамі.

Да наступнага ліста.

Дранько-Майсюк.

[1] Мусіць жа, В. Івашчанка блізка сябраваў з Я. Сіпаковым, калі пасылаў яму такія «шчырыя» пісьмы.

[2] Здаецца, гэты добры намер так і застаўся намерам.

[3] У трэцім сваім лісце (7.03.1982 г.) М. Стральцоў з відавочным балючым жалем даводзіў: «...Канечне, у браткоў-беларусаў многа свінства, зачуханства, хутаранства, непавагі да саміх жа сябе [...] і гэта праяўляецца нават у людзей далёка не пасрэдных. Мы дарослыя людзі і абмежаванасць сваю нацыянальную павінны называць абмежаванасцю, як і абмежаванасць расейскую, якая таксама існуе і часта заключаецца ў тым, што квас бессаромна разбаўляецца бражкай, а на лапці начэпліваюцца падкоўкі і г. д.».

[4] З маёй другой паездкай у Міхалкі не склалася.

[5] Пленум Саюза пісьменнікаў БССР.

[6] Запіс адбыўся ў маскоўскай тэлевізійнай студыі Астанкіна.

Шосты ліст

26.4.[19]82 г. Мінск

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Неяк мы з Вамі згубілі сувязь. На свой апошні ліст я чакаў адказу і не прычакаў. Мусіць, ліст мой не дайшоў да Вас[1]. І такое здараецца ў нашай краіне. Калі сцісла паведаміць аб сваіх навінах, то яны такія — сыну майму ўжо 10 месяцаў, дыплом свой я абараніў, збіраюся ўладкоўвацца ў Мінску. А зараз з Тэадорам Крыжкам (славацкі паэт, пра яго я пісаў Вам) ездзім па Беларусі, чытаем Багдановіча і марым убачыць «Вянок» паславацку.

Я ведаю, што Шамякін узяўся за Вашу справу. Хочацца думаць, што ўсё атрымаецца. Толькі калі... ад гэтага і ўся гаркота. Вядома, ёсць у Мінску людзі, якім Ваша хуткае вяртанне не надта спадабалася б. [...] Толькі так я магу вытлумачыць тое, што і па гэты дзень Вы ў Міхалках. Нехта з моцных Вам хціва зайздросціць, а то і проста ненавідзіць. Хто ён? Некалі даведаемся, калі ўсе сыдземся ў адным месцы, якое вылучаецца найвялікшай дэмакратыяй.

Міхась Лявонавіч, дасылаю Вам красавіцкае «Полымя». Тут шмат вершаў, ёсць і мае радкі. Толькі, калі ласка, не чытайце першы верш «Удовы»[2]. Ён дрэнны, дый яшчэ Вялюгін руку прыклаў...

Пішыце мне на мой ранейшы маскоўскі адрас. Буду вельмі чакаць.

Дранько-Майсюк.

[1] Гаворка пра мой пяты ліст. Ён дайшоў да адрасата, як і дайшоў чацвёрты ліст, у якім я паведамляў, што сына назваў Васілём. 7 сакавіка 1982 г. М. Стральцоў перадаваў «...прывітанне шчырае жонцы і міламу сынку, якога ты добра-такі назваў Васільком. Харошая кветка мужчынскага роду...»

[2] У сваім чацвёртым да мяне лісце (16.05.1982 г.) М. Стральцоў паведамляў: «Надумаў я адразу, як прачытаў «Полымя» з тваімі вершамі, адгукнуцца на іх у «Ліме», загарэўся гэтай думкай, а далей пайшло не так, як марылася. Не выбраў, браце, часу [...]. Вершы мне твае спадабаліся. Сказаць так — сказаць мала. Найперш, яны арыгінальныя — не вонкавай нейкай аздобай, а спосабам мыслення — «паганскім» (языческим) [...]. Як паэт, мысліш ты па-свойму [...] мовай паэзіі, вяртаючы вобразу першароднасць, а не падмяняючы яе, першароднасць, адно бачнасцю тропа. Адчуванне ў цябе непадробнае, цэльнае — вось што галоўнае. Табе не падабаецца першы верш [...]. Я прачытаў уважліва [...]. Ты дарэмна, верш харошы [...]. «Ты магутнікам стань на зямлі...» — вельмі спадабалася. «Да цябе яна йдзе з агароду» [апошні радок верша «Ты магутнікам стань на зямлі!..» — *Л. Д.-М.*] — вельмі хораша, так проста, па-харошаму нечакана і «наіўна-світальна». Віншую. «Я чуў салоўку зблізку...» — таксама добра. «І ў кветку майго слыху залётвала пчала» [фінал верша «Я чуў салоўку зблізку...» — *Л. Д.-М.*] прымусіла мяне па-харошаму зноў жа ўсміхнуцца, прыгадаўшы сваё

нешта, у якім, памятаю, сумняваўся. Неяк гэтак: «...так пчала апошні раз цалуе памяць кветак». Значыць, падобная логіка вобраза можа быць натуральнай — ці не так? «Стог нечакана пахіліўся / І, палымнеючы, паплыў / У захад» [радкі з верша «Прагрукаў нечаканы воз...» — *Л. Д.-М*]. Здаецца, драбніца, на першы погляд, але як пачуццёва і зрокава выразна. Па-сапраўднаму экспрэсіўна і нават сюррэалістычна. Віншую [...]. Папярэдзь мяне наконт новых тваіх публікацый [...]. Я загадзя падрыхтаваўся б і нешта напісаў пра твае вершы — шчыра, з ахвотай, бо яны блізкія мне і, здаецца, я разумею, чаго ты хочаш ад верша наогул. Ці дамовіліся, ці згода?..»

Сёмы ліст

[20.05.1982 г.]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Мне было вельмі прыемна чытаць Ваш ліст[1]. Яшчэ ніхто з беларусаў такога дакладнага і ўважлівага слова пра мяне не казаў. Было больш эмоцый, чым патрэбнай удумлівасці[2].

У чэрвеньскім нумары «Юности» павінны з'явіцца некалькі маіх вершаў у перакладзе адной маскоўскай кабеткі[3]. Нумар гэты я Вам прывязу (калі выйдзе ён), і разам падумаем[4] над адным з самых складаных пытанняў — пытаннем перакладу.

А зараз пра справы больш цікавыя. Я заходзіў у «Дружбу народов» да Іны Сяргеевай. Гаварылі пра рэчы не зусім абавязковыя, а калі я перадаў Ваша прывітанне, яна ажывілася. Вельмі хораша гаварыла пра Вас як празаіка — «...он создан для прозы» і г. д. Прасіла, каб я ў наступным лісце перадаваў Вам яе прывітанне і яшчэ... Прасіла, каб Вы даслалі свае пазнейшыя рэчы (апавяданні, крытычныя нататкі ці проста назіранні, або лірычныя запісы), адным словам, усё, што Вы лічыце вартым і што, вядома, яшчэ не друкавалася ў «Др[ужбе] нар[одов]». Уласна я мяркую, [...] на гэта трэба адгукнуцца. Як Вы лічыце[5]?

1 чэрвеня [1982 г.] з сям'ёй збіраюся ў Давыд-Гарадок. Недзе 8-га зноў вярнуся ў Маскву. 22-га — уручэнне дыпломаў. А пасля зноў на ўсё лета дамоў. Вось мой палескі адрас: *225540, Брэсцкая вобл., г. Давыд-Гарадок, вул. Жданава, д. 18.*

Наконт «Маладосці». Трэба будзе завітаць да Грачанікава, можа нешта і атрымаецца.

Тэадор пераклаў ужо 16 вершаў Багдановіча. Пакуль што хоча зрабіць публікацыю ў браціслаўскім літаратурным тыднёвіку «Новэ слово». А далей будзе рыхтаваць кнігу. Справа, як мне здаецца, цікавая і патрэбная. Багдановіч у Славакіі яшчэ не выдаваўся.

Учора чытаючы брылёўскія мініяцюры, падумаў — няўжо ўсё патрэбна друкаваць? Ну, сонца ўзышло, ну, раса заззяла, ну, вольна дыхаецца раніцай і г. д. [...][6]. Калі палічыце патрэбным, скажыце пра гэта мне — пра Брыля і яго запісы[7].

Са спадзяваннем на ўсё лепшае развітваюся з Вамі. Калі пісаў, дакладней, калі пачынаў пісаць гэты ліст, хацелася быць і шчырым, і ўважлівым да Вас, а зараз, перачытаўшы ўсё напісанае, бачу, што якраз гэтага трохі і не стае. Думка страціла належную плынь.

Да 18 чэрвеня [1982 г.] пішыце мне ў Маскву, а далей — будзе Д[авыд]-Гарадок.

А зараз перада мной Ваша кніга «Что будет сниться», «Мол[одая] гвардия» [19]68 г. Чытаюць мае хатнія.

Ваш *Дранько-Майсюк*.

[1] Пісьмо за 16.05.1982 г., у якім, дарэчы, просячы папярэдзіць яго адносна маіх новых магчымых публікацый, М. Стральцоў параіў мне аднесці вершы і ў рэдакцыю часопіса «Маладосць».

[2] Дагэтуль мае творы ацэньваліся толькі ў Літінстытуце.

[3] У часопісе «Юность» (1982, № 6) была надрукавана падборка маіх вершаў у перакладзе М. Вірта.

[4] Гэтае цвёрдае «разам падумаем» хіба не сведчыць аб тым, што ўпэўненасць студэнта Л. Дранько-Майсюка часам заскоквала ў самаўпэўненасць.

[5] У пятым сваім лісце (9.06.1982 г.) М. Стральцоў даў такі адказ: «...Рады твайму ўспаміну пра Іну Андрэеўну — прыемна мне было. Нейкае харошае, бадай улюбёнае пачуццё да яе ў мяне засталося — таму і прыемна. Толькі вось прозы, на жаль, прыслаць ёй не магу. Хіба з часам прышлю ёй нешта накшталт нататак [...]. А наогул жа, паспра-

бую напісаць ёй і сам. Пакуль жа вітанні перадавай, скажы, што рады яе ўвазе, што скаланулася ва мне нешта добрае ў адказ, тое, што я чапаць баюся, а проста рады, што яно недзе прыхаванае ёсць...» Дарэчы, у «Дружбе народов» з 1968-га па 1977 г. друкаваліся самыя знакамітыя творы М. Стральцова — аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь», апавяданне «Смаленне вепрука», іншыя апавяданні, а таксама вершы.

[6] Зноў такі настраёвая думка студэнта, які знаходзіўся ў палоне ацэначных крайнасцяў. Цяпер перачытваю гэта з горкай усмешкай, бо Янка Брыль — мой любімы пісьменнік, аўтар «Марылі», «Гуртавога», «Ніжніх Байдуноў», «Муштука і папкі» — твораў, без якіх не ўяўляю сваё чытацкае жыццё.

[7] У пятым лісце М. Стральцоў прапанаваў такі аналіз: «...ягонае [Янкі Брыля] юнацкае захапленне Талстым, талстоўская прага споведзі, культ маральнай пакуты — у нейкім дзіўна і часам [...] скажоным выглядзе, абіўшыся [так у Стральцова. — *Л. Д.-М.*] у цяперашнім проста Іване Антонавічы, паўстае з ягоных мініяцюр...»

Восьмы ліст

20 чэрвеня [19]82 г. [Давыд-Гарадок]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Я доўга не адказваў на Ваш апошні ліст[1], збіраў да гурбы свае растрэсеныя думкі, марудзіў і нават свядома марудзіў. Вялікая шчырасць жыве ў Вашым лісце, а я палохаўся сваёй раптоўнае няшчырасці.

Маскву пакінуў увечары 17-га [чэрвеня 1982 г.]. Інстытут [...] скончыў, наперадзе, калі ўсё будзе добра, чакае праца ў выдавецтве. Увечары 19-га выправіў у Мінск сваю жонку[2]. У яе пачынаецца чарговая сесія. А сам да канца ліпеня застануся ў Давыд-Гарадку, буду глядзець свайго Васіля. А клопату з ім пакуль што хапае.

Чытаў і перачытваў Ваша выказванне [...] пра «юнацкае захапленне Талстым»[3] [...] Нешта такое бачыцца мне і ў Адамовічу, які [...] мерае ўсё па [...] Дастаеўскім. Дарэчы, чаму яго лічаць беларускім празаікам, калі ён піша па-руску? Нейкая таксама гульня ў беларусаў «русских». Мне гэта так не падабаецца[4].

Калі быў у Мінску, заходзіў у «Маладосць». Макаль дазволіў пакінуць шэсць вершаў. Трохі дзіўным паказаўся мне гэты чалавек і паходзіў ён у час нашай сустрэчы не на загадчыка аддзела паэзіі «Маладосці», а на літкансультанта райгазеты. Вельмі хочацца, каб [...] маё раптоўнае ўражанне было памылковым. Вершы ў «Маладосці», калі пойдуць, то некалі ў канцы года. А што не прыняў Макаль, занёс я Жуку ў «Лім». Вось такія ў мяне рэдакцыйныя справы. І яшчэ — «Юность» (№ 6) надрукавала тры маіх вершы ў перакладзе М. Вірты. Ёсць у гэтым нумары вершы Барадуліна і Бураўкіна.

У Маскве паспрабую быць у жніўні. Абавязкова зазірну ў «Дружбу народов». Можа да гэтага часу Вы зробіце для іх рукапіс.

Валянціна Міканораўна Шчадрына некалькі разоў ездзіла да Ів. П. Шамякіна ў «крамлёўку»[5]. Ён абяцаў, як толькі выйдзе, адразу ўзяцца за гомельскае начальства. Вашым лёсам ён глыбока заклапочаны. Я думаю, усё ў гэтым сэнсе будзе добра, бо Шамякін, слава богу, яшчэ з'яўляецца ў нашым свеце той сілай, якая здольная дапамагчы.

У Мінску бачыўся з Р. І. Барадуліным. Ён якраз з'яўляецца рэдактарам маёй кнігі[6]. Казаў мне, каб да верасня я падрыхтаваў рукапіс у канчатковым варыянце. Спрабую гэта рабіць.

Хлопчык мой спіць. А я, пакуль дайшоў да гэтай старонкі, некалькі разоў падбягаў да яго ложачка. Спіць ён варухліва.

Думка зноў вярнулася да Адамовіча. Як Вы лічыце, наколькі яго сённяшняя вядомасць (я гавару пра яго, як аб празаіку) адпавядае ісціне[7]?

Міхась Лявонавіч, можа пашчасціць, і некалі бліжэй да жніўня я прыеду да Вас. Вельмі хачу гэтага. І паспрабуйце для «Др[ужбы] нар[одов]» падрыхтаваць матэрыял. Мне здаецца, улічваючы ўсё, што такая публікацыя з усесаюзным выхадам проста неабходна. Калі ласка, пішыце ў [Давыд]-Гарадок.

Ваш *Лёня*.

[1] Пісьмо М. Стральцова за 9.06.1982 г.

[2] Мая жонка Вольга Шчадрына ў 1982 г. вучылася на філалагічным факультэце БДУ.

[3] Такая ацэнка — акрамя ўсяго іншага, яшчэ і вынік абставін; не трэба забываць, М. Стральцоў знаходзіўся ў той рэжымнай установе, якая не магла спрыяць душэўнаму спакою... У іншых умовах (на волі!) ён пісаў пра бескарыслівую праўдзівасць Янкі Брыля, што ў ягонай прозе яму падабалася новае разуменне эпічнасці, што слова аўтара «Птушак і гнёздаў» — слова ўплывовае і што Янка Брыль — гэта непрыманне самазадаволенасці. А яшчэ паводле М. Стральцова Янка Брыль — пісьменнік добрага паэтычнага слыху, і наогул у беларускім апавяданні існуе школа імя Янкі Брыля.

[4] Таксама студэнцкае меркаванне. Алесь Адамовіч — беларус па ўсёй глыбіні сваёй душы, аўтар выдатных твораў пра Якуба Коласа, М. Гарэцкага, Кузьму Чорнага, Янку Брыля, І. Мележа. У маскоўскім універсітэце ён чытаў бліскучыя лекцыі па беларускай літаратуры, а лепшую сваю празаічную рэч — «Хатынскую аповесць» — спачатку надрукаваў па-беларуску, а тады ўжо па-руску, што даволі сімвалічна.

[5] Цэнтральная клінічная бальніца 4-га Галоўнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя СССР; знаходзілася ў Кунцаве пад Масквой.

[6] Гаворка пра першы мой зборнік вершаў «Вандроўнік» (1983).

[7] У шостым сваім лісце да мяне (28.06.1982 г.) М. Стральцоў толькі намеціў адказ: «...Пра Адамовіча, калі хочаш, пагаворым іншы раз, у наст[упным], скажам, лісце. Можа, у звязку з Быкавым нават...» Свой адказ ён адклаў з той прычыны, што ў гэтым, шостым, пісьме даволі шырока выказаўся пра іншых пісьменнікаў і, гэта бачна, не хацеў у шэраг іншых ставіць Адамовіча. Невыпадкова ж даў знаць мне: калі ўжо гаварыць пра Адамовіча, то толькі ў звязку з Быкавым! Аўтар «Загадкі Багдановіча» і ў эпісталярным жанры пільнаваўся стылю!

Дзявяты ліст

2 ліпеня [19]82 г.

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Учора я атрымаў шмат лістоў, сярод якіх адшукаўся самы жаданы — Ваш[1]. Я нават і не чакаў, што ў ім столькі будзе пра Макаля[2]. А зараз, пішучы свой адказ, разумею, што столькі і патрэбна было — маладому пеўніку навука. Дзякуй Вам за гэта. Учора ж я перагарнуў макалёўскую кніжку «Дотык да зямлі» 1975 г. Уражання, на жаль, аніякага. Адчуваецца, што

тэхнічны бок справы ім засвоены добра. Але той жывінкі або, скажам гучна, — паэзіі, няма, ізноў такі на жаль[3]. У гэтым сэнсе Вярцінскі на шмат галоў вышэй за свайго сябра.

Званіў у Мінск. У нейкім нумары «ЛіМа» збіраюцца друкаваць мае вершы. Даведаўся, што ёсць нейкія заўвагі. Калі яны, лімаўцы, будуць людзьмі, то, спадзяюся, пакажуць мне свае заўвагі. А то аднойчы яны вырабілі штуку — далі маю падборку[4], у якой, ці не геній Свіркі папрацаваў, было 50 маіх слоў, а 50 іхніх.

А хатніх клопатаў у мяне зараз даволі. Хлопчык на руках — 29 чэрвеня яму быў годзік. І наварыць трэба, і папраць [...], і кніжку даць новую, каб ён раздзёр (асабліва любіць «политиздатовские» выданні), і спаць пакласці. А пра песні я ўжо і не кажу. Спяваю яму, што ў галаву ўзбрыдзе, нешта накшталт таго — хлопчык маленькі, хлопчык залаценькі, хлопчык будзе спаткі, бацьку анігадкі. А ён слухае і засынае.

З 1-5 жніўня збяруся ў Мінск. Буду ўладкоўвацца на работу, шукаць кватэру. З работай, здаецца, прасцей — бяруць у «Маст[ацкую] літ[аратуру]» да Ул. Паўлава. А з кватэрай трэба падумаць. А пакуль што не думаецца. Штодня маю трычатыры гадзіны вольныя. Спрабую чытаць. Неяк так атрымалася, не ведаю чаму, што ўсё ніяк не даходзілі рукі да польскай літаратуры. І вось ухапіўся за Б. Пруса, як за нешта нечуванае, у перакладзе Брыля. Прачытаў апавяданняў пяць-шэсць і падобраму ўсміхнуўся. Зрабіў вывад — ранні Брыль («Сірочы хлеб», «У сям'і» і яшчэ некалькі твораў) выйшаў адсюль. Здаецца, нават і сама інтанацыя прусаўская, толькі ў паляка болей кплівасці або гумару. У Брыля няма гэтага. Ёсць, відаць, больш засяроджанасці на рэчах, якія вакол дзіцяці.

А пра Адамовіча хацелася б пачуць, хоць і ў звязку з Быкавым. Справа ў тым, што мяне апошнія часы непакоіць такая даволі значная рэч — як адносіны да вайны. Талент Быкава [...] (накіраваны ў адзін бок) [...]. Я гавару пра тое, што тыя аповесці, якія з'явіліся пасля «Сотнікава»[5], амаль што нічога не прыбавілі да агульнай карціны — беларус на вайне. Пра нешта другое, новае, Быкаў, пэўна, пісаць ужо не можа[6] [...], таму

толькі перасоўвае акцэнты («Яго бат[альён]», «Воўч[ая] згр[ая]», «Пайсці і не вярн[уцца]»[7]). Адамовіч жа (даводзіць), што гэта «новы крок»[8] і г. д. [...] Адсюль мой неспакой і раздражнёнасць. Відаць, я не зусім маю рацыю, хоць нешта і адчуваецца [...] запраграмаванае зверху. У 6-м нумары «Дружбы народов» на тэму вайны выказаліся шэсць «ведущих писателей Белоруссии» (словы редакцыйныя) — Адамовіч, Казько, Жук, Шамякін, Быкаў. Брыдка было [...] чытаць[9]. Але хай жыве і гэта.

Развітваюся з Вамі, Міхась Лявонавіч. Прыехаць паспрабую, можа нават з Мінска. Шануйце сябе, каб яшчэ паваяваць. Я ў Вас ніколі не пытаўся пра здароўе. Баюся нават пытацца. Хай яго будзе столькі, колькі Вам патрэбна.

Зірніце, калі ласка, на гэты верш[10]. Ці варты ён увагі?

З павагай *Л. Дранько-Майсюк.*

[1] Шосты ліст М. Стральцова (28.06.1982 г.), дасланы ў Давыд-Гарадок.

[2] Падаўшы неканапічны партрэт П. Макаля, М. Стральцоў звяртаўся да мяне гэтак: «...Ты добра робіш, што хочаш людзей зразумець, не націскаючы на эмоцыі. Зразумець глыбінна — і псіхалагічна, і біягр[афічна], і праз літаратурны лёс...»

[3] Сёння творчасць П. Макаля я ацэньваю больш памяркоўна — ён, безумоўна ж, паэт, і ў ягоных кнігах ёсць «жывінка» — то-бок, паэзія.

[4] Мой няўдалы лімаўскі дэбют: Лявон (?) Дранько-Майсюк. Вершы «Прытча», «Ручай», «У тых мінулых снах...», «Ты мне што-небудзь расскажы...», «Выплісне з калодзежа вада...» (уступнае слова В. Коўтун) — «Літаратура і мастацтва», 12 снежня 1980 г.

[5] «Сотнікаў» (1970 г.) — аповесць В. Быкава.

[6] Дарма малады максімаліст Л. Дранько-Майсюк рабіў такія высновы! Якасна новыя творы В. Быкаў напісаў — гэта і «На чорных лядах» (1994), і «Жоўты пясочак» (1995), і «Сцяна» (1997), і «Доўгая дарога дадому» (2002).

[7] «Яго батальён» (1975), «Воўчая зграя» (1974), «Пайсці і не вярнуцца» (1978) — аповесці В. Быкава.

[8] Алесь Адамовіч шмат цікава і змястоўна пісаў пра творчасць Васіля Быкава. А што да маіх тадышніх ацэнак, то яны, мякка кажучы, вельмі і вельмі спрэчныя.

[9] Названыя пісьменнікі даволі блякла адказалі на пытанні часопіснай анкеты «Што нам сёння дае памяць пра вайну?» Тое, што я чуў пра вайну ад бацькі і маці, было нашмат цікавейшым.

[10] Далей у лісце — верш «Ігруша», які быў упершыню надрукаваны У. Някляевым у газеце «Знамя юности» за 20 кастрычніка 1983 г.

Дзясяты ліст

13.07.[19]82 г. [Давыд-Гарадок]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Дзякуй Вам за шчырасць, за ўвагу да мяне. Добрая гэтая гутарка, што так нечакана пачалася паміж намі, ужо дапамагла мне ў такой вялікай справе, як свая ўласная ўстойлівасць або цвёрдасць падчас сустрэч з розным або з рознымі.

Пра Быкава адзін масквіч, якога я вельмі паважаю, гаварыў мне: «Лёнечка, ну и что ж такого... У Быкова слабо чувствуется нац[иональный] колорит, язык и проч., ну и пусть не чувствуется. Быков писатель общеевропейского масштаба, незачем ему встряхивать одежками нац[ионального] своеобразия...» Але такая абскубаная еўрапеізацыя мяне ніколі не цікавіла, дакладней кажучы, не захапляла. І разам з тым, усё напісанае Быкавым я ахвотна прачытаў. І зараз чакаю яго новай аповесці «Знак бяды» (8-мы нумар «Полымя»[1]). А раптам ён падужае свой рацыяналізм[2]?

Мне было прыемна адшукаць у Вашым лісце добрыя словы аб Адамчыку. Мне здаецца, што яго два раманы[3], вельмі значныя для нашай літаратуры, якраз і пераадольваюць тое вузкае фальваркоўства, пра якое Вы згадалі, відаць, маючы на ўвазе апавяданні Адамчыка.

Неяк, а так заўсёды здараецца ў мяне, калі душа напечана паганымі думкамі, зрабіў я прыкладна такі запіс: «А ці трэба абараняць усё беларускае? Ці само яно патрабуе абароны? Маецца на ўвазе сапраўднае беларускае — Купала, Багдановіч, нашы песні, казкі, наша гісторыя і г. д. Калі яно сапраўднае, то ж яно і моцным павінна быць, і такім чынам яго ніколі не захлісне

брудная хваля русіфікацыі. А сама гэта хваля, якая штогод мацнее і шырыцца, некалі сама задушыцца ў сваім уласным брудзе. І адсюль такі выснаваўся вынік — усё ідзе сваім ладам, і трэба спакойна рабіць сваю работу».

І аднак жа гэта заспакаенне не супакойвае. Таму спакойна працуючы, мы нічога не зменім [...], нават калі і створым шэдэўры. Бо шэдэўры тыя з цягам часу, можа і так здарыцца, ужо ніхто не прачытае. Ратунак, відаць, можна было б пашукаць на тым полі, якое называецца дзяржаўнасцю. Беларусы ніколі гэтага поля не ўраблялі. Хоць працавалі і працуюць шмат, ды ўсё на карысць чужым. Здаецца, дарэчы прыгадваюцца купалаўскія радкі: «Вораг польскі і рускі / Шчыра множыў курганы, — / Не было Беларусі, / Толькі быў «Край забраны»...[4]

Цяжка мне пра гэта гаварыць, бо калі я звяртаюся з нейкімі такімі пытаннямі да сваіх сяброў, суседзяў, нават бацькоў, усе здзіўлена на мяне глядзяць. Некалі Глебка гаварыў, што паляк яшчэ не паспее нарадзіцца, а ўжо крычыць: «Я поляк малы»[5]. А беларус сябе ніколі беларусам не назаве, назаве сябе тутэйшым альбо рускім — у залежнасці ад таго, куды ён ходзіць: у царкву ці ў касцёл. Зноў жа можна супакоіцца і палічыць усё вышэй сказанае нашай нац[ыянальнай] адметнасцю. Шмат хто так і робіць.

Я Вам хачу паказаць свой верш, які трохі адпавядае гэтым сумным настроям[6]. У ім ёсць радок «сугучны стральцоўскай прозе». Верш пісаўся ў той час, калі я з вялікім задавальненнем чытаў Вашы апавяданні.

Яшчэ раз дзякую Вам за добрыя адносіны да мяне. Буду чакаць Вашых шчырых заўваг і думак.

Ваш *Дранько-Майсюк*.

[1] Васіль Быкаў. Знак бяды / Полымя, 1982, № 8. Менавіта ў гэтым творы В. Быкаў раскрыўся, як вялікі нацыянальны мастак!

[2] Адносна гэтага ў сёмым лісце 8 ліпеня 1982 г. М. Стральцоў так скіраваў маю ўвагу: «...У Быкава ёсць *зыходны* матэрыял, ёсць імкненне псіхалагічна-абагуленага даследавання, але і, па-сутнасці, таго ж *матэрыялу* і няма, ёсць толькі імпульс, яго я, у дадзеным выпадку, і разумею як *матэрыял*. А далей... рацыяналізм... На рацыяналізм

хварэе і Адамовіч. Толькі ён яшчэ і «філасофствуе». Не будзем абгаворваць феномен мовы. Айтматава цяжка зразумець, але яму памагае ў тым, чаго ён дамагаецца, пэўнасць менавіта нацыянальнай стыхіі... З нашымі Адамовічамі і Быкавымі тут складаней...»

[3] «Чужая бацькаўшчына» (1978) і «Год нулявы» (1983). Апошні раман я чытаў у часопісе «Полымя» (1982, № № 3–5).

[4] Радкі з верша Янкі Купалы «Летапіснае» (1928).

[5] У П. Глебкі думка выказана так: «...Беларус (характарыстыка нацыі). А што такое беларус? Сам ён ніколі не называў сябе так. Адказваў на пытанне пра нац-насць: — Не ведаю. Або: — Тутэйшы. Не тое што паляк. Той адразу, нават з калыскі, адказваў: «Хто ты естэсь? Поляк малы». Але не думайце, што «тутэйшы» такі ўжо наіўны. Калі ў панскім маёнтку ён адказваў на пытанне: «Адкуль ты?» — «Тутэйшы», дык ён падразумяваў, што не сам пан тут гаспадар...» («Мая анкета», раздзел «Нацыянальнасць»).

[6] Маецца на ўвазе верш «Храм беларускі», які яшчэ на стадыі выдавецкага рэдагавання быў зняты з кнігі «Вандроўнік» (1983).

Адзінаццаты ліст

26.07.[19]82 г. [Давыд-Гарадок]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Пасля Вашага ліста (за 21.07.1982 г.)[1] ухапіўся я чытаць «Кала Бруньёна»[2]. Цешыўся добрай прозе і думаў, а няўжо няма ў нас свайго Бруньёна? Гумар і шчыры смех беларусам уласцівы гэтак жа сама, як і французам. І наогул наша душа мае ўсё тое, што b душа людская. У гэтым сэнсе Бог роўна падзяліў. А вось ці маем мы свайго літаратурнага Бруньёна? Мяркую, што не маем. Бо і незабыўнай душэўнай моцы дзядзька Антось[3], і кудраўцоўскі Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі[4], і мележаўскі Зайчык[5], і купалаўскія прымакі[6], і сучасныя байдуны[7], і яшчэ нешта — усё гэта даволі здробнена ў параўнанні з раланаўскім героем. Бруньён шырэй і больш бесклапотна глядзіць на свет, чым гэта робіць коласаўскі Антось. Бог для Антося гэта мяжа, праз якую не пяройдзеш, а Бруньён такой мяжы нават не заўважае. Досціп Антося грунтуецца на вобразах жыцця навакольнага,

а Бруньёнаўскі, апрача гэтага, яшчэ і на «мудрасці кніжнай»[8]. Культура трошкі іншая і ў гэтым, відаць, уся справа. Але вылепіць [...] нешта сваё, адметнае, беларус яшчэ знойдзе сілу.

Што мне паказалася цікавым і вельмі істотным у раманах Адамчыка — думка пра шчасце, каханне, жыццёвы спакой і думка пра смерць. Усяго гэтага пазбаўлена гераіня раманаў Алеся. Нават падумаць страшна — пазбаўлена смерці! Жыві, а як жыць? У гэтым сэнсе фінал першай кнігі проста выдатны. У адрозненне ад мележаўскай Ганны Алеся парушае самае немагчымае для вясковай кабеты: «Не убий!». Яна забівае, таму яна яшчэ і пазбаўлена даравання людскога і Боскага. Адамчык пераканаўча аб гэтым гаворыць.

Вы кажаце, што ў Адамчыка, у яго таленце, мала гармоніі і элемента «мысліцельнага»[9]. Здаецца, так я Вас зразумеў. Хочацца папрасіць у Вас тлумачэння, бо ў маім разуменні гэтыя раманы якраз і жывуць нейкай вялікай першароднасцю, яснасцю прыроды і чалавечага жыцця[10].

29 ліпеня паеду ў Мінск, пасля ў Маскву на колькі дзён. Буду выпісвацца[11], а таксама трэба атрымаць дыплом. У Мінску трэба шукаць жытло. Ніколі не шукаў, не ведаю, як гэта рабіць, з чаго пачынаць[12].

Вельмі Вам удзячны я, Міхась Лявонавіч, за ўважлівае прачытанне майго верша[13]. Ваша падтрымка і добрыя словы для мяне, як пагода ў час жніва. Не пакідаю думкі завітаць да Вас. Дай Бог, каб гэта спраўдзілася ў жніўні. Вельмі добра было б. Глядзіце сябе, не марнуйце дарма сілы (ці мала ёсць недарэчнасцяў, на якія яны зводзяцца?). Наперадзе яшчэ шмат цікавай работы.

Развітваюся з Вамі і як заўсёды чакаю Вашых лістоў. Пішыце ў Давыд-Гарадок.

Ваш *Дранько-Майсюк*.

[1] У гэтым, восьмым па ліку, пісьме М. Стральцоў, заўсёды непрыхільны да раманаў з працягам, даваў такую карціну: «...У нас на Беларусі, здаецца мне, акрамя іншага, нейкая Аўстра-Венгерская правінцыя («лоскутная») жыццёвых сопляў і душ — нам цяжка перамагаць гэта, і сведчаннем таму хаця б літаратура. І «Кала Бруньёнаў» не

нараджаецца, і «Працэсаў» кафкіянскіх таксама не адбываецца. Нейкія гіпертрафіраваныя (з галавой плеазаўра) эпапенцыі («На рубяжы вякоў» [раман А. Чарнышэвіча], «На парозе будучыні» [раман М. Лобана] і г. д.) Мележ зайшоў па гэтай дарозе ў тупік — навошта яшчэ і Адамчыку?..»

[2] «Кала Бруньён» — аповесць лаўрэата Нобелеўскай прэміі, французскага пісьменніка Рамэна Ралана.

[3] Персанаж паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» (1923).

[4] Герой прозы Анатоля Кудраўца — спачатку дзейнічаў у апавяданні, якое так і называлася «Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі» (1979), а тады ўжо і ў рамане «Сачынне на вольную тэму» (1984).

[5] Гарэзны Зайчык, у якога дзяцей поўная хата, — дзеючая асоба ў рамане Івана Мележа «Людзі на балоце» (1962).

[6] «Прымакі» — сцэнічны жарт у адным акце, створаны Янкам Купалам у 1913 г.

[7] Алюзія на дзівосную аповесць Янкі Брыля «Ніжнія Байдуны» (1975).

[8] Словазлучэнне з верша Янкі Купалы «Мая навука» (1919): «Мне мудрасці кніжнай не даў Бог пазнаці, / Мой бацька не мог даць раскошаў такіх — / Наўчыўся я слоў беларускіх ад маці / І дум беларускіх без школы і кніг».

[9] На гэты конт у восьмым лісце М. Стральцоў выказаўся гэтак: «... Баюся, што многія з нас бяруцца за пяро «без бога ў душы» — нават таленавітыя. Калі-небудзь пагаворым з табой пра раманы Адамчыка — такі бліскучы талент, і так мала ў ім усё той жа гармоніі, не кажучы ўжо пра элемент «мысліцельны», што не абавязковы для рамана наогул...»

[10] У наступным, дзявятым, лісце (14.08.1982 г.), дасланым у Давыд-Гарадок, М. Стральцоў даў разгорнутае тлумачэнне: «...Наконт Адамч[ыка]. Я, здаецца, выказаўся пэўна. Не супраць паэзіі ягонай я, не супраць паўнакроўнасці ў адлюстраванні жыцця, калі не абыходзяцца «вечныя» праблемы чалавечага існення, — без гэтага [адно слова не чытаецца. — *Л. Д.-М.*] мастацтва сапраўднага наогул не бывае. Я казаў пра пэўную «безадноснасць» раманнай канструкцыі, раманнай формы — а ўвогуле — *канцэпцыі рамана як жанру ў сучасных умовах*. Што ў Адамч[ыка] раманы, і харошыя, — супраць гэтага пярэчыць можа хіба бурбон, гэтак жа, як і ставіць пад сумненне іх *літара*турнае, г. зн. *прафесійнае* майстэрства. Я хацеў сказаць толькі, што аднаго гэтага мала. Зноў кажу, арыгінальнай думкі няма і раманнай (жанравай) і сугуба творчай, па-мастацку — індывідуальнай! Я ўвесь час пытаю сябе — дзеля чаго? Прывесці да нейкай развязкі

раманных калізій — калі ласка! Але *як* і *якіх*? Мы любім вырашаць усё грамадскай падзеяй, гісторыяй — якая *адбылася* — тут, маўляў, гіст[арычны] аптымізм, праўда аб'ектыўная гісторыі і г. д. і г. д. Але ж гэта *ілюстрацыя* і храналогія, якую, папраўдзе, наўрад ці схаваеш пад майстэрствам. Што далей? Абарваць раманы, іх працяг храналагічны, як гэта здарылася з Мележам, дзе «пасобілі» «боскія» акалічнасці, працягваць — дакуль? Бясконца? Вось я пра што!..»

[11] Мае маскоўскія сябры і знаёмыя лічылі мяне вар'ятам, што па сваёй волі я адмовіўся ад маскоўскай прапіскі.

[12] На некалькі месяцаў я знайшоў прытулак у Валянціна Акудовіча (дзякуй яму!), які жыў тады ў аднапакаёвай кватэры на вуліцы Пятра Мірашнічэнкі. У 1984 г. я пазнаёміў В. Акудовіча з Міхасём Стральцовым, які працаваў тады ў рэдакцыі часопіса «Нёман». М. Стральцоў папрасіў В. Акудовіча напісаць пра Янку Брыля, і ў выніку з'явіўся бліскучы артыкул пра аўтара «Ніжніх Байдуноў» (В. Акудович. Быть собеседником: заметки о прозе Янки Брыля / «Нёман», 1985, № 1).

[13] Верш «Храм беларускі».

Дванаццаты ліст

[28.08.1982 г. Масква]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Ваш ліст, датаваны 14.08, я атрымаў у Маскве. З Д[авыд]-Гарадка[1] яго мне прывезла жонка. Наконт эпасу нашых эпікаў і ў прыватнасці наконт Айтматава увогуле згодзен[2]. Ёсць аднак нейкія дэталі ў мяне, пра якія і сапраўды варта пагаманіць пры сустрэчы.

Што раблю ў Маскве? Выпісваюся, пакідаю вялікую сталіцу, еду ў Мінск. На працу ўладкаваўся ў «Мастацкай літаратуры», у рэдакцыі паэзіі. Самае для мяне надзённае зараз — [...] кватэра. Заходзіў у Саюз, напісаў заяву на імя Танка[3]. Недзе ў верасні павінны разгледзець. Спадзявання вялікага на тое, што ўсё вырашыцца станоўча, не маю, але ж нейкая маленькая надзея ўсё пацвельвае мяне. А раптам... Праўда, мяне яшчэ ў Мінску мала ведаюць як літаратара, таму «плошчу» могуць аддаць якому-небудзь шафёру ці бухгалтару літфонду. Хоць шчыра кажучы, і яны ж людзі, ім таксама патрэбна. Але хопіць пра гэта.

Як толькі ў Мінску з'явіцца ў мяне якое-небудзь жытло, адразу Вам паведамлю[4].

Буду вельмі рады, калі Вы прачытаеце гэты мой верш[5]. А пішацца даволі скупа — верш у месяц. Пішыце мне пакуль што ў Д[авыд]-Гарадок. У верасні я туды збіраюся.

Жонка мая і мой малы Васіль жадаюць Вам самых вялікіх поспехаў.

Ваш *Леанід*.

[1] Гэты ліст (дзявяты па ліку) М. Стральцоў напісаў мне ў Давыд-Гарадок.

[2] Згадваючы аб'ёмістыя, толькі з павярхоўным кірункам на эпас, раманы беларускіх празаікаў, у сваім дзявятым пісьме М. Стральцоў даводзіў: «...гэты эпас — запознены і не можа сур'ёзна ўплываць на літаратурны працэс [...], эпас патрэбен нейкі другі, калі патрэбны цяпер увогуле. У апошнім, напрыклад, я не дужа ўпэўнены [...]. Хіба ў Айтматава «мележаўскі», «сачанкаўскі», «адамчыкаўскі» эпас? У пісьменніка, які, здавалася б, павінен быць пад уплывам выразных форм нац[ыянальнага] эпасу, нацыянальнага ўкладу, традыцый, якія, сам ведаеш, куды *больш пэўныя, адасоблена-закончаныя, чым нашы*? А ён [Айтматаў], не перастаючы быць нацыянальным, гаворыць з намі вунь на якім узроўні думкі і формы...»

[3] У 1982 г. Максім Танк з'яўляўся старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі.

[4] Аднапакаёвую кватэру я атрымаў у лютым 1983 г.

[5] Маецца на ўвазе верш «Паэзія», упершыню надрукаваны У. Някляевым у газеце «Знамя юности» за 20 кастрычніка 1983 г. Пазней верш быў уключаны ў зборнік «Вандроўнік», а таксама ў кнігу «Гаспода» і ў новай рэдакцыі ў кнігу «Места і свет».

Трынаццаты ліст

18 верасня [19]82 г. [Давыд-Гарадок]

Паважаны Міхась Лявонавіч!

Учора я прыехаў у свой Давыд[-Гарадок], марыў знайсці тут Ваш ліст[1]. Заўтра ўвечары збіраюся зноў у Мінск, маці ўжо

ўзяла білета. Дарэчы, Вы можаце мне напісаць на выдавецтва: *220600, пр. Машэрава, 11.*

Шмат у мяне пакуль хатніх спраў. З прапіскаю, здаецца, усё абыходзіцца няблага[2], а вось з кватэрай невядома. Кажуць, што будуць нешта даваць у Саюзе, заяву я напісаў.

Заходзіў з вершамі да Вялюгіна[3]. Ён адабраў вершаў 12 і шчыра са мной пагаманіў. А мне такія рэчы заўсёды прыемныя.

У выдавецтве работы хапае. Рукапісаў шмат, і амаль палова з іх нічога не вартая. У нас перамены. Вадзім [Спрынчан] будзе загадваць рэдакцыяй, Ул. Андр. Паўлаў пайшоў на месца Шахаўца. А «Папа»[4] на пенсію.

Пішыце мне, Міхась Лявонавіч.

За апошні месяц я ўжо занадта паглыбіўся ў сваё ўласнае, таму, відаць, наша перапіска нешта страціла прывабнае для нас абодвух.

Ваш *Дранько-Майсюк.*

P. S. Заходзіў у машбюро і бачыў, як дзяўчаты[5] перадрукоўвалі вершы з «Ценю ад вясла»[6]. Гэта, відаць, на тую кнігу, якая запланавана ў перавыданнях[7].

[1] Дзясяты (апошні) ліст ад М. Стральцова я атрымаў у Мінску 6 кастрычніка 1982 г.

[2] Мяне прапісаў у сваёй кватэры (Мінск, вуліца Карла Маркса д. 36, кв. 24) Уладзімір Караткевіч.

[3] Гэта значыць, я заходзіў у рэдакцыю часопіса «Полымя».

[4] «Папа» — такую жартоўную мянушку насіў у выдавецтве У. Шахавец.

[5] Супрацоўніцы выдавецтва С. Расянчук і Л. Ганчарэнка.

[6] «Цень ад вясла» — зборнік вершаў М. Стральцова, які быў выдадзены ў 1979 г.

[7] Маецца на ўвазе рэдакцыя перавыданняў; кніга выбраных вершаў М. Стральцова ў гэтай рэдакцыі (серыя «Бібліятэка беларускай паэзіі») «Яшчэ і заўтра» ўбачыла свет у 1983 г.

Уступнае слова і заўвагі Леаніда Дранько-Майсюка

ДАДАТАК

Рэкамендацыі М. Стральцову для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў

1

Гады паўтара ў адным з нумароў газеты «Літаратура і мастацтва» я прачытаў апавяданне, падпісанае невядомым мне тады імем — Міхась Стральцоў. Апавяданне мяне парадавала тым, што аўтар яго, адчуў я, удумліва, сур'ёзна глядзіць на жыццё, дбайліва, патрабавальна ставіцца да якасці твора, да мовы. Прыемна было адчуваць, што ўжо на гэтым апавяданні была адзнака і бясспрэчнай таленавітасці аўтара, і немалой творчай культуры.

Першае ўражанне, як я потым пераканаўся, не было памылковым. З наступных апавяданняў яшчэ больш выразна акрэсліліся асаблівасці Стральцова, як празаіка: строгасць і сціпласць пісьма, непрыхільнасць да ўсялякай позы, крыклівасці, фальшу, паэтычнае бачанне звычайнага, паўсядзённага ў жыцці, уважлівая работа над мовай.

Я перакананы, што з Міхасём Стральцовым у нашу літаратуру ідзе сур'ёзны, таленавіты празаік і рэкамедую яго прыняць у члены Саюза пісьменнікаў Беларусі.

10 лютага 1962 г. Іван Мележ

2

Міхась Стральцоў выдаў кніжку апавяданняў «Блакітны вецер». Гэтая кніжка вельмі прыемна чытаецца. У ёй Стральцоў заяўляе аб сабе не як барзапісец, а як мастак. Ён скупы на слова, эканомны ў выбары мастацкіх сродкаў, шукае яркасці, тыповасці, адчувае мяжу мастацкага. Ад гэтага відзён характар, чутна атмасфера, жыве вобраз. Можна смела сказаць, што

Стральцоў займаецца літаратураю ад патрэбы душы, а гэта ўжо гарантыя, што з літаратураю ён звязвае сябе невыпадкова.

Апроч апавяданняў Стральцоў даволі актыўна выступае з рэцэнзіямі, з аглядамі літаратуры — у «ЛіМе», «Беларусі», «Нёмане», «Полымі» — і ў гэтых артыкулах выяўляе сябе таксама, як чалавек удумлівы, сур'ёзны.

Раю прыняць Міхася Стральцова ў члены СП.

6 лютага 1962 г. Янка Скрыган

3

Я, Пташнікаў Іван Мікалаевіч (член Саюза пісьменнікаў, білет № 5905), рэкамедую ў члены Саюза пісьменнікаў СССР Стральцова Міхася Лявонавіча.

Апавяданні Міхась Стральцоў пачаў друкаваць яшчэ ў 1957 г. у часопісе «Маладосць» і выступаў пасля рэгулярна ў перыядычным друку: друкаваўся ў часопісах «Полымя», «Маладосць», у газеце «Літаратура і мастацтва».

Яго апавяданні «Перад дарогай», «Двое ў лесе», «Суседзі», «Блакітны вецер» прасякнуты роздумам над жыццём, лірызмам; вобразы ў іх свежыя, поўныя, акрэсленыя, выпісаныя выпукла, раскрыты глыбока і пераканальна. Наогул, Міхась Стральцоў — мастак, і мастак сучасны.. Тэматыка яго твораў — наша сучаснасць, з яе героямі і канфліктамі.

Апавяданні Міхася Стральцова выйшлі ў 1962 годзе ў Белдзяржвыдавецтве ў кнізе «Блакітны вецер».

Міхась Стральцоў выступае яшчэ часта з крытычнымі артыкуламі па пытаннях літаратуры ў газетах і часопісах.

Міхася Стральцова варта прыняць у члены Саюза пісьменнікаў, як чалавека таленавітага і сціплага, які звязаў сябе з літаратурай.

7 лютага 1962 г. Іван Пташнікаў

КАМЕНТАР

ПРЫ ЎРАЧЫСТЫМ СВЯТЛЕ ДНЯ
Успаміны пра Міхася Стральцова

Ала Сямёнава. «Раніцай яснага мая...» (с. 15). Урывак з эсэ «Бэзавы попел». Друкуецца паводле выд.: Сямёнава А. Святло загадкі (1995).

Сямёнава Ала (нар. 1938) — празаік, літаратуразнавец. Пасля заканчэння БДУ працавала рэдактарам выдавецтваў «Навука і тэхніка», «Мастацкая літаратура», у аддзеле крытыкі часопіса «Нёман». Аўтарка кніг «Слова сапраўднага лад», «Святло загадкі», «У святой краіне выгнання» ды інш. Жыве ў Мінску.

Таццяна Арлова. Грустные улыбки XX века (с. 26). Друкуецца паводле выд.: Свет близких звёзд: эссе и очерки выпускников факультета журналистики БГУ / Сост. Л. Саенкова (2014).

Арлова Таццяна (нар. 1935) — тэатразнавец, педагог. Пасля заканчэння БДУ працавала ў рэдакцыі газ. «Знамя юности», у выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя», выкладала ў БДУ. Аўтарка кніг «Ты і я», «Купалаўцы: эцюды пра акторaў», «Тэатральная крытыка новага часу» ды інш. Жыве ў Мінску.

Аляксандр Станюта. Астатняе — у маўчанні (с. 35). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Станюта Аляксандр (1936–2011) — пісьменнік, літаратуразнавец, доктар філалагічных навук. Закончыў БДУ (1960), дзе ўсё жыццё выкладаў рускую класічную літаратуру. Аўтар кніг «Плошча Свабоды», «Стэфанія», «Сцэны з мінскага жыцця» ды інш.

Алесь Жук. Памяць аб радасці (с. 40). Друкуецца паводле газ. «Новы час», 25 кастрычніка 2013 г.

Жук Алесь (нар. 1947) — празаік, перакладчык. Пасля заканчэння філфака БДУ працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура», у апараце ЦК КПБ, галоўным рэдактарам тыднёвіка «Літаратура і мастацтва», часопіса «Нёман». Аўтар кніг «Паляванне на апошняга жураўля», «Праклятая любоў», «Вечаровае сонца» ды інш. Жыве ў Мінску.

Анатоль Вярцінскі. Падарожжа да Міхася Стральцова (с. 50). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Вярцінскі Анатоль (нар. 1931) — паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Пасля заканчэння БДУ працаваў у рэдакцыях газет, у апараце Саюза пісьменнікаў, галоўным рэдактарам тыднёвіка «Літаратура і мастацтва», дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі. Аўтар кніг «Чалавечы знак», «Ветрана», «Хлопчык глядзіць» ды інш. Жыве ў Мінску.

Васіль Зуёнак. Той куст ядлоўцавы... (с. 56). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Зуёнак Васіль (нар. 1935) — паэт, перакладчык, эсэіст. Пасля заканчэння БДУ працаваў у апараце Саюза пісьменнікаў, галоўным рэдактарам часопісаў «Маладосць» і «Бярозка», узначальваў СП Беларусі. Аўтар кніг «Крэсіва», «Жніўны дзень», «Паміж небам і зямлёй» ды інш. Жыве ў Мінску.

Ніна Шклярава. Азірніся! (с. 66). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Шклярава Ніна (нар. 1947) — паэтка, перакладчыца. Закончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, інструктарам райкама камсамола. Аўтарка кніг «Дзічка», «Аберуч», «Аканіцы» ды інш. Жыве ў Гомелі.

Мікола Гіль. Мой сябра Міша Стральцоў (с. 70). Друкуецца ў скароце паводле час. «Полымя», 2016, № 1–2.

Гіль Мікола (сапр. *Гілевіч*; нар. 1936) — празаік, публіцыст. Пасля заканчэння БДУ працаваў у рэдакцыях перыядычных выданняў, быў галоўным рэдактарам тыднёвіка «Літаратура і мастацтва» і часопіса «Мастацтва». Аўтар кніг «Пуд жыта», «Кім і Валерыя», «Бралася на дзень» ды інш. Жыве ў Мінску.

Ніна Работа. «Гэй, дзень добры! Жыву!» (с. 104). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Работа Ніна (сапр. *Кішкурна*; нар. 1940) — педагог. Пасля заканчэння БДУ працавала настаўніцай у школах на Міншчыне, у сталічных установах адукацыі. Жыве ў Мінску.

Данута Бічэль. Легенда Стральцова (с. 107). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Бічэль Данута (нар. 1937) — паэтка, эсэістка, перакладчыца. Пасля заканчэння філфака Гродзенскага педінстытута імя Я. Купалы настаўнічала, працавала дырэктарам Музея М. Багдановіча, узначальвала абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў. Аўтарка кніг «Дзе ходзяць басанож», «Хадзі на мой голас», «Мост святога Францішка» ды інш. Жыве ў Гродне.

Фёдар Яфімаў. Яснае святло з суседняй вуліцы (с. 114). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Яфімаў Фёдар (нар. 1933) — паэт, перакладчык. Служыў у Савецкай арміі на афіцэрскіх пасадах, завочна закончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага. У 1968 г. быў звольнены з працы і выключаны з партыі за асуджэнне савецкай акупацыі Чэхаславакіі. Аўтар кніг «Армия», «Светлые зимние ночи» «Перейти поле» ды інш. Жыве ў Мінску.

Валянцін Тарас. Міша, Міша... (с. 116). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Тарас Валянцін (1930–2009) — паэт, публіцыст, перакладчык. Пасля заканчэння журфака БДУ працаваў у рэдакцыях газеты «Звязда» і часопіса «Нёман». Аўтар кніг «Пазіцыя», «Дань времени», «На выспе ўспамінаў» ды інш.

Уладзімір Мехаў. «Быццам апошні раз жыву на зямлі...» (с. 121). Друкуецца паводле час. «Полымя», 1988, № 10.

Мехаў Уладзімір (сапр. *Няхамкін*; нар. 1928) — празаік, публіцыст. Пасля заканчэння БДУ працаваў у рэдакцыях «Чырвонай змены», «Літаратуры і мастацтва», на Беларускім радыё. Аўтар кніг «Зарево», «Старадаўняя гравюра», «Сустрэчы ў радыёстудыі» ды інш. Жыве ў Мінску.

Аляксандр Дракахруст. Посвящение в поэты (с. 125). Друкуецца паводле выд. Дракохруст А. Что было, то — было: из воспоминаний и записных книжек (2006), дзе тэкст не мае назвы; загаловак — укладальніка.

Дракахруст Аляксандр (1923–2009) — паэт, перакладчык. Закончыў Маскоўскую ваенна-інжынерную навучальню і Хабараўскі педістытут, працаваў у рэдакцыях вайсковых газет. Аўтар кніг «Мои вы годы-эшелоны», «Круговорот», «Исповедь» ды інш.

Уладзімір Някляеў. Яго няма ў чым папракнуць (с. 127). Друкуецца паводле выд.: Шапран С. Уладзімір Някляеў: незавершаная біяграфія («Дзеяслоў», 2015, № 72); *З цыкла «Знакі прыпынку» (с. 130).* Тэксты друкуюцца паводле выд.: Някляеў У. Знакі прыпынку (2013) / Укл. і кам. С. Шапрана; Някляеў У. Выбраныя творы (2010) / Укл. і кам. В. Болдыравай; Някляеў У. Паэт з рысамі рыцара / Народная воля, 10 кастрычніка 2007 г.

Някляеў Уладзімір (нар. 1946) — паэт, празаік, грамадска-палітычны дзеяч. Завочна закончыў Мінскі педістытут, працаваў у рэдакцыях газеты «Знамя юности», на Беларускім тэлебачанні, быў галоўным рэ-

дактарам часопіса «Крыніца» і тыднёвіка «Літаратура і мастацтва», узначальваў Саюз пісьменнікаў. Аўтар кніг «Прошча», «Кон», «Цэнтр Еўропы» ды інш. Жыве ў Мінску.

Марына Наталіч. Позірк за небакрай (с. 132). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Марына Наталіч (сапр. *Наталля Давыдзенка*; 1950) — паэтка, перакладчыца. Пасля заканчэння філфака БДУ працавала ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», у Нацыянальна-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны. Аўтарка кніг «Странница», «Фрагменты жизни развесёлой», «Палыновая зорка» ды інш. Жыве ў Мінску.

Леанід Дранько-Майсюк. Устойлівае суседства (с. 136); Адзіноцтва зоркі (с. 138). Тэксты друкуюцца паводле час. «Дзеяслоў», 2005, № 18.

Дранько-Майсюк Леанід (нар. 1957) — паэт, празаік. Пасля заканчэння маскоўскага Літаратурнага інстытута працаваў рэдактарам у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Аўтар кніг «Над пляцам», «Акропаль», «Стомленасць Парыжам» ды інш. Жыве ў Мінску.

Уладзімір Ягоўдзік. З дзённікавых запісаў (с. 142). Друкуецца паводле выд. Ягоўдзік У. Белыя рысы на чорным полі (1995).

Ягоўдзік Уладзімір (нар. 1956) — празаік. Пасля заканчэння філфака БДУ працаваў на Брэсцкай абласной тэлестудыі, у рэдакцыях газет «Заря» і «Літаратура і мастацтва», быў галоўным рэдактарам часопіса «Бярозка». Аўтар кніг «Стронга», «Прыручэнне птушкі», «Сонейка, свяці!» ды інш. Жыве ў Мінску.

Алесь Пісьмянкоў. Настальгія па чыстым (с. 143). Друкуецца паводле выд.: Пісьмянкоў А. Я не памру, пакуль жыву (2000).

Пісьмянкоў Алесь (1957–2004) — паэт, эсэіст. Пасля заканчэння філфака БДУ працаваў у рэдакцыях «Літаратуры і мастацтва», «Полымя», у апараце Саюза пісьменнікаў. Быў галоўным рэдактарам «ЛіМа», часопіса «Вожык». Аўтар кніг «Белы камень», «Планіда», «Не знікай» ды інш.

Адам Глобус. Словы пра паэта Міхася Стральцова (с. 144). Друкуецца паводле газ. «Звязда», 28 ліпеня 2012 г.

Адам Глобус (сапр. *Уладзімір Адамчык*; нар. 1958) — паэт, празаік, мастак, кнігавыдавец. Закончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, працаваў мастаком-рэстаўратарам, у рэдакцыі часопіса «Крыніца», узначальваў выдавецтва «Сучасны літаратар». Аўтар кніг «Парк», «Толькі не гавары маёй маме», «Койданава» ды інш. Жыве ў Мінску.

Фама Варанецкі. Ён так маўчаў, што заслухаешся (с. 147). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Варанецкі Фама (нар. 1938) — актор, педагог. Закончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працаваў у Дзяржаўным тэатры імя Якуба Коласа, у Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы, выкладаў у Беларускай Акадэміі мастацтваў. Жыве ў Мінску.

Аляксей Гардзіцкі. Парада сябра (с. 150). Друкуецца паводле час. «Полымя», 1998, № 3.

Гардзіцкі Аляксей (1934–1999) — журналіст, празаік. Закончыў Брэсцкі педістытут, настаўнічаў, працаваў сакратаром райкама камсамола, у Інстытуце літаратуры Акадэміі навук, у апараце Саюза пісьменнікаў. Аўтар кніг «Сябрына», «Зразумець як сваё», «Вачыма маіх сяброў» ды інш.

Рыгор Барадулін. Конь гуляў на волі (с. 151). Друкуецца паводле выд.: Барадулін Р. Аратай, які пасвіць аблокі (1995). *Багдановіч нашага часу (с. 157).* Друкуецца паводле выд.: Шапран С. Тры мяхі дзядзькі Рыгора, альбо Сам-насам з Барадуліным (2012).

Барадулін Рыгор (1935–2014) — народны паэт Беларусі, перакладчык, эсэіст. Працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура», узначальваў Беларускі ПЭН-Цэнтр. Аўтар кніг «Вечалле» (1980), «Евангелле ад Мамы» (1995), «Ксты» (2005) ды інш. Выйшаў Збор твораў у 4 тамах (1996–2002).

Анатоль Кудравец. За дальнім прычалам (с. 159). Друкуецца паводле выд.: Кудравец А. За дальнім прычалам (2007).

Кудравец Анатоль (1936–2014) — празаік, эсэіст. Завочна закончыў журфак БДУ, працаваў у рэдакцыі «Літаратуры і мастацтва», у выдавецтве «Мастацкая літаратура», у апараце ЦК КПБ, быў галоўным рэдактарам часопіса «Нёман». Аўтар кніг «Радуніца», «Сачыненне на вольную тэму», «Смерць нацыяналіста» ды інш.

Алена Стральцова. Мая радасць і мой боль (с. 172). Друкуецца ўпершыню; тэкст напісаны адмыслова для нашага выдання.

Стральцова Алена (сапр. *Буторына*; нар. 1945), жонка М. Стральцова; працавала фотааператарам у Беларускім доме друку.

Віктар Карамазаў. І прадчуванне, і лёс (с. 181); *Пейзаж знаёмы» (с. 193)*; *«Мой голас і ў веку наступным пачуецца» (с. 204).* Тэксты друкуюцца паводле выд.: Карамазаў В. Выбраныя творы (2013).

Карамазаў Віктар (нар. 1934) — празаік, эсэіст. Пасля заканчэння журфака БДУ працаваў у раённым і абласным друку, у рэдакцыях

«Звязды», «Літаратуры і мастацтва», «Полымя». Аўтар кніг «Дзень Барыса і Глеба», «Крыж на зямлі і поўня ў небе», «Проста ўспомніў я цябе» ды інш. Жыве ў Мінску.

Ала Сямёнава. Пры ўрачыстым святле дня (с. 214). Урывак з эсэ «Бэзавы попел». Друкуецца паводле выд.: Сямёнава А. Святло загадкі (1995).

Янка Брыль. З запісаў (с. 224). Друкуецца паводле выд.: Брыль Я. Вячэрняе (1994).

Брыль Янка (1917–2006) — народны пісьменнік Беларусі. Удзельнік Другой сусветнай вайны. Працаваў у рэдакцыях часопісаў «Вожык», «Маладосць» і «Полымя», у Дзяржаўным выдавецтве БССР, у апараце Саюза пісьменнікаў. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі. Аўтар кніг «Жменя сонечных промняў», «Дзе скарб ваш», «Блакітны зніч» ды інш. Выйшаў Збор твораў у 5 тамах (1979–1981).

НАСТУПНЫ, ЯШЧЭ НЕ АБ'ЯЎЛЕНЫ ЗМЕСТ

Літаратуразнаўчы дыскурс

Алесь Адамовіч. Міхась Стральцоў — учора і заўтра (с. 227). Друкуецца паводле выд.: Стральцоў М. Выбранае (1987).

Адамовіч Алесь (1926–1994) — празаік, публіцыст, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Доктар філалагічных навук. Удзельнік Другой сусветнай вайны. Пасля заканчэння філфака БДУ працаваў у Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі, у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Аўтар кніг «Браму скарбаў сваіх адчыняю», «Хатынская аповесць», «Vixi» ды інш. Выйшаў Збор твораў у 4 тамах (1981–1983).

Янка Брыль. З добрай, сумнай усмешкай (с. 234). Друкуецца ў скароце паводле выд.: Брыль Я. Збор твораў у 5 т. Том 4. Тэкст — прадмова да кнігі М. Стральцова «Что будет сниться» (Масква, 1968).

Рыгор Барадулін. На сініх лугах маленства (с. 235). Друкуецца паводле час. «Полымя», 2002, № 3–4.

Леанід Дранько-Майсюк. Выгнаны патрыцый (с. 242). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Алесь Асташонак. За мяжою звычайнага (с. 252). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Асташонак Алесь (1954–2004) — празаік, перакладчык. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моваў. Працаваў перакладчыкам

на будоўлях у Алжыры, рэдактарам у выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя», у часопісе «Крыніца». Аўтар кніг «Фарбы душы», «Жоўты колер белага снегу».

Алесь Разанаў. Наступны, яшчэ не аб'яўлены змест (с. 254). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Разанаў Алесь (нар. 1947) — паэт, эсэіст, перакладчык. Вучыўся на філфаку БДУ (адкуль быў адлічаны з палітычных меркаванняў), у Брэсцкім педінстытуце. Працаваў у рэдакцыі тыднёвіка «Літаратура і мастацтва», у выдавецтве «Мастацкая літаратура», у часопісе «Крыніца». Аўтар кніг «Каардынаты быцця», «Шлях-360», «Паляванне ў райскай даліне» ды інш. Жыве ў Мінску.

Валянцін Акудовіч. Вусцішнасць быцця (с. 255). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Акудовіч Валянцін (нар. 1950) — філосаф, эсэіст, крытык. Закончыў маскоўскі Літаратурны інстытут. Працаваў у рэдакцыях «Літаратуры і мастацтва», «Культуры», «Крыніцы», выкладаў у Беларускім калегіуме. Аўтар кніг «Мяне няма. Роздум на руінах чалавека», «Разбурыць Парыж», «Архіпелаг Беларусь» ды інш. Жыве ў Мінску.

Анатоль Сідарэвіч. Абраннік сонечнага Феба (с. 258). Друкуецца ў скароце паводле час. «Дзеяслоў», 2003, № 4.

Сідарэвіч Анатоль (нар. 1948) — гісторык, літаратуразнавец, палітолаг. Закончыў гісторыка-філасофскі факультэт БДУ. Працаваў у рэдакцыях тыднёвіка «Літаратура і мастацтва», часопіса «Крыніца», выкладаў у Беларускім гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа і Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэце імя А. Сахарава. Жыве ў Мінску.

Сонечны Стральцоў: гутарка Ю. Залоскі з У. Бойкам (с. 289). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

Залоска Юрась (нар. 1968) — журналіст, філосаф, тэолаг. Закончыў журфак БДУ і Люблінскі ўніверсітэт. Доктар філасофскіх навук. Працаваў у рэдакцыях «Літаратуры і мастацтва», «Крыніцы», цяпер — праваслаўны святар. Аўтар кніг «Праўда як рэлігія. Дыялогі з Васілём Быкавым», «Версіі. Шлях да храма idea sui», «Философия религии Люблинской школы» ды інш.

Бойка Уладзімір (1932–1996) — мастацтвазнавец, літаратурны крытык.

«Стральцова будуць чытаць заўжды»: гутарка М. Скоблы з Л. Дранько-Майсюком (с. 302). Гутарка прагучала на радыё «Свабода» 17 лютага

2007 г. Друкуецца ў скароце паводле сайта радыё: http://www.svaboda.org/a/754807.html.

Ціхан Чарнякевіч. «Журба і пасміханне павінны быць у гэтым...» (с. 307). Друкуецца паводле час. «Дзеяслоў», 2011, № 50.

Чарнякевіч Ціхан (нар. 1986) — крытык, літаратуразнавец. Закончыў факультэт беларускай філалогіі і культуры БДПУ. Працаваў у рэдакцыях тыднёвіка «Літаратуры і мастацтва», часопіса «Маладосць», цяпер — у апараце Саюза беларускіх пісьменнікаў. Аўтар кнігі «Вандроўнік: пра паэта Уладзіміра Някляева».

Леанід Дранько-Майсюк. Коратка пра Міхася Стральцова (с. 316). Друкуецца паводле час. «Крыніца», 1994, № 9.

«У ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАГАДКІ»
Архіўныя тэксты Міхася Стральцова

Аўтабіяграфія (с. 321). Друкуецца ўпершыню. Арыгінал — у асабістай справе М. Стральцова, што зберагаецца ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў.

Пра Еўдакію Лось (с. 321). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, што зберагаецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (фонд 361, воп. 1, спр. 31).

Дзённікавы запіс (с. 324). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 49).

«ГАЛУБІНАЯ ЛЁГКАЯ ПОШТА МНЕ ПРЫНЕСЛА ТВАЁ ПІСЬМО»
Лісты Міхася Стральцова

1. *Паўлу Кабзарэўскаму (с. 329).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 31, воп. 1, спр. 417). Усе лісты, адрасаваныя П. Кабзарэўскаму, публікуюцца паводле той самай крыніцы.

9. *Віталю Фёдараву (с. 333).* Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 49).

10. *Валянціну Аскоцкаму (с. 334).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, што зберагаецца ў Цэнтральным Маскоўскім архіве-музеі асабістых збораў (фонд Л-238, воп. 1, спр. 206). Усе лісты, адрасаваныя В. Аскоцкаму, публікуюцца паводле той самай крыніцы. Укладальнік

шчыра дзякуе Канстанціну Баленко за росшук у маскоўскім архівемузеі лістоў М. Стральцова.

12. *Але Сямёнавай (с. 336).* Цалкам друкуецца ўпершыню паводле машынапіснай копіі з архіва А. Сямёнавай. На жаль, укладальнік не атрымаў магчымасці пазнаёміцца з арыгіналамі de visu. Часткова лісты М. Стральцова А. Сямёнавай публікаваліся ў эсэ «Бэзавы попел (гл. яе кнігу «Святло загадкі», 1995). Усе лісты да гэтага ж адрасата публікуюцца паводле той самай крыніцы.

26. *Ніне Шкляравай (с. 362).* Гэты і наступны ліст друкуюцца ўпершыню паводле аўтографаў з прыватнага архіва Н. Шкляравай.

29. *Пятру Кошалю (с. 365).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 49).

«ТЫ — САМАЯ ДАЛІКАТНАЯ ДУША Ў ГЭТЫМ ЧЭРСТВЫМ СВЕЦЕ...»
Лісты Міхасю Стральцову

1. *Павел Кабзарэўскі — Міхасю Стральцову (с. 368).* Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 31, воп. 2, спр. 268).

2. *Марыя Стральцова — Міхасю Стральцову (с. 369).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа з прыватнага архіва А. Дз. Стральцовай. Ліст № 15 публікуецца паводле той самай крыніцы.

3. *Еўдакія Лось — Міхасю Стральцову (с. 370).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 51).

4. *Сяргей Баруздзін — Міхасю Стральцову (с. 371).* Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 51). Ліст № 21 публікуецца паводле той самай крыніцы.

5. *Мікола Федзюковіч — Міхасю Стральцову (с. 371).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 59). Ліст № 7 публікуецца паводле той самай крыніцы.

6. *Янка Сіпакоў — Міхасю Стральцову (с. 372).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 51).

8. *Ніна Мацяш — Міхасю Стральцову (с. 373).* Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 55).

9. *Рыгор Барадулін — Міхасю Стральцову (с. 374).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа з прыватнага архіва А. Дз. Стральцовай. Ліст № 12 публікуецца паводле той самай крыніцы.

10. *Іван Шамякін — Міхасю Стральцову (с. 374).* Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 60).

11. *Карлас Шэрман — Міхасю Стральцову (с. 375).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа з прыватнага архіва А. Дз. Стральцовай. Ліст № 13 публікуецца паводле той самай крыніцы.

14. *Пімен Панчанка — Міхасю Стральцову (с. 379).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа з прыватнага архіва А. Дз. Стральцовай. Ліст № 17 публікуецца паводле той самай крыніцы.

16. *Віктар Стрыжак — Міхасю Стральцову (с. 380).* Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, што зберагаецца ў БДАМЛіМ (фонд 361, воп. 1, спр. 56).

18. *Данута Бічэль — Міхасю Стральцову (с. 382).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа з прыватнага архіва А. Дз. Стральцовай.

19. *Анатоль Вялюгін — Міхасю Стральцову (с. 382).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа з прыватнага архіва А. Дз. Стральцовай.

20. *Янка Брыль — Міхасю Стральцову (с. 382).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа з прыватнага архіва А. Дз. Стральцовай.369

«Гатовы Вам заўсёды дапамагчы»: лісты Леаніда Дранько-Майсюка (с. 383). Друкуюцца паводле час. «Дзеяслоў», 2016, № 80.

ДАДАТАК

Рэкамендацыі М. Стральцову для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў (с. 411). Друкуюцца ўпершыню паводле аўтографаў з асабістай справы М. Стральцова, што зберагаецца ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў.

ПАКАЗНІК ІМЁНАЎ*

Адамовіч Алесь (1927–1994), пісьменнік, крытык і грамадскі дзеяч, аўтар прадмовы да кнігі М. Стральцова «Выбранае» (1987) *326, 365*

Алешка Антон (1913–1971), празаік *322*

Асіпенка Алесь (1919–1994), празаік і кінасцэнарыст *340*

Аскоцкі Валянцін (1931–2010), расійскі крытык, публіцыст і літаратуразнавец *333, 334, 364, 366, 367*

Бабушкін Іван (1873–1906), расійскі рэвалюцыянер *335*

Багдановіч Максім (1891–1917), класік беларускай літаратуры *330, 331*

Барадулін Рыгор (1935–2014), народны паэт Беларусі *325, 328, 340, 348, 349, 365*

Бубнаў Генадзь (нар. 1948), празаік, на той час супрацоўнік часопіса «Нёман» *336, 364*

Бунін Іван (1870–1953), расійскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі *351*

Бураўкін Генадзь (1936–2014), паэт, грамадскі і дзяржаўны дзеяч; на той час старшыня Дзяржаўнага камітэта па тэлебачаньні і радыёвяшчаньні БССР *325, 326*

Броўка Пятрусь (1905–1980), народны паэт Беларусі *342*

Брыль Янка (1917–2006), народны пісьменнік Беларусі *332, 335, 365*

Быкаў Васіль (1924–2003), народны пісьменнік Беларусі *365*

Варанецкі Фама (нар. 1938), актор, тэатральны педагог *327*

Вялюгін Анатоль (1923–1994), паэт і кінасцэнарыст, на той час загадчык аддзела паэзіі часопіса «Полымя» *325, 339, 348*

Вярцінскі Анатоль (нар. 1931) — паэт і грамадскі дзеяч *326*

Гардзіцкі Аляксей (1934–1999), журналіст, празаік, на той час супрацоўнік апарата Саюза пісьменнікаў *324*

Гаўрусёў Сцяпан (1931–1988), паэт і перакладчык *349, 352*

---

* Улічаныя імёны, якія сустракаюцца ў тэкстах М. Стральцова.

Гедымін (каля 1275–1341), вялікі князь ВКЛ, заснавальнік дынастыі Гедымінавічаў *361*

Герчык Міхаіл (1932–2008), празаік *350*

Гесэ Герман (1877–1962), швейцарска-нямецкі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі *359*

Гіль Мікола (сапр. Гілевіч; нар. 1936) — празаік, на той час намеснік галоўнага рэдактара тыднёвіка «ЛіМ» *326*

Горкі Максім (Пешкаў Аляксей; 1868–1936), расійскі пісьменнік і грамадскі дзеяч *344*

Гратоўскі Ежы (1933–1999), польскі тэатральны рэжысёр, педагог, тэарэтык тэатра *342*

Дабралюбаў Ігар (1933–2010), кінарэжысёр, народны артыст Беларусі *350*

Давыдзенка Наталля (нар. 1950), паэтка, даследчыца літаратуры *328*

Дастаеўскі Фёдар (1821–1881), расійскі пісьменнік *335, 343, 358*

Дзюдэван Аўрора, сапраўднае імя французскай пісьменніцы Жорж Санд (1804–1876) *354*

Дзюма Аляксандр (1802–1870), французскі пісьменнік *342*

Дранько-Майсюк Леанід (нар. 1957), паэт, празаік, эсэіст, перакладчык *327*

Івашчанка Вячаслаў, маскоўскі крытык і перакладчык, аўтар прадмовы да кнігі М. Стральцова «Журавлиное небо» (Масква, 1978) *364*

Кабзарэўскі Павел (сапр. Гардон Фавій Залманавіч; 1909–1970), расійскі пісьменнік, перакладчык беларускай літаратуры *329, 330, 331, 332*

Казакевіч Вячаслаў (нар. 1951), расійскі паэт, родам з Бялынічаў *366*

Кальцоў Аляксей (1809–1842), расійскі паэт *345*

Карамазаў Віктар (нар. 1934), празаік, эсэіст *362*

Караткевіч Уладзімір (1930–1984), класік беларускай літаратуры *322, 363, 364*

Каткоў Міхаіл (1818–1887), расійскі публіцыст і выдавец *334*

Кіеня Віктар (нар. 1955), паэт *363*

Кіслік Навум (1925–1998), паэт і перакладчык *365*

Кошаль Пётр (нар. 1946), расійскі паэт і перакладчык, родам са Слуцка; на той час супрацоўнік маскоўскага выдавецтва «Советский писатель» *365*

Кудравец Анатоль (1936–2014), празаік, галоўны рэдактар час. «Нёман» *363, 364*

Купала Янка (Луцэвіч Іван; 1882–1942), класік беларускай літаратуры *343*

Ладуценка Мікалай — галоўны лекар паліклінікі Літфонду БССР *324*

Лось Еўдакія (1929–1977), паэтка, празаік *321–324*

Любімаў Юрый (1917–2014), расійскі тэатральны рэжысёр *333*

Лявонаў Леанід (1899–1994), расійскі празаік *366*

Ляскоў Мікалай (1831–1895), расійскі празаік *335*

Макаёнак Андрэй (1920–1982), драматург, народны пісьменьнік Беларусі *343*

Макарэвіч Васіль (нар. 1939), паэт, на той час супрацоўнік Беларускага радыё *355*

Макарэвіч Пятро (1938–2014), паэт і перакладчык *328*

Масарэнка Алесь (нар. 1938) — празаік *348*

Міхайлава Тамара, знаёмая М. Стральцова *326*

Мюндар Фелікс — школьны настаўнік М. Стральцова *327*

Навуменка Іван (1925–2006), народны пісьменнік Беларусі, літаратуразнавец, акадэмік *331*

Нікіціна Ніна — *гл. Шклярава Ніна*

Ніцшэ Фрыдрых (1844–1900), нямецкі мысляр, пісьменнік і філолаг *344*

Някрасаў Мікалай (1821–1878), расійскі паэт і публіцыст *345*

Нядзведскі Уладзіслаў (1929–1973), паэт *322*

Паўлаў Уладзімір (нар. 1935), паэт і празаік, на той час загадчык рэдакцыі паэзіі выдавецтва «Мастацкая літаратура» *326, 339*

Пашкоў Генадзь (нар. 1948), паэт, на той час намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» *352*

Песталоцы Ёган Генрых (1746–1827), швейцарскі педагог *354*

Пеўзнер, бухгалтар, сусед М. Стральцова па доме на вул. Чарнышэўскага *322*

Пісараў Дзмітрый (1840–1868), расійскі літаратурны крытык *335*

Пісьмянкоў Алесь (1957–2004), паэт і крытык, на той час супрацоўнік «ЛіМа» *352*

Полацкі Сімяон (1629–1680), усходнеславянскі пісьменнік і багаслоў *352*

Пушкін Аляксандр (1799–1837), класік расійскай літаратуры *335*

Пушча Язэп (сапр. Плашчынскі; 1902–1964), беларускі паэт *322*

Раеўскі Валерый (1939–2011), тэатральны рэжысёр, народны артыст Беларусі *343*

Рылько Алесь (1923–1967), празаік *343*

Рубцоў Мікалай (1936–1971), расійскі паэт *344, 360*

Рэйнхард Макс (сапр. Максіміллян Гольдман; 1873–1943), аўстрыйскі рэжысёр, актор і тэатральны дзеяч *343*

Сальеры Антоніо (1750–1825), італьянскі кампазітар *331*

Сачанка Барыс (1936–1995), празаік і публіцыст, даследчык літаратуры *325*

Свірка Юрась (1933–2010), паэт і перакладчык, на той час загадчык аддзела паэзіі тыднёвіка «ЛіМ» *326*

Сідарэвіч Анатоль (нар. 1948), гісторык і літаратуразнавец *327*

Сіпакоў Янка (1936–2011), паэт, празаік і перакладчык *355*

Скрыган Ян (1905–1992), празаік і мемуарыст *355*

Спрынчан Вадзім (нар. 1950), паэт і перакладчык *365*

Ставер Алесь (1929–1995), паэт і празаік *339*

Стральцова Алена (нар. 1945), другая жонка М. Стральцова; працавала фотааператарам у Беларускім доме друку *335, 367*

Стральцова Вераніка, дачка М. Стральцова ад першага шлюбу, літаратуразнавец *356, 357, 359*

Стральцова Таіса, сястра М. Стральцова *334*

Сямёнава Ала (нар. 1938), празаік, эсэіст, крытык; аўтар эсэ пра М. Стральцова «Бэзавы попел» *336, 338, 340–342, 346,348, 349, 353, 356, 358, 360*

Талстой Леў (1828–1910), класік расійскай літаратуры *335, 344, 363*

Танк Максім (сапр. Яўген Скурко; 1912–1995), народны паэт Беларусі, перакладчык, грамадскі і дзяржаўны дзеяч *332, 350*

Тарас Валянцін (1930–2009), паэт і перакладчык *365*

Твардоўскі Аляксандр (1910–1971), расійскі паэт, галоўны рэдактар часопіса «Новый мир» *335*

Трэдзіякоўскі Васілій (1703–1769), расійскі паэт, перакладчык і філолаг *333*

Ушакоў Мікалай (1899–1973), расійскі паэт і перакладчык *351*

Феліні Федэрыка (1920–1993), італьянскі кінарэжысёр *359*

Фёдараў Віталь, журналіст раённага друку; працаваў у Слаўгарадзе і Лёзна *333*

Фірштэйн Барыс, парадыст, друкаваўся пад псеўданімам Язэп Таўшчэзны *324*

Франко Іван (1856–1916), класік украінскай літаратуры *352*

Фрэйд Зігмунт (1856–1939), аўстрыйскі псіхааналітык, псіхіятр і неўролаг *343*

Цвірка Кастусь (нар. 1934), паэт, празаік, перакладчык, кнігавыдавец *355*

Цютчаў Фёдар (1803–1873), расійскі паэт і дзяржаўны дзеяч *351*

Чаадаеў Пётр (1794–1856), расійскі філосаф і публіцыст *335*

Чарнышэўскі Мікалай (1828–1889), расійскі пісьменнік і мысляр *322, 335*

Чыгрынаў Іван (1934–1996), народны пісьменнік Беларусі; на той час сакратар праўлення СП Беларусі *364, 366*

Чэхаў Антон (1860–1904), класік расійскай літаратуры *351, 362*

Шамякін Іван (1921–2005), народны пісьменнік Беларусі, грамадскі і дзяржаўны дзеяч *332*

Шклярава Ніна (нар. 1947), паэтка і перакладчыца *326, 327, 362, 363*

Шэрман Карлас (1929–2005), перакладчык, паэт, эсэіст *328*

Эшкрафт Пегі (1907–1991), англійская акторка, уладальніца прэміі «Оскар» *343*

Ягоўдзік Уладзімір (нар. 1956), празаік, на той супрацоўнік тыднёвіка «ЛіМ» *327*

Ясенін Сяргей (1895–1925), расійскі паэт *363*

Яскевіч Алесь (нар. 1934), крытык і літаратуразнавец, доктар філалогіі *351*

Яфімаў Фёдар (нар. 1933), паэт і перакладчык *365*

ЗМЕСТ

Міхась Скобла. Ён бачыў свет без бруду і хамства 5

ПРЫ ЎРАЧЫСТЫМ СВЯТЛЕ ДНЯ
Успаміны пра Міхася Стральцова

Ала Сямёнава. «Раніцай яснага мая...» 15
Таццяна Арлова. Грустные улыбки XX века 26
Аляксандр Станюта. Астатняе — у маўчанні 35
Алесь Жук. Памяць аб радасці 40
Анатоль Вярцінскі. Падарожжа да Міхася Стральцова 50
Васіль Зуёнак. Той куст ядлоўцавы... 56
Ніна Шклярава. Азірніся! 66
Мікола Гіль. Мой сябра Міша Стральцоў 70
Ніна Работа. «Гэй, дзень добры! Жыву!» 104
Данута Бічэль. Легенда Стральцова 107
Фёдар Яфімаў. Яснае святло з суседняй вуліцы 114
Валянцін Тарас. Міша, Міша... 116
Уладзімір Мехаў. «Быццам апошні раз жыву на зямлі...» 121
Аляксандр Дракахруст. Посвящение в поэты 125
Уладзімір Някляеў. Яго няма ў чым папракнуць 127
З цыкла «Знакі прыпынку» 130
Марына Наталіч. Позірк за небакрай... 132
Леанід Дранько-Майсюк. Устойлівае суседства 136
Адзіноцтва зоркі 138
Уладзімір Ягоўдзік. З дзённікавых запісаў 142
Алесь Пісьмянкоў. Настальгія па чыстым 143
Адам Глобус. Словы пра паэта Міхася Стральцова 144
Фама Варанецкі. Ён так маўчаў, што заслухаешся 147

Аляксей Гардзіцкі. Парада сябра 150
Рыгор Барадулін. Конь гуляў на волі 151
Багдановіч нашага часу 157
Анатоль Кудравец. За дальнім прычалам 159
Алена Стральцова. Мая радасць і мой боль 172
Віктар Карамазаў. І прадчуванне, і лёс 181
Пейзаж знаёмы 193
«Мой голас у веку наступным пачуецца» 204
Ала Сямёнава. Пры ўрачыстым святле дня 214
Янка Брыль. З запісаў 224

НАСТУПНЫ, ЯШЧЭ НЕ АБ'ЯЎЛЕНЫ ЗМЕСТ

Літаратуразнаўчы дыскурс

Алесь Адамовіч. Міхась Стральцоў — учора і заўтра 227
Янка Брыль. З добрай, сумнай усмешкай 234
Рыгор Барадулін. На сініх лугах маленства 235
Леанід Дранько-Майсюк. Выгнаны патрыцый 242
Алесь Асташонак. За мяжою звычайнага 252
Алесь Разанаў. Наступны, яшчэ не аб'яўлены змест 254
Валянцін Акудовіч. Вусцішнасць быцця 255
Анатоль Сідарэвіч. Абраннік сонечнага Феба 258
Сонечны Стральцоў: гутарка *Ю. Залоскі* з *У. Бойкам* 289
«Стральцова будуць чытаць заўжды»:
гутарка *М. Скоблы* з *Л. Дранько-Майсюком* 302
Ціхан Чарнякевіч.
«Журба і пасміханне павінны быць у гэтым...» 307
Леанід Дранько-Майсюк. Коратка пра Міхася Стральцова 316

«У ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАГАДКІ»

Архіўныя тэксты Міхася Стральцова

Аўтабіяграфія 321
Пра Еўдакію Лось 321
Дзённікавы запіс 324
Дарчыя надпісы на кнігах 325

«ГАЛУБІНАЯ ЛЁГКАЯ ПОШТА МНЕ ПРЫНЕСЛА ТВАЁ ПІСЬМО»

Лісты Міхася Стральцова

1. Паўлу Кабзарэўскаму. 21 марта 1966 г. 329
2. Паўлу Кабзарэўскаму. 14 июня 1967 г. 329
3. Паўлу Кабзарэўскаму. 12 февраля 1968 г. 330
4. Паўлу Кабзарэўскаму. 9 апреля 1968 г. 330
5. Паўлу Кабзарэўскаму. [1968 г.] 331
6. Паўлу Кабзарэўскаму. 28 октября 1968 г. 332
7. Паўлу Кабзарэўскаму. 13 ноября 1968 г. 332
8. Валянціну Аскоцкаму. 28 декабря 1973 г. 333
9. Віталю Фёдараву. [1974?] 333
10. Валянціну Аскоцкаму. [1976 г.] 334
11. Валянціну Аскоцкаму. [1979 г.] 334
12. Але Сямёнавай. [Верасень 1981 г.] 336
13. Але Сямёнавай. 31 кастрычніка 1981 г. 338
14. Але Сямёнавай. 14 сакавіка 1982 г. 340
15. Але Сямёнавай. 5 мая 1982 г. 341
16. Але Сямёнавай. 5 чэрвеня 1982 г. 342
17. Але Сямёнавай. 12 чэрвеня 1982 г. 346
18. Але Сямёнавай. 21 чэрвеня 1982 г. 347
19. Але Сямёнавай. 12 жніўня 1982 г. 349
20. Але Сямёнавай. 22 жніўня 1982 г. 353
21. Але Сямёнавай. 2 верасня 1982 г. 356
22. Але Сямёнавай. 27 верасня 1982 г. 358
23. Але Сямёнавай. 11 кастрычніка 1982 г. 360
24. Але Сямёнавай. 14 кастрычніка 1982 г. 361
25. Але Сямёнавай. 22 кастрычніка 1982 г. 362
26. Ніне Шкляравай. 31 мая 1984 г. 362
27. Ніне Шкляравай. [Без даты] 363
28. Валянціну Аскоцкаму. 27 декабря 1984 г. 364
29. Пятру Кошалю. 19 мая 1985 г. 365
30. Валянціну Аскоцкаму. [Декабрь 1985 г.] 366
31. Валянціну Аскоцкаму. 20 марта 1986 г. 367
32. Валянціну Аскоцкаму. [Без даты] 367

«ТЫ — САМАЯ ДАЛІКАТНАЯ ДУША Ў ГЭТЫМ ЧЭРСТВЫМ СВЕЦЕ...»

Лісты Міхасю Стральцову

1. Павел Кабзарэўскі — Міхасю Стральцову. 9 декабря 1968 г. . . . 368
2. Марыя Стральцова — Міхасю Стральцову. 19 марта [1972 г.] . . 369
3. Еўдакія Лось — Міхасю Стральцову. 26 ліпеня 1973 г. 370
4. Сяргей Баруздзін — Міхасю Стральцову. 5 марта 1974 г. 371
5. Мікола Федзюковіч — Міхасю Стральцову. 4 лютага 1975 г. . . . 371
6. Янка Сіпакоў — Міхасю Стральцову. 12 мая 1975 г. 372
7. Мікола Федзюковіч — Міхасю Стральцову. 11 лістапада 1975 г. 372
8. Ніна Мацяш — Міхасю Стральцову. 30 красавіка 1977 г. 373
9. Рыгор Барадулін — Міхасю Стральцову. 12 лютага 1982 г. 374
10. Іван Шамякін — Міхасю Стральцову. 25 сакавіка 1982 г. 374
11. Карлас Шэрман — Міхасю Стральцову. 8 чэрвеня 1982 г. 375
12. Рыгор Барадулін — Міхасю Стральцову. 15 чэрвеня 1982 г. . . . 376
13. Карлас Шэрман — Міхасю Стральцову. 20 ліпеня 1982 г. 377
14. Пімен Панчанка — Міхасю Стральцову. 7 ліпеня 1984 г. 379
15. Марыя Стральцова — Міхасю Стральцову. 30 августа 1985 г. . 379
16. Віктар Стрыжак — Міхасю Стральцову. 9 лютага 1987 г. 380
17. Пімен Панчанка — Міхасю Стральцову. 9 лютага 1987 г. 381
18. Данута Бічэль — Міхасю Стральцову. 11 лютага 1987 г. 382
19. Анатоль Вялюгін — Міхасю Стральцову. [12 лютага 1987 г.] . . 382
20. Янка Брыль — Міхасю Стральцову. 14 лютага 1987 г. 382
21. Сяргей Баруздзін — Міхасю Стральцову. 2 января 1989 г. 383
«Гатовы Вам заўсёды дапамагчы»: лісты Леаніда Дранько-Майсюка 383

ДАДАТАК

Рэкамендацыі М. Стральцову для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў (І. Мележа, Я. Скрыгана, І. Пташнікава) . . . 411

КАМЕНТАР 413

ПАКАЗНІК ІМЁНАЎ 423

В92 **Выгнаны** патрыцый : Кніга пра Міхася Стральцова / уклад, прадм., камент. Міхася Скоблы. — Мінск : Лімарыус, 2017. — 432 с. : іл. — (Беларуская мемуарная бібліятэка).

ISBN 978-985-6968-56-6.

Гэтая кніга — не парадны партрэт у залатой раме класіка беларускай літаратуры Міхася Стральцова (1937–1987), а хутчэй мазаічная выява ў поўны рост, складзеная з дзясяткаў каляровых шкельцаў, у якіх адбілася і захавалася для нашчадкаў размаітае жыццё выдатнага творцы. Успаміны 34 аўтараў, раней не публікаваныя лісты пісьменніка, невядомыя архіўныя тэксты — усё гэта, безумоўна, зацікавіць прыхільнікаў творчасці М.Стральцова, які «даў інтэлектуальны пачатак прозе, пачуццёвую глыбіню эсэістыцы, шырыню і далягляднасць крытыцы, акварэльнасць і адухоўленасць паэзіі» (выраз Р. Барадуліна).

УДК 94(476)(093)
ББК 63.3(4Беи)

Літаратурна-мастацкае выданне

Беларуская мемуарная бібліятэка

ВЫГНАНЫ ПАТРЫЦЫЙ

Кніга пра Міхася Стральцова

Укладальнік *М. Скобла*

Адказны за выпуск *М. Шыбко*

Вёрстка *В. Нога*

Карэктар *Л. Вікторка*

Падпісана ў друк 12.01.2017. Фармат 70×100/32. Папера афсетная.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 17,55. Ул.-выд. арк. 19,5. Наклад 300 асобн. Заказ 2640.

Выдавецтва ТАА «Лімарыус».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы
і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў 20.03.2014 за № 1/226.
Вул. Геалагічная, 59, к. 4, п. 29, 220138, г. Мінск.

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Новапрынт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы
і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/54 ад 25.02.2014.
Вул. Геалагічная, 59, к. 4, п. 10, 220138 г. Мінск.

ISBN 978-985-6968-56-6

9 789856 968566

Беларуская
мемуарная
бібліятэка

Выгнаны патрыцый